# Беларускія пісьменнікі

# Беларускія пісьменнікі (1917-1990)

*Даведнік*

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1994

ББК 91.9:83.3Бел7
Б 43
УДК 016 : 882.6(092)

Складальнік *А. К. Гардзіцкі*
Навуковы рэдактар
кандыдат філалагічных навук *А. Л. Верабей*

**Б** $\frac{\textbf{4406010000— 003}}{\textbf{М 302(03)—94}}$ **68—93**

**ISBN 5-340-00709-X**

© Укладанне. А. К. Гардзіцкі, 1994

# Ад складальніка

Мэта гэтага Даведніка — коратка пазнаёміць з біяграфіямі пісьменнікаў Беларусі, іх творчасцю. У яго ўключаны звесткі пра членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі: празаікаў, паэтаў, драматургаў, крытыкаў, перакладчыкаў, а таксама пра многіх літаратараў, якія былі рэпрэсіраваны, загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны або памерлі. Упершыню змяшчаюцца даведкі пра асобных літаратараў, якія жывуць і працуюць за межамі Беларусі.

У Даведніку паведамляюцца асноўныя біяграфічныя факты: даты нараджэння пісьменнікаў (па новым стылі), месца нараджэння (паводле сучаснага адміністрацыйна-тэрытарыяльнага падзелу), адукацыя, жыццёвы шлях, пералічаюцца навуковыя і ганаровыя званні, рэспубліканскія, усесаюзныя і замежныя прэміі, адзначаюцца ўзнагароды ордэнамі і медалямі, членства ў Саюзе пісьменнікаў. У сувязі з тым, што большасць пісьменнікаў жыве ў Мінску, месца жыхарства названа толькі тых, хто жыве па-за межамі сталіцы рэспублікі. Называюцца арыгінальныя кнігі пісьменніка, у дужках пазначаецца год выпуску і, калі кніга выйшла за межамі Беларусі, указваецца месца выдання. У выпадку, калі твор драматургіі не выходзіў асобным выданнем, ён датуецца па першай публікацыі ў друку, а таксама па пастаноўцы ў тэатры, на кінастудыі ці тэлебачанні.

Даведнік складзены паводле звестак на 1 студзеня 1991 г.

Асноўнымі крыніцамі для напісання гэтага Даведніка паслужылі: асабовыя справы пісьменнікаў, якія захоўваюцца ў архіве СП Беларусі, картатэкі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і аддзела статыстыкі друку Дзяржаўнай кніжнай палаты БССР, асобныя тамы біябібліяграфічнага даведніка «Беларускія пісьменнікі».

---

За час, пакуль Даведнік знаходзіўся ў вытворчасці, адбыліся наступныя змены ў грамадскім статусе пісьменнікаў за 1991 і 1992 гг. (падаюцца важнейшыя з іх):

**1991 г.**

*Анатоль Вярцінскі* — заслужаны работнік культуры Беларускай ССР.

*Ніл Гілевіч* — народны паэт БССР.

*Уладзімір Дамашэвіч* — лаўрэат прэміі прафсаюзаў Беларусі за раман «Камень з гары».

*Аляксей Дудараў* — заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР.

*Алесь Звонак* — заслужаны работнік культуры Беларускай ССР.

*Анатоль Казловіч* — лаўрэат прэміі прафсаюзаў Беларусі за кнігу публіцыстыкі «Собственный корреспондент».

*Уладзімір Карызна* — лаўрэат прэміі прафсаюзаў Беларусі за кнігу вершаў для дзяцей «Мір і сонейка — для ўсіх».

*Мікола Кусянкоў* — лаўрэат Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя Аркадзя Куляшова за зборнік вершаў «Дуброва».

*Міхась Мушынскі* — член-карэспандэнт АН БССР.

*Барыс Сачанка* — лаўрэат Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя Івана Мележа за кнігу «Сняцца сны аб Беларусі».

*Браніслаў Спрынчан* — лаўрэат прэміі прафсаюзаў Беларусі за зборнік вершаў «Жизни вечные круги».

*Іван Шамякін* — ордэн Дружбы народаў.

## 1992 г.

*Рыгор Барадулін* — народны пісьменнік Беларусі. Ганаровы грамадзянін Ушацкага раёна.

*Сяргей Грахоўскі* — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа за кнігу «Споведзь».

*Уладзімір Дамашэвіч* — заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Літаратурнай прэміі СП Беларусі за аповесць «Кожны чацвёрты».

*Мікола Ермаловіч* — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Кастуся Каліноўскага за гістарычна-публіцыстычную кнігу «Старажытная Беларусь: Полацкі і новагародскі перыяды».

*Алесь Жук* — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь імя Якуба Коласа за кнігу прозы «Праклятая любоў».

*Сяргей Законнікаў* — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за кнігу паэзіі «Заклінанне».

*Алесь Звонак* — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь за кнігу паэзіі «Светлацені».

*Мікола Маляўка* — лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Аркадзя Куляшова за зборнік паэзіі «Зімні дождж».

Медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны:

1991 г.— *Янка Брыль, Васіль Вітка, Уладзімір Калеснік, Максім Лужанін, Сяргей Панізнік, Ян Скрыган;*

1992 г.— *Генадзь Каханоўскі, Пімен Панчанка, Максім Танк, Іван Чыгрынаў, Уладзімір Юрэвіч.*

Даты смерці пісьменнікаў даюцца ў Даведніку за 1991 і 1992 гг.

# а



## *Аляксандр* АВЕЧКІН

Аляксандр Аляксеевіч Авечкін нарадзіўся 22.6.1913 г. у горадзе Чудаве Наўгародскай вобласці (Расія) у сям'і служачага.

Працаваў рабочым на мясцовай запалкавай фабрыцы (1929—1931). Служыў у Савецкай Арміі (1931—1936), быў інструктарам чудаўскага аэраклуба. У час Вялікай Айчыннай вайны — лётчык, камандзір эскадрыллі. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1949), аддзяленне журналістыкі Вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КПСС (1960). Працаваў уласным карэспандэнтам газеты «Калгасная праўда» па Брэсцкай вобласці (1950—1955), загадчыкам аддзела культуры брэсцкай абласной газеты «Заря» (1955—1959), рэдактарам газеты «Красноярский пилот» (1959—1961), старшым рэдактарам брэсцкай абласной студыі тэлебачання (1963—1976). Член СП СССР з 1958 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны І ступені, «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 7.11.1980 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1949 г. Пісаў на рускай мове. Аўтар аповесцей для дзяцей «Соломка» (1951), «Ошибка «Дикого зубра» (Краснаярск, 1960), «У Дивных гор» (1965), «Происшествия в конце каникул» (1982), зборнікаў прозы «Подвиг сигналиста» (1958), «Рассказы» (Краснаярск, 1961), «Особое задание» (1979).

*Уладзімір* АГІЕВІЧ



Уладзімір Іванавіч Агіевіч нарадзіўся 26.9.1910 г. у вёсцы Пухавічы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Настаўнічаў у сельскай школе (1929—1933). Скончыў літаратурны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1937). Выкладаў у Слуцкім педагагічным вучылішчы (1937—1939), вучыўся ў аспірантуры пры АН БССР (1937—1941). Некаторы час выкладаў гісторыю беларускай літаратуры ў вышэйшых навучальных установах Мінска. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Быў паранены. У 1943—1946 гг.— вучоны сакратар аддзялення грамадскіх навук АН БССР. Працаваў выкладчыкам беларускай літаратуры ў Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага, літкансультантам у СП БССР, рэдактарам аддзела часопіса «Беларусь». Член СП СССР з 1946 г.

Памёр 2.10.1952 г.

Дэбютаваў вершамі ў 1928 г. Як крытык пачаў выступаць у 1941 г. Вылучаюцца яго артыкулы пра творчасць Я. Купалы і Я. Коласа, пра пасляваенную беларускую паэзію. Склаў падручнікі (разам з І. Кудраўцавым): «Кніга для чытання ў 2 класе школ рабочай і сельскай моладзі» (1952), «Кніга для чытання ў 3 класе школ рабочай і сельскай моладзі» (1952). Лепшыя крытычныя працы сабраны ў кнізе «Літаратура і жыццё» (1954).

На беларускую мову пераклаў аповесць М. Прыляжаевай «З табой таварышы» (1950).

*Эдзі* АГНЯЦВЕТ



Эдзі Агняцвет (Эдзі Сямёнаўна Каган) нарадзілася 11.10.1913 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачых.

Пасля заканчэння сямігодкі працавала на мінскім заводзе «Камунар» (1930), год правучылася ў мінскай будаўнічай прафтэхшколе. Скончыла крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута (1934). Завочна вучылася на педагагічным аддзяленні літфака педінстытута (1934—

1936), працавала рэдактарам Беларускага радыё (1934—1938), кансультантам у кабінеце маладога аўтара СП БССР (1939), у аддзеле паэзіі часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1940—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны жыла ва Узбекістане. У 1945—1946 гг. працавала ў Дзяржаўным выдавецтве БССР. Член СП СССР з 1937 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Першыя вершы надрукавала ў 1929 г. Піша пераважна для дзяцей. Выдала зборнікі паэзіі «Маё пакаленне» (1935), «Вершы» (1938), «Вясновай раніцай» (1941), «Край мой родны» (1945), «Дарога ў будучыню» (1949), «Беларуская рабіна» (1959), «Лірыка» (1965), «Круглы год: Выбранае» (1966), «Жаданне» (1971), «Спадзяванне калыханак» (1983), «Закаханым» (1986), паэму «На беразе Волгі» (1940). Выйшлі кнігі паэзіі для дзяцей «Васількі» (1947), «Ля піянерскага кастра» (1952), «Твае таварышы» (1957), «Госць з далёкай зямлі» (1958), «Незвычайныя канікулы» (1962), «Першы ліст» (1966), «Падарожнік» (1969), «Піянерская гама» (1970), «Краіна маленства» (1975), «Мы сур'ёзныя, мы вясёлыя» (1976), «Доктар Смех» (1977), «Ад зярнятка да вясёлкі» (1981), «Хто пачынае дзень?» (1982), «На двары алімпіяда» (1984), «Буду настаўнікам» (1990), паэмы «Песня пра піянерскі сцяг» (1949), «Мы будзем сябраваць» (1955, дапрацаванае выданне ў 1979), кніга для чытання ў 4 класе «Роднае слова» (з Я. Івашуціч, 1989). У 1976 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Аўтар лібрэта опер для дзяцей «Джанат» (1962, ставілася ў 1944, 1947, 1974), «Марынка» (урыўкі ў 1958, пастаўлена ў 1956).

Пераклала на беларускую мову паасобныя творы А. Пушкіна, М. Някрасава, У. Маякоўскага, М. Ушакова, Г. Ахматавай, В. Шэфнера, А. Барто, Л. Украінкі, М. Бажана, Я. Судрабкална, С. Нярыс, Г. Гуляма, Уйгуна, Д. Максімовіч, М. Карыма і інш., кнігу Зульфіі «Такое сэрца ў мяне» (з А. Грачанікавым, 1985), зборнікі паэзіі для дзяцей Я. Османіса «Сабака з рагаткай» (1976), Г. Сулейманавай «Сорак косак» (1982), М. Джаліля «Я гляджу на зоры» (1985). З французскай мовы пераклала кнігі П.-Ж. Беранжэ «Выбраныя песні» (1960),

«Краіна Паэмія» (анталогія французскай паэзіі для дзяцей, 1962), А. Экзюперы «Маленькі прынц» (1969), Г. Апалінэра «Зямны акіян» (1973), П. Элюара «З табою» (1980).

У 1986 г. узнагароджана міжнародным Ганаровым дыпломам імя Х.-К. Андэрсена за кнігу вершаў і перакладаў для дзяцей «На двары алімпіяда».

---

## *Алесь АДАМОВІЧ*



Алесь (Аляксандр Міхайлавіч) Адамовіч нарадзіўся 3.9.1927 г. у вёсцы Канюхі Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых.

З 1928 г. сям'я пражывала ў пасёлку Глуша Бабруйскага раёна. У 1942 г. ён, вучань сярэдняй школы,— сувязны, з 1943 г.— баец партызанскага атрада імя Кірава Мінскага злучэння. У 1944—1945 гг.— студэнт Ленінагорскага горна-металургічнага тэхнікума (Алтайскі край). У 1945—1950 гг. вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1953 г. скончыў аспірантуру пры універсітэце і працаваў там жа на кафедры беларускай літаратуры. У 1954—1962 гг. і з 1967 г.— навуковы супрацоўнік, у 1976—1983 гг.— загадчык сектара літаратурных узаемасувязей Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. У 1962—1966 гг. вучыўся на Вышэйшых сцэнарных курсах у Маскве, у 1964—1966 гг. выкладаў беларускую літаратуру ў МДУ імя М. В. Ламаносава. З 1966 г. зноў працаваў у Інстытуце літаратуры. У 1982 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXXVII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. З 1987 г.— дырэктар навукова-даследчага Інстытута кінамастацтва ў Маскве. Народны дэпутат СССР (1989). Член-карэспандэнт АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі.

Як крытык і літаратуразнавец выступае ў друку з 1950 г. Піша на беларускай і рускай мовах. Аўтар навуковых прац «Шлях да майстэр-

ства: Станаўленне мастацкага стылю К. Чорнага» (1958), «Культура творчасці» (1959), «Беларускі раман» (1961), «Становление жанра: Белорусский роман» (Масква, 1964), «Маштабнасць прозы» (1972), «Горизонты белорусской прозы» (Масква, 1974), «Здалёк і зблізку: Беларуская проза на літаратурнай планеце» (1976), «Кузьма Чорный: Уроки творчества» (Масква, 1977), «Лев Толстой и белорусская литература: Война и человек» (1978, даклад на VIII Міжнародны з'езд славістаў), «Літаратура, мы і час» (1979), «Браму скарбаў сваіх адчыняю...» (1980), «О современной военной прозе» (Масква, 1981), «Война и деревня в современной литературе» (1982), альбома «Сказ пра Івана Мележа» (1984), брашуры «Литература и проблемы века» (Масква, 1986), кніг літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі «Выбери — жизнь» (1986), «Ничего важнее» (Масква, 1985), «Додумывать до конца» (Масква, 1988), «Отвоевались!» (Масква, 1990).

Выйшлі раман «Война под крышами» (1960), які разам з раманам «Сыновья уходят в бой» склалі дылогію «Партизаны» (1963, па сцэнарыю пісьменніка пастаўлена аднайменная кінадылогія, 1970), «Хатынская аповесць» (Масква, 1972; на беларускай мове ў 1976, інсцэніравана ў 1977), аповесці «Асия. Последний отпуск» (1975), «Каратели: Радость ножа, или Жизнеописание гипербореев» (1981), «Последняя пастораль» (часопіс «Новый мир», 1986). У 1985 г. на кінастудыі «Мосфильм» пастаўлены двухсерыйны мастацкі фільм «Иди и смотри» (сцэнарый А. Адамовіча і Э. Клімава, апублікаваны ў 1986, у аснову якога пакладзены «Хатынская аповесць» і «Каратели...»). Фільм заняў першае месца на Сусветным кінафестывалі ў Маскве (1985), узнагароджаны залатым прызам. У 1987 г. выйшла кніга апавяданняў і эсэ «Моление о будущем». Адзін з аўтараў дакументальных кніг «Я з вогненнай вёскі...» (з Я. Брылём, У. Калеснікам, 1975) і «Блокадной книги» (з Д. Граніным, Масква, 1979, 2-е, поўнае выданне, у перакладзе на беларускую мову ў 1985). У 1977 г. выйшаў Збор твораў у 2-х, у 1981—1983 гг.— у 4 тамах.

Лаўрэат прэміі Міністэрства абароны СССР (1974) і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1976) — за «Хатынскую аповесць».

## *Вячаслаў АДАМЧЫК*



Вячаслаў Уладзіміравіч Адамчык нарадзіўся 1.11.1933 г. у вёсцы Варакомшчына Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сямігодкі (1949) працаваў грузчыкам на станцыі Наваельня і вучыўся ў вячэрняй школе. У 1952—1957 гг. займаўся на аддзяленні журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у газетах «Знамя юности» (1957—1958), «За вяртанне на Радзіму» (1958—1960), рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1960—1962), рэдактарам аддзела публіцыстыкі часопіса «Полымя» (1962—1963). У 1965 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы пры СП СССР у Маскве. Быў літсупрацоўнікам часопіса «Неман» (1965—1967), загадчыкам рэдакцыі часопіса «Полымя» (1967—1969), рэдактарам аддзела прозы, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» (1969—1977), галоўным рэдактарам сцэнарнай майстэрні пры кінастудыі «Беларусьфільм» (1977—1980), намеснікам галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1980—1982). З 1982 г.— галоўны рэдактар часопіса «Бярозка». Прымаў удзел у рабоце XXXVIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1983). Член СП СССР з 1960 г.

Дэбютаваў вершамі ў 1952 г. У 1957 г. апублікаваў першае апавяданне. Аўтар зборнікаў прозы «Свой чалавек» (1958), «Млечны шлях» (1960), «Міг бліскавіцы» (1965), «Дзікі голуб» (1972), «Дзень ранняй восені» (1974), «Раяль з адламаным вечкам» (1990) і раманаў «Чужая бацькаўшчына» (1978, паводле рамана зняты мастацкі фільм, 1982 і тэлеспектакль, 1983), «Год нулявы» (1983), «І скажа той, хто народзіцца...» (1987). Напісаў сцэнарыі дакументальных фільмаў «Іван Мележ» (зняты ў 1977), «Валянцін Таўлай» (зняты ў 1978), «Дзядзька Якуб» (зняты ў 1981), п'есу «Раіса Грамычына» (1989).

Пераклаў кнігу балгарскіх народных казак «Незвычайны асілак» (1961), паасобныя творы М. Прышвіна, Ю. Казакова, С. Залыгіна і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1980, за раман «Чужая бацькаўшчына») і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1988, за раманы «Чужая бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца...»).

---

*Валянціна АКОЛАВА*



Валянціна Валянцінаўна Аколава нарадзілася 25.7.1954 г. у вёсцы Мазуршчына Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Полацкага музычна-педагагічнага вучылішча імя Ф. Скарыны працавала настаўніцай у Ветрынскай школе-інтэрнаце Полацкага раёна (1973—1977), метадыстам наваполацкага Палаца культуры нафтавікоў (1977), карэспандэнтам шматтыражнай газеты «Знамя новостройки» трэста № 16 «Нафтабуд» (1977—1978), у рэдакцыі радыёвяшчання Наваполацкага вытворчага аб'яднання «Палімір» (1979—1980). У 1980 г. завочна скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1981—1986 гг. працавала ў выдавецтве «Юнацтва», у 1987—1988 гг.— літкансультантам газеты «Знамя юности». Член СП СССР з 1986 г.

Першыя вершы надрукавала ў 1968 г. (салігорская газета «Шахцёр»). Адзін з аўтараў паэтычнага зборніка «Сцяжына» (1983). Аўтар зборнікаў паэзіі «За тым лугам зеляненькім» (1987), «Вяртанне ў заўтра» (1990), «Я люблю сваю Белую Русь» (1990), а таксама паэмы-п'есы «Палачанка Інгрэна, альбо Вяртанне Скарыны» (1990). Паасобныя вершы пакладзены на музыку.

Выступае як перакладчык з рускай, украінскай і славацкай моў.

## *Зэлік* АКСЕЛЬРОД



Зэлік Майсеевіч Аксельрод нарадзіўся 30.12.1904 г. у горадзе Маладзечна ў сям'і саматужніка.

Вучыўся ў Вышэйшым літаратурна-мастацкім інстытуце імя В. Брусава (1922—1925). Скончыў літаратурны факультэт Маскоўскага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна (1928). Працаваў у дзіцячым доме, рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР, у Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. З 1931 па 1941 гг.— адказны сакратар яўрэйскага часопіса «Штэрн» («Зорка»). Арыштаваны органамі НКДБ 30.5.1941 г. У сувязі з пачаткам вайны следства не закончана. Крымінальная справа на яго спынена 7.6.1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 26.6.1941 г.

Першыя вершы надрукаваны ў 1921 г. Пісаў на мове ідыш. Аўтар зборнікаў паэзіі «Трапятанне» (1922), «Вершы» (1932), « І зноў вершы» (1935), «Сам-насам» (1937), «Вершы» (1938), «Чырвонаармейскія вершы» (1939), «Вершы» (Нью-Йорк, 1961), «Утренний свет» (Масква, 1963), «Вершы» (Масква, 1980).

Пераклаў на мову ідыш паэму М. Някрасава «Чыгунка», кнігу выбраных вершаў Я. Купалы (1936), паэму П. Броўкі «Прамова фактамі» (у кнізе «Паэзія БелАПП», 1931) і п'есу французскага драматурга Лябіша «Труадэк» (з Ізі Харыкам, пастаўлена Маскоўскім дзяржаўным яўрэйскім тэатрам).

## *Андрэй* АЛЕКСАНДРОВІЧ



Андрэй Іванавіч Александровіч нарадзіўся 22.1.1906 г. у горадзе Мінску ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння Мінскага педагагічнага тэхнікума (1925) працаваў рэдактарам акруговай газеты «Наш працаўнік». Вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1925—1930), адначасова рэдагаваў часопіс «Малады араты». Адзін з арганізатараў літаратурнага аб'яднання «Маладняк». З 1932 г.— намеснік старшыні аргка-

мітэта, у 1934—1937 гг.— намеснік старшыні праўлення СП БССР. Прымаў удзел у падрыхтоўцы рэформы правапісу беларускай мовы (1933). Абіраўся членам ЦВК БССР. У 1938 г. быў рэпрэсіраваны. Тэрмін адбываў на Крайняй Поўначы, працаваў на будаўніцтве Нарыльскага металургічнага камбіната (1938—1947). З 1947 г.— літсупрацоўнік шматтыражнай газеты Мінскага трактарнага завода, з 1948 г.— брыгадзір «Белтрактарабуда». У 1949—1955 гг.— у ссылцы ў Краснаярскім краі. Пасля рэабілітацыі (1955) жыў у Мінску. Член-карэспандэнт АН БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 6.1.1963 г.

Першы верш апублікаваў у 1921 г. Выйшлі зборнік вершаў «Камсамольская нота» (з А. Вольным, 1924), зборнік апавяданняў «Сутарэнне» (1925), а таксама раман «Ваўчаняты» (з А. Вольным і А. Дударом, 1925). Аўтар зборнікаў паэзіі «Па беларускім бруку» (1925), «Прозалаць» (1926), «Угрунь» (1927), «Фабрыка смерці» (1929), «Устаноўка» (1930), «Гудкі» (1930), «Вершы і паэмы» (1931), «Нараджэнне чалавека» (вершы і паэма, 1931), «Узброеныя песні» (1936), «Вершы» (1970), «Галубінае крыло» (1976), паэмы «Цені на сонцы» (1930), «Паэма імя Вызвалення» (1930), «Напор» (1933). Аўтар кніг для дзяцей «Рыбак» (1928), «Горад раніцой» (1930), «Калыханка» (1930), «Хлопчык і певень» (1930), «Як дзеці памагалі будаваць самалёт» (1931), «Шчаслівая дарога» (1935), «Казка пра пана Жываглота» (1935), «Падарунак дзеткам-малалеткам» (1936, 1973) і інш. Выйшлі Выбраныя творы (1934), «Выбранае» (1958), Збор твораў у 2 тамах (1981).

Пераклаў на беларускую мову «Інтэрнацыянал», паэму А. Пушкіна «Руслан і Людміла» (1938), шэраг твораў рускіх, украінскіх, літоўскіх паэтаў і празаікаў.

*Сцяпан* АЛЕКСАНДРОВІЧ



Сцяпан Хусейнавіч Александровіч нарадзіўся 15.12.1921 г. у гарадскім пасёлку Капыль Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

У 1939 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта і быў прызваны ў Чырвоную Армію. Скончыў універсітэт у 1950 г. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Наваельненскай сярэдняй школе Дзятлаўскага раёна і ў Навагрудку (1944—1953), у Мінскім бібліятэчным тэхнікуме (1953—1958). У 1958—1963 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1963 г.— дацэнт, з 1974 г.— прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1955 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені і медалямі.

Памёр 1.5.1986 г.

Літаратурную працу пачаў у 1946 г. з крытычных артыкулаў і краязнаўчых нарысаў. Выдаў кнігі нарысаў «Незабыўнымі сцежкамі» (1959; 2-е, дапоўненае выданне 1962), «Па слядах паэтычнай легенды» (1965), «Тут зямля такая» (1974), «Вальнадумца з-пад Нясвіжа Аляксандр Незабытоўскі» (1975), зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў «Старонкі братняй дружбы» (1960), «Гісторыя і сучаснасць» (1968), «Кнігі і людзі» (1976), «Слова — багацце» (1981), манаграфію «Пуцявіны роднага слова» (1971). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964).

Аўтар аповесцей пра жыццё Якуба Коласа «Ад роднае зямлі...» (1962), «На шырокі прастор» (1972), «Крыжавыя дарогі» (1985), а таксама аповесці «Далёкія зарніцы» (1967).

Падрыхтаваў для выдання творчую спадчыну Ф. Багушэвіча («Творы», 1967), А. Паўловіча («Выбранае», 1975), Цёткі («Творы», 1976), К. Каганца («Творы», 1979).

Складальнік вучэбнага дапаможніка «Беларуская літаратура XIX — пачатку XX ст.: Хрэстаматыя крытычных матэрыялаў» (з В. С. Александровіч, 1978).

*Святлана* ***АЛЕКСІЕВІЧ***



Святлана Аляксандраўна Алексіевіч нарадзілася 31.5.1948 г. у горадзе Івана-Франкоўску (Украіна) у сям'і ваеннаслужачага.

Пасля заканчэння Капаткевіцкай сярэдняй школы Петрыкаўскага раёна (1965) працавала выхавацелькай Асавецкай школы-інтэрната, а затым настаўніцай гісторыі і нямецкай мовы Белажэвіцкай сямігадовай школы Мазырскага раёна. У 1966 г. працавала ў нараўлянскай раённай газеце «Прыпяцкая праўда». У 1972 г. скончыла аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Накіравана ў бярозаўскую раённую газету «Маяк камунізма». У 1973—1976 гг. працавала ў рэспубліканскай «Сельской газете», у 1976—1984 гг.— загадчык аддзела нарыса і публіцыстыкі часопіса «Неман». Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1983 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны».

Літаратурную дзейнасць пачала ў 1975 г. Піша на рускай і беларускай мовах. У перыядычным друку выступае з нарысамі. Аўтар дакументальных кніг «У войны — не женское лицо» (1985), «Апошнія сведкі» (1985), «Цинковые мальчики» (часопіс «Дружба народов», 1990). Паводле кнігі «У войны — не женское лицо» напісала п'есу (пастаўлена ў 1985 г. у многіх тэатрах краіны і за мяжой) і сцэнарыі аднайменнага цыкла дакументальных фільмаў (1983, адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР у 1985 г. і «Сярэбраным голубам» на міжнародным кінафестывалі ў Лейпцыгу), дакументальных стужак «Бацькоўскі дом», «Партрэт з вяргіняй», «Гэтыя незразумелыя старыя людзі» і інш. (усяго пятнаццаць фільмаў). Аўтар п'есы «Марутка» (пастаўлена ў 1988).

Лаўрэат літаратурных прэмій СП СССР імя М. Астроўскага (1984), імя К. Федзіна (1985) і прэміі Ленінскага камсамола (1986) за кнігі «У войны — не женское лицо» і «Апошнія сведкі».

## *Антон* АЛЕШКА



Антон Антонавіч Алешка нарадзіўся 1.2.1913 г. у вёсцы Балотчыцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў у 1931 г. двухгадовыя педагагічныя курсы пры Слуцкім педагагічным тэхнікуме і да 1935 г. настаўнічаў у мястэчку Лапічы Асіповіцкага раёна. Скончыў Ваенна-медыцынскую акадэмію імя С. М. Кірава (1941). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны — на фронце, спачатку на Заходнім, а потым на 3-м Беларускім. Пасля вайны служыў ваенным урачом у ваенна-паветраных сілах. Дэмабілізаваўся ў 1963 г. Жыў у Мінску. Член СП СССР з 1951 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 13.9.1971 г.

Першыя апавяданні надрукаваў у 1932 г. У 1938—1939 гг. часопіс «Полымя» змясціў некалькі апавяданняў і аповесць «Маладосць». Выйшлі кнігі аповесцей і апавяданняў «Раніца» (1949), «Іх першых вітае сонца» (1957), «Пяць сутак» (1959), «Над намі мільён вышыні» (1965), раман «Дарогі без слядоў» (1969), «Неба на замку» (выбранае, 1974, 1984).

## *Мікалай* АЛЯКСЕЕЎ



Мікалай Іванавіч Аляксееў нарадзіўся 17.12. 1898 г. у горадзе Пецярбургу (Расія) у сям'і дворніка.

Рана асірацеў, у дзесяць гадоў стаў вучнем, падручным, потым працаваў электраманцёрам у тэхнічных канторах Пецярбурга, на трыкатажнай фабрыцы «Керстэн» і Абухаўскім заводзе. У жніўні 1915 г. прызваны ў армію. На Заходнім фронце быў паранены. Прымаў удзел у Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях і грамадзянскай вайне. У 1918—1958 гг. у Савецкай Арміі — прайшоў шлях ад радавога байца да генерал-маёра. Скончыў Акадэмічныя курсы вышэйшага каманднага саставу пры Ваенна-інжынернай акадэміі (1935). Удзельнічаў у баях на

Хасане. У час Вялікай Айчыннай вайны — начальнік аддзела кадраў Заходняга і 3-га Беларускага франтоў. Пасля звальнення ў запас з пасады начальніка Далёкаўсходняга суворaўскага вучылішча (1958) жыў у Мінску. Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, пяццю ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Кутузава II ступені, Айчыннай вайны I і II ступеняў, «Знак Пашаны», крыжам Грунвальда III класа і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1980).

Памёр 12.8.1985 г.

Выступаў у друку з 1939 г. Пісаў на рускай мове. Аўтар раманаў «Яков Железнов» (Масква, 1946), «Испытание» (Курск, 1957), «По зову сердца» (1974), аповесцей «Вот так-то, Николай!» (зборнік «Люди высокого долга», 1964), «Сухарь» (1971), дакументальнай кнігі «Навстречу Победе» (з Н. І. Крыловым і І. Г. Драганом, Масква, 1970) і дакументальнай аповесці «Осколком оборванная жизнь» (Масква, 1978). Напісаў п'есу «Сестра Варвара» (пастаўлена ў 1960).

---

## *Мікола АЛЯХНОВІЧ*



Мікола (Мікалай Мікалаевіч) Аляхновіч нарадзіўся 21.4.1903 г. у горадзе Барысаве Мінскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1920 г. скончыў восем класаў Барысаўскай мужчынскай гімназіі. Прымаў удзел у барацьбе з замежнымі інтэрвентамі на тэрыторыі Беларусі. Вучыўся на медыцынскім факультэце (1921—1924), а ў 1930 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, настаўнічаў (1925—1930). У 1925—1927 гг.— кіраўнік Барысаўскай філіі «Маладняка». У 1930—1932 гг.— аспірант, у 1932—1934 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. Адначасова працаваў выкладчыкам Мінскага вышэйшага педінстытута (1933—1936). У 1936 г. быў рэпрэсіраваны. Адбываў ссылку на Калыме (1938—1942). На

пасяленні ў Іркуцкай і Карагандзінскай абласцях працаваў урачом. У 1957 г. рэабілітаваны. Жыў у Ленінградзе.

Памёр 9.4. 1959 г.

Друкавацца пачаў у 1919 г., як крытык выступаў з 1926 г. Аўтар артыкулаў і рэцэнзій пра творчасць А. Александровіча, М. Багдановіча, М. Зарэцкага, Я. Коласа, Р. Мурашкі, П. Труса, Я. Скрыгана, А. Пушкіна, М. Горкага і інш.

---

## *Францішак АЛЯХНОВІЧ*



Францішак Каролевіч Аляхновіч нарадзіўся 9.3.1883 г. у горадзе Вільні ў сям'і музыканта.

Вучыўся ў віленскай гімназіі, хіміка-тэхнічнай школе, Драматычнай школе (Кракаў), школе Музычнага таварыства (Варшава). З 1904 г. ездзіў па Польшчы з вандроўнай тэатральнай трупай. У 1908 г. вярнуўся ў Вільню, працаваў рэпарцёрам у польскіх газетах. Выдаваў гумарыстычны часопіс «Пэркунас», у якім змясціў антыцарскі артыкул. Быў прыцягнуты да адказнасці, але ўцёк у Галіцыю, дзе іграў у розных тэатрах. У 1913 г. (пасля амністыі з нагоды святкавання 300-леццям дома Раманавых) вярнуўся ў Вільню. Але за антырэлігійны выпад у тым жа артыкуле быў прыгавораны да года турэмнага зняволення. Выйшаўшы на волю, працаваў мулярам, пажарным, настаўнікам, наладжваў тэатральныя прадстаўленні. У 1918 г. прабраўся праз лінію фронту ў Мінск. У 1919—1920 гг.— дырэктар і галоўны рэжысёр мінскага «Беларускага тэатра». З 1920 г. жыў у Вільні. У 1921—1923 гг. рэдагаваў газету «Беларускі звон». У 1926 г. нелегальна перайшоў у БССР і хутка быў арыштаваны і сасланы на 10 год на Салавецкія астравы. У 1933 г. быў абменены ўладамі на заходнебеларускага палітвязня Б. Тарашкевіча. Вярнуўся ў Вільню, выступаў у польскай газеце «Слова» з артыкуламі аб беларускім тэатры і драматургіі.

У час фашысцкай акупацыі рэдагаваў калабарацыяністкі тыднёвік «Беларускі голас» (1942—1944).

3.3.1944 г. забіты невядомымі на кватэры ў Вільні.

У друку пачаў выступаць з 1917 г. (газета «Гоман»). Драматург, празаік, паэт, публіцыст. Супрацоўнічаў таксама ў газетах і часопісах «Беларускае жыццё», «Грамадзянін», «Рунь». Асобнымі выданнямі выйшлі п'есы «Каліс», «На вёсцы», «Страхі жыцця» (усе — Вільня, 1919, апошняя пастаўлена ў 1918), «Цені» (1920, пастаўлена ў 1919), «Заручыны Паўлінкі» (Вільня, 1921, пастаўлена ў 1918), «Няскончаная драма» (Вільня, 1922), «Птушка шчасця» (пастаўлена ў 1920), «Шчаслівы муж» (Вільня, 1922), «Пан міністар» (Вільня, 1924), «Дрыгва» (Вільня, 1925), казка ў 1 акце для дзяцей «У лясным гушчары» (Рыга, 1932, пастаўлена ў 1917). У зборніках, перыядычным друку апублікаваны п'есы, драматычныя абразкі «Манька», «Чорт і баба» (пастаўлена ў 1918), «Базылішк», «Перад святам», «На Антокалі» (усе ў 1918), «Дзядзька Якуб», «На вёсцы» (абедзве ў 1919), «Лес шуміць» (1920), «Бутрым Няміра» (1918, пастаўлена ў 1918), «Круці ні круці, а трэба памярці» (пастаўлена ў 1943). Напісаў аповесці «Пісьмы да яе» (газета «Гоман», 1918), «Страшны суд» (часопіс «Новы шлях», 1944). Даследаванне «Беларускі тэатр» (Вільня, 1924), кнігу ўспамінаў «У кіпцюрох ГПУ» (Вільня, 1937).

---

## *Серафім* АНДРАЮК



Серафім Антонавіч Андраюк нарадзіўся 10.3.1933 г. у вёсцы Градзялі Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сялянскай сям'і.

У 1945 г. разам з бацькамі пераехаў у вёску Бербашы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1957). Працаваў выкладчыкам у Крываносаўскай сярэдняй школе Старадарожскага раёна Мінскай вобласці. У 1965 г. скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. У 1966—1981 гг.— навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. З 1981 г.— галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1972 г.

Выступае ў друку як крытык і літаратуразна-

вец з 1964 г. Выдаў манаграфіі «Жыццё. Літаратура. Героі» (1973), «Традыцыі і сучаснасць» (1981), зборнікі крытычных артыкулаў «Вывяраючы жыццём» (1976), «Жыць чалавекам» (1983), нарыс творчасці І. Пташнікава «Чалавек на зямлі» (1988). Адзін з аўтараў «Истории белорусской советской литературы» (1977).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1984, за кнігу «Жыць чалавекам»).

---

## *Уладзімір* АНІСКОВІЧ



Уладзімір Ігнатавіч Анісковіч нарадзіўся 25.10. 1932 г. у вёсцы Гасцілавічы Лагойскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў рамеснае вучылішча ў Мінску (1950). Працаваў токарам і наладчыкам на Мінскім трактарным заводзе (1950—1958). Служыў на Балтыйскім ваенна-марскім флоце (1952—1956), пасля працаваў вадзіцелем тралейбуса ў Мінску (1958—1969). Скончыў завочна факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1971). Працаваў рэдактарам на Беларускім радыё (1969—1971). У 1971—1975 гг.— літсупрацоўнік аддзела мастацтва і крытыкі часопіса «Неман», у 1975—1982 гг.— загадчык аддзела крытыкі і бібліяграфіі газеты «Літаратура і мастацтва», у 1982—1984 гг.— супрацоўнік часопіса «Родная прырода». З 1985 г.— рэдактар выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1979 г.

Узнагароджаны медалём.

У 1965 г. апублікаваў першы нарыс. Пераклаў з балгарскай мовы на беларускую раманы І. Давыдкава «Белы конь за акном» (1981) і А. Гуляшкі «Вандроўнік блукае па свеце» (1988), аповесці С. Страціева «Кароткае сонца» («Даляглядь», 1979), Г. Мішава «Зроблена ў правінцыі» («Даляглядьі», 1981), П. Вежынава «Вышэй за ўсё» і «Бар'ер» (1983), П. Незнакомава «Таямнічы карабель» (зборнік «Такая любоў», 1987), паасобныя творы іншых аўтараў. Выйшлі таксама ў перакладзе з балгарскай мовы творы для дзяцей «Жыў-быў хлопчык» А. Стаянава (1970), «Незвычайныя прыгоды Ліска» Б. Апрылава (1977), «Цмок»

Н. Хайтава (1978), «Неверагодныя прыгоды Жыўкі» М. Лакатніка (1981), «Маленькі вадалаз» Д. Цончава (1982), «Мы, верабейкі» І. Радзічкава (1983), «Пан Трымай Мой Парасон» І. Мілева (1986).

---

## *Іван* АНОШКІН



Іван Архіпавіч Аношкін нарадзіўся 21.1.1928 г. у вёсцы Антонаўка Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Суражскае педагагічнае вучылішча Бранскай вобласці (1947). Працаваў выхавацелем Далісіцкага дзіцячага дома на Браншчыне, адказным сакратаром рэдакцыі суражскай раённай газеты «Маяк коммуны». У 1948 г. пераехаў на Брэстчыну, дзе працаваў загадчыкам Мышчыцкай пачатковай школы Жабінкаўскага раёна, адказным сакратаром рэдакцыі жабінкаўскай раённай газеты «Ленинский путь», карэспандэнтам абласной газеты «Заря». У 1956 г. скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ, у 1964 г.— завочна гістарычны факультэт Магілёўскага педінстытута. Рэдагаваў чэрыкаўскую раённую газету «Сацыялістычная перамога». З 1959 г.— літсупрацоўнік, з 1968 г.— загадчык аддзела абласной газеты «Магілёўская праўда», а з 1981 г.— сакратар Магілёўскага абласнога аддзялення СП БССР. Член СП СССР з 1965 г.

Узнагароджаны медалём.

Літаратурнай працай займаецца з 1951 г. Першую кніжку апавяданняў і гумарэсак «Лішні мінус» выдаў у 1959 г. Затым выйшлі зборнікі аповесцей і апавяданняў «Старыя знаёмыя» (1963), «Брантазаўр» (1973), «Компас паказвае на захад» (1976), «Землякі» (1979), «Херувім з чорнымі крыламі» (апавяданні і гумарэскі, 1984), «Курам не да смеху» (апавяданні і гумарэскі, 1985), «Чырвоная каліна стаяла...» (1985). Аўтар кніг для дзяцей «Навічок» (1966), «Алёнчын сакрэт» (1969), «Антонаў ясень» (1981).

## *Лідзія* АРАБЕЙ



Лідзія Львоўна Арабей нарадзілася 27.6.1925 г. у вёсцы Нізок Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых.

У час Вялікай Айчыннай вайны жыла ў Шчучыне Гродзенскай вобласці (1942—1944). Пасля вызвалення (1944) — супрацоўнік рэдакцыі шчучынскай раённай газеты «Чырвоны сцяг». З 1945 г. жыве ў Мінску. Працавала ў часопісе «Вожык», у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», настаўнічала. У 1951 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, у 1954 г.— аспірантуру пры Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР. Была старшым рэдактарам выдавецтва «Беларусь» (1955—1967), літсупрацоўнікам часопіса «Полымя» (1967—1974). Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1958 г.

Літаратурную працу пачала ў 1945 г. Выступае як празаік, крытык, літаратуразнавец. У 1956 г. выдала даследаванне «Цётка (Алаіза Пашкевіч)», у 1959 г.— крытыка-біяграфічны нарыс «Хвядос Шынклер». Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Мера часу» (1962), «Экзамен» (1963), «Ларыса» (1964), «Ваўчкі» (1972), «Сярод ночы» (1968), «На другой зіме вайны» (1968), «Мне трэба ехаць» (1974), «Паласа дажджу» (1984), «Пошукі кахання» (1987), дакументальных аповесцей пра Цётку «На струнах буры» (1967) і «Стану песняй» (1977), раманаў «Іскры ў папялішчы» (1970) і «Сузор'е Вялікай Мядзведзіцы» (1980), кнігі сатыры і гумару «Кватэра № 3» (1961). Выдала зборнікі апавяданняў для дзяцей «Калібры» (1960), «Ісці ў разведку» (1989) і аповесць «Сіні бор» (1972). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1985).

Пераклала раман эстонскага пісьменніка А. Хінта «Бераг вятроў» (з А. Раманоўскай, 1960).

## *Іван АРАБЕЙКА*



Іван Сяргеевіч Арабейка нарадзіўся 26.3.1942 г. у вёсцы Хмелева Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1964 г. скончыў хіміка-тэхналагічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута. Тры гады працаваў на шклозаводзе «Нёман». З 1968 г. у Брэсце — майстар змены на заводах зборнага жалезабетону (1968—1969), газавай апаратуры (1971—1973), выкладчык інжынерна-будаўнічага інстытута (1969—1970), галоўны інжынер спецкамбіната камунальна-бытавога абслугоўвання (1973—1975). З 1975 г.— старшы эксперт Брэсцкага аддзялення Гандлёва-прамысловай палаты БССР. Член СП СССР з 1979 г.

Першы верш надрукаваў у 1963 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Услед за сонцам» (1972), «Асенні ранак» (1978).

## *Уладзімір АРЛОЎ*



Арлоў Уладзімір Аляксеевіч нарадзіўся 25.8.1953 г. у горадзе Полацку ў сям'і служачых.

Скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1975). Выкладаў гісторыю ў школе ў Наваполацку (1975—1976). З 1976 г. працаваў у рэдакцыі гарадской наваполацкай газеты «Хімік» — карэспандэнтам, загадчыкам аддзела, намеснікам рэдактара. З 1988 г.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Віцэ-прэзідэнт Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1986 г.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

У друку выступае з 1976 г. Першыя творы змясціў у самвыдатаўскіх альманахах «Блакітны ліхтар» і «Мілавіца». Аўтар кніг апавяданняў і аповесцей «Добры дзень, мая Шыпшына» (1986), «Дзень, калі ўпала страла» (1988), навукова-папулярнай кнігі «Асветніца з роду Усяслава» (1989).

Пераклаў з рускай мовы гісторыка-этнаграфічны нарыс М. Улашчыка «Была такая вёска» (1989).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1986) за кнігу «Добры дзень, мая Шыпшына».

---

## *М. АРОЛ*



М. Арол (Сцяпан Язэпавіч Пяцельскі) нарадзіўся каля 1890 г. у мястэчку Гарадок Беластоцкага павета Беластоцкага ваяводства (цяпер Польшча) у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння царкоўна-настаўніцкай школы ў Ялоўцы (Беласточчына, 1909) вучыў дзяцей у Ялоўцы, Гарадку, пазней у Струзе (цяпер Мастоўскі раён, 1910—1912) і Парэччы на Гродзеншчыне. У 1913—1914 гг. жыў на Ковеншчыне. На пачатку першай сусветнай вайны мабілізаваны ў армію. Прымаў удзел у баявых дзеяннях. У верасні 1917 г. знаходзіўся са сваёй часцю на Украіне.

Узнагароджаны Георгіеўскім крыжам.

Памёр у канцы 1917 г. ці ў пачатку 1918 г. ад тыфу.

З першым вершам выступіў у друку ў 1909 г. (газета «Наша ніва»). Паэтычныя і публіцыстычныя творы пісьменнік публікаваў у «Беларускім календары «Нашай нівы», часопісе «Лучынка» і іншых беларускіх выданнях. Падрыхтаваў кніжку паэзіі «Лірнік» і ў 1913 г. паслаў у Віленскае выдавецкае таварыства, але выхаду яе перашкодзіла першая сусветная вайна. Асобныя творы змешчаны ў кнігах «Хрэстаматыя новай беларускай літаратуры» (Вільня, 1927), «Беларуская дакастрычніцкая паэзія» (1967), у «Беларускім календары» (Беласток, 1979).

На беларускую мову перакладаў творы В. Бялінскага.

## *Мікола АРОЧКА*



Мікола (Мікалай Мікалаевіч) Арочка нарадзіўся 10.12.1930 г. у вёсцы Вецявічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1951 г. скончыў Азярніцкую сярэднюю школу Слонімскага раёна і паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння універсітэта (1956) працаваў у часопісе «Сельская гаспадарка Беларусі» (1956—1960) і ў газеце «Літаратура і мастацтва» (1962). У 1966 г. скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1966 г.— навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Доктар філагічных навук. Член СП СССР з 1958 г.

У друку з вершамі пачаў выступаць з 1949 г. (баранавіцкая абласная газета «Чырвоная звязда»). Аўтар кніжак паэзіі «Не ўсе лугі пакошаны» (1958), «Ветраломная паласа» (1962), «Крылатае семя» (1967), «Кветкі бяссмертніка» (1972), «Матчына жыта» (1978), «Колас на ржышчы» (1980), «Бяздоннае» (1985), «Падземныя замкі» (1986), драматычных паэм «Курганне. Крэва» (1982), «Судны дзень Скарыны» (1990), кніжкі вершаў для дзяцей «У птушынай вёсцы» (1964) і аповесці «Хай расце маладая таполя» (1964).

Выдаў крытыка-літаратуразнаўчыя кнігі «Валянцін Таўлай» (1969), «Галоўная служба паэзіі» (1974), «Беларуская савецкая паэма» (1979), «Саюз часу і майстэрства» (1981), «Максім Танк: Жыццё ў паэзіі» (1984), «Поэзия и война» (1987). Адзін з аўтараў «Истории белорусской советской литературы» (1977).

Выступае як перакладчык з рускай, латышскай, польскай, англійскай моў.

*Наталля* **АРСЕННЕВА**



Наталля Аляксееўна Арсеннева нарадзілася 20.9.1903 г. у горадзе Баку (Азербайджан) у сям'і служачага.

Пасля заканчэння 1-й Віленскай беларускай гімназіі (1921) паступіла на гуманістычны факультэт Віленскага універсітэта. У сувязі з пераводам мужа ў Хелмно (Польшча) у 1922 г. вымушана была пакінуць вучобу. У 1939 г. апынулася ў БССР, працавала ў вілейскай абласной «Сялянскай газеце». Як жонка польскага афіцэра з двума сынамі выслана на пачатку 1940 г. у Казахстан. Працавала там у калгасе. Паводле хадайніцтва СП БССР, вярнулася ў маі 1941 г. на Беларусь. У час Вялікай Айчыннай вайны апынулася пад акупацыяй, працавала ў «Менскай (Беларускай) газэце». У 1944 г. кіравала аддзелам літаратуры Беларускага культурнага згуртавання. У сувязі з наступленнем Савецкай Арміі (1944) выехала з мужам у Германію, дзе знаходзілася нейкі час у лагеры для перамешчаных асоб. З 1950 г. жыве ў ЗША.

Першы верш у беларускім друку апублікавала ў 1920 г. (газета «Наша думка»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Пад сінім небам» (Вільня, 1927), другі зборнік «Жоўтая восень» не паспеў выйсці з-за вайны, «Сягоньня» (Мінск, 1944), «Між берагамі» (Нью-Йорк — Таронта, 1979).

Апублікавала п'есу «Сваты» (1955), шэраг абразкоў. Напісала лібрэта да опер М. Шчаглова «Лясное возера», «Усяслаў Чарадзей» і да яго ж аперэты «З выраю», шэраг тэкстаў для песень.

Пераклала на беларускую мову драму Г. Гаўптмана «Затонуты звон» (1948—1954, пастаўлена ў 1943 у Мінску), «Евангельскі хрысціянскі сьпеўнік» (Мінск, 1943), лібрэта опер «Вяселле Фігаро», «Чарадзейная жалейка» В.-А. Моцарта, «Вольны стралец» К.-М. Вэбера, «Кармэн» Ж. Бізэ, «Цыганскі барон» І. Штраўса, тэксты арый да «Яўгенія Анегіна» П. Чайкоўскага, пралог да «Рамэо і Джульеты» У. Шэкспіра, раздзелы з «Дзядоў», «Пана Тадэвуша» А. Міцкевіча, асобныя вершы І.-В. Гётэ і інш.

## *Надзея* АРТЫМОВІЧ



Надзея Еўдакімаўна Артымовіч нарадзілася 18.2.1946 г. у вёсцы Аўгустова Бельска-Падляшскага павета Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сям'і служачага.

У 1964 г. скончыла Беларускі ліцэй у Бельску-Падляшскім. У 1965—1967 гг. вывучала русістыку ў Настаўніцкай студыі ў Беластоку, затым — беларускую філалогію ў Варшаўскім універсітэце. Пасля заканчэння універсітэта (1972) працавала як руска-польскі перакладчык у Інстытуце прамысловага дызайну (Варшава). У 1979 г. вярнулася ў Бельск-Падляшскі. Да 1983 г. працавала ў мясцовым Доме культуры. Член літаратурнага аб'яднання «Белавежа». Кандыдат у члены Саюза польскіх пісьменнікаў з 1986 г.

Дэбютавала як паэт у 1970 г. (газета «Ніва», Беласток). Першы зборнік вершаў «У сне, у болю слова» (1979) выйшаў у перакладзе на польскую мову ў Беластоку. Там жа выйшлі зборнікі паэзіі «Роздумы» (1981), «Сезон у белых пейзажах» (1990).

## *Алесь* АСІПЕНКА



Алесь (Аляксандр Харытонавіч) Асіпенка нарадзіўся 7.9.1919 г. у вёсцы Пушкары Віцебскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся на гістарычным факультэце Віцебскага педагагічнага інстытута (1939—1940). Настаўнічаў у Рудаках пад Віцебскам (1940—1941). У 1942 г.— партызан, памочнік камісара па камсамолу партызанскага атрада № 7 брыгады Аляксея Данукалава на Віцебшчыне. У снежні 1942 г. адпраўлены за лінію фронту — лячыўся ў шпіталі, вучыўся ў школе партызанскага руху, на партыйна-савецкіх курсах. У 1943 г. накіраваны на камсамольскую работу ў Горацкі раён Магілёўскай вобласці. З 1944 г.— карэспандэнт, літсупрацоўнік, загадчык аддзела, намеснік рэдактара, з 1952 г.— рэдактар газеты «Чырвоная змена». У 1955 г.

завочна скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. У 1953—1972 гг.— загадчык аддзела, адказны сакратар, намеснік галоўнага рэдактара, галоўны рэдактар часопіса «Маладосць». У 1972—1976 гг.— галоўны рэдактар сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм», у 1976—1980 гг.— галоўны рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступені, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны работнік культуры БССР (1979).

Першае апавяданне надрукаваў у 1945 г. Выйшлі ў свет зборнікі апавяданняў і аповесцей «Лёд растае» (1958), «Подых кветак і працы» (1960), «Дарога ў даль» (1962), «Крокі» (1971), «Парогі» (1973), «Абжыты кут» (1964), «Жыта» (1968), «Канец бабінага лета» (1975), «Два дні і дзве ночы» (1977), «Пяцёра адважных» (1985), раманы «Вогненны азімут» (1966), «Непрыкаяны маладзік» (1974, поўнае выданне ў 1982), «Святыя грэшнікі» (1988). У 1979 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2-х, у 1989—1990 гг.— у 3 тамах.

Зрабіў літаратурны запіс кнігі А. Дзенісевіча «Орлиное племя» (1970). Аўтар сцэнарыяў мастацкіх фільмаў «Пяцёра адважных» (1971), «Канец бабінага лета» (1982), «Трывогі першых птушак» (1986). Сааўтар сцэнарыяў мастацкіх фільмаў «Ясь і Яніна» (з С. Паляковым, 1974), «Трэцяга не дадзена» (з І. Балгарыным і М. Пяцігорскай, 1980), «Кожны трэці» (з Н. Сафаравым, 1980).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1974) за літаратурны запіс кнігі А. Дзенісевіча «Орлиное племя» , Літаратурнай прэміі імя І. Мележа (1981) за раман «Непрыкаяны маладзік».

## *Алесь* АСТАПЕНКА



Алесь (Аляксандр Кірылавіч) Астапенка нарадзіўся 14.7.1920 г. у вёсцы Сырская Буда Кармянскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Да Вялікай Айчыннай вайны скончыў тры курсы літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Адначасова працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда». У час Вялікай Айчыннай вайны — рэдактар і дыктар беларускай рэдакцыі Усесаюзнага радыёкамітэта (Масква), удзельнічаў у баях на Заходнім і Бранскім франтах. Улетку 1943 г. пад Арлом быў цяжка паранены. З восені 1943 г. зноў працаваў на радыё ў Маскве. Вярнуўшыся ў Мінск, загадваў аддзелам літаратуры і мастацтва газеты «Чырвоная змена» (1946—1947), аддзелам піянерскага жыцця часопіса «Бярозка» (1947—1953). Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Памёр 20.7.1970 г.

У 1940 г. выступіў з рэцэнзіямі і артыкуламі. Першы верш апублікаваў у 1942 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Выпрабаванне» (1947, дапоўненае выданне ў 1980), «Дзень маёй Радзімы» (1952), «Выбранае» (1957), «Сэрца спявае» (1960). Паасобныя вершы пакладзены на музыку.

Перакладаў на беларускую мову творы рускіх, украінскіх, літоўскіх, латышскіх, нямецкіх паэтаў, а таксама грузінскія казкі.

## *Змітрок* АСТАПЕНКА



Змітрок (Дзмітрый Емяльянавіч) Астапенка нарадзіўся 10.11.1910 г. у вёсцы Калеснікі Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні (Цяпер Хіславіцкага раёна Смаленскай вобласці) у сям'і настаўніка.

У 1929 г. скончыў Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум. Працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет і часопісаў. Пасля жыў у Маскве, працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў 252-й школе. У 1936 г. арыштаваны і асуджаны

на 8 год пазбаўлення волі. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны — на фронце.

Загінуў 7.10.1944 г. у Карпатах.

Першыя вершы надрукаваў у 1926 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «На ўсход сонца» (1931), «Краіне» (1931), «Абураныя» (1932), «Выбранае» (1957, уключана паэма «Эдэм»), «Вершы і паэмы» (1968), кніжка-малюнак для дзяцей «Трактар» (1933), зборнік «Як шум дажджу» з друку не выйшаў, захаваліся толькі гранкі.

Пісаў апавяданні. Аўтар навукова-фантастычнага рамана «Вызваленне сіл» (часопіс «Маладняк», 1932).

Пераклаў раманы М. Горкага «Маці» (1932), Л. Первамайскага «Ваколіцы» (1931, разам з М. Багуном), аповесці П. Голубева «Завіруха» (1930), М. Дончанкі «Ударны атрад» (1932), творы іншых рускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў.

---

## *Алесь АСТАШОНАК*



Алесь (Аляксандр Мікалаевіч) Асташонак нарадзіўся 1.6.1954 г. у Мінску ў сям'і рабочых.

Скончыў перакладчыцкі факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў (1976). Працаваў перакладчыкам на будоўлі металургічнага камбіната ў пасёлку Эль-Хаджар (Алжыр). У 1978—1979 гг. служыў у Савецкай Арміі, у 1980—1981 гг.— інспектар дэканата па працы з замежнымі навучэнцамі і выкладчык французскай мовы Беларускага політэхнічнага інстытута, у 1981—1982 гг.— выхавацель у тэхнічным вучылішчы будаўнікоў № 31, у 1982 — 1984 гг.— рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Упраўлення тэатраў і музычных устаноў Міністэрства культуры БССР, у 1984—1986 гг.— рэдактар у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя П. Броўкі. З 1988 г.— старшы рэдактар часопіса «Крыніца» («Родник»). Член СП СССР з 1986 г.

Друкавацца пачаў у 1981 г. Аўтар кнігі прозы «Фарбы душы» (1989), п'ес «Іскры ўначы» (пастаўлена ў 1982, апублікавана ў 1986), «Камедыянт, ці Узнёсласць сумнай надзеі» (пастаўлена ў 1984, апублікавана ў 1985), сцэнарыяў тэлевізійных мастацкіх фільмаў «Ка-

медыянт» (1987), «Сон» (кароткаметражны паводле ўласнага апавядання «Чарга», 1989; прыз Саюза кінематаграфістаў СССР на XIII Усесаюзным фестывалі тэлевізійных фільмаў, 1989; першае месца ў конкурсе ў рамках Тыдня міжнароднага кіно ў Тэруэлі, 1989, Іспанія).

Перакладае з французскай, англійскай, літоўскай моў. Пераклаў раманы «Порт туманаў» Ж. Сіменона («Сучасны замежны дэтэктыў», 1988), «Планета малпаў» П. Буля («Сучасная замежная фантастыка», 1990), п'есы «Улюбёнец публікі» С. Палякова (пастаўлена ў 1985), «Жаночы стол у паляўнічай зале» В. Мярэжкі (пастаўлена ў 1988), «Матылёчак, матылёчак...» А. Нікалаі (пастаўлена ў 1988), аповесць Веркора «Маўчанне мора» («Даляглядьі», 1987), аповесці Ж. Сіменона «Пад страхам смерці» (часопіс «Беларусь», 1988), «Дзяўчына і бясхвостыя парсючкі» («Даляглядьі», 1989) і іншыя творы замежных пісьменнікаў. Сумесна з В. Грыгалюнасам пераклаў з літоўскай мовы асобныя апавяданні Б. Радзявічуса, М. Слуцкіса, С. Шальцяніса.

---

## *Анатоль* АСТРЭЙКА



Анатоль (Акім Пятровіч) Астрэйка нарадзіўся 24.7.1911 г. у вёсцы Пясочнае Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў двухгадовыя настаўніцкія курсы пры Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме (1930), вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута (1932—1934). З 1930 г. працаваў у газетах Полацка, Оршы, Горак, Мінска. У час Вялікай Айчыннай вайны быў адказным сакратаром сатырычнай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». Двойчы (1942, 1943) накіроўваўся на акупіраваную тэрыторыю Беларусі. У 1946—1948 гг.— старшыня Гродзенскага аддзялення СП БССР, у 1948—1953 гг.— адказны сакратар часопіса «Вожык». Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 23.8.1978 г.

Вершы пачаў друкаваць у 1929 г. Першы зборнік вершаў «Слава жыццю» выдадзены ў 1940 г. Рукапіс другога зборніка — «Квецень» згарэў у час вайны ў Мінску. У 1943 г. друкарня слуцкай падпольнай газеты «Народны мсцівец» выпусціла зборнік «Слуцкі пояс». У пасляваенныя гады выйшлі кнігі паэзіі «Крамлёўскія зоры» (1945), «Добры дзень» (1948), «Зямля мая» (1952), «Песня дружбы» (1956), «Бацька мой Нёман» (1961), «Сэрца насцеж» (1965), «Цвіціце, верасы» (1975), «Зямная Случчына» (1977), «Ураджай цяпла» (1978), «Памяць дарог» (1980), а таксама вершаваная казка «Елка» (1949) і паэма для дзяцей «Прыгоды дзеда Міхеда» (1956). Выдадзены Выбраныя творы ў 2 тамах (1970, 1981).

Перакладаў творы пісьменнікаў народаў СССР на беларускую мову. Аўтар тэкстаў многіх беларускіх песень.

---

## *Сяргей* АСТРЭЙКА



Сяргей Адамавіч Астрэйка нарадзіўся 9.7. 1912 г. у вёсцы Каласаўшчына Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум (1930). Быў рэдактарам у Беларускім навукова-даследчым інстытуце прамысловасці, а ў 1932—1933 гг.— навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР (працаваў у слоўнікавай камісіі). У 1933 г. арыштаваны і асуджаны да пяці гадоў высылкі. Пакаранне адбываў у г. Ірбіт Свярдлоўскай вобласці. Працаваў бухгалтарам матэрыяльнага аддзела Ірбіцкага падшыпнікавага завода. У 1937 г., не адбыўшы тэрміну, арыштаваны паўторна. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957 г.

Расстраляны 14.9.1937 г.

Першыя паэтычныя творы апублікаваў у 1928 г. на старонках газеты «Чырвоная змена». Вершы друкаваліся ў часопісах «Полымя» (1930, 1931, 1965), «Чырвоная Беларусь» (1931, 1932), зборніку «Дзень паэзіі» (1965). Рукапіс першага зборніка «Смарагды кроз» не ўбачыў свету з-за арышту, рукапіс паэмы «Бенгалія» загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны.

## *Мікола* АЎРАМЧЫК



Мікола (Мікалай Якаўлевіч) Аўрамчык нарадзіўся 14.1.1920 г. у вёсцы Плёсы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1938 г. паступіў на філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, адначасова працаваў у рэдакцыі газеты «Піянер Беларусі». У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Паўночна-Заходнім і Волхаўскім франтах. Пры акружэнні ў чэрвені 1942 г. быў узяты ў палон і вывезены фашыстамі ў Рур на каменнавугальныя шахты. Пасля вайны працаваў на аднаўленні Данбаса. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1949). Працаваў у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Полымя», у 1953—1980 гг.— рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1980).

Першыя вершы апублікаваў у 1937 г. у бабруйскай газеце «Камуніст». Аўтар кніг паэзіі «Пярэдні край» (1949), «Шляхамі дружбы» (1952), «Ключы жураўліныя» (1960), «Сустрэча былых канагонаў» (1963), «Універсітэцкі гарадок» (1967), «Агледзіны» (1969), «Як на далоні» (1970), «Дрэва дружбы» (1973), «Вадовішча» (1976), рамана «У падзямеллі» (1986), «Анкета: Выбранае» (1990). Выдаў зборнік вершаў для дзяцей «Дружба» (1950). Выйшлі «Выбранае» (1976) і Выбраныя творы ў 2 тамах (1980).

Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы Дж. Байрана, А. Міцкевіча, Л. Украінкі, І. Франка, М. Джаліля, Г. Эміна, зборнікі вершаў С. Міхалкова «А што ў вас?» (1950), В. Бычко «Тры сястры» (1953), паэму М. Нагнібеды «Васілёк» (1961) і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1964) за зборнік «Сустрэча былых канагонаў».

# Б



*Адам* БАБАРЭКА

Адам Антонавіч Бабарэка нарадзіўся 14.10. 1899 г. у вёсцы Слабада-Кучынка Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і беззямельнага селяніна.

Скончыў Мінскую духоўную семінарыю (1918). Настаўнічаў у школах Случчыны. У час белапольскай акупацыі ўдзельнічаў у падпольнай барацьбе, быў пасаджаны ў астрог (1920). Пасля вызвалення Случчыны працаваў настаўнікам, быў членам рэўкома Пукаўскай воласці і загадваў валасным аддзелам народнай асветы. Служыў у Чырвонай Арміі (1921—1922). У 1927 г. скончыў этнолага-лінгвістычнае аддзяленне педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Адначасова з вучобай працаваў у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь», настаўнічаў. Адзін з заснавальнікаў літаратурнага аб'яднання «Маладняк» (1923). Пасля ўтварэння «Узвышша» (1926) — сакратар аб'яднання. У 1926—1929 гг. працаваў у Камуністычным універсітэце Беларусі імя У. І. Леніна выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры, а з 1928 г.— асістэнт кафедры гісторыі беларускай літаратуры БДУ. У 1930 г. рэпрэсіраваны. Год знаходзіўся ў мінскай турме. З 1931 г. жыў у ссылцы ў гарадскім пасёлку Слабадское (Вятчына), з канца 1934 г.— у Вятцы (цяпер г. Кіраў), працаваў бухгалтарам. У ліпені 1937 г. зноў быў арыштаваны і засуджаны тройкай НКУС на 10 гадоў выпраўленча-працоўнага лагера. За першую справу рэабілітаваны ў 1957 г. Вярхоўным судом БССР, за другую — у 1959 г. Кіраўскім абласным судом.

Памёр 10.10.1938 г. у лагернай бальніцы.

З 1920 г. пачалі з'яўляцца на старонках рэспубліканскага друку вершы, апавяданні. У 1925 г. выдаў кнігу «Апавяданні». Распрацоў-

ваў пытанні літаратуразнаўства і эстэтыкі, даследаваў літаратурны працэс (артыкулы змяшчаліся ў часопісах «Маладняк», «Узвышша», «Чырвоны сейбіт», «Радавая рунь» і інш.). Шэраг прац прысвечаны творчасці Я. Коласа, М. Багдановіча, У. Дубоўкі, М. Чарота, З. Бядулі і іншых беларускіх пісьменнікаў.

---

## *Юрый БАГДАНАЎ*



Юрый Міхайлавіч Багданаў нарадзіўся 8.8. 1944 г. у горадзе Горкім (цяпер Ніжні Ноўгарад, Расія) у сям'і служачых.

У 1945 г. разам з бацькамі пераехаў у Баранавічы. Скончыў Мінскае музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі (1964). Працаваў выкладчыкам у Баранавіцкай музычнай школе. Пасля заканчэння Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве (1974) працаваў у Дзяржаўным камітэце БССР па кінематаграфіі інспектарам, намеснікам начальніка Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату. Адначасова на працягу пятнаццаці год быў рэдактарам кінабюлетэня «На экранах Беларусі». У 1988—1990 гг. працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». З 1990 г.— вядучы рэдактар у Міністэрстве культуры БССР. Член СП СССР з 1989 г.

Узнагароджаны медалём.

У друку выступае з 1964 г. Піша на рускай мове. Выйшлі кнігі вершаў «Признак счастья» (1974), «Река времени» (1977), «Взлетное поле» (1981), «Берег вселенной» (1988), а таксама паэма «Красная соль» (альманах «Истоки», Масква, 1983).

Перакладае творы беларускіх паэтаў на рускую мову.

## *Ірына БАГДАНОВІЧ*



Ірына Эрнстаўна Багдановіч нарадзілася 30.4. 1956 г. у горадзе Лідзе Гродзенскай вобласці ў сям'і служачых.

Скончыла гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта (1978), аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1983). З 1983 г.— навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1989 г.

Друкуецца з 1973 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Чаравікі маленства» (1985), «Фрэскі» (1989). Выступае і як крытык, літаратуразнавец. У 1989 г. выйшла манаграфія «Янка Купала і рамантызм».

## *Максім БАГДАНОВІЧ*



Максім Адамавіч Багдановіч нарадзіўся 9.12. 1891 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага, беларускага фальклརыста, этнографа.

Раннія дзіцячыя гады правёў у Гродна (1892—1896), жыў і вучыўся ў Ніжнім Ноўгарадзе (1896—1908) і Яраслаўлі (1908—1916). Скончыў Дзямідаўскі юрыдычны ліцэй у Яраслаўлі (1916) і восенню пераехаў у Мінск. Працаваў сакратаром губернскай харчовай камісіі. У лютым 1917 г., цяжка хворы на сухоты, выехаў на лячэнне ў Ялту.

Памёр 25.5.1917 г.

Першы твор — алегарычнае апавяданне «Музыка» — апублікаваў у 1907 г. (газета «Наша ніва»). У 1913 г. у Вільні выйшаў зборнік вершаў і паэм «Вянок» (2-е выданне, Вільня, 1927, факсімільнае выданне, Мінск, 1985). Напісаў паэмы «Максім і Магдалена», «Страцім-лебедзь». Выступаў і ў жанры прозы («Апокрыф» і інш.). Выдадзены «Выбраныя творы» (1940, 1946, 1952), «Творы» (1957), «Вершы» (1967, 1973, 1981, 1981 — «Школьная бібліятэка»), «Маладзік» (1968), «Выбранае» (1977), «Вянок» (выбранае, 1981), Зборы твораў у 2 тамах (1927—1928, 1968). Для дзяцей выйшла паэма «Мушка-зелянушка і Камарык — насаты тва-

рык» (1940, 4-е выданне ў 1975). У 1970 г. паводле яго твораў пастаўлена опера «Зорка Венера» (лібрэта А. Бачылы, музыка Ю. Семянякі). Многія вершы пакладзены на музыку.

Актыўна выступаў з літаратурна-крытычнымі і публіцыстычнымі артыкуламі. Рэцэнзіі, літаратурна-крытычныя працы прысвечаны творчасці М. Ламаносава, А. Пушкіна, М. Лермантава, К. Рылеева, У. Адоеўскага, Я. Баратынскага, М. Някрасава, А. Талстога, А. Чэхава, І. Франка, В. Брусава, Р. Тагора, Т. Гацье, Т. Шаўчэнкі, У. Самійленкі, а таксама сучасным яму рускім, беларускім і ўкраінскім пісьменнікам.

Перакладаў на беларускую мову творы антычных (Гарацыя, Авідзія), рускіх і заходнееўрапейскіх аўтараў (А. Пушкіна, Ф. Шылера, Г. Гейнэ, П. Верлена, Э. Верхарна, А. Майкава, А. Арвера, М. Розенгейма і інш.), песні розных народаў свету (рускіх, украінскіх, сербскіх, скандынаўскіх, персідскіх, іспанскіх, фінскіх, японскіх). На рускую мову пераклаў творы Т. Шаўчэнкі, Янкі Купалы, І. Франка, В. Стафаніка.

---

## *Міхась БАГУН*



Міхась Багун (Міхаіл Фёдаравіч Блошкін) нарадзіўся 8.11.1908 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага.

У 1928 г. скончыў курсы пры Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме. Настаўнічаў у вёсцы Рожна Лепельскага раёна (1929—1930). З 1931 г. працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная Полаччына», а ў 1932—1936 гг.— у Дзяржаўным выдавецтве БССР і ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». У 1936 г. рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны пасмяротна Вярхоўным судом БССР 29.12.1954 г.

Памёр 17.2.1938 г. (па сведчанні відавочцаў — у снежні 1937).

Першы верш апублікаваў у 1925 г. у газеце «Беларуская вёска». Выйшлі кнігі паэзіі «Рэха бур» (1931), «Рэвалюцыі» (1932), «Выбранае» (1961). Асобным выданнем выйшла апавяданне для дзяцей «Жэнька» (1934).

Пераклаў на беларускую мову раманы Л. Первамайскага «Ваколіцы» (1931, разам з

З. Астапенкам), Ф. Панфёрава «Брускі» (1932, разам з Т. Кляшторным), М. Астроўскага «Як гартавалася сталь» (1936), асобныя творы А. Пушкіна, У. Маякоўскага, Э. Багрыцкага, Я. Гашака, Р. Альберці. На словы М. Багуна напісана шэраг песень.

---

## *Юрый БАГУШЭВІЧ*



Юрый (Георгій Канстанцінавіч) Багушэвіч нарадзіўся 5.5.1917 г. у горадзе Оршы ў сям'і чыгуначніка.

У 1941 г. скончыў факультэт мовы і літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Адначасова працаваў у газеце «Сталинская молодежь». У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі на Калінінскім і Беларускім франтах, з 1943 г.— ваенны карэспандэнт. З 1945 г.— у вайсковай газеце на Далёкім Усходзе (Карэя, Кітай). Пасля дэмабілізацыі (1949) працаваў у рэдакцыях газет «Піянер Беларусі», «Мінская праўда», «Фізкультурнік Беларусі», быў карэспандэнтам газеты «Советский спорт»», літкансультантам СП БССР, галоўным рэдактарам Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і дакументальных фільмаў. Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі, у тым ліку медалём КНДР.

Памёр 18.3.1983 г.

Першыя творы апублікаваў у 1938 г. Пісаў пераважна на рускай мове. Выйшлі аповесці «Побратимы» (1955), «Дерево дружбы» (1959), «Повести и рассказы» (1970), «В городке над Неманом» (1973), «Дырэктар «зялёнай школы» (1975), «Юность пришла» (1977, 1987). Прымаў удзел у напісанні гісторыі заводаў станкабудаўнічага і Мінскага аўтамабільнага.

Напісаў некалькі сцэнарыяў кароткаметражных кінафільмаў, у сааўтарстве з В. Зубам — п'есу «Сябры» (1960, пастаўлена ў 1958).

Пераклаў на рускую мову асобныя творы П. Пестрака, А. Рылько, П. Кавалёва, аповесць Р. Няхая «Сарочы лес», зборнік «Піянеры-героі» (з Б. Бур'янам).

*Алесь БАДАК*



Алесь (Аляксандр Мікалаевіч) Бадак нарадзіўся 28.2.1966 г. у вёсцы Туркі Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочых.

У 1983 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Служыў у Савецкай Арміі (1984—1986). Зноў вучыўся ва універсітэце, які скончыў у 1990 г. Член СП СССР з 1990 г.

З першымі вершамі выступіў у друку ў 1979 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборніка паэзіі «Будзень» (1989).

Выступае ў перыядычным друку з літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі.

*Алесь БАЖКО*



Алесь (Аляксандр Цімафеевіч) Бажко нарадзіўся 22.10.1918 г. у вёсцы Даўгінава Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў музычным інстытуце імя С. Манюшкі ў Навагрудку (1936—1938), у Варшаўскай кансерваторыі (1938—1939). Працаваў дырэктарам мірскага РДК (1940). У гэтым жа годзе прызваны ў Савецкую Армію. Пасля ранення пад Ельняй (1942) працаваў на абаронным будаўніцтве. Удзельнічаў у стварэнні першых адзінак Войска Польскага на тэрыторыі СССР у якасці генеральнага інструктара прапаганды Валагодскага акружнога ўпраўлення Саюза польскіх патрыётаў. З чэрвеня 1945 г.— інструктар Баранавіцкага абкома камсамола, першы сакратар Дзятлаўскага райкома камсамола. Са снежня 1945 г.— на журналісцкай рабоце: літсупрацоўнік баранавіцкай абласной газеты «Чырвоная змена», на абласным радыё, у рэдакцыях рэспубліканскіх газет «Савецкі селянін», «Чырвоная змена», у маладзечанскай абласной газеце «Сталінскі шлях». У 1955 г. завочна скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. З 1956 г.— карэспандэнт, загадчык аддзела пісем газеты «Літаратура і мастацтва». З 1959 г.— намеснік рэдактара газеты «Голас Радзімы», з 1962 г.— загадчык

рэдакцыі мастацкай літаратуры выдавецтва «Беларусь», з 1970 г.— намеснік галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва». У 1973—1977 гг. працаваў дырэктарам Літаратурнага музея Янкі Купалы, у 1977—1978 гг.— галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі і намеснік начальніка Упраўлення па справах мастацтваў Міністэрства культуры БССР. Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1977).

У друку выступіў упершыню з нарысамі і нататкамі ў 1945 г. Першыя вершы апублікаваў у 1947 г. Выйшлі аповесці «Перад вераснем» (1959), «Позняе ворыва» (1963), «Лясныя крушні» (1981), «Жывыя прывіды» (1986), зборнік нарысаў і памфлетаў «Татальнае банкруцтва» (1973), кніга аповесцей «Перад вераснем. Позняе ворыва» (1979).

Выдаў паэмы: «Карвіга пакідае хутар» (1961), «Татры» (1964), «Паэмы» (1968), зборнікі вершаў «Блакітныя вербы» (1973), «Суладдзе» (1975), «Каласы і скалы: Выбранае» (1978). У 1987 г. выйшлі Выбраныя творы (паэмы і вершы). Выступае як перакладчык з польскай і славацкай моў.

---

## *Зінаіда* БАНДАРЫНА



Зінаіда Аляксандраўна Бандарына нарадзілася 11.10.1909 г. у горадзе Гродна ў сям'і настаўніка.

Скончыла Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум (1927), літаратурна-сцэнарны факультэт Інстытута кінематаграфіі ў Маскве (1933), аспірантуру пры Дзяржаўнай акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе (1937). Настаўнічала ў беларускай школе для перасяленцаў у сібірскім пасёлку Медзякова (1927—1928), загадвала аддзелам літаратуры ў газеце «Палеская праўда» (1928—1929, Гомель), сцэнарным аддзяленнем у Віцебскім кінатэхнікуме (1933—1934), працавала ў тэатрах і на кінастудыях Масквы, Архангельска, Горкага. У час Вялікай Айчыннай вайны служыла санінструктарам у дывізіі

Панфілава. У пасляваенныя гады была супрацоўніцай часопіса «Бярозка» і карэспандэнтам Беларускага радыё (1945—1946), дырэктарам Дома народнай творчасці ў Гродна (1946—1948), загадвала філіялам музея Янкі Купалы ў Вязынцы (1948—1950), працавала ў газетах «Зорька», «Літаратура і мастацтва» (1950—1956). Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджана медалямі.

Памерла 16.4.1959 г.

Літаратурную дзейнасць пачала ў 1926 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «Вершы» (разам з Н. Вішнеўскай і Я. Пфляўмбаўм, 1926), «Веснацвет» (1931).

Выступала і ў жанры прозы. На рускай мове напісала аповесці «Дипломная работа» (альманах «Советская Отчизна», 1953) і «Галина Ильина» (1959), на беларускай — аповесць «Шуміць тайга» (часопіс «Маладняк», 1928), аповесць пра дзіцячыя і юнацкія гады Янкі Купалы «Ой, рана на Івана...» (1956, апошняе выданне ў 1979), зборнік апавяданняў для дзяцей «Лясныя госці» (1960).

Пераклала з рускай мовы «Апавяданні пра Пакістан» (1954) М. Ціханава.

---

## *Раіса БАРАВІКОВА*



Раіса Андрэеўна Баравікова нарадзілася 11.5.1947 г. у вёсцы Пешкі Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачага.

Пасля заканчэння Бярозаўскай сярэдняй школы (1965) пачала працаваць у быхаўскай раённай газеце «Маяк Прыдняпроўя» літсупрацоўнікам. Скончыла аддзяленне мастацкага перакладу Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве (1971). Працавала рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм» (1971—1972). У 1972—1977 гг.— карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва», у 1983—1988 гг.— літкансультант рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». Член СП СССР з 1977 г.

У друку выступае з 1960 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Рамонкавы бераг» (1974), «Слухаю сэрца» (1978), «Такое кароткае лета» (1981), «Адгукнуся голасам жалейкі» (1984), «Каханне»

(1987), «Пад небам першага спаткання» (1990).

Напісала аповесць «Кватарантка» (1980). Выйшла кніжка казак і апавяданняў для дзяцей «Галенчыны «Я», альбо Планета Цікаўных Хлопчыкаў» (1990). Перакладае з рускай, украінскай і польскай моў.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова (1988) за кнігу лірыкі «Каханне».

---

## *Рыгор* БАРАДУЛІН



Рыгор Іванавіч Барадулін нарадзіўся 24.2.1935 г. на хутары Верасоўка Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і рабочага.

У 1954 г. скончыў Ушацкую сярэднюю школу, у 1959 г. філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у рэдакцыях газеты «Советская Белоруссия», часопісаў «Бярозка», «Беларусь», «Полымя», з 1969 г. у выдавецтве «Беларусь», з 1972 г. рэдактарам, затым загадчыкам рэдакцыі ў «Мастацкай літаратуры». У 1984 г. у складзе дэлегацыі Беларускай ССР прымаў удзел у рабоце XXXIX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. З 1989 г.— прэзідэнт Беларускага ПЭН-цэнтра. Член СП СССР з 1958 г.

Узнагароджаны ордэнамі Дружбы народаў, «Знак Пашаны», медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

Першыя вершы апублікаваны ў 1953 г. (газета «Чырвоная змена»). Выдаў зборнікі паэзіі «Маладзік над стэпам» (1959), «Рунець, красаваць, наліваццa» (1961), «Нагбом» (1963), «Неруш» (1966), «Адам і Ева» (1968), «Лінія перамены дат» (1969), «Вяртанне ў першы снег» (1972), «Рум» (1974), «Свята пчалы: Выбранае» (1975), «Абсяг» (1978), «Вечалле» (1980), «Амплітуда смеласці» (1983), «Маўчанне перуна» (1986), «Самота паломніцтва» (1990), паэму «Балада Брэсцкай крэпасці» (1975). Творы гумару і сатыры — у кніжках «Дойны конь» (1965), «Станцыя кальцавання» (1971), «Журавінка» (1973), «Прынамсі» (1977), «Бервенізацыя» (1988), «Мудрэц са ступаю» (1988). Разам з мастаком М. Лісоўскім выдаў альбом сяброўскіх шаржаў і эпіграм «Няўрокам кажу-

чы» (1971), а разам з К. Куксом — «Абразы без абразы» (1985). Выйшлі кніжкі паэзіі для дзяцей «Мех шэрых, мех белых» (1963), «Красавік» (1965), «Экзамен» (1969), «Ай! Не буду! Не хачу!» (1971), «Суровая вымова» (1976), «Што было б тады, калі б?» (1977), «Ці пазяхае бегемот?» (1981), «Азбука не забаўка» (1985), «Індыкала-кудыкала» (1986), «Кобра ў торбе» (1990). У 1984 г. выйшлі выбраныя творы ў 2 тамах.

Напісаў кнігу літаратурна-крытычных артыкулаў і эсэ «Парастак радка, галінка верша» (1987).

На беларускую мову пераклаў кнігі — Я. Райніс «Ветрык, вей!» (1965), Ф.-Г. Лорка «Блакітны звон Гранады» (1975), С. Ясенін «Выбранае» (з А. Куляшовым, 1976), С. Паптонеў «Беларусь — белая балада» (з В. Нікіфаровічам, 1979, 1985), А. Вазнясенскі «Небам адзіным» (1980), І. Драч «Мелодыя каліны» (1981), Г. Містраль «Ветраліст» (1984), К. Шэрман «Дождж у Каралішчавічах» (1984), «Слова пра паход Ігаравы» (1986), «Беларусь — маё слова і песня (паэты свету пра Беларусь)» (1987), А. Хаям «Рубаі» (1989), М. Шагал «Паэзія» (з Л. Бярынскім, 1989), Б. Пастарнак «Гарэла свечка...» (1990). Паасобныя творы Шэкспіра, Байрана, Кітса, Кіплінга, Рэмбо, Бёрнса і іншых паэтаў свету ўвайшлі ў кнігу перакладчыка «Кахаць — гэта значыць...» (1986). Пераклаў п'есы Лесі Украінкі «Каменны гаспадар» і Мальера «Тарцюф».

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1976) за паэму «Балада Брэсцкай крэпасці», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1976) за зборнік вершаў «Рум» і кнігу перакладаў выбранай лірыкі Ф.-Г. Лоркі «Блакітны звон Гранады».

## *Сымон БАРАНАВЫХ*



Сымон Баранавых (Сымон Якаўлевіч Баранаў) нарадзіўся 1.9.1900 г. у вёсцы Рудкова Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Юнаком парабкаваў у багатых гаспадароў. У 1920—1923 гг. служыў у Чырвонай Арміі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у роднай вёсцы ў сельсавеце, загадваў хатай-чытальняй. У 1925—1928 гг. вучыўся ў Мінску на рабфаку. У 1931 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў у Беларускім радыёцэнтры, затым адказным сакратаром часопіса «Беларусь калгасная», у бібліятэцы Дома пісьменніка. У 1936 г. арыштаваны. Асуджаны на 10 год зняволення. Рэабілітаваны ў 1954 г. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 10.11.1942 г.

Выступіў у друку спачатку як селькор з карэспандэнцыямі. У 1927 г. апублікаваў першае апавяданне (газета «Чырвоная змена»). Выдадзены зборнік апавяданняў «Злосць» (1930), аповесці «Чужая зямля» (1930), «Межы» (1930), «Новая дарога» (1936), аповесць для дзяцей «Пастка» (1935), раман «Калі ўзыходзіла сонца» (1957), «Дзве аповесці» (1967), «Новая дарога» (апавяданні, аповесці, раман, 1989).

## *Ілары БАРАШКА*



Ілары (Іларыён Мацвеевіч) Барашка нарадзіўся 25.7.1905 г. у горадзе Мінску ў сям'і рабочага.

З 1924 г.— адказны сакратар рэдакцыі часопіса «Полымя». З 1925 г.— рэдактар часопіса «Малады араты», з 1927 г.— намеснік адказнага рэдактара газеты «Чырвоная змена», з 1929 г.— намеснік рэдактара часопіса «Маладняк». Адначасова вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (скончыў у 1930). У 1932—1936 гг. працаваў рэдактарам на студыі Белдзяржкіно ў Ленінградзе. У 1938 г. скончыў Кінаакадэмію і быў прызначаны начальнікам Упраўлення наву-

чальных устаноў Камітэта па справах кінематаграфіі пры СНК СССР. У 1941—1944 гг.— палітработнік у Палітупраўленні Ціхаакіянскага, затым Чарнаморскага ваенна-марскога флоту. Пасля вайны працаваў у Міністэрстве культуры СССР, Міністэрстве культуры РСФСР. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 3.6.1968 г.

У друку выступіў у 1923 г. з апавяданнямі і нарысамі. Выйшлі зборнікі апавяданняў «У прасторы» (1926), «Камунары» (1931), «На розныя тэмы» (1931), аповесць «Рыгор Галота» (1929), казка «Залатыя арэхі» (1930), вершаваны нарыс «Асінстан» (1931), апавяданне для дзяцей «Газета Ганначкі Хаваначкі» (1932) і зборнік апавяданняў «Блізкія далі» (1959).

Выдаў таксама брашуры палітычнага і літаратуразнаўчага зместу: «Шляхам змагання і перамог» (1928), «11 ліпеня — дзень вызвалення ад белапалякаў» (1930), «Буржуазныя плыні ў сучаснай літаратуры» (1930).

Аўтар п'есы «Раманы Зора» (1932) і інш. Разам з Р. Кобецам напісаў сцэнарый мастацкага кінафільма «Дняпро ў агні» (пастаўлены ў 1937), аўтар сцэнарыяў шэрагу дакументальных фільмаў, у тым ліку пра Я. Коласа і Ф. Скарыну.

Пераклаў на рускую мову паасобныя творы К. Крапівы, К. Чорнага, П. Галавача і на беларускую — «Паэмы» У. Сасюры (1930).

---

## *Анатоль* БАРОЎСКІ



Анатоль Мікалаевіч Бароўскі нарадзіўся 12.5. 1942 г. у вёсцы Крушнікі Мазырскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўніка.

Пасля заканчэння Асавецкай сярэдняй школы Мазырскага раёна (1960) працаваў у калгасе, потым на заводзе жалезабетонных вырабаў у Мазыры, настаўнікам пачатковых класаў у вёсцы Турбінка Мазырскага раёна. У 1961—1962 гг.— студэнт Мазырскага педагагічнага інстытута імя Н. К. Крупскай (скончыў завочна ў 1967). У 1962—1964, 1968—1970 гг. служыў у Савецкай Арміі. Працаваў у мазырскай раён-

най газеце «Камуніст Палесся» адказным сакратаром гарадскога таварыства «Веды», інструктарам гаркома партыі, намеснікам дырэктара вучылішча геалогіі (Мазыр). З 1975 г.— уласны карэспандэнт газеты «Чырвоная змена» па Гомельскай і Брэсцкай абласцях. Член СП СССР з 1990 г.

Друкуецца з 1963 г. Аўтар кнігі аповесцей і апавяданняў «Каліна пад акном» (1987), аповесці «Тросніца» (калектыўны зборнік «Знаёмства», 1982). Асобнымі выданнямі выйшлі нарысы «Надзейная змена» (1976), «Мікалай Пушкар» (1985), «Цветут над Припятью сады» (з Ю. Герасіменкам, 1987).

---

## *Алесь БАРСКІ*



Алесь Барскі (Аляксандр Андрэевіч Баршчэўскі) нарадзіўся 2.11.1930 г. у вёсцы Бандары Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сялянскай сям'і.

Скончыў аддзяленне рускай філалогіі філалагічнага факультэта Лодзінскага універсітэта (1955). З 1956 г. працуе на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта, з 1975 г.— загадчык гэтай кафедры. У 1959—1980 гг.— старшыня праўлення Беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа». З 1984 г.— старшыня Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Польшчы. Доктар філалагічных навук. Член Саюза польскіх пісьменнікаў з 1962 г.

Узнагароджаны ордэнамі Залаты крыж Адраджэння Польшчы, Кавалерскі крыж Адраджэння Польшчы і медалямі.

Выступіў упершыню ў друку ў 1956 г. (газета «Ніва», Беласток). Аўтар зборнікаў вершаў «Белавежскія матывы» (Беласток, 1962), «Жнівень слоў» (Беласток, 1967), «Мой бераг» (Мінск, 1975), «Блізкасць далёкага» (Беласток, 1983), «Лірычны пульс» (Мінск, 1987).

Апублікаваў цыкл навукова-папулярных артыкулаў «Беларуская літаратура і беларускі фальклор» (газета «Ніва», 1965—1988). Аўтар універсітэцкіх падручнікаў «Гісторыя беларускай літаратуры — фальклор» (Варшава, 1976), «Гіс-

торыя беларускай літаратуры — пісьменнасць Кіеўскай Русі і Вялікага Літоўскага княства» (1981), падручніка для 7 класа «Дружба і праца» (з В. Шведам, Варшава, 1967), «Насустрач жыццю» (з В. Шведам, Варшава, 1974), навуковых кніг «Беларуская абраднасць і фальклор усходняй Беласточчыны» (Беласток, 1990), «Ігнат Дварчанін — палітык і вучоны» (з А. Бергман, Е. Тамашэўскім, Варшава, 1990).

Пераклаў на польскую мову зборнікі казак М. Федароўскага «Д'яблава скрыпка» (1973), казак Міншчыны, Гродзеншчыны і Магілёўшчыны «Невычэрпны збан» (1976), рускіх казак «Асілкі-чарадзеі» (Варшава, 1984), украінскіх казак «Зачараваныя колеры стэпу» (Варшава, 1986), зборнікі паэзіі В. Лукшы «Лета круглы год» (1983), «Дрэва дружбы» (1990), В. Віткі «Тосі-тосі ладкі» (1985), А. Пысіна «У сонейку» (1985). Пераклаў паэму Янкі Купалы «Яна і я», шматлікія яго вершы ўвайшлі ў складзеныя ім «Выбраныя творы» Я. Купалы (Варшава, 1984). Складальнік і адзін з перакладчыкаў зборніка «Янка Купала і Якуб Колас: Да 100-годдзя з дня нараджэння» (Варшава, 1982).

---

## *Марына БАРСТОК*



Марына (Марыя Мікітаўна) Барсток нарадзілася 15.4.1916 г. у вёсцы Наркавічы Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1935 г. скончыла Полацкі педагагічны тэхнікум. Два гады настаўнічала ў мястэчку Ветрына на Віцебшчыне. Вучылася завочна ў Магілёўскім педагагічным інстытуце, з 1937 г.— студэнтка Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі была накіравана працаваць загадчыкам аддзела культуры брэсцкай абласной газеты «Заря». На пачатку Вялікай Айчыннай вайны выехала ў Горкаўскую вобласць. У 1945 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, потым аспірантуру пры Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН

БССР. У 1959—1979 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1951 г.

У друку пачала выступаць з 1934 г. Напісала кнігі «Вобраз станоўчага героя ў творчасці Якуба Коласа» (1951), «Пятро Глебка» (1952), «Вывучэнне творчасці Кузьмы Чорнага ў школе» (1959; другое, дапоўненае выданне ў 1973), «Максім Багдановіч» (1961; другое, дапоўненае выданне ў 1974), «Адзінства і разнастайнасць сучаснай беларускай паэзіі» (1973), «Руплівы поўдзень: Нарыс творчасці Генадзя Бураўкіна» (1984). Выдала брашуры «Пятрусь Броўка» (1955), «Віднейшы беларускі дзіцячы пісьменнік Янка Маўр» (1958), «Максім Танк» (1962), «Вялікі Кастрычнік і беларуская літаратура» (1977) і інш. Адна з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1966), «Истории многонациональной советской литературы» (Масква, 1970), «Истории белорусской советской литературы» (1977), дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Беларуская дзіцячая літаратура» (1966). Выступае ў перыядычным друку з вершамі.

---

## *Леанід БАРШЧЭЎСКІ*



Леанід Пятровіч Баршчэўскі нарадзіўся 4.3. 1958 г. у горадзе Полацку ў сям'і служачага.

Пасля заканчэння сярэдняй школы № 10 Полацка (1975) паступіў у Мінскі педагагічны інстытут замежных моў на спецыяльнасць нямецкая і англійская мовы (скончыў у 1980). Працаваў выкладчыкам нямецкай і англійскай моў у роднай школе. З 1981 г.— выкладчык кафедры замежных моў Наваполацкага політэхнічнага інстытута імя Ленінскага камсамола Беларусі. У 1987 г. скончыў аспірантуру пры Мінскім педінстытуце замежных моў. Кандыдат філалагічных навук. Народны дэпутат БССР з 1990 г. Член СП СССР з 1989 г.

У друку выступае з 1973 г. Працуе ў галіне мастацкага перакладу з нямецкай, польскай, чэшскай, нідэрландскай на беларускую мову. Пераклаў кнігу Б. Брэхта «На шалях праўды» (1988), п'есу С. Мрожака «Танга» (пастаўлена

ў 1989), паасобныя творы Я. Врхліцкага, Ф. Кафкі, Г. Ахтэрберга, В. Тэўса, А. Шміт-Заса, А. Кухгофа і інш.

Выступае з артыкуламі па праблемах мастацкага перакладу.

---

## *Васіль* БАРЫСЕНКА



Васіль Васільевіч Барысенка нарадзіўся 25.4. 1904 г. у горадзе Барысаве Мінскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Працоўны шлях пачаў чорнарабочым на чыгунцы. У 1924 г. скончыў Барысаўскі педагагічны тэхнікум. Два гады працаваў настаўнікам у пачатковай школе. У 1929 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вучыўся ў аспірантуры пры АН БССР (1929—1932). У 1931—1941 гг. і пасля вайны да 1966 г. выкладчык Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Адначасова з 1934 г.— навуковы супрацоўнік, а з 1937 г.— дырэктар Інстытута мовы і літаратуры АН БССР. У час Вялікай Айчыннай вайны ў дзеючай арміі ў якасці карэспандэнта армейскай газеты. У 1946—1973 гг.— дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1974 г.— старшы навуковы супрацоўнік-кансультант гэтага ж інстытута. Акадэмік АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1937 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1974).

Памёр 26.7.1984 г.

Выступаў у друку з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі з 1932 г. Напісаў літаратуразнаўчыя працы «Францішак Багушэвіч і праблема рэалізму ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя» (1957), «Роля рускай класічнай літаратуры ў развіцці рэалізму беларускай літаратуры пачатку XX ст.» (1963, разам з В. Івашыным), артыкулы пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, З. Бядулі, В. Дуніна-Марцінкевіча, Т. Шаўчэнкі і інш. Сааўтар (з В. Івашыным)

падручніка для 8 класа «Беларуская літаратура» (1959—1978, 19 выданняў), хрэстаматыі для 10 класа «Родная літаратура» (14-е выданне, 1961), адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» (1977). Складальнік зборнікаў «Беларуская дакастрычніцкая проза» (1965), «Беларуская дакастрычніцкая паэзія» (1967).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні «История белорусской дооктябрьской литературы» і «История белорусской советской литературы».

---

## *Яўген* БАРЫЧЭЎСКІ



Яўген Іванавіч Барычэўскі нарадзіўся 17.12. 1883 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага.

Скончыўшы Мінскую гімназію, у 1903 г. паступіў у Берлінскі універсітэт, праз год перавёўся на гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага універсітэта. Пасля заканчэння вучобы (1910) пакінуты пры універсітэце, выкладаў рускую літаратуру ў сярэдніх навучальных установах Масквы, займаўся навукова-літаратурнай дзейнасцю: у маскоўскіх часопісах і газетах друкаваў артыкулы і даследаванні. З восені 1918 г. прызначаны вучоным сакратаром Музейнага аддзела Наркамасветы. У пачатку 1922 г. быў запрошаны на працу ў Беларускі дзяржаўны універсітэт. Працаваў у Мінскай цэнтральнай партыйнай школе (1924—1927), у Інбелкульце, потым у Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР (1927—1933). Быў рэпрэсіраваны. Пасмяротна рэабілітаваны. Прафесар.

Памёр 12.9.1934 г.

Пісаў на беларускай і рускай мовах. У 1922 г. у Маскве выйшла складзеная Я. Барычэўскім кніжка «Мир искусств в образах». У 1927 г. у Мінску выдадзены працы «Тэорыя санету» і «Паэтыка літаратурных жанраў». Артыкулы і даследаванні па пытаннях паэтыкі і эстэтыкі, прысвечаныя творчасці Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, рускіх, нямецкіх, французскіх пісьменнікаў, друкаваліся ў «Працах Беларуска-

га дзяржаўнага універсітэта», у часопісах «Маладняк», «Узвышша», «Полымя». Аўтар дапаможніка для студэнтаў-завочнікаў «Паэтыка. Курс для завочнага педфаку» (1929—1930). Прымаў удзел у падрыхтоўцы Збору твораў М. Багдановіча ў 2 тамах (1927—1928).

---

## *Міхась БАРЭЙША*



Міхась (Міхаіл Уладзіміравіч) Барэйша нарадзіўся 4.1.1950 г. у вёсцы Новы Лад Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Наваполацкі нафтавы тэхнікум (1969). Працаваў машыністам, апаратчыкам на Полацкім хімічным камбінаце (цяпер вытворчае аб'яднанне «Палімір»). У 1971—1973 гг. служыў на Балтыйскім флоце. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся на камбінат. Скончыў завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1981). З 1980 г.— карэспандэнт полацкай аб'яднанай газеты «Сцяг камунізму», з 1983 г.— намеснік рэдактара. Член СП СССР з 1989 г.

Памёр 13.8.1990 г.

У друку пачаў выступаць з 1973 г. Першая кніга прозы ўвайшла ў калектыўны зборнік «Сустрэча» (1985). Другая кніга прозы «Крыніца, чыстая вадзіца» выйшла ў 1988 г.

---

## *Святлана БАСУМАТРАВА*



Святлана Міхайлаўна Басуматрава нарадзілася 22.11.1946 г. у горадзе Мазыры Гомельскай вобласці ў сям'і служачых.

Дзяцінства прайшло на Магілёўшчыне. У 1958 г. сям'я выехала на цалінныя землі ў пасёлак Паспеліна Алтайскага краю, у 1962 г. пераехала ў Баранавіцкі раён. Пасля заканчэння школы (1964) працавала старшай піянерважатай Вольнаўскай васьмігадовай школы пад Баранавічамі. У 1966—1969 гг. вучылася ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага ў Маскве (скончыла завочна ў 1986). Працавала ўчотчы-

кам у саўгасе «Савіцкі» Баранавіцкага раёна, выкладала беларускую і нямецкую мовы ў Крывошынскай і Федзюкоўскай сярэдніх школах Ляхавіцкага раёна. З 1972 г. у Бабруйску — швачка-матарыстка швейнай фабрыкі, паштальён, укладчыца камбіната будаўнічых матэрыялаў, карэспандэнт-арганізатар радыёвяшчання, карэспандэнт шматтыражнай газеты «Рабочы», кантралёр вытворчага аб'яднання «Беларусьгуматэхніка». Член СП СССР з 1982 г.

Першы верш надрукаваны ў 1960 г. (паспелінская раённая газета «За урожай» Алтайскага краю). Аўтар кніг паэзіі «Белая Бярэзіна» (1981), «Кветкі палявыя» (1985), «Званы чалавечнасці» (1988).

---

## *Алесь БАЧЫЛА*



Алесь (Аляксандр Мікалаевіч) Бачыла нарадзіўся 2.3.1918 г. у вёсцы Лешніца Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1934 г. скончыў Беларускі педагагічны тэхнікум і выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Каралішчавіцкай і Сінілаўскай школах на Міншчыне. Завочна скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут (1939). Восенню 1939 г. прызваны ў Чырвоную Армію, служыў да 1945 г. Удзельнічаў у паходзе ў Іран, у баях на Крымскім, Паўночна-Каўказскім (Чарнаморская група войск), Варонежскім, 2-м Беларускім і 1-м Прыбалтыйскім франтах. Пасля вайны працаваў у «Настаўніцкай газеце», потым у газеце «Літаратура і мастацтва» — загадчыкам аддзела, адказным сакратаром (1946—1951), намеснікам галоўнага рэдактара (1952—1957). У 1951—1952 гг.— уласны карэспандэнт «Литературной газеты», рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР. У 1957—1972 гг.— адказны сакратар часопіса «Полымя», у 1972—1978 гг.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1946 г.

Памёр 3.1.1983 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», Дружбы народаў і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1967).

Першы верш надрукаваў у 1934 г. Выйшлі кніжкі паэзіі «Шляхі» (1947), «Подых вясны» (1950), «Зоры вясеннія» (1954), «Юнацтва» (1959), «Калючая ружа» (1962), «Асенняя аповесць» (паэма, 1965), «Дарыце цюльпаны» (1966), «Снежная балада» (выбранае, 1968), «Тры багіні» (1973), «Вершы» (1974), «Белы бярэзнік» (1976), «Гарацъ лісты кляновыя» (1981) і зборнік гумарыстычных вершаў «Кавалер Мікіта» (1967), кніжка вершаў для дзяцей «Мне купілі самакат» (1981). У 1978 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2-х, у 1986—1987 гг.— Збор твораў у 3 тамах.

Аўтар нарыса пра жыццёвы шлях М. Багдановіча «Дарогамі Максіма» (1971), кнігі «Крыло неспакою» (пошук, роздум, палеміка, успаміны).

Аўтар лібрэта опер «Яснае світанне» (надрукавана і пастаўлена ў 1958), «Вернасць (надрукавана ў 1959), «Калючая ружа» (пастаўлена ў 1960, надрукавана ў 1962), «Калі ападае лісце» (пастаўлена ў 1968), «Зорка Венера» (пастаўлена ў 1970) і лібрэта аперэты «Паўлінка» (па аднайменнай камедыі Янкі Купалы, пастаўлена ў 1973). Песні на яго вершы ўвайшлі ў зборнік «Я сэрцам з табою» (1988).

Пераклаў на беларускую мову «Тараса Бульбу» М. Гогаля (з М. Паслядовічам, 1954), «Брэсцкую крэпасць» С. Смірнова (1967), «Залаты ключык, або Прыгоды Бураціна» А. Талстога (1952), а таксама асобныя творы рускіх, украінскіх і латышскіх пісьменнікаў.

---

## *Міхась БАШЛАКОЎ*



Міхась (Міхаіл Захаравіч) Башлакоў нарадзіўся 27.4.1951 г. у пасёлку Станцыя Церуха (цяпер вёска Баштан) Гомельскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

У 1967 г. скончыў Грабаўскую сярэднюю школу і паступіў на гісторыка-філалагічны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Пасля заканчэння вучобы (1973) працаваў настаўнікам у Нісімкавіцкай СШ Чачэрскага раёна (1973—1974), Цеменіцкай СШ на Браншчыне (1974—1975), Пракопаўскай васьмігадовай школе Гомельскага раёна (1975—1978).

Затым выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школах Гомеля (1978—1985). З 1985 г.— карэспандэнт-арганізатар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР па Гомельскай вобласці. Член СП СССР з 1988 г.

У 1968 г. надрукаваў першы верш. Аўтар кнігі паэзіі «Касавіца» (зборнік «Нашчадкі», 1979) і «Начны паром» (1987).

---

## *Барыс* БЕЛЯЖЭНКА



Барыс Паўлавіч Беляжэнка (Беліжэнка) нарадзіўся 5.6.1937 г. у вёсцы Промыслы Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

Пасля заканчэння школы працаваў старшым піянерважатым Навікоўскай сярэдняй школы Шумілінскага раёна (1955—1957). Служыў на Балтыйскім ваенна-марскім флоце (1957—1958). Пасля настаўнічаў, быў дырэктарам Дома піянераў і школьнікаў, супрацоўнікам бешанковіцкай раённай газеты «Зара», сакратаром партыйнай арганізацыі калгаса «Герой працы», інструктарам райкома партыі, дырэктарам Пуськаўскай васьмігодкі. У 1965 г. скончыў завочна філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Загадваў Чашніцкім райана (1965—1967), працаваў намеснікам старшыні Чашніцкага райвыканкома (1967—1968). У 1970 г. скончыў Мінскую вышэйшую партыйную школу. З 1970 г.— інструктар, з 1972 г.— лектар, а з 1975 г.— загадчык сектара друку, тэлебачання і радыё Віцебскага абкома КПБ. У 1980—1986 гг.— загадчык аддзела абласной газеты «Віцебскі рабочы». Член СП СССР з 1979 г.

Узнагароджаны медалямі.

Друкуецца з 1958 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Крыгалом» (1973), «Жытнёвае поле» (1977). У 1977 г. у часопісе «Маладосць» апублікаваў паэму «Свята пумы», у 1988 г. у газеце «Віцебскі рабочы» — скарочаны варыянт аповесці-дэтэктыва «Каляровыя фотакарткі».

*Варлен* БЕЧЫК



Варлен Леанідавіч Бечык нарадзіўся 25.6. 1939 г. у вёсцы Астрашыцкі Гарадок Мінскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1960) выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў Пліскай сярэдняй школе Смалявіцкага раёна. У 1962—1966 гг.— аспірант кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна. З 1966 па 1971 гг.— літсупрацоўнік рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» і часопіса «Неман». З 1972 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1981 г.— намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура». Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1971 г.

Памёр 13.11.1985 г.

Выступаў у друку з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі з 1959 г. Выйшлі яго кнігі літаратурна-крытычных артыкулаў «Свет жывы і блізкі» (1974), «Прад высокаю красою» (1984), кніга пра паэзію А. Куляшова «Шлях да акіяна» (1981), «Выбранае» (1989). Адзін з аўтараў «Истории белорусской советской литературы» (1977). У сааўтарстве з М. Ярошам выдаў манаграфію «Беларуская савецкая лірыка» (1979). Напісаў брашуру, прысвечаную памяці беларускіх паэтаў, загінуўшых на Вялікай Айчыннай вайне «Радзіме — радок і жыццё» (1986).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1987, пасмяротна) за кнігу «Прад высокаю красою».

*Захар БІРАЛА*



Захар Якаўлевіч Бірала нарадзіўся 15.2.1906 г. у вёсцы Раўнаполле Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1928—1931 гг. вучыўся на рабфаку пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут (1934). Выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе ў Лагойску (1934—1936). У 1936 г. рэпрэсіраваны. Знаходзіўся ў зняволенні ў Горкаўскай (цяпер Ніжагародскай) вобласці. 24 верасня 1940 г. быў вызвалены. Працаваў настаўнікам у Сенніцкай сярэдняй школе Мінскага раёна. У час Вялікай Айчыннай вайны жыў з бацькамі, працаваў на ўласнай гаспадарцы ў вёсцы Астравы Рудзенскага раёна. Пасля вызвалення Беларусі (1944) прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на тэрыторыі Польшчы, быў цяжка паранены. У 1945—1974 гг. выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў Мар'інагорскім сельгастэхнікуме. Рэабілітаваны ў 1958 г. Член СП СССР з 1980 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Друкуецца з 1925 г. Выступае пераважна ў жанры сатыры і гумару. Аўтар кніжак гумарыстычных вершаў «Смех і радасць вёскі» (1929), «Цвітуць кветкі» (1963), «У пажарным парадку» (1968), «На светлым чорнае» (1974), «Прыляцела птушка» (1977), зборніка лірыкі, сатыры і гумару «Розы і крапіва» (1986).

*Пятро БІТЭЛЬ*



Пятро (Пётр Іванавіч) Бітэль нарадзіўся 19.6. 1912 г. у гарадскім пасёлку Радунь Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і паштовага служачага.

У 1931 г. скончыў настаўніцкую семінарыю ў Вільні. Працаваў настаўнікам пачатковых школ у Нясвіжскім і Стаўбцоўскім раёнах (1931—1939). Служыў у польскай арміі (1933—1934). За перыяд 1935—1939 гг. скончыў завочна Вышэйшыя настаўніцкія курсы ў Вільні

(гістарычна-філалагічны аддзел). У 1939 г. удзельнічаў у польска-нямецкай вайне, а пасля аб'яднання Беларусі працаваў у Валожыне настаўнікам і школьным інспектарам. У час нямецкай акупацыі вывезены ў Германію (1944) і там, пасля вызвалення (1945), прызваны ў Савецкую Армію. У 1946—1947 гг. працаваў настаўнікам Забрэжскай сярэдняй школы Валожынскага раёна. Пасля звальнення з настаўніцкай працы (1947) і немагчымасці ўладкавацца на ніякую дзяржаўную працу стаў праваслаўным святарам. У 1950 г. арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў зняволення. Адбываў тэрмін у Альжарасе Кемераўскай вобласці, у Омску і Джэзказгане. У 1956 г. звольнены датэрмінова са зняццем судзімасці. Да 1963 г. зноў, не могучы нідзе ўладкавацца, служыў у царкве. У 1963—1974 гг. выкладаў у Вішнеўскай сярэдняй школе Валожынскага раёна беларускую мову і літаратуру, нямецкую мову і маляванне. Скончыў завочна беларускае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1970) і Дзяржаўныя цэнтральныя курсы завочнага навучання «Ин-яз» у Маскве (1970). Рашэннем Вярхоўнага суда БССР ад 28.11.1978 г. па справе арышту і зняволення поўнасцю рэабілітаваны. Член СП СССР з 1985 г.

Памёр 18.10.1991 г.

Друкавацца пачаў у 1939 г. (часопіс «Настаўніцкія справы» на польскай мове, Вільня). У 1968 г. выйшла паэма «Замкі і людзі», у 1984 г.— «Паэмы», у 1990 г.— вершаваныя аповесці «Дзве вайны».

Перакладаў з рускай, украінскай, польскай, нямецкай моў. Пераклаў усе буйныя творы А. Міцкевіча («Пан Тадэвуш», «Конрад Валенрод», «Гражына», «Крымскія санеты», «Дзяды»), польскамоўныя паэмы і п'есы В. Дуніна-Марцінкевіча, раман Ю.-І. Крашэўскага «Хата за вёскай» (1989), паасобныя творы Б. Брэхта, І.-Р. Бехера, І.-В. Гётэ, М. Канапніцкай, М. Лермантава, У. Маякоўскага, Э. Межэлайціса, М. Някрасава, Б. Пруса, А. Пушкіна, Ю. Славацкага, Г. Сянкевіча, А. Твардоўскага, К. Тэтмаера, І. Франка, Т. Шаўчэнкі, Ф. Шылера, С. Ясеніна.

## *Данута* БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА



Данута Іванаўна Бічэль-Загнетава (Загнетава) нарадзілася 1.1.1938 г. у вёсцы Біскупцы Лідскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1957 г. скончыла Навагрудскае педагагічнае вучылішча, а ў 1962 г.— аддзяленне беларускай мовы, літаратуры і гісторыі Гродзенскага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы. З 1962 г. выкладала беларускую мову і літаратуру ў школах Гродна. З 1982 г. працуе загадчыцай Дома-музея Максіма Багдановіча ў Гродна. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджана медалём.

У друку выступае з 1958 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Дзявочае сэрца» (1961), «Нёман ідзе» (1964), «Запалянкі» (1967), «Доля» (1972), «Ты — гэта ты» (1976), «Браткі» (1979), «Дзе ходзяць басанож» (1983), «Загасцінец» (1985), «Даўняе сонца» (1987), «А на Палессі» (1990). Напісала паэмы і кніжкі вершаў для дзяцей: «Перапёлка» (1968), «Грыб-парасон» (1969), «Дзічка» (1971), «Рыжая палянка» (1971), «Дагані на кані» (1973), «Лузанцы» (1982), «Габрынька і Габрусь» (1985).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1984) за зборнік вершаў «Дзе ходзяць басанож».

## *Валянцін* БЛАКІТ



Валянцін Блакіт (Валянцін Уладзіміравіч Болтач) нарадзіўся 7.10.1938 г. у вёсцы Вострава Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Скідзельскай сярэдняй школы (1956) быў прыняты на работу літсупрацоўнікам у рэдакцыю шчучынскай раённай газеты «Чырвоны сцяг». Служыў у Савецкай Арміі (1957—1960). У 1966 г. скончыў завочна Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна. Працаваў у шчучынскай, затым у жалу-

докскай раённай газеце «За Радзіму» (1962), у міжраённай газеце «Савецкая вёска» (Шчучын), у 1963—1967 гг.— адказным сакратаром воранаўскай раённай газеты «Ленинское знамя», у 1967—1968 гг.— уласным карэспандэнтам абласной газеты «Гродненская правда». З 1968 г. загадчык сектара друку, радыё і тэлебачання, у 1971—1972 і 1974—1978 гг.— намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Гродзенскага абкома КПБ. У 1974 г. скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС у Маскве. У 1978—1987 гг. працаваў загадчыкам сектара тэлебачання і радыё ЦК КПБ. З 1987 г.— галоўны рэдактар часопіса «Вожык». Член СП СССР з 1981 г.

Узнагароджаны медалямі.

Вершы і нататкі публікаваў яшчэ ў школьныя гады ў раённай і абласной газетах. Першае апавяданне надрукавана ў 1960 г. (часопіс «Вожык»). Аўтар зборніка гумарыстычных апавяданняў «Вынаходнік» (1974), аповесцей «Час прылёту журавоў» (1979), «Шануй імя сваё» (1981), «Усмешка Фартуны» (1984), «Вырай» (1986), «Аповесці» (1988).

---

## *Сымон БЛАТУН*



Сымон Ціханавіч Блатун нарадзіўся 10.5.1937 г. у вёсцы Кавака Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1959) працаваў літсупрацоўнікам у газетах «Звязда», «Літаратура і мастацтва», літкансультантам у «Чырвонай змене».

Памёр 3.4.1970 г.

Першы верш надрукаваў у 1956 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборнікаў вершаў «Раўнавага» (1968), «Радаслоўнае дрэва» (1970), «Чысціня» (вершы і пераклады, 1979). У 1971 г. выйшаў зборнік гумарэсак, вершаў і мініяцюр «Калючая шаткаванка».

Перакладаў вершы рускіх, літоўскіх, латышскіх, армянскіх, узбекскіх паэтаў.

## *Міхась БЛІСЦІНАЎ*



Міхась (Міхаіл Міхайлавіч) Блісцінаў нарадзіўся 19.10.1909 г. у вёсцы Іванкава Масальскага раёна Калужскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

У 1910 г. з бацькамі пераехаў на Беларусь. Вучыўся ў Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме. У 1928 г. пачаў працаваць вясковым настаўнікам. У 1930—1932 гг.— студэнт Мінскага педагагічнага інстытута. У 1933—1936 гг.— адказны сакратар рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Скончыў сцэнарны факультэт Кінаакадэміі ў Маскве (1938). Працаваў рэдактарам на кінастудыі «Савецкая Беларусь». У час Вялікай Айчыннай вайны быў на штабной і палітрабоце ў 53-й арміі Паўночна-Заходняга і Стэпавага франтоў, з 1943 г.— у дывізійнай газеце 2-га Украінскага і Забайкальскага франтоў. У пасляваенны час працаваў ва ўстановах кінематаграфіі ў Мінску. Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 24.12.1982 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1926 г. з вершаў. З 1929 г. пісаў апавяданні і нарысы. Аўтар п'ес «Агні Палесся» (1931), «Трактар» (1931), «Мох» (1932), інсцэніровак «Ленінцы» і «Кастрычнік» (1932), «Грунт» (пастаўлена ў 1934), аповесці «Хітрасць» (альманах «Бальшавіцкая моладзь», 1934).

Напісаў сцэнарый мастацкага фільма «Строгая жанчына» (пастаўлены ў 1959), а таксама васемнаццаць сцэнарыяў дакументальных і навукова-папулярных фільмаў (фільм «Каларадскі жук» у 1965 г. адзначаны на Міжнародным кінафестывалі ў Браціславе дыпломам).

У перыядычным друку выступаў з рэцэнзіямі і артыкуламі па пытаннях кіно. Адзін з аўтараў кнігі «Мінскі аўтамабільны» (1972).

Пераклаў на беларускую мову «Крэнкебіль» А. Франса (1936), «Пятра Першага» А. Талстога (1940, скарочанае выданне для дзяцей), п'есу «Як гартавалася сталь» (паводле рамана М. Астроўскага, 1937), паасобныя п'есы А. Бруштэйн, Бр. Тур, В. Любімавай і інш.

*Янка* **БОБРЫК**



Янка (Іван Іванавіч) Бобрык нарадзіўся 21.7. 1905 г. у мястэчку Глуск Магілёўскай вобласці ў сям'і каваля.

У 1929 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Настаўнічаў у Мілаславіцкай сямігодцы Клімавіцкага раёна. У 1931 г. паступіў у аспірантуру Акадэміі мастацтвазнаўства у Ленінградзе. Пасля заканчэння вучобы (1934) быў навуковым супрацоўнікам акадэміі, працаваў рэдактарам кінастудыі Белдзяржкіно, рэдактарам Упраўлення па справах мастацтваў Ленінградскага гарвыканкома. Удзельнік абароны Ленінграда.

Памёр 25.8.1942 г. у блакадным Ленінградзе.

З вершамі ў друку выступіў у 1924 г. У 1926 г. разам з А. Звонакам і Я. Туміловічам выдаў зборнік вершаў «Пунсовае ранне». У 1930 г. часопіс «Маладняк» надрукаваў яго паэму «Галіна». Асобныя вершы змешчаны ў зборніку «Мы іх не забудзем» (1949).

Выступаў у перыядычным друку з апавяданнямі і нарысамі.

*Таіса* **БОНДАР**



Таіса Мікалаеўна Бондар нарадзілася 20.2. 1945 г. у гарадскім пасёлку Рудзенск Мінскай вобласці ў сям'і рабочых.

У 1967 г. скончыла факультэт англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. Настаўнічала ў г. Фалешты (Малдавія). У 1977 г. вярнулася на Беларусь. У 1978—1981 гг. загадвала аддзелам выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». З 1981 г.— загадчык аддзела культуры, адказны сакратар, а з 1985 г. намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларусь». Член СП СССР з 1978 г.

У друку з вершамі выступіла ў 1970 г. Выдала зборнікі паэзіі «Захапленне» (1974), «Акно ў восень» (1977), «...І голас набыла душа»

(вершы і паэмы, 1980), «Святочны снег» (вершы, паэма, 1981), «Чырвоны месяц года» (вершы і паэмы, 1985), «Спадчынны боль» (1987), «Адна» (1989).

Аўтар кніг апавяданняў «Сінія яблыкі» (1984), аповесцей «Час, калі нас любілі» (1988), аповесцей і апавяданняў «Паветраны замак на дваіх» (1990), рамана «Спакуса» (1989).

Перакладае з малдаўскай (Г. Віеру «Імя тваё», 1986), румынскай і англійскай моў.

---

## *Якаў БРАНШТЭЙН*



Якаў Анатольевіч Бранштэйн нарадзіўся 10.11. 1897 г. у горадзе Бельску-Падляшскім Гродзенскай губерні (цяпер Польша) у сям'і рабочага.

У 15 год стаў «хлопчыкам для паслуг», потым быў рахункаводам. У 1919—1921 гг.— добраахвотнік Чырвонай Арміі, удзельнічаў у баях на Заходнім і Туркестанскім франтах. Працаваў у газеце «Орловская правда». У 1925 г. скончыў 1-шы Маскоўскі дзяржаўны універсітэт, вучыўся ў Камакадэміі (1926—1930), скончыў аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. З 1930 г.— выкладчык Мінскага педагагічнага інстытута і адначасова навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. У 1932—1937 гг.— адказны сакратар Арганізацыйнага камітэта, рэарганізаванага ў Саюз пісьменнікаў Беларусі ў 1934 г. 6.4.1937 г. рэпрэсіраваны. 28.10.1937 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР вынесены прыгавор на 10 год зняволення. Рэабілітаваны 27.6.1956 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Член-карэспандэнт АН БССР, прафесар. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Пісаў на ідыш і на беларускай мовах. Літаратурна-крытычную дзейнасць пачаў у 20-я гады з артыкулаў пра творчасць яўрэйскіх і беларускіх пісьменнікаў. Выдаў зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Атака» (1930) і навуковыя працы «Праблемы ленінскага этапа ў літаратуразнаўстве» (1932), «Вынікі 15-гадовай барацьбы за марксізм-ленінізм у літаратуразнаўстве» (1932), літаратурна-крытычныя пра-

цы «Аб стане яўрэйскай літаратуры ў перыяд рэканструкцыі» (дадатак да часопіса «Штэрн», 1932), «На замацаваных пазіцыях» (1934), «Літаратурная вучоба» (1935).

У перыядычных выданнях 30-х гадоў і калектыўных зборніках змешчаны шэраг артыкулаў пра творчасць А. Пушкіна, Я. Купалы, Я. Коласа, А. Александровіча, М. Лынькова, Я. Маўра, С. Баранавых, І. Харыка, М. Кульбака і іншых пісьменнікаў.

---

## *Пятрусь БРОЎКА*



Пятрусь (Пётр Усцінавіч) Броўка нарадзіўся 25.6.1905 г. у вёсцы Пуцілкавічы Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Працоўны шлях пачаў у 1918 г. з перапісчыка ў Вяліка-Долецкім валасным камісарыяце. Быў справаводам валвыканкома, рахункаводам у саўгасе, старшынёй сельсавета, загадчыкам аддзела ў Полацкім акруговым камітэце камсамола. У 1927—1928 гг.— адказны сакратар акруговай газеты «Чырвоная Полаччына». У 1931 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта, у 1940 г. прызначаны галоўным рэдактарам часопіса «Полымя». На пачатку Вялікай Айчыннай вайны добраахвотна пайшоў у Савецкую Армію. Быў інструктарам-літаратарам франтавой газеты «За Савецкую Беларусь», супрацоўнічаў у партызанскім друку. З 1943 г.— адказны сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, а з 1945 г.— зноў галоўны рэдактар часопіса «Полымя». У 1948 г. абраны старшынёй праўлення Саюза пісьменнікаў БССР. У 1959 г. як дэлегат ад БССР удзельнічаў у рабоце XIV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. У 1967—1980 гг.— галоўны рэдактар Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР і БССР, сакратаром праўлення СП СССР. Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Герой Сацыялістычнай Працы (1972). Узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонай Зоркі, Дружбы народаў, «Знак Пашаны» і многімі медалямі.

Народны паэт БССР (1962), заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1975). Ганаровы грамадзянін г. Мінска (1980).

Памёр 24.3.1980 г.

Друкавацца пачаў у 1926 г. у газеце «Чырвоная Полаччына». Аўтар кніжак паэзіі «Гады як шторм» (1930), «Прамова фактамі» (1930), «Цэхавыя будні» (1931), «Паэзія» (1932), «Так пачыналася маладосць» (1934), «Прыход героя» (1935), «Вясна радзімы» (1937), «Кацярына» (1938, паэма), «Вершы і паэмы» (1940), «Шляхамі баравымі» (1940), «Насустрач сонцу» (1943, Масква), «У роднай хаце» (1946), «Вершы і паэмы» (1946), «Сонечнымі днямі» (1950), «Цвёрдымі крокамі» (1954), «Пахне чабор» (1959), «Далёка ад дому» (1960), «Па сакрэту» (1961, сатыра і гумар), «А дні ідуць...» (1961), «Высокія хвалі» (1962), «Вершы і паэмы» (1966), «Заўсёды з Леніным» (1967, паэма), «Між чырвоных рабін» (1969), «Калі ласка» (1972), «Ты — мая пчолка» (1972), «Лясы наддзвінскія» (1973, паэма), «І ўдзень і ўночы» (1974), «Што сэрца праспявала» (1979), «Маладосць і сталасць» (1980), «Савецкі чалавек» (1982), «Мая Радзіма» (1985).

Для дзяцей выдаў кніжкі паэзіі «Маладым сябрам» (1961), «Наш музей» (1962, паэма), аповесць «Донька-Даніэль» (1982).

Неаднаразова выдаваліся кніжкі Выбраных твораў (1934, 1945, 1947, 1948, 1951), выходзілі Зборы твораў у 2-х (1957, 1969), у 4-х (1965—1966), у 7-мі (1975—1978), у 9 тамах (1987—1992).

Выдаў аповесць «Каландры» (1931, экранізавана ў 1934), нарысы «Ураджай» (з П. Глебкам, 1933), «Месяц у Чэхаславакіі» (1952), раман «Калі зліваюцца рэкі» (1957), зборнік апавяданняў «Разам з камісарам» (1974). Напісаў лібрэта опер «Міхась Падгорны» (1940, пастаўлена ў 1939), «Алеся» («Дзяўчына з Палесся», з Я. Рамановічам, пастаўлена ў 1944, урыўкі апублікаваны ў 1947).

Выступаў і як перакладчык на беларускую мову твораў Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, П. Тычыны, М. Бажана, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага, А. Пракоф'ева, У. Бранеўскага, Дж. Байрана і іншых паэтаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1947) за цыкл вершаў і паэму «Хлеб», Дзяржаўнай

прэміі СССР (1951) за зборнік вершаў «Дорога жизни», Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1959) за раман «Калі зліваюцца рэкі», Ленінскай прэміі (1962) за кнігу вершаў «А дні ідуць...», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1970) за паэму «Заўсёды з Леніным» і кнігу вершаў «Між чырвоных рабін», Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за ўдзел у стварэнні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

---

## *Янка БРЫЛЬ*



Янка (Іван Антонавіч) Брыль нарадзіўся 4.8. 1917 г. у горадзе Адэсе (Украіна) у сям'і чыгуначніка.

У 1922 г. разам з бацькамі пераехаў на іх радзіму ў Заходнюю Беларусь (вёска Загора Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці). Скончыў польскую сямігодку (1931), працаваў на гаспадарцы, займаўся самаадукацыяй. У сакавіку 1939 г. прызваны ў польскую армію. Служыў у марской пяхоце. У верасні 1939 г. пад Гдыняй трапіў у нямецкі палон, восенню 1941 г. уцёк на радзіму. З кастрычніка 1942 г.— сувязны партызанскай брыгады імя Жукава Баранавіцкага злучэння, а з сакавіка да ліпеня 1944 г.— партызан-разведчык брыгады «Камсамолец» і рэдактар газеты «Сцяг свабоды» (орган Мірскага падпольнага райкома партыі) і сатырычнага антыфашысцкага лістка «Партызанскае жыгала». З кастрычніка 1944 г. жыве ў Мінску. Працаваў у рэдакцыі газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», часопісах «Вожык», «Маладосць», «Полымя», у Дзяржаўным выдавецтве БССР. У 1966—1971 гг.— сакратар праўлення СП БССР. Двойчы выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1963—1967, 1980—1985). Старшыня Беларускага аддзялення таварыства «СССР — Канада» (1967—1990). Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1945 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Дружбы народаў, «Знак Пашаны», савецкімі і польскімі медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1981).

У 1938 г. пачаў друкавацца як паэт і публіцыст (віленскі беларускі часопіс «Шлях моладзі»). Аўтар кніг апавяданняў, аповесцей «Апавяданні» (1946), «Нёманскія казакі» (апавяданні і нарысы), «Вераснёвая рунь» (1949), «У Забалоцці днее» (1951), «Дзеля сапраўднай радасці» (1952), «На Быстранцы» (1955), «Вачыма друга» (нарысы, 1956), «Сэрца камуніста» (нарыс, 1957), «І смех, і бяда» (сатыра і гумар, 1958), «Надпіс на зрубе» (1958), «Выбраныя апавяданні» (1959), «Мой родны кут» (1959), «Працяг размовы» (апавяданні, замалёўкі, нарысы, 1962), «Жменя сонечных промняў» (мініяцюры, 1965), «Адзін дзень» (1968), «Акраец хлеба» (1977), «Золак, убачаны здалёк» (1979), «Гуртавое» (1980), зборнікаў апавяданняў і мініяцюр «Ты жывеш» (1978), «Сёння і памяць» (1985), «Ад сяўбы да жніва» (1987), «На сцежцы — дзеці» (1988), раманаў «Граніца» (ч. I, часопіс «Полымя», 1949), «Птушкі і гнёзды» (1964). У сааўтарстве з А. Адамовічам і У. Калеснікам напісаў дакументальную кнігу «Я з вогненнай вёскі...» (1975, па матывах кнігі пастаўлены «Хатынскі цыкл» дакументальных фільмаў). Выдаў кніжкі прозы для дзяцей «Ліпка і клёнік» (1949), «Зялёная школа» (1951), «Светлае ранне» (1954), «Пачатак сталасці» (1957), «Жыў-быў вожык» (1976), «Сняжок і Волечка» (1983). Выйшлі Зборы твораў у 2-х (1960), 4-х (1967—1968) і 5 тамах (1979—1981).

Я. Брылю належаць таксама кнігі «Роздум і слова» (літаратурна-крытычныя артыкулы, нататкі, 1963) і «Трохі пра вечнае» (артыкулы, творчыя партрэты, лірычны роздум, 1978). Напісаў тэксты да альбомаў «Там, дзе сінее Нарач» (1963) і «Між тых палёў...» (1968).

Вядомы і як перакладчык з рускай, украінскай і польскай моў. У яго перакладзе на беларускую мову выйшлі паасобныя творы Л. Талстога, А. Чэхава, М. Горкага, П. Бажова, Г. Траяпольскага, А. Вішні, Л. Смілянскага, А. Даўжэнкі, В. Казачэнкі, М. Канапніцкай, Э. Ажэшкі, Л. Кручкоўскага, Я. Івашкевіча, В. Жукроўскага, Т. Ружэвіча, М. Ю. Канановіча, Я. Гушчы і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1952) за аповесць «У Забалоцці днее», Літаратурнай

прэміі імя Якуба Коласа (1963) за кнігу «Працяг размовы», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1982) за аповесць «Золак, убачаны здалёк».

Атрымаў у Польшчы прэміі за пераклады польскай літаратуры і ўмацаванне дружбы паміж народамі — імя У. Петшака (1972) і аўтарскага аб'яднання «ЗАІКС» (1975).

---

## *Генадзь БУБНАЎ*



Генадзь Фёдаравіч Бубнаў нарадзіўся 9.5.1948 г. у вёсцы Цяляткава Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і калгасніка і настаўніцы.

У 1972 г. скончыў факультэт журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. Ламаносава. Працаваў рэдактарам Галоўнай рэдакцыі прапаганды, а з 1974 г.— старшым рэдактарам літаратурнай рэдакцыі Беларускага радыё. У 1975—1977 гг.— літсупрацоўнік, у 1977—1984 гг.— рэдактар аддзела крытыкі і бібліяграфіі, а з 1984 г.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Неман». Член СП СССР з 1981 г.

Дэбютаваў вершамі ў 1963 г. Піша на рускай мове. Аўтар зборнікаў паэзіі «Связующая нить» (1975), «Ржаной полдень» (1978), «Вещий камень» (балады і паэма, 1987), гісторыка-філасофскіх даследаванняў «Левый и правый, или Время умирать и время жить» (часопіс «Нёман», 1989) і «Красный жезл запрета, или Тот покой, который вы ожидаете» (часопіс «Нёман», 1990).

Пераклаў з беларускай мовы на рускую «Первую книгу» І. Мележа (1981), раманы-эсэ А. Лойкі «Янка Купала» (з І. Бурсавым, Масква, 1982) і «Скорина» (Масква, 1989), аповесць І. Шамякіна «Ветви и корни» (1988), паасобныя творы Р. Барадуліна.

*Дзмітрый БУГАЁЎ*



Дзмітрый Якаўлевіч Бугаёў нарадзіўся 12.1. 1929 г. у вёсцы Сычык Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1945—1948 гг. вучыўся ў Магілёўскім педагагічным вучылішчы. Працаваў настаўнікам у Крытышынскай сямігадовай школе Іванаўскага раёна і адначасова займаўся на факультэце мовы і літаратуры Магілёўскага педагагічнага інстытута. У 1949 г. перавёўся на стацыянарнае аддзяленне гэтага інстытута і скончыў яго ў 1952 г. Пасля вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага (1952—1955), выкладаў беларускую літаратуру ў Мазырскім педагагічным інстытуце (1955—1959), быў навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1959—1964). З 1964 г.— дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Кандыдат філалагічных навук, прафесар. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1961 г.

У друку выступае з літаратуразнаўчымі і крытычнымі артыкуламі з 1957 г. Выйшлі кнігі «Шчодрае сэрца пісьменніка» (1963), «Паэзія Максіма Танка» (1964), «Уладзімір Дубоўка» (1965), «Максім Гарэцкі» (1968), «Шматграннасць» (1970), «Зброяй сатыры, зброяй праўды» (1971), «Вернасць прызванню: Творчая індывідуальнасць Івана Мележа» (1977), «Талент і праца» (1979), «Чалавечнасць» (1985), «Васіль Быкаў» (1987), «Арганічнасць таленту» (1989).

Удзельнічаў у стварэнні «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964—1966).

Адзін з аўтараў і рэдактараў вучэбнага дапаможніка для студэнтаў універсітэта «Беларуская савецкая літаратура» (ч. 1 — 1981, ч. 2 — 1982).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1984) за кнігу «Талент і праца».

## *Яўген БУДЗІНАС*



Яўген Дамінікавіч Будзінас нарадзіўся 18.2. 1944 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і служачых.

У 1946 г. сям'я пераехала ў Вільнюс. Працоўны шлях пачаў у час вучобы ў дзевятым класе школы рабочай моладзі лабарантам Вільнюскага радыётэхнічнага вучылішча (1960—1961). Вучыўся завочна ў радыётэхнічным інстытуце (спачатку ў Разані, пасля ў Мінску, скончыў у 1972 г.). Працаваў слесарам у Разані (1961—1962), манцёрам Мінскага гарадскога аўтатрэста (1963—1965), цесляром, затым настаўнікам матэматыкі, рускай мовы і літаратуры вячэрняй школы ў пасёлку Светлы Цюменскай вобласці (1967—1968). З 1968 г. на журналісцкай працы ў Мінску: літсупрацоўнік, загадчык аддзела газеты «Знамя юности», уласны карэспандэнт Агенцтва друку «Навіны» па Беларусі (1972—1975), карэспандэнт часопіса «Рабочая смена» (1975—1976). З 1982 г.— спецыяльны карэспандэнт часопіса «Дружба народов» па Беларускай ССР і Прыбалтыцы. Член СП СССР з 1986 г.

Першы нарыс апублікаваў у 1966 г. (часопіс «Неман»). Піша на рускай мове. Аўтар кніг нарысаў, публіцыстыкі «Один практический шаг» (Масква, 1983), «Дом в сельской местности» (Масква, 1985), «Действующие лица» (1986), «Преждевременный конфликт» (Масква, 1988), рамана-даследавання «Промежуточный человек» (1990).

## *Канстанцыя БУЙЛО*



Канстанцыя Буйло (Канстанцыя Антонаўна Калечыц) нарадзілася 14.1.1893 г. у горадзе Вільні ў сялянскай сям'і.

У 1914 г. скончыла кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы ў Вільні. Настаўнічала на Лідчыне. Загадвала беларускай кнігарняй у Полацку (1915—1916). Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працавала статыстам у Валакаламскім павятовым выканкоме рабочых і салдацкіх дэпутатаў, бухгалтарам саўгаса «Данілкава».

З 1923 г. жыла ў Маскве. Працавала на заводзе «Аграном» (1929—1934), начальнікам аддзела збыту палітэхлабарсаюза (1934—1940), у 1940—1951 гг.— начальнікам аператыўнага аддзела, затым в. а. намесніка дырэктара цэнтральнай канторы ветэрынарнага забеспячэння трэста Саюзветзабпрам. Член СП СССР з 1944 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1968).

Памерла 4.6.1986 г.

Дэбютавала вершамі ў 1909 г. (газета «Наша ніва»). Першую кнігу «Курганная кветка» (1914, Вільня, факсімільнае выданне ў 1989) адрэдагаваў Я. Купала. Аўтар зборнікаў вершаў «Світанне» (1950), «На адноўленай зямлі» (1961), «Май» (1965), «Роднаму краю» (1973). Выйшлі Выбраныя творы (1954), «Выбранае» (1968, 1976), Выбраныя творы ў 2 тамах (1981). Напісала кніжкі вершаў для дзяцей «Юрачка» (1957), «У бляску зор» (1968), «Вясной» (1984).

Аўтар п'ес «Кветка папараці» (1914) і «Сягонняшнія і даўнейшыя» (1914, пастаўлена ў 1921).

Многія вершы паэтэсы пакладзены на музыку. Асабліва шырокую вядомасць займела песня «Люблю», якая стала народнай.

---

## *Сямён БУКЧЫН*



Сямён (Самуіл Уладзіміравіч) Букчын нарадзіўся 18.8.1941 г. у сяле Валаконаўка Валаконаўскага раёна Курскай вобласці (Расія) у сям'і ваеннаслужачага і настаўніцы.

З 1949 г. жыве ў Мінску. Пасля заканчэння сярэдняй школы № 11 імя А. П. Чэхава (1959) два гады працаваў фрэзероўшчыкам на Мінскім электратэхнічным заводзе. У 1961 г. паступіў на аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Служыў у Савецкай Арміі (1964—1967). Вучобу ва універсітэце працягваў завочна (скончыў у 1967). Быў на рэдактарскай працы на Бела-

рускім тэлебачанні, у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, у 1969—1985 гг.— адказны сакратар часопіса «Весці АН БССР». З 1985 г.— старшы навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1983 г.

Узнагароджаны медалём.

Друкуецца з 1959 г. Піша на рускай мове. Пачынаў як журналіст у газеце «Зорька». З 1966 г. выступае як крытык, літаратуразнавец, празаік. Аўтар кніг «Дорогой Антон Павлович...: Очерки о корреспондентах А. П. Чехова» (1973), «Судьба фельетониста: Жизнь и творчество Власа Дорошевича» (1975), «К мечам рванулись наши руки: Документальные повести» (1978, 2-е выданне, 1985), «Как жить, Лев Николаевич?..: Очерки о белорусских корреспондентах Льва Толстого» (1979), «Последний год Дениса Фонвизина» (1981), «Народ издревле нам родной: Русские писатели и Белоруссия» (1984).

Склаў, падрыхтаваў тэксты і напісаў уступныя артыкулы да выданняў: «Писатели чеховской поры: Избранные произведения писателей 1880—1890-х годов: В 2 томах» (1982), «Сказки и легенды» В. М. Дарашэвіча (1983); «Друзьям, отечеству, народу: Поэзия декабристов» (1986), «Песнь о Беларуси: Стихи русских советских поэтов» (1988).

---

## *Галіна БУЛЫКА*



Галіна Аляксандраўна Булыка нарадзілася 6.12. 1960 г. у вёсцы Осава Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

У 1966 г. сям'я пераехала ў Мінск. Скончыла хімічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1983). Працавала стажорам-даследчыкам у Інстытуце фізіка-арганічнай хіміі АН БССР, выхавацелем у рабочым інтэрнаце Мінскага матацыклетнага і веласіпеднага завода, інжынерам-наладчыкам Упраўлення пусканаладачных работ трэста «Аўтарэмбудмантаж» Мінаўтапрома СССР. У 1989 г. скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Член СП СССР з 1987 г.

З вершамі ўпершыню выступіла ў друку ў 1975 г. (часопіс «Бярозка»). Аўтар падборкі вершаў «Дзень нараджэння снежня» ў калектыўным зборніку «Сцяжына» (1983), зборніка паэзіі «Сінтэз» (1986).

---

## *Генадзь БУРАЎКІН*



Генадзь Мікалаевіч Бураўкін нарадзіўся 28.8. 1936 г. у вёсцы Шуляціна Расонскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1959 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў стыльрэдактарам часопіса «Коммунист Белоруссии», старшым рэдактарам на Беларускім радыё, загадчыкам аддзела літаратуры, намеснікам галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва». У 1968—1972 гг.— карэспандэнт «Правды» па Беларускай ССР, у 1972—1978 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Маладосць». З 1978 г.— старшыня Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні. З 1990 г.— пастаянны прадстаўнік Беларускай ССР пры ААН. У складзе дэлегацыі БССР у 1976 г. удзельнічаў у рабоце XXXI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1980—1990). Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, медалямі.

Першыя вершы надрукаваў у 1952 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Майская просінь» (1960), «З любоўю і нянавісцю зямною» (1963), «Дыханне» (1966), «Выбраныя вершы» (1969), «Жніво» (1971), «Выток» (1974), «Вершы пяці кніг» (1976), «Варта вернасці» (1978), «Пяшчота» (1985), «Гняздо для птушкі радасці» (1986), а таксама кніжак для дзяцей «Тры казкі пра Зая» (1974), «Сінія арэлі» (1987). У 1986 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Напісаў кнігу прозы «Тры старонкі з легенды» (1971).

Адзін з аўтараў (з У. Халіпам, Ф. Коневым) сцэнарыя двухсерыйнага фільма «Полымя» (1974), аўтар сцэнарыяў дакументальных філь-

маў «Апаленая памяць» (1975) і «Падарожжа па Беларусі» (1976).

Перакладае з рускай, украінскай, малдаўскай, балгарскай і іншых моў. Пераклаў на беларускую мову камедыю А. Хмеліка «Пузыркі» (пастаўлена ў 1966). У яго перакладзе асобным выданнем выйшла кніжка паэзіі Б. Алейніка «Заклінанне агню» (1979).

Многія вершы пакладзены беларускімі кампазітарамі на музыку.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1972) за высокі мастацкі ўзровень вершаў і адлюстраванне ў іх маладзёжнай тэматыкі і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1980) за кнігу вершаў «Варта вернасці».

---

## *Васіль БУРНОСАЎ*



Васіль Емяльянавіч Бурносаў нарадзіўся 18.8. 1914 г. у вёсцы Зеляនькова Круглянскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1933—1934 гг. працаваў брыгадзірам, затым старшынёй калгаса «Новы свет» Бялыніцкага раёна. Быў токарам на аўтарамонтным заводзе ў Магілёве. Скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску (1939). Працаваў рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны — на Заходнім фронце, быў цяжка паранены. З 1942 г.— інструктар ЦК ВЛКСМ, з 1943 г.— намеснік рэдактара газеты «Чырвоная змена». Быў карэспандэнтам «Правды» па БССР (1944—1947). Працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР, рэдакцыях часопіса «Полымя», «Коммунист Белоруссии», газеты «Літаратура і мастацтва», у Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, галоўным рэдактарам выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, старшым рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1951 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 19.7.1984 г.

Літаратурна-крытычнай працай займаўся з 1947 г. Апублікаваў шэраг артыкулаў аб пар-

тыйнасці і народнасці літаратуры, сацыялістычным рэалізме, аб творчасці Л. Талстога, М. Гогаля, А. Кальцова, М. Горкага, У. Маякоўскага, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Лынькова, А. Куляшова і іншых беларускіх пісьменнікаў.

---

## *Іван* БУРСАЎ



Іван Цярэнцьевіч Бурсаў нарадзіўся 19.12. 1927 г. у горадзе Клімавічы Магілёўскай вобласці ў сям'і ваеннаслужачага.

Працоўны шлях пачаў у 1945 г. счэпшчыкам вагонаў на Чэлябінскім металургічным заводзе. Працаваў на Мінскім трактарным заводзе (1953—1957). У 1962 г. скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага. Працаваў рэдактарам аддзела прозы часопіса «Неман» (1962—1964). З 1965 г. жыве ў Маскве. Член СП СССР з 1964 г.

У друку выступае з 1953 г. Піша на рускай мове. У Маскве выдаў зборнікі вершаў «Близкие звезды» (1960), «Лобжанка-речка» (1967), «Горсть» (1970), «Праздник света» (1976), «Грамота лет» (1977), «Песочные часы» (1981), «Круг» (вершы, паэма, 1986); у Мінску выдаў «Косая сажень» (1964), «Среда» (1972), «Грамота лет» (1977), «Помня о любви» (1980), «Уста» (вершы, паэмы, 1984), «Колесо обозрения» (вершы, паэмы, 1988). Для дзяцей выйшлі кніжкі прозы, вершаў і казак «Едет лес» (1961), «Как Дед Мороз для зайчат построил мост» (1963), «Как звери к зиме готовятся» (1966), «Матрешкины сказки» (1968), «Сказки с присказками» (1968), «Веселые небылички» (1970), «Ванька-Встанька» (1973), «Страна Голубого Солнца» (1973), «Вы слыхали?» (1975), «Сказки, полные чудес» (1979), «Девяносто пять ежей» (1982), «Сорок сорок» (1988).

Перакладае з беларускай і ўкраінскай моў на рускую. У яго перакладах асобнымі выданнямі выйшлі зборнікі паэзіі Р. Барадуліна «Целиноград» (1961), «Раскидач» (1969), «Кошки в лукошке» (1985), Г. Бураўкіна «Голоса расстояний» (1964), У. Караткевіча «Вечерние паруса» (1969), В. Зуёнка «Основа» (1972), «Молчание травы» (паэма, 1987), А. Астрэйкі

«Приключения деда Михеда» (1974), Е. Лось «Песня твоей сестры» (1977), К. Цвіркі «Закон воды» (1978), Д. Бічэль-Загнетавай «Где ходят босиком» (1987) і інш.

---

## *Барыс БУР'ЯН*



Барыс Іванавіч Бур'ян нарадзіўся 7.1.1924 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і чыгуначніка.

Да вайны працаваў артыстам у тэатрах Разані і Кінешмы. Скончыў тэатральную студыю пры Разанскім тэатры (1941). Са жніўня 1941 г. служыў у Савецкай Арміі — у войсках сувязі, удзельнічаў у баях на 4-м Украінскім фронце. З 1946 г.— карэспандэнт БелТА, у 1947—1951 гг.— стыльрэдактар газеты «Сталинская молодежь». Потым быў рэдактарам на Беларускім тэлебачанні, на Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў. У 1952—1953 і з 1963 гг. супрацоўнік газеты «Літаратура і мастацтва», у 1953—1962 гг. часопіса «Советская Отчизна» («Неман»). У 1967—1985 гг.— загадчык аддзела тэатра, музыкі і кіно ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1950 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і «Знак Пашаны», медалямі.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1947 г. з тэатральных рэцэнзій. Піша на рускай і беларускай мовах. Выдаў тэатразнаўчы нарыс «На высоком взлете» (з І. Лісневўскім, 1962), брашуру «Каму апладзіруе зала» (1972), зборнікі эсэ і артыкулаў «На театральных перекрестках» (з І. Лісневўскім, 1967), «З сёмага рада партэра» (1978), «Судьба чужая — как своя» (1982), «І толькі надпіс...» (1987). Выступае і як літаратурны крытык.

Аўтар аповесцей «Первый снег» (1957), «У синей бухты» (1959), «Твоя повесть» (1959), «Вальс Грибоедова» (1960), «Радужный перезвон» (1964), «Грозовые отголоски» (выбранае, 1984).

Напісаў п'есы «Зорка Венера» (з М. Алтуховым, 1961, пастаўлена ў 1967) і «Твой высокі поўдзень» (пастаўлена ў 1968). Стварыў шэраг

сцэнарыяў для радыё, тэлебачання і дакументальнага кінематографа.

З беларускай мовы на рускую пераклаў асобныя творы К. Чорнага, М. Лынькова, Б. Мікуліча, А. Якімовіча, А. Васілевіч, У. Шахаўца, І. Грамовіча, Т. Хадкевіча, Я. Курто і інш.

---

## *Мікола* БУСЬКО



Мікола (Мікалай Іосіфавіч) Бусько нарадзіўся 30.9.1940 г. у вёсцы Пагарэлка Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Турэцкай сярэдняй школы Карэліцкага раёна служыў у Савецкай Арміі (1959—1962). Скончыў Баранавіцкі тэхнікум лёгкай прамысловасці (1962) і выяўленчы факультэт Маскоўскага завочнага народнага універсітэта мастацтваў (1967). Працаваў рабочым на лесагандлёвай базе (1963—1965), затым афарміцелем у Доме афіцэраў (1965—1967), на мясакамбінаце (1967—1976), з 1976 г.— афарміцель аўтобуснага парка ў Баранавічах. Член СП СССР з 1989 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1970 г. у раённым друку. Аўтар кнігі паэзіі «У Нёмна на плячах» (1986).

---

## *Уладзімір* БУТРАМЕЕЎ



Уладзімір Пятровіч Бутрамееў нарадзіўся 20.3. 1953 г. у вёсцы Расна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

У 1974 г. скончыў геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працаваў у школах Горацкага і Чэрыкаўскага раёнаў настаўнікам і загадчыкам навучальнай часткі. У 1980 г. пераехаў у пасёлак Альберцін на Слонімшчыне. Працаваў на Слонімскай папяровай фабрыцы, настаўнікам у вячэрняй школе, у Слонімскім прафесійна-аматарскім тэатры. У 1986 г. скончыў Вышэйшыя двухгадовыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве, атрымаў спецыяльнасць кінадраматурга. У 1989 г. залічаны на Вышэйшыя літаратурныя

курсы ў Маскве. Член СП СССР з 1987 г.

У рэспубліканскім друку выступае з 1982 г. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Любить и верить» (Масква, 1986), «Сдвиженье» (Масква, 1990), аповесці «Где праздник, там и я, или Сказка-басня о том, как жил, по свету бродил, умер и живым остался ловкий мужик Нестерка» (зборнік «Дни этого года», Масква, 1986).

Напісаў п'есы «Ізноў Несцерка» (пастаўлена ў 1987), «Страсці па Аўдзею» (1990, пастаўлена ў 1989), аднаактоўку «Живите надеждой» (1984). Адзін з аўтараў сцэнарыя тэлефільма «Наш сад» (з Я. Міцько, пастаўлены ў 1987).

---

## *Васіль БЫКАЎ*



Васіль Уладзіміравіч Быкаў нарадзіўся 19.6. 1924 г. у вёсцы Бычкі Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся на скульптурным аддзяленні Віцебскага мастацкага вучылішча. Скончыў экстэрнам Кубліцкую сярэднюю школу. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў складзе інжынернага батальёна ўдзельнічаў у будаўніцтве абаронных збудаванняў. Са жніўня 1942 г.— курсант Саратаўскага пяхотнага вучылішча (скончыў у лістападзе 1943). Як камандзір узвода аўтаматчыкаў і ўзвода палкавой, затым армейскай артылерыі ўдзельнічаў у баях на 2-м і 3-м Украінскіх франтах. Быў двойчы паранены. З дзеючай арміяй прайшоў Румынію, Венгрыю, Югаславію, Аўстрыю. Служыў на Украіне, у Беларусі, на Далёкім Усходзе. Пасля дэмабілізацыі (1947) працаваў мастаком у гродзенскіх мастацкіх майстэрнях, стыльрэдактарам абласной газеты «Гродненская правда». У 1949—1955 гг. зноў служыў у Савецкай Арміі. У 1956—1972 гг.— літсупрацоўнік, затым літкансультант газеты «Гродненская правда», у 1972—1978 гг.— сакратар Гродзенскага абласнога аддзялення СП БССР. З 1978 г. жыве ў Мінску. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1978—1990), з 1989 г.— народны дэпутат СССР. У 1990 г. абраны прэзідэнтам Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». Ганаровы грама-

дзянін Ушацкага раёна Віцебскай вобласці. Член СП СССР з 1959 г.

Герой Сацыялістычнай Працы (1984). Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1980).

Аўтар кніг апавяданняў, аповесцей «Жураўліны крык» (1960), «Ход канём» (гумар, 1960), «Трэцяя ракета. Здрада» (1962), «Альпійская балада» (1964, па матывах аповесці пастаўлены ў 1967 г. балет на музыку Я. Глебава), «Адна ноч» (уключана аповесць «Пастка», 1965), «Аповесці» (1969), «Сотнікаў. Абеліск» (1972, па аповесці «Сотнікаў» пастаўлены ў 1977 г. кінафільм «Узыходжанне»), «Воўчая зграя» (1975, пастаўлена опера на музыку Г. Вагнера «Сцежкаю жыцця», 1980), «Аповесці і апавяданні» (1978), «Пайсці і не вярнуцца» (1979), «Знак бяды» (1984, пастаўлены кінафільм у 1988), «У тумане» (уключаны таксама аповесці «Мёртвым не баліць» і «Аблава», 1989), «Дажыць да світання» (1990), рамана «Кар'ер» (1987). У 1974 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах, у 1980—1982 гг.— Збор твораў у 4 тамах (уключаны таксама аповесці «Круглянскі мост», «Праклятая вышыня», «Яго батальён»). Выдаў кнігу крытыкі «Праўдай адзінай» (1984).

Працуе і ў галіне драматургіі кіно, тэатра. Па яго сцэнарыях пастаўлены кінафільмы «Трэцяя ракета» (1963), «Альпійская балада» (1966), «Дажыць да світання» (1975), «Воўчая зграя» (1976), 3-х серыйны тэлефільм «Доўгія вёрсты вайны» (1976), «Абеліск» (1977) і кароткаметражны фільм «Пастка» (1966). Аўтар п'есы «Рашэнне» (1972). На аснове аповесці «Сотнікаў» напісаў п'есу «Апошні шанц» (пастаўлена ў 1974), у 1979 г. пастаўлены спектакль «Пайсці і не вярнуцца». У маскоўскіх тэатрах пастаўлены яго п'есы: у 1976 — «Абеліск», у 1977 — «Скрыжаванне» (па матывах аповесцей «Сотнікаў» і «Круглянскі мост»).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1964) за аповесць «Трэцяя ракета», Дзяржаўнай прэміі СССР (1974) за аповесці «Абеліск» і «Дажыць да світання», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1978) за аповесці «Воўчая зграя» і «Яго батальён», Ленінскай прэміі (1986) за аповесць «Знак бяды».

## *Лукаш* БЭНДЭ



Лукаш Апанасавіч Бэндэ нарадзіўся 1.11.1903 г. у вёсцы Шчакоцк Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі імя У. І. Леніна (1926). Спачатку працаваў у Віцебскім ветэрынарным інстытуце, потым — у Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР, адначасова ў часопісе «Напагатове» і Дзяржаўным выдавецтве ў Ленінградзе і ў Ленінградскім тэатральным інстытуце, з 1935 г.— у Інстытуце рускай літаратуры (Пушкінскі Дом), загадваў кафедрай рускай літаратуры Ленінградскага абласнога настаўніцкага інстытута. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у войсках НКУС (Ленінград). З 1946 г.— выкладчык у педагагічных і настаўніцкіх інстытутах Даўгаўпілса, Ленінграда, Выбарга, Жытоміра, рэдактар Ленінградскага аддзялення Дзяржаўнага літаратурнага выдавецтва. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 23.12.1961 г.

Друкавацца пачаў у 1925 г. Выступаў у галіне крытыкі і літаратуразнаўства. Аўтар кніг «Янка Купала: Крытычны нарыс» (1932), «Андрэй Александровіч» (1932), а таксама шматлікіх артыкулаў і рэцэнзій у перыядычным друку. У 30-я гады склаў шэраг чытанак, хрэстаматый па беларускай літаратуры для школ.

## *Ядвіга* БЯГАНСКАЯ



Ядвіга Іосіфаўна Бяганская нарадзілася 29.2. 1908 г. у горадзе Улан-Удэ (Бурацiя) у сям'і чыгуначніка.

У 1922 г. з бацькамі вярнулася на Беларусь. У 1924 г. аселі на жыхарства ў Мінску. Скончыла літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Дзяржаўнага універсітэта (1930). Працавала выкладчыцай рускай і беларускай мовы і літаратуры ў школах Мінска. У лістападзе 1937 г. была арыштавана, асуджана на 10 год зняволення, адбывала тэрмін у калымскіх лагерах, дзе працавала на цяж-

кіх работах да дня свайго вызвалення. У лістападзе 1947 г. ёй было дазволена жыць на Гомельшчыне. Толькі пасля рэабілітацыі (1954) атрымала магчымасць вярнуцца ў Мінск. У 1956—1964 гг. працавала старшым рэдактарам перадач для дзяцей і юнацтва на Беларускім радыё. Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджана медалямі.

Памерла 3.4.1992 г.

У друку дэбютавала вершамі ў 1926 г. (часопіс «Малады араты»). Напісала для дзяцей кнігі аповесцей, апавяданняў «Далеко на Севере» (Магадан, 1954), «Жэнеў галубок» (1958), «Сустрэча з морам» (1962), «Зосіна зорачка» (1965), «Кожны марыць стаць Калумбам» (1968), «Над ракой Шушай» (1977), «Нечаканая сустрэча» (1980), «Сланечнікі» (1980), «Ля самага сіняга мора» (1982), «Сонцу і ветру насустрач» (1988).

Працавала ў галіне перакладу з польскай і славацкай моў на беларускую. З польскай пераклала аповесці Б. Ясенскага «Палю Парыж» (1932), Я. Корчака «Кароль Мацюсь Першы» (1970), Г. Бахляровай «Дом пад каштанамі» (1972), А. Богдая «Прыгоды маленькага Пінгвіна Пік-Пока» (1973), Э. Ажэшкі «Хам» (1975), Г. Паўшар-Кляноўскай «Нявыдуманыя гісторыі» (1976) і інш. Са славацкай — раманы М. Крно «Я вярнуся жывы» (1960), У. Мінача «Жывыя і мёртвыя» (1961), К. Ярунковай «Брат маўклівага ваўка» (1976), Я. Грушоўскага «Яношак» (1980) і інш.

---

## *Змітрок БЯДУЛЯ*



Змітрок Бядуля (Самуіл Яфімавіч Плаўнік) нарадзіўся 23.4.1886 г. у вёсцы Пасадзец Лагойскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і арандатара.

Вучыўся ў пачатковай яўрэйскай школе — хедары, у школе рабінаў — ешыбоце. Працаваў хатнім настаўнікам, а з 1902 г. канторшчыкам на лесараспрацоўках. У 1912 г. быў запрошаны ў Вільню на сталую працу ў беларускія культурныя арганізацыі. Разам з Янкам Купалам працаваў у газеце «Наша ніва». Летам 1915 г.

з Вільні вярнуўся ў родны Пасадзец, а неўзабаве пераехаў у Мінск, дзе працаваў у беларускім бежанскім камітэце. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі некалькі год працаваў у газеце «Савецкая Беларусь», быў рэдактарам дзіцячага часопіса «Зоркі» і краязнаўчага «Наш край». Уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», пасля — ва «Узвышша». На пачатку Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваўся з Беларусі. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Памёр 3.11.1941 г. каля Уральска.

Першы надрукаваны твор — абразок на беларускай мове «Пяюць начлежнікі» (газета «Наша ніва», 1910). У 1911—1912 гг. друкаваў вершы на рускай мове ў часопісах «На берегах Невы» (Пецярбург) і «Молодые порывы» (Вільня). У 1913 г. апублікаваў зборнік лірычных імпрэсій «Абразкі» (Пецярбург). У паслярэвалюцыйны час выйшлі кнігі паэзіі «Пад родным небам» (1922), «Буралом» (1925), «Паэмы» (1927), зборнікі апавяданняў «На зачарованых гонях» (1923), «Апавяданні» (1926), «Выбраныя апавяданні» (1926), «Танзілія» (1927), «Дэлегатка» (1928), «Тры пальцы» (1930), «Незвычайныя гісторыі» (1931), «Па пройдзеных сцежках» (1940), аповесці «Салавей» (1928, экранізавана і пастаўлена ў 1937, аднайменны балет ў 1939), «Набліжэнне» (1935), «У дрымучых лясах» (1939, часопіс «Полымя»), двухтомны раман «Язэп Крушынскі» (1929—1932), «Выбраныя творы» (1934). Шмат зборнікаў выбраных твораў выйшлі ў пасляваенныя гады. Для дзяцей выдадзены кнігі «Качачка-цацачка» (1927, казка), «Вясной» (1928, вершы), «Гаспадарка» (1930, вершы), «Мурашка-Палашка» (1939, вершаваная казка), «Люцік» (1940, верш), «Хлопчык з-пад Гродна» (1940, паэма), «Апавяданні» (1947), «Мае забавы» (1949, вершы), «Сярэбраная табакерка» (1958, казка і апавяданні), «Дзень добры!» (1979, вершы, казкі, апавяданні), асобныя вершы, казкі. У 1951—1953 гг. выйшаў Збор твораў у 4-х, у 1985—1989 гг.— у 5 тамах.

Выдаў даследаванне «Вера, паншчына і воля ў беларускіх народных казках і песнях» (1924), кнігу нарысаў «Дзесяць» (1930).

Пераклаў з яўрэйскай на беларускую мову

аповесць Шолама-Алейхема «Хлопчык Мотка» (1930), раман С. Годынэра «Чалавек з вінтоўкай» (1933), кнігу С. Каган «Апавяданні» (1940), паасобныя вершы Т. Шаўчэнкі, Ю. Будзяка.

---

## *Антон* БЯЛЕВІЧ



Антон Пятровіч Бялевіч нарадзіўся 27.5.1914 г. у вёсцы Дуброўка Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Магілёўскім палітасветным інстытуце (1933—1935). Працаваў загадчыкам аддзела пухавіцкай раённай газеты «За калгасы», нарысістам у газеце «Чырвоная змена», у 1939—1945 гг.— у газеце «Звязда». У час Вялікай Айчыннай вайны супрацоўнічаў у беларускім перыядычным друку, удзельнічаў у партызанскім руху на Віцебшчыне, закідваўся ў тыл ворага. У 1945—1947 гг.— загадчык аддзела паэзіі газеты «Літаратура і мастацтва», у 1947—1950 гг.— нарысіст газеты «Савецкі селянін». Член СП СССР з 1943 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 11.4.1978 г.

Першы верш апублікаваны ў 1938 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). У 1945 г. у Маскве выйшаў першы зборнік паэзіі «Человек из дубравы» ў перакладзе на рускую мову, у Мінску — вершаваная казка «Мароз-партызан». Аўтар кніжак паэзіі «На бацькоўскіх сцежках» (1946), «Свята» (1947), «Чалавек-сонца» (1947), «Паэмы» (1948), «Светач» (1950), «Дарогай шчасця» (1952), «Жывая рака» (1955), «Хлеб і нахлебнікі» (1957), «За салаўінымі гаямі» (1959), «Вясёлка над полем» (1961), «Залатыя ключы» (1963), «Высокі поўдзень» (1964), «Рэха навальніц» (1965), «Партрэт бацькаўшчыны» (1967), «Вінтоўка і плуг» (1968), «Любоў мая» (1971), «Гарынь» (1972), «А ў бары, бары» (1974), «З Дуброўкі краіна відна» (1974), «Сонцам заручоныя» (1975), «Сонечны гадзіннік» (1978), «Сосны ў жыце» (1980), «Мой шчодры бор» (1985). Выдаў зборнік вершаваных фельетонаў «Маштабны Міка-

нор» (1963). Напісаў для дзяцей кніжкі паэзіі «Ідзі, мой сын» (1953), «Тарасікава дарожка» (1962), «Дабрадзейны асілак» (1973), «Партызанскі рыбачок», (1976), аповесць «Малюнкі маленства» (1977).

Аўтар дакументальнай аповесці «Мінай Шмыроў» (1970), кніг нарысаў «Майстры сацыялістычнага земляробства» (1939), «Сонечным шляхам» (1950), «Добрыя людзі» (1957), «Людзі робяць вясну» (1959), «З добрай доляй заручоныя» (1960), «Хатынь: боль і гнеў» (1971), «Споведзь сэрца» (1978), кнігі літаратурных партрэтаў «Чарадзеі» (1970). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1968—1969).

Пераклаў на беларускую мову паэму А. Твардоўскага «За даллю — даль» (1962), паасобныя вершы А. Пракоф'ева, М. Бажана, А. Малышкі, І. Няходы і інш.

---

## *Рыгор* БЯРОЗКІН



Рыгор Саламонавіч Бярозкін нарадзіўся 3.7. 1918 г. у горадзе Магілёве ў сям'і служачага.

Вучыўся на рабфаку, на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1936—1938). У 1938 г. працаваў загадчыкам аддзела крытыкі ў рэдакцыі часопіса «Полымя рэвалюцыі», затым — літаратурным кансультантам у кабінеце маладога аўтара пры Саюзе пісьменнікаў БССР (1938—1939), загадчыкам аддзела крытыкі газеты «Літаратура і мастацтва» (1939—1941). Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны, у красавіку 1941 г., быў рэпрэсіраваны. 26 чэрвеня, калі фашысцкія войскі набліжаліся да Мінска, калону зняволеных вывелі з турмы на расстрэл. Р. Бярозкіну выпала застацца жывым. Ён накіраваўся ў Магілёў і ў ваенкамаце падаў заяву ў Чырвоную Армію. Прымаў удзел у баях пад Сталінградам, на Курскай дузе, пад Кіевам і ў Карпатах, на Сандамірскім плацдарме і ў вызваленні Прагі. Быў паранены. У ліпені 1949 г. рэпрэсіраваны другі раз. Зняволенне адбываў у лагерах Казахстана і Сібіры, працуючы на будаўніцтве шахт і электрастанцый. Быў вызвалены ў лістападзе 1955 г., рэабілітаваны ў ліпе-

ні 1956 г. У 1956—1967 гг. загадваў аддзелам крытыкі і паэзіі ў часопісе «Неман» (да 1960 «Советская Отчизна»). У 1967—1969 гг.— загадчык аддзела літаратуры рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», у 1970—1975 гг.— літсупрацоўнік бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 1.12.1981 г.

Выступаў у друку з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі з 1935 г. Першы зборнік артыкулаў «Паэзія праўды» выдаў у 1958 г. Затым выйшлі кнігі «Аркадий Кулешов: Критико-биографический очерк» (Масква, 1960), «Спадарожніца часу: Артыкулы аб паэзіі» (1961), «Свет Купалы: Думкі і назіранні» (1965; дапоўнены і перапрацаваны варыянт — «Мир Купалы», Масква, 1973), «Пімен Панчанка: Крытыка-біяграфічны нарыс» (1968), «Человек на заре: Рассказ о Максиме Богдановиче — белорусском поэте» (Масква, 1970, у перакладзе на беларускую мову выйшла ў 1981), «Постаці» (1971), «Кніга пра паэзію: Выбранае» (1974), «Звенні: Творчая індывідуальнасць і ўзаемадзеянне літаратур» (1976), «Аркадзь Куляшоў: Нарыс жыцця і творчасці» (1978), «Свет Купалы. Звенні: Выбранае» (1981), «Паэзія — маё жыццё» (1989).

---

## *Змітро БЯСПАЛЫ*



Змітро (Дзмітрый Аляксандравіч) Бяспалы нарадзіўся 28.8.1934 г. у вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1956 г. скончыў Рэчыцкі землеўпарадчы тэхнікум. Працаваў землеўпарадчыкам у Гродзенскай вобласці. Служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі (1958) паступіў на аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў у 1963). Адначасова працаваў у часопісе «Вожык» — супрацоўнікам, намеснікам рэдактара аддзела фельетонаў. З 1972 г.— адказны сакратар інфармацыйна-метадычнага бюлетэня «Родная

прырода», а з 1977 г.— пасля рэарганізацыі бюлетэня ў часопіс — яго галоўны рэдактар. Член СП СССР з 1974 г.

Першае гумарыстычнае апавяданне было надрукавана ў 1963 г. Піша на беларускай і рускай мовах. Выдаў зборнікі гумарыстычных апавяданняў «Сякера пад лаваю» (1970), «Ад варот паварот» (1977). Для дзяцей напісаў кнігі аб прыродзе Беларусі «Лясныя хітруны» (1969; дапоўненае выданне ў 1986), «У лясной каморы» (1972), «Мядзведзеў пачастунак» (1976), «Страшны звер» (1978), «Дзіўны птах» (1981), «Казкі Сіняга лесу» (1983), «С полным лукошком: Записки грибника» (1985), «Звери Беловежской пущи» (1987), «Птицы Беловежской пущи» (1988).

Склаў зборнік «Беларускія народныя жарты» (1970), адзін з аўтараў фотаальбома «Пакланіся прыродзе» (1984).

# В



*Мікола* ***ВАДАНОСАЎ***

Мікола (Мікалай Міхайлавіч) Ваданосаў нарадзіўся 4.1.1923 г. у горадзе Мінску ў сям'і ваеннаслужачага.

Дзяцінства прайшло ў вёсцы Котава Барысаўскага раёна. У 1939 г. паступіў у Мінскі дарожна-механічны тэхнікум. У Вялікую Айчынную вайну — радыст партызанскага злучэння на Маладзечаншчыне. Служыў у Савецкай Арміі, тройчы быў паранены. У 1946—1957 гг.— тэхнік на Беларускім радыёцэнтры. Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1959). З 1966 г.— рэдактар выдавецтва «Беларусь», у 1972—1982 гг.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1982).

Упершыню ў друку выступіў у 1948 г. Аўтар кніжак апавяданняў і аповесцей «У Баркоўскай пушчы» (1956), «Пераломнае лета» (1961), «Надзеі і здзяйсненні» (1963), «Адзінай маці сыны» (1968), «Пад чужым паролем» (1971), «Дзе віруе Бяроза» (1973), «Дзень і ўсё жыццё» (1988). Для дзяцей выйшлі кнігі «Першае знаёмства» (1954), «Аднагодкі» (1959), «Пабярэжцы» (1960), «Рачны госць» (1961), «Апошні вадзянік» (1964), «Хатабыч-малодшы» (1965), «Здарэнне на Сцюдзёнцы» (1967), «Двайная памылка» (1969), «Лясныя прыгоды» (1976), «Жыць, каб змагацца. Цімохава тайна» (1978), «Скарб Загорскай камяніцы» (1985). Напісаў зборнікі гумарыстычных апавяданняў «Прынцыповы аратар» (1966), «Сам сябе падвёў» (1973), «Левыя ногі» (1983). У 1983 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

*Аляксандр* ***ВАЗНЯСЕНСКІ***



Аляксандр Мікалаевіч Вазнясенскі нарадзіўся 17.7.1888 г. у сяле Чукалы Ардатаўскага раёна (Мардовія) у сям'і настаўніка.

Скончыў славяна-рускае аддзяленне гісторыка-філалагічнага факультэта Варшаўскага універсітэта (1913) і быў пакінуты пры універсітэце для падрыхтоўкі да прафесарскага звання. У 1915—1921 гг.— асістэнт, прыват-дацэнт гісторыка-філалагічнага факультэта Растоўскага універсітэта. У 1921—1927 гг.— дацэнт, у 1927—1930 гг.— прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пасля працаваў у Маскоўскім інстытуце кінематаграфіі, у Маскоўскім гарадскім педінстытуце, у Народным камісарыяце цяжкай прамысловасці (1930—1934). У 1934 г. быў высланы ў Ташкент, дзе да чэрвеня 1939 г. працаваў загадчыкам вучэбнай часткі курсавога навучання рабочых кадраў, эканамістам па планаванні і ўліку. З 1939 г.— прафесар Казанскага педінстытута. З 1940 г.— прафесар, а ў 1943—1947 гг.— дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта Казанскага універсітэта імя У. І. Ульянава-Леніна. Доктар філалагічных навук, прафесар.

Узнагароджаны медалём.

Памёр 16.1.1966 г.

У друку пачаў выступаць у 1913 г. з артыкуламі па гісторыі рускай класічнай літаратуры. Быў прадстаўніком культурна-гістарычнай школы ва ўсходнеславянскім літаратуразнаўстве. Аўтар артыкулаў пра М. Гогаля, М. Лермантава, І. Тургенева і інш. У 20-я гады ў часопісах «Полымя», «Узвышша», у «Працах БДУ» змясціў шэраг артыкулаў па тэорыі літаратуры і пытаннях развіцця беларускай літаратуры, беларускага тэатра. Выдаў працы «Паэтыка Максіма Багдановіча» (Коўна, 1926), «Асноўныя прынцыпы пабудовы беларускай навукі аб літаратуры» (1927), «Паэмы Янкі Купалы (Сюжэтная пабудова і стыль)» (1927). Доктарская дысертацыя «Исследования по истории новой белорусской литературы» (ч. 1—3) не апублікавана, зберагаецца ў бібліятэцы Казанскага універсітэта імя У. І. Ульянава-Леніна.

*Марыя* ***ВАЙЦЯШОНАК***



Марыя Антонаўна Вайцяшонак нарадзілася 3.5.1942 г. у горадзе Змяінагорску Алтайскага краю ў сям'і высланага з Беларусі польскага асадніка.

Пасля смерці бацькоў выхоўвалася ў дзіцячых дамах Змяінагорска, Масквы, Ракава. Працавала на Мінскім камвольным камбінаце прадзільшчыцай, адначасова вучылася завочна ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна на філалагічным факультэце (скончыла ў 1972). Працавала ў школах вёсак Боркі, Роўбіцк Пружанскага раёна, Схоліна, Дунілавічы Пастаўскага раёна, у Мядзелі, выхавацелькай дзіцячага сада ў Мінску. З 1974 г. на журналісцкай працы ў «Сельской газете», часопісах «Неман», «Беларусь», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1990 г.

У друку выступае з 1959 г. Аўтар кнігі нарысаў «Сярод блізкіх людзей» (1988). Выступае таксама з апавяданнямі і казкамі.

*Феліксас* ***ВАЙШНОРАС***



Феліксас Вайшнорас нарадзіўся 18.5.1897 г. у вёсцы Пілвішкіс Вілкавішскага раёна (Літва) у рабочай сям'і.

Скончыў Камуністычны універсітэт нацыянальных меншасцей Захаду ў Маскве (1925). У 1919 г.— сакратар Пілвішскага падрайкома КП Літвы. У 1921—1923 гг. палітвязень каўнаскай турмы. З 1923 г., пасля абмену палітвязнямі, жыў у СССР. Працаваў у рэдакцыях газет і часопісаў у Маскве і Смаленску. З 1930 г. у Мінску — супрацоўнік, у 1934—1937 гг.— рэдактар газеты «Чырвоны араты» (на літоўскай мове). Быў сакратаром літоўскай секцыі СП БССР. У 1937 г. рэпрэсіраваны і высланы з Беларусі. Рэабілітаваны ў 1956 г. У 1944—1945 гг. служыў у Савецкай Арміі (16-я літоўская дывізія). З 1945 г. жыў у Вільнюсе, працаваў у выдавецтве, грамадскіх таварыствах. Член СП СССР з 1934 г.

Заслужаны дзеяч культуры Літоўскай ССР (1965).

Памёр 21.8.1972 г.

Вершы пачаў пісаць у каўнаскай турме. У 1934 г. у Мінску выдаў на літоўскай мове зборнік паэзіі «Пад сцягам працы і барацьбы». Напісаў аўтабіяграфічную кнігу «Да светлага жыцця» (Вільнюс, 1960). Пераклаў на літоўскую мову (пад псеўданімам Ф. Садайніс) паэму Янкі Купалы «Над ракою Арэсай» (1935), асобныя творы Якуба Коласа, Т. Кляшторнага, І. Харыка, рускіх і латышскіх пісьменнікаў.

---

## *Лідзія* ВАКУЛОЎСКАЯ



Лідзія Аляксандраўна Вакулоўская нарадзілася 20.2.1926 г. у горадзе Шчорсе Чарнігаўскай вобласці (Украіна) у сям'і ваеннаслужачага.

Скончыла акцёрскі факультэт Кіеўскага тэатральнага інстытута імя Карпенкі-Карага (1952). З 1954 г.— літсупрацоўнік раённай газеты «Сталинский путь» на Чукотцы, у 1958—1965 гг.— абласной газеты «Калиниградская правда». З 1966 г. жыла ў Мінску. Член СП СССР з 1963 г.

Памерла 28.8.1991 г.

Выступала ў друку з 1954 г. Пісала на рускай мове. Выйшлі асобнымі выданнямі нарыс «Первый снег» (Магадан, 1956), аповесці «Толино лето» (Калінінград, 1960), «Свой след на земле» (Калінінград, 1961), «Пурга уходит через сутки» (Магадан, 1963), «Сашка, моя знакомая» (Масква, 1964), «Последняя радиограмма» (Магадан, 1965), кнігі аповесцей, апавяданняў «200 километров до суда» (Магадан, 1969), «Хозяйка Птичьей скалы» (Магадан, 1971), «Улица вдоль океана» (Масква, 1972), «Женщины» (1975), «Свадьбы» (Масква, 1979), «Путевка в Белую долину» (1980), «Письма любимого человека:» (1982), «Вступление в должность» (Масква, 1985), «И снятся белые снега» (1986), «История одной любви» (1988), «Сколько бы ни пришлось, буду ждать...» (1990). Аўтар сцэнарыяў мастацкіх фільмаў «Лушка» (пастаўлены ў 1964) і «Саша-Сашачка» (пастаўлены ў 1966).

*Эдуард* ВАЛАСЕВІЧ



Эдуард Станіслававіч Валасевіч нарадзіўся 12.3.1918 г. у горадзе Магілёве ў сям'і чыгуначніка.

У 1935—1936 гг. працаваў грузчыкам на чыгунцы. Скончыў літаратурны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1941). З 1941 г. у Савецкай Арміі — спачатку ў 1-м камуністычным знішчальным батальёне пры ЦК КП Беларусі, потым — у дзеючай арміі на Бранскім, Заходнім франтах. Быў цяжка паранены (1943). З лістапада 1943 г. працаваў у Дзяржаўным архіве Аджарскай АССР (г. Батумі), з 1944 г. выкладаў фальклор і рускую літаратуру ў Магілёўскім педінстытуце. Загадваў аддзелам у абласной газеце «За Радзіму». У 1952 г. пераехаў у Мінск. Працаваў у часопісах «Полымя», «Вожык», у Белдзяржфілармоніі, у 1970—1974 гг. быў дырэктарам Беларускага аддзялення Усесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах СП СССР. Член СП СССР з 1950 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

У друку выступае з 1938 г. (газета «Камунар Магілёўшчыны»). Першую кніжку «Вершы і байкі» выдаў у 1954 г. Аўтар зборнікаў баек «Залатая рыбка» (1957), «Як дбаеш — так і маеш» (1958), «Арліны суд» (1959), «Соль» (1962), «На вясёлай хвалі» (1967), «Казёл адпушчэння» (1968), «Туды і рак з кляшнёй» (1970), «Сур'ёзна і з усмешкай» (1973), «Палюсы» (байкі і санеты, 1977), «Рагаты анёл» (1978), «Кругавая парука» (1979), «Бегемот і іншыя» (1982), «Яечня на далоні» (1984), «Лірыка і сатыра: Выбранае» (1988), а таксама кніжак-баек для дзяцей «Камар-званар» (1959), «Байкі» (1960), «Горкі мёд» (1967), «Спех — курам на смех» (1982), казкі ў вершах «Дняпроўскія чарадзеі» (1963, 1988).

Камедыі, скетчы выйшлі ў зборніках «Свет клінам не сышоўся» (1958) і «З хворай галавы на здаровую» (1961).

*Пётр ВАЛКАДАЕЎ*



Пётр Іванавіч Валкадаеў нарадзіўся 22.11.1911 г. у вёсцы Кажамякі Кінель-Чаркаскага раёна Куйбышаўскай вобл. (Расія) у сялянскай сям'і.

У 1929 г. стаў працаваць трактарыстам у калгасе. Скончыў літаратурны факультэт Куйбышаўскага педагагічнага інстытута (1936), два гады працаваў дырэктарам сярэдняй школы ў Кінель-Чаркаску. У 1939 г. прызваны ў Савецкую Армію. Служыў у якасці інструктара-літаратара дывізійнай газеты «Новый путь». У 1941 г. удзельнічаў у баях на Заходнім фронце, быў кантужаны, у 1942—1944 гг.— у партызанскім атрадзе № 122 на Магілёўшчыне. Пасля вайны працаваў у рэдакцыях газет «Советская Белоруссия», «Настаўніцкая газета», «Сталинская молодежь», карэспандэнтам «Литературной газеты». Член СП СССР з 1949 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 4.11.1973 г.

Пісаў на рускай мове. Першы верш надрукаваў у 1934 г. (часопіс «Волжская новь»). Аўтар паэмы «Чандра» (1952), зборнікаў вершаў «Родная сторона» (1950), «Зеленая пристань» (1960), «Ливень» (1967), «Далекие сполохи» (1981), кнігі нарысаў «Строители» (1956), «Механізатар Андрэй Худзякоў» (1961), «Поиски квадрата» (1962), «Ветеран» (1963), кніжкі для дзяцей «Егоркины рапорты» (1958) і аповесці «Чей мальчишка?» (1961).

*Адольф ВАРАНОВІЧ*



Адольф Усцінавіч Вардновіч нарадзіўся 15.6. 1940 г. у вёсцы Мікольцы Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Мядзельскай сярэдняй школы (1957) паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча (скончыў у 1960). Працаваў у мастацкай майстэрні Аршанскага льнокамбіната мастаком па тканінах, а таксама ў дзіцячай мастацкай школе выкладчыкам. З 1989 г.— член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі Дзяржаўнага камітэта

БССР па тэлебачанні і радыёвяшчанні. Член СП СССР з 1979 г.

Першыя апавяданні апублікаваў у 1970 г. (штотыднёвік «Літаратура і мастацтва»). Выдаў кнігі аповесцей і апавяданняў «Высокі падмурак» (1978), «Агні хат» (1986).

---

## *Алена* ВАСІЛЕВІЧ



Алена Сямёнаўна Васілевіч нарадзілася 22.12. 1922 г. у засценку Даманшчына (цяпер вёска Ліпнікі) Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і ляснога аб'ездчыка.

Засталася без бацькоў на восьмым годзе жыцця. Выхоўвалася ў сваякоў. Скончыла літаратурны факультэт Рагачоўскага настаўніцкага інстытута (1941). У час Вялікай Айчыннай вайны працавала бібліятэкарам у шпіталі, пісарам страявой часці, начальнікам бібліятэкі. У 1946 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працавала літкансультантам у Курскім абласным выдавецтве (1946—1950). З 1950 г.— загадчык аддзела культуры часопіса «Работніца і сялянка», а ў 1972—1980 гг.— загадчык рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Мастацкая літаратура», у 1981—1983 гг.— загадчык рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1977).

Першы мастацкі твор (аповесць «У прасторах жыцця») надрукавала ў 1947 г. (часопіс «Беларусь»). Выйшлі кніжкі апавяданняў «Блізкія знаёмыя» (1954), «Заўтра ў школу» (1956), «Сябры» (1958), «Апавяданні» (1959), «Падслухала сэрца» (1960), «Калінавая рукавічка» (1963), «Я з вамі» (1964), «Пісар страявой часці» (1969), «Адно імгненне» (1975), «Шурка Рэмзікаў» (1985), зборнік апавяданняў і аповесцей «Мыс Добрай Надзеі» (1977), аповесць «Шляхі-дарогі» (1950), цыкл аповесцей «Расці, Ганька» (1966), «Доля цябе знойдзе» (1968), «Новы свет» (1970), «Пачакай, затрымайся...»

(1970), якія склалі тэтралогію «Пачакай, затрымайся...» (1972). Аўтар кніг «Люблю, хвалююся, жыву» (нататкі, эсэ, 1986), «Элегія» (апавяданні, эцюды, эсэ, 1988). Выдадзены Выбраныя творы ў 3 тамах (1982—1983).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за тэтралогію «Пачакай, затрымайся...».

---

## *Галіна ВАСІЛЕЎСКАЯ*



Галіна Ануфрыеўна Васілеўская нарадзілася 15.1.1927 г. у гарадскім пасёлку Клічаў Магілёўскай вобласці ў сям'і рабочага.

З 1932 г. жыве ў Мінску. У 1945 г. здала экстэрнам экзамены за дзесяцігодку. Скончыла аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1950). Працавала радыёжурналістам, літсупрацоўнікам часопіса «Сельская гаспадарка Беларусі». У 1959—1977 гг.— рэдактар аддзела часопіса «Работніца і сялянка». З 1977 г.— рэдактар аддзела нарыса, з 1979 г.— адказны сакратар часопіса «Полымя». У 1982—1988 гг.— дырэктар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР. Член СП СССР з 1970 г.

Узнагароджана медалём.

Літаратурнай працай займаецца з 1953 г. Пісала нарысы, артыкулы. У 1959 г. апублікавала першае апавяданне. Аўтар аповесцей для дзяцей і юнацтва «Маланка ўначы» (1963), «Малюнак на снезе» (1969), «Я еду на вярблюдзе» (1970), «Бывай, Грушаўка» (1979), «Юныя назаўсёды» (1983), «Крылы, або Адзін год з жыцця Віталя Пятроўскага» (1987). У 1986 г. выйшла «Выбранае».

## *Іосіф ВАСІЛЕЎСКІ*



Іосіф Іосіфавіч Васілеўскі нарадзіўся 8.12. 1911 г. у горадзе Данецку (Украіна) у сям'і рабочага.

У 1922 г. з бацькамі пераехаў на Беларусь. Скончыў Аршанскія педагагічныя курсы (1928—1930). Пасля заканчэння тэатральна-драматургічных курсаў у Мінску (1931) быў акцёрам БДТ-2 у Віцебску, літработнікам газеты «Ленінскі прызыў» у Оршы. У 1933 г. прызваны ў Чырвоную Армію. У 1937—1952 гг. працаваў акцёрам у тэатрах Смаленска, Жытоміра, Днепрадзяржынска, Усць-Каменагорска, Разані, Іжэўска, Калугі. З 1967 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны медалямі.

Першыя вершы былі надрукаваны на беларускай мове ў 1931 г. (часопіс «Маладняк»). З 1935 г. піша на рускай мове. У Смаленску выйшлі кнігі паэзіі «В добрый час» (1954), «Родное раздолье» (1956), «Новь» (1959), «Авось да небось» (1960), «Лирика» (1961), «Трудный экзамен» (паэма, 1962), «Нас попробуй обгони» (1963). У Маскве выйшлі нарыс «Оружием сатиры» (1959), «От зорьки до зорьки» (1960), зборнікі вершаў «День за днем» (1963), «Свершение» (1966), «Чибис» (1973), «Зимнее солнце» (1979), «Призадумалась река» (1982). У Мінску выдаў зборнік паэзіі «Пальмы и сосны» (1969), «Мой спутник солнце» (выбраныя вершы, 1971), «Продолжение» (1981), «Река времени» (1989), кнігі для дзяцей «Птичья тревога» (1968), «Диковины» (1972), «Веселый поезд» (1977), «Безымянные острова» (1984), «Снежные лебеди» (1987).

Працуе як перакладчык з беларускай на рускую мову. У яго перакладзе асобнымі выданнямі выйшлі зборнік песень «Хоры а капелла» (1968), зборнік вершаў М. Хведаровіча «Кленовый сок» (1972), казка А. Якімовіча «Коваль-Вернидуб» (1974), «Извечной песни голоса: Белорусская лирика» (1980).

## *Пятро ВАСІЛЕЎСКІ*



Пятро (Пётр Савельевіч) Васілеўскі нарадзіўся 15.5.1922 г. у вёсцы Сямёнаўка Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Журавіцкай дзесяцігодкі (1940) быў прызваны ў Савецкую Армію. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у баях на Карэльскім фронце. З 1942 г.— карэспандэнт армейскай газеты «Сталинский боец». Быў двойчы паранены. У 1944 г. дэмабілізаваны, з 1945 г. працаваў у рэдакцыі газеты «Сталинская молодежь», у 1946 г. накіраваны ў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ. У 1947 г. паступіў у школу-студыю МХАТа і ў той жа год перайшоў на рэжысёрскі факультэт Усесаюзнага інстытута кінематаграфіі (скончыў у 1953). У 1953—1988 г. працаваў рэжысёрам на кінастудыі «Беларусьфільм». Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Піша на беларускай і рускай мовах. Першыя апавяданні апублікаваў у 1942 г. у вайсковых газетах. У 1956 г. выйшла першая кніга — аповесць «Новый день». Выйшлі кнігі «Первопуток» (1958), «Красота человеческая» (1980), «Вечные молодожены» (1987).

Працуе пераважна ў галіне драматургіі. Аўтар п'ес «Год дзевяцьсот семнаццаты» («Год здзяйсненняў», апублiквана і пастаўлена ў 1957), «Чалавек вярнуўся» (1961, пастаўлена ў 1959), «Любоў, Надзея, Вера...» (1962, пастаўлена ў 1960), «Странный дом» (апублікавана і пастаўлена ў 1962), «Твой заўтрашні дзень» (пастаўлена ў 1967). У 1968 г. выйшаў зборнік п'ес «Твой заўтрашні дзень», у 1984 г.— «Образ жизни».

Як рэжысёр, сцэнарыст прымаў удзел у стварэнні мастацкіх і дакументальных кінафільмаў «Беларускі канцэрт», «Дзеці партызана», «Строгая жанчына», «Апавяданні аб юнацтве», «Палеская легенда», «Рагаты бастыён», «Выкрыццё», «Беларусь сёння», «Крокі ў заўтра», тэлефільма аб жыцці і творчасці Якуба Коласа «Жывіце даўжэй, хлопцы» і інш.

## *Міхась* ВАСІЛЁК



Міхась Васілёк (Міхаіл Восіпавіч Касцевіч) нарадзіўся 14.11.1905 г. у вёсцы Баброўня Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і лесніка.

Сярэднюю адкукацыю атрымаў у 1921 г. у Казлове (Мічурынску), дзе разам з бацькамі быў у бежанстве. У 1922 г. вярнуўся на Гродзеншчыну. Уступіў у Беларускую сялянска-рабочую грамаду. Арганізоўваў гурткі Таварыства беларускай школы. За ўдзел у рэвалюцыйным руху польскія ўлады неаднаразова арыштоўвалі і саджалі ў турму. У 1939 г. быў мабілізаваны ў польскае войска, у час баёў трапіў у нямецкі палон. У жніўні 1941 г. уцёк з палону, дабраўся да родных мясцін і ўключыўся ў падпольную барацьбу. Кіраваў Скідальскім падпольным антыфашысцкім камітэтам, пад псеўданімам Язэп Гром выступаў у партызанскім друку. Пасля вызвалення працаваў у скідальскай раённай газеце «Чырвоны сцяг» (1944—1946), а пазней — у абласной газеце «Гродненская правда». Член СП СССР з 1945 г.

Памёр 3.9.1960 г.

У друку пачаў выступаць у 1926 г. у віленскіх выданнях. Першы зборнік лірыкі «Шум баравы» (Вільня, 1929) быў канфіскаваны паліцыяй. Рукапіс другога зборніка быў забраны дэфензівай і знішчаны (1934). У 1937 г. у Вільні выйшаў зборнік «З сялянскіх ніў». У савецкі час выдадзены кнігі паэзіі «Выбраныя вершы» (1950), «Выбраныя творы» (1955), «Зоры над Нёманам» (1963), «Вершы» (1973).

## *Яўген* ВАСІЛЁНАК



Яўген Пятровіч Васілёнак нарадзіўся 26.12. 1917 г. у горадзе Орше ў сям'і чыгуначніка.

Сярэднюю адукацыю атрымаў у Аршанскай чыгуначнай школе. У 1934—1935 гг. вучыўся ў Магілёўскім педагагічным інстытуце на літаратурным факультэце. Працаваў у шклоўскай раённай газеце «Прамень камунізма», у рэдакцыях раённых і гарадскіх газет Барысава, Багушэўска, Оршы. У 1939 г. накіраваны на

журналісцкую працу на Далёкі Усход (працаваў у Хабараўску, Усурыйску, Уладзівастоку). У 1943—1945 гг.— у радах Савецкай Арміі, служыў у рэдакцыі дывізійнай газеты «Боец-патриот», у 1945—1948 гг.— карэспандэнт маскоўскай газеты «Гудок» у Алма-Аце. З 1948 г. жыў у Мінску — быў рэдактарам БелТА, карэспандэнтам газеты «Труд» па Беларускай ССР, загадчыкам аддзела публіцыстыкі часопіса «Маладосць». У 1958—1966 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Неман». Член СП СССР з 1953 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 23.9.1973 г.

У друку спачатку апублікаваў вершы (1936), потым прозу (1939). Выйшлі зборнікі аповесцей і апавяданняў «Зялёныя агні» (1954), «Прызванне» (апавяданні і нарысы, 1956), «Выпадковы прыпынак» (1957), «Розныя дарогі» (1957), «Таццяна Ларына» (1964), «Вячэрняя размова» (1968), «Сімфонія са спагнаннем» (1969), «Забыты вензель» (1970), «На перагоне» (1973) і драма «Каралеўскі гамбіт» (1959). У 1977 г. выдадзены Выбраныя творы ў 2 тамах.

Пераклаў на беларускую мову аповесць І. Пятрова «Нончына каханне» (1961), кнігу Л. Касіля «Пра жыццё зусім добрае» (1961), раманы С. Улуг-задэ «Абноўленая зямля» (1973) і А. Ірасека «Скалакі» (з М. Татурам, 1961), а таксама творы іншых пісьменнікаў.

---

## *Галіна ВАСЮКОВА*



Галіна Георгіеўна Васюкова нарадзілася 21.3. 1927 г. у горадзе Барысаве Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

У 1944 г. была вывезена фашысцкімі акупантамі ў Германію, працавала там на фабрыцы ў мястэчку Альбендорф. У сакавіку 1945 г. ёй удалося ўцячы ў Чэхаславакію, дзе каля горада Упіцэ ўступіла ў атрад Супраціўлення. Вучылася ў Брэсцкім музычным вучылішчы (1949—1951 гг.), у 1967 г. скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1964 г.

Выступае ў друку з 1956 г. Піша на рускай

мове. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей для дзяцей «Про Наташу» (1957), «Старший брат» (1959), «Андрюшины знакомые» (1964), «Разные истории» (1966), «Куклоград» (вершы, Калінінград, 1970), «С Маринкой не играю» (Калінінград, 1971), аповесцей «Ветер с полей» (1961, часопіс «Неман»), «Золотые росы» (1962), «Тревожные дни» (1983).

---

## *Ніна* ВАТАЦЫ



Ніна Барысаўна Ватацы нарадзілася 14.5.1908 г. у горадзе Вендэні (цяпер горад Цэсіс, Латвія) у сям'і служачых.

Скончыла літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1930). У 1930—1936 гг. і ў 1945—1990 гг. працавала ў Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна на пасадах ад памочніка бібліятэкара да галоўнага бібліёграфа. З канца 1936 г. да 1941 г. была на бібліятэчнай рабоце ў Архангельску, ва Ульянаўску, мастаком — у Кіраве. У 1942—1945 гг.— начальнік бібліятэкі эвакуацыйнага шпіталя (г. Мелекес Ульянаўскай вобласці). У 1946—1956 гг. выкладала па сумяшчальніцтве бібліяграфію на бібліятэчным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Член СП СССР з 1979 г.

Узнагароджана медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1963).

Выступае пераважна ў галіне бібліяграфіі і літаратуразнаўства. Першы артыкул апублікавала ў 1932 г. Склала бібліяграфіі «Мастацкая літаратура Савецкай Беларусі» (за 1917—1960 гг.— 1962; за 1961—1968 гг.— 1971), «Беларускае савецкае літаратуразнаўства і крытыка. 1945—1963» (1964), «Беларуская савецкая драматургія. 1917—1965» (1967), рэкамендацыйны бібліяграфічны даведнік «Белорусская литература» (з М. Каваленка, Р. Сіпаковай, Масква, 1988), бібліяграфічныя даведнікі і памяткі пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, К. Чорнага, К. Крапівы, М. Лынькова, П. Глебкі, П. Труса, П. Пестрака, І. Шамякіна, П. Панчанкі і інш.

Аўтар бібліяграфічнага даведніка «Максім Багдановіч» (1961), альбома-выстаўкі (з А. Лойкам, 1968), шэрага артыкулаў, складальнік зборніка ўспамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра М. Багдановіча «Шлях паэта» (1975), працы «Максім Багдановіч: Паказальнік твораў, аўтографаў і крытычнай літаратуры» (1977). Напісала брашуры «Лев Толстой и Белоруссия» (з Н. Лапідусам, 1978), «Пушкин и Белоруссия» (1979).

Аўтар кніг «Песня Максіма» (1981), «Шляхі» (1986).

---

## *Анатоль* ВЕРАБЕЙ



Анатоль Леанідавіч Верабей нарадзіўся 10.8. 1950 г. у вёсцы Вайнілавічы Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1972). Працаваў навуковым супрацоўнікам Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР (1972—1974). Пасля заканчэння аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1974) — навуковы супрацоўнік гэтага інстытута (1977—1990). З 1990 г.— дацэнт кафедры беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1988 г.

У друку выступае з 1976 г. як крытык і літаратуразнавец. Выдаў кнігі «Максім Танк і польская літаратура» (1984), «Жывая повязь часоў; Нарыс творчасці Уладзіміра Караткевіча» (1985), «Беларуска-рускі паэтычны ўзаемапераклад 20—30-х гадоў» (1990), брашуру «Паэзія Максіма Танка» (1983). Удзельнічаў у выданні творчай спадчыны П. Пестрака (Збор твораў у 5 тамах, т. 3, 1985), У. Хадыкі («На ўзвеях дзён», 1986), У. Караткевіча (Збор твораў у 8 тамах, 1987—1991).

## *Уладзімір* ВЕРАМЕЙЧЫК



Уладзімір Міхайлавіч Верамейчык нарадзіўся 1.11.1937 г. у вёсцы Петрыцкае Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

У 1955 г. скончыў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча. Год працаваў старшым піянерважатым Міхалкаўскай сярэдняй школы Мазырскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1956—1959). Пасля дэмабілізацыі паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў у 1964). Працаваў завучам, дырэктарам Ведрыцкай васьмігадовай школы Рэчыцкага раёна, пасля рэарганізацыі гэтай школы ў сярэднюю (1966) — яе дырэктар. Член СП СССР з 1976 г.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалём.

Першы верш надрукаваў у 1955 г. (рэчыцкая раённая газета). Аўтар зборнікаў вершаў «Прыпяць» (1973), «Яснасць» (1978), «Люблю!» (1981), «Клянуся Прыпяццю» (1988), кнігі публіцыстыкі «Гарызонты сельскіх педагогаў: Запіскі дырэктара школы» (1984).

Выступае і як сатырык.

## *Зоська* ВЕРАС



Зоська Верас (Войцік Людвіка Антонаўна) нарадзілася 30.9.1892 г. у пасёлку Мяджыбаж Лятычаўскага раёна Хмяльніцкай вобласці (Украіна) у сям'і ваеннаслужачага.

У 1912 г. скончыла прыватную жаночую гімназію ў Гродне, у 1914 г.— агародніцка-пчалярскія курсы ў Варшаве. Удзельніца гродзенскага гуртка беларускай моладзі (1909—1913). У 1916—1917 гг. працавала ў Мінскім аддзеле Беларускага таварыства дапамогі пацярпелым ад вайны. З 1923 г. жыве ў Вільнюсе. У 1924—1929 гг.— адміністратар рэдакцыі газет Беларускай сялянска-рабочай грамады, у 1927—1931 гг.— рэдактар дзіцячага часопіса «Заранка», у 1934—1935 гг.— дзіцячага часопіса «Пралескі», у 1928—1939 гг.— старшыня Беларускага кааператыўнага таварыства «Пчала», аднача-

сова (1934—1938) — рэдактар пчалярскага часопіса «Беларуская борць» (Вільня). Вынесла з віленскай турмы «Лукішкі» вершы М. Машары і выдала за свой кошт яго першы зборнік «Малюнкі» (1928). Член СП СССР з 1982 г.

Памерла 8.10.1991 г.

Друкавацца пачала ў 1907 г. (часопіс «Падснежник», Кіеў). На беларускай мове выступіла з абразкамі пад псеўданімам Мірко ў 1911 г. (газета «Наша ніва»). Аўтар «Беларуска-польска-расейска-лацінскага батанічнага слоўніка» (Вільня, 1924), брашуры «Гісторыя ўжывання зёлак у лячэнні» (1934), кнігі вершаў і апавяданняў для дзяцей «Каласкі» (1985). Напісала ўспаміны пра М. Багдановіча, У. Галубка, Ядвігіна Ш. і інш.

Для дзіцячага тэатра з украінскай мовы пераклала п'есы Р. Завадовіча «Князь Марцыпан» (Вільня, 1929), Ю. Ігарава «Сірата» (Вільня, 1929), з рускай — «Лясныя хаткі» В. Біянкі (Вільня, 1931).

---

## *Алесь ВЕЧАР*



Алесь (Аляксандр Сцяпанавіч) Вечар нарадзіўся 25.3.1905 г. у вёсцы Машчыцы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1923 г. паступіў на першы курс Слуцкага сельгастэхнікума. У 1924—1925 гг. загадваў хатай-чытальняй у вёсцы Паськова Горка Старадарожскага раёна. Пасля заканчэння агранамічнага факультэта Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі (1929) быў залічаны аспірантам навукова-даследчага Інстытута сельскай і лясной гаспадаркі БССР. Быў адным з кіраўнікоў Аршанскай філіі «Маладняка», у 1928—1930 гг. узначальваў Мінскую філію БелАПП. У 1930—1931 гг. працаваў выкладчыкам у Гарадоцкім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі (Віцебская вобласць). З 1933 г. загадваў аддзелам у навукова-даследчым Інстытуце харчовай прамысловасці БССР. У 1937—1959 гг. жыў у Краснадары — працаваў загадчыкам кафедры ў Кубанскім сельскагаспадарчым інстытуце, дацэнтам, загадчыкам кафедры Краснадарскага інстытута харчовай прамысловасці.

З 1959 г.— загадчык аддзела біяхіміі раслін Інстытута біялогіі, з 1970 г.— загадчык лабараторыі біяхіміі і малекулярнай біялогіі Інстытута эксперыментальнай батанікі імя В. Ф. Купрэвіча АН БССР. Акадэмік АН БССР. Доктар біялагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1978 г.

Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларускай ССР (1975).

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў і медалямі.

Памёр 4.4.1985 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1926 г. (часопіс «Аршанскі маладняк»). Аўтар зборнікаў вершаў «Кола дзён» (1930), «Зварот да слова» (1977), паэмы «Мая гімназія» (часопіс «Полымя», 1979). Пераклаў на беларускую мову паэму А. С. Пушкіна «Домік у Каломне» (1937).

Аўтар навуковых прац па біяхіміі раслін і тэхнічнай біяхіміі «Фізіялогія і біяхімія бульбы» (з М. Ганчарыкам, 1979), «Водородные ионы в биосфере» (1986) і інш.

---

## *Змітро ВІТАЛІН*



Змітро Віталін (Дзмітрый Іванавіч Сергіевіч) нарадзіўся 15.7.1910 г. у горадзе Калінкавічы ў сям'і чыганачніка.

Скончыў чыгуначную дзевяцігодку ў Калінкавічах. З 1929 г. жыў у Мінску. Працаваў радыёманцёрам, затым карэспандэнтам Радыёцэнтра БССР. Быў членам БелАПП. Вясной 1932 г. па закліку камсамола Беларусі паехаў працаваць адказным сакратаром крычаўскай раённай газеты, а ў верасні паступіў вучыцца на творчае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута. 10.8.1933 г. быў рэпрэсіраваны і высланы ў Марыінск (Расія). Уцёк з высылкі. Мяркуецца, што служыў у арміі.

Прапаў без вестак у час Вялікай Айчыннай вайны.

З вершамі ў друку пачаў выступаць у 1930 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборніка вершаў «Будзем жыць!» (1932). Перакладаў з рускай мовы.

## *Васіль ВІТКА*



Васіль Вітка (Цімох Васільевіч Крысько) нарадзіўся 16.5.1911 г. у вёсцы Еўлічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Слуцкай прафтэхшколы (1928) працаваў слесарам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце, у заводскай шматтыражцы (1929—1930), рэдакцыях газет «Камуніст» (Бабруйск, 1930—1933), «Ударнік» (Жлобін, 1933—1935), «Чырвоная змена» (1935—1937), «Літаратура і мастацтва» (1937—1938) і часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1938—1939). Удзельнічаў у паходзе Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь і да самага пачатку вайны працаваў сакратаром Беластоцкага абласнога аддзялення СП БССР. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны — у рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь», а з 1942 г.— у аддзеле прапаганды і агітацыі ЦК КПБ рэдактарам масавых выданняў для акупіраваных раёнаў. Супрацоўнічаў у сатырычных часопісах «Партызанская дубінка» і «Раздавім фашысцкую гадзіну». З дня ўтварэння часопіса «Беларусь» (студзень 1944) працаваў яго адказным сакратаром, з 1948 г.— намеснікам, з 1951 г.— галоўным рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва». У 1957—1974 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка». У 1974—1987 гг.— член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм». Член СП СССР з 1943 г.

Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума — «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1970).

Друкавацца пачаў у 1928 г. Першы зборнік вершаў «Гартаванне» выдадзены ў 1944 г. у Маскве. Затым выйшлі зборнікі паэзіі «Поўдзень» (1946), «Вернасць» (1953), «Ружа і штык» (1958), «Паверка» (1961), «Вершы» (1968), «Беларуская калыханка» (1971), «Праводзіны лета» (1972), «Вышыні святла» (1977), «Случчына» (1981), «Трэція пеўні» (1988), зборнік сатыры і гумару «Для дома, для альбома і трохі для эпохі» (1983). Для дзяцей выдаў кніжкі паэзіі і вершаваных казак «Вавёрчына

гора» (1948), «Буслінае лета» (1958), «Казка пра цара Зубра» (1960), «Дударык» (1964), «Азбука Васі Вясёлкіна» (1965), «Казкі» (1968, 1976), «Чытанка-маляванка» (1971), «Хто памагае сонцу» (1975), «Ладачкі-ладкі» (1977), «Мы будуем метро» (1979), «Мінскія баллады» (1982), «Казкі і краскі», «Госці», «Загадка пра зярнятка» (усе 1984), «Дзецям» (выбраныя творы ў дзвюх кнігах, 1986), «Свята дружбы» (1987), зборнік апавяданняў «Зайчык-вадалаз» (1962). У 1973 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Аўтар п'ес «Прамень будучыні» (1948), «Шчасце паэта» (1951, пастаўлена ў 1952).

Напісаў многа літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў на маральна-этычныя і выхаваўчыя тэмы. У 1977 г. выдаў кнігу дзённікаў, нарысаў і апавяданняў «Дзеці і мы», у 1982 г.— кнігу «Урокі», у 1988 г.— «Азбука душы». Адзін з аўтараў чытанак «Роднае слова» для 1 (1969), 2 (1970) і 3 (1988) класаў.

На беларускую мову пераклаў паэму У. Маякоўскага «Добра!» (1940, з Р. Ланьковым), «Паны Галаўлёвы» М. Салтыкова-Шчадрына (1956), кнігу В. Сухамлінскага «Блакітныя жураўлі» (1971), творы рускіх, украінскіх, латышскіх, балгарскіх і польскіх пісьменнікаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1972) за кнігі «Беларуская калыханка», «Казкі» і «Чытанка-маляванка». У 1978 г. узнагароджаны міжнародным ганаровым дыпломам імя Х.-К. Андэрсена з занясеннем прозвішча пісьменніка ў Ганаровы спіс дацкага казачніка.

---

## *Юрка ВІЦЬБІЧ*



**Юрка Віцьбіч (Георгій Шчарбакоў) нарадзіўся 15.6.1905 г. у горадзе Веліжу (Расія) у сям'і святара.**

Вучыўся ў гімназіі і педагагічным тэхнікуме. У 1922—1933 гг. працаваў у Маскве на хімічных заводах. У час Вялікай Айчыннай вайны жыў на акупаванай тэрыторыі, быў членам так званага Цэнтральнага ўрада Беларускага культурнага згуртавання, выступаў у друку з артыкуламі па гісторыі Беларусі.

Быў прызначаны рэдактарам літаратурна-мастацкага часопіса «Узвышша», ніводнага нумара якога так і не выйшла. Жыў у Германіі, потым у ЗША. У 1939 г. быў прыняты ў члены СП СССР.

Памёр у 1975 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1929 г. (часопіс «Узвышша»). Аўтар кніг прозы «Смерць Ірмы Лаймінг» (1932), «Формула супраціўлення касцей» (1937). У эміграцыі выдаў кнігу гістарычных нарысаў «Плыве з-пад Святое гары Нёман» (Мюнхен, 1956) і зборнік артыкулаў на рускай мове «Мы дойдем» (Нью-Йорк, 1975), надрукаваў у перыядычным друку шэраг апавяданняў.

---

## *Мікола* ВІШНЕЎСКІ



Мікола (Мікалай Аляксеевіч) Вішнеўскі нарадзіўся 28.3.1910 г. у горадзе Гомелі ў сям'і рабочага.

У 1931 г. скончыў Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум і стаў працаваць у газеце «Звязда». У 1932—1933 гг. вучыўся ва Усесаюзным інстытуце кінематаграфіі, потым зноў працаваў у «Звяздзе». У 1939 г. накіраваны на працу ў вілейскую абласную «Сялянскую газету». На пачатку Вялікай Айчыннай вайны служыў у будаўнічым батальёне, потым у рэдакцыях франтавой газеты «За свабодную Беларусь», сатырычнага лістка «Партызанская дубінка». З лістапада 1942 г.— спецкарэспандэнт газеты «Савецкая Беларусь», з 1944 г.— загадчык сельскагаспадарчага аддзела, уласны карэспандэнт газеты «Звязда», а ў 1952—1967 гг.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Сельская гаспадарка Беларусі». Член СП СССР з 1952 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 17.3.1986 г.

З першым нарысам выступіў у 1933 г. (газета «Звязда»). Першае апавяданне апублікаваў у 1941 г. (газета «Звязда»). Асобнымі выданнямі выйшлі нарысы «Майстар конегадоўлі» (1939), «Герой Сацыялістычнай Працы Еўдакія

Кухарава» (1948) і зборнік апавяданняў «Скарб зямлі» (1951).

Аўтар шэрага навукова-папулярных і вучэбных фільмаў («Трактар «Беларусь», 1955; «Залатое дно», 1962; «Жывы канвеер», 1964; «Севазвароты на Беларусі», 1966 і інш.).

---

## *Анатоль* ВОЛЬНЫ



Анатоль Вольны (Анатоль Іўсцінавіч Ажгірэй) нарадзіўся 2.12.1902 г. на станцыі Пухавічы Мінскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1911 г. паступіў у Ігуменскую гімназію. У 1920 г. пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію, прымаў удзел у баях з інтэрвентамі. Пасля дэмабілізацыі (1921) працаваў у ЦК ЛКСМБ і вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. З 1923 г. уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», а з 1928 г.— у «Полымя». 4.11.1936 г. арыштаваны. У 1937 г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны пасмяротна 3.12.1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Заслужаны дзеяч мастацтва БССР (1935).

Расстраляны 29.10.1937 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1920 г. Выдаў зборнікі паэзіі «Камсамольская нота» (1924, з А. Александровічам), «Чарнакудрая радасць» (1926), «Табе» (1927).

У 1925 г. выйшаў раман «Ваўчаняты» (у сааўтарстве з А. Александровічам і А. Дударом). Аўтар аповесцей «Два» (1925), «Антон Савіцкі» (1927, газета «Савецкая Беларусь»). «Зборнік фельетонаў» (1927) і кніга гумарэсак і фельетонаў «Суседзі» (1932) выйшлі пад псеўданімам «Алёша».

Напісаў п'есы, драматызаваныя агітжарты («Калі дзяк гаворыць праўду», «Міколка», «У агранома» — 1924), камедыю «Ратуй, божа!» (з Р. Кобецам, 1932). Выступаў і як кінадраматург — па яго сцэнарыях пастаўлены фільмы «Хвоі гамоняць» (з К. Дзяржавіным, 1929), «Гатэль «Савой» (1930), «У агні народжаная» (1930), «Сонечны паход» (1931), «Новая радзіма» (1935) і інш. У 1935 г. выйшла кінааповесць «Шасцідзесятая паралель».

## *Артур* ВОЛЬСКІ



Артур Вольскі (Артур Вітальевіч Зэйдэль-Вольскі) нарадзіўся 23.9.1924 г. у горадзе Дзяржынску Мінскай вобласці ў сям'і пісьменніка.

Вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы (1938—1941), працаваў мастаком у БДТ-2 (Уральск). У 1942 г. прызваны ў Ваенна-Марскі Флот. Служыў на Далёкім Усходзе. Удзельнічаў у баях супраць імперыялістычнай Японіі. У 1952 г. дэмабілізаваўся. Працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» загадчыкам аддзела культуры і быту, адказным сакратаром часопісаў «Бярозка», «Вясёлка». Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1962). З 1963 г.— загадчык літаратурна-педагагічнай часткі, з 1962 г.— дырэктар Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, з 1978 г.— дырэктар Дома літаратара, з 1980 г.— літкансультант СП БССР. У 1981—1984 гг.— старшы рэдактар выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1955 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалём «За баявыя заслугі» і іншымі медалямі.

Першы літаратурны твор надрукаваў у 1937 г. Напісаў на рускай мове аповесць «Родная семья» (Хабараўск, 1953, з Б. Іртышскім). Аўтар зборнікаў паэзіі «Водбліскі далёкіх маякоў» (1958), «Далёкія і блізкія прычалы» (1962), «Дабрата» (1966), «Выратавальны круг» (1974), «Строма» (1982), «Чалавек, якому баліць» (выбранае, 1984), «Наваселле дрэў» (1990). Напісаў кніжкі паэзіі, прозы, казак для дзяцей «Маленькім сябрам» (1955), «Дзедаў госць» (1958), «Чырвоная зорка» (1961), «Чарнічка» (1964), «Рагатка» (1971), «Што такое мікра тое» (1971), «Лясныя мастакі» (1973), «Жывыя літары» (1973), «А куды падаўся дождж» (1974), «Ізумрудавы горад, дзе ты?..» (1977), «Еду ў госці да слана» (1978), «Сонца блізка ўжо зусім» (1984), «Дабяруся да нябёс» (1984), «Ад А да Я — прафесія мая» (1987), апавядання-эсэ «Хлеб — усяму галава» (1989). Кнігі Выбраных твораў выходзілі ў 1971, 1974 гг.

Сумесна з П. Макалём напісаў п'есы «За лясамі дрымучымі» (1959, пастаўлена ў 1958),

«Марынка-крапіўніца» (пастаўлена ў 1962). У сааўтарстве з Э. Доўнер напісаў кінасцэнарый «Марынка, Янка і тайны каралеўскага замка» (пастаўлены ў 1978). Аўтар п'ес-казак «Сцяпан — вялікі пан» (1979, пакладзеная на музыку Ю. Семянякам і пастаўленая ў 1979 г. на сцэне Мінскага тэатра музычнай камедыі, яна з'явілася першай беларускай аперэтай для дзяцей), «Тры Іваны — тры браты» (1985), «Граф Глінскі-Папялінскі» (1986), «Каб не змаўкаў жаваранак» (1989). На Беларускім тэлебачанні пастаўлены спектаклі «Апошняя ноч Алаізы» (1986), «Водар папараці» (1989).

Перакладае з рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, яўрэйскай, нямецкай моў.

---

## *Віталь* ВОЛЬСКІ



Віталь Вольскі (Віталій Фрыдрыхавіч Зэйдэль-Вольскі) нарадзіўся 5.9.1901 г. у горадзе Пецярбурзе (Расія) у сям'і служачага.

З 1918 г. працаваў на Трубачным заводзе, потым у Камісарыяце гарадской гаспадаркі Петраграда. З 1919 г.— у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне. Служыў у пагранічных войсках і органах ВЧК. З 1926 г.— старшы інспектар Галоўрэперткома БССР, у 1927 г. скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі імя У. І. Леніна. З 1928 г.— старшы інструктар кінафікацыі Белдзяржкіно, з 1929 г.— дырэктар Віцебскага мастацкага тэхнікума, з 1930 г.— дырэктар Беларускага драматычнага тэатра ў Віцебску. У 1932—1936 гг. працаваў дырэктарам Інстытута літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР. З красавіка 1942 г. загадваў аддзелам у рэдакцыі сатырычнай газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», з лістапада 1943 г.— у рэдакцыі часопіса «Беларусь». У 1948—1954 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1971).

Памёр 22.8.1988 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1926 г. Даследаваў народную творчасць і старажытную рукапісную літаратуру беларускіх татараў — кітабы. Першая кніжка — «Праблемы беларускай савецкай драматургіі» (1934). Напісаў манаграфію «Эдуард Самуйлёнак: Жыццё і творчасць» (1951), «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры эпохі феадалізму» (1958), адзін з аўтараў дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры» (1956), падручніка «Беларуская савецкая літаратура» для 9—10 класаў (1948—1954).

Аўтар п'ес «Цудоўная дудка» (1940, пастаўлена ў 1939), «Дзед і жораў» (1946, пастаўлена ў 1939), «Несцерка» (1946, пастаўлена ў 1941, аднайменны фільм па сцэнарыю аўтара, 1955), «Машэка» (1946, пастаўлена ў 1954) — усе яны ўключаны ў зборнік «П'есы» (1962), а таксама аўтар сцэнарыяў дакументальна-краязнаўчых фільмаў «Белавежская пушча» (1946), «Бярэзінскі запаведнік» (1965).

Напісаў кнігі краязнаўчых нарысаў і апавяданняў «Па лясных сцежках» (1948), «У лясах над Бярозай» (1955), «Месяц за месяцам» (1956), «На бабровых азёрах» (1957), «Чайкі над Нараччу» (1959), «Родны край» (1961), «Афрыканскае падарожжа» (1963), «Эль Махрыб» (1965), «Старонкі нашай гісторыі» (1966), «Падарожжа па краіне беларусаў» (1968), «Месяц за месяцам» (1969), «Палессе» (1971), «Кніга падарожжаў» (1971), «Лёс Дункана» (1978), «Дзень добры, Бяроза» (1984). У 1977 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Пераклаў на беларускую мову сатырычную паэму І.-В. Гётэ «Рэйнеке-Ліс» (1940), раманы В. Брэдэля «Выпрабаванне» (1937), М. Кульбака «Зельманцы» (1960).

*Мікола* ВОРАНАЎ



Мікола (Мікалай Гаўрылавіч) Воранаў нарадзіўся 13.12.1936 г. у вёсцы Віры Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

З 1952 г., скончыўшы Азяркоўскую сямігодку, працаваў камбайнерам у Задзвінскай МТС Суражскага раёна. У 1955—1959 гг. служыў на Балтыйскім флоце. З 1959 г. на журналісцкай рабоце — літсупрацоўнік суражскай раённай газеты «Кліч Ільіча», аршанскай газеты «Ленінскі прызыў», загадчык сельскагаспадарчага аддзела сенненскай раённай газеты «Ленінская іскра». Жыве ў гарадскім пасёлку Шаркаўшчына Віцебскай вобласці. Член СП СССР з 1978 г.

Першае апавяданне «Асінавае шула» надрукаваў у 1963 г. (газета «Віцебскі рабочы»). Выступае таксама з вершамі. Выдаў зборнікі апавяданняў і аповесцей «Ветраны дзень» (1976), «Перад адлігай» (1984) і раман «Маланка паліць жыта» (1990). У часопісе «Маладосць» надрукаваў аповесці «Завея» (1979) і «Вадалазы» (1981).

*Міхась* ВЫШЫНСКІ



Міхась (Міхаіл Антонавіч) Вышынскі нарадзіўся 27.1.1940 г. у горадзе Мінску ў сям'і настаўніка.

Пасля заканчэння школы фабрычна-заводскага навучання (1957) працаваў мулярам на будоўлях Мінска. Адначасова вучыўся ў вячэрняй школе. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1965), настаўнічаў на Брэстчыне і Міншчыне. У 1967—1968 гг. працаваў рэдактарам мастацкай літаратуры ў выдавецтве «Беларусь», у 1968—1969 гг.— рэдактарам аддзела прозы часопіса «Неман». У 1970—1975 гг.— рэдактар вяшчання для дзяцей і юнацтва Беларускага радыё. Член СП СССР з 1970 г.

Літаратурнай працай займаецца з 1959 г. (апублікаваў нарыс у газеце «Калгасная праў-

да»). Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Вокны ўначы» (1969), «На павароце» (1973), «Крыніца, светлая вадзіца» (1979), «У полі, за сялом...» (апавяданні для дзяцей, 1981), «Людзі вясны» (нарысы, 1982).

---

## *Анатоль* ВЯЛЮГІН



Анатоль Сцяпанавіч Вялюгін нарадзіўся 27.12. 1923 г. у вёсцы Машканы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і фельчара.

У 1939—1940 гг., будучы студэнтам літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда». З верасня 1941 г. вучыўся ў Свярдлоўскім педагагічным інстытуце. У 1942 г. прызваны ў Савецкую Армію, вучыўся ў Лугінскай авіяшколе, удзельнічаў у баях на Сталінградскім фронце. У 1943 г. быў паранены, доўгі час знаходзіўся на лячэнні ў шпіталі. У 1945—1946 гг.— літсупрацоўнік у газеце «Літаратура і мастацтва». У 1948 г. скончыў завочна Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. У 1946—1984 гг. з невялікімі перапынкамі працаваў рэдактарам аддзела паэзіі часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1946 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1969).

Друкуецца з 1934 г. Актыўна выступаць з вершамі пачаў з 1938 г. Аўтар кніжак паэзіі «Салют у Мінску» (1947), «Негарэльская арка» (1949), «На подступах» (1952), «На зоры займае» (1958), «Насцеж» (1960), «Вецер з Волгі» (1963, паэма), «Адрас любві» (1964, выбранае), «Вершы і балады» (1969), «Верасовы ўзятак» (1974), «Песня зялёнага дуба» (1989), зборнікаў вершаў для дзяцей «Галубы» (1949), «Тры гудкі» (1951), «Рыбы нашых рэк» (1952), «Дзіцячы сад» (1954), «Вада і вуда» (1967). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1973, 1984).

Па яго сцэнарыях пастаўлены мастацкі двухсерыйны тэлефільм «Рэха ў пушчы» (1977), мастацкі фільм «Глядзіце на траву» (1985) і 40 дакументальных фільмаў: «Дарога без пры-

валу» (1964, з Р. Няхаем), «Балада пра маці» (1965), «Бацька Нёман» (1966), «Арліная крыніца» (1966), «Генерал Пушча» (1967), «Белая вежа» (з С. Сплашновым, 1968), «Там, за ракой — Дзяржынава» (1968), «Агонь» (1969), «Таямніца Івянецкай пушчы» (1970), «Я — крэпасць, вяду бой» (1972), «А зязюля кукавала» (1972), «Магілёў — дні і ночы мужнасці» (1974), «Гарызонты дарог» (1977), «Навальнічная далеч памяці» (1985) і інш.

Выступае і як перакладчык. У яго перакладзе на беларускую мову асобнымі выданнямі выйшлі М. Лермантаў «Каўказскі палоннік» і «Баярын Орша» (паэмы, 1950), Ю. Тувім «Падарунак дзецям» (1956, з С. Дзяргаем), Э. Межэлайціс «Паэма братэрства» (з М. Калачынскім, 1958), П. Варанько «Хлопчык Памагай» (1958), Д. Белавус «Птушыныя галасы» (1960), М. Нагнібеда «Званы Хатыні» (1973) і «Матулям з Расон» (1979). Пераклаў паасобныя вершы У. Маякоўскага, А. Міцкевіча, У. Бранеўскага і інш. Склаў зборнікі «Мы іх не забудзем» (1949), «Крывёю сэрца» (1967).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1964) за паэму «Вецер з Волгі», Дзяржаўнай прэміі БССР (1968) за кінасцэнарый «Генерал Пушча».

---

## *Вера* ВЯРБА



Вера Вярба (Гертруда Пятроўна Сакалова) нарадзілася 14.1.1942 г. у вёсцы Высокі Гарадзец Талачынскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачых.

У 1964 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працавала ў аддзеле прапаганды літаратуры Упраўлення кніжнага гандлю Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па друку (1969—1971), у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1972—1977), у часопісе «Беларусь» (1980—1983). Член СП СССР з 1964 г.

З першымі вершамі выступіла ў друку ў 1958 г. (часопісы «Полымя», «Вясёлка», «Работніца і сялянка»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Вочы вясны» (1962), «Белыя пісьмы» (1967),

«Высакосны год» (1969), «Сіняя бухта» (1975), «Альфа» (1978), «Мая маленькая планета» (1982), «Яраслаўне» (1986). Выйшла кніжка вершаў для дзяцей «Пралеска» (1968). У 1976 г. выйшла «Выбранае», у 1987 г.— кніжка выбранай паэзіі «Белыя пісьмы». Яе верш «Ручнікі» (музыка М. Пятрэнкі) стаў папулярнай песняй.

Пераклала на беларускую мову аповесць Р. Фраермана «Дзікі сабака Дзінга, альбо Аповесць пра першае каханне» (1975).

---

## *Анатоль ВЯРЦІНСКІ*



Анатоль Ільіч Вярцінскі нарадзіўся 18.11.1931 г. у вёсцы Дзямешкава Лепельскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1956 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у рэдакцыях раённых газет (Давыд-Гарадок, Камянец, Клімавічы, Рагачоў). У 1962 г. пераехаў у Мінск, супрацоўнічаў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», быў рэдактарам выдавецтва «Беларусь». У 1967—1982 гг.— літкансультант, адказны сакратар праўлення СП БССР. У 1986—1990 гг.— галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва». З 1990 г.— народны дэпутат БССР. З'яўляецца намеснікам старшыні пастаяннай Камісіі па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека, членам Канстытуцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета БССР. У складзе дэлегацыі Беларускай ССР удзельнічаў у 1977 г. у рабоце XXXII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1964 г.

Дэбютаваў з вершамі ў 50-я гг. (студэнцкая газета «Беларускі універсітэт», газета «Чырвоная змена», часопіс «Маладосць»). Выдаў кнігі вершаў і паэм «Песня пра хлеб» (1962), «Тры цішыні» (1966), «Чалавечы знак» (1968), «Выбранае» (1973), «З'яўленне» (1975), «Час першых зорак» (1976), «Ветрана» (1979), «Святло зямное» (1981).

Паасобныя вершы пакладзены на музыку. Па паэме «Колькі лет, колькі зім!» пастаўлены тэлеспектакль (1980).

Аўтар зборніка літаратурнай крытыкі і публіцыстыкі «Высокае неба ідэала» (1980) і кнігі публіцыстычных нататак «Нью-Йоркская сірэна» (1987).

Напісаў п'есы для дзяцей «Дзякуй, вялікі дзякуй» (1978, пастаўлена ў 1974), «Скажы сваё імя, салдат» (1977, пастаўлена ў 1975), «Гефест — друг Праметэя» (1983, пастаўлена ў 1984). У 1983 г. выйшаў зборнік п'ес пад назвай «Дзякуй, вялікі дзякуй».

Пераклаў на беларускую мову п'есы Лопэ дэ Вэгі «Раба свайго каханага», М. Себасцьяна «Безыменная зорка», В. Пальчынскайтэ «Спяшаюся за летам», якія пастаўлены ў тэатрах рэспублікі, а таксама асобныя вершы з класічнай і сучаснай рускай, украінскай, літоўскай, латышскай, балгарскай, польскай, венгерскай, кубінскай паэзіі.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1988) за кнігу «Нью-Йоркская сірэна».

# Г



## *МІКОЛА ГАЙДУК*

Мікола (Мікалай Раманавіч) Гайдук нарадзіўся 29.5.1933 г. у вёсцы Кабылянка Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сялянскай сям'і.

У 1951 г. скончыў агульнаадукацыйны ліцэй у мястэчку Міхалова. Два гады працаваў у гміннай управе. З 1953 г. вучыўся ў СССР на філалагічным факультэце ва універсітэтах Растова-на-Доне, Ленінграда, Мінска. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1959) працаваў у агульнаадукацыйным ліцэі з беларускай мовай навучання імя Б. Тарашкевіча ў Бельску-Падляшскім спачатку як настаўнік беларускай і лацінскай моў, а з 1965 г.— дырэктарам ліцэя. У 1959—1964 гг. адначасова выкладаў беларускую літаратуру на беларускім аддзяленні завочнай настаўніцкай студыі ў Беластоку. У 1971—1986 гг.— публіцыст, у 1986—1988 гг.— намеснік галоўнага рэдактара газеты «Ніва» (Беласток). Член Беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа» з 1958 г. Член Саюза польскіх пісьменнікаў з 1985 г.

Узнагароджаны ордэнамі Кавалерскі крыж ордэна Адраджэння Польшчы, Залатым крыжам і Сярэбраным крыжам заслугі і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1986).

У друку выступіў з вершам на беларускай мове ў 1957 г. (газета «Ніва»). Выдаў на беларускай мове зборнік вершаў «Ціш» (Беласток, 1988). Піша апавяданні, на польскай мове выдаў «Белавежскія паданні» (Беласток, 1990). Выступае як публіцыст, літаратуразнаўца і перакладчык паэзіі з польскай на беларускую мову. Апублікаваў каля 600 уласных запісаў беларускіх песень з нотамі, краязнаўчы слоўнік. Сабраў у наваколлі Белавежы і апрацаваў збор-

нік беларускіх народных казак, легенд і паданняў «Аб чым шуміць Белавежская пушча» (1982). Сааўтар (з Л. Гайдук) падручнікаў па беларускай мове для 3, 4, 5 класаў (1962—1987) (па 3 выданні) і «Граматыкі беларускай мовы для 5—8 класаў беларускай пачатковай школы» (1975).

---

## *Платон ГАЛАВАЧ*



Платон Раманавіч Галавач нарадзіўся 18.4. 1903 г. у вёсцы Пабокавічы Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Застаўшыся без маці, з сямі год наймаўся за пастуха. У 1922—1923 гг.— інструктар Барысаўскага павятовага камітэта камсамола. У 1926 г. скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі імя У. І. Леніна ў Мінску і стаў працаваць загадчыкам аддзела ЦК ЛКСМБ, з 1928 г. быў першым сакратаром ЦК ЛКСМБ і рэдактарам газеты «Чырвоная змена». З лістапада 1929 да сакавіка 1930 г.— намеснік наркома асветы БССР. Адзін з кіраўнікоў літаратурных арганізацый «Маладняк», БелАПП. У розны час рэдагаваў часопісы «Маладняк», «Полымя». Абіраўся членам ЦК КПБ (1927— 1930) і членам ЦВК БССР (1927—1935). У 1937 г. рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны 25.7.1956 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Пачаў друкавацца з 1921 г. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Дробязі жыцця» (1927), «Хочацца жыць» (1930), «Апавяданні» (1934), аповесцей «Вінаваты» (1930), «Спалох на загонах» (1930), «Даляры» (1931), «Носьбіты нянавісці» (1936, часопіс «Полымя рэвалюцыі»), «Яны не пройдуць!» (1937, часопіс «Полымя рэвалюцыі»), рамана «Праз гады» (1935, перавыданы ў 1936, 1984), нарыса пра будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала «Ад Мядзведжай гары да Белага мора» (1934). У 1958 г. выйшаў Збор твораў у 3 тамах. У 1963 г. часопіс «Полымя» надрукаваў «Пісьмы Платона Галавача».

## *Віктар ГАЛАЎЧЫНЕР*



Віктар Якаўлевіч Галаўчынер нарадзіўся 28.6. 1905 г. у г. Мінску ў сям'і настаўніка.

У 1926 г. скончыў Беларускую драматычную студыю пры Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва ў Маскве. Працаваў у Мінску рэжысёрам і акцёрам Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра (1926—1938), Беларускага рабочага тэатра імя ЦС ПСБ (1930—1932). У 1938—1939 гг.— выкладчык тэатральнага вучылішча ў Мінску, у 1939—1942 гг.— рэжысёр Беларускага тэатра імя Янкі Купалы, у 1942—1946 гг.— мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра БССР, у 1946—1948 гг.— галоўны рэжысёр Дзяржаўнага рускага тэатра БССР. З 1949 г.— галоўны рэжысёр у тэатрах Іркуцка, Ташкента, Вільнюса.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Народны артыст БССР (1944) і Літоўскай ССР (1959).

Памёр 15.7.1961 г.

У 1925 г. апублікаваў першы твор — п'есу «Гаўрош» па матывах рамана В. Гюго. Аўтар п'ес «Велікадушнасць» (пастаўлена ў 1935), «Урок жыцця» («Жыццё вучыць», пастаўлена ў 1942), «Да вяршынь» (1946), «Прафесар гісторыі» (1948). Выступаў і як тэатральны крытык.

## *Ніна ГАЛІНОЎСКАЯ*



Ніна Васільеўна Галіноўская нарадзілася 18.12. 1935 г. у вёсцы Вялікія Лазіцы Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1955 г. скончыла Магілёўскае дашкольнае педагагічнае вучылішча. Працавала выхавацелькай дзіцячага сада торфапрадпрыемства «Калпеніца» Брэсцкай вобласці, дзіцячага дома ў мястэчку Лунна Гродзенскай вобласці (1955—1958), карэктарам газеты «Мінская праўда» (1962—1963), карэктарам друкарні выдавецтва «Звязда» — затым выдавецтва ЦК КПБ (1963—1967). У 1967—1968 гг.— рэдактар мастацкіх

фільмаў газеты «Кинонеделя Минска». Член СП СССР з 1985 г.

Першы верш апублікавала ў 1958 г. (скідальская раённая газета «Красное знамя»). Аўтар кніжак вершаў для дзяцей «Давайце пазнаёмімся» (1962), «Лясная зарадка» (1965), «Размова сняжынак» (1968), «Сяргейкаў параход» (1972), Кніжчыны сябры» (1975), «Мой дзень» (1977), «Зай прагназіст» (1979), «Незвычайны карагод» (1986), «Восень едзе ў магазін» (1990), калектыўнага зборніка «Калі ветрык спачывае» (1985).

---

## *Леанід ГАЛУБОВІЧ*



Леанід Міхайлавіч Галубовіч нарадзіўся 12.8. 1950 г. у вёсцы Вароніна Клецкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Грыцэвіцкай сярэдняй школы Клецкага раёна (1967), затым слуцкага прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 97 (1969) працаваў электрыкам на Жабінкаўскім цукровым заводзе. Служыў у Савецкай Арміі (1970—1972). Працаваў электрыкам на прадпрыемствах Слуцка, Жабінкі, Клецка. У 1989 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. З 1989 г.— рэдактар літаратурна-драматычных праграм на Беларускім тэлебачанні. Член СП СССР з 1984 г.

У друку выступае з 1967 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Таемнасць агню» (1984) і «Споведзь бяссоннай душы» (1989).

---

## *Уладзіслаў ГАЛУБОК*



Уладзіслаў Галубок (Уладзіслаў Іосіфавіч Голуб) нарадзіўся 15.5.1882 г. на станцыі Лясная Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе, здаў экстэрнам экзамены за курс Мінскага гарадскога вучылішча (1906), скончыў у Мінску мастацкія курсы. Працаваў грузчыкам на чыгунцы, прыказчыкам у магазіне, слесарам у Мінскім

дэпо. У 1917—1920 гг.— акцёр і рэжысёр Першага беларускага таварыства драмы і камедыі. З 1920 да 1922 г.— загадчык мастацкага аддзела ў Народным камісарыяце асветы БССР. Адзін з заснавальнікаў беларускага савецкага тэатра. У 1920 г. стварыў беларускі вандроўны тэатр, які называўся «Трупа Галубка», а ў 1932 г. атрымаў назву БДТ-3. У 1937 г. рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны 26.8.1957 г. Вярхоўным судом БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Народны артыст БССР (1928).

Расстраляны 28.9.1937 г.

У 1906 г. пачаў выступаць у перыядычным друку як паэт і празаік. Выдаў зборнік «Апавяданні» (Пецярбург, 1913). З 1917 г. выступаў як драматург. Напісаў каля 40 п'ес. «Апошняе спатканне» (Вільня, 1919, пастаўлена ў 1917), «Пісаравы імяніны» (1927, пастаўлена ў 1917), «Бязвінная кроў» (пастаўлена ў 1918), «Залёты дзяка» (пастаўлена ў 1918), «Бязродны» (пастаўлена ў 1919), «Суд» (Вільня, 1924, пастаўлена ў 1920), «Душагубы» (пастаўлена ў 1921), «Ганка» (1929, пастаўлена ў 1920), «Пан Сурынта» (1930, пастаўлена ў 1923), «Плытагоны» (пастаўлена ў 1923), «Фанатык» (пастаўлена ў 1922), «Пінская мадонна» (пастаўлена ў 1927), «Белы вянок» (1929, пастаўлена ў 1921), «Ветрагоны» (1930, пастаўлена ў 1919), «Краб» (1930, пастаўлена ў 1927), «Белая зброя» (1933, пастаўлена пад назвай «Рыкашэт» у 1935), «Ліпавічок» (1962) і інш. У 1968 г. выйшаў зборнік «П'есы», у 1982 г.— «Творы». Аўтар публіцыстычных і тэатразнаўчых артыкулаў. Вядомы як мастак-дэкаратар і пейзажыст.

---

## *Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ*



Навум Якаўлевіч Гальпяровіч нарадзіўся 14.1. 1948 г. у горадзе Полацку ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў на Полацкім шклозаводзе (1966—1967), у полацкай аб'яднанай газеце «Сцяг камунізму» (1967—1977). Вучыўся завочна на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1979 г. скончыў завочна Віцебскі педагагічны інстытут імя С. М. Кірава. У 1977—1980 гг.— рэдактар радыёвяшчання

вытворчага аб'яднання «Палімір» у Наваполацку, у 1980—1981 гг.— супрацоўнік наваполацкай гарадской газеты «Химик», з 1981 г.— уласны карэспандэнт Дзяржтэлерадыё БССР па Віцебскай вобласці. Член СП СССР з 1990 г.

Першы верш надрукаваў у гарадской газеце Наваполацка «Химик» у 1967 г. Адзін з аўтараў калектыўнага зборніка паэзіі «Сцяжына» (1983). У 1990 г. выйшаў зборнік вершаў «Брама».

Выступае таксама з літаратурна-крытычнымі і публіцыстычнымі артыкуламі.

---

## *Мікола* ГАМОЛКА



Мікола (Мікалай Іванавіч) Гамолка нарадзіўся 11.3.1922 г. у вёсцы Брынёў Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1939—1940, завочна ў 1948—1952). У 1940—1946 гг. служыў у Савецкай Арміі. У 1947 г. паступіў на працу рэдактарам у Дзяржаўнае выдавецтва БССР, у 1948—1949 гг.— літсупрацоўнік рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», з 1949 г. загадваў аддзелам літаратуры і мастацтва рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», у 1951—1962 гг.— адказны сакратар часопіса «Бярозка». З 1967 г.— адказны сакратар Камісіі па Дзяржаўных прэміях БССР пры Савеце Міністраў рэспублікі. У 1970—1980 гг. і ў 1982—1986 гг.— літкансультант СП БССР, у 1980—1982 гг.— дырэктар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР. Член СП СССР з 1946 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 3.05.1992 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1937 г. (бабруйская газета «Камуніст»). Аўтар зборнікаў вершаў «Зварот шчасця» (1946) і «Б'юць куранты» (1950). Паасобныя вершы пакладзены на музыку. Працаваў пераважна ў жанры прозы. Выйшлі аповесці для дзяцей «Лета ў Калінаўцы» (1950, дапоўненае выданне ў 1956), «Добры дзень, школа!» (1953), «За вялікую трасу» (часопіс «Полымя», 1954), а таксама раман «Шосты акіян» (1959), аповесці «Лясная крэпасць»

(1980), «Сокалы-сакаляняты» (1987), «Партызанскія сёстры» (1989), зборнік апавяданняў «Шлях адкрыты» (1960). На рускай мове выдаў аповесць-хроніку «Девушка шла по войне» (1972). У 1982—1983 гг. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Напісаў п'есу «Бітва ў космасе» (пастаўлена ў 1963).

Пераклаў на беларускую мову п'есу-казку Я. Шварца «Чырвоная шапачка» (пастаўлена ў 1967).

---

## *Васіль ГАРБАЦЭВІЧ*



Васіль Савіч Гарбацэвіч нарадзіўся 19.4.1893 г. у вёсцы Дукарка (цяпер увайшла ў склад вёскі Дукора) Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1913 г. скончыў Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Працаваў настаўнікам Лютаўскай земскай школы пад Сянно (1913—1915). Скончыў Мінскі настаўніцкі інстытут (1918). Настаўнічаў у Дукорскай школе (1918—1924), выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Магілёўскім педагагічным тэхнікуме (1924—1929). Арганізатар і кіраўнік Магілёўскай філіі «Маладняка». У 1932 г. скончыў Мінскі вышэйшы педагагічны інстытут. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1943 г. пад Каневам быў цяжка паранены. Настаўнічаў з перапынкамі ў вёсцы Дукора на Міншчыне (1933—1957). Член СП СССР з 1981 г.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Заслужаны настаўнік БССР (1947).

Памёр 17.9.1985.

Вядомы як драматург. Аўтар п'ес «Вяселле» (пастаўлена ў 1921), «Чырвоныя кветкі Беларусі» (апублікавана і пастаўлена ў 1923, асобнае выданне ў 1959), «Пад вішнёвымі садкамі» (апублікавана ў 1927), «Песні нашых дзён» (1930). У 1983 г. выйшаў зборнік п'ес «Чырвоныя кветкі Беларусі». Аўтар успамінаў пра сустрэчы з М. Багдановічам у Яраслаўлі («Шлях паэта», 1975).

## *Вісарыён* ГАРБУК



Вісарыён Сцяпанавіч Гарбук нарадзіўся 24.11. 1913 г. у вёсцы Шкілякі Полацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1933 г. скончыў Лепельскі педагагічны тэхнікум. Выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў Дварэцкай няпоўнай сярэдняй школе (1933—1935), адначасова вучыўся завочна на літаратурным факультэце Мінскага педінстытута імя М. Горкага. У 1935 г. перайшоў на стацыянарнае аддзяленне інстытута. У красавіку 1936 г. рэпрэсіраваны. Зняволенне адбываў на Калыме. Вярнуўся на Беларусь у 1940 г. Поўнасцю рэабілітаваны ў 1961 г. З 1940 г.— настаўнік і загадчык навучальнай часткі Мехаўскай сярэдняй школы на Віцебшчыне (1940—1941). У ліпені 1941 г. прызваны ў армію. Удзельнічаў у абароне Масквы, вызваленні Беларусі, Польшчы, узяцці Берліна. У 1946 г. цяжка захварэў на поліартрыт і быў прыкаваны да ложка. Жыў у Пяцігорску. Член СП СССР з 1963 г.

Узнагароджаны медалямі.

Заслужаны работнік культуры БССР (1979).

Памёр 8.8.1986 г.

Пісаць пачаў у шпіталі. У 1957 г. надрукаваў першае апавяданне. Пісаў на беларускай і рускай мовах. Аўтар кніг прозы «Не шукаю спакою» (1963), «Лицо в полоску» (1967, па аднайменным апавяданні ў 1971 г. пастаўлены тэлефільм). Для дзяцей выйшлі кнігі «Танюшкины рассказы» (Стаўрапаль, 1964), «Алачка-забывалачка» (1964), «На маім акне. Таніны апавяданні» (1966), «Незнарок і знарок» (1969), «Такіх кветак не бывае» (1971), «Хто такія мы» (1973), «Мышки и Мишки» (Стаўрапаль, 1974), «Са мной здарылася неверагоднае» (1977). Пераклаў і апрацаваў для дзяцей казкі народаў Паўночнага Каўказа «Напітак волатаў» (1969). У 1983 г. выйшла кніга выбраных твораў «Горад без папугайчыкаў».

## *Віктар ГАРДЗЕЙ*



Віктар Канстанцінавіч Гардзей нарадзіўся 19.8. 1946 г. у вёсцы Малыя Круговічы Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Круговіцкай сярэдняй школы (1964) працаваў у калгасе, а ў 1965—1966 гг. быў літсупрацоўнікам ляхавіцкай раённай газеты «Будаўнік камунізму». З 1966 г.— у ганцавіцкай раённай газеце «Савецкае Палессе» (загадчык аддзела пісем, адказны сакратар, намеснік рэдактара). З пераездам у Мінск (1983) працаваў у рэдакцыях часопісаў «Беларусь», «Родная прырода», з 1989 г.— старшы літсупрацоўнік аддзела прозы часопіса «Маладосць». Завочна скончыў факультэт журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна (1984). Член СП СССР з 1979 г.

Узнагароджаны медалём.

Літаратурную працу пачаў у 1963 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Касавіца» (1975), «Верасное палясоўе» (1978), «Засевак Радзімы» (1983), «Незабудкі азёр» (1985), «Узрушэнне» (1988) і кніжак вершаў для дзяцей «Чырвоны грабеньчык» (1976), «На арэхавай палянцы» (1982), «Коцікі на вярбе» (1988), «Мой тата — трактарыст» (1989).

Выдаў кнігі прозы «Дом з блакітнымі акацыямі» (1984) і «Карані вечнага дрэва» (1988).

## *Аляксей ГАРДЗІЦКІ*



Аляксей Кузьміч Гардзіцкі нарадзіўся 2.5. 1934 г. у вёсцы Пугачова (з 1979 г. у межах Брэста) Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна (1956). Быў завучам Мікашэвіцкага дзіцячага дома, на камсамольскай працы, журналістам на Брэстчыне. У 1959—1962 гг.— аспірант, у 1962—1966 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Працаваў старшым рэдактарам Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па

друку. З 1972 г.— літкансультант СП БССР. Член СП СССР 1970 г.

З рэцэнзіямі і артыкуламі пачаў выступаць у 1953 г. (брэсцкая абласная газета «Заря»). Аўтар кніг дыялогаў, інтэрв'ю, гутарак пра літаратуру «Дыялогі» (1968), «Сустрэчы» (1972), «Зразумець як сваё» (1977), «Вачыма сяброў» (1977), «Сябрына» (1986), «Гутаркі» (1988). Напісаў літаратуразнаўчую працу «Пра майстэрства дэталі» (1969) і брашуру «Творчасць Івана Шамякіна» (1971). Выступае і як аўтар празаічных мініяцюр і літаратурных эцюдаў.

Складальнік зборніка «Беларускія савецкія паэты» (на грузінскай мове, Тбілісі, 1978), біябібліяграфічнага даведніка «Пісьменнікі савецкай Беларусі» (1981).

## *Алесь ГАРОДНЯ*



Алесь Гародня (Аляксандр Эраставіч Функ) нарадзіўся ў горадзе Пярмі (Расія) у 1899 г. у сям'і чыноўніка.

Часта з бацькамі наведваў Пружаншчыну, дзе былі дзедаў і матчын маёнткі. Рэвалюцыю 1917 г. сустрэў у Фінляндыі. Далучыўся трывала да беларускай культуры ў Маскве, куды пераехаў у 1917 г. на вучобу. Там стаў членам маскоўскай арганізацыі Беларускай сацыялістычнай грамады. Быў тэхнічным рэдактарам часопіса «Чырвоная Беларусь». У 1930 г. арыштаваны, у 1931 г. асуджаны да зняволення. У 1942 г. зноў яму інкрымініравана справа і Самаркандскі абласны суд прыгаварыў яго да вышэйшай меры пакарання, якая была заменена на 10 год зняволення.

Памёр 12.9.1944 г. у зняволенні.

У друку з празаічнымі творамі пачаў выступаць з 1925 г. (часопіс «Полымя»). У Мінску выйшлі аповесці «На крэсах» (1927) і «Варта на Рэйне» (1930). Выступаў таксама з апавяданнямі і артыкуламі.

## *Цішка ГАРТНЫ*



Цішка Гартны (Зміцер Хведаравіч Жылуновіч) нарадзіўся 4.11.1887 г. у гарадскім пасёлку Капыль Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1905 г. скончыў двухкласнае вучылішча ў Капылі. Працаваў у гарбарнай майстэрні. Прымаў удзел у рэвалюцыйных падзеях 1905—1907 гг. У пошуках працы аб'ехаў Беларусь, Украіну і Літву. У 1910 і 1911 гг. прыязджаў у Капыль і браў удзел у рабоце мясцовай арганізацыі РСДРП, у выданні рукапісных часопісаў. У маі 1913 г. стаў працаваць на заводзе «Вулкан» у Пецярбургу. Газета «Правда» ў 1912—1913 гг. змясціла шэраг яго вершаў і нарыс пра гарбароў. Быў членам рабочага культурна-асветнага таварыства «Знание». У 1914 г. перайшоў працаваць на завод «Айваз». Вёў у Петраградзе прапагандысцкую і арганізацыйную работу сярод бежанцаў-беларусаў. Пасля Кастрычніка — сакратар Беларускага нацыянальнага камісарыята пры ўрадзе РСФСР, рэдактар газеты «Дзянніца». З дня ўтварэння БССР (1.1.1919) да 3.2.1919 г. быў старшынёй Часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі. З сакавіка 1919 г.— рэдактар-выпускаючы і сакратар газеты «Красная заря» (Харкаў), а з чэрвеня 1919 г.— палітработнік у штабе 14-й арміі. Працаваў рэдактарам газеты «Савецкая Беларусь», часопіса «Полымя», дырэктарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР і Дзяржаўнага архіва БССР, загадчыкам Галоўмастацтва і намеснікам народнага камісара асветы БССР. Быў членам Інбелкульта (Інстытута беларускай культуры), а ў 1928 г. абраны акадэмікам АН БССР. Працаваў у Інстытуце гісторыі і загадваў выдавецтвам АН БССР. Быў членам ЦВК БССР (1920—1931). 15.11.1936 г. арыштаваны. Знаходзячыся ў турме, быў абвешчаны псіхічна хворым, у сувязі з чым пераведзены ў Магілёўскую псіхіятрычную лячэбніцу, дзе памёр (па іншых звестках — скончыў жыццё самагубствам). 15.10.1955 г. рэабілітаваны ў грамадска-прававых адносінах, у 1988 г. адбылася поўная палітычная рэабілітацыя. Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 11.4.1937.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1908 г. на старонках «Нашай нівы». Выдаў зборнікі паэзіі «Песні» (1913), «Песні працы і змагання» (Берлін, 1922), «Урачыстасць» (1925). У 1967 г. выйшлі «Вершы».

Актыўна выступаў як празаік. Аўтар кніг апавяданняў «Трэскі на хвалях» (1924), «Прысады» (апавяданні і п'есы, 1927), «Гаспадар» (1930), «Гоман зарніц» (1932), «Наступ на горны» (апавяданні, нарысы і вершы, 1932), аповесцей «На новым месцы» (1930), «Зялёны шум» (1931), рамана «Сокі цаліны» (ч. I—III, 1922—1930). У 1929—1932 гг. выйшаў Збор твораў у 4 тамах, у 1987—1989 гг.— тры тамы Збору твораў у 4 тамах. У 1926 і 1962 гг.— «Выбраныя апавяданні», у 1978 г.— кніга выбраных апавяданняў «Насустрач сонцу».

Аўтар драм «Хвалі жыцця» (1918), «Сацыялістка» (1924), «Дзве сілы» (1927), зборніка літаратурна-крытычных артыкулаў «Узгоркі і нізіны» (1928), крытыка-біяграфічнага нарыса «Янка Купала — пясняр вызвалення» («Янка Купала ў літаратурнай крытыцы», 1928).

Пераклаў на беларускую мову раман А. Фадзеева «Апошні з удэгэ» (1932).

---

## *Мікола ГАРУЛЁЎ*



Мікола (Мікалай Аляксандравіч) Гарулёў нарадзіўся 6.11.1919 г. у вёсцы Баева Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і настаўніка.

Скончыў аддзяленне рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута (1941). На пачатку Вялікай Айчыннай вайны — баец 1-га камуністычнага знішчальнага батальёна пры ЦК КП Беларусі, потым — баец, афіцэр-палітработнік у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі (1947) — адказны сакратар рэдакцыі магілёўскай абласной газеты «За Радзіму». У 1949 г. пераехаў у Мінск, працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР, у рэдакцыі часопіса «Советская Отчизна», загадчыкам літаратурнай часткі Рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага, на кінастудыі «Беларусьфільм», у 1970—1979 гг.—

адказны сакратар часопіса «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1979).

Памёр 7.5.1980 г.

Першы верш апублікаваў у 1938 г. (газета «Камунар Магілёўшчыны»). Пісаў на рускай і беларускай мовах. У 1949 г. выдаў нарыс «Шлях рацыяналізатара». Выйшлі зборнікі аповесцей і апавяданняў «Друзья-товарищи» (1954), «Новы настаўнік» (1974), «Прощайте, любимые» (1977), «Кібернетычная жонка» (1979), раманы «Прощайте, любимые» (1979), «После разлуки» (1981). Зрабіў літаратурны запіс кнігі М. Каралёва «Сыновья народа» (1955).

Выдаў зборнікі вершаў «Сверстники» (1950), «В пути» (1956), «Признание» (1976).

Выступаў і як драматург. Аўтар п'ес «Выбух» (з М. Алтуховым, 1959, пастаўлена ў 1958), «Второе знакомство» (1961, пастаўлена ў 1960), «Если любишь» («Призвание», 1963, пастаўлена ў 1962), «Моя дочь» (1966, пастаўлена ў 1965), «Друг или враг» («Кровью скрепленная», 1967, пастаўлена ў 1966), «Месть Половинкина» (пастаўлена ў 1968), «Москвич-408» (1971), тры апошнія п'есы ўвайшлі ў зборнік «Наследники» (1971). Напісаў кінааповесць «Наследники Матвея Марковича» (1963) і сцэнарыі трох дакументальных фільмаў.

Пераклаў на рускую мову раманы М. Паслядовіча «Святло над Ліпскам» (1950) і М. Зарэцкага «Вязьмо» (1965), а таксама паасобныя творы Я. Коласа, Э. Самуйлёнка, П. Галавача, М. Танка, П. Панчанкі, А. Бялевіча, У. Краўчанкі, Я. Скрыгана, І. Мележа і інш.

## *Алесь ГАРУН*



Алесь Гарун (Аляксандр Уладзіміравіч Прушынскі) нарадзіўся 11.3.1887 г. у фальварку Новы Двор (цяпер у межах Мінска) у сям'і чорнарабочага.

Скончыў гарадское прыходскае вучылішча ў Мінску (1897), вучыўся ў рамесніцкім вучылішчы. З 1902 г. працаваў сталяром у розных майстэрнях і на мэблевай фабрыцы ў Мінску. У 1904 г. уступіў у партыю эсэраў і актыўна ўключыўся ў падпольную рэвалюцыйную дзейнасць. У 1907 г. арыштаваны і высланы на пасяленне ў Сібір, дзе займаўся сталярнай і цяслярнай працай. Ссылку адбываў у Кірэнскім павеце Іркуцкай губерні. У 1914 г. працаваў на Лене вадалівам. З 1915 г.— на залатых капальнях у Бадайбо, дзе сустрэў Лютаўскую рэвалюцыю. Там быў абраны дэпутатам Савета Ленінскай золатапрамысловай акругі. У Мінск вярнуўся ў верасні 1917 г., у 1918 г., у час нямецкай акупацыі, рэдагаваў газету «Беларускі шлях». У 1919 г., пасля захопу Мінска палякамі, стаў членам так званай Беларускай вайсковай камісіі. У 1920 г. цяжка хворы вывезены ў Кракаў.

Памёр 28.7.1920 г.

Пісаць вершы пачаў змалку. У друку дэбютаваў вершам «Маці-Беларусі» ў 1907 г. (газета «Наша ніва»). Вершы, апавяданні публікаваліся ў газетах «Наша ніва», «Беларус», «Вольная Беларусь», у калектыўных зборніках і календарах. Выйшаў зборнік паэзіі «Матчын дар» (1918, 1929, факсімільнае выданне ў 1988), у 1920 г.— зборнік «Жывыя казкі», куды ўвайшлі тры п'есы для дзіцячага тэатра: «Хлопчык у лесе» (ставілася ў Вільні ў 1921), «Шчаслівы чырвонец» і «Дзіўны лапаць, або Не ўсё тое порах, што ў пораху ляжыць». У Вільні асобным выданнем выйшла паэма «Мае коляды» (пад псеўданімам А. Сумны, 1920). Выступаў у друку і як публіцыст.

## *Таццяна ГАРЭЛІКАВА*



Таццяна Іванаўна Гарэлікава нарадзілася 28.11. 1947 г. у вёсцы Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Патапаўскай сярэдняй школы (1964) паступіла на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыла завочна ў 1970). З 1968 г. працавала бібліятэкарам у Мінску, з 1972 г.— старшай піянерважатай, з 1975 г.— арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы Трасцянецкай, з 1976 г.— дырэктарам Раўкуцевіцкай сярэдняй школы, з 1978 г.— інспектарам Мінскага райана. З 1979 г.— намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі, з 1980 г.— сакратар Мінскага райкома КПБ. З 1985 г.— рэдактар аддзела прозы часопіса «Неман». Член СП СССР з 1979 г.

З першым апавяданнем выступіла ў друку ў 1962 г. (газета «Піянер Беларусі»). Выйшлі зборнікі аповесцей і апавяданняў «Дзе лес шуміць» (1978), «Пры святле расстанняў» (1985).

## *Максім ГАРЭЦКІ*



Максім Іванавіч Гарэцкі нарадзіўся 18.2.1893 г. у вёсцы Малая Багацькаўка (у 1976 г. аб'яднана ў вёску Багацькаўка) Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Горацкае каморніцка-агранамічнае вучылішча (1913). Працаваў каморнікам у Літве. Улетку 1914 г. прызваны ў армію. У час першай імперыялістычнай вайны быў на фронце, ва Усходняй Прусіі. Пад Сталупененам паранены. У 1916 г. скончыў Паўлаўскае ваеннае вучылішча. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі жыў у Смаленску, супрацоўнічаў у «Известиях Смоленского Совета», у газеце «Звязда», з рэдакцыяй якой у пачатку 1919 г. пераехаў у Вільню. Займаўся выдавецкай і навуковай дзейнасцю, працаваў настаўнікам Віленскай беларускай

гімназіі. Быў рэдактарам і выдаўцом газет «Наша думка» (1920—1921) і «Беларускія ведамасці» (1921—1922). За сувязь з віленскімі камуністамі трапіў у 1922 г. у Лукішскую турму. У 1923 г. вярнуўся ў БССР. Чытаў лекцыі на рабфаку Беларускага дзяржаўнага універсітэта, загадваў кафедрай беларускай мовы і літаратуры ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі, займаўся літаратурнымі даследаваннямі ў Інстытуце беларускай культуры, а потым у АН БССР. У 1931—1935 гг. жыў у Кіраве (былая Вятка), куды быў высланы. Працаваў чарцёжнікам, тэхнікам. З верасня 1935 г. жыў у пасёлку Пясочня (цяпер г. Кіраў) Калужскай вобласці, дзе працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе, у 1938 г. быў арыштаваны і адпраўлены ў лагер у Комі АССР. Справа па абвінавачанні М. Гарэцкага адменена і спынена ў 1957 г. Вярхоўным судом БССР. 7.2.1959 г. Калужскім абласным судом поўнасцю рэабілітаваны.

Расстраляны 10.2.1938 г. у Вязьме.

Друкаваўся з 1912 г. (допісы, карэспандэнцыі). Першае апавяданне надрукаваў у 1913 г. у газеце «Наша ніва». У 1914 г. выдаў у Вільні зборнік апавяданняў «Рунь», у 1919 г.— драматызаваную аповесць «Антон». Выйшлі кнігі прозы: зборнік апавяданняў «Досвіткі» (1926), аповесці «Дзве душы» (Вільня, 1919), «Ціхія песні» (1926, другое, дапрацаванае і пашыранае выданне пад назвай «Ціхая плынь» у 1930), дакументальна-мастацкія запіскі «На імперыялістычнай вайне» (1926, перавыдадзены ў 1987), раман «Віленскія камунары» (1965), «Камароўская хроніка» (часопіс «Полымя», 1966). Выпушчаны ў 1960 г.— «Выбранае», у 1973 г.— Выбраныя творы ў 2 тамах, у 1984—1986 гг.— Збор твораў у 4 тамах, у 1990 г.— «Творы».

Працаваў і ў галіне крытыкі і літаратуразнаўства, а таксама мовазнаўства. Напісаў першую «Гісторыю беларускае літаратуры» (Вільня, 1920, 4-е выданне, Мінск, 1926). Аўтар літаратурна-крытычнай працы «Маладняк» за пяць гадоў. 1923—1928» (1928), «Хрэстаматыі беларускае літаратуры. XI век — 1905 г.» (Вільня, 1922), «Руска-беларускага слоўніка» (з Г. Гарэцкім, Смаленск, 1918, 2-е выданне, Вільня, 1920), «Беларуска-расійскага слоўнічка» (3-е выданне, 1925), «Практычнага маскоўска-беларускага

слоўніка» (з М. Байковым, 1924, 2-е выданне, 1926). Выдаў зборнік «Народныя песні з мелодыямі» (запісаныя ад маці, мелодыі запісалі А. Ягораў і М. Аладаў, 1928).

Напісаў драматычныя абразкі, якія ставіліся самадзейнасцю, «Атрута» (1913), «Мутэрка» («Вучыцель Мутэрка», 1920), «Чырвоныя ружы» (1923), «Жартаўлівы Пісарэвіч» (1925), «Не адной веры» (1928), «Гапон і Любачка» (1929) і інш.

Пераклаў на беларускую мову паасобныя працы У. І. Леніна (пад псеўданімам А. Мсціслаўскі), творы Ю. Лібядзінскага «Камісары» і «Тыдзень», А. Фадзеева «Разгром», апавяданні М. Горкага «Збродзік», «Канавалаў» і «Чалкаш», «Слова аб палку Ігаравым».

---

## *Юрка* ГАЎРУК



Юрка (Юрый Паўлавіч) Гаўрук нарадзіўся 6.5. 1905 г. у горадзе Слуцку Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

У 1921 г. скончыў слуцкую школу другой ступені, у 1925 г.— Вышэйшы літаратурна-мастацкі інстытут імя В. Брусава ў Маскве. Быў дацэнтам кафедры беларускай мовы і літаратуры ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі (1925—1931), чытаў курс зарубежнай літаратуры і літаратур народаў СССР у Магілёўскім педагагічным інстытуце. 8.2.1935 г. рэпрэсіраваны. Асуджаны на высылку з Беларусі. Больш за 20 гадоў працаваў на розных работах у Карэліі, Усходняй Сібіры, Комі АССР. Рэабілітаваны ў 1956 г. У 1957—1967 гг.— памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 18.2.1979 г.

Працаваў у галіне перакладу з французскай, англійскай, нямецкай, польскай, рускай, украінскай на беларускую мову. Першая публікацыя — у 1925 г. (верш Г. Гейнэ «Ткачы»). Пераклаў п'есы У. Шэкспіра «Сон у летнюю ноч» (1925, пастаўлена ў 1926), «Гамлет» (1935, 1964, пастаўлена ў 1946), «Атэла» (1954), «Канец —

справе вянец» (пастаўлена ў 1964), «Кароль Лір» (1974), «Антоній і Клеапатра» (1982). У яго перакладзе ставіліся п'есы «Прыніжаныя і зняважаныя» паводле Ф. Дастаеўскага (1957), «Ліса і вінаград» Г. Фігейрэда (1957), «Забыты ўсімі» Н. Хікмета (1958), «Тысяча франкаў узнагароды» В. Гюго (1962), «Мяцеліца» Л. Ляонава (1965), «Дзядзька Ваня» А. Чэхава (1965), «Мешчанін у дваранах» Мальера (1967), «Улада цемры» Л. Талстога (1969), «Залатая карэта» Л. Ляонава (1971), «Багна» А. Астроўскага (1972), «Доктар філасофіі» Б. Нушыча (1972).

Напісаў зборнік краязнаўчых апавяданняў «Вясковыя рыскі» (1926). Аўтар першай на Беларусі кніжкі паэтычных перакладаў «Кветкі з чужых палёў» (1928). У 1969 г. выйшаў зборнік арыгінальных вершаў і перакладаў «Іскры з крэменя», у 1975 г.— зборнік выбраных перакладаў паэзіі «Агні ў прасторах», у 1990 г.— «Выбранае» (вершы і пераклады).

Пераклаў асобныя творы А. Пушкіна, Ф. Шылера, А. Міцкевіча, Дж. Байрана, Лесі Украінкі, У. Сасюры, П. Варанько, асобнымі выданнямі выйшлі раман А. Сціля «Любіць будзем заўтра» (1960), зборнік А. Маруа «Падарожжа ў нябыт і яшчэ 24 навелы» (1974), раманы Э. Хемінгуэя «І ўзыходзіць сонца» (1976) і К.-С. Прычард «Дачка ўрагану» (1977). На рускую мову пераклаў аповесць «Люба Лук'янская» (1965) і раманы «Пошукі будучыні» (1968) К. Чорнага і «Серадзібор» (1966) П. Пестрака.

Аўтар артыкулаў па тэорыі і практыцы мастацкага перакладу, эсэ, якія ўвайшлі ў кнігу «Ступень адказнасці» (1986).

---

## *Сцяпан ГАЎРУСЁЎ*



Сцяпан Захаравіч Гаўрусёў нарадзіўся 10.5. 1931 г. у вёсцы Нова-Аляксандраўка Дрыбінскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Магілёўскае педагагічнае вучылішча (1951). Служыў у Савецкай Арміі. У 1954—1957 гг. быў супрацоўнікам рэспубліканскай газеты «Звязда», у 1964—1965 гг.— рэдактарам выдавецтва «Беларусь». Член СП СССР з 1955 г.

Памёр 12.3.1988 г.

З вершамі ў друку ўпершыню выступіў у

1948 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Паходныя кастры» (1955), «На грэбнях хваль» (1959), «Шчодрасць» (1962), «Ураган» (1966), «Профіль веку» (1969), «Кляновыя лісты» (1971), «Пераклічка» (1973), «Клопат» (1976), «Водсветы» (1978), «Азарэнне» (1980), «Крона» (выбранае, 1981), «Пладаноснасць» (1986), «Званы нябёс» (1988).

Пераклаў на беларускую мову шэраг твораў А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага, М. Святлова, А. Пракоф'ева, М. Дудзіна, С. Нараўчатава, Я. Райніса, Я. Судрабкална, І. Харыка, паэму «Ануш» А. Туманяна, «Маабіцкі сшытак» М. Джаліля (з А. Пысіным, 1975), асобныя вершы таджыкскіх, узбекскіх, азербайджанскіх і башкірскіх паэтаў.

Выступаў у друку з рэцэнзіямі і літаратурна-крытычнымі артыкуламі.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова (1987) за кнігу вершаў «Пладаноснасць».

---

## *Леанід ГАЎРЫЛАЎ*



Леанід Рыгоравіч Гаўрылаў нарадзіўся 2.2. 1918 г. у вёсцы Бердыж Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і рабочага-сезонніка.

Вучыўся ў Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме. Паступіў у Інстытут народнай гаспадаркі, а ў 1936 г. перавёўся на літаратурны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута. Пасля заканчэння інстытута (1940) прызваны ў Чырвоную Армію. Служыў у танкавых войсках механікам-вадзіцелем. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны — на фронце.

Загінуў у 1941 г.

Першыя вершы з'явіліся ў 1935 г. Друкаваўся ў альманаху «Аднагодкі», у газетах «Гомельская праўда», «Літаратура і мастацтва», у часопісе «Полымя рэвалюцыі». Нізкі вершаў змешчаны ў зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Крывёю сэрца» (1967). У 1961 г. выйшла кніжка паэзіі «Вернасць».

*Леанід ГАЎРЫЛКІН*



Леанід Іванавіч Гаўрылкін нарадзіўся 22.5. 1935 г. у пасёлку Стэп Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1952 г. паступіў на адзяленне філасофіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, а праз два гады перавёўся на аддзяленне журналістыкі. Пасля заканчэння універсітэта (1957) працаваў адказным сакратаром рэдакцыі цераховўскай раённай газеты «Ленінец», а ў 1960—1977 гг.— рэдактарам на Гомельскай студыі тэлебачання. З 1967 г. адначасова з'яўляўся сакратаром Гомельскага абласнога аддзялення СП БССР. У 1977—1979 гг.— галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм», у 1979—1986 гг.— сакратар праўлення СП БССР. У 1986—1989 гг.— загадчык аддзела літаратуры часопіса «Вожык». Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны медалём.

Памёр 5.2.1989 г.

Першыя апавяданні надрукаваў у 1959 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Рукі не здрадзяць» (1963), «Прашу звольніць мяне» (1965), «Пакінутая на досвітку» (1970), «Вясенні разліў» (1973), «Урок без перапынку» (1985), «Ружы для каварнай жанчыны» (1990), раманаў «Не магу без цябе» (1975, адзначаны прэміяй на Усесаюзным конкурсе ВЦСПС і СП СССР на лепшы твор пра рабочы клас), «Зямля дзяцей нашых» (1980), «Матчына хата» (1983), «Застаюся з табой» (1986). Выдаў кніжкі гумарыстычных апавяданняў «Мадэльер з Баршчоўкі» (1980), «Як Клава мужа шукала» (1985), «Жыццё Ігната Валуна» (1989). У 1987 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Працаваў і ў галіне драматургіі. Аўтар аднаактовай п'есы «Бо ў пісанні сказана» (1966), п'есы «Выпрабаванне» (пастаўлена ў 1975), радыёп'есы «Жыгулі» ў экспартным варыянце» (пастаўлена ў 1978), камедыі «Хвост паўліна» (пастаўлена на тэлебачанні, 1981). Аўтар кінасцэнарыя дакументальнага фільма пра П. Броўку «Маўчаць ніколі я не буду» (1980).

*Аркадзь ГЕЙНЭ*



Аркадзь Андрэевіч Гейнэ нарадзіўся 10.1.1919 г. у гарадскім пасёлку Бешанковічы Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

Вучыўся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску (1938—1941). Працаваў у рэдакцыях газет. У час Вялікай Айчыннай вайны — на фронце, камандзір узвода механізаванай брыгады.

Загінуў 16.12.1942 г. на Сталінградскім фронце.

З 1934 г. выступаў з вершамі, артыкуламі і рэцэнзіямі ў газетах «Піянер Беларусі», «Чырвоная змена», «Літаратура і мастацтва», часопісе «Полымя рэвалюцыі». У 1939 г. выйшаў зборнік паэзіі «Шчаслівая зорка». Асобныя вершы змешчаны ў калектыўных зборніках «Камсамол на граніцы» (1939), «Мы іх не забудзем» (1949), «Крывёю сэрца» (1967).

*Ларыса ГЕНІЮШ*



Ларыса Антоўна Геніюш нарадзілася 9.8.1910 г. у маёнтку Жлобаўцы Ваўпянскай воласці Гродзенскага павета (цяпер Ваўкавыскі раён Гродзенскай вобласці) у сялянскай сям'і.

Ратуючыся ад першай сусветнай вайны, бацькі разам з дачкою пакінулі родныя мясціны. Вярнуліся дадому ў 1919 г. Скончыла Ваўкавыскую польскую гімназію (1928). У 1937 г. выехала ў Прагу, дзе жыў і вучыўся ва універсітэце яе муж І. Геніюш. Уключылася ў жыццё беларускай эміграцыі, у дзейнасць урада БНР (нейкі час была яго сакратаром). У час нямецкай акупацыі друкавалася ў газетах «Раніца», «Беларускі работнік», у часопісе «Новы шлях» і інш. У 1948 г. арыштавана і перавезена ў Мінск. Судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР асуджана на 25 гадоў зняволення ў папраўча-працоўных лагерах. Камісія Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 30.5.1956 г. абвінавачванне прызнала абгрунтаваным, але тэрмін пакарання быў зменшаны

да 8 гадоў. Пераехала ў пасёлак Зэльву, што на Гродзеншчыне, дзе жыла, не прыняўшы савецкага падданства. У беларускім савецкім друку выступала з 1963 г.

Памерла 7.4.1983 г.

Дэбютавала ў друку вершамі ў 1939 г. Першы зборнік паэзіі «Ад родных ніў» апублікаваны ў Празе ў 1942 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «Невадам з Нёмана» (вершы і паэма, 1967), «На чабары настоена» (1982), «Белы сон» (1990), паэтычныя кніжкі для дзяцей «Казкі для Міхаські» (1972) і «Добрай раніцы, Алесь!» (1976). У часопісе «Спадчына» надрукавана паэма «Маёй бабусі» (1989), у часопісе «Маладосць» — аповесць «Споведзь» (1990).

---

## *Мікалай ГЕРАСІМАЎ*



Мікалай Афанасьевіч Герасімаў нарадзіўся 26.10.1903 г. у горадзе Пецярбургу (Расія) у сям'і служачага.

Працоўны шлях пачаў у 1920 г. справаводам у Малаяраслаўскім павятовым выканкоме Калужскай вобласці. З 1921 г. працаваў інструктарам у спартыўных арганізацыях. Служыў у Чырвонай Арміі (1925—1927). Быў рабочым на суднабудаўнічым заводзе, на трыкатажнай фабрыцы, на будаўніцтве ў Ленінградзе. Пасля заканчэння Ваенна-медыцынскай акадэміі імя С. М. Кірава ў Ленінградзе (1937) быў ваенным урачом. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1956 г. звольнены з вайсковай службы, з 1957 г. жыў у Магілёве. Член СП СССР з 1956 г.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 17.9.1977 г.

У друку выступіў у 1924 г. з нарысамі. Пісаў на рускай мове. Выйшлі аповесці «Где сходятся берега» (Масква, 1931) і «Простуда» (Масква, 1932), раман «Узлы» (Масква, 1933), аповесці «Огонь над Каличевкой» (Чкалаў, 1955), «Завтрашний день принадлежит тебе» (Масква, 1966), «Повести» (1979).

## *Якаў ГЕРЦОВІЧ*



Якаў Бенцыянавіч Герцовіч нарадзіўся 1.1. 1910 г. у вёсцы Сяліба Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

Працоўны шлях пачаў дванаццацігадовым хлапчуком на лесапільным заводзе «Кастрычнік» у Асіповіцкім раёне, быў конюхам у калгасе. У 1936 г. скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску. Працаваў журналістам. У час Вялікай Айчыннай вайны карэспандэнт газет Заходняга, а затым 3-га Беларускага франтоў. Пасля вайны працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда», з 1953 г.— у часопісе «Вожык», у 1967—1970 гг.— намеснік галоўнага рэдактара гэтага часопіса. Член СП СССР з 1948 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 21.4.1976 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў з вершаў у 1927 г. З рэцэнзіямі і літаратурна-крытычнымі артыкуламі выступаў з 1934 г. Аўтар нарыса «Анастасия Мицкевич» (1939), зборнікаў артыкулаў «На перадавых пазіцыях» (1957), «Літаратура і жыццё народа» (1960), «Герой і сучаснасць» (1963), «Пісьменнікі, кнігі, героі» (1966), «Творчае крэда» (1970).

Напісаў кніжку гумарэсак «Не пугай адзінай» (1969). Выдаў франтавыя нататкі «На вайне як на вайне» (1969).

## *Міхаіл ГЕРЧЫК*



Міхаіл Навумавіч (Майсей Беньямінавіч) Герчык нарадзіўся 7.6.1932 г. у горадзе Бабруйску ў сям'і рабочага.

У час Вялікай Айчыннай вайны разам з маці і малодшым братам быў у эвакуацыі ў калгасе імя Мічурына Нова-Пакроўскага раёна Арэнбургскай (тады Чкалаўскай) вобласці, працаваў у сельскай гаспадарцы. Восенню 1944 г. сям'я вярнулася дадому. Скончыў Мінскае педагагічнае вучылішча імя Н. К. Крупскай (1953), аддзяленне журналістыкі філалагічнага факуль-

тэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1958). Працаваў у піянерскай газеце «Зорька», быў рэдактарам на Беларускім радыё. З 1964 г.— рэдактар выдавецтва «Беларусь», з 1972 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1964 г.

У друку выступае з 1949 г. (верш у газеце «Зорька»). Піша на рускай і беларускай мовах. Выдаў для дзяцей аповесці «Ветер рвет паутину» (1963), «Портрет Фиделя» (1964), «Повесть о золотой рыбке» (1968), «Солнечный круг» (1970), зборнікі аповесцей і апавяданняў «Земное притяжение» (1965), «Ветка зеленого дерева» (1977), «Дзе жывуць чараўнікі» (1980), «Самое синее небо» (1982). Аўтар раманаў «Отдаешь навсегда» (1970, адзначаны прэміяй на Усесаюзным літаратурным конкурсе імя М. Астроўскага), «Обретение надежды» (1976), «Вяртанне да сябе», дакументальна-публіцыстычнай аповесці «Час гаспадароў» (1983), сцэнарыя мастацкага фільма «Научись танцевать» (1985).

---

## *Васіль ГІГЕВІЧ*



Васіль Сямёнавіч Гігевіч нарадзіўся 3.1.1947 г. у вёсцы Жыцькава Барысаўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1969 г. скончыў фізічны факультэт Харкаўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. Горкага. Працаваў выкладчыкам фізікі ў Новааляксандраўскай сярэдняй школе Сахноўшчынскага раёна Харкаўскай вобласці. З 1970 г.— карэспандэнт-радыёарганізатар ашмянскай раённай газеты «Красное знамя». У 1970—1977 гг.— інжынер Барысаўскага шклозавода імя Ф. Э. Дзяржынскага. Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1979). З 1979 па 1981 г. працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм», з 1981 г.— у часопісе «Маладосць», з 1988 г.— загадчык аддзела прозы часопіса. Член СП СССР з 1977 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1972 г. у часопісе «Полымя». Аўтар зборнікаў прозы «Спелыя яблыкі» (апавяданні, 1976), «Калі

ласка, скажы» (аповесць і апавяданні, 1978), «Жыціва» (аповесці, 1980), «Астравы на далёкіх азёрах» (аповесці, апавяданні, 1984), «Доказ ад процілеглага» (раман, 1985), «Мелодыі забытых песень» (аповесці, раман, апавяданні, 1988), «Карабель» (аповесці, раман, 1989), «Марсіянскае падарожжа» (аповесць, раман, 1990).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1982) за аповесць «Жыціва».

---

## *Ніл ГІЛЕВІЧ*



Ніл Сымонавіч Гілевіч нарадзіўся 30.9.1931 г. у вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Першыя гады пасля вайны працаваў калгасным паштальёнам. У 1951 г. скончыў Мінскае педагагічнае вучылішча імя Н. К. Крупскай. Апошні год вучобы спалучаў з працай настаўніка ў адной са школ Мінска. У 1956 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, пасля аспірантуру пры ім. З 1960 па 1986 г.— супрацоўнік кафедры беларускай літаратуры гэтага універсітэта. З 1958 да 1963 г. працаваў таксама літкансультантам газеты «Звязда». З 1980 да 1989 г.— першы сакратар праўлення СП БССР. З 1989 г.— старшыня рэспубліканскага Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. Галоўны рэдактар бюлетэня ТБМ «Наша слова». З чэрвеня 1990 г.— старшыня пастаяннай Камісіі Вярхоўнага Савета БССР па адукацыі, культуры і захаванні гістарычнай спадчыны. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1985—1990). У 1990 г. выбраны народным дэпутатам БССР. Член Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР. Кандыдат філалагічных навук. Прафесар. Член СП СССР з 1954 г.

Заслужаны дзеяч навукі БССР (1980).

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, медалём Францыска Скарыны і інш., балгарскім ордэнам Кірыла і Мяфодзія I ступені, ордэнам Югаслаўскай зоркі са стужкай.

Упершыню ў друку з вершамі выступіў у 1946 г. Яму належаць кнігі паэзіі «Песня ў дарогу» (1957), «Прадвесне ідзе па зямлі» (1959),

«Неспакой» (1961), «Бальшак» (1965), «Перазовы» (1967), «Лісце трыпутніку» (1968), «А дзе ж тая крынічанька» (1972), «Запаветнае» (1975), «Актавы» (1976), «У добрай згодзе» (лірыка, гумар і сатыра, 1979), «Святлынь» (1984), «Повязь» (1987), «Як дрэва карэннем» (1986), раман у вершах «Родныя дзеці» (1985), а таксама зборнікі сатыры і гумару «Званковы валет» (1961), «Да новых венікаў» (1963), «Ці грэх, ці 2» (1970), «Як я вучыўся жыць» (1974), «Русалка на Нарачы» (1974), «Кантора» (1989), «Дыялог на хаду» (1990). Выдаў зборнікі вершаў і паэм для дзяцей «Сцяжок на мачце» (1959), «Сіні домік, сіні дом» (1961), «Зялёны востраў» (1963), «Дождж-грыбасей» (1966), «Загадкі» (1971), «Калі рана ўстанеш» (1984), «Добры чалавек» (1987). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1981).

Выдаў зборнік п'ес «Начлег на буслянцы» (1980) і аповесць «Перажыўшы вайну» (1988).

Аўтар кніг па літаратуразнаўству і фалькларыстыцы «Акрыленая рэвалюцыяй» (Паэзія «Маладняка») (1962), «Наша родная песня» (1968), «З клопатам пра песні народа» (1970), «Паэтыка беларускай народнай лірыкі» (1975), «Паэтыка беларускіх загадак» (1976), «Верная вялікім запаветам: Сучасная балгарская паэзія. 1956—1976» (1977), «Вусная народная творчасць і сучасная лірычная паэзія ўсходніх і паўднёвых славян» (1978), зборнікаў літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулаў «У гэта веру» (1978), «Удзячнасць і абавязак» (1982), «Покліч жыцця і часу» (1983), «Годнасць, сумленнасць, мужнасць» (1988), «Вяртанне і працяг» (1990).

Укладальнік і навуковы рэдактар фальклорных зборнікаў «Песні сямі вёсак» (1973), «Песні народных свят і абрадаў» (1974), «Лірычныя песні» (1976), «Лірыка беларускага вяселля» (1979), «Народныя казкі, байкі, апавяданні і мудраслоўі» (1983).

Працуе ў галіне перакладу. У яго перакладзе з балгарскай выйшлі аповесць П. Вежынава «Сляды застаюцца» (1960), раман С. Даскалова «Свая зямля» (1961) і яго ж зборнік апавяданняў «Любча-безбілетнік» (1959), зборнік «Балгарскія народныя песні» (1961), анталогія сучаснай паэзіі «Ад стром балканскіх» (1965), кніга вершаў для дзяцей «Чарадзейны ліхтарык»

(1968), анталогія класічнай паэзіі «Хай зорыць дзень!» (з А. Разанавым, 1973), анталогія аднаго верша «Сто гадоў. Сто паэтаў. Сто песень». (1978), кніга лірыкі Н. Вапцарава «Песня пра чалавека» (1982), Хр. Радзеўскага «Цвіціце, зёлкі, травы, дрэвы» (1985), Г. Джагарава «Зямля — як чалавечая далонь» (1984), Л. Леўчава «Мелодыя для флейты» (1990). Пераклаў многія творы Х. Боцева, І. Вазава, П. Яварава, Н. Вылчава, А. Германава, І. Давыдкава, Д. Методзіева, А. Стаянава і інш. У 1978 г. выйшлі выбраныя старонкі славенскай паэзіі XIX—XX ст. «Маці мая, Славенія». У 1970 г.— казкі народаў Югаславіі «Ці страшны страх», у 1980 — зборнік югаслаўскай паэзіі «Па камянях, як па зорах», у 1985 — кніга лірыкі О. Жупанчыча «У вечным дазоры». Перакладае таксама з рускай, украінскай, польскай, сербахарвацкай, лужыцкай і іншых моў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1980) за кнігу паэзіі «У добрай згодзе» і перакладчыцкую дзейнасць і Міжнароднай прэміі імя Х. Боцева (1986) за рэвалюцыйную паэзію і публіцыстыку.

---

## *Мікола* ГІЛЬ



Мікола Гіль (Мікалай Сымонавіч Гілевіч) нарадзіўся 15.6.1936 г. у вёсцы Слабада Лагойскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1959). Працаваў рэдактарам перадач для дзяцей на Мінскай студыі тэлебачання (1960—1961), літсупрацоўнікам, а потым загадчыкам аддзела ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1961—1972). Некаторы час загадваў аддзелам у рэдакцыі бюлетэня «Родная прырода» (1972), быў супрацоўнікам аддзела публіцыстыкі часопіса «Маладосць» (1972—1977). З 1977 г.— адказны сакратар, з 1982 г.— намеснік галоўнага рэдактара, з 1990 г.— галоўны рэдактар штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1975 г.

Як журналіст пачаў актыўна выступаць з 1957 г. Першае апавяданне надрукаваў у 1962 г.

(газета «Літаратура і мастацтва»). Выдаў кнігі апавяданняў, аповесцей «Ранішнія сны» (1973), «Таццянін чэрвень» (1978), «Пуд жыта» (1982), «Тэлеграма з Кавалевіч» (1984), нарысаў «Пасеянае — узыдзе» (1985), «Камандзіроўка у Вішанькі» (1987), «Кім і Валерыя» (1988), казку-быль «На лясной вуліцы» (1975), зборнік апавяданняў для дзяцей «Самы галоўны чалавек» (1980) і аповесць у апавяданнях пра лётчыка-касманаўта СССР П. Клімука «Ёсць на зямлі крыніца» (1983).

У літаратурнай апрацоўцы М. Гіля выйшлі кнігі ўспамінаў Р. Мачульскага «Страницы бессмертия» (1972) і «Люди высокого долга» (1975), у літаратурным запісе — кніга П. Клімука «Зоры — побач» (1977).

Пераклаў на беларускую мову раман літоўскага пісьменніка В. Бубніса «Пад летнім небам» (1982), кнігі прозы венгерскага пісьменніка І. Эркеня «Сям'я Тотаў. Выстаўка ружаў» (з Л. Каўрус, 1985) і шведскага пісьменніка П. Лагерквіста «Кат. Карлік» (з Г. Шупенькам, 1986).

---

## *Уладзімір ГЛАЗЫРЫН*



Уладзімір Мікалаевіч Глазырын нарадзіўся 6.6. 1901 г. у Гарадзішчанскім раёне Чаркаскай вобласці (Украіна) у сям'і рабочага.

Пасля вучобы ў рэальным вучылішчы працаваў рабочым на чыгунцы. У 1918 г. пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію, удзельнічаў у баях з войскамі Калчака і польскімі легіёнамі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Жыў і працаваў у Мінску і Маскве, у Польшчы. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 10.5.1961 г.

Літаратурнай працай пачаў займацца ў 1934 г. Пісаў на рускай мове. Апублікаваў урыўкі з п'ес «Фронт» (1934—1935), «Огонь» (1935), «Юрий Резлер» (1936) і інш. Аўтар кнігі апавяданняў для дзяцей «В детстве» (1939). У перакладзе на беларускую мову выйшлі драма «Фронт» (1935), «Апавяданні» (1938), аповесць для дзяцей «Коля Гузоўскі» (1936) і апавяданне «Маленькі разведчык» (1938). На рускую мову пераклаў апавяданні М. Лынькова.

*Пятро ГЛЕБКА*



Пятро (Пётр Фёдаравіч) Глебка нарадзіўся 6.7.1905 г. у вёсцы Вялікая Уса Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Уздзенскай сямігодкі (1923) працаваў сакратаром сельсавета. У 1924 г. паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум, з якога ў 1927 г. перавёўся на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Адначасова быў сакратаром рэдакцыі часопіса «Узвышша» (1928—1930). Пасля заканчэння універсітэта (1930) працаваў у рэдакцыях газеты «Калгаснік Беларусі», часопіса «Полымя рэвалюцыі», кансультантам у кабінеце маладога аўтара пры СП БССР. У час Вялікай Айчыннай вайны — у рэдакцыях франтавых газет «За Савецкую Беларусь», «За свабодную Беларусь». Пад псеўданімам Язэп Касіла друкаваў сатырычныя творы ў газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» і ў «Партызанскай дубінцы». У 1943—1945 гг.— рэдактар выдавецтва ЦК КП(б)Б «Савецкая Беларусь», галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР у Маскве. У 1944 г. прызначаны таксама кіраўніком групы па складанню «Руска-беларускага слоўніка» (1953), у 1952—1956 гг. загадваў сектарам лексікаграфіі ў Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР. У 1956—1957 гг.— дырэктар Інстытута мовазнаўства, у 1957—1969 гг.— дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Адначасова ў 1966—1969 гг.— акадэмік-сакратар аддзялення грамадскіх навук АН БССР. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1955—1967). Як член дэлегацыі Беларускай ССР неаднаразова ўдзельнічаў у рабоце сесій Генеральнай Асамблеі ААН (1955, 1956, 1957, 1964). Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 18.12.1969 г.

Першыя вершы былі надрукаваны ў 1925 г. Аўтар кніжак паэзіі «Шыпшына» (1927), «Урачыстыя дні» (1930), «Арка над акіянам» (паэма,

1932), «Арлянка» (паэма, 1932), «Хада падзей» (вершы, паэмы, 1932), «Чатыры вятры» (1935), «Мужнасць» (вершы, паэмы, 1938), «Пад небам бацькаўшчыны» (вершы, паэмы, 1947), «Нашай славы зара» (вершы, паэмы, 1947), «Размова аб шчасці» (1948), «У тыя дні» (паэма, 1957), «Вершы» (1975), «На спатканні дарог» (1990). Для дзяцей выдадзены зборнікі паэзіі «Пад сцягам перамог» (1952), «Прывітанне Радзіме» (1961), «Вобразы роднай краіны» (1964), «Наш сцяг» (1972), «Наш лес» (1973), «Шчаслівы май» (1985). Выйшлі выбраныя творы (1952). Зборы твораў у 2-х (1958), у 3-х (1969—1971), у 4 тамах (1984—1986).

Напісаў драматычную паэму «Над Бярозайракой» (1940, пастаўлена ў 1940), лібрэта оперы «Андрэй Касценя» (пазнейшая назва «Лясное водгулле», 1971, пастаўлена ў 1970), вершаваную драму «Святло з Усходу» (1957, пастаўлена ў 1957).

Выступаў з нарысамі, літаратурна-крытычнымі і публіцыстычнымі артыкуламі. Выйшлі кніжка нарысаў «Ураджай» (з П. Броўкам, 1933), зборнік артыкулаў «Паэзія барацьбы і перамогі» (1973), «Пытанні гісторыі, філалогіі і мастацтва» (1975). Аўтар многіх навуковых прац у галіне беларускай лексікаграфіі, мастацтвазнаўства і фалькларыстыкі. Ініцыятар і заснавальнік выдання ў АН БССР шматтомнага Збору беларускага фальклору (выходзіць з 1970).

Перакладаў на беларускую мову творы А. Пушкіна («Барыс Гадуноў», вершы), М. Лермантава, М. Някрасава, А. Чэхава, Дж. Байрана, А. Міцкевіча, С. Стандэ, М. Горкага, У. Маякоўскага, А. Пракоф'ева, А. Суркова, М. Галоднага, Б. Лаўрынёва, Т. Шаўчэнкі, М. Рыльскага, М. Бажана, П. Варанько, І. Харыка, А. Платнера і інш.

## *Адам ГЛОБУС*



Адам Глобус (Уладзімір Вячаслававіч Адамчык) нарадзіўся 29.9.1958 г. у горадзе Дзяржынску Мінскай вобласці ў сям'і пісьменніка.

У 1959 г. з бацькамі пераехаў у Мінск. Вучыўся ў Мінскім мастацкім вучылішчы на педагагічным аддзяленні (1973—1977). Пасля заканчэння вучылішча паступіў на мастацкае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (скончыў у 1983). Працаваў чарцёжнікам, мастаком-рэстаўратарам, мастаком-афарміцелем. З 1987 г.— рэдактар у часопісе «Крыніца» («Родник»). Член СП СССР з 1988 г.

Працуе ў галіне паэзіі і прозы. У друку пачаў выступаць з вершамі ў 1981 г. (газета «Літаратура і мастацтва», часопіс «Маладосць»). Аўтар кнігі паэзіі «Парк» (1988) і зборніка апавяданняў «Адзінота на стадыёне» (1989).

## *Уладзімір ГЛУШАКОЎ*



Уладзімір Сцяпанавіч Глушакоў нарадзіўся 7.4.1952 г. у гарадскім пасёлку Давыд-Гарадок Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы № 1 у Давыд-Гарадку (1969) паступіў у Мар'інагорскі сельскагаспадарчы тэхнікум Пухавіцкага раёна. За паўгода да заканчэння (у маі 1971) прызваны ў Савецкую Армію. Дэмабілізаваўшыся, працаваў слесарам-зборшчыкам на галоўным канвееры Мінскага трактарнага завода (1973—1976), свідравальшчыкам, электракаршчыкам на маторным заводзе (1976—1979). Вучыўся завочна на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1982 г. скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага. Працаваў рэдактарам аддзела прозы часопіса «Неман» (1979—1988). Член СП СССР з 1986 г.

З першымі публікацыямі ў рэспубліканскім друку выступіў у 1974 г. Працуе ў жанры прозы

і публіцыстыкі. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар аповесцей «Семена» (1981), «Капли» (Масква, 1984), дакументальнай аповесці «Тёплые листья тополей» (1984), раманаў «Цветение калины» (1987), «На круги своя» (1990), шэрагу нарысаў, апублікаваных у перыядычным друку.

---

*Уладзімір* *ГНІЛАМЁДАЎ*



Уладзімір Васільевіч Гніламёдаў нарадзіўся 26.12.1937 г. у вёсцы Кругель Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна (1959). Служыў у Савецкай Арміі (1959—1961). Працаваў завучам Тамашоўскага дзіцячага дома, настаўнікам Камароўскай сярэдняй школы Брэсцкага раёна. У 1965 г. скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і быў залічаны навуковым супрацоўнікам гэтага ж інстытута. У 1969—1976 гг. працаваў у апараце ЦК КП Беларусі інструктарам, затым загадчыкам сектара мастацкай літаратуры. З 1976 г.— намеснік дырэктара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, з 1977 г. адначасова загадчык аддзела тэорыі літаратуры. Доктар філалагічных навук. Член СП СССР з 1972 г.

Узнагароджаны медалямі.

У друку выступае як крытык і літаратуразнавец з 1962 г. Выдаў брашуры «Лірычны летапіс часу» (1967), «Ленін у сэрцы» (1968), «Сучасная беларуская паэзія» (1969), «Пафас жыццесцвярджэння: Вобраз чалавека актыўнай жыццёвай пазіцыі ў сучаснай беларускай паэзіі» (1985). Аўтар манаграфіі «Традыцыі і наватарства» (1972), «Сучасная беларуская паэзія: Творчая індывідуальнасць і літаратурны працэс» (1983), «Іван Мележ: Нарыс жыцця і творчасці» (1984), зборнікаў літаратурна-крытычных артыкулаў «Упоравень з часам» (1976), «Як само жыццё» (1980), «Ля аднаго вогнішча» (1984), «Класікі і сучаснікі» (1987). Адзін з аўтараў кнігі «У. І. Ленін і Кастрычніцкая рэвалюцыя ў беларускай літаратуры» (з С. Лаўшуком, Л. Савік, 1987).

## *Юрка* *ГОЛУБ*



Юрка (Юрый Уладзіміравіч) Голуб нарадзіўся 20.10.1947 г. у вёсцы Горна Зэльвенскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1970) працаваў рэдактарам на Гродзенскай студыі тэлебачання. З 1978 г.— загадчык аддзела культуры абласной газеты «Гродненская правда», з 1979 г.— загадчык аддзела мастацкага вяшчання Гродзенскага абласнога тэлерадыё. Член СП СССР з 1971 г.

Друкавацца пачаў у раённым друку ў 1963 г., у рэспубліканскім — у 1965 г. Выдаў зборнікі паэзіі «Гром на зялёнае голле» (1969), «Дрэва навальніцы» (1973), «Векапомнае поле» (1976), «Помню пра цябе» (1983), «Сын небасхілу» (1989). Аўтар кнігі для дзяцей «У бары грыбы бяры» (1986).

## *Іван* *ГРАМОВІЧ*



Іван Іванавіч Грамовіч нарадзіўся 26.7.1918 г. у вёсцы Закружка Мінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў літаратурна-лінгвістычны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1939). У 1939—1945 гг.— у Савецкай Арміі, служыў у артылерыйскіх часцях як палітработнік і камандзір. Друкаваў нарысы ў франтавых газетах. Працаваў загадчыкам аддзела, адказным сакратаром часопіса «Беларусь» (1946—1953), адказным сакратаром часопіса «Маладосць» (1953—1954). У 1956 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Быў начальнікам сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм» (1956—1957), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць» (1957—1958), літкансультантам СП БССР (1958—1969), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Вожык» (1970—1975). Член СП СССР з 1946 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1978).

Памёр 2.7.1986 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1935 г. (альманах «Аднагодкі»). Аўтар кніг «Апавяданні» (1947), нарысаў «Агні пяцігодкі» (1949), зборніка апавяданняў, аповесцей «Шырокія азёры» (1951), «Да ясных вышыняў» (1952), «У лесе на палянцы» (1957), «Рына-Марына» (1958), «Далі сабе слова» (1970), «Чатыры сантыметры надзеі» (1987), зборнікаў апавяданняў для дзяцей «Першае верасня» (1949), «Сонца скрозь воблакі» (1964), «Як вясну рабілі» (1985). Выдаў зборнікі гумару «Нарасць» (1961), «Вадалей — Гэтакдалей» (1975) і «Залатая бранзалетка» (1977). У часопісе «Полымя» апублікаваў першую частку рамана «Іду з табой, Масква!» (1953). Выйшлі кнігі ўспамінаў «У сховах памяці і сэрца» (1983), нататак «Зялёны долар — чорны забойца» (1985). Выйшлі «Выбранае» (1968, 1988) і Выбраныя творы ў 2 тамах (1978).

Аўтар сцэнарыяў дакументальных і відавых фільмаў «Памяццю сэрца» (1962), «Паэт у дарозе» (1963), «Паўлік і партфель» (1963).

Пераклаў з рускай і ўкраінскай моў аповесць М. Носава «Дзённік Колі Сініцына» (1955), раман У. Кочатава «Браты Яршовы» (1960), паасобныя творы А. Голубевай, А. Кавінькі.

---

## *Міхайла ГРАМЫКА*



Міхайла (Міхаіл Аляксандравіч) Грамыка нарадзіўся 12.11.1885 г. у вёсцы Чорнае Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і разначынца.

У час вучобы ў Магілёўскай гімназіі ўдзельнічаў у рабоце нелегальнага гуртка, які знаходзіўся пад уплывам магілёўскай арганізацыі РСДРП. У 1905 г. паступіў у Маскоўскі універсітэт на медыцынскі факультэт, затым перавёўся на фізіка-матэматычны па спецыяльнасці геалогія. У 1905 г. удзельнічаў у маскоўскім снежаньскім паўстанні. У 1906—1907 гг. уваходзіў у сялянскую арганізацыю пры Магілёўскім акруговым камітэце РСДРП. Пасля закан-

чэння універсітэта (1911) настаўнічаў у Адэсе ў прыватным камерцыйным вучылішчы, у жаночых гімназіях, у 1920 г. быў загадчыкам школы-інтэрната для беларусаў-бежанцаў. У 1921—1930 гг. працаваў у Інбелкульце, выкладаў геалогію ў Белпедтэхнікуме, быў дацэнтам кафедры геалогіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Адным з першых браў удзел у пошуках нафты на Палессі. У 1930 г. рэпрэсіраваны і сасланы ў Іванава-Вазнясенск. Пасля заканчэння тэрміну ссылкі (1936) пераехаў з сям'ёй у Запалярны Кіраўск, дзе працаваў у горным тэхнікуме. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны апынуўся ў г. Чусовым Пермскай вобласці. Праз год пераехаў ва Удмурцію. Займаў розныя пасады, у тым ліку дацэнта Удмурцкага педінстытута (Іжэўск). У 1948—1952 гг. зноў працаваў у Запалярным горным тэхнікуме. Апошнія гады жыў у г. Хімкі пад Масквой. Рэабілітаваны 15.11.1957 г. Член СП СССР з 1965 г.

Памёр 30.6.1969 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1907 г. (пісаў спачатку на рускай мове). У 1922 г. апублікаваў у часопісе «Полымя» паэму «Гвалт над формай», у 1927 г. выйшлі кнігі паэзіі «Плынь» (вершы і паэмы) і «Дзве паэмы». Аўтар п'ес «Змітрок з Высокай Буды» (1918), «Скарынін сын з Полацка» (пастаўлена ў 1926), «Каля тэрасы» (1929, пастаўлена ў 1927, у новай рэдакцыі выйшла ў 1975), «Віно бушуе» (1929), «Над Нёманам» (пастаўлена ў 1927), «Воўк» (1930). У 1967 г. выдадзена «Выбранае», у 1987 г.— «Родная пушча» (п'есы, вершы, паэмы, успаміны, лісты).

Выступаў як крытык з артыкуламі пра творчасць М. Багдановіча, пра пастаноўку «Цара Максімільяна» і інш.

Апублікаваў на беларускай мове падручнікі «Пачатковая геаграфія» (1923, 4 выданні), «Уводзіны ў навуку аб неарганічнай прыродзе» (ч. 1— Крышталаграфія, ч. 2 — Мінералогія, 1926).

Перакладаў творы Л. Талстога, У. Сасюры.

## *Пятрусь ГРАНІТ*



Пятрусь Граніт (Іван Пятровіч Івашэвіч) нарадзіўся 24.1.1909 г. у вёсцы Зачэпічы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1927—1939 гг. працаваў брукаром, у 1930 г. уступіў у рады КПЗБ. Прымаў удзел у нелегальным з'ездзе беларускіх пісьменнікаў у Вільні (1933). За рэвалюцыйную дзейнасць арыштоўваўся ўладамі буржуазнай Польшчы. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў старшынёй Беліцкага сельсавета (1939—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны быў сувязным партызанскай брыгады «Барацьба» на Гродзеншчыне, выступаў у партызанскім друку з вершамі. Пасля вайны скончыў завочна Навагрудскае педагагічнае вучылішча (1950), працаваў настаўнікам, загадчыкам пачатковай школы ў Зачэпічах (1945—1971).

Памёр 14.1.1980 г.

У друку ўпершыню выступіў з вершам у 1933 г. («Беларуская газета»). Першая кніжка паэзіі «Над хвалямі Нёмана» была падрыхтавана да друку ў 1939 г., але не выйшла ў сувязі з вайной. Аўтар зборніка паэзіі для дзяцей «Сцяжынка» (1978), нізкі вершаў апублікаваны ў зборніках «Сцягі і паходні» (1965), «Ростані волі» (1990).

## *Сяргей ГРАХОЎСКІ*



Сяргей Іванавіч Грахоўскі нарадзіўся 25.9.1913 г. у сяле Нобель Пінскага павета Мінскай губерні (цяпер Зарэчненскі раён Ровенскай вобласці, Украіна) у сялянскай сям'і.

Дзяцінства і юнацтва прайшлі ў мястэчку Глуск Магілёўскай вобласці. Працаваць пачаў у 1930 г. рабочым на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. У 1935 г. скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, працаваў рэдактарам на Беларускім радыё.

У 1936 г. быў рэпрэсіраваны, 10 гадоў знаходзіўся ў лагеры (Горкаўская вобласць). Пасля

вызвалення выкладаў рускую мову і літаратуру ва Урэцкай сярэдняй школе Слуцкага раёна (1946—1949). Быў паўторна арыштаваны і па ранейшым абвінавачванні высланы на вечнае пасяленне ў Новасібірскую вобласць, дзе працаваў настаўнікам. Пасля рэабілітацыі (19.10. 1955) працаваў на Беларускім радыё (1956—1957 гг.), загадваў аддзелам рэдакцыі часопіса «Бярозка» (1957—1959). Быў літаратурным кансультантам СП БССР (1959—1960), літаратурным рэдактарам часопіса «Вясёлка» (1960—1973), у 1973—1974 гг.— адказны сакратар Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Член СП СССР з 1956 г.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1983).

Узнагароджаны медалямі.

Першы верш надрукаваў у 1926 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «Дзень нараджэння» (1958), «Чаканне» (1960), «Табе зайздросціць сонца» (1963), «Памяць» (1965), «Тры вымярэнні» (1967), «Вершы» (1968), «Паэма дарог» (1970), «Зазімак» (1976), «Лірыка» (1978), «Зачараванасць» (1978), «Асеннія гнёзды» (1982), «Кругі надзеі» (1985), «Верую» (1987), «І радасць і боль» (1988).

Выдаў нарыс «Горад маладосці» (1960), зборнік апавяданняў «Які вялікі дзень» (1966), дакументальныя аповесці «Рудабельская рэспубліка» (1968, паводле аповесці пастаўлены спектакль у 1968, твор экранізаваны ў 1972), «Суровая дабрата» (1977), аповесці «Ранні снег» (1975), «Гарачае лета» (1974), «Сустрэча з самім сабою» (1988), «Споведзь» (вершы, аўтабіяграфічныя аповесці, 1990), кнігу ўспамінаў «Так і было» (1986). Выйшлі кнігі вершаў для дзяцей «Ад вясны да вясны» (1959), «Сёння і заўтра» (1961), «Гарыць касцёр» (1966), «Сонечная сцежка» (1980), «Знаходка» (1985), апавяданняў «Агеньчык у акне» (1972). У 1973 і ў 1983 гг. выдаваліся Выбраныя творы ў 2 тамах.

Выступае і як публіцыст. Выдаў кнігу «Мінск» (1971) і нарыс на маральна-этычную тэму «Бацькі і дзеці» (1972).

На беларускую мову пераклаў «80 000 кіламетраў пад вадой» Ж. Верна (1937, з Ю. Лявонным), аповесць «Ваенная тайна» А. Гайдара (1936), раман «Крушэнне» Р. Тагора (1958),

«Выбраныя вершы і паэмы» А. Блока (1980), кнігу лірыкі М. Дудзіна «Пасля спаткання» (1984), асобныя творы А. Пушкіна, Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, Я. Райніса, С. Ясеніна, Лесі Украінкі, П. Варанько, М. Забалоцкага, А. Твардоўскага, М. Ціханава, М. Ісакоўскага, Р. Гамзатава, А. Венцловы, Т. Масэнкі, М. Нагнібеды, У. Сасюры, Я. Судрабкална і іншых паэтаў.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова (1983) за зборнік «Асеннія гнёзды».

---

## *Анатоль* ГРАЧАНІКАЎ



Анатоль Сымонавіч Грачанікаў нарадзіўся 8.9. 1938 г. у вёсцы Шарпілаўка Гомельскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і служачага.

Пасля заканчэння ў 1960 г. Гомельскага інстытута інжынераў чыгуначнага транспарту працаваў на Гомельскім рамонтна-механічным заводзе (1960—1962), намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі Гомельскага абкома камсамола (1962—1965), першым сакратаром Гомельскага гаркома камсамола (1965—1967). Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1969). У 1969—1971 гг.— загадчык аддзела літаратуры газеты «Літаратура і мастацтва», а у 1971—1976 гг.— намеснік старшыні праўлення СП БССР. З 1976 г.— галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка», з 1978 г.— часопіса «Бярозка», з 1982 г.— часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1965 г.

Памёр 7.3.1991 г.

Упершыню выступіў у друку ў 1957 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Магістраль» (1964), «Круглая плошча» (1971), «Грыбная пара» (1973), «Начная змена» (1975), «Дрэва на выспе» (1977), «Калі далёка ты...» (выбраная лірыка, 1979), «Палессе» (вершы і паэмы, 1983), «Верасень» (1984), «Я вас люблю» (1986), «Жнівень-45» (1990). Выданы на рускай мове зборнік паэзіі «Звезды и курганы» (Масква, 1976) адзначаны прэміяй на Усесаюзным літаратурным конкурсе імя М. Астроўскага (1978). Напісаў кніжку сатыры і гумару «Школа танцаў» (1988). Выдаў кніжкі для дзяцей «Казка пра Івана-ганчара і пачвару цара» (1980), «Валерка і ля-

таючая талерка» (1983), «Жывая вада» (казкі, 1985), «Зорны палёт» (вершы, казкі, легенды, 1988). У 1988 г. выйшла «Выбранае».

Пераклаў на беларускую мову зборнік паэзіі Зульфіі «Такое сэрца ў мяне» (з Э. Агняцвет, 1985), кнігі вершаў для дзяцей сучасных афганскіх паэтаў «Ватан — значыць Радзіма» (1987), М. Пацхішвілі «Рагатун і рагатуха» (1989), а таксама асобныя творы рускіх, украінскіх, малдаўскіх, літоўскіх, сярэднеазіяцкіх паэтаў і паэтаў замежных славянскіх краін.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1974) за зборнік вершаў «Грыбная пара», Дзяржаўнай прэміі БССР (1984) за кнігі вершаў «Палессе», «Валерка і лятаючая талерка», «Казка пра Івана-ганчара і пачвару цара».

---

## *Мікола ГРОДНЕЎ*



Мікола (Мікалай Пятровіч) Гроднеў нарадзіўся 25.10.1929 г. у вёсцы Старая Алешня Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Гомельскім тэхнікуме фізкультуры. У 1953 г. скончыў гістарычны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута імя В. Чкалава. Быў школьным інспектарам у Вілейскім раёна, дырэктарам Куранецкай сярэдняй школы рабочай моладзі (1954—1956). Працаваў у радашковіцкай раённай газеце «Сцяг Ільіча» (1957—1959), быў уласным карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва». З 1961 г.— у аддзеле фельетонаў рэдакцыі часопіса «Вожык», у 1968—1984 гг.— рэдактар аддзела нарысаў часопіса «Беларусь», у 1984—1989 гг.— адказны сакратар бюлетэня «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Член СП СССР з 1964 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1954 г. Выйшлі зборнікі апавяданняў і аповесцей «За бацькоўскім парогам» (1960), «Цяжкае шчасце» (1963), «Вясна была...» (1968), «Заручыны» (1972), «Высокі поўдзень» (1974), «Зоркаўкі» (1975), «Што скажуць людзі» (1975), «Салодкі боль» (1977), «Крок да тайны» (1983), «Нязведаная даль» (1989), зборнік гумарыстычных апавяданняў «Клін клінам» (1979).

## *Клім* ГРЫНЕВІЧ



Клім Лазаравіч Грыневіч нарадзіўся 18.2.1912 г. у вёсцы Шасцёраўка Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Працаваў на будаўніцтве чыгункі Асіповічы—Магілёў — Рослаў (1929—1930). Вучыўся ў Рагачоўскім педагагічным тэхнікуме (1930—1931). У 1931 г. пераехаў у Мінск. Працаваў на будаўніцтве, карэктарам у друкарні, літсупрацоўнікам газет «Рабочий» і «Сельгасрабочы», сакратаром рэспубліканскага ЦК прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі. З верасня 1932 г. вучыўся на літаратурна-творчым аддзяленні Мінскага Вышэйшага педагагічнага інстытута. Вясной 1933 г. быў рэпрэсіраваны і высланы ў Чымкенцкую вобласць, г. Сарыагач, дзе працаваў настаўнікам у мясцовай школе, пасля — інспектарам райана (1933—1935). Служыў у радах Чырвонай Арміі. У 1937—1941 гг.— настаўнічаў у школах г. Балагое Калінінскай вобласці і адначасова вучыўся на літаратурным факультэце Ленінградскага педагагічнага інстытута імя А. І. Герцэна.

Памёр 3.3.1941 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1929 г. (газеты «Піянер Беларусі», «Чырвоная змена»). Аўтар зборніка паэзіі «На бераг» (1932).

## *Мікола* ГРЫНЧЫК



Мікола (Мікалай Міхайлавіч) Грынчык нарадзіўся 1.8.1923 г. у вёсцы Быцень Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

З сакавіка 1943 г.— агентурны разведчык партызанскага атрада «Савецкая Беларусь» Брэсцкага злучэння, з ліпеня 1944 г.— у Савецкай Арміі, на фронце. Быў цяжка паранены. Пасля вайны працаваў загадчыкам Быценьскага раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння. У 1952 г. скончыў літаратурны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута. Настаўнічаў на Гродзеншчыне. Скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1957), затым — навуковы супра-

цоўнік гэтага інстытута. З 1970 г.— загадчык кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Адначасова ў 1973—1985 гг.— галоўны рэдактар рэспубліканскага навуковага міжведамаснага зборніка «Беларуская літаратура». З 1980 г.— загадчык кафедры літаратуры Мінскага інстытута культуры. Доктар філалагічных навук. Прафесар. Член СП СССР з 1971 г.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1977).

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Выступае як крытык і літаратуразнавец з 1957 г. Аўтар манаграфій «Максім Багдановіч і народная паэзія» (1963), «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрачніцкай паэзіі» (1969), «Шляхі беларускага вершаскладання» (1973), крытыка-біяграфічнага нарыса «Аркадзь Куляшоў» (1964), адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1966), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» (1977), падручнікаў для студэнтаў філфака педінстытутаў «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1917—1940» (1981), «Гісторыя беларускай літаратуры. XIX — пачатак XX ст.» (1981) і «Гісторыя беларускай літаратуры. Старажытны перыяд» (1985).

---

## *Валерый ГРЫШАНОВІЧ*



Валерый Мікалаевіч Грышановіч нарадзіўся 3.3.1947 г. у гарадскім пасёлку Халопенічы Крупскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых.

У 1973 г. скончыў факультэт журналістыкі Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. Ламаносава. Працаваў у рэдакцыях крупскай раённай газеты «Ленінскім курсам», клецкай раённай газеты «Да новых перамог». У 1969 г. абраны сакратаром Крупскага райкома камсамола, у 1972—1973 гг. працаваў у Мінскім абкоме камсамола. Служыў у Савецкай Арміі (1973—1974). У 1974—1977 гг.— інструктар, намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агі-

тацыі ЦК ЛКСМ Беларусі, у 1977—1979 гг.— намеснік рэдактара, рэдактар газеты «Знамя юности», у 1979—1983 гг.— загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия», у 1983—1987 гг.— інструктар сектара газет і часопісаў ЦК КПБ. З 1987 г.— дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1990 г.

З вершамі выступіў упершыню ў рэспубліканскім друку ў 1968 г. («Сельская газета»). Піша на рускай мове. Аўтар зборніка паэзіі «Стронций в капле росы» (1990), адзін з аўтараў кнігі нарысаў «Дальние дороги» (1983).

---



## *Кастусь* ГУБАРЭВІЧ

Кастусь (Канстанцін Лявонцьевіч) Губарэвіч нарадзіўся 5.1.1907 г. у вёсцы Радучы Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1927 г. скончыў Магілёўскі педагагічны тэхнікум. Настаўнічаў на Гомельшчыне. Скончыў сцэнарнае аддзяленне Дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі ў Маскве (1932). Працаваў у газеце «Палеская праўда», рэдактарам на кінафабрыцы Белдзяржкіно ў Ленінградзе, на Беларускім радыё ў Мінску. У час Вялікай Айчыннай вайны — рэдактар на радыёстанцыі «Савецкая Беларусь». У пасляваенныя гады загадваў аддзелам літаратурна-драматычных перадач на Беларускім радыё, аддзелам мастацтва ў рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», быў членам рэпертуарнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм». У 1966—1974 гг.— галоўны рэдактар рэпертуарнай калегіі Міністэрства культуры БССР. Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1966).

Памёр 3.7.1987 г.

Выступаць у друку пачаў у 1926 г. з вершамі і апавяданнямі (газета «Чырвоная змена», часопіс «Маладняк», альманах «Дняпроўскія ўсплескі»). Першая кніга — зборнік апавяданняў «Гайда туды і Жывыя шрубы» (1930).

Працаваў пераважна ў галіне драматургіі, тэатра і кіно. Аўтар п'ес «Цэнтральны ход» (з І. Дорскім, пастаўлена ў 1948), «Брэсцкая крэпасць» («Цытадэль славы», 1952, пастаўлена ў 1953, аднайменны спектакль Брэсцкага абласнога драмтэатра імя ЛКСМ Беларусі атрымаў у 1967 г. прэмію Усесаюзнага Ленінскага камсамола), «Простая дзяўчына» (1953, пастаўлена ў 1953), «На крутым павароце» (1956, пастаўлена ў 1956), «Галоўная стаўка» (1957, пастаўлена ў 1957, новы варыянт пад назваю «Брэсцкі мір» — у 1969), «Далёкая песня» (1961, пастаўлена ў 1962), «А куды ж нам падзецца» (пастаўлена ў 1963), «Першы ўрок» («Дзеля жыцця», пастаўлена ў 1967), «Салодкі месяц» (пастаўлена ў 1968), «Партызанская зона» (пастаўлена ў 1976), «Даруй мне» (пастаўлена ў 1980). Выйшлі зборнікі «П'есы» (1954), «П'есы» (1963), «П'есы» (1969), «Драмы і камедыі» (1981), кніга кінааповесцей «Анютина дорога» (1980).

У кінадраматургіі дэбютаваў сцэнарыем «Баям насустрач» («Пераможцы», з Е. Гезіным і К. Мінцам, 1932). Па яго сцэнарыях пастаўлены мастацкія фільмы «Дзяўчынка шукае бацьку» (з Я. Рысам, 1958), «Анюціна дарога» (1968), «Паланез Агінскага» (1971), «Неадкрытыя астравы» (1973), «Дрэвы на асфальце» (1984), некалькі дакументальных фільмаў, а таксама тэлефільмы «Галоўная стаўка», «Далёкая песня».

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1972) за сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Дзяўчынка шукае бацьку» (з Я. Рысам), «Анюціна дарога» і «Паланез Агінскага», лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1968) за сцэнарыі фільмаў «Дзяўчынка шукае бацьку» і «Анюціна дарога».

## *Алесь ГУРЛО*



Алесь (Аляксандр Кандратавіч) Гурло нарадзіўся 31.1.1892 г. у гарадскім пасёлку Капыль Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Капыльскае чатырохкласнае вучылішча (1908). Працаваў чорнарабочым на лесапільні, зарабляў падзённай работай. У 1909 г. уступіў у рады Капыльскай арганізацыі РСДРП. Пасля працаваў на заводзе «Вулкан» у Пецярбургу. З 1913 г. служыў на Балтыйскім флоце — спачатку матросам на крэйсеры «Богатырь», а ў першую сусветную вайну — унтэр-афіцэрам на мінаносцы «Забияка». Быў цяжка паранены. Удзельнік Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый і грамадзянскай вайны. З атрадам рэвалюцыйных матросаў прымаў удзел у штурме Зімняга палаца, у падаўленні эсэраўскага мяцяжу ў Яраслаўлі, у барацьбе з калчакаўцамі. У 1921 г. вярнуўся на Беларусь. Працаваў у Інбелкульце, у Інстытуце мовы АН БССР. Быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Полымя», «Пробліск». У 1930 г. рэпрэсіраваны. Высланы на 5 гадоў у Самару. Вярнуўся ў Мінск. Рэабілітаваны ў лістападзе 1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 4.2.1938 г.

Першы верш надрукаваў у 1907 г. у газеце «Наша ніва». Аўтар зборнікаў паэзіі «Барвёнак» (1924), «Спатканні» (1925), «Сузор'і» (1926), «Зорнасць» (1927), «Межы» (1929), «Выбраныя творы» (1950), «Вершы» (1953), «Вершы» (1972). У 1947 г. выйшла кніжка вершаў для дзяцей «Нашы птушкі». У 1912 г. напісаў сямейна-бытавую драму «Любоў усё змагае».

Перакладаў на беларускую мову творы рускіх пісьменнікаў А. Аўдзеенкі, Ф. Гладкова, У. Стаўскага і інш.

*Ільья* ***ГУРСКІ***



Ільья Данілавіч Гурскі нарадзіўся 26.4.1899 г. у вёсцы Замосце Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1914 г. у пошуках работы пераехаў у Петраград — спачатку батрачыў у памешчыцкім маёнтку ля станцыі Любань, у 1916 г. стаў качагарам на Абухаўскім заводзе. Удзельнічаў у Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайне. Быў цяжка паранены. Пасля дэмабілізацыі (1924) працаваў у Галоўліце БССР, затым старшынёй Галоўрэперткома БССР, начальнікам Галоўмастацтва БССР. Адначасова вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні (скончыў у 1932). Займаўся ў аспірантуры АН БССР (1932—1935). Быў рэдактарам газеты «Літаратура і мастацтва» (1935—1941). Удзельнік паходу ў Заходнюю Беларусь. У Вялікую Айчынную вайну — адказны сакратар франтавой газеты «За Савецкую Беларусь», рэдактар газеты «За свабодную Беларусь», рэдактар сатырычнага часопіса «Партызанская дубінка». У 1944—1960 гг. рэдагаваў часопіс «Беларусь». Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1969).

Памёр 11.8.1972 г.

Дэбютаваў у друку рэцэнзіямі ў 1926 г. Як драматург пачаў выступаць у 1928 г. Аўтар п'ес «Новым шляхам» (1928), «Дрыгва» (1928), «Сварка» (1929), «Качагары» (1932, пастаўлена ў 1931), «Бальшавіцкая вясна» (1930), «Новы горад» (1933, пастаўлена ў 1931), «На крэсах усходніх» (1933), «Маці» (1934), «Сваты» (1935, пастаўлена ў 1936), «На варце» (1938), «Валодзя Вярбіцкі» (апублікаваны ўрыўкі ў 1937, пастаўлена ў 1941), «Патрыёты» (1939), «Хлеб» (1949), «Свае людзі» (апублікавана і пастаўлена ў 1950), іншых аднаактовак. У 1936 г. выйшлі «Драматычныя творы».

Выдадзены кнігі апавяданняў «Над Нёманам» (1945), «На родных гонях» (1948), «Зары

насустрач» (1949), «Неспакойныя характары» (1955), «У вялікай дарозе» (1958), «Родная дарога» (1961), зборнік апавяданняў для дзяцей «На берагах Нявы» (1977), аповесць «Лясныя салдаты» (1945; у 1979— аповесць і апавяданні), раман «У агні» (1952), раман-хроніка «Вецер веку» (у 3-х ч.— 1966, у 4-х — 1974), раман-памфлет «Чужы хлеб» (1971). У 1951 г. выдадзены Выбраныя творы, у 1989 г. кніга аповесцей і апавяданняў «Расцвілі вішні».

---

## *Эсфір ГУРЭВІЧ*



Эсфір (Эся Саламонаўна) Гурэвіч нарадзілася 22.11.1921 г. у мястэчку Татарск Мсціслаўскага павета (цяпер Манастыршчанскі раён Смаленскай вобласці, Расія) у сям'і шаўца.

Скончыла літаратурны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна (1941). У час Вялікай Айчыннай вайны — медыцынская сястра ў ваенным шпіталі Заходняга, а затым 3-га Беларускага франтоў. У 1946—1949 гг. вучылася ў аспірантуры пры Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР. З 1950 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Доктар філалагічных навук. Член СП СССР з 1977 г.

Узнагароджана ордэнам Вялікай Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

У друку выступае з 1948 г. Аўтар манаграфій «Творчая гісторыя раманаў М. Астроўскага» (1957), «Беларуская дзіцячая літаратура (1917—1967)» (1970), «Пафас гераізму» (1979), «Детская литература Белоруссии» (Масква, 1982), «Янка Маўр: Нарыс жыцця і творчасці» (1983), «Боль и тревога наши» (1986). У сааўтарстве з Л. Гарэлік, Т. Грамадчанка і інш. напісала кнігу «Сучасная літаратура і чытач» (1988). Адзін з аўтараў «Истории белорусской советской литературы» (1977), «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1981—1982).

## *Сяргей* ГУСАК



Сяргей Адамавіч Гусак нарадзіўся 2.4.1930 г. у вёсцы Іванкаўшчына Мазырскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1955 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў настаўнікам Жалудоцкай сярэдняй школы на Гродзеншчыне (1955—1956). У 1956—1958 гг.— выкладчык беларускай мовы і літаратуры Воўчынскай, завуч Маладзводскай сярэдніх школ Высокаўскага раёна (цяпер Камянецкага), з 1958 г.— загадчык Высокаўскага райана. У 1959 г. залічаны ў аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна. Быў навуковым супрацоўнікам Інстытута педагогікі (1960—1962), начальнікам навучальна-метадычнага аддзела Міністэрства асветы БССР (1962—1965), выкладчыкам беларускай літаратуры ў БДУ імя У. І. Леніна (1965—1968). З 1967 г.— намеснік дэкана філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна, у 1968— 1969 гг.— рэктар Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1968 г.

Памёр 20.12.1969 г.

У друку як крытык пачаў выступаць у 1961 г. Аўтар крытыка-біяграфічнага нарыса «Аляксей Кулакоўскі» (1967) і кнігі літаратурна-крытычных артыкулаў «Пафас праўды» (1973).

## *Сілан* ГУСЕЎ



Сілан (Сіла Нічыпаравіч) Гусеў нарадзіўся 14.8.1897 г. у вёсцы Калясянка Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Быў батраком у памешчыка, з 1913 г. працаваў на суконнай фабрыцы ў Пецярбургу. За распаўсюджанне рэвалюцыйных пракламацый у 1914 г. высланы этапам на радзіму. Працаваў на пабудове чыгункі, служыў на Балтыйскім флоце. У пачатку кастрычніка 1917 г. прыкамандзіраваны на крэйсер «Аўрора». Прымаў удзел у штурме Зімняга палаца. Служыў

у Чырвонай гвардыі і Чырвонай Арміі, а таксама на Чарнаморскім флоце. Удзельнічаў у грамадзянскай вайне і ў барацьбе з інтэрвентамі. Быў паранены. З 1921 да 1930 г. быў на партыйнай і савецкай рабоце ў Беларусі. У 1933 г. у Мінску скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі. Працаваў рэдактарам літаратурнага альманаха «Атака», рэдактарам літаратурнага аддзела Радыёкамітэта, дырэктарам Дома творчасці, кансультантам у кабінеце маладога аўтара СП БССР, дырэктарам Беларускага аддзялення Літфонду СССР (1933—1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны служыў у Савецкай Арміі. Двойчы быў паранены. У пасляваенны час працаваў ва ўстановах культуры, друку Беларусі. Член СП СССР з 1940 г.

Памёр 31.3.1986 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеняў і медалямі.

Першае апавяданне было надрукавана ў 1933 г. (часопіс «Полымя рэвалюцыі»). Выйшлі зборнік апавяданняў «За жыццё» (1934) і аповесць «Шлях юнака» (ч. 1, 1938), працяг якой у фрагментах друкаваўся ў часопісе «Полымя» за 1969 г.

---

## *Іван ГУТАРАЎ*



Іван Васільевіч Гутараў нарадзіўся 15.4.1906 г. у вёсцы Воўкаўка Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Выхаванец Леменскай школы-камуны У. І. Леніна на Магілёўшчыне. Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1928). Выкладаў рускую літаратуру ў Магілёўскім палітасветным і педагагічным інстытутах, у БДУ. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у Савецкай Арміі, прымаў удзел у партызанскім руху. У 1945—1947 гг.— сакратар партбюро СП СССР. У 1947 г. скончыў дактарантуру пры Інстытуце сусветнай літаратуры імя М. Горкага. Працаваў у ЦК КПБ загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва Упраўлення прапаганды і агітацыі, а пасля рэарганізацыі намеснікам загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі. З 1951 г.— загадчык кафедры рускай

літаратуры БДУ імя У. І. Леніна, У 1957—1967 гг.— загадчык сектара фальклору Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Член-карэспандэнт АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1946 г.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

Памёр 8.2.1967 г.

У друку выступаў з 1930 г. Літаратурна-навуковую дзейнасць пачаў у 1932 г. з выдання ў Магілёве працы «Бальшавізм і літаратуразнаўства». Аўтар даследаванняў «К. Маркс і Ф. Энгельс пра сутнасць і спецыфіку мастацкай літаратуры» (Магілёў, 1933), «Борьба и творчество народных мстителей» (1949), «Поэтическое мастерство В. В. Маяковского» (Масква, 1950), «Эстетические основы советской литературы» (1950), «Введение в литературоведение» (1954), «Философско-эстетические взгляды А. С. Пушкина» (1957), «Вопросы литературоведения» (метадычны дапаможнік для студэнтаў-завочнікаў, 1958), «Основы советского литературоведения» (1967). Адзін з аўтараў кнігі «Беларуская народная вуснапаэтычная творчасць» (1968).

Склаў хрэстаматыю «Вуснапаэтычная творчасць беларускага народа» (1959, з С. Васілёнкам), зборнік «Сучасны беларускі фальклор» (1963).

---

## *Аляксандр* ГУТКОВІЧ



Аляксандр Залманавіч Гутковіч нарадзіўся 20. 12.1920 г. у вёсцы Аскеры (цяпер у складзе вёскі Вярхоўе) Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і каваля.

Працоўны шлях пачаў у 1938 г. з артыста дапаможнага складу Вялікага драматычнага тэатра імя М. Горкага ў Ленінградзе. У 1939 г. вучыўся на рэжысёрскім факультэце Ленінградскага тэатральнага інстытута, адкуль быў прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны (Калінінскі, Заходні, 3-ці Беларускі і 3-ці Прыбалтыйскі франты). У 1945 г дэмабілізаваўся і паступіў на акцёрскі факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інсты-

тута. Пасля заканчэння інстытута (1949) восем год працаваў акцёрам Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, з 1957 г.— педагогам Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача. З 1959 г.— рэжысёр студыі Беларускага тэлебачання. Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР (1981).

Памёр 9.9.1989 г.

Літаратурнай працай займаўся з 1954 г. Разам з У. Хазанскім напісаў п'есу «Юныя мсціўцы» (1960, пастаўлена ў 1957), з Ф. Казоўскай — п'есы «Правда і счастье» (1960, пастаўлена ў 1959), «Дело ее жизни» (1962, пастаўлена ў 1961), «И завтра...» (1967), інсцэніроўкі «Андрэй Лабанаў» (паводле рамана Д. Граніна «Шукальнікі», пастаўлена ў 1955) і «Уласнасць» (паводле рамана К. Чорнага «Трэцяе пакаленне», пастаўлена ў 1964). Аўтар сцэнарыяў тэлефільмаў «Уся каралеўская раць» (па аднайменным рамане Р. Уорэна, пастаўлены ў 1971), «Атланты і карыятыды» (з І. Шамякіным, пастаўлены ў 1980), тэлеспектакляў «Калі зліваюцца рэкі» (па аднайменным рамане П. Броўкі, пастаўлены ў 1961), «Трывожнае шчасце» (з І. Шамякіным, пастаўлены ў 1968), «Сцяг брыгады» (па аднайменнай паэме А. Куляшова, пастаўлены ў 1975), «Чужая бацькаўшчына» (па аднайменным рамане В. Адамчыка, пастаўлены ў 1983), «Алімпіяда» (па аднайменным рамане І. Пташнікава, пастаўлены ў 1984), аднаактовых п'ес «Кветкі для Алесі» (пастаўлена ў 1988) і «Устаць! Суд ідзе» (паводле нарысаў Я. Богата, пастаўлена ў 1988).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1966) за пастаноўку на тэлебачанні спектакля-трылогіі «Людзі на балоце» паводле аднайменнага рамана І. Мележа.

# Д



*Андрус ДАБУЛЯВІЧУС*

Андрус Дабулявічус нарадзіўся 19.7.1886 г. у маёнтку Паравея Біржайскага раёна (Літва) у сялянскай сям'і.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі служыў у Чырвонай Арміі. Вучыўся ў Камуністычным універсітэце нацыянальных меншасцей Захаду імя Ю. Мархлеўскага (1922—1925), Акадэміі камуністычнага выхавання імя Н. Крупскай (скончыў у 1931), затым у Інстытуце чырвонай прафесуры ў Маскве. У 1927—1928 гг.— сакратар Аршанскага райкома КПБ, у 1934 г. працаваў у палітаддзелах МТС на Міншчыне. З 1935 г. у Мінску, выкладчык на курсах дырэктараў прамысловых прадпрыемстваў, рэдактар Беларускага дзяржаўнага выдавецтва. Член літоўскай секцыі СП БССР з 1935 г.

У жніўні 1937 г. арыштаваны, прыгавораны да 5 год папраўча-працоўных лагераў. Тэрмін адбываў на Магадане.

Памёр 10.6.1938 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1922 г. Выдаў у Мінску на літоўскай мове зборнік вершаў «Мая радзіма» (1936). Пад такой самай назвай у Вільнюсе ў 1960 г. выйшаў зборнік выбраных твораў паэта. Выступаў і як публіцыст.

## *Васіль* ДАВЫДЗЕНКА



Васіль Паўлавіч Давыдзенка нарадзіўся 3.6.1933 г. у вёсцы Нежыхаў Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Мінскага медыцынскага вучылішча (1953) працаваў лабарантам на кафедры ядзернай фізікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Адначасова вучыўся ў вячэрняй сярэдняй школе № 3 г. Мінска. У 1955—1957 гг. служыў у Савецкай Арміі. Скончыў лячэбны факультэт Мінскага медыцынскага інстытута (1963). Працаваў урачом-анколагам у клініцы № 1 Мінска, а ў 1965—1987 гг.— у навукова-даследчым Інстытуце анкалогіі і медыцынскай радыялогіі Міністэрства аховы здароўя БССР.

Памёр 27.9.1987 г.

Друкавацца пачаў у час вучобы ў шматтыражцы інстытута. Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Жывыя струны» (1978), «Свае і чужыя дарогі» (1983).

## *Уладзімір* ДАДЗІЁМАЎ



Уладзімір Ільіч Дадзіёмаў нарадзіўся 8.1.1924 г. у вёсцы Новабеліца (цяпер у межах Гомеля) у сям'і рабочага.

Да вайны скончыў першы курс Камуністычнага інстытута журналістыкі імя С. Кірава ў Мінску. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны — радавы пяхоты, карэкціроўшчык батарэі, з 1943 г. супрацоўнік вайсковай газеты «Гвардейский натиск». Прымаў удзел у баях на Доне, Курскай дузе, у фарсіраванні Дняпра, у вызваленні Польшчы, Румыніі, Венгрыі, Балгарыі, Аўстрыі, Югаславіі. Пад Балатонам (Венгрыя) быў паранены. Пасля вайны завочна скончыў чатыры курсы Гродзенскага педагагічнага інстытута, а ў 1958 г.— Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Быў карэспандэнтам газеты «Чырвоная змена», Беларускага радыё, літсупрацоўнікам часопіса «Калгаснік Беларусі». У 1959—1964 гг.— уласны карэспан-

дэнт «Литературной газеты». Член СП СССР з 1955 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 25.11.1983 г.

Друкавацца пачаў у 1940 г., з апавяданнямі выступіў у франтавым друку ў 1943 г. Аўтар дакументальных кніг «Жлобінскія маладагвардзейцы» (1950), «Белаазёрскі дзённік» (1963), рамана «Над Нёманам» (1957) і нарысаў «Людзі вялікай будоўлі» (1960), «Даярка Лідзія Асіюк» (1961).

---

## *Віктар ДАЙЛІДА*



Віктар Браніслававіч Дайліда нарадзіўся 28.9.1930 г. у вёсцы Славінск Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1952 г. скончыў Баранавіцкі настаўніцкі інстытут. Настаўнічаў у Пастарынскай сямігадовай школе. Скончыў завочна факультэт беларускай мовы і літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1957). Быў намеснікам дырэктара Ішкалдаскай (1957—1959), дырэктарам Войкавіцкай (1959—1962) васьмігадовых школ Баранавіцкага раёна, старшым рэдактарам на Брэсцкай студыі тэлебачання (1962). У 1962—1973 гг.— дырэктар Чапліцкай сярэдняй школы Слуцкага раёна. У 1973—1982 гг. працаваў намеснікам дырэктара Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР. У 1988—1989 гг.— старшыня кааператыва «Белая Русь». Член СП СССР з 1969 г.

Узнагароджаны медалём.

Выдатнік народнай асветы БССР (1968).

У друку выступае з 1953 г. Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Вясна, хлопцы, вясна» (1966), «Была вайна» (1969), «Пяро дзікай качкі» (1977), «Буслы над вёскай» (1979), «Пыжыкавая шапка» (гумарэскі, 1986), кнігі для дзяцей «Сустрэча з маленствам» (1980).

*Леанід* ДАЙНЕКА



Леанід Марцінавіч Дайнека нарадзіўся 28.1. 1940 г. у вёсцы Змітраўка 2-я Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1956) працаваў на будоўлях Калінінграда і Свярдлоўскай вобласці. У Ніжнім Тагіле скончыў тэхнічнае вучылішча (1959). Працаваў электрыкам на Ніжнетагільскім металургічным камбінаце. Служыў у Савецкай Арміі (1960—1963). У 1967 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў старшым рэдактарам на Віцебскай студыі тэлебачання, на Беларускім тэлебачанні. У 1972—1989 гг.— адказны сакратар часопіса «Маладосць», з 1989 г.— загадчык рэдакцыі паэзіі выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1970 г.

Узнагароджаны медалямі.

Першы верш апублікаваў у 1961 г. (газета Уральскай ваеннай акругі «Красный боец»). Выдаў кніжкі вершаў «Галасы» (1969), «Бераг чакання» (1972), «Начныя тэлеграмы» (1974), «Мая вясна саракавая» (1979), «Вечнае імгненне» (1985), «Сняжынкі над агнём» вершы і паэмы (1989). Аўтар зборніка апавяданняў «Бацькава крыніца» (1976), раманаў «Людзі і маланкі» (1978), «Запомнім сябе маладымі» (1981), «Футбол на замініраваным полі» (1983), «Меч князя Вячкі» (1987), «След ваўкалака» (1988), «Жалезныя жалуды» (часопіс «Маладосць», 1990).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1988) за раман «Меч князя Вячкі», Дзяржаўнай прэміі БССР (1990) за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей — за гістарычныя раманы «Меч князя Вячкі» і «След ваўкалака».

## *Генрых* ДАЛІДОВІЧ



Генрых Вацлававіч Далідовіч нарадзіўся 1.6. 1946 г. у вёсцы Янкавічы Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і каваля.

У 1968 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Шабыньскай няпоўнай сярэдняй школе Барысаўскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1969—1970). Зноў працаваў настаўнікам, а з 1971 г.— завучам у Шабыньскай школе. З 1973 г.— супрацоўнік аддзела прозы часопіса «Полымя», з 1979 г.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1974 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1966 г. у стаўбцоўскай раённай газеце «Прамень». Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Дажджы над вёскай» (1974), «Цяпло на першацвет» (1976), «Маладыя гады» (1979), «Міланькі» (1980), «На новы парог» (1983), «Станаўленне» (1985), «Міг маладосці» (выбранае, 1987), раманаў «Гаспадар-камень» (1986), «Пабуджаныя» (1988), «Свой дом» (часопіс «Маладосць», 1989). Выступае ў друку з публіцыстычнымі і крытычнымі артыкуламі, эсэ.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1988) за раман «Гаспадар-камень».

## *Уладзімір* ДАМАШЭВІЧ



Уладзімір Максімавіч Дамашэвіч нарадзіўся 17.2.1928 г. у вёсцы Вадзяціна Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1953 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у выдавецтвах «Народная асвета», «Беларусь» (1953—1967), на Беларускім радыё (1965), літработнікам у часопісе «Полымя» (1967—1972), загадчыкам аддзела прозы часопіса «Маладосць» (1973—1977), рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1977), у 1978—1988 гг. загадваў аддзелам

прозы часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1962 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1958 г. (часопіс «Маладосць»). Выдаў кнігі прозы «Заклінаю ад кулі» (1960), «Між двух агнёў» (1963), «Абуджэнне» (1968), аповесць-хроніку «Порахам пахла зямля» (1975), «У лабірынце вуліц» (1979), нарыс «Каб радзіла зямля» (1972), аповесць «Кожны чацвёрты» (часопісны варыянт у «Маладосці», 1983), дакументальную аповесць «Першым заўсёды цяжка» (з У. Сазановічам, 1986), раман «Камень з гары» (1990). Выйшлі «Выбранае» (1977) і Выбраныя творы (1988).

---



## *Міхась ДАНІЛЕНКА*

Міхась (Міхаіл Пятровіч) Даніленка нарадзіўся 28.10.1922 г. у вёсцы Ястрабка Лоеўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1941 г. скончыў Рэчыцкае педагагічнае вучылішча і быў прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на Паўднёва-Заходнім фронце. У маі 1942 г. непадалёку ад станцыі Мікалаеўка (Украіна) быў кантужаны і трапіў у палон. У сакавіку 1944 г. уцёк з лагера ваеннапалонных. У жніўні 1945 г. служыў у Савецкай Арміі. Затым працаваў настаўнікам Казярожскай сямігадовай школы Лоеўскага раёна. Скончыў завочна Гомельскі настаўніцкі інстытут (1952). У 1952—1982 гг.— супрацоўнік газеты «Гомельская праўда». З 1983 г. жыве ў в. Багатая Града Лоеўскага раёна. Член СП СССР з 1950 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Першае апавяданне надрукаваў у 1940 г. Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Мая песня» (1952), «Майская навальніца» (1959), «Наваселле» (апавяданні і нарысы, 1964), «Наш дом» (1971), «Запаветны акіян» (1972), «Маці Мар'я» (1976), «Журлівіца» (1980), «Родная зямля» (1982). Выдаў кнігі прозы для дзяцей «Вернасць слову» (1956), «Зачараваны гарлачык» (1961), «На вуліцы Сонечнай» (1963), «Ключы бабулі Зімы» (1986).

## *Сяргей* ДАРОЖНЫ



Сяргей Дарожны (Сяргей Міхайлавіч Серада) нарадзіўся 25.2.1909 г. у горадзе Слоніме ў сям'і служачага.

З 1921 г. выхоўваўся ў Мазырскім дзіцячым доме. Вучыўся ў Мінскім педагагічным тэхнікуме, на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (скончыў у 1930). Быў членам літаратурных арганізацый «Маладняк», «Узвышша». Працаваў на гуце ў Барысаве, у рэдакцыях рэспубліканскіх газет і часопісаў. У 1936 г. рэпрэсіраваны. Тэрмін адбываў на Далёкім Усходзе. Рэабілітаваны ў 1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 19.7.1943 г.

З вершамі выступіў у друку ў 1925 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «Звон вясны» (1926, у сааўтарстве з І. Плаўнікам), «Васількова россып» (1929), «Пракосы на памяць» (1932). У 1966 г. выйшлі «Выбраныя вершы».

Пераклаў на беларускую мову раман Г. Караваевай «Лесазавод» (1932), асобныя творы У. Караленкі, А. Новікава-Прыбоя. Дз. Беднага, С. Кірсанава, І. Уткіна, М. Кальцова.

## *Цодзік* ДАЎГАПОЛЬСКІ



Цодзік Львовіч Даўгапольскі нарадзіўся 11.8. 1879 г. у горадзе Гарадку Віцебскай вобласці ў сям'і меламеда (настаўніка, што навучае малітвам, асновам рэлігійнага спявання).

У 14-гадовым узросце паступіў вучнем у майстэрню па перапрацоўцы шчаціны. Амаль дзесяць гадоў быў рабочым на шчаціннай фабрыцы ў Невелі. Пасля здачы экстэрнам экзамену на званне хатняга настаўніка (1909) працаваў у школах на Беларусі. У 1918 г. Наркамасветы РСФСР (аддзел нацыянальных меншасцей) прызначыў яго інструктарам па Віцебскай і Магілёўскай абласцях. У 1922—1924 гг.— дырэктар дзіцячага дома ў Віцебску, з 1925 г.— літработнік рэдакцыі яўрэйскай газеты «Акцябэр» («Кастрычнік») у Мінску. У 1937 г. быў

рэпрэсіраваны. Тэрмін адбываў у Казахстане. У 1943 г. вызвалены. Жыў на Урале, у Віцебску, Ленінградзе. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 16.7.1959 г.

Пісаў на ідыш і рускай мовах. Першае апавяданне апублікаваў у 1917 г. На мове ідыш выйшлі «Правінцыяльныя абразкі» (зборнік драм, Вільня, 1914), «Пракляцці дзядулі» (камедыя для дзяцей, Масква, 1919), «Адваротны бок новага быту» (1928), раман «Каля адчыненай брамы» (1926), кнігі апавяданняў «Навыварат» (1928), «На савецкай зямлі» (1931), зборнік вершаў «З пяром у руцэ» (1932), аповесць «Агітпоезд» (1933), раман «Шоўк» (1933), «Навелы» (1936), п'есы «Барацьба машын» (1930), «Да апошняга» (1931), «Калгасны сургуч» (1933).

На рускай мове выйшлі аповесці «Это было давно» (Масква, 1950), «На берагах Сылвы» (1955), «На рассвете» (1957) і кніга аповесцей і апавяданняў «Пять лепестков» (1959).

Асобныя творы перакладаліся на беларускую мову («Каля адчыненай брамы», 1931, «Агітпоезд», 1936).

---

## *Вячаслаў ДАШКЕВІЧ*



Вячаслаў Іосіфавіч Дашкевіч нарадзіўся 15.4. 1941 г. у вёсцы Дзякшняны Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1958) і Ашмянскага вучылішча механізацыі сельскай гаспадаркі (1959) два гады працаваў трактарыстам у саўгасе імя Янкі Купалы Маладзечанскага раёна. У 1959 г. паступіў на завочнае аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, на другім курсе перавёўся на стацыянар (скончыў у 1965). Працаваў карэспандэнтам Беларускага радыё (1964—1967), газеты «Физкультурник Белоруссии» (1967—1971), загадчыкам аддзела часопіса «Родная прырода» (1971—1976), старшым рэдактарам Саюза журналістаў БССР (1977—1980), старшым рэдактарам і загадчыкам аддзела на Беларускім тэлебачанні (1980—1986). З 1989 г.— навуковы супрацоўнік аддзела між-

нацыянальных і міжнародных зносін Інстытута філасофіі і права АН БССР. Член СП СССР з 1982 г.

У друку выступае з 1963 г., з вершамі — з 1974 г. Першая кніга вершаў «Хвіліна чакання» ўвайшла ў калектыўны зборнік «Нашчадкі» (1979). У 1983 г. выйшаў зборнік паэзіі «Загадка Атлантыды».

Пераклаў з эстонскай мовы «Няўлоўны цуд» Э. Вільдэ (тэлеп'еса, 1985) і асобныя вершы эстонскіх паэтаў.

---

## *Ігнат ДВАРЧАНІН*



Ігнат Сымонавіч Дварчанін нарадзіўся 8.6.1895 г. у вёсцы Погіры Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і арандатара.

Пасля заканчэння школы вышэйшай ступені атрымаў званне народнага настаўніка (1912). Працаваў тры гады народным настаўнікам у вёсцы Хмельніца на Слонімшчыне. У 1915—1917 гг.— на вайсковай службе, дзе скончыў школу прапаршчыкаў. На фронце сустрэў рэвалюцыю. У Мінску стаў членам Беларускай сацыялістычнай грамады. У 1918 г.— сакратар культурна-асветніцкага аддзела Беларускага нацыянальнага камісарыята ў Маскве. У 1918 г. прыехаў на Беларусь. Вёў культурна-асветніцкую работу ў Дзятлаўскім павеце, за што быў зняволены ўладамі Польшчы ў беластоцкі канцлагер. У 1921 г. арганізаваў у Даўгаўпілсе беларускія настаўніцкія курсы, дзе чытаў лекцыі па беларускай мове і літаратуры, стварыў беларускі тэатральны калектыў і хор. У 1925 г. скончыў Карлаў універсітэт у Празе са званнем доктара філасофіі. З 1926 г. выкладаў беларускую літаратуру ў Віленскай беларускай гімназіі. Выконваў даручэнні цэнтральнага сакратарыята Беларускай сялянска-рабочай грамады. Уваходзіў у Галоўную ўправу Таварыства беларускай школы (1926—1930). У 1928 г. выбраны паслом у польскі сейм. Разам з іншымі пасламі стварыў у сейме самастойную фракцыю — беларускі рабоча-сялянскі клуб «Змаганне». Быў сакратаром Беларускага выдавецкага таварыства ў Вільні. У 1930 г. арыштаваны

польскімі ўладамі і асуджаны на 8 год турмы. У выніку абмену палітвязнямі паміж СССР і Польшчай у 1932 г. прыехаў у Мінск. Працаваў у АН БССР у камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі. У 1933 г. рэпрэсіраваны.

Расстраляны 8.12.1937 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1917 г. (газеты «Беларуская рада», «Вольная Беларусь»). З паэтычнымі творамі выступаў у газетах, часопісах «Дзянніца», «Наша думка», «Беларускі звон», «Маладое жыццё», «Перавясла», «Маланка», «Наш шлях», «Прамень», «Студэнцкая думка» і інш. Выступаў і як публіцыст. Напісаў і абараніў дысертацыю, прысвечаную дзейнасці і светапогляду Ф. Скарыны. Склаў «Хрэстаматыю новай беларускай літаратуры (ад 1905 году). Для старэйшых класаў беларускіх сярэдніх школ» (Вільня, 1927). Нізка вершаў апублікавана ў калектыўным зборніку «Ростані волі» (1990).

Пераклаў на беларускую мову паэму А. Блока «Дванаццаць» (Вільня, 1926).

---

## *Аўяр'ян* ДЗЕРУЖЫНСКІ



Авяр'ян Сафонавіч Дзеружынскі нарадзіўся 10.6.1919 г. у вёсцы Хляўно Кармянскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Магілёўскі газетны тэхнікум (1937), затым Камуністычны інстытут журналістыкі ў Мінску (1941). У час Вялікай Айчыннай вайны карэспандэнт і супрацоўнік газет у Краснаярскім краі, Калінінскай вобласці, Маскве. У 1945—1949 гг.— загадчык аддзела газеты «Чырвоная змена». З 1949 г.— рэдактар выдавецтва «Беларусь», з 1972 г.— выдавецтва «Мастацкая літаратура», у 1981—1984 гг.— выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны медалём.

Першыя літаратурныя творы надрукаваў у 1939 г. Выйшлі зборнікі вершаў «Песні маладосці» (1959), «Калінавы цвет» (1961), «Бярозавы вецер» (1990), зборнікі вершаў для дзяцей «Цуды ёсць на свеце» (1960), «Дзе жыве зіма» (1962), «Карагод» (1963), «Ляцелі дзве птушкі» (1964), «Яе завуць Каця» (1965),

«Кую-кую ножку» (1967), «Смешкі і пацешкі» (1968), «Добры ветрык» (1969), «Чабарок» (1970), «Ластаўка» (1971), «Бегунок» (1972), «Каласок» (1975), «Конікі-будаўнікі» (1977), «Цягнік-працаўнік» (1978), «Вясёлікі» (выбранае, 1979), «Добрае сэрца» (1980), «Касмічны агарод» (1981), «Той, хто працуе...» (1984), «Працалюбы» (1987), «Залаты каласок» (1989).

Многія вершы пакладзены на музыку, сярод іх «Мінскі вальс», «Дзявочая лірычная», «Песня аб Мінску», «Нездаровіцца». Песні «Сабірайся ў госці, мой дзядок», «Мяцеліца» сталі народнымі.

---

## *Генадзь* ДЗМІТРЫЕЎ



Генадзь Рыгоравіч Дзмітрыеў нарадзіўся 18.10.1943 г. у вёсцы Злыднікі (цяпер Першамайка) Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачых.

Пасля заканчэння Бычыхінскай сярэдняй школы (1959) працаваў загадчыкам клуба рабочай моладзі на Бычыхінскім ільнозаводзе, рабочым на будоўлі ў Мінску. Вучыўся на беларускім аддзяленні філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1961—1964, скончыў завочна ў 1970), служыў у Савецкай Арміі (1964—1967). У 1967—1974 гг. настаўнічаў у Баранчанскай сярэдняй школе Карэліцкага раёна. З 1974 г.— карэспандэнт-арганізатар, затым намеснік дырэктара, а з 1988 г.— дырэктар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР. Член СП СССР з 1979 г.

Узнагароджаны медалём.

Першы верш надрукаваў у езярышчанскай раённай газеце «Калгасная вёска» ў 1959 г., у наступным годзе вершы з'явіліся ў рэспубліканскім друку (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў вершаў «Гарады на далонях» (1974), «Азярыны» (1980) і кнігі для дзяцей «Птушка Сінязорка» (1976).

*Уладзімір* ДЗЮБА



Уладзімір Іванавіч Дзюба нарадзіўся 24.2.1946 г. у горадзе Палтава (Украіна) у сям'і служачых.

Дзяцінства прайшло ў вёсцы Патапаўка Буда-Кашалёўскага раёна. Пасля заканчэння аддзялення беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1968) працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Мікалаеўскай сярэдняй школе Буда-Кашалёўскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1968—1969), працаваў рэдактарам на Гомельскай студыі тэлебачання (1970—1972), літсупрацоўнікам газеты «Гомельская праўда» (1972—1977). З 1978 г.— карэспандэнт газеты «На страже Октября» (Мінск), з 1980 г.— старшы рэдактар літаратурна-драматычнага вяшчання на Беларускім радыё. Член СП СССР з 1986 г.

Узнагароджаны медалём.

Першы верш апублікаваў у буда-кашалёўскай раённай газеце «Ленінскі шлях» у школьныя гады. З вершамі ў рэспубліканскім друку выступіў упершыню ў 1963 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Вуліцы без назваў» (1972), «Кругазварот» (1976), «Карані бліскавіцы» (1986), радыёп'ес у вершах «Жыццё рэвалюцыянера» (з А. Пётухам, пастаўлена ў 1987), «Я, Арлоўскі» (пастаўлена ў 1989), «Нарачным. Рукевічу. Рылееў» (пастаўлена ў 1990).

*Павел* ДЗЮБАЙЛА



Павел Кузьміч Дзюбайла нарадзіўся 5.8.1931 г. у вёсцы Кукарава Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1954). Адначасова працаваў у школах на Маладзечаншчыне. Служыў у Савецкай Арміі (1954—1955). Быў дырэктарам Бакштанскай сярэдняй школы Юрацішкаўскага раёна, інспектарам Маладзечанскага аблана. У 1960 г. скончыў аспірантуру пры Ін-

стытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР і з таго часу — навуковы супрацоўнік, а з 1968 г.— загадчык сектара беларускай савецкай літаратуры інстытута, цяпер — аддзела сучаснай беларускай літаратуры і крытыкі. Доктар філалагічных навук. Прафесар. Член СП СССР з 1967 г.

У друку з артыкуламі і рэцэнзіямі выступае з 1956 г. Аўтар літаратуразнаўчых і літаратурнакрытычных прац «Беларускі раман аб Вялікай Айчыннай вайне» (1964), «Праблемы стылю ў сучаснай беларускай прозе» (1973), «Вобраз нашага сучасніка ў беларускай прозе» (1978), «У вялікай дарозе» (1981), «Беларускі раман. Гады 70-я» (1982), «Наш сучаснік — у жыцці і літаратуры» (1984), «Панарама сучаснай беларускай прозы» (1986), «У пошуках духоўных каштоўнасцей: Беларуская проза сёння» (1987), «Вялікі Кастрычнік і сучасная беларуская літаратура» (1988), «Станоўчы герой у беларускай літаратуры» (1990). У сааўтарстве з В. Жураўлёвым і М. Луферавым напісана кніга «Праблемы сучаснай беларускай прозы» (1967). Адзін з аўтараў калектыўных прац «Беларуская савецкая проза: Раман і аповесць» (1971) і «История белорусской советской литературы» (1977).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні «История белорусской дооктябрьской литературы» і «История белорусской советской литературы».

---

## *Мота* ДЗЯГЦЯР



Мота Ізраілевіч Дзягцяр нарадзіўся 15.7.1909 г. у вёсцы Пціч Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і шаўца.

У 1929 г. прыехаў у Мінск і стаў працаваць на скураным заводзе «Бальшавік». Затым быў муляром на будоўлях горада, вучыўся на рабфаку. Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1937). У 1937—1939 гг. служыў у Савецкай Арміі. Удзельнік паходу ў Заходнюю Беларусь у 1939 г. і савецка-фінляндскай вайны.

Загінуў 9.11.1939 г. каля фінскай граніцы.

Першае апавяданне апублікаваў у 1931 г. Пісаў на мове ідыш. Выступаў з апавяданнямі, аповесцямі, нарысамі. Аўтар кніг прозы «На рыштаваннях» (1934), «Савецкая Беларусь» (1935), «Будаўнікі» (1936), «Браты» (1937), «Верныя вартавыя» (1938), «Наша зямля» (1939). На беларускай мове выйшлі «Апавяданні» (1940).

---

## *Анатоль* ДЗЯЛЕНДЗІК



Анатоль Андрэевіч Дзялендзік нарадзіўся 4.3.1934 г. у вёсцы Кулакі Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1957 г. скончыў лячэбны факультэт Мінскага медыцынскага інстытута. Працаваў урачом у рэспубліканскай псіханеўралагічнай бальніцы ў Мінску (1957—1968). У 1968—1976 гг.— член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм». У 1969 г. скончыў завочна Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. Член СП СССР з 1965 г.

Пачаў выступаць у друку у 1955 г. (газета «Сталинская молодежь»). Піша на рускай і беларускай мовах. У 1963 г. выйшла першая кніга — зборнік гумарэсак «Пагібель «Тытаніка». Аўтар драм «Выклік багам» («Чатыры крыжы на сонцы», 1967, пастаўлена ў 1965), «Грешная любовь» (Масква, 1970, пастаўлена ў 1967), «Начное дзяжурства» (1972, пастаўлена ў 1970), «Последняя земляника в августе» (пастаўлена ў 1975), «Гаспадар» (пастаўлена ў 1985), камедый «Амазонки» (1974, пастаўлена ў 1972), «Операция «Многоженец» (1976, пастаўлена ў 1974), «Аукцион» (пастаўлена ў 1988), «Гіпапатам» (1981). Напісаў шэраг аднаактовых п'ес («Абы ціха», «Дзяўчына з камвольнага» і інш.). Аўтар сцэнарыяў тэлефільмаў «Познай себя» (пастаўлены ў 1972), «Голубой карбункул» (пастаўлены ў 1979) і мастацкіх фільмаў «Заўтра будзе позна» (з М. Крно, пастаўлены ў 1973), «Неудобный человек» (пастаўлены ў 1985), «Волки в зоне» (пастаўлены ў 1990). Напісаў таксама шэраг радыёп'ес («Шаўковыя травы», «Даўгавечнік», «Дыягназ» і інш.).

У 1981 г. выйшаў зборнік камедый «Аперацыя «Мнагажэнец», у 1985 г.— «П'есы».

*Сяргей* ***ДЗЯРГАЙ***



Сяргей Сцяпанавіч Дзяргай нарадзіўся 17.9. 1907 г. у горадзе Мінску ў сям'і чыгуначніка.

Скончыў 1-ю Мінскую чыгуначную сямігадовую школу (1924), а затым трохгадовыя агульнаадукацыйныя курсы (1927). Хвароба не дала магчымасці вучыцца далей. У сярэдзіне 30-х гадоў працаваў падчытчыкам і карэктарам у друкарні газеты «Звязда». У час Вялікай Айчыннай вайны жыў у Гомелі, удзельнічаў у падпольным руху. Працаваў загадчыкам аддзела паэзіі часопіса «Полымя» (1951—1953), адказным сакратаром, рэдактарам аддзела літаратуры часопіса «Вожык» (1953—1967). Член СП СССР з 1950 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 25.12.1980 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1938 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Вачыма будучыні» (вершы і паэмы, 1953), «Крэмень аб крэмень» (вершы і паэмы, 1958), «Цешча» (гумарыстычныя вершы, 1959), «Чатыры стыхіі» (вершы і паэмы, 1962, дапоўненае выданне ў 1988), «Свята ў будзень» (1964), «Салата з дзядоўніку» (гумарыстычныя вершы, 1967), «Выбранае» (1967), «Вершы» (1974), «На вогненнай сцяжыне: Выбранае» (вершы і паэмы, 1977).

Пераклаў на беларускую мову паэмы «Гражына» А. Міцкевіча, «Бацька зачумленых» Ю. Славацкага, «Дванаццаць» А. Блока, «На ўвесь голас» У. Маякоўскага, «Сінія гусары» М. Асеева, «Сын» П. Антакольскага, «1905 год» Б. Пастарнака, паасобныя творы М. Канапніцкай, У. Бранеўскага, Ю. Тувіма, І. Бехера, Г. Зегерс, М. Лермантава, С. Шчыпачова, Л. Украінкі і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1964) за зборнік вершаў і паэм «Чатыры стыхіі».

## *Анатоль ДЗЯРКАЧ*



Анатоль Дзяркач (Анатоль Рыгоравіч Зіміёнка) нарадзіўся 18.4.1887 г. у мястэчку Турэц Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і фельчара.

Скончыў Навагрудскае гарадское вучылішча (1904). Служыў пісарам у Мінскай гарадской і земскай управах. Удзельнічаў у рэвалюцыйным руху, быў зняволены ў турму, адбываў ссылку. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў у рэдакцыях газет «Беларуская вёска», «Піянер Беларусі», быў рэдактарам сатырычна-гумарыстычнага часопіса «Дубинка» (1924, дадатак да газеты «Звезда»). Быў кандыдатам у члены СП СССР. 16.10.1936 г. арыштаваны. Справа перагледжана і спынена Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 4.5.1957 г.

Расстраляны 5.9.1937 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1904 г. на рускай мове. Выйшлі зборнікі сатырычных і гумарыстычных вершаў «Пра папоў, пра дзякоў, пра сялян-мужыкоў» (1925), «Бог удвох» (1930), «Качаргой па абразох» (1930), «Усім патроху...» (1930), паэма «Міколава гаспадарка» (1927) і зборнікі для дзяцей «Нашы прыяцелі» (1928), «Першы дзень у дзіцячым садзе» (1928), «Працавітая дзяўчына» (1928), «Звяры нашых лясоў» (1929).

Аўтар працы «Интервенция и оккупация в Белоруссии» (Масква, 1932).

Пераклаў на беларускую мову зборнікі вершаў У. Маякоўскага «Кім быць?» (1932), Дз. Беднага «Пра папоў» (1931), К. Чукоўскага «Мыйдадзір» (1928 і 1935), С. Маршака «Пошта» (1937), А. Барто «Брацікі» (1935), раманы А. Дарагойчанкі «Вялікая Каменка» (1932), Л. Корыса «Кіруй, Брытанія» (1932), аповесці А. Чумачэнкі «Клуб даследнікаў» (1932), Д'Эрвілы «Прыгоды дагістарычнага хлопчыка» (1937), працу А. Ферсмана «Наш апатыт» (1931), паасобныя творы А. Пушкіна, С. Міхалкова, М. Асеева, П. Тычыны, Н. Забілы, П. Усэнкі і інш.

## *Алесь ДЗЯТЛАЎ*



Алесь (Аляксандр Мікалаевіч) Дзятлаў нарадзіўся 3.6.1936 г. у вёсцы Туркі Бабруйскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўніка.

У 1959 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у глыбоцкай раённай газеце «Сцяг камунізма» (1959—1961), у «Чырвонай змене» (1961—1973). У 1973—1975 гг.— член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм», у 1975—1980 гг.— карэспандэнт рэспубліканскай газеты «Звязда», з 1980 г.— рэдактар аддзела навукі часопіса «Родная прырода». Член СП СССР з 1979 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1970 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Росы на поплаве» (1974), «Белы месяц сакавік» (1977), «Сляды» (1981), «Вяртанне» (1987).

## *Іосіф ДОРСКІ*



Іосіф Львовіч Дорскі нарадзіўся 17.12.1911 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага.

У 1929 г. скончыў агульнаадукацыйныя курсы, у 1930 г.— курсы кінасцэнарыстаў у Мінску. Вучыўся завочна ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага (1939—1941). Працаваў сакратаром рэдакцыі шматтыражнай газеты Мінскага дрэваапрацоўчага завода (1929—1930), кінасцэнарыстам на кінафабрыцы «Савецкая Беларусь» (1931—1932, Ленінград), літсупрацоўнікам газеты «Рабочий» (1932—1934), служыў у Чырвонай Арміі (1934 —1935). З 1935 г.— загадчык літаратурнай часткі, з 1948 г.— дырэктар Беларускага тэатра імя Якуба Коласа. У 1961—1964 гг.— дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм». Член СП СССР з 1956 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР (1961).

Памёр 7.12.1964 г.

Літаратурнай працай займаўся з 1930 г. Разам з К. Губарэвічам напісаў драму «Цэнтральны ход» (пастаўлена ў 1948) і лірычную камедыю «Алазанская даліна» (1951, пастаўлена ў 1949). Аўтар п'есы «Права на шчасце» (пастаўлена ў 1956 пад назвай «Шчасце»).

---

## *Сямён ДОРСКІ*



Сямён Львовіч Дорскі нарадзіўся 20.10.1920 г. у горадзе Мінску ў сям' служачага.

Займаючыся ў беларускай школе, адначасова вучыўся завочна на Маскоўскіх курсах замежных моў, якія скончыў у 1939 г. з пасведчаннем перакладчыка. Да Вялікай Айчыннай вайны скончыў тры курсы гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У чэрвені 1941 г. эвакуіраваўся ў Куйбышаўскую вобласць, дзе працаваў у калгасе. У верасні пераехаў ва Уральск, у якім працаваў брат — тэатральны дзеяч і драматург І. Дорскі. Выкладаў гісторыю ў сярэдняй школе № 1. У 1942—1943 гг.— курсант Ленінградскага ваеннага вучылішча сувязі імя Ленсавета (г. Уральск). У 1943—1946 гг.— у Савецкай Арміі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі вярнуўся ў Мінск, у 1946—1947 гг. працаваў перакладчыкам ва Упраўленні па пастаўках ЮНРРА (Адміністрацыя дапамогі і ўзнаўлення Аб'яднаных Нацый) пры Савеце Міністраў БССР. У 1947 г. без адрыву ад вытворчасці скончыў факультэт замежных моў Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў выкладчыкам (1947—1955), загадчыкам (1955—1962) кафедры англійскай мовы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1962—1983 гг. дацэнт кафедры лексікалогіі (пазней стылістыкі) англійскай мовы Мінскага дзяржаўнага педінстытута замежных моў. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1980 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны і медалямі.

Памёр 14.01.92 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў з вершаў (газета «Уральская правда», 1941—1942 гг.). З 1957 г. займаецца перакладчыцкай працай з англійскай, нямецкай, французскай і іспанскай моў на беларускую. Пераклаў раман П. Абрахамса «Вянок для Удома» (1959), аповесці Л. Рэна «Негр Нобі» (1962), П. Джойса «Цікі» (1977), кнігу казак Г. Прокапа «Пятае кола» (1980), аповесць Д. Алонса «У пошуках чорнай чайкі» (1982), раман І. Кардэнаса Акуны «Загадка адной нядзелі» (1986), раман К. Макалаў «Птушкі на цернях» (1983), п'есу Э. Заля «Наследнікі Рабурдэна» (пастаўлена ў 1960). У перыядычным друку апублікаваны аповесці Э. Лёста «Аперацыя «Бумеранг» (газета «Чырвоная змена», 1969), Г. дэ Бройна «Рэната» (часопіс «Полымя», 1971), В. Ланге «Дванаццаць вінаватых» (часопіс «Маладосць», 1971).

## *Аляксандр ДРАКАХРУСТ*



Аляксандр Абрамавіч Дракахруст нарадзіўся 7.11.1923 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і ваеннаслужачага.

У ліпені 1941 г. прызваны ў армію. Быў салдатам інжынернага батальёна, камандзірам узвода. Удзельнічаў у баях на Паўднёва-Заходнім, Паўднёвым, 2-м Украінскім, 1-м Беларускім франтах, у штурме Берліна. Скончыў Маскоўскае ваенна-інжынернае вучылішча (1945) і завочна факультэт мовы і літаратуры Хабараўскага педагагічнага інстытута (1962). З 1946 г.— ваенны журналіст. У 1964—1971 гг.— карэспандэнт газеты Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі «Во славу Родины». Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

Выступае ў друку з 1939 г. (газета «Молодая гвардия», Адэса). Піша на рускай мове. Першы зборнік вершаў «Миру быть на земле!» выдаў у 1951 г. ва Уладзівастоку. Затым выйшлі кніжкі паэзіі «Цвет счастья» (Уладзівасток, 1953), «Зарницы над сопками» (Хабараўск, 1959), «Сменяет время караулы» (дадатак да часопіса

«Советский воин», 1961), «Тревожный ветер» (1964), «Бухта смятенья» (1967), «И нет конца тревогам» (1969), «Мост» (1972), «Мои вы годы — эшелоны» (выбранае, 1975), «Раздорожье» (1979), «Притяжение» (Хабараўск, 1981), «Лицо твое» (1982), «Сквозное ранение» (1983), «Дальняя связь» (выбранае, 1983), «Круговорот» (1986), «Исповедь» (1990).

Пераклаў на рускую мову шэраг вершаў і паэм М. Аўрамчыка, А. Астрэйкі, Р. Барадуліна, А. Вялюгіна, С. Гаўрусёва, С. Грахоўскага, А. Грачанікава, Е. Лось і некаторых іншых беларускіх паэтаў. У 1988 г. выйшла кніга выбраных перакладаў з беларускай мовы «Журавлиная стая».

---

## *Леанід ДРАНЬКО-МАЙСЮК*



Леанід Васільевіч Дранько-Майсюк нарадзіўся 10.10.1957 г. у горадзе Давыд-Гарадку Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ў рабочай сям'і.

Пасля заканчэння Давыд-Гарадоцкай сярэдняй школы № 2 (1974) працаваў на мясцовым заводзе слясарна-мантажных інструментаў. У 1975 г. паступіў на завочнае аддзяленне паэзіі Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве. У 1976—1978 гг. служыў у Савецкай Арміі. Пасля дэмабілізацыі перавёўся на стацыянарнае аддзяленне Літінстытута, які скончыў у 1982 г. З 1982 г.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1984 г.

Першыя вершы надрукаваў у столінскай раённай газеце «Навіны Палесся» ў 1972 г., у рэспубліканскім друку выступіў у 1975 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў вершаў «Вандроўнік» (1983), «Над пляцам» (1986), «Тут» (вершы, паэмы, эсэ, 1990).

*Вячаслаў* ДУБІНКА



Вячаслаў Андрэевіч Дубінка нарадзіўся 17.12. 1941 г. у горадзе Слуцку Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

Скончыў Чарнавіцкі тэхнікум чыгуначнага транспарту (1961). Працаваў брыгадзірам комплекснай брыгады, прарабам, начальнікам будаўнічага ўчастка ў Слуцку (1961—1964), фотакарэспандэнтам раённых газет «Будаўнік камунізма» (Любань, 1964—1965), «Шахцёр» (Салігорск, 1965—1966), рэспубліканскіх газет «Звязда» (1966—1971), «Чырвоная змена» (1972—1974), у студыі «Фота і жыццё» Саюза журналістаў Беларусі (1974—1976), фатографам рэстаўрацыйнай майстэрні Міністэрства культуры БССР (1979—1981). З 1981 г.— у часопісе «Беларусь». Член СП СССР з 1988 г.

Аўтар фотанарысаў, фотаальбомаў «Бабруйск» (1967), «Нясвіж» (1968), «Магілёў» (1971), «Брэст» (1979) і інш. Выйшлі кнігі публіцыстыкі, прозы «Паплач ля роднае крынічкі» (1981), «Не плач, душа мая» (1983), «Ой, зялёны дубочак» (1983), «Браты святой ночы» (1986), «Развітальная песня» (1989).

*Уладзімір* ДУБОЎКА



Уладзімір Мікалаевіч Дубоўка нарадзіўся 15.7.1900 г. у вёсцы Агароднікі Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Нова-Вілейскую настаўніцкую семінарыю (1918). Настаўнічаў у Тульскай вобласці (1918—1920), служыў у Чырвонай Арміі (1920—1921). Пасля дэмабілізацыі працаваў метадыстам і інспектарам беларускіх школ Наркамата асветы РСФСР і займаўся на творчым аддзяленні Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута імя В. Брусава, які скончыў у 1924 г. Быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Узвышша», першым рэдактарам часопіса «Беларускі піянер» (цяпер «Бярозка»). Працаваў рэдактарам беларускага тэксту «Весніка ЦВК, СНК і СПА Саюзу ССР» (1922—1925), адказным сакратаром пастпрэд-

ства БССР пры ўрадзе СССР (1923—1924), выкладчыкам беларускай літаратуры Камуністычнага універсітэта народаў Захаду (1924—1927), рэдактарам «Збору законаў і загадаў рабоча-сялянскага ўраду Саюза ССР» (1926—1930). У 1930 г. рэпрэсіраваны. Зняволенне, высылку адбываў у Кіраўскай вобласці, Чувашыі, на Далёкім Усходзе, у Грузіі, Краснаярскім краі. Пасля рэабілітацыі (1957) жыў у Маскве. Член СП СССР з 1958 г.

Памёр 20.3.1976 г.

Першы верш надрукаваў у 1921 г. у газеце «Савецкая Беларусь». Выйшлі зборнікі вершаў «Строма» (Вільня, 1923), «Трысцё» (1925), «Credo» (1926), «Наля» (Масква, 1927), «Палеская рапсодыя» (1961), «Вершы» (1970), паэмы «Там, дзе кіпарысы» (1925), «І пурпуровых ветразей узвівы» (Вільня, 1939), кніжкі вершаваных казак для дзяцей «Цудоўная знаходка» (1960), «Кветкі — сонцавы дзеткі» (1963), «Казкі» (1968), «Залатыя зярняты» (1975), а таксама казкі «Як сінячок да сонца лётаў» (1961), «Дзівосныя прыгоды» (1963), «Мілавіца» (1964). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1959, 1965).

Аўтар аповесцей для дзяцей «Жоўтая акацыя» (1967), «Ганна Алелька» (1969), «Як Алік у тайзе заблудзіўся» (1974) і кнігі апавяданняў-успамінаў «Пялёсткі» (1973). Выступаў з крытычнымі, публіцыстычнымі і навуковымі артыкуламі на пытаннях беларускай мовы, літаратуры, культуры.

Вядомы і як перакладчык твораў У. Шэспіра («Санеты», 1964), Дж. Байрана (паэмы «Шыльёнскі вязень», «Бронзавы век», містэрыя «Каін» у зборніку «Выбранае», 1963), вершаў В. Брусава, А. Пракоф’ева, П. Тычыны, Ю. Янsocіса, С. Шырвані, М. Ардубады, К. Каладзе, Е. Чарэнца, У. Бранеўскага, Ю. Славацкага, У. Сыракомлі, Ду Фу і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1962) за зборнік вершаў «Палеская рапсодыя».

## *Алесь* ДУБРОВІЧ



Алесь Дубровіч (Аляксей Ягоравіч Рэдзька) нарадзіўся ў 1910 г. у вёсцы Каралевічы Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў вясковую школу, займаўся самаадукацыяй. Удзельнік рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. У 1933 г. прымаў удзел у першым нелегальным з'ездзе пісьменнікаў, які ўтварыў Літаратурны фронт сялянска-рабочых пісьменнікаў Заходняй Беларусі. У 1934 г. быў зняволены ў Лукішскую турму, дзе адбыў два гады. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР (1939) працаваў у валасным рабоча-сялянскім камітэце, выбіраўся старшынёй сельсавета. Быў дэлегатам Народнага сходу ў Беластоку (1939). Перад Вялікай Айчыннай вайной працаваў у Вілейскай раённай газеце. З пачатку вайны — падпольшчык.

Расстраляны фашысцкімі акупантамі 7.11. 1942 г.

Друкаваўся з 1928 г. у прагрэсіўнай газеце «Доля працы», у перыядычных выданнях «Беларуская газета», «Літаратурная старонка», «Беларускі летапіс», «Калоссе». Нізкі вершаў змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Сцягі і паходні» (1965), «Крывёю сэрца» (1967), «Ростані волі» (1990).

## *Ігнат* ДУБРОЎСКІ



Ігнат Дуброўскі (Ігнат Цімафеевіч Чарняўскі) нарадзіўся 4.9.1906 г. у вёсцы Дуброва Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1925) працаваў загадчыкам магазіна спажывецкай кааперацыі ў сваёй вёсцы, справаводам сельсавета, загадчыкам аддзела прапаганды, затым сакратаром райкома камсамола ў Астрашыцкім Гарадку. У 1928—1929 гг. служыў у Чырвонай Арміі. Скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію ў Горках (1931) і аспірантуру пры Усесаюзным інстытуце эканомікі сельскай гаспа-

даркі ў Маскве (1937). Працаваў намеснікам дырэктара гэтага інстытута па навучальнай частцы. З 1937 г.— загадчык сектара аграрных праблем Інстытута эканомікі АН БССР. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны пайшоў на фронт, камандаваў батарэяй. Быў цяжка кантужаны і паранены пры абароне Масквы. Быў вязнем фашысцкага канцлагера (Франкфурт-на-Майне). У 1945—1976 гг.— зноў загадваў сектарам аграрных праблем Інстытута эканомікі АН БССР. Кандыдат сельскагаспадарчых навук. Член СП СССР з 1951 г.

Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Дружбы народаў, Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1981).

Першыя вершы надрукаваны ў 1927 г. У пасляваенны час пачаў пісаць празаічныя творы, нарысы. Аўтар аповесцей «Зямля маладзее» (1952), «Зямныя вузлы» (1967), зборнікаў апавяданняў «Радня» (1954), «Паўз самыя вокны» (1961) і нарысаў «Светлы шлях» (1959), «Да долі чалавечай» (1970), «Гамоніць Палессе» (1977), «На новыя кругі» (1980), «Час сеяць і час жаць» (1982), «Красна хата не толькі пірагамі» (1988).

Напісаў таксама шэраг навуковых прац па праблемах развіцця сельскай гаспадаркі, крытычнае даследаванне аб нарысе «Нялёгкі хлеб» (1990).

---

## *Міхась ДУБРОЎСКІ*



Міхась (Міхаіл Георгіевіч) Дуброўскі нарадзіўся 3.10.1897 г. у вёсцы Казелле Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Працаваў паштальёнам у Харкаве (1915—1916), быў прызваны ў армію. Прымаў удзел у падзеях Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Смаленску і на Клімаўшчыне. Служыў у Чырвонай Арміі. У 1925 г. скончыў творчае аддзяленне Вышэйшага літаратурна-мастацкага інстытута імя В. Брусава ў Маскве і быў накіраваны на працу ў Мінск — навуковым супрацоўнікам

літаратурнай камісіі Інбелкульта. З 1926 да 1945 г. жыў у Маскве, працаваў упраўдомам ва Усесаюзным радыёкамітэце, настаўнічаў (у 1941—1942 гг. працаваў у Башкірыі). Скончыў аспірантуру пры Маскоўскім інстытуце гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Г. Чарнышэўскага (1941). З 1945 г.— старшы выкладчык Брэсцкага настаўніцкага інстытута, у 1949—1950 гг.— Літаратурнага інстытута імя М. Горкага (Масква), у 1950—1957 гг.— Гродзенскага педінстытута імя Янкі Купалы. Член СП СССР з 1959 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 11.9.1983 г.

Выступаў у перыядычным друку з вершамі, п'есамі, артыкуламі з 1918 г. У 1926 г. у яго перакладзе на беларускую мову выйшла асобным выданнем паэма О. Уайльда «Балада Рэдынгскай турмы».

Адзін з аўтараў (з П. Шастаковым) п'есылібрэта «Уласнай рукой» (газета «Гудок», 1928—1929, пастаўлена ў 1919).

---

## *Міхаіл ДУБЯНЕЦКІ*



Міхаіл Фёдаравіч Дубянецкі нарадзіўся 4.3. 1927 г. у вёсцы Востраў Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1944 г. скончыў кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы ў Пінску. Працаваў настаўнікам пачатковых класаў Лемяшэвіцкай няпоўнай сярэдняй школы Пінскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1945—1951). У 1951—1952 гг.— прапагандыст Пінскага райкома КПБ, у 1952—1956 гг.— слухач Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ (у 1960 г. скончыў завочна Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС па спецыяльнасці журналістыка), у 1956—1957 гг.— загадчык аддзела Ганцавіцкага райкома КПБ, у 1958—1961 гг.— намеснік рэдактара ганцавіцкай раённай газеты «Сялянская праўда», у 1961—1964 гг.— рэдактар выдавецтва «Беларусь», у 1964—1968 гг.— загадчык рэдакцыі, галоўны рэдактар выдавецтва «Ураджай», у 1968—1975 гг.— інструктар сектара друку ЦК КПБ, у 1975—1979 гг.— адказ-

ны сакратар, намеснік галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, у 1979—1986 гг.— дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1984 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 3.9.1990 г.

Публікаваць мастацкія пераклады пачаў у 1964 г. Перакладаў з рускай, украінскай, польскай моў. Выйшлі зборнік украінскіх апавяданняў «Сцяжынка без канца» (1980), «Жыві і помні» В. Распуціна (1982), «Клімко» Г. Цюцюнніка (1982), «Гэта дзіўнае жыццё: Аповесці і апавяданні» Д. Граніна (1983), «Блакадная кніга» А. Адамовіча і Д. Граніна, «Стэфан, Верная рака» С. Жэромскага (1984). Аўтар брашуры «Савецкая Беларусь» (1973).

---

## *Алесь ДУДАР*



Алесь Дудар (Аляксандр Аляксандравіч Дайлідовіч) нарадзіўся 24.12.1904 г. у вёсцы Навасёлкі Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і селяніна.

Пасля атрымання ў Мінску сярэдняй адукацыі (1921) вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Адзін з заснавальнікаў літаратурнага аб'яднання «Маладняк». 31.10.1936 г. арыштаваны. Прыгавор Ваеннай калегіі ад 28.10.1937 г. у адносінах да яго адменены Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР (1957), і справа спынена. Рэабілітаваны пасмяротна 21.9.1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1921 г. Выдаў зборнікі вершаў «Беларусь бунтарская» (1925), «Сонечнымі сцежкамі» (1925), «І залацісцей, і сталёвей» (1926), «Вежа» (1928), паэмы «Шанхайскі шоўк» (1926), «Слуцак» (1935), зборнік апавяданняў «Марсельеза» (1927). У 1959 г. выйшлі Выбраныя творы, у 1984 г.— зборнік вершаў і паэм «Вежа».

Разам з А. Александровічам і А. Вольным напісаў раман «Ваўчаняты» (1925).

Выступаў і як крытык. Пад псеўданімам

Т. Глыбоцкі выдаў зборнік артыкулаў «Пра літаратурныя справы» (1928).

Пераклаў некаторыя творы А. Пушкіна, «Дванаццаць» А. Блока, урыўкі з «Фаўста» І.-В. Гётэ, творы С. Ясеніна, Б. Пастарнака, М. Ціханава, Г. Гейнэ, Э. Вайнерта і інш. Асобнымі выданнямі выйшлі «Выбраныя вершы» С. Стандэ (1932), аповесць Ф. Гладкова «Новая зямля» (1932), раман У. Кузьміча «Крыллі авіяспіралі» (1932), «Апавяданне пра кайданы» М. Ляшко (1933), «Вільгельм Тэль» Ф. Шылера (1934), «Жаніцьба Фігара» П. Бамаршэ (1936).

---

## *Аляксей ДУДАРАЎ*



Аляксей Ануфрыевіч Дудараў нарадзіўся 6.6.1950 г. у вёсцы Кляны Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1968 г. скончыў Наваполацкае прафесійна-тэхнічнае вучылішча нафтавікоў. Працаваў слесарам на Полацкім нафтаперапрацоўчым заводзе. Служыў у Савецкай Арміі (1968—1970), зноў працаваў на нафтаперапрацоўчым заводзе (1970—1972). У 1976 г. скончыў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут. Быў акцёрам, загадчыкам літаратурнай часткі Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача (1976—1979). У 1979—1983 гг. член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі «Тэлефільма» (Мінск). Сакратар Саюза тэатральных дзеячаў БССР (з 1987). Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1979 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалём.

У друку выступае з 1973 г. Выдаў зборнік апавяданняў «Святая птушка» (1979), казку для дзяцей «Сінявочка» (1981). Найбольш вядомы як драматург і кінадраматург. Па яго сцэнарыях пастаўлены кароткаметражныя фільмы «Кола» (1977), «Дэбют» (1978), «Буслянё» (1980) і мастацкія — «Суседзі» (1979), «Купальская ноч» (1982), «Белыя росы» (1984), «Восеньскія сны» (1986). Аўтар п'ес «Выбар» (пастаўлена ў 1979), «Парог» (пастаўлена ў 1981), «Апошні ўзлёт» (пастаўлена ў 1982), «Вечар» (пастаўлена ў 1983), «Радавыя» (па-

стаўлена ў 1984), «Злом» (пастаўлена ў 1988), «Вежа» (з У. Някляевым, пастаўлена ў 1990). Інсцэніраваў раманы М. Астроўскага «Як гартавалася сталь» (пастаўлена ў 1980) і М. Булгакава «Майстар і Маргарыта» (пастаўлена ў 1987). У 1987 г. выйшаў зборнік п'ес «Дыялог».

Лаўрэат прэмій Ленінскага камсамола Беларусі (1982) за зборнік апавяданняў «Святая птушка» і п'есу «Выбар», Ленінскага камсамола (1984) за творы апошніх год, Дзяржаўнай прэміі СССР (1985) за спектакль «Радавыя».

---

## *Зінаіда ДУДЗЮК*



Зінаіда Іосіфаўна Дудзюк нарадзілася 29.3. 1950 г. у вёсцы Слабодка Браслаўскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння Белаазёрскай сярэдняй школы (1966) працавала тынкоўшчыцай у Белаазёрску. У Брэсце скончыла тэхнічнае вучылішча будаўнікоў (1970). Працавала чарцёжніцай, тэхнікам, інжынерам інстытута «Брэстграмадзянпраект», адначасова вучылася ў Брэсцкім інжынерна-будаўнічым інстытуце на вячэрнім факультэце (скончыла ў 1977). Працавала інжынерам на Бярозаўскай ДРЭС, метадыстам Бярозаўскага бюро экскурсій і падарожжаў. З 1983 г.— карэспандэнт-арганізатар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР. Член СП СССР з 1986 г.

Першы верш надрукавала ў 1967 г. (бярозаўская раённая газета «Маяк камунізма»). З 1976 г. друкуецца ў рэспубліканскіх выданнях. Аўтар зборнікаў паэзіі «Праводзіны птушак» (1983) і «Абрысы лета» (1988). Піша вершы і казкі для дзяцей. Напісала п'есу для лялечных тэатраў «Канёк-гарбунёк» (паводле аднайменнай казкі П. Яршова, 1984, калектыўны зборнік «Крынічка»), аднаактоўку «У абдымках вятроў» (1985), радыёп'есу «Дудка-самагудка» (пастаўлена ў 1989).

Пераклала на беларускую мову п'есу Т. Амосавай і І. Пятровай «Славутае качаня Цім» (пастаўлена ў 1990).

## *Пятро ДУДО*



Пятро (Пётр Дзмітрыевіч) Дудо нарадзіўся 4.9.1911 г. у вёсцы Забалацце Лепельскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

З 1935 г. служыў у Чырвонай Арміі. У 1940 г. скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. Кірава ў Мінску. У 1940—1941 гг.— намеснік рэдактара газеты «Вольная праца» (Беласток), у гады Вялікай Айчыннай вайны — палітработнік, супрацоўнік армейскага друку. З 1949 г.— карэспандэнт газеты «Во славу Родины» (Мінск).

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 23.2.1958 г.

Выступаў у перыядычным друку з нарысамі і апавяданнямі з 1934 г. Аўтар аповесці «Першы салют» (1958), сатырычнай камедыі «Чортаў тузін» (1963).

## *Мар'ян ДУКСА*



Мар'ян Мікалаевіч Дукса нарадзіўся 5.4.1943 г. на хутары каля вёскі Каракулічы Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1958—1960 гг. займаўся ў Свірскім вучылішчы механізацыі, закончыўшы яго, працаваў у калгасе ўчотчыкам трактарнай брыгады, адначасова вучыўся завочна ў сярэдняй школе. Скончыў філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна (1969). У 1969—1987 гг. настаўнічаў у Сольскай сярэдняй школе на Смаргоншчыне. Член СП СССР з 1969 г.

Першы верш апублікаваў у мядзельскай раённай газеце ў 1960 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «Спатканне» (1967), «Крокі» (1972), «Станцыя» (1974), «Прыгаршчы суніц» (1976), «Забытыя словы» (1979), «Зона супраціўлення» (1982), «Твая пара сяўбы» (1985), «Заснежаныя ягады» (1989). Аўтар кніг для дзяцей «Зялёны акварыум» (1980) і «Світаюць сосны» (1987).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя А. Куляшова (1990) за кнігу вершаў і паэм «Заснежаныя ягады».

## *Хацкель ДУНЕЦ*



Хацкель Майсеевіч Дунец нарадзіўся ў студзені 1897 г. у горадзе Слоніме Гродзенскай вобласці ў сям'і рамесніка.

Атрымаў сярэднюю педагагічную адукацыю. У 1918—1919 гг. працаваў загадчыкам сталовай, затым на партыйнай рабоце ў Віцебску. З 1926 г. жыў у Мінску, быў намеснікам рэдактара газеты «Акцябэр» («Кастрычнік»). З 1933 г. да лютага 1935 г.— намеснік наркома асветы БССР, затым — культработнік на заводзе імя Кірава. Арыштаваны 7.7.1936 г. і па пастанове пазасудовага органа 27.8.1936 г. зняволены ў выпраўленча-працоўны лагер тэрмінам на 5 год. Зняволенне адбываў ва ухтпячорскіх лагерах. Паўторна арыштаваны ў красавіку 1937 г. і Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР ад 28.10.1937 г. асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны па справе 1936 г.— 24.1.1967 г. Судовай калегіяй Вярхоўнага суда БССР, 1937 г.— 2.2.1967 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г. у Мінску.

Першы артыкул апублікаваў у 1927 г. у часопісе «Штэрн» («Зорка»). Пісаў на мове ідыш. Разглядаючы яўрэйскую літаратуру, выказваўся і пра творчасць беларускіх пісьменнікаў. Асобнымі выданнямі выйшлі публіцыстычныя і літаратурна-крытычныя працы «Аб масавай рабоце на яўрэйскай мове» (1929), «Дасягненні нацыянальнай палітыкі ў БССР» (1930), «Тэорыя паэзіі Літвакова» (1931), «У змаганні» (1931), «За Магнітабуд літаратуры» (1932), «Пра пісьменнікаў і творы» (1933), «На літаратурныя тэмы» (1934).

## *Язэп ДЫЛА*



Язэп (Восіп Лявонавіч) Дыла нарадзіўся 14.4.1880 г. у горадзе Слуцку ў сям'і служачага.

Скончыў Слуцкую гімназію ў 1898 г. На наступны год паступіў у Юр'еўскі (цяпер Тартускі) ветэрынарны інстытут, з якога на трэцім курсе за ўдзел у антыўрадавых выступленнях быў выключаны. У 1903—1904 гг. працаваў у рэдакцыі мінскай газеты «Северо-Западный край». У 1905 г. вёў нелегальную работу сярод сялян па заданні Мінскага камітэта РСДРП. Працаваў у выдавецтвах Пецярбурга, Арэнбурга, Казані, Масквы (1906—1918). Быў членам Часовага рабоча-сялянскага Савецкага ўрада Беларусі — камісарам працы (студзень — люты 1919). У 1921—1923 гг.— старшыня Цэнтрабелсаюза. Пасля працаваў старшынёй Дзяржаўнай планавай камісіі БССР. У 1924 г.— намеснік старшыні Камісіі па раяніраванні БССР. З лістапада 1924 г.— сапраўдны член і вучоны сакратар Інстытута беларускай культуры, у 1925—1927 гг.— дырэктар Першага беларускага дзяржаўнага тэатра, дырэктар Інстытута па вывучэнні мастацтва пры Інбелкульце, намеснік загадчыка Белдзяржкіно па літаратурнай частцы. Быў членам ЦВК БССР. У 1931 г. рэпрэсіраваны, асуджаны на высылку з Беларусі. Жыў і працаваў у Саратаве. Рэабілітаваны ў 1957 г.

Памёр 7.4.1973 г.

Як пісьменнік дэбютаваў у 1912 г. у «Нашай ніве». Аўтар п'ес «Панскі гайдук» (1926, пастаўлена ў 1924), «Юнак з Крошына» (часопіс «Полымя», 1965), гістарычнай аповесці «Настасся Мякота» (часопіс «Маладосць», 1968, пазнейшая назва «У імя дзяцей»), шэрагу твораў для дзяцей. У 1981 г. выйшла кніга «Творы».

У перыядычным друку публікаваў апавяданні, крытычныя артыкулы, рэцэнзіі. Пераклаў на беларускую мову паасобныя вершы М. Канапніцкай, працы аб тэатральным жыцці Беларусі ў канцы XIX — пачатку XX стст., успаміны пра Я. Купалу, Я. Коласа, Я. Райніса.

# е



*Галіна* ЕГАРЭНКАВА

Галіна Іванаўна Егарэнкава нарадзілася 13.5. 1942 г. у горадзе Горкім (зараз Ніжні Ноўгарад, Расія) у сям'і рабочага.

У 1965 г. скончыла філалагічны факультэт Горкаўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. І. Лабачэўскага. Выкладала рускую мову і літаратуру ў школах Горкага (1965—1967). Скончыла аспірантуру пры Літаратурным інстытуце імя М. Горкага ў Маскве. З 1972 г.— асістэнт, з 1978 г.— дацэнт кафедры рускай і зарубежнай літаратур Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Па сумяшчальніцтве выкладала рускую літаратуру ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (1972—1978). З 1980 г. працавала дацэнтам кафедры літаратуры педагагічнага інстытута імя М. Горкага ў Горкім. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1979 г.

Памерла 9.2.1989 г.

Выступаць у друку пачала ў 1964 г. Літаратурна-крытычныя артыкулы і літаратуразнаўчыя працы прысвечаны творчасці А. Пушкіна, Ф. Дастаеўскага, Л. Талстога, М. Гогаля, М. Лермантава, сучасных беларускіх пісьменнікаў І. Шамякіна, А. Адамовіча, Г. Далідовіча, В. Казько, І. Пташнікава, І. Чыгрынава і інш. Аўтар кніг «Духовная жажда» (Горкі, 1983), «Земная основа» (літаратурна-крытычныя артыкулы, Горкі, 1987). У 1990 г. у Мінску выйшаў зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў аб беларускай прозе 70—80-х гадоў «Звено связующее».

### *Алесь* ЕМЯЛЬЯНАЎ



Алесь (Аляксандр Міхайлавіч) Емяльянаў нарадзіўся 20.3.1952 г. у вёсцы Забалацце Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі (1969—1971). У 1971—1973 гг. служыў у Савецкай Арміі. Працаваў электрыкам у Мінску, а ў 1977 г. перайшоў на журналісцкую працу (газеты «Чырвоная змена», «Піянер Беларусі»). Скончыў завочна філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1983). У 1983—1986 гг.— рэдактар на Беларускім тэлебачанні. З 1986 г.— літкансультант СП БССР. Член СП СССР з 1986 г.

Першы верш апублікаваў у 1968 г. (часопіс «Бярозка»). Аўтар кніжак вершаў і паэм «Ранак поўніцца жыццём» (1977), «Нязжатае поле» (1982), «На падкове дарог» (1987).

### *Мікола* ЕРМАЛОВІЧ



Мікола (Мікалай Іванавіч) Ермаловіч нарадзіўся 29.4.1921 г. у вёсцы Малыя Навасёлкі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1938 г. паступіў на беларускае аддзяленне літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Да вайны скончыў тры курсы. У 1941—1943 гг. працаваў настаўнікам у Мардоўскай АССР. У 1943—1944 гг. на педагагічнай працы ў Суражы Віцебскай вобласці, у 1944—1946 гг.— у Дзяржынску Мінскай вобласці. У 1946 г. аднавіў вучобу ў педінстытуце. Пасля заканчэння (1947) быў залічаны ў аспірантуру пры педінстытуце. З 1948 па 1955 гг. працаваў выкладчыкам беларускай літаратуры ў Маладзечанскім настаўніцкім інстытуце, а пасля яго закрыцця быў загадчыкам метадычнага кабінета Маладзечанскага абласнога інстытута ўдасканалення настаўнікаў. У канцы 1957 г. па стану здароўя

выйшаў на пенсію. Жыве ў Маладзечна. Член СП СССР з 1989 г.

Сталую літаратурную працу пачаў у 1948 г. Выступае ў друку як аўтар крытычных і літаратуразнаўчых артыкулаў і гістарычных нарысаў. У 1970 г. выйшла кніга «Дарагое беларусам імя», у 1989 г.— кніга «Па слядах аднаго міфа», у 1990 г.— гістарычнае даследаванне «Старажытная Беларусь».

---

## *Якуб* ЕРМАЛОВІЧ



Якуб (Якаў Сідаравіч) Ермаловіч нарадзіўся 7.8.1910 г. у вёсцы Вяшэўка Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння двухгадовых педагагічных курсаў у Мсціславе (1931) настаўнічаў у вёсцы Усушак Чавускага раёна, а ў 1932—1933 гг. быў літработнікам чэрвеньскай раённай газеты «Калектывіст». У 1933—1936 гг. вучыўся ў Мінскім педагагічным інстытуце (скончыў завочна літаратурны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута ў 1959 г.). Рэпрэсіраваны ў 1936 г. Вызвалены ў 1941 г. Рэабілітаваны 26.7.1967 г. У 1944—1970 гг. працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы ў вёсцы Пагост Бярэзінскага раёна. Член СП СССР з 1961 г.

Памёр 12.4.1987 г.

Дэбютаваў у друку ў 1929 г. Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Над Бярозай» (1960), «Душа чалавека» (1962), «Родная зямля» (1967), «Твар у твар» (1970), «След на зямлі» (1977), «Сіняя птушка» (1980), «Акопы не пазарасталі» (1985).

## *Алесь ЕСАКОЎ*



Алесь (Аляксандр Аляксандравіч) Есакоў нарадзіўся 18.12. 1911 г. у вёсцы Новікава Галіцкага раёна Кастрамской вобласці (Расія) у сям'і рабочага.

Працоўны шлях пачаў на Мінскай шчотачнай фабрыцы імя Н. К. Крупскай у 1928 г. Быў артыстам і загадчыкам літаратурнай часткі Тэатра рабочай моладзі. Вучыўся на рабфаку, у Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага (1932—1935). Служыў у Чырвонай Арміі (1935—1936). З 1936 г.— загадчык аддзела мастацтва ў газеце «Літаратура і мастацтва», з 1938 г.— дырэктар Рэспубліканскага тэатра юнага гледача, з 1940 г.— начальнік аддзела тэатраў Упраўлення па справах мастацтва пры СНК БССР. Удзельнічаў як ваенны журналіст у паходзе Савецкай Арміі ў Заходнюю Беларусь і ў савецка-фінляндскай вайне. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі, потым у партызанскім атрадзе на Міншчыне. Быў паранены. Пасля вайны працаваў начальнікам Галоўрэперткома БССР (1944—1945), загадчыкам аддзела ў газеце «Літаратура і мастацтва» (1945—1951), літкансультантам у СП БССР (1951—1960). У 1960—1974 гг.— вучоны сакратар Літаратурнага музея Янкі Купалы. Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 13.6.1985 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1928 г. Адзін з аўтараў п'есы «Першы штандар» (1930, пастаўлена ў 1929). Выдаў манаграфічны нарыс «Уладзімір Крыловіч» (1956), нарысы «Калгасны хор сяла Азершчына» (з Б. Смольскім, 1953) і «Старэйшы самадзейны калектыў» (1958), манаграфію «Янка Купала і беларускі тэатр» (1972), брашуру «Янка Купала і беларускае мастацтва» (1972). У 1977 г. выйшла кніга «Зерне да зерня: Абразкі з жыцця Янкі Купалы».

# Ж



## *Рыгор ЖАЛЯЗНЯК*

Рыгор Самуілавіч Жалязняк нарадзіўся ў верасні 1914 г. у горадзе Віцебску ў сям'і рабочага.

Вучыўся ў Віцебскім фабрычна-заводскім вучылішчы чыгуначнікаў (1930—1931), працаваў у дэпо, літсупрацоўнікам у газеце «Віцебскі рабочы» (1931—1932), займаўся ў Віцебскім кінатэхнікуме на сцэнарным аддзяленні (1932—1933). Паступіў у Ленінградскі дзяржаўны інстытут гісторыі, філасофіі, літаратуры і лінгвістыкі, а ў 1936 г. перавёўся на філалагічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Пасля заканчэння універсітэта (1938) вучыўся тры гады ў аспірантуры. Напісаў у 1941 г. кандыдацкую дысертацыю на тэму «Паэзія М. А. Багдановіча».

Загінуў у 1942 г. пры абароне Ленінграда.

Першыя творы надрукаваў у 1931 г. У сааўтарстве з Г. Люгоўскім выдадзены ў Віцебску ў 1933 г. зборнік паэзіі «Першы вытап». У 1934 г. у Віцебску выйшаў зборнік вершаў «Вясновыя будні». Шэраг вершаў надрукаваны ў зборніках «Мы іх не забудзем» (1949) і «Крывёю сэрца» (1967). Пісаў таксама нарысы.



## *Анатоль ЖАЛЯЗОЎСКІ*

Анатоль Пятровіч Жалязоўскі нарадзіўся 5.2.1943 г. у вёсцы Крапіўна Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння сярэдняй школы № 5 у Оршы (1962) паступіў у Беларускі інстытут фізічнай культуры. З другога курса прызваны ў Савецкую Армію (1963—1965). З 1965 г. працягваў вучобу ў інстытуце (скончыў у 1968), працаваў у спартыўнай школе моладзі ў Оршы

(1968), загадчыкам аддзела Віцебскага абкома камсамола (1968—1971), інструктарам ЦК ЛКСМБ (1971—1974), інструктарам па турызму і экскурсіях у сістэме Белсаўпрофа (1974—1975), намеснікам дырэктара Мінскага экскурсійнага бюро (1972—1979), загадчыкам лабараторыі ў Міністэрстве жыллёва-камунальнай гаспадаркі (1975—1983), начальнікам аддзела прапаганды і выхаваўчай работы Спорткамітэта БССР. З 1987 г.— дырэктар Дома літаратара, з 1989 г.— сакратар праўлення СП БССР, з 1990 г.— намеснік старшыні СП Беларусі. Член СП СССР з 1986 г.

Першае апавяданне апублікаваў у 1975 г. Аўтар дакументальнай кнігі «Озеро Палик помнит» (1976), зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Перелом» (1981), «Горкі хлеб» (1985), аповесці «Іду на канфлікт» (часопіс «Маладосць», 1990).

---

## *Алесь ЖАМОЙЦІН*



Алесь (Аляксандр Пятровіч) Жамойцін нарадзіўся 17.8.1955 г. у вёсцы Малахоўцы Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння Пружанскай сярэдняй школы-інтэрната (1972) працаваў слесарам на заводзе «Гомсельмаш». У 1973—1975 гг. служыў у Савецкай Арміі. Зноў працаваў слесарам (Наваполацк), матарыстам цеплахода «Днепра-Буг» (Пінск). У 1982 г. скончыў завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1976—1977 гг.— лабарант Малахоўскай сярэдняй школы, у 1977—1978 гг.— апілоўшчык (Баранавічы), у 1978—1985 гг.— настаўнік беларускай мовы і літаратуры Доцішскай васьмігадовай школы Воранаўскага раёна, у 1985—1987 гг.— механік на Прыбалтыйскай чыгунцы (Вільнюс). З 1988 г.— навуковы супрацоўнік, з 1989 г.— загадчык літаратурнамемарыяльнага музея Ф. Багушэвіча ў вёсцы Кушляны Смаргонскага раёна. Член СП СССР з 1989 г.

Першыя вершы ў рэспубліканскім друку

з'явіліся ў 1981 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Аўтар зборніка паэзіі «Азірнуўшыся — не скамянею» (1989).

---

## *Ірына ЖАРНАСЕК*



Ірына Францаўна Жарнасек нарадзілася 17.1.1953 г. у вёсцы Чаранкі Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Пліскай сярэдняй школы (1969) працавала загадчыцай Мамайскай сельскай бібліятэкі на Глыбоччыне. Скончыла завочна Мінскі інстытут культуры (1976). У 1978—1979 гг.— загадчыца чытальнай залы бібліятэкі трэста № 16 «Нафтабуд» у Наваполацку, у 1979—1983 гг.— карэспандэнт шматтыражнай газеты «Знамя новостройки» гэтага трэста. З 1983 г.— карэспандэнт наваполацкой гарадской газеты «Химик». Член СП СССР з 1987 г.

Першае апавяданне апублікавала ў 1978 г. (газета «Химик»), у наступным годзе выступіла ў рэспубліканскім друку (часопіс «Работніца і сялянка»). Аўтар зборніка апавяданняў «Ліст да сына» (1986).

---

## *Генрык ЖАРСКІ*



Генрык Казіміравіч Жарскі нарадзіўся ў 1902 г. у горадзе Варшаве (Польшча) у сям'і фельчара.

З шаснаццаці год удзельнічаў у падпольнай рабоце польскай кампартыі. Быў зняволены ў варшаўскі астрог «Павіак». Вызвалены пад залог, эмігрыраваў у Францыю, дзе працаваў на заводзе «Рэно». Высланы за межы Францыі за арганізацыю забастоўкі рабочых. Па накіраванні Польскай секцыі Камінтэрна прыехаў у СССР, дзе быў залічаны на вучобу ў Маскоўскі дзяржаўны інстытут журналістыкі. Працаваў у Саратаве ў абласной газеце, затым у пугачоўскай раённай газеце. У 1932 г. пераведзены ў Беларусь. Быў намеснікам рэдактара, затым рэдактарам польскай газеты «Орка» («Ворыва»). У 1937 г. рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны ў 1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 14.10.1937 г.

Літаратурнай працай займаўся з другой паловы 20-х гадоў. Апублікаваў на рускай мове аповесць «Без языка» (газета «Пионерская правда», 1927). У газеце «Орка» выступаў з публікацыямі на польскай мове. У «Альманаху літэрацкім» (Мінск, 1934) апублікаваў шэраг празаічных твораў. Асобным выданнем на польскай мове выйшла кніжка апавяданняў для дзяцей «Парашок для чыхання» (1935). Незадоўга да арышту падрыхтаваў да друку зборнік апавяданняў, які не выйшаў у свет.

---

## *Алесь ЖАЎРУК*



Алесь Жаўрук (Аляксандр Дзмітрыевіч Сінічкін) нарадзіўся 19.8.1910 г. у горадзе Сянно Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1927 г. паступіў у Рагачоўскі педагагічны тэхнікум, пасля заканчэння якога настаўнічаў у саўгасе «Сосны» Любанскага раёна. Скончыў у 1938 г. Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Г. Чарнышэўскага. Займаўся ў аспірантуры пры АН БССР. У 1939 г. прызваны ў Савецкую Армію. Быў ваенным карэспандэнтам армейскай газеты «В бой за родину». З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце.

Загінуў 23.8.1942 г. пад Сталінградам.

Першыя вершы надрукаваў у 1926 г. (газеты «Магілёўскі селянін» і бабруйская — «Камуніст»). Выдаў зборнікі вершаў «Ручаіны» (1936), «Дняпро выходзіць з берагоў» (1938). Надрукаваны напісаныя для дзяцей у сааўтарстве з А. Ушаковым паэмы «Пра майго таварыша» (1939), «Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада» (1939) і зборнік вершаў «Пра майго катка» (1950). У 1960 г. выйшла «Выбранае», у 1987 г.— зборнік «Крывёю сэрца» (вершы, паэмы, успаміны пра паэта).

Аўтар лібрэта аперэты «Зарэчны барок» (з А. Ушаковым, пастаўлена ў 1940).

## *Алег* ЖДАН



Алег Ждан (Алег Аляксеевіч Пушкін) нарадзіўся 5.1.1938 г. у горадзе Смаленску (Расія) у сям'і служачага.

Скончыў гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1960). Працаваў на будаўніцтве Карагандзінскага металургічнага камбіната (г. Цемір-Тау), у Прыташкенцкай геафізічнай партыі, затым — на будаўніцтве Брацкага лесапрамысловага комплексу. З 1963 г. жыве ў Мінску. Рабіў на трактарным заводзе абрубшчыкам, грузчыкам, выбівальшчыкам, наждачнікам, начальнікам змены (1963—1972), рэдактарам на Беларускім тэлебачанні (1972—1973), на кінастудыі «Беларусьфільм» (1973—1976, 1983—1984). Скончыў завочнае аддзяленне Літаратурнага інстытута імя М. Горкага (1969). Член СП СССР з 1983 г.

Першае апавяданне апублікаваў у газеце «Литературная Россия». Піша на рускай мове. Аўтар кніг апавяданняў, аповесцей «Во время прощания» (1975), «В гостях и дома» (Масква, 1977), «Знакомый» (1977), «Черты и лица» (Масква, 1985), «По обе стороны проходной» (Масква, 1987), «Самостоятельная жизнь» (1990).

## *Алесь* ЖУК



Алесь (Аляксандр Аляксандравіч) Жук нарадзіўся 1.4.1947 г. у вёсцы Клешаў Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1970 г. скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1972—1974 гг. служыў у Савецкай Арміі камандзірам мотастралковага ўзвода. У 1974—1977 гг. працаваў рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура». У 1977—1979 гг.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць». У 1979—1980 гг.— інструктар пры ЦК КПБ, у 1980—1986 гг.— галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», у 1986—

1989 гг.— сакратар праўлення СП БССР, з 1989 г.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1973 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Першыя апавяданні апублікаваў у рэспубліканскім друку ў 1965 г. Выдаў кнігі прозы «Асеннія халады» (1972), «Паляванне на старых азёрах» (1975), «Зоркі над палігонам» (1977), «Не забывай мяне» (1978), «Па саннай дарозе» (1979), «Паўстанак вяртання» (1981), «Паляванне на Апошняга Жураўля» (1982), «Чорны павой» (1986), «Праклятая любоў» (1990), «На дазорнай сцяжыне» (1990). Аўтар п'есы «Апошні жуpавель» (з А. Дударавым, пастаўлена ў 1986), сцэнарыя тэлефільма «Паляванне на Апошняга Жураўля» (зняты ў 1986). Па матывах аповесці «Зоркі над палігонам» зняты фільм «Палігон» (1983).

Пераклаў на беларускую мову кнігі Г. Траепольскага «Белы Бім Чорнае вуха» (1975), зборнік апавяданняў Ю. Казакова «Арктур — гончы сабака» (1976), аповесці М. Кацюбінскага «Fata morgana» і «Дарагою цаною» (1980), У. Багамолава «Зося» (1981), раманы Н. Сафарава «Дні праклёну і дні надзеі» (1982), Т. Джумагельдыева «Прапашчы чалавек» (1984), аповесці Ю. Трыфанава «Папярэднія вынікі» (1986), М. Булгакава «Сабачае сэрца» (1989), асобныя творы іншых пісьменнікаў.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978) за кнігу «Зоркі над палігонам», Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1982) за кнігу «Паўстанак вяртання».

---

## *Кастусь ЖУК*



Кастусь (Канстанцін Якаўлевіч) Жук нарадзіўся 2.5.1954 г. у вёсцы Затур'я Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Сейлавіцкай сярэдняй школы (1971) і курсаў шафёраў пры Нясвіжскім аўтамотаклубе ДТСААФ (1972) служыў у Савецкай Арміі (1972—1974). Працаваў наладчыкам, электразваршчыкам на Мінскім трактарным заводзе (1974—1979) і адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні філалагічнага

факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў у 1981). Быў літсупрацоўнікам газеты «Чырвоная змена» (1979), карэспадэнтам шматтыражнай газеты мінскіх будаўнікоў «На стройках Минска» (1979—1981). З 1981 г. працаваў рэдактарам на Беларускім тэлебачанні. У 1986—1988 гг.— слухач Мінскай вышэйшай партыйнай школы пры ЦК КПБ. З 1988 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1988 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1968 г. (нясвіжская раённая газета «Чырвоны сцяг»). У 1979 г. дэбютаваў першай кніжкай вершаў у калектыўным зборніку «Нашчадкі». Аўтар кніг вершаў і паэм «Планета маёй душы» (1982), «Зямная ноша» (1988).

Перакладае з рускай, украінскай, латышскай моў.

---

## *Васіль ЖУКОВІЧ*



Васіль Аляксеевіч Жуковіч нарадзіўся 7.11. 1940 г. у вёсцы Забалацце Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1959 г. паступіў на філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. Пушкіна, з трэцяга курса перавёўся на завочнае аддзяленне (скончыў у 1964). У 1957—1959 гг. працаваў рабочым на будоўлях Брэста. У 1962—1971 гг.— літсупрацоўнік, загадчык сельскагаспадарчага аддзела рэдакцыі брэсцкай раённай газеты «Заря над Бугом». З 1971 г.— старшы рэдактар Брэсцкага тэлебачання, з 1972 г.— літсупрацоўнік газеты «Знамя юности», з 1973 г.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». У 1977 г. скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. З 1981 па чэрвень 1982 г.— намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1977 г.

У друку выступае з 1956 г. Выдаў зборнікі вершаў «Паклон» (1974), «Мелодыя святла» (1976), «Суседства» (1982), «Цана цішыні» (1985), «Твая місія» (1988), «Разняволенне» (1990), аповесць «Як адна вясна...» (1980),

кнігу для дзяцей «Тараскаў самакат» (1988), шэраг кніжачак-раскладанак.

Пераклаў зборнік К. Цвіркі для дзяцей «Салавейка» (1974), паасобныя вершы І. Якштаса, П. Грабоўскага, І. Няходы, Махтумкулі, У. Мэя, апавяданні А. Ананьева, С. Баруздзіна.

---

## *Васіль ЖУРАЎЛЁЎ*



Васіль Пракопавіч Жураўлёў нарадзіўся 27.5.1931 г. у вёсцы Раздзел 2-гі Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1954 г. скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага і паступіў у аспірантуру пры гэтым жа інстытуце. З 1957 г.— навуковы супрацоўнік, з 1989 г. галоўны навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Доктар філалагічных навук. Член СП СССР з 1972 г.

Выступае ў друку як крытык і літаратуразнавец з 1957 г. Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964—1966), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» (1977). Сааўтар кніг «Праблемы сучаснай беларускай прозы» (з П. Дзюбайлам і М. Луферавым, 1967), «Беларуская савецкая проза: Апавяданне і нарыс» (з А. Андраюком, А. Лысенка, Л. Голубевай, 1971), «Пытанні паэтыкі» (з Я. Шпакоўскім і А. Яскевічам, 1974), калектыўнай працы «Ідэйна-тэарэтычныя пытанні сучаснага літаратурнага працэсу» (1987), аўтар манаграфій «Структура твора» (1978), «Магчымасці рэалізму.: Прычыннасць і гістарызм» (з М. Тычынам, 1982), «Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана» (1990).

## *Янка ЖУРБА*



Янка Журба (Іван Якаўлевіч Івашын) нарадзіўся 30.4.1881 г. у вёсцы Купніна (цяпер у межах Чашнікаў) Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1902 г. скончыў Полацкую настаўніцкую семінарыю. Настаўнічаў на Віцебшчыне. Пасля заканчэння Глухаўскага настаўніцкага інстытута (1909, Чарнігаўская губерня) працаваў выкладчыкам у гарадскіх і пачатковых вучылішчах Украіны, Беларусі, Расіі, у навукова-педагагічнай камісіі Наркамасветы БССР (1921—1922), інспектарам Бабруйскага, затым Калінінскага (Клімавічы) акруговых аддзелаў народнай асветы (1923—1927), выкладчыкам у Чэрыкаўскай сямігадовай школе, у Магілёўскім медыцынскім вучылішчы (1927—1934). У 1934 г. пераехаў у Мінск і стаў працаваць у Інстытуце мовазнаўства АН БССР. З-за хваробы вачэй быў змушаны ў 1937 г. пакінуць працу. З 1941 г. і пасля вайны жыў у Чашніцкім раёне, быў настаўнікам спеваў. Апошнія гады жыцця правёў у вёсцы Слабада пад Полацкам і ў Полацку. Член СП СССР з 1939 г.

Памёр 7.1.1964 г.

З 1902 г. друкаваў этнаграфічныя нарысы ў газеце «Витебские губернские ведомости». Першы верш па-беларуску апублікаваў у 1909 г. у газеце «Наша ніва». Аўтар зборнікаў паэзіі «Заранкі» (1924), «Ясныя шляхі» (1959), «Вершы» (1970), «Роднае» (1980), «Мая песня» (1984) і кніжак вершаў для дзяцей «Ластаўкі» (1950), «Сонечная раніца» (1955), «Светлыя дні» (1959). У 1950 г. выйшлі Выбраныя творы.

Пераклаў на беларускую мову раман Ф. Дастаеўскага «Бедныя людзі» (1930).

### *Алесь* ЖЫГУНОЎ



Алесь (Аляксандр Міхайлавіч) Жыгуноў нарадзіўся 27.11.1954 г. у вёсцы Тройца Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Навабрашчынскую сярэднюю школу (1970), працаваў дырэктарам клуба ў вёсцы Боркі Шклоўскага раёна. Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1976) — настаўнік беларускай і рускай мовы і літаратуры Чарнявіцкай сярэдняй школы Глыбоцкага раёна. З 1980 г.— карэспандэнт-арганізатар Глыбоцкага раённага радыё, з 1988 г.— загадчык аддзела радыёінфармацыі раённай газеты «Шлях перамогі». З 1989 г. працуе ў рэдакцыі раённай газеты «Веснік Глыбоччыны» (новая назва газеты). Жыве ў Глыбокім Віцебскай вобласці. Член СП СССР з 1982 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1972 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборніка вершаў «Матчына вышыванка» (1984).

### *Уладзімір* ЖЫЖЭНКА



Уладзімір Аляксандравіч Жыжэнка нарадзіўся 23.1.1931 г. у горадзе Дарагабужы Смаленскай вобласці (Расія) у сям'і настаўніка.

У 1948 г. паступіў вучыцца на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў у 1953). Адначасова працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры ў вячэрніх школах. З 1953 г.— рэдактар дзіцячай і юнацкай літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве БССР (пазней — «Беларусь»), у 1964—1966 гг. і ў 1966—1969 гг.— старшы рэдактар на Беларускім радыё, у 1966 г. (студзень — верасень) — галоўны рэдактар Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў. З 1969 г. працуе ў часопісе «Неман», з 1979 г.— загадчык аддзела прозы часопіса. Член СП СССР з 1981 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў з рэцэнзій і артыкулаў у студэнцкія гады. З 1955 г. выступае пераважна як перакладчык твораў беларус-

кіх пісьменнікаў на рускую мову. У яго перакладзе выйшлі раманы М. Лобана «Гарадок Устронь» (1972), Л. Арабей «Іскры ў папялішчы» (1973), А. Васілевіч «Пачакай, затрымайся» (1975), А. Шашкова «Спытай сваё сэрца» (1976), Б. Сачанкі «Вялікі Лес» (1986), В. Адамчыка «Голас крыві брата твайго» (часопіс «Нёман», 1990), асобныя аповесці А. Кулакоўскага, В. Карамазава, А. Марціновіча, Я. Маўра, І. Сяркова, М. Паслядовіча, кнігі І. Навуменкі пра Янку Купалу і Якуба Коласа і інш.

У яго літаратурнай апрацоўцы выдадзены на рускай мове кнігі У. Парахневіча «Огненные вихри» (1967), А. Караткевіча «Обелиск у дороги» (1971), Л. Шыпулі «Четыре тарана в небе» (1982).

---

## *Уладзімір ЖЫЛКА*



Уладзімір Адамавіч Жылка нарадзіўся 27.5. 1900 г. у вёсцы Макашы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1914 г. скончыў гарадское вучылішча ў Міры і разам з бацькамі пераехаў у Мінск. Вучыўся ў Багародзіцкім агранамічным вучылішчы Тульскай губерні (1915—1917), працаваў аграномам у дзяржаўным маёнтку пад Мінскам (1918—1919). Вучыўся ў беларускай гімназіі ў Дзвінску, а ў лютым 1923 г. выехаў на вучобу ў Чэхію, дзе быў залічаны на гісторыка-філалагічны факультэт Карлава універсітэта ў Празе. У 1926 г. вярнуўся на радзіму. Быў літсупрацоўнікам рэдакцыі газеты «Звязда», выкладаў беларускую літаратуру ў Мінскім музычным тэхнікуме. На пачатку 1930 г. арыштаваны і паводле пастановы пазасудовага органа ад 10.4.1931 г. высланы тэрмінам на 5 год у г. Уржум Кіраўскай вобласці, дзе працаваў загадчыкам гаспадаркі і выкладчыкам літаратуры ў медыцынскім тэхнікуме. Рэабілітаваны 19.9. 1960 г. Судовай калегіяй Вярхоўнага суда БССР.

Памёр 1.3.1933 г.

Выступаць у друку з вершамі пачаў у 1920 г. У Вільні выйшлі асобнымі выданнямі паэма «Уяўленне» (1923) і зборнік вершаў «На растані» (1924). У Мінску выдадзены зборнікі «З па-

лёў Заходняй Беларусі» (1927), «Вершы» (1970), «Пожні» (вершы, пераклады, крытычныя артыкулы, 1986).

Пераклаў «Слова пра Якуба Шэлю» Б. Ясенскага (1932), а таксама асобныя творы А. Блока, А. Міцкевіча, Г. Ібсена, Ш. Бадлера, І. Волькера і інш.

---

## *Хведар ЖЫЧКА*



Хведар Змітравіч Жычка нарадзіўся 20.3.1927 г. у пасёлку Марс Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1944—1951 гг. служыў на Балтыйскім Ваенна-Марскім Флоце, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Потым працаваў літработнікам у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Піянер Беларусі», адказным сакратаром рэдакцыі часопіса «Бярозка». У 1959 г. скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. Быў рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі выдавецтва «Беларусь», галоўным рэдактарам газеты «Літаратуры і мастацтва». З 1976 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Першы верш апублікаваў у 1947 г. (часопіс «Полымя»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Стой на вахце, сэрца» (1961), «Росныя лілеі» (1965), «Настой» (1968), «Абеліск» (1973), «Абавязак» (1979), «Карэц калодзежнай вады» (вершы і паэмы, 1984), «Абрус» (1985), «Абдымкі сонца» (1988) і паэмы «Партызанскі праспект» (1975).

У сааўтарстве з П. Беразняком напісаў кнігі апавяданняў і фельетонаў «Сукенка ў крапінку» (1956) і «Лясныя страхі» (1959). Выйшлі аповесці для дзяцей «Каштанавы «Масквіч» (1959), «Піфагоравы штаны» (1961), «Зброю бяруць сыны» (1964), «Зорачка-пяцёрачка» (1965), «Дзе растуць бяссмертнікі» (1967), «Дзень будзе ясны» (1981), зборнікі апавяданняў «Паспелі суніцы» (1966), «Букет вяргіняў» (1970), навукова-папулярныя нарысы «Мая вуліца» (1970), «Мы па вуліцы ідзём» (з І. Чыжэўскім, 1973), «Старонкі піянерскай гісторыі» (1975), зборнік вершаў «Сонца скача

па траве» (1989). У 1977 г. выдаў зборнік гумарэсак «Спагадлівыя людзі».

У яго перакладзе на беларускую мову выйшлі кнігі Т. Масэнкі «Казка нашага лесу» (1962), М. Алейніка «Леся» (з В. Крайко, 1967) і «Жылюкі» (1983), Л. Украінкі «Лясная песня» (1971), Б. Ногейла «Паводка» (1977), В. Нэзвала «Васількі і гарады» (1986). Выдаў зборнік выбраных паэтычных перакладаў «Вокны ў сад» (1987). Склаў анталогію сучаснай чэшскай паэзіі «Высокае неба» (1980).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Віцезслава Нэзвала (1983) за пераклады і прапаганду чэшскай і славацкай паэзіі. Узнагароджаны Дыпломам і медалём Славацкага літаратурнага фонду (1984).

# З



## *Людміла ЗАБАЛОЦКАЯ*

Людміла Забалоцкая (Людміла Васільеўна Саламаха) нарадзілася 27.12.1949 г. у горадзе Крычаў Магілёўскай вобласці ў сям'і служачых.

У 1968 г. скончыла Крычаўскае медыцынскае вучылішча, працавала карэспандэнтам чавускай раённай газеты «Іскра». У 1974 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1974—1984 гг.— навуковы рэдактар у Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя П. Броўкі. Член СП СССР з 1990 г.

Друкуецца з 1968 г. Выдала зборнікі вершаў «Сакавік» (1974), «Радаводны васілёк» (1981), «Святло палыну» (1989).

## *Ніна ЗАГОРСКАЯ*



Ніна Сымонаўна Загорская нарадзілася 16.7. 1940 г. у вёсцы Загор'е Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыла аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1962). Дзесяць год працавала старшым рэдактарам на Брэсцкай студыі тэлебачання. У 1974 г. скончыла Мінскую вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. У 1973 г. накіравана на працу адказным сакратаром у рэдакцыю газеты «Зорька». З 1976 г.— адказны сакратар рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач Беларускага радыё, з 1980 г.— намеснік галоўнага рэдактара літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання, з 1981 г.— загадчык аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя», з 1982 г.— галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдак-

цыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР. Член СП СССР з 1982 г.

У друку выступае з 1958 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Радар» (1975), «Явар» (1982), «Мне добра з вамі» (вершы і паэмы, 1989). Асобныя вершы пакладзены на музыку.

Пераклала на беларускую мову кнігу апавяданняў Х. Гюльназарана «Калі я быў маленькі» (1986), драматычную паэму Л. Украінкі «Апантаная» (1989), дакументальную драму С. Віеса і Ю. Бэбрыша «Райніс і Аспазія» (1989, пастаўлена ў 1990), паасобныя вершы паэтаў народаў СССР і замежных краін.

Уклала кнігі драматургіі «Галоўны экзамен» (1987), «І засталася каса ў пракосе» (1988), «Радзіма мая дарагая» (1989), «Салют» (1990), з А. Селязнёвай «Крок у бессмяротнасць» (1984), «Крынічка» (для тэатраў лялек, 1985), «Каля роднай хаты» (1987), «Чалавек на зямлі — гаспадар» (1989).

Выступае і як публіцыст, крытык.

---

## *Язэп ЗАЗЕКА*



Язэп (Іосіф Васільевіч) Зазека нарадзіўся 24.6. 1907 г. у вёсцы Востраў Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і батрака.

Скончыў літаратурны факультэт Вышэйшага педагагічнага інстытута імя М. Горкага ў Мінску (1936), а таксама аспірантуру пры гэтым інстытуце (1940). Працаваў намеснікам дырэктара Беластоцкага педагагічнага інстытута. У першыя гады Вялікай Айчыннай вайны — на падпольнай рабоце ў заходніх абласцях Беларусі, а з красавіка 1943 г.— рэдактар газеты «Свіслацкая праўда», што выдавалася пры партызанскай брыгадзе імя Чапаева Беластоцкага злучэння. Пасля вызвалення Беларусі працаваў намеснікам дырэктара, дэканам Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. У 1949— 1952 гг. загадваў кафедрай рускай літаратуры ў Адэскім педінстытуце. У 1952—1973 гг.— дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1967 г.

Узнагароджаны польскім ордэнам Крыж партызанскі, медалямі.

Памёр 27.8.1977 г.

Друкавацца пачаў у 1930 г. Выдаў зборнік апавяданняў «Рукою ворага» (1932), зборнік нарысаў «Партызанскія сцежкі» (1959), кніжкі апавяданняў для дзяцей «Лясныя сябры» (1966), «Сонечны алень» (1969), «Трывожная ноч» (апавяданні і нарысы, 1972).

Аўтар брашуры «Вялікі і вечна жывы: Вобраз У. І. Леніна ў беларускай народнай творчасці» (1968), паасобных артыкулаў пра беларускі фальклор. Укладальнік зборнікаў партызанскай творчасці «Песні барацьбы» (з М. Мяровіч і С. Карабанам, 1946), «Лясныя песні» (1970, 2-е дапоўненае выданне ў 1974).

---

## *Сяргей ЗАЙЦАЎ*



Сяргей Міхайлавіч Зайцаў нарадзіўся 21.6. 1954 г. у горадзе Свярдлоўску (Расія) у сям'і ваеннаслужачага.

У 1977 г. скончыў Карагандзінскі медыцынскі інстытут. Працоўную дзейнасць пачаў урачом-педыятрам у акцябрскай раённай бальніцы Тургайскай вобласці Казахстана. У 1978 г. пераехаў у Мінск. Працаваў старшым мастакомрэдактарам у Дзяржаўным тэатры оперы і балета БССР. У 1979—1981 гг.— галоўны ўрач ямінскай сельскай бальніцы Любанскага раёна. У 1981 г. вярнуўся ў Мінск, працуе ўрачом у паліклініцы. Член СП СССР з 1989 г.

У друку пачаў выступаць з 1978 г. (акцябрская раённая газета «Новь», Казахстан). Піша на рускай мове. Аўтар рамана-быліны «Побеждая — оглянись» (1986).

*Сяргей ЗАКОННІКАЎ*



Сяргей Іванавіч Законнікаў нарадзіўся 16.9. 1946 г. у вёсцы Слабада Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1969). Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Клетнаўскай сярэдняй школе Барысаўскага раёна (1969—1970). Пасля — літсупрацоўнік ушацкай раённай газеты «Патрыёт» (1970—1971), сакратар Ушацкага райкома камсамола (1972—1975). З сакавіка 1975 г.— карэспандэнт, загадчык аддзела газеты «Чырвоная змена», з кастрычніка 1975 г.— карэспандэнт газеты «Звязда». З 1978 г. інструктар, з 1979 г. загадчык сектара мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ, з 1986 г.— галоўны рэдактар часопіса «Полымя». Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1977 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалём.

Першы верш апублікаваў у 1963 г. (газета «Віцебскі рабочы»). У 1970 г. у калектыўным зборніку «Рунь» надрукавана падборка вершаў. Аўтар зборнікаў паэзіі «Бяседа» (1973), «Устань да сонца» (вершы і паэма, 1976), «Пакуль жыве мая бяроза» (вершы і паэмы, 1981), «Вера, Надзея, Любоў» (1983), «Прысак часу» (вершы, паэмы, 1986), «Сутнасць» (вершы і паэма, 1987), «Вечная далеч» (1987).

Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы рускіх, украінскіх, грузінскіх і літоўскіх паэтаў.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя. А. Куляшова (1982) за кнігу вершаў «Пакуль жыве мая бяроза».

## *Іван* ЗАМОЦІН



Іван Іванавіч Замоцін нарадзіўся 1.11.1873 г. у вёсцы Крывуліна Бежацкага раёна Цвярской вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

Скончыў аддзяленне гісторыі і славеснасці Пецярбургскага гісторыка-філалагічнага інстытута (1897). Працаваў настаўнікам гімназіі ў Варшаве, Пецярбургу. З 1904 г. быў прыват-дацэнтам Варшаўскага, а потым Пецярбургскага універсітэтаў. З 1908 г.— прафесар Варшаўскага, у 1917—1922 гг.— Данскога універсітэтаў. З 1922 г.— прафесар Беларускага дзяржаўнага універсітэта, чытаў курс методыкі выкладання літаратуры. З 1931 г.— прафесар Мінскага педагагічнага інстытута. Адначасова (з 1925) працаваў у Інстытуце беларускай культуры, затым у АН БССР. 4.4.1938 г. быў арыштаваны, 5.8. 1939 г. асуджаны да 8 год выпраўленча-працоўных лагераў. Рэабілітаваны 18.4.1956 г. Акадэмік АН БССР, член-карэспандэнт АН СССР, доктар філалагічных навук, прафесар.

Памёр у лагеры 25.5.1942 г.

Пісаў на рускай і беларускай мовах. Навуковыя працы прысвечаны гісторыі літаратуры XVIII—XIX і беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзяў. Адзін з пачынальнікаў беларускага савецкага літаратуразнаўства. Першая кніга «Ранние романтические веяния в русской литературе» надрукавана ў 1900 г. у Варшаве. Затым былі выдадзены працы «Предание о Вадиме Новгородском в русской литературе» (Варонеж, 1901), «Романтизм двадцатых годов XIX ст. в русской литературе» (Варшава, 1903—1907, т. 1—2), «Литературные эпохи XIX столетия: Очерки по истории русской литературы» (Варшава, 1906, вып. 1—6), «Романтический идеализм в русском обществе и литературе 20—30-х годов XIX ст.» (Санкт-Пецярбург, 1907), «Сороковые и шестидесятые годы» (Варшава, 1911), «Ф. М. Достоевский в русской критике, 1846—1881» (Варшава, 1913, ч. 1), «М. Ю. Лермонтов» (Варшава, 1914), «Единство русской культуры» (Харкаў, 1919). У Мінску выйшлі «На переломе: Схема литературных исканий XIX—XX вв.» (1927), «Мастацкая літаратура ў школьным выкладанні. Вып. 1—2» (1927—

1928), «А. С. Пушкін: Нарыс жыцця і творчасці» (1937), а таксама некалькі метадычных распрацовак па пытаннях выкладання мовы і літаратуры. Шэраг работ надрукаваны ў 20—30-я гг. у «Працах Беларускага дзяржаўнага універсітэта», у часопісах «Узвышша», «Полымя». Крытыка-біяграфічны нарыс пра М. Багдановіча змешчаны ў 1 томе Збору твораў паэта (Мінск, 1927). Даследаваў таксама творчасць І. Тургенева, І. Ганчарова, М. Някрасава, Л. Талстога, А. Серафімовіча, Я. Купалы, Я. Коласа, Ц. Гартнага, П. Глебкі, К. Крапівы і іншых пісьменнікаў.

---

## *Аляксей ЗАРЫЦКІ*



Аляксей Аляксандравіч Зарыцкі нарадзіўся 22.3.1911 г. у гарадскім пасёлку Хоцімск Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1928 г. скончыў сярэднюю школу ў Бабруйску, працаваў электраманцёрам на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце. У 1936 г. скончыў Маскоўскі інстытут замежных моў. З 1938 па 1946 г. служыў у Савецкай Арміі. У 1941—1942 гг. удзельнічаў у баях пад Арлом і Масквой, будучы памочнікам начальніка разведаддзела штаба аднаго з паветрана-дэсантных карпусоў. Затым у якасці інструктара армейскага палітаддзела прымаў удзел у баявых аперацыях на Волхаўскім і Ленінградскім франтах. Быў супрацоўнікам, пасля загадчыкам аддзела паэзіі часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1935 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Памёр 29.10.1987 г.

Першы верш надрукаваў у 1927 г., а ў 1932 г. выйшаў першы зборнік вершаў «Эпічныя фрагменты». У пасляваенны час выдаў кнігі паэзіі «Дняпроўскае рэха» (1946), «Арліная крыніца» (1947), «Наш сын» і «Світанскія сады» (1950), «Вершы і паэмы» (1952), «Залатое дно» (1955), «Праз бурныя парогі» (1957), «Пасылка ў рай» (1960), «Размова з сэрцам» (1961), «Вяртанне на зямлю» (1966), «Мая асяніна» і «У дарогу» (1973), «Талоны на бяссмерце» і «Пераклічка га-

доў» (1974), «Каля вячэрняга кастра» (1979), «Трывожная госця» (1986). У 1965 г. выдадзена кніга апавяданняў на рускай мове «Вересковый мед», У 1985 г.— кніга ўспамінаў, крытычных артыкулаў, нарысаў «За словам-падарункам». У 1969 і ў 1981 гг. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Перакладаў з рускай, украінскай, літоўскай, нямецкай, польскай, лужыцка-сербскай моў. Асобнымі кнігамі выйшлі зборнік А. Туманяна «Казкі і легенды» (1958), паэма К. Данелайціса «Чатыры пары года» (1961), балада А. Міцкевіча «Свіцязанка» (1976) і кніга выбраных перакладаў «У свет па песні» (1978).

---

## *Міхась ЗАРЭМБА*



Міхась (Міхаіл Мікалаевіч) Зарэмба нарадзіўся 2.1.1941 г. у вёсцы Знаменка Лагойскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых.

Пасля заканчэння Лагойскай сярэдняй школы № 1 — калгаснік, памочнік брыгадзіра калгаса «Перамога» (1957—1960). У 1965 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. З 1965 г.— літсупрацоўнік, з 1968 г.— загадчык аддзела школьнага і піянерскага жыцця газеты «Піянер Беларусі». З 1989 г. працуе загадчыкам рэдакцыі літаратуры для дзяцей малодшага школьнага ўзросту выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1989 г.

Узнагароджаны медалём.

Першы верш апублікаваў у 1956 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў для дзяцей «Камандзір зялёнага патруля» (1967), «Загадка без адгадкі» (1972), «Бі, барабан!» (1972), «Хто каго?» (1978), «Пераправа» (1987), «Сакрэт тэлепата» (1989).

## *Міхась ЗАРЭЦКІ*



Міхась Зарэцкі (Міхаіл Яфімавіч Касянкоў) нарадзіўся 20.11.1901 г. у сяле Высокі Гарадзец Талачынскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і дзяка.

Дзяцінства прайшло ў вёсцы Зарэчча пад Шкловам. У 10 год аддадзены ў Аршанскае духоўнае вучылішча, а затым — у Магілёўскую духоўную семінарыю, якую пакінуў, калі пачалася рэвалюцыя. Працаваў перапісчыкам у паўвайсковай часці. З лютага 1919 г. настаўнічаў на Магілёўшчыне, потым прызначаны загадчыкам валаснога аддзела народнай асветы. У 1920—1926 гг.— палітработнік Чырвонай Арміі. Уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Маладняк», з 1927 г.— у аб'яднанне «Полымя». Да лістапада 1936 г. працаваў у АН БССР. 3.10.1936 г. арыштаваны. Прыгавор Ваеннай калегіі ад 28.10.1937 г. адменены Вярхоўным судом БССР 7.12.1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1922 г. у газеце «Савецкая Беларусь». У 1925 г. выйшлі з друку два зборнікі апавяданняў «У віры жыцця» і «Пела вясна». Услед за імі — «Пад сонцам» (1926), «42 дакументы і Двое Жвіроўскіх» (1926), «На чыгунцы» (1928), «Ракавыя жаронцы» (1930, уключаны і п'есы «Віхор на балоце» і «Белыя ружы»), апавяданне «Бацькаў сын» (1932), аповесць «Голы звер» (1926), раманы «Сцежкі-дарожкі» (1928), «Вязьмо» (1932), кніжкі нарысаў «Падарожжа на новую зямлю» (1929), «Лісты ад знаёмага» (1931). Аўтар п'ес «Сымон Карызна» (1935), «Ная» (1936) і інш., а таксама кінасцэнарыя «Пачатак шчасця». У 1975 г. выдадзены зборнік выбраных апавяданняў «Пачатак шчасця», у 1989—1991 гг. выйшаў Збор твораў у 4 тамах. Выступаў і як крытык.

Пераклаў на беларускую мову раман «Цэмент» Ф. Гладкова (1930), «Прыгода ўдалага ваякі Швейка ў сусветную вайну» Я. Гашака (ч. 1, 1931).

## *Мікола ЗАСІМ*



Мікола (Мікалай Арцёмавіч) Засім нарадзіўся 19.11.1908 г. у вёсцы Шані Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Працаваў па найме, на Пружанскім лесапільным заводзе. У 1924 г. уступіў у падпольную камсамольскую арганізацыю, затым у Камуністычную партыю Заходняй Беларусі. За ўдзел у рэвалюцыйным руху польскія ўлады яго не раз арыштоўвалі. У 1925 г. зняволены ў пружанскую турму. Пасля ўз'яднання (1939) абраны старшынёй Шанеўскага сельсавета. У час Вялікай Айчыннай вайны — партызан, інструктар Брэсцкага абласнога антыфашысцкага камітэта. У 1944—1946 гг.— загадчык аддзела Пружанскага райвыканкома. Пасля заканчэння Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ (1948) працаваў у брэсцкай абласной газеце «Заря» (1948—1957), затым — у раённай газеце «Заря над Бугом». Кіраваў абласным літаб'яднаннем. Член СП СССР з 1945 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 19.7.1957 г.

Вершы пачаў друкаваць у 1928 г. у часопісах «Маланка», «Літаратурная старонка», «Асва», газетах «Наша воля», «Наша праца», у Айчынную вайну — у падпольных газетах «Заря», «За Родину». Выйшлі зборнікі паэзіі «Ад шчырага сэрца» (1947), «Вершы» (1954), «Выбранае» (1960), «Вершы» (1973), «А за намі Белавежа» (вершы і паэма, 1984).

## *Алесь ЗВОНАК*



Алесь (Пётр Барысавіч) Звонак нарадзіўся 14.2.1907 г. у горадзе Мінску ў сям'і рабочага.

Выхоўваўся ў дзіцячым доме. Пасля атрымання сярэдняй адукацыі (1925) накіраваны адказным сакратаром газеты «Чырвоная Полаччына». Узначальваў полацкую філію «Маладняка». З 1927 г. працаваў на Беларускім радыё, з 1929 г.— у часопісе «Маладняк». У 1931 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаў-

нага універсітэта, у 1934 г.— аспірантуру Акадэміі мастацтвазнаўства ў Ленінградзе. Працаваў у АН БССР (1934—1935), у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1935—1936). У лістападзе 1936 г. арыштаваны, у 1937 г. асуджаны на 10 год зняволення, якое адбываў у лагерах Магаданскай вобласці. Пасля адбыцця тэрміну працаваў геолагам аб'екта, галоўным геолагам прадпрыемства (Магаданская вобласць). 29.12.1954 г. Вярхоўным судом рэабілітаваны. З 1955 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1936 г.

Узнагароджаны медалём.

З вершамі ў друку выступіў у 1925 г., а ў 1926 г. разам з Я. Бобрыкам і Я. Туміловічам выдаў зборнік «Пунсовае ранне». Аўтар зборнікаў вершаў «Буры ў граніце» (1929), «На лінію агню» (1932), «Мая Радзіма» (1935), «Табе адной» (1957), «Запаветнае» (1961, вершы і паэмы), «Россып» (1967), «Прадчуванне» (вершы і паэма, 1974), «Санеты» (1982), «Ружовая чайка» (1985), паэм «Каршун» (1930) і «Загай» (1931). У 1977 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах, у 1987 г.— «Сябрына: Выбраныя творы».

Выступае ў галіне крытыкі, драматургіі тэатра і кіно. Аўтар п'есы «Навальніца будзе» па матывах трылогіі Якуба Коласа «На ростанях» (1960, пастаўлена ў 1959), сцэнарыяў навукова-папулярных фільмаў «Якуб Колас» (1962), «Вобразы і думы» (1965). У 1973 г. выдаў кнігу артыкулаў і ўспамінаў «Неспакойныя сэрцы».

Пераклаў на беларускую мову «Дуэль. Іоныч» А. Чэхава (1931), «Апошні з удэге» А. Фадзеева (з М. Хведаровічам, 1935), «Віцязь у тыгравай шкуры» Ш. Руставелі (з М. Хведаровічам, 1966), зборнік лірыкі Д. Кугульцінава «Святло жанчыны» (1975), асобныя творы А. Пушкіна, М. Някрасава, М. Святлова, У. Лугаўскога, А. Пракоф'ева, Я. Смелякова, М. Галоднага, М. Рыльскага. М. Бажана, П. Тычыны, А. Малышкі, У. Сасюры, Т. Масэнкі, Р. Гамзатава, А. Туманяна, І. Бехера, У. Кавальскага, Ю. Славацкага і інш.

## *Сяргей ЗНАЁМЫ*



Сяргей Знаёмы (Сяргей Змітравіч Клопаў) нарадзіўся 27.6.1909 г. у вёсцы Звоня Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Падлеткам працаваў рабочым на запалкавай фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» ў Барысаве. Быў рабкорам, затым рэдактарам шматтыражнай газеты «Чырвоны Бярэзінец». У 1930 г. скончыў літаратурна-крытычнае аддзяленне літаратурна-лінгвістычнага факультэта Вышэйшага педагагічнага інстытута. Выкладаў рускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе № 11 у Барысаве. З вясны 1936 г. працаваў літаратурным рэдактарам на Беларускім радыё. Арыштаваны 26.11. 1936 г. 4—5.10.1937 г. асуджаны на 8 год зняволення ў лагеры. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР 29.12.1954 г. Член СП СССР з 1934 г.

20.1.1944 г. уцёк з Паўночна-Усходняга лагера, і звестак пра яго далейшы лёс няма.

У друку выступаў з 1929 г. Аўтар кнігі падарожных нататак «Відагоршчы» (1930), зборнікаў нарысаў «Дом № 31» (1930), «За дамбаю» (1931), «Лес гарыць» (1932), аповесцей «Ганчары» (1933) і «Біяграфія майго героя» (1935).

Запісваў і даследаваў беларускі фальклор. Займаўся мастацкім перакладам з рускай, украінскай і іншых моў.

## *Валянцін ЗУБ*



Валянцін Андрэевіч Зуб нарадзіўся 9.1.1915 г. у горадзе Мінску ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння Мінскага хіміка-тэхналагічнага тэхнікума харчовай прамысловасці (1935) працаваў на хлебазаводзе ў г. Вялікі Усцюг Валагодскай вобласці, затым у Мінску ў трэсце «Галоўхлеб». У 1939 г. паступіў на сцэнарны факультэт Усесаюзнага дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі ў Маскве, які скончыў у 1943 г. У першы ваенны год быў у народным апалчэнні. Працаваў сцэнарыстам на сцэнарнай студыі ў Маскве (1943—1944), старшым рэдактарам на кінастудыі «Беларусьфільм»

(1944—1946), фельетаністам, загадчыкам аддзела рэдакцыі часопіса «Вожык» (1946—1975). Член СП СССР з 1952 г.

Памёр 11.8.1980 г.

Узнагароджаны медалямі.

Першае апавяданне надрукаваў у 1938 г. (часопіс «Полымя рэвалюцыі»). Аўтар аповесці для дзяцей «Таямнічы надпіс» (1953), зборнікаў апавяданняў «Сапернікі» (гумарыстычныя творы, 1958), «Пад вясновым сонцам» (1960), «Як Толік праславіўся» (1962), «Чорны кот» (гумарыстычныя творы, 1973). У 1985 г. выйшла кніга аповесцей і апавяданняў «Таямнічы надпіс».

Выступаў і ў галіне драматургіі. Выйшлі зборнікі п'ес «Дружная сям'я» (1955), «Злавацца не трэба» (1961, аднайменная п'еса пастаўлена ў 1960), «Аперацыя «Шафа» (1967), «П'есы» (1972), «Нарада ў загсе» (1972), «Не спяшайцеся караць» (1975), «Тыдзень вечнага кахання» (1982), «Надзейная апора» (1985), п'есы «Сябры» (1960, з Ю. Багушэвічам, пастаўлена ў 1958), «Марат Казей» (1963, пастаўлена ў 1964), «Нечаканае знаёмства» (1963, пастаўлена ў 1962), «Юнацтва рыцара» (1972, пастаўлена ў 1970), «Тыдзень вечнага кахання» (1976, пастаўлена аперэта на музыку Ю. Семянякі ў 1975), шэраг аднаактовак. Напісаў некалькі сцэнарыяў навукова-папулярных фільмаў (фільм «Фіноз» атрымаў дыплом на Міжнародным фестывалі дакументальных фільмаў у Чэхаславакіі ў 1964 г.).

---

## *Васіль* ЗУЁНАК



Васіль Васільевіч Зуёнак нарадзіўся 3.6.1935 г. у вёсцы Мачулішча Крупскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1954 г. скончыў Барысаўскае педагагічнае вучылішча і паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння універсітэта (1959) працаваў у рэдакцыі газеты «Рабочае юнацтва» (Мінск), з 1960 да 1966 г.— у газеце «Піянер Беларусі». Быў галоўным рэдактарам часопіса «Бярозка» (1972—1978). У 1966—1972 гг.— намеснік га-

лоўнага рэдактара, у 1978—1982 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Маладосць». У 1982—1989 гг.— сакратар, у 1989—1990 гг.— першы сакратар, з 1990 г.— старшыня СП Беларусі. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1966 г.

Выступае ў друку з вершамі з 1954 г. Аўтар кніжак паэзіі «Крэсіва» (1966), «Крутаяр» (1969), «Сяліба» (1973), «Нача» (1975), «Маўчанне травы» (1980), «Час вяртання» (1981), «Світальныя птушкі» (1982), «Лукам'е» (1984), «Жніўны дзень: Выбранае» (1985), «Вызначэнне» (1987), «Лета трывожных дажджоў» (1990), зборніка гумарыстычных вершаў «Качан на п'едэстале» (1973), кнігі літаратурна-крытычных артыкулаў «Лінія высокага напружання» (1983). Напісаў кніжкі нарысаў і замалёвак для дзяцей «Любіць прыроду — любіць Радзіму» (1962), «Працай славіцца чалавек» (1963) і паэтычныя зборнікі «Вясёлы калаўрот» (1965), «Жылі-былі пад вадой» (1969), «Сонечны клубочак» (1972), «Будзем сілы набірацца» (1974), «Шапка-ўсёвідзімка» (1983), «Хата, поўная гасцей» (1987).

Перакладае з рускай, украінскай, балгарскай, польскай, славацкай, сербскай і іншых моў. Разам з Р. Барадуліным пераклаў кніжку вершаў У. Лучука «Возера-Бульдозера» (1978).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1974) за кнігу вершаў «Сяліба», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1982) за паэму «Маўчанне травы».

---

## *ЗЬНІЧ*



Зьніч (Алег Андрэевіч Бембель) нарадзіўся 16.12.1939 г. у горадзе Мінску ў сям'і скульптара.

Вучыўся на энергетычным факультэце Беларускага політэхнічнага інстытута (1956—1959). Скончыў мінскае музычнае вучылішча імя М. І. Глінкі (1963) і Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А. В. Луначарскага (1969) па спецыяльнасці фартэпіяна. Працаваў выкладчыкам у музычных школах Мінска, у гарадах Глыбокім Віцебскай вобласці і Тарусе Калуж-

скай вобласці. У 1971—1974 гг.— аспірант Інстытута філасофіі і права АН БССР, у 1974—1983 і 1984—1987 гг.— навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Член СП СССР з 1989 г.

У друку з вершамі пачаў выступаць у 1979 г. Аўтар кніг паэзіі «Рэха малітвы» (Нью-Йорк, 1988), «Саната ростані» (Беласток, 1988). У Беларусі вершы друкаваліся ў калектыўным зборніку «Крыло» (1984), у «Днях паэзіі» (1982, 1983, 1984), у газетах «Літаратура і мастацтва», «Голас Радзімы», часопісах «Полымя», «Маладосць», «Беларусь», «Крыніца».

Выступае з філасофска-эстэтычнымі даследаваннямі, прысвечанымі праблемам нацыянальнага і інтэрнацыянальнага ў мастацкай культуры. Напісаў працу «Н. Г. Чернышевский и проблемы национального в духовной культуре» («Н. Г. Чернышевский и его наследие». Новасібірск, 1980). У 1985 г. у Лондане выйшла філасофска-сацыялагічнае даследаванне «Роднае слова і маральна-эстэтычны прагрэс».

# І



*Анатоль* *ІВАНОЎ*

Анатоль Васільевіч Іваноў нарадзіўся 15.11. 1914 г. у сяле Зямлянск Сямілукскага раёна Варонежскай вобласці (Расія) у сям'і каваля.

У 1932 г. скончыў аднагадовыя курсы па падрыхтоўцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы і паступіў у Варонежскі медыцынскі інстытут. Пасля заканчэння яго (1937) — ваенны ўрач. Служыў на Далёкім Усходзе. Удзельнічаў у 1938 г. у баях ля возера Хасан, а ў 1945 г.— у разгроме японскай Квантунскай арміі. З 1946 г. служыў у Беларускай ваеннай акрузе. У 1963 г. дэмабілізаваўся. Жыве ў Бабруйску. Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

У 1933 г. у інстытуцкай шматтыражцы апублікаваў першыя вершы. Піша на рускай мове. Аўтар апавяданняў, рамана «На Дальнем Востоке» (1954, апошняе перавыданне ў 1986) і аповесці «Под нами цель» (1976).

*Васіль* *ІВАШЫН*



Васіль Уладзіміравіч Івашын нарадзіўся 9.5. 1913 г. у вёсцы Ляхавічы Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1933 г. скончыў Мінскі транспартна-эканамічны тэхнікум. Адзін год працаваў тэхнікам-эканамістам Белкаапрамсавета. У 1934 г. паступіў на літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута.Пасля заканчэння інстытута (1938) выкладаў мову і літаратуру ў Віцебскім педвучылішчы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У 1946—1948 гг. выкладаў мову і літара-

туру ў Рэспубліканскай партыйнай школе пры ЦК КПБ. Скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры АН БССР (1949). Быў навуковым супрацоўнікам, а ў 1954—1967 гг. загадваў сектарам беларускай савецкай літаратуры гэтага інстытута. У 1967—1978 гг.— дырэктар навукова-даследчага Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР, з 1978 г.— старшы навуковы супрацоўнік-кансультант гэтага інстытута. Акадэмік АПН СССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

У друку з літаратурна-крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі выступае з 1949 г. Аўтар манаграфій «Янка Купала: Творчасць перыяду рэвалюцыі 1905—1907 гг.» (1953), «М. Горький и белорусская литература начала XX века» (1956), «У истоков социалистического реализма» (1963), «Да вышынь рэалізму» (1983), «Выверанае жыццём» (1988), брашур «Янка Купала — вялікі народны паэт» (1952), «Рэвалюцыя 1905—1907 гг. і развіццё беларускай літаратуры» (1955), дакладаў на Міжнародных з'ездах славістаў «Асноўныя асаблівасці развіцця сучаснай беларускай літаратуры» (з Н. Перкіным, 1958), «Роля рускай класічнай літаратуры ў развіцці рэалізму беларускай літаратуры пачатку XX ст.» (з В. Барысенкам, 1963). Сааўтар падручнікаў для 8 класа «Беларуская літаратура» (з В. Барысенкам, 1959—1978), для 9 класа «Беларуская літаратура» (з М. Лазаруком, 1979—1990), кнігі «Изучение русской литературы во взаимосвязи с белорусской» (з М. Лазаруком, А. Ленсу, 1988) і іншых прац па метадалогіі і методыцы выкладання літаратуры ў школе.

## *Анатоль ІВЕРС*



Анатоль Іверс (Іван Дарафеевіч Міско) нарадзіўся 15.5.1912 г. у вёсцы Чамяры Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

За ўдзел у рэвалюцыйна-вызваленчым руху быў выключаны з Віленскай (1928), Клецкай (1929) і Навагрудскай (1931) гімназій. Пасля ўз'яднання Беларусі працаваў літаратурным работнікам слонімскай раённай газеты «Вольная праца» (1939—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны — адзін з арганізатараў падпольнага антыфашысцкага руху, з лістапада 1943 г.— партызан брыгады імя Ракасоўскага, у сакавіку 1944 г. абраны сакратаром Слонімскага міжраённага антыфашысцкага камітэта. Выдаваў антыфашысцкую газету «Беларусь». У пасляваенныя гады працаваў у Слонімскім гарсавеце, у рэдакцыі раённай газеты «За перамогу камунізму», у лесахімічнай прамысловасці. У 1976—1984 гг.— сакратар слонімскага раённага аддзялення Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Жыве ў Слоніме. Член СП СССР з 1940 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Выступаць у друку з вершамі пачаў у 1934 г. У 1939 г. у Вільні выйшаў зборнік вершаў «Песні на загонах». Апублікаваў зборнікі паэзіі «З пройдзеных дарог» (1970), «Жыву ў бацькоўскім краі» (вершы і паэмы, 1982), «Я пайшоў бы ўслед за летам» (1987).

## *Вольга ІПАТАВА*



Вольга Міхайлаўна Іпатава нарадзілася 1.1. 1945 г. у гарадскім пасёлку Мір Карэліцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых.

Пасля смерці маці выхоўвалася ў дзіцячым доме (1956—1961). У 1961 г. скончыла ў Гродна сярэднюю школу № 7 і паступіла на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1963 г. перавялася на завочнае аддзяленне (скончыла ў 1967). Настаўнічала ў вёсцы Руба на Віцебшчыне, праца-

вала таваразнаўцам у Віцебскім абласным кнігагандлі (1964), інструктарам, загадчыкам сектара ў Гродзенскім гаркоме камсамола (1965—1968), рэдактарам на абласной студыі тэлебачання (1968—1970). У 1970—1973 гг.— літсупрацоўнік газеты «Літаратура і мастацтва», затым літкансультант газеты «Чырвоная змена». У 1975—1978 гг.— аспірантка Літаратурнага інстытута імя М. Горкага. Зноў працавала літкансультантам у «Чырвонай змене» (1978—1979). У 1985—1989 гг.— галоўны рэдактар літаратурна-драматычных перадач Беларускага тэлебачання. З 1989 г.— загадчык аддзела, з 1990 г.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Спадчына». Член СП СССР з 1970 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалём Францыска Скарыны.

Друкуецца з 1959 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Раніца» (1969), «Ліпеньскія навальніцы» (1973), «Парасткі» (1976), зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Вецер над стромай» (1977, рускае выданне, Масква, 1980, адзначана на Усесаюзным конкурсе імя М. Горкага, 1981), «Дваццаць хвілін з Немезідай» (1981), «Перакат» (1984), «За морам Хвалынскім» (1989), кніжак для дзяцей «Снягурка» (1974) і «Казка пра Паўліна» (1983). Напісала тэлеп'есу «Давыд Гарадзенскі» (пастаўлена ў 1988).

# К

## *Ала КАБАКОВІЧ*



Ала Кабаковіч (Ала Канстанцінаўна Кабаковіч-Тычына) нарадзілася 7.3.1943 г. у в. Гутава Драгічынскага р-на Брэсцкай вобл. у сялянскай сям'і.

Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1964), аддзяленне мастацкага перакладу Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве (1971). У 1964—1966 гг.— рэдактар на Беларускім радыё, у 1971—1985 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Кандыдат філалагічных навук.

Памерла 11.2.1985 г.

У друку выступіла ў 1970 г. з вершамі (часопіс «Неман»). Аўтар кніг па крытыцы і літаратуразнаўству «Паэзія Максіма Багдановіча: Дыялектыка рацыянальнага і эмацыянальнага» (1978), «Беларускі свабодны верш» (1984), «Фальклорныя і анталагічныя традыцыі ў беларускай паэзіі» (1989). Сааўтар манаграфіі «Паэзія абнаўлення свету» (з І. Шпакоўскім, Н. Шуклінай, 1981). Перакладала на рускую мову творы беларускіх паэтаў.

## *Таццяна КАБРЖЫЦКАЯ*



Таццяна Вячаславаўна Кабржыцкая нарадзілася 15.8.1941 г. у горадзе Кіеве (Украіна) у сям'і служачых.

У час Вялікай Айчыннай вайны была эвакуіравана ў Алма-Ату. У 1946 г. сям'я пераехала ў Львоў. Скончыла філалагічны факультэт Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя І. Франка (1964). Працавала завучам Вязаўскай сярэдняй школы на Львоўшчыне (1964—1966), рэдактарам выдавецтва Львоўскага уні-

версітэта (1966—1967), вучылася ў аспірантуры пры гэтым універсітэце (1967—1971). У 1971—1980 гг.— навуковы супрацоўнік навукова-даследчага Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР, з 1980 г.— дацэнт кафедры рускай савецкай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1990 г.

У друку выступае з рэцэнзіямі і літаратурнакрытычнымі артыкуламі з 1963 г. З В. Рагойшам выдала кнігі «Карані дружбы: Беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі пачатку XX ст.» (1976), «Слядамі знічкі: Пра Сяргея Палуяна» (1990) і падрыхтавала да публікацыі кнігу С. Палуяна «Лісты ў будучыню» (1989).

На ўкраінскую мову пераклала творы М. Багдановіча, У. Караткевіча, асобным выданнем выйшлі аповесці В. Быкава «У тумане», «Аблава», раман «Мёртвым не баліць» (Кіеў, 1990). З украінскай мовы пераклала кнігу для настаўнікаў Д. Тхаржэўскага і У. Гекта «Праблемнае навучанне...» (1986).

---

## *Віктар КАВАЛЕНКА*



Віктар Антонавіч Каваленка нарадзіўся 21.7. 1929 г. у вёсцы Сакаўшчына Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1948 г. скончыў Лідскае педагагічнае вучылішча. Працаваў настаўнікам Дабравольскай сямігадовай школы на Гродзеншчыне. У 1949—1953 гг. вучыўся на факультэце мовы і літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў у Свірскім раёне выкладчыкам мовы і літаратуры Сырмежскай СШ, дырэктарам Кемелішскай СШ. У 1955 г. паступіў у аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Пасля заканчэння аспірантуры (1958) — навуковы супрацоўнік, з 1982 г. дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Член-карэспандэнт АН БССР, доктар філалагічных навук. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1962 г.

Заслужаны дзеяч навукі БССР (1981).

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

У друку выступае з 1952 г. як крытык і літаратуразнавец. Выдаў кнігі «Пошукі і здзяйсненні» (1963), «Давер» (1967), «Голас чалавечнасці» (1970), «З пазіцый сучаснасці» (1975, 2-е выданне 1982), «Вытокі. Уплывы. Паскоранасць» (1975), «Прага духоўнасці» (літаратурна-крытычныя артыкулы, 1975), «Праблемы сучаснай беларускай крытыкі» (1977), «Жывое аблічча дзён» (1979), «Иван Шамякин: Очерк творчества» (Масква, 1979, на беларускай мове ў 1980), «Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры» (1981), «Общность судеб и сердец: Белорусская проза о Великой Отечественной войне в контексте русской и других литератур» (1985), «Пакліч жыцця» (1987), «Веліч праўды: Выбранае» (1989). Напісаў на VIII Міжнародны з'езд славістаў даклад «Некаторыя асаблівасці параўнальнага вывучэння славянскіх літаратур запозненага развіцця» (1973). З'яўляецца сааўтарам кнігі «Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы» (з М. Мушынскім, А. Яскевічам, 1972), адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), «Истории советской многонациональной литературы» (1974), «Истории белорусской советской литературы» (1974).

Аўтар рамана «Падвышанае неба» (1978).

Лаўрэат прэміі СП СССР (1976) за кнігу «Прага духоўнасці», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у стварэнні даследавання «История белорусской дооктябрьской литературы» і «История белорусской советской литературы».

---

## *Павел КАВАЛЁЎ*



Павел Нічыпаравіч Кавалёў нарадзіўся 18.11. 1912 г. у вёсцы Склімін Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1930 г. скончыў педагагічныя курсы і настаўнічаў у пачатковай школе ў вёсцы Пожар. З 1931 г. быў сакратаром рэдакцыі клімавіцкай, затым смалявіцкай раённых газет. У 1936 г. скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя. С. М. Кірава ў Мінску. Працаваў у газетах «Звязда» (1936—1941), «Савецкая Беларусь»

(1941—1943), у Цэнтральным штабе партызанскага руху (1943—1944), памочнікам сакратара ЦК КПБ (1944—1946). З 1946 г.— адказны сакратар праўлення СП БССР, з 1955 г.— галоўны рэдактар часопіса «Вожык», у 1967—1972 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Полымя». У 1966 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член СП СССР з 1945 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1978).

Літаратурную працу пачаў з нарысаў у 1929 г. Выйшлі нарысы «Герой Савецкага Саюза Аляксей Антоненка» (пад псеўданімам Павел Віхроў, 1943), «Герой Савецкага Саюза Уладзімір Лабанок» (1945), «Калгас імя Янкі Купалы» (1948), «Сярод людзей калгасных» (1959). Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Прага бою» (апавяданні і нарысы, 1945), «Аповесці пра добрае сэрца» (1950), «У новы дзень» (1952), «Каб шчасліва жыць» (1953), «Апавяданні» (1956), «Сонца ў вокны» (1962), «Падзенне Хвядоса Струка» (1967), «Пакінь нас, трывога» (1977), зборнікаў гумарыстычных апавяданняў «Пісьмо ў два адрасы» (1959), «Павер, кахаю...» (1969) і «Як здароўе, доктар?» (1972), а таксама аднаактовых п'ес «Подзвіг. Родная кроў» (1945).

Выдаў для дзяцей кнігі прозы «Андрэйка» (1948), «Згублены дзённік» (1954), «Сябры мае, дзеці» (1959), «Лёнька Гром» (1961), «Малы мужчына» (1966), «Чырвоны лядок» (1969), «Жыві сабе, зайчык» (1975). У 1972 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах, у 1987 г. — «Выбранае».

Выдаў брашуры «Беларуская савецкая літаратура ў пасляваенны перыяд» (1950), «Беларуская савецкая літаратура ў барацьбе за мір» (1951).

Пераклаў на беларускую мову раман А. Гуляшкі «МТ станцыя» (1955), аповесці С. Шляху «Таварыш Ваня» (1957), С. Баруздзіна «Пажарная дружына» (1982), п'есы А. Гоу і д'Юссо «Глыбокія карэнні» (1948), В. Мінко «Не называючы прозвішчаў» (1954), паасобныя апавяданні А. Чэхава, М. Горкага, А. Аверчанкі,

Г. Рykліна, В. Ардава, А. Вішні. І. Ле, Ю. Збанацкага. М. Ібрагімава, І. Шыхлы, Мірмухсіна, Х. Назіра, Б. Каюмава, А. Тодарава, А. Нэнсіна, Д. Джуравіча, І. Потрч і інш.

---

## *Дзмітрый КАВАЛЁЎ*



Дзмітрый Міхайлавіч Кавалёў нарадзіўся 17.6. 1915 г. у горадзе Ветка Гомельскай вобласці ў сям'і каваля.

У 1939 г. скончыў вячэрні рабфак у Нова-Беліцы (цяпер Нова-Беліцкі раён Гомеля), працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Раманавіцкай сярэдняй школе Гомельскага раёна і адначасова вучыўся завочна на філалагічным факультэце Ленінградскага універсітэта. У студзені 1941 г. прызваны служыць на Паўночны флот. У час Вялікай Айчыннай вайны — стралок марской пяхоты, падводнік, адказны сакратар газеты брыгады падводных лодак «Боевой курс». Пасля дэмабілізацыі (1946) дзевяць год жыў у Мінску, працаваў у рэспубліканскім друку. У 1957 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. З 1956 г. жыў пастаянна ў Маскве. Быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Смена», загадчыкам рэдакцыі рускай прозы і паэзіі выдавецтва «Молодая гвардия», выкладчыкам і кіраўніком паэтычнага семінара ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага. Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 5.3.1977 г.

Першы верш апублікаваў у 1937 г. (газета «Палеская праўда»). Пісаў на рускай мове. Выдаў у Мінску зборнікі паэзіі «Далекие берега» (1947), «Стихи» (1950), «Мы не расстаемся» (1953), «Рябиновые ночи» (1958), «Кому что дорого» (выбранае, 1982), аповесць «О мальчике Женьке из села Нижние Деревеньки» (1955). У Маскве выйшлі кнігі вершаў «Солдатские думы» (1958), «Тишина» (1958), «Студеное солнце» (1961), «Солнечная ночь» (1963), Молчание гроз» (1964), «Рожь» (1964), «Ветреный день» (1967), «Зеленый дым» (1968), «Озимь» (1968), «Тревожный мир» (1970), «Зябь» (1971), «Годы» (выбранае, 1971),

«Чуткая глубина» (1973), «Тревожная совесть» (1975), «Мечты и память» (выбранае, 1977), «Мое время» (выбранае, 1977), «Лирика» (1979), «Дороги жизни и любви» (выбранае, 1985). У Мурманску выйшаў зборнік вершаў «Море, море!..» (выбранае, 1976). Выйшла кніга крытыкі і публіцыстыкі «Наедине с жизнью» (Масква, 1979).

Пераклаў на рускую мову зборнікі паэзіі Н. Гілевіча «Песню бярыце з сабою» (1959), А. Лойкі «Мая планета» (1971), М. Сурначова «Адна любоў» (1971), А. Грачанікава «Зоркі і курганы» (1976), С. Данілава і С. Джуры, раман І. Мележа «Подых навальніцы» (1967), кнігі прозы Я. Брыля «Жменя сонечных промняў» (1968), «Акраец хлеба» (1977), дакументальную кнігу А. Адамовіча, Я. Брыля і У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...» (1977), паасобныя вершы беларускіх паэтаў.

---

## *Сяргей КАВАЛЁЎ*



Сяргей Валер'евіч Кавалёў нарадзіўся 20.6. 1963 г. у горадзе Магілёве ў сям'і рабочых.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1985), аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры універсітэта (1988). З 1988 г. там жа выкладае гісторыю старажытнабеларускай літаратуры. Член СП СССР з 1989 г.

У друку выступае з 1980 г. як крытык, паэт, аўтар твораў для дзяцей. У 1988 г. выдаў падборку вершаў «Шыпшына» ў калектыўным зборніку «Лагодны промень раніцы», кнігу казак «Мэва». Аўтар кнігі пра маладую беларускую паэзію 80-х гг. «Як пакахаць ружу» (1989).

У 1989 г. на Беларускім тэлебачанні пастаўлена п'еса «Падарожжа з Драўляным Рыцарам».

*Васіль КАВАЛЬ*



Васіль Пятровіч Каваль (Кавалёў) нарадзіўся 17.8.1907 г. у вёсцы Сава Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1925 г. вучыўся на агульнаадукацыйных курсах пры Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі і восенню паступіў у Магілёўскі педагагічны тэхнікум, але неўзабаве вярнуўся ў родную вёску. Вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1926—1927, 1928—1929). Працаваў у рэдакцыі часопіса «Маладняк». Службу ў Чырвонай Арміі праходзіў як ваенны журналіст у Смаленску. У 1936 г. рэпрэсіраваны. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

У друку пачаў выступаць у 1926 г. з вершамі і апавяданнямі. Выйшлі зборнікі апавяданняў «Як вясну гукалі» (1927), «На загонах» (1928), «Крыніца» (1929), Выбраныя творы (1932) і «Выбранае» (1959), а таксама аповесці для дзяцей «Санька-сігналіст» (1936) і «Следапыты» (1961).

*Уладзімір КАВАЛЬСКІ*



Уладзімір Антонавіч Кавальскі нарадзіўся 21.10. 1912 г. у сяле Варонеж Карукаўскага раёна Чарнігаўскай вобласці (Украіна) у сям'і служачага.

Пасля смерці бацькі (1925) працаваў на цукровым заводзе, у фасфарытных шахтах (Ярмолінскі раён), кур'ерам у банку (г. Хмяльніцкі), сакратаром сельсавета (вёска Зарэчча Праскураўскага раёна). У 1929—1930 гг. вучыўся ў польскай тэатральнай студыі ў Кіеве. З 1930 г.— загадчык польскага сектара Камітэта радыёвяшчання пры Саўнаркоме БССР. Адзін з арганізатараў і кіраўнік польскай секцыі СП БССР. У лістападзе 1937 г. рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны 18.9.1979 г. ваенным трыбуналам Беларускай ваеннай акругі. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 28.12.1937 г.

З першымі публікацыямі выступіў у 1929 г. у газеце «Орка» («Ворыва»). Пісаў на польскай мове. Друкаваўся ў цэнтральных польскіх газетах СССР і ў часопісе «Культурная Масква». Аўтар зборнікаў «Паэзія» (1934), «Дзве паэмы» (1934), «Дарога на Поўнач» (1935), «Вершы пра Грузію» (1936).

Напісаў п'есы «Штурм чарнаводаў» (пастаўлена ў польскім тэатры ў Кіеве, 1931), «Сям'я Варанцовых» (рыхтавалася да пастаноўкі ў польскім тэатры ў Мінску, 1935).

---

## *Міхась КАВЫЛЬ*



Міхась Кавыль (Язэп Казіміравіч Лешчанка) нарадзіўся 1.11.1915 г. у вёсцы Покаршаў Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Грэскую сямігодку. Вучыўся на пазашкольным аддзяленні Беларускага педагагічнага тэхнікума ў Мінску (1930—1933). Быў членам «Маладняка». 23.2.1933 г. арыштаваны і асуджаны на 3 гады няволі. Адбываў пакаранне на Далёкім Усходзе (чацвёртае аддзяленне Дальлага). У канцы кастрычніка 1935 г. датэрмінова вызвалены «за ўдарную працу і добрыя паводзіны». Жыў у Варонежы (1935—1938), вучыўся ў педагагічным інстытуце на літаратурным факультэце (1936—1938), працаваў настаўнікам у пасёлку Ваўчок Варонежскай вобласці (1938—1941). З першых дзён вайны — на фронце. Ваяваў на Украіне, у маі 1942 г. трапіў у акружэнне. З 1944 г.— у Германіі. У 1950 г. выехаў у ЗША, дзе жыве і цяпер.

Першы верш апублікаваў у 1929 г. (газета «Беларуская вёска»). Друкаваўся ў «Піянеры Беларусі», у дадатку да бабруйскага «Камуніста» — «Вясне», у часопісе «Маладняк». У эміграцыі выдаў зборнікі паэзіі «Ростань» (Рэгенсбург, 1947), «Пад зоркамі белымі» (Нью-Йорк, 1954), «Першая рана» (Манчэстэр, 1960), «Цяжкія думы» (ЗША, 1961), «Міжагнёўе» (Нью-Йорк, 1990).

Перакладае творы рускіх, украінскіх, англійскіх, польскіх паэтаў на беларускую мову.

## *Сара КАГАН*



Сара Рувімаўна Каган нарадзілася 3.7.1885 г. у вёсцы Максімавічы Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і служачага.

Загадвала гарадской бібліятэкай у Бабруйску. У 1935 г. пераехала ў Мінск, дзе працавала ў бібліятэчным калектары, вучылася на вячэрнім аддзяленні філалагічнага факультэта педагагічнага інстытута.

Загінула ў 1941 г. у мінскім гета.

Першыя вершы апублікавала ў газеце «Акцябэр». Сістэматычна стала выступаць у друку з 1929 г. Пісала на мове ідыш. Аўтар кніг паэзіі «У дарозе» (1934), «Мая радзіма» (вершы і паэмы, 1938), «Нашы людзі» (1940), прозы «Першая прэмія» (1938), «Скрыпач» (аповесць, 1941). У перакладзе З. Бядулі на беларускай мове выйшлі «Апавяданні» (1940).

## *Эля КАГАН*



Эля Шоламавіч Каган нарадзіўся 10.2.1909 г. у горадзе Мінску ў сям'і настаўніка.

Вучыўся ў прафтэхшколе абутнікоў. У 1936—1939 гг. працаваў у рэдакцыі яўрэйскага часопіса «Штэрн» («Зорка»). У гады Вялікай Айчыннай вайны — супрацоўнік франтавога друку.

Загінуў 22.6.1944 г. на фронце.

У друку выступіў з першым апавяданнем у 1926 г. Пісаў на мове ідыш. Празаічныя творы ўвайшлі ў зборнікі «Апавяданні і мініяцюры» (1932), «Горад без цэркваў» (1935), «Дзіцячыя апавяданні» (1936). У 1932 г. выдаў зборнік «Вершы». У 1940 г. у перакладзе на беларускую мову выйшла асобным выданнем апавяданне для дзяцей «Дружная сямейка», у 1979 г.— зборнік апавяданняў «Маем зялёным».

Аўтар п'есы «Роднае поле» (1932). Разам з З. Аксельродам зрабіў інсцэніроўку «Маленькі чалавечак» па матывах твораў М. Мойхер-Сфорыма (пастаўлена ў 1938).

Перакладаў творы А. Пушкіна, М. Гогаля, Э. Самуйлёнка і інш.

*Алесь* КАЖАДУБ



Алесь (Аляксандр Канстанцінавіч) Кажадуб нарадзіўся 27.9.1952 г. у горадзе Ганцавічы Брэсцкай вобласці ў сям'і служачых.

У 1969—1974 гг. вучыўся на аддзяленні рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння настаўнічаў у вёсцы Крайск Лагойскага раёна. У 1975—1977 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР, у 1977—1981 гг.— рэдактар літаратурна-драматычных праграм рэспубліканскага тэлебачання, з 1981 па 1983 гг.— літсупрацоўнік аддзела публіцыстыкі часопіса «Маладосць». У 1985 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. З 1990 г. жыве ў Маскве. Член СП СССР з 1981 г.

Першае апавяданне апублікаваў у 1976 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Гарадок» (1980), «Размова» (1985), «Лесавік» (1987), «Дарога на замчышча» (1990).

*Барыс* КАЗАНАЎ



Барыс Казанаў (Барыс Міхайлавіч Лапіцкі) нарадзіўся 26.12.1938 г. у вёсцы Расна Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і музыканта.

У гады Вялікай Айчыннай вайны выхоўваўся ў міяскім дзіцячым доме на Урале. У 1946 г. вярнуўся на радзіму. Скончыў філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1962). З 1964 г. жыве ў Мінску. Працаваў спецыяльным карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва», на Беларускім радыё (1964—1966), старшым рэдактарам на Беларускім тэлебачанні (1968—1971). Працаваў на Далёкім Усходзе на зверабойных, рыбалоўных, вадалазных, навуковых суднах (1962—1964, 1966—1968, 1971), стаў прафесійным мараком. З 1982 г. працуе на суднах замежплавання Ціхаакіянскага ўпраўлення прамысловай разведкі навуковага флоту. Член СП СССР з 1987 г.

З 1962 г. пачынае выступаць у рэспубліканскім і саюзным друку. Піша на рускай мове. Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Прописан в Тихом океане» (1966), «Антоновские яблоки» (1968), «Осень на Шантарских островах» (Масква, 1972), «Лунный корабль» (Уладзівасток, 1990), рамана «Полынья» (Масква, 1984).

Па сцэнарыях пісьменніка знята дванаццаць дакументальных і тэлевізійных фільмаў. Дакументальны фільм «Паляванне са старым сабакам» атрымаў прыз «Сярэбраны алень» на Міжнародным кінафестывалі ў Венецыі (1968), тэлефільм «Прыцяжэнне вады» стаў лаўрэатам Міжнароднага фестывалю «Чалавек і мора» ў Юрмале (1985). Напісаў сцэнарый мастацкага тэлефільма «Прызыўнікі» (пастаўлены ў 1987).

---

## *Уладзімір* КАЗБЯРУК



Уладзімір Міхайлавіч Казбярук нарадзіўся 29.8.1923 г. у вёсцы Бандары Беластоцкага ваяводства (цяпер Польшча) у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1949) працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Любчанскай сярэдняй школе, а ў 1951—1952 гг.— выкладчыкам рускай мовы і літаратуры Нягневіцкай сярэдняй школы Навагрудскага раёна. Вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага (1952—1955), працаваў выкладчыкам Полацкага педагагічнага інстытута. У 1959—1964 гг.— вучоны сакратар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, з 1964 г.— навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1977 г.

Узнагароджаны медалямі.

У друку выступае з рэцэнзіямі і крытычнымі артыкуламі з 1954 г. Аўтар манаграфій «Якуб Колас у школе» (1967 і 1975), «Ступені росту» (1974), «Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» (1979), «Рамантычны пошук» (1983), нарыса «Якуб Колас (жыццё і творчасць)» (1962), дакладаў на VII Міжнародны з'езд славістаў «Традыцыі польскага рамантызму ў беларускай

літаратуры пачатку XX ст.» (1972) і на IX Міжнародны з'езд славістаў «Славянскія літаратуры і праблемы беларускага параўнальнага літаратуразнаўства (дакастрычніцкі перыяд)» (1982). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), кнігі «Старонкі літаратурных сувязей» (1970).

Для беларуска-польскага зборніка «Малыя героі вялікай вайны» (Мінск — Лодзь, 1986) пераклаў успаміны маладых польскіх удзельнікаў другой сусветнай вайны. Пераклаў «Клад» З. Бядулі (на рускую мову, 1986), «Хітры мангуст» (ангольскія казкі, 1987), «Комбле» (грузінскія казкі, 1990), паасобныя казкі і апавяданні пісьменнікаў народаў СССР.

Для серыі «Школьная бібліятэка» падрыхтаваў (склаў і напісаў уступныя артыкулы) зборнікі «Беларуская літаратура XIX — пачатку XX стагоддзя» (1977), «Вытокі» (1988), «На ўсходзе сонца» (1990), кнігі Я. Коласа «На прасторах жыцця» (1986), «Голас зямлі» (1988), Я. Купалы «Спадчына» (1988).

---

## *Янка* КАЗЕКА



Янка (Іван Дарафеевіч) Казека нарадзіўся 31.8.1915 г. у вёсцы Кострычы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

З верасня 1931 г. працаваў на Бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце, у 1933—1934 гг.— у рэдакцыі шматтыражнай газеты «За ўдарныя тэмпы». Адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні лесатэхнікума. У 1938 г. скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Дукорскай сярэдняй школе Пухавіцкага раёна. У 1939—1954 гг. служыў у Савецкай Арміі. У час Вялікай Айчыннай вайны — армейскі палітработнік. Пад Ельняй, у 1941 г., быў паранены. Пасля вайны працаваў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1954—1957), галоўным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР (з 1963 — «Беларусь», 1957—1967). З 1967 г.— загадчык рэдакцыі народнай асветы і друку, з 1969 па 1979 гг.— намеснік галоўнага рэдактара, з 1980 г.— стар-

шы навуковы рэдактар выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя П. Броўкі. Член СП СССР з 1954 г.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1975).

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

З рэцэнзіямі і артыкуламі пра беларускую прозу ў друку выступіў упершыню ў 1935 г. Напісаў зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў і літаратуразнаўчых прац «З невычэрпных крыніц» (1958), «Беларуская байка» (1960), «Натхненне і майстэрства» (1963), «Кандрат Крапіва» (1965), «Няходжанай дарогай» (1973), «Голас часу» (1975), «Кузьма Чорны: Старонкі творчасці» (1980), «Гартаванне слова: Выбранае» (1985).

Склаў і падрыхтаваў да друку кнігі аўтабіяграфічных матэрыялаў беларускіх пісьменнікаў «Пяцьдзесят чатыры дарогі» (1963), «Пра час і пра сябе» (1966), «Вытокі песні» (1973).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за ўдзел у выданні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

---

## *Анатоль КАЗЛОВІЧ*



Анатоль Мікалаевіч Казловіч нарадзіўся 16.9. 1946 г. у вёсцы Горск Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Малецкай сярэдняй школы Бярозаўскага раёна (1964) працаваў памочнікам экскаватаршчыка ў Сігневіцкім будаўнічамантажным упраўленні меліярацыі. Каля года працаваў фотакарэспандэнтам бярозаўскай раённай газеты «Маяк камунізма». Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1969). Служыў у Савецкай Арміі (1969—1971). Працаваў у рэспубліканскай «Сельской газете» карэспандэнтам, рэдактарам аддзела нарыса і публіцыстыкі часопіса «Неман». З 1977 г.— загадчык карэспандэнцкага пункта «Литературной газеты» ў БССР. Член СП СССР з 1981 г.

Дэбютаваў у рэспубліканскім друку ў 1964 г. вершамі. Піша на рускай і беларускай мовах.

Аўтар зборнікаў нарысаў «Дыханне» (1977), «Что открывает «колумбик». Цеховые будни» (1977), «Пора идти» (1979), «Красный остров» (Масква, 1988), кніг дакументальных аповесцей «Далеко впереди» (1981), «Дитя мое золотое» (1984), «Трудно любить» (1985), «Рассвет» (1986), «На моей ладони линия реки» (1987), «Место под солнцем» (1988), «Собственный корреспондент» (1989). Аўтар літаратурных сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Зачем нужны контролеры» (1979), «Испекли мы каравай» (1980), «Взлететь бы!» (1990).

---

## *Віктар* КАЗЛОЎСКІ



Віктар (Вінцэсь Іванавіч) Казлоўскі нарадзіўся 6.9.1905 г. у вёсцы Мрочкі Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум, а ў 1931 г.— літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне БДУ. Працаваў у рэдакцыях газет і часопісаў, Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Да вясны 1945 г.— карэспандэнт газеты «Звязза». З-за хваробы пераехаў у вёску.

Памёр 24.2.1975 г.

Упершыню выступіў з вершамі ў друку ў 1925 г. (газета «Савецкая Беларусь»). Выдаў у 1932 г. зборнікі вершаў «Слова аб юнай краіне», «Музыка працы» і паэму «Рахіль».

Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы М. Асеева, М. Ісакоўскага, І. Уткіна.

---

## *Леанід* КАЗЫРА



Леанід Аляксеевіч Казыра нарадзіўся 12.9.1949 г. у вёсцы Негрымава Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1966) працаваў слесарам-мантажнікам Навагрудскага раённага аб'яднання «Сельгастэхніка». Скончыў перакладчыцкі факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў (1972). Працаваў рэферэнтам-перакладчыкам з французскай і англійскай моў у навуковых

установах Мінска і Масквы, служыў у Савецкай Арміі (1976—1977), быў перакладчыкам бюро «Загрантэхдапамога» пры Мінскім электратэхнічным заводзе (1977—1978). З красавіка 1978 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Член СП СССР з 1986 г.

Узнагароджаны медалём.

У друку выступае з артыкуламі і рэцэнзіямі па пытаннях мастацкага перакладу і літаратурных узаемасувязей з 1979 г. Аўтар кнігі «Беларуская савецкая літаратура за мяжой» (з Г. Адамовіч, У. Сакалоўскім, І. Чаротам, 1988).

Перакладае з французскай, англійскай, польскай і рускай моў. У яго перакладзе на беларускую мову выйшлі раманы Ф. Марыяка «Тэрэза Дэскейру» і «Клубок гадзюк» (1985), а таксама апавяданні і навелы А. Вюрмсэра, М. Друона, В. Кандрацьева, Б. Клавэля, А. Маруа, Ф. Саган, М. Эме і інш.

---

## *Віктар КАЗЬКО*



Віктар Апанасавіч Казько нарадзіўся 23.4.1940 г. у горадзе Калінкавічы Гомельскай вобласці ў сям'і рабочага.

Выхоўваўся ў вільчанскім і хойніцкім дзіцячых дамах на Палессі. Пасля заканчэння васьмі класаў (1956) паехаў у Кузбас, дзе паступіў вучыцца ў горнапрамысловае вучылішча. Скончыў Кемераўскі індустрыяльны горны тэхнікум (1962). Працаваў на шахце, у геолагаразведцы праходчыкам (Кемераўская вобласць). З 1962 г. на журналісцкай рабоце — загадчык аддзела прамысловасці таштагольскай гарадской газеты «Красная Шория» (Кемераўская вобласць), карэспандэнт абласнога радыё, літсупрацоўнік абласной газеты «Комсомолец Кузбасса». У 1970 г. скончыў завочна Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. З 1971 г. жыве ў Мінску. Быў літсупрацоўнікам газет «Чырвоная змена», «Советская Белоруссия», у 1973—1976 гг.— літсупрацоўнік аддзела прозы часопіса «Неман». У 1986—1988 гг.— сакратар праўлення СП БССР. У 1986 г. у складзе

дэлегацыі Беларускай ССР удзельнічаў у рабоце XL сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1973 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Друкуецца з 1962 г.

Першыя апавяданні ў друку Беларусі апублікаваў у 1971 г. Спачатку пісаў на рускай, затым на беларускай мове. Выдаў аповесці «Високосный год» (1974), «Здравствуй и прощай» (Масква, 1976), «Две повести» (1977), «Суд у Слабадзе» (аповесць і апавяданні, 1978), раманы «Неруш» (1983), «Хроніка дзетдомаўскага сада» (1987).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола (1977) за кнігу «Здравствуй и прощай», Дзяржаўнай прэміі БССР за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей (1982) — за аповесць «Суд у Слабадзе».

---

## *Міхась* КАЛАЧЫНСКІ



Міхась (Міхаіл Іванавіч) Калачынскі нарадзіўся 12.1.1917 г. у гарадскім пасёлку Крупкі Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1934 г. скончыў Крупскую сярэднюю школу і пачаў працаваць у мястэчку Бобр старшым піянерважатым, потым літработнікам у крупскай раённай газеце «Камуністычны шлях». Скончыў курсы пры Камуністычным інстытуце журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску (1936), у 1937—1938 гг. быў адказным сакратаром рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». У 1938—1953 гг.— у Савецкай Арміі. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг., у Вялікую Айчынную вайну — армейскі журналіст на Закаўказскім, Стэпавым, 2-м і 3-м Украінскіх франтах. У пасляваенныя гады працаваў спецкарэспандэнтам акруговай ваеннай газеты «Защитник Родины» (Адэса, 1945—1947), літаратурным сакратаром газеты Беларускай ваеннай акругі «Во славу Родины» (Мінск, 1947—1953). Пасля дэмабілізацыі прызначаны галоўным рэдактарам альманаха «Советская Отчизна». З 1954 г.— адказны сакратар, а з 1958 г.— намеснік старшыні праўлення

СП БССР. У 1960—1978 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Беларусь». У складзе дэлегацыі БССР у 1971 г. удзельнічаў у рабоце XXVI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член СП СССР з 1940 г.

Памёр 10.8.1990 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені і «Знак Пашаны», медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1974).

Першы верш апублікаваў у 1932 г. (часопіс «Іскры Ільіча»). У даваенны час выдаў паэмы для дзяцей «Косця-чэкіст» (1938) і «Пакет» (1940). Рукапіс зборніка вершаў «На Выбаргскай дарозе» згарэў у час вайны ў Мінску. Пасля вайны выйшлі зборнікі паэзіі «Сонца ў блакіце» (1949), «У вялікім паходзе» (1952), «Прыпар» (1956), «Сосны і дзюны» (1960), «Гронка рабіны» (выбранае, 1964), «Паясы» (1968), «За палямі, за лясамі» (1969), «Докшыцкі каравай» (1974), «Кніга дружбы» (1975), «Суквецце» (выбранае, 1977), «Ля берагоў запаветных» (1983). Аўтар кніжак паэзіі для дзяцей «Насустрач жыццю» (1951), «На лясным паўстанку» (1955), «Прыгоды Патапкі» (1958), «Лясныя казкі» (1967), «Мая мазаіка» (1971), «Рэха зямлі» (1978), «Снежная казка» (паэма, 1986). У 1971 г. і ў 1982 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах. Шэраг вершаў пакладзены на музыку.

Перакладаў творы рускіх, украінскіх, літоўскіх, балгарскіх і мангольскіх паэтаў.

---



## *Іван* КАЛЕСНІК

Іван Іванавіч Калеснік нарадзіўся 9.10.1932 г. у вёсцы Грычына Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1954 г. скончыў Мінскае педагагічнае вучылішча імя Н. К. Крупскай. Працаваў загадчыкам аддзела газеты «Чырвоная змена» (1954—1961), адначасова завочна вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1954—1958). Быў літсупрацоўнікам часопіса «Бярозка»

(1962—1963), старшым рэдактарам на Беларускім радыё (1963—1965, 1967—1968), літсупрацоўнікам часопіса «Маладосць» (1968—1972). У 1967 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. У 1972—1979 гг.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1962 г.

Памёр 10.6.1979 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1951 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборнікаў вершаў «Белыя каштаны» (1959), «Пяць сузор'яў» (1963), «Калі разам мы» (1967), «Інтэрнат» (1971), «Юнацтва» (1975), «Падарожнае» (вершы, пераклады, 1982).

Перакладаў творы А. Суркова, М. Ціханава, М. Рыльскага, М. Нагнібеды, З. Нуры, М. Ханінава і іншых паэтаў.

---

## *Уладзімір КАЛЕСНІК*



Уладзімір Андрэевіч Калеснік нарадзіўся 17.9. 1922 г. у вёсцы Сіняўская Слабада Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1936 г. паступіў у польскую Навагрудскую гімназію. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі працягваў вучобу ў Навагрудскім педагагічным вучылішчы. З ліпеня 1941 г. прымаў удзел у стварэнні падпольных антыфашысцкіх арганізацый і баявых дружын у верхнім Надняммонні. Летам 1942 г. у складзе адной з баявых дружын уступіў у партызанскі атрад імя Чапаева. Дыверсійная група, у якой быў мінёрам, стала заснавальніцай новага атрада «Камсамольскі». З восені 1942 г. камандаваў узводам, праз год стаў начальнікам штаба атрада «2-гі Камсамольскі» брыгады «Камсамолец» Баранавіцкага злучэння. У 1943 г. Мірскім падпольным райкомам быў прыняты кандыдатам у члены КП(б)Б. Скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1949), аспірантуру пры гэтым інстытуце (1952). З 1952 г.— загадчык кафедры літаратуры Бабруйскага настаўніцкага інстытута, з 1956 г.— загадчык кафедры беларускай літаратуры Брэсцкага педагагічнага інстытута, узначальваў Брэсцкае абласное літаратурнае аб'яд-

нанне (1956—1970), быў сакратаром аддзялення СП БССР (1981—1983). Кандыдат філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, «Знак Пашаны», Дружбы народаў, медалямі.

Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларускай ССР (1979).

У друку з літаратурна-крытычнымі, літаратуразнаўчымі і дакументальнымі творамі выступае з 1953 г. Выдаў кнігі «Паэзія змагання: Максім Танк і заходнебеларуская літаратура» (1959), «Час і песні» (1962), «Зорны спеў» (1975), «Ветразі Адысея: Уладзімір Жылка і рамантычная традыцыя ў беларускай паэзіі» (1977), «Максім Танк: Нарыс жыцця і творчасці» (1981), «Лёсам пазнанае: Выбраныя літаратурныя партрэты» (1982), «Тварэнне легенды» (1987), «Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці» (1990). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964), «Истории советской многонациональной литературы» (1971), «Истории белорусской советской литературы» (1977), а таксама вучэбных дапаможнікаў і падручнікаў для педінстытутаў і універсітэтаў. Напісаў дакументальныя творы «Аповесць пра Таўлая» (часопіс «Полымя», 1964—1965), «Пасланец Праметэя» (1984), сумесна з А. Адамовічам і Я. Брылём кнігу «Я з вогненнай вёскі...» (1975). Склаў зборнікі паэзіі Заходняй Беларусі «Сцягі і паходні» (1965) і «Ростані волі» (1990).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у напісанні двухтомнай «Истории белорусской дооктябрьской литературы» і «Истории белорусской советской литературы».

## *Мікалай* КАЛІНКОВІЧ



Мікалай Калінковіч (Мікалай Мікалаевіч Калянковіч) нарадзіўся 15.1.1951 г. у вёсцы Цна Лунінецкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння Лунінецкай сярэдняй школы № 2 (1968) кароткі час выкладаў нямецкую мову ў Гаўрыльчыцкай васьмігадовай школе Салігорскага раёна. З кастрычніка 1968 г.— літсупрацоўнік лунінецкай раённай газеты «Ленінскі шлях». У 1969—1971 гг. служыў у Савецкай Арміі. Пасля заканчэння факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1976) — карэспандэнт аддзела ідэалогіі брэсцкай абласной газеты «Заря», у 1976—1978 гг.— намеснік рэдактара лунінецкай раённай газеты. У 1978 г. прызваны на тэрміновую афіцэрскую службу. Служыў у Мінску, Ашхабадзе, Маскве, у Грузіі. У 1984—1987 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Вышэйшай школе КДБ СССР. Кандыдат гістарычных навук. Член СП СССР з 1984 г.

Узнагароджаны медалямі.

24.7.1990 г. загінуў пры выкананні службовых абавязкаў у Грузіі.

Упершыню выступіў у друку ў 1968 г. (лунінецкая раённая газета). Пісаў на беларускай і рускай мовах. Аўтар гісторыка-дакументальнага нарыса «Лунинец» (1981, 1989), кніг дакументальных аповесцей, апавяданняў, нарысаў «Не обрывается земная связь» (Ашхабад, 1982). «Имя мое — Свобода» (Ашхабад, 1984), «Палескія дні Аляксандра Блока» (1985), «Возвращение рассветной рани» (Ашхабад, 1987), «Не должен неизвестным быть солдат» (Ашхабад, 1987), адзін з аўтараў кнігі «На рубежах тайной войны» (Ашхабад, 1985).

На Туркменскім радыё пастаўлены п'есы «Ліпенскае зарыва» (1982), «Камісар Закаспія» (1985).

## *Клаўдзія* КАЛІНА



Клаўдзія Канстанцінаўна Каліна (Лукашэвіч) нарадзілася 1.11.1925 г. у вёсцы Блювінічы Брэсцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і настаўніка.

Скончыла Брэсцкае музычнае вучылішча (1953). Працавала настаўніцай спеваў у школах Брэста, Кобрына, Віцебска, а ў 1960—1977 гг.— Мінска. Член СП СССР з 1975 г.

Першыя апавяданні і казкі пачала друкаваць у дзіцячых часопісах у 1962 г. Аўтар аповесцей, апавяданняў і казак для дзяцей «Хлопчык-пакідайчык» (1969), «Забароненая песня» (1972), «Каляровыя месяцы» (1975), «Маці і сын» (1977), «Світанак» (1983), «Бабуля Насця, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля» (1985), «Крылаты конь» (1989).

## *Леанід* КАЛОДЗЕЖНЫ



Леанід Трафімавіч Калодзежны нарадзіўся 28.2.1935 г. у вёсцы Солаўе Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Віцебскім мастацка-графічным педвучылішчы (1951—1953), служыў у Савецкай Арміі (1954—1957). У 1958—1960 гг.— супрацоўнік аршанскай раённай газеты «Ленінскі прызыў», з 1961 г.— мастак-афарміцель на Аршанскім ільнокамбінаце. Член СП СССР з 1977 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1958 г. (літаратурна-мастацкі альманах «Дзвіна»), у 1967 г. газета «Літаратура і мастацтва» апублікавала падборку апавяданняў. Аўтар кніг апавяданняў «Аўсяны звон» (1975) і «Бярозы ў жыце» (1981).

## *Лукаш* КАЛЮГА



Лукаш Калюга (Канстанцін Пятровіч Вашына) нарадзіўся 27.9.1909 г. у вёсцы Скварцы Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1931 г. скончыў Беларускі педагагічны тэхнікум. Працаваў стыльрэдактарам у навукова-даследчым Інстытуце прамысловасці ВСНГ, на Беларускім радыё. Уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Узвышша». У студзені 1933 г. рэпрэсіраваны, асуджаны на 5 гадоў пазбаўлення волі. Тэрмін адбываў у Ірбіце Свярдлоўскай вобласці. Паўторна арыштаваны 2.10.1937 г. Рэабілітаваны 24.8.1956 г. Вярхоўным судом БССР, па справе другога арышту — 22.12.1965 г. Чэлябінскім абласным судом.

Расстраляны 2.10.1937 г.

Першыя апавяданні надрукаваў у 1927 г. (часопіс «Чырвоны сейбіт»). У 1928 г. часопіс «Узвышша» змясціў аповесць «Ні госць, ні гаспадар», у 1929 г.— шэраг апавяданняў. У часопісе «Полымя» за 1931 г. была надрукавана першая частка аповесці «Нядоля Заблоцкіх» — «Прыгоды і летуценні». У 1974 г. выйшаў зборнік апавяданняў і аповесцей «Ні госць, ні гаспадар». Падборку апавяданняў змясціў часопіс «Полымя» ў 1988 г.

Пераклаў аповесць П. Панча «Блакітныя эшалоны» (з К. Чорным, 1930), раман Ю. Алешы «Зайздрасць» (1931), раман Я. Гашака «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка» (ч. 4, 1932).

## *Алесь* КАМАРОЎСКІ



Алесь (Аляксандр Адамавіч) Камароўскі нарадзіўся 1.3.1947 г. у вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

Скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1970). Служыў у Савецкай Арміі камандзірам узвода (1970—1971). Быў загадчыкам аддзела Мінскай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна (1971—1973),

навуковым супрацоўнікам Літаратурнага музея Якуба Коласа (1973—1976), працаваў загадчыкам аддзела ў Рэспубліканскім праўленні аматараў кнігі БССР (1976—1979), на Беларускім тэлебачанні (1979—1990). З 1990 г.— загадчык аддзела крытыкі і мастацтва часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1988 г.

З вершамі ўпершыню ў друку выступіў у 1961 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар кніг «Пачатак» (1975), «Зямля маіх надзей» (вершы і паэмы, 1988), аповесцей для дзяцей «Адкрытая тайна» (1979) і «Заварожаны мяч» (1989).

---

## *Казімір* КАМЕЙША



Казімір Вікенцьевіч Камейша нарадзіўся 4.12. 1943 г. у вёсцы Малыя Навікі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў завочнае беларускае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1970). Служыў у Савецкай Арміі (1963—1966), быў літсупрацоўнікам валожынскай раённай газеты «Працоўная слава» (1967—1968). З 1968 г.— старшы рэдактар на Беларускім радыё, у 1979—1981 гг. працаваў у часопісе «Полымя», з 1981 — у часопісе «Вясёлка». З 1988 г.— рэдактар аддзела паэзіі ў часопісе «Маладосць». Член СП СССР з 1971 г.

У рэспубліканскім друку выступіў з вершамі ў 1961 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Восеньскія позвы» (1969), «Мембрана» (1972), «Нектар» (1974), «Тут мае вёсны прычалены» (вершы і паэмы, 1977), «Сябрына» (1978), «Плёс» (1982), «Галоўная вярста» (вершы і паэма, 1985), «Пярэймы дня» (вершы і паэмы, 1988).

Выдаў кнігі паэзіі для дзяцей «Гаёўка» (1975), «Буслянка» (1985), «Дзятлава кузня» (1987), «Добры дзень, шафёр» (1988) і кнігу прозы «Духмянае дзіва» (1984).

Перакладаў творы рускіх, украінскіх і славацкіх пісьменнікаў на беларускую мову.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова (1989) за зборнік паэзіі «Пярэймы дня».

## *Гірш* КАМЯНЕЦКІ



Гірш Мордухавіч Камянецкі нарадзіўся 15.12. 1895 г. у вёсцы Чарняўка Крупскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

Вучыўся ў хедэры, ешыбоце (яўрэйскія духоўныя школы). Працаваў цырульнікам у Барысаве (1916—1919, 1921—1928). Служыў у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у грамадзянскай вайне (1919—1921). Вучыўся на літаратурным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1928—1930). У 1937—1941 гг.— адказны сакратар яўрэйскай секцыі СП БССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны працаваў у Бугуруслане. Быў рэдактарам мастацкай літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве БССР (1948—1949). У 1950 г. рэпрэсіраваны. Адбываў тэрмін у лагерах Іркуцкай вобласці да 1956 г. Вярнуўся адтуль інвалідам. Рэабілітаваны ў 1956 г. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 25.4.1957 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1924 г.

Пісаў на мове ідыш. Аўтар зборнікаў вершаў «Простай дарогай» (1934), «Заказ на маладосць» (1940), «Мацней за жалеза» (1948), «Вершы» (1948). У 1960 г. у перакладзе на беларускую мову выйшлі «Выбраныя вершы».

## *Ала* КАНАПЕЛЬКА



Ала Іванаўна Канапелька нарадзілася 14.2. 1960 г. у вёсцы Небытаў Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1978 г. скончыла Лоеўскае педагагічнае вучылішча і паступіла на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння універсітэта (1983) працавала метадыстам, з 1988 г.— загадчыкам сектара метадычнай працы Дома літаратара СП БССР. З 1990 г.— загадчык арганізацыйна-прапагандысцкага аддзела Беларускага фонду культуры. Член СП СССР з 1985 г.

Першыя вершы апублікавала ў 1974 г. (хойніцкая раённая газета «Ленінскі сцяг»), у рэспубліканскім друку выступіла ў 1977 г. (часопіс

«Маладосць»). У 1985 г. выйшаў зборнік вершаў «Цвет алешыны».

Перакладала творы ўкраінскіх, курдскіх, малдаўскіх, балгарскіх паэтаў.

---

## *Уладзімір* КАНДРАЦЕНЯ



Уладзімір Ігнатавіч Кандраценя нарадзіўся ў сакавіку 1917 г. у вёсцы Смалічы Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1935 г. скончыў рабфак у Бабруйску, у 1939 г.— літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, быў накіраваны настаўнікам у Чырвонаслабадскую сярэднюю школу, але быў прызваны ў Чырвоную Армію. Служыў у Заходняй Беларусі, быў супрацоўнікам армейскай газеты. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны вайсковая часць трапіла ў акружэнне, і ён апынуўся ў палоне. Уцёк з лагера і вярнуўся дадому. Па некаторых звестках па прапанове камандавання партызанскага атрада ўладкаваўся настаўнікам у Чырвонаслабадскую школу. У верасні 1942 г. перабраўся ў Слуцк, працаваў дворнікам у сірочым прытулку, дзе стварыў падпольную групу, якая ў снежні 1942 г. была выдана правакатарам. Член СП СССР з 1938 г.

Расстраляны немцамі 23.2.1943 г. у Слуцку, пахаваны ў в. Смалічы.

У 1932 г. мазырская газета «Палеская праўда» змясціла апавяданне «Спаганяюць падаткі». Выступаў на старонках часопісаў «Полымя рэвалюцыі», «Полымя», «Штэрн». Асобным выданнем выйшла кніга апавяданняў «Любоў» (1938, 1939).

## *Аркадзь КАНДРУСЕВІЧ*



Аркадзь Лявонцьевіч Кандрусевіч нарадзіўся 10.9.1929 г. у вёсцы Ламачы Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1947 г. скончыў Мазырскае педагагічнае вучылішча, працаваў настаўнікам у Тульгавіцкай сярэдняй школе Хойніцкага раёна. У 1948 г. паступіў у Ленінградскае мастацка-графічнае педагагічнае вучылішча. Пасля заканчэння яго (1951) быў выкладчыкам малявання і чарчэння ў школах Мазыра, Пскова, Калінкавіч. З 1954 г. перайшоў на журналісцкую работу. Быў літсупрацоўнікам нараўлянскай, хойніцкай раённых газет. У 1960—1967 гг. працаваў мастакомрэтушорам рэдакцыі абласной газеты «Магілёўская праўда». У 1967—1968 гг.— загадчык аддзела ілюстрацыі рэспубліканскай газеты «Звязда». Затым вяртаецца ў магілёўскую газету, дзе працуе намеснікам адказнага сакратара (1969—1978), загадчыкам аддзела інфармацыі (1979—1983), загадчыкам аддзела савецкай работы і народнага кантролю (1983—1986). З 1989 г.— літкансультант гэтай газеты. У 1978 г. завочна скончыў філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута імя А. Куляшова. Кіраваў абласным літаратурным аб'яднаннем «Прыдняпроўе» (1972—1984). Член СП СССР з 1970 г.

Дэбютаваў у друку вершам у 1956 г. (газета «Гомельская праўда»), у рэспубліканскім — выступіў у 1960 г. (часопіс «Вожык»). Аўтар зборнікаў прозы «Чарпак Вялікай Мядзведзіцы» (1969) і «Кругі на Белай паляне» (1977). Зрабіў літаратурную апрацоўку кнігі ўспамінаў партызанаў і падпольшчыкаў Магілёўскай вобласці «Вела нас партия» (1984).

## *Юлія* КАНЭ



Юлія Міхайлаўна Канэ нарадзілася 21.8.1931 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і інжынера.

У 1945 г. разам з бацькамі пераехала ў Мінск. Скончыла аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1954). У 1954—1955 гг.— літсупрацоўнік, стыліст у рэдакцыях газет Літвы. У 1955—1959 гг. працавала на Мінскім аўтазаводзе рэдактарам у аддзеле галоўнага канструктара, у газеце «Піянер Беларусі» (1959). Член СП СССР з 1961 г. З 1992 г. жыве ў Ізраілі.

Пачала друкавацца з 1951 г. Як літаратурны крытык выступае з 1958 г. Выдала кнігі «Дзень сённяшні» (1962), манаграфію «Янка Брыль» (Масква, 1964), «Плынь» (1983), «Як паветра і хлеб: Жыццёвы і творчы шлях Янкі Брыля» (1988).

Працуе таксама ў галіне перакладу і перакладазнаўства. Пераклала на беларускую мову творы М. Галшаяна, С. Ханзадзяна, А. Айвазяна і іншых армянскіх пісьменнікаў. На рускую мову пераклала аповесці К. Каліны «Маці і сын», «Бурштынавыя пацеркі» («Тяжелая палата»), «Крылаты конь», шэраг апавяданняў В. Хомчанкі і інш.

## *Аляксандр* КАПУСЦІН



Аляксандр Пятровіч Капусцін нарадзіўся 12.2. 1924 г. у вёсцы Старая Рудня Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У чэрвені 1942 г. арганізаваў у роднай вёсцы камсамольска-маладзёжную падпольную групу, з красавіка 1943 г.— у партызанах. З лістапада 1943 г.— на фронце, быў кантужаны і тройчы паранены. У 1945 г. абраны сакратаром Жлобінскага райкома камсамола. З 1946 да 1965 г. працаваў у органах юстыцыі. Скончыў завочна Мінскую юрыдычную школу (1950) і гістарычны факультэт Гомельскага настаўніцкага інстытута імя В. Чкалава (1955), а таксама Вышэйшыя юрыдычныя курсы ў Маскве (1959). У 1965 г. прызначаны загадчыкам аддзела абласной газе-

ты «Гомельская праўда», з 1971 г. працаваў старшым рэдактарам, потым загадчыкам рэдакцыі навукі і культуры БелТА. У 1973 г. працаваў адказным сакратаром штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», у 1974—1980 гг.— намеснікам галоўнага рэдактара штотыднёвіка. Член СП СССР з 1974 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, медалём «За адвагу», іншымі медалямі.

Ганаровы грамадзянін Жлобіна (1983).

Першую карэспандэнцыю надрукаваў у жніўні 1943 г. у падпольнай абласной газеце «Гомельская праўда». З апавяданнямі і нарысамі выступае ў друку з 1948 г. Выдаў кнігі апавяданняў і аповесцей «Суд ідзе» (1959), «Мерай закона і сумлення» (1969), «Суд вырашыў» (1975), «Чалавек з пазіцыяй» (апавяданні і гумарэскі, 1975), «Белыя гусі лета прарочаць» (1976), «Покліч сэрца» (1976), «Размова ў дарозе» (1977), «Скажу праўду» (1979), «Быць чалавекам» (1981), «Па арбіце памяці» (1984), «Рэха даўніх баёў» (1984), «Дружба вывела да зорак» (1985), «Гудок далёкага поезда» (1986), «Родина — любовь наша вечная» (1986), «Салёная раса» (1988).

Перакладае з рускай і польскай моў.

---

## *Іван* КАПЫЛОВІЧ



Іван Іванавіч Капыловіч нарадзіўся 2.2. 1944 г. у вёсцы Забалацце Мазырскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і шафёра і настаўніцы.

У 1962 г. паступіў на аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Служыў у Савецкай Арміі (1964—1966). Працягваў вучобу ва універсітэце (скончыў у 1967). З 1967 г.— літсупрацоўнік рэдакцыі «Чырвоная змена». У 1969 г., знаходзячыся ў службовай камандзіроўцы, трапіў у аўтакатастрофу, стаў інвалідам. Член СП СССР з 1981 г.

У друку выступіў з нарысамі ў 1966 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Сонца садзіцца ў травы» (1978), «Два дні ў лютым» (1981), «Асенні гром» (1985), «Сны не вяртаюцца» (1988).

## *Мікола* КАПЫЛОВІЧ



Мікола (Мікалай Фаміч) Капыловіч нарадзіўся 10.7.1937 г. у вёсцы Астражанка Лельчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Астражанскую сярэднюю школу (1956), працаваў загадчыкам сельскага клуба, інструктарам Лельчыцкага райкома камсамола. У 1958 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. На апошнім курсе вучобу сумяшчаў з работаю на Беларускім радыё ў якасці рэдактара Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных перадач. Пасля заканчэння універсітэта (1963) выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Цудзенішскай сярэдняй школе Ашмянскага раёна. У 1964—1967 гг.— рэдактар выдавецтва «Беларусь». Працаваў літаратурным сакратаром газеты «Звязда», рэдактарам у Дзяржаўным камітэце Савета Міністраў па друку, у выдавецтвах «Навука і тэхніка», «Мастацкая літаратура». У 1989—1990 гг.— загадчык аддзела пісьмаў газеты «Маяк Палесся» Брагінскага раёна. З 1983 г. жыве ў Маладзечна. Член СП СССР з 1986 г.

У рэспубліканскім друку ўпершыню выступіў у 1960 г. Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Скрозь жывуць людзі» (1968), «Дні ціхай восені» (1968), «Засада» (1979), «Чужы сваяк» (1987).

## *Леў* КАРАІЧАЎ



Леў Сяргеевіч Караічаў нарадзіўся 16.5. 1936 г. у горадзе Разані (Расія) у сям'і настаўніцы.

Жыў з бацькамі ў вёсцы Рудакоў Хойніцкага раёна. Перад вайной сям'я пераехала ў Мінск. Пасля заканчэння мінскай сярэдняй школы № 15 (1953) працаваў тэхнікам-канструктарам у інстытуце «Белдзяржпраект» і адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні будаўнічага факультэта Беларускага політэхнічнага інстытута (скончыў у 1960). З 1958 г.— тэхнік-канструктар, старшы архітэктар, старшы інжынер-канструктар Інстытута будаўніцтва і ар-

хітэктуры АН БССР. З 1962 г.— кіраўнік групы тэхнічнай інфармацыі трэста «Аргтэхбуд», затым у Міністэрстве будаўніцтва БССР. У 1967—1976 гг.— загадчык рэдакцыі тэхнікі, будаўніцтва, спорту «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі». Карэспандэнт газеты «Звязда» (1976—1977), рэдактар-кінадраматург сцэнарнай майстэрні кінастудыі «Беларусьфільм» (1977—1978), супрацоўнік часопіса «Неман» (1980—1981), загадчык літаратурнай часткі Беларускага тэатра юнага гледача (1983—1984), прадстаўнік выдавецтва «Известия» па Беларускай ССР (1984—1986). Член СП СССР з 1985 г.

З 1958 г. пачаў выступаць як публіцыст, тэатральны і кінакрытык, з 1967 г.— як драматург. Аўтар п'ес «І выхавай сына» (пастаўлена ў 1967), «Зорныя ночы» (пастаўлена ў 1977), «Цар прыроды» (урывак у газеце «Літаратура і мастацтва», 1978), «Слова гонару» (апублікавана ў аднайменным зборніку, 1983), «И на все времена» (зборнік «Сучасная беларуская п'еса», 1985), інсцэніроўкі «Гандлярка і паэт» паводле аднайменнай аповесці І. Шамякіна (пастаўлена ў 1980), аднаактоўкі «Апанаванасць» (1989). Напісаў шэраг інсцэніровак, якія ставіліся на Беларускім радыё, а таксама сцэнарыяў для аб'яднання «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм».

---

## *Віктар* КАРАМАЗАЎ



Віктар Філімонавіч Карамазаў нарадзіўся 27.6. 1934 г. у горадзе Чэрыкаве Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

Скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1958). Працаваў адказным сакратаром чэрыкаўскай раённай газеты «Сацыялістычная перамога», крычаўскай раённай газеты «Шлях сацыялізма», загадваў аддзелам у міжраённай газеце «Новае жыццё» (Крычаў). У 1962—1963 гг.— уласны карэспандэнт абласной газеты «Магілёўская праўда». З 1964 г. працаваў у газеце «Звязда» — літсупрацоўнікам, потым загадчыкам аддзела навукі, ВНУ і школ, а затым загадчыкам аддзела

літаратуры і мастацтва. У 1969—1971 гг. быў літсупрацоўнікам, пасля загадчыкам аддзела культуры газеты «Літаратура і мастацтва», загадчыкам аддзела мастацкіх фільмаў Галоўнай рэдакцыі «Тэлефільм», членам сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі Беларускага тэлебачання. З сакавіка 1982 г.— загадчык аддзела публіцыстыкі часопіса «Полымя». У 1982—1986 гг.— кансультант СП БССР. Член СП СССР з 1969 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Першае апавяданне надрукаваў у 1958 г. (альманах «Советская Отчизна»). Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Падранак» (1968), «Па талым снезе» (1973), «Спіраль» (1974), «Вясёлка сярод зімы» (нарысы, 1978), «Дзень Барыса і Глеба» (1981), «Дома» (1984), «Дзяльба кабанчыка» (выбранае, 1988), «Глядзіце ў вочы лемуру» (аповесць-эсэ, 1989), «Проста ўспомніў я цябе...» (публіцыстычная проза, эсэ, 1989), раманаў «Пушча» (1979, экранізаваны ў 1988), «Бежанцы» (часопіс «Полымя», 1990).

Аўтар сцэнарыяў мастацкага тэлевізійнага фільма «Зялёныя фрэгаты» (пастаўлены ў 1974) і шэрага дакументальных кінастужак.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя К. Каліноўскага (1990) за кнігу публіцыстыкі «Проста ўспомніў я цябе...».

---

## *Уладзімір КАРАТКЕВІЧ*



Уладзімір Сямёнавіч Караткевіч нарадзіўся 26.11.1930 г. у горадзе Оршы Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

У час Вялікай Айчыннай вайны быў у эвакуацыі ў Пермскай вобласці, пасля ў Арэнбургу. У 1944 г. вярнуўся ў Оршу, атрымаў сярэднюю адукацыю. У 1954 г. скончыў філалагічны факультэт Кіеўскага універсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі. Настаўнічаў у вёсцы Лесавічы Таращанскага раёна Кіеўскай вобласці (1954—1956), у Оршы (1956—1958). Скончыў Вышэйшыя літаратурныя (1960), Вышэйшыя сцэнарныя курсы (1962) у Маскве. З 1962 г. жыў у Мінску. Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў.

Памёр 25.7.1984 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1951 г. (аршанская раённая газета «Ленінскі прызыў»). У 1955 г. верш «Машэка» быў змешчаны ў часопісе «Полымя». Выйшлі зборнікі паэзіі «Матчына душа» (1958), «Вячэрнія ветразі» (вершы і паэма, 1960), «Мая Іліяда» (1969), «Быў. Ёсць. Буду.» (вершы і паэмы, 1986).

Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Блакіт і золата дня» (1961), «Чазенія» (1970), «Вока тайфуна» (1974), «З вякоў мінулых» (1978), раманаў «Каласы пад сярпом тваім» (1968), «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1972), «Нельга забыць» («Леаніды не вернуцца да Зямлі», 1982), «Чорны замак Альшанскі» (увайшлі аднайменны раман і аповесць «Зброя»), (1983), аповесці «У снягах драмае вясна» (1989). Для дзяцей выдаў «Казкі» (1975) і нарыс «Белавежская пушча» (1975).

Аўтар п'ес «Млын на Сініх Вірах» (пастаўлена на тэлебачанні ў 1959), «Званы Віцебска» (1977, пастаўлена ў 1974), «Кастусь Каліноўскі» (1980, пастаўлена ў 1978), «Калыска чатырох чараўніц» (апублікавана і пастаўлена ў 1982), «Маці ўрагану» (1985, пастаўлена ў 1988; аднайменны мастацкі фільм — рэжысёр Ю. Марухін, 1990). У 1988 г. выйшаў зборнік п'ес «Старыя беларускія хронікі». Напісаў сцэнарыі кароткаметражных фільмаў «Сведкі вечнасці» (1964), «Памяць каменя» (1966), «Будзь шчаслівай, рака» (1967), сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (першапачатковая назва «Жыцце і ўзнясенне Юрася Братчыка», з В. Бычковым, 1967), «Чырвоны агат» (1973), «Дзікае паляванне караля Стаха» (з В. Рубінчыкам, 1979), «Чорны замак Альшанскі» (з М. Пташуком, 1984). На тэлебачанні і радыё па яго творах пастаўлены шэраг спектакляў. Па лібрэта Караткевіча пастаўлена ў Беларускім тэатры оперы і балета опера «Сівая легенда» (кампазітар Д. Смольскі, 1978), а паводле яго аповесці «Дзікае паляванне караля Стаха» — аднайменная опера (кампазітар У. Солтан, 1989).

Выступаў як публіцыст і крытык. Напісаў нарыс «Зямля пад белымі крыламі» (1977, першае выданне — на ўкраінскай мове, Кіеў, 1972), эсэ «Мсціслаў — Мстиславль» (1985), эсэ, артыкулы пра Ф. Скарыну, Т. Шаўчэнку, Лесю

Украінку, М. Агінскага, Я. Купалу, М. Багдановіча, М. Шолахава, Я. Брыля, У. Калесніка, М. Лужаніна, Р. Барадуліна, В. Зуёнка, А. Наўроцкага, Я. Сіпакова. Выйшлі Выбраныя творы у 2 тамах (1980) і Збор твораў у 8 тамах (1987—1991).

Працаваў як перакладчык. На беларускую мову пераклаў драму М. Карыма «У ноч зацьмення Месяца» (пастаўлена ў 1972), аповесць Э. Гашпаравай «Цяжка быць мустангам» (1981), паасобныя творы Дж. Байрана, А. Міцкевіча, І. Франка, Я. Судрабкална, Б. Мацкявічуса і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1983) за раман «Нельга забыць» («Леаніды не вернуцца да Зямлі»), Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1984, пасмяротна) за раман «Чорны замак Альшанскі».

---

## *Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ*



Галіна Анатольеўна Каржанеўская нарадзілася 27.8.1950 г. у вёсцы Лясішча Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых.

У 1968 г. скончыла Янушкавіцкую сярэднюю школу Лагойскага раёна, паступіла на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. З трэцяга курса перавялася на завочнае аддзяленне і пачала настаўнічаць у Янушкавіцкай школе. Пасля заканчэння універсітэта (1973) выкладала беларускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе пасёлка Плешчаніцы Лагойскага раёна. У 1980—1982 гг.— рэдактар літаратурна-драматычнай рэдакцыі Беларускага тэлебачання. З 1984 г.— карэспандэнт аддзела прозы і паэзіі, з 1986 г.— загадчык аддзела крытыкі газеты «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1976 г.

З вершамі ў рэспубліканскім друку выступіла ў 1967 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «На мове шчасця» (1973), «Мой сад» (вершы і паэма, 1976), «Званы гадоў» (1980), «Жыла-была» (1983), «Вечны водгук» (вершы і паэма, 1988), кніжкі вершаў для дзяцей «На што падобна аблачынка» (1983) і «Сінічка на балконе» (1989).

Напісала п'есы для дзяцей «Іван Світаннік» (пастаўлена ў 1981), «Шукайце кветку-папараць» (пастаўлена ў 1985), а таксама п'есы «Зуб мудрасці» (часопіс «Маладосць», 1984), «Мора, аддай пярсцёнак» (часопіс «Полымя», 1987).

Выступае і як крытык.

---



## *Уладзімір КАРПАЎ*

Уладзімір Барысавіч Карпаў нарадзіўся 26.2. 1912 г. у горадзе Хвалынску Саратаўскай вобласці (Расія) у сям'і земскага ўрача.

У час голаду на Паволжы (1921) пераехаў разам з маці на Гомельшчыну ў вёску Ёлча Брагінскага раёна. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1929) працаваў рабочым на лесапільным заводзе ў Рэчыцы, затым настаўнічаў на Брагіншчыне, у Сіроцінскім раёне. У 1941 г. завочна скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у падпольным і партызанскім руху, быў намеснікам камандзіра спецгрупы Мінскага абкома КПБ, старшым разведчыкам глыбокага тылу. Пасля вызвалення Мінска выкладаў мову і літаратуру, загадваў навучальнай часткай сярэдняй школы № 42, працаваў у газеце «Советская Белоруссия», у 1945 г. быў адказным сакратаром газеты «Літаратура і мастацтва», у 1947— 1960 гг. загадваў аддзелам прозы і крытыкі ў часопісе «Полымя». Член СП СССР з 1946 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём за баявыя заслугі і іншымі медалямі.

Памёр 6.8.1977 г.

З рэцэнзіямі і артыкуламі ў друку пачаў выступаць у 1945 г. Аўтар кніг літаратурна-крытычных артыкулаў «Па шляху сталасці» (1952) і «Крылаты ўзлёт» (1966).

З 1948 г. пачаў выступаць як празаік. Выйшлі аповесць «Без нейтральнай паласы» (1950), раманы «За годам год» (1957), «Вясеннія ліўні» (1961), «Нямігі крывавыя берагі» (1962), «Сотая маладосць» (1971, усе чатыры раманы склалі цыкл «На перавале стагоддзя»), кніга апавядан-

няў і ўспамінаў «Прызнанне ў нянавісці і любві» (1976). Укладальнік і адзін з аўтараў кнігі «Мы раскажам пра Мінск» (1964), аўтар тэксту да фотаальбома «Мінск» (1965). Склаў кнігі «Горад і годы» (1967) і «Сквозь огонь и смерть» (1970). У 1983—1985 гг. выйшаў Збор твораў у 5 тамах.

---

## *Васіль КАРПЕЧАНКА*



Васіль Васільевіч Карпечанка нарадзіўся 7.1. 1925 г. у вёсцы Будзішча Чачэрскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Нова-Беліцкім лесатэхнічным тэхнікуме (1939—1941). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Быў тройчы паранены. Пасля дэмабілізацыі (1946) працаваў настаўнікам пачатковых класаў Сідаравіцкай і Роўкавіцкай школ Чачэрскага раёна. У 1952 г. скончыў Гомельскае педагагічнае вучылішча, у 1957 г.— беларускае аддзяленне Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працаваў загадчыкам аддзела пісьмаў, адказным сакратаром рэдакцыі магілёўскай раённай газеты «За камуністычную працу» (1957—1958). У 1959—1986 гг. працаваў у Рэчкаўскай сярэдняй школе Магілёўскага раёна дырэктарам, настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара па ваенна-патрыятычным выхаванні. Член СП СССР з 1990 г.

Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Выступае ў друку з 1953 г. Аўтар зборніка для дзяцей «Сонейка ўзышло» (1961). Многія вершы ўключаны ў школьныя падручнікі для малодшых класаў «Верасок», «Кніжка-малышка», «Ад вясны да вясны», у калектыўныя зборнікі.

## *Аляксей* КАРПЮК



Аляксей Нічыпаравіч Карпюк нарадзіўся 14.4. 1920 г. у вёсцы Страшава на Беласточчыне (цяпер Польшча) у сялянскай сям'і.

Скончыў два класы польскай гімназіі ў Вільні. У 1939—1941 гг. вучыўся у Навагрудскім педагагічным вучылішчы. У гады нямецка-фашысцкай акупацыі ўваходзіў у склад падпольнай дыверсійнай групы. У час выканання дыверсіі на чыгунцы ў канцы 1942 г. быў арыштаваны і адпраўлены ў беластоцкую турму, а адтуль у канцлагер Штутгоф. Увосень 1943 г. уцёк з лагера і прыняў удзел у партызанскай барацьбе. У 1944 г. быў камандзірам партызанскага атрада імя К. Каліноўскага на Гродзеншчыне. У 1944—1945 гг. служыў у Савецкай Арміі, удзельнічаў у баях на тэрыторыі Польшчы і Германіі. Двойчы паранены. Скончыў аддзяленне англійскай мовы Гродзенскага педагагічнага інстытута (1949). Працаваў загадчыкам Сапоцкінскага рана (1949—1951), дырэктарам Біскупцкай сямігадовай школы Ваўкавыскага раёна (1951—1953), у Гродзенскім педінстытуце (1953—1955), у абласной газеце «Гродзенская праўда» (1955—1957), уласным карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва». У 1961 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. З 1961 г.— загадчык агенцтва «Інтурыст» (Гродна), з 1965 г.— сакратар Гродзенскага абласнога аддзялення СП БССР, з 1970 г.— упаўнаважаны УААП па вобласці, у 1977—1981 гг.— дырэктар Рэспубліканскага музея атэізму і гісторыі рэлігіі ў Гродна, з 1978 г.— зноў сакратар абласнога аддзялення СП БССР. Член СП СССР з 1953 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі і залатым крыжам ордэна «Віртуці Мілітары» (Польшча).

Заслужаны работнік культуры БССР (1980).

Памёр 14.7.1992 г.

У друку дэбютаваў у 1953 г. аповесцю «У адным інстытуце». Выйшлі кнігі аповесцей і апавяданняў «Дзве сасны» (1958), «Данута» (1960), «Мая Гродзеншчына» (нарыс, 1960), «Пушчанская адысея» (1964), «Чаго мы варты» (бібліятэка газеты «Голас Радзімы», 1970),

«След на зямлі: Скарбы і здабыткі маёй Гродзеншчыны» (1972), «Вершалінскі рай» (1974), «Ольга Корбут» (1977), «Свежая рыба» (1978), «Партрэт» (1983), «Сучасны канфлікт» (1985), «Дзве сястры» (казка, 1986), раман «Карані» (1988). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах у 1980 г. і 1990—1991 гг.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа (1986) за кнігу «Сучасны канфлікт».

---

## *Яўген* КАРШУКОЎ



Яўген Іванавіч Каршукоў нарадзіўся 1.1.1932 г. у вёсцы Давыдавічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўніка.

У 1956 г. скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў адказным сакратаром акцябрскай раённай газеты «Чырвоны Кастрычнік» (1956—1958), загадчыкам аддзела веткаўскай раённай газеты «Пад ленінскім сцягам» (1958—1959), рэдактарам шматтыражнай газеты панчошна-трыкатажнай фабрыкі «8 Сакавіка» ў Гомелі (1959), старшым рэдактарам на Гомельскай студыі тэлебачання (1959—1971). З 1971 г.— загадчык аддзела літаратуры газеты «Літаратура і мастацтва», з 1975 г.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Вожык», з 1978 г. працаваў у апараце СП БССР. У 1980—1989 гг.— галоўны рэдактар выдавецтва «Юнацтва». З 1989 г.— кансультант СП БССР. Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны медалямі.

Першыя апавяданні і гумарэскі надрукаваў у 1955 г. Аўтар кніг прозы «У дарогу» (1963), «Не без таго...» (1967), «Сустрэча» (1969), «Бывай, кампанія!» (1977), «Перад новым годам» (1980), «Пісьмо жонцы» (1982), «І надыходзіць дзень» (1982). Выйшлі кнігі для дзяцей «Змоўшчыкі» (1975) і «Пасланне нашчадкам» (1987).

Пераклаў са славацкай мовы зборнікі апавяданняў «Апошні вераснёвы дзень» (1982), «Разбуджаны голас» (1988), раман Р. Морыца «Выбух» (1984). Перакладае таксама з рускай, украінскай і польскай моў.

*Уладзімір* КАРЫЗНА



Уладзімір Іванавіч Карызна нарадзіўся 25.5. 1938 г. у вёсцы Закружка Мінскага раёна ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1961) працаваў выкладчыкам беларускай і рускай мовы і літаратуры ў Опсаўскай сярэдняй школе на Браслаўшчыне, у гэты час узначальваў літаратурнае аб'яднанне пры раённай газеце «Браслаўская звязда». З 1967 г.— рэдактар, старшы рэдактар, загадчык аддзела беларускай музыкі Рэспубліканскага радыё, з 1980 г.— рэдактар аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя», з 1981 г.— старшы рэдактар, загадчык рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1970 г.

Першы верш надрукаваў у 1956 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Край мой сінявокі» (1963), «Жураўліны досвітак» (1969), «Святло ліўня» (вершы і паэма, 1972), «Цеплыня» (паэма, вершы, песні, 1977), «Цішыня баразны» (вершы і паэма, 1981), «Шумяць вербы» (вершы, песні, 1982), «Музыка ў свеце» (1985), «Расколіна на Звоне Свабоды» (1986), «Душы разгуканай мелодыя» (вершы, паэмы, песні, 1988), кніжкі вершаў для дзяцей «На сяле ў бабулі» (1975), «Кыонг і яго сябры» (1982), «Малююць дзеці» (з А. Вольскім, 1984), «Зямля — два паўшар'і» (1988), «Мір і сонейка для ўсіх» (1990).

Больш за сотню вершаў пакладзена на музыку. Выдадзены зборнікі песень «Клубныя вечары» (1979), «Люблю цябе, Белая Русь» (1984), «Салавей спявае» (1990).

Пераклаў зборнік вершаў А. Матуціса «Мамін пірог» (1986), шматлікія вершы дзіцячых пісьменнікаў для серыі «Бібліятэка дзіцячай літаратуры народаў СССР».

## *Алесь КАСКО*



Алесь (Аляксандр Канстанцінавіч) Каско нарадзіўся 10.12.1951 г. у вёсцы Чудзін Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1968 г. паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. Пушкіна. На пачатку 1971 г. перапыніў вучобу. Выкладаў рускую мову і літаратуру ў Рагазнянскай сярэдняй школе Брэсцкага раёна, беларускую мову і літаратуру ў Чудзінскай сярэдняй школе. Служыў у Савецкай Арміі (1971—1973). Зноў працаваў у Чудзінскай сярэдняй школе і працягваў вучобу завочна. У 1974 г. перавёўся на стацыянарнае аддзяленне Брэсцкага педінстытута (скончыў у 1976). У 1976—1984 гг.— карэспандэнт жабінкаўскай раённай газеты «Сельская праўда». З 1984 г.— рэдактар на Брэсцкай абласной студыі тэлебачання. Член СП СССР з 1984 г.

Літаратурнай працай займаецца з 1968 г. Першыя вершы ў рэспубліканскім друку апублікаваў у 1970 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар кнігі вершаў «Вестка» ў калектыўным зборніку «Нашчадкі» (1979), кніг паэзіі «Скразная лінія» (1982) і «Набліжэнне» (1989).

## *Ізяслаў КАТЛЯРОЎ*



Ізяслаў Рыгоравіч Катляроў нарадзіўся 21.11. 1938 г. у горадзе Чавусы Магілёўскай вобласці ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння сямі класаў працаваў на Магілёўскай абутковай фабрыцы (1955—1960), адначасова вучыўся ў вячэрняй школе. З 1960 г.— рабочы геадэзічнай канторы Мінгарвыканкома. Скончыў вячэрняе аддзяленне факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1966). У 1962—1966 гг.— літсупрацоўнік газеты «Западная трасса» (Мінск). З 1966 г.— карэспандэнт, адказны сакратар, з 1979 г.— намеснік рэдактара светлагорскай раённай газеты «Агні камунізму». Член СП СССР з 1990 г.

Першы твор апублікаваў у 1956 г. Піша на

рускай мове. Аўтар зборнікаў вершаў «Мой ровесник» (1975), «Конфетное дерево» (1980), «Друзья мои — свидетели мои» (1981), «Здесь, на трепетной земле» (1989).

---

*Генадзь* КАХАНОЎСКІ



Генадзь Аляксандравіч Каханоўскі нарадзіўся 8.1. 1936 г. у вёсцы Дамашы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў школе і адначасова працаваў у сельскай гаспадарцы. Пасля службы ў Савецкай Арміі (1955—1958) скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя У. І. Леніна (1963). Працаваў настаўнікам у Ленкаўскай васьмігадовай школе і ў Маладзечна. З 1964 г.— навуковы супрацоўнік, намеснік дырэктара па навуковай рабоце, дырэктар Мінскага абласнога краязнаўчага музея (Маладзечна). Завочна скончыў аспірантуру пры Інстытуце гісторыі АН БССР. З 1981 г. навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. З 1989 г.—старшыня Беларускага краязнаўчага таварыства. Кандыдат гістарычных навук. Член СП СССР з 1986 г.

У друку з краязнаўчымі артыкуламі пачаў выступаць з 1962 г. Выйшлі кнігі нарысаў «Маладзечна» (1971), «Вілейка» (1974), «Адчыніся, таямніца часу» (1984), «Повязь часоў» (1985), а таксама асобныя нарысы-даследаванні пра невядомыя факты з жыцця і творчасці Я. Купалы — «На запаветнай зямлі» (1974) і М. Багдановіча — «У родным краі» (1983). Аўтар манаграфічных даследаванняў «Археалогія і гістарычнае краязнаўства Беларусі XVI—XIX стст.» (1984), «Маладзечна, 600 гадоў» (1988), «Беларуская фалькларыстыка: Эпоха феадалізму» (з Л. Малаш і К. Цвіркам, 1989), «Прадвесне навукі (1990).

Складальнік і аўтар прадмовы зборніка «Гэй, смалі, страляй, маланка: Сатыра і гумар Заходняй Беларусі 1920—1939 гг.» (1989). Адзін са складальнікаў і аўтараў літаратурна-мастацкіх календароў «Кола дзён» (1987, 1988), «Беларускі каляндар—1991» (1990), «Наш край» (1990).

## *Лазар* КАЦОВІЧ



Лазар Абрамавіч Кацовіч нарадзіўся 5.10. 1903 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага.

У 12 год пайшоў працаваць «хлопчыкам для паслуг» у мануфактурны магазін, затым — кур'ерам у банк. З 1920 г.— канторшчык у Народным камісарыяце аховы здароўя БССР, з 1921 г.— у Мінскім гарвыканкоме. З 1922 г. быў артыстам, памочнікам рэжысёра гарадскога тэатра і вандроўных калектываў. Пасля заканчэння прафтэхшколы друкароў (1926) залічаны гравёрам-літографам у друкарню ў Мінску. З дня ўтварэння Саюза пісьменнікаў Беларусі да 1937 г. быў яго арганізацыйным сакратаром. У 1939 г. скончыў сцэнарны факультэт Дзяржаўнага інстытута кінематаграфіі ў Маскве. Працаваў на кінастудыях у Мінску, Ташкенце, у 1943—1946 гг.— рэдактар Усесаюзнага радыёкамітэта. У пасляваенныя гады жыў у Мінску. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 13.8.1953 г.

Літаратурную працу пачаў у 1920 г. з вершаў. Пісаў на ідыш і рускай мовах. Выйшлі кніжка апавяданняў для дзяцей «Кіфка-ілгунішка» (1926), кнігі прозы «Гумарэскі» (1934), «Коратка і ясна» (1936), зборнік пародый «Прабачце, сябры мае» (1937), на рускай мове — аповесці «Возвращение к жизни» (1952), «Красный факел» (1957). У перакладзе на беларускую мову выдаў аповесць «Сям'я» (1946).

Аўтар п'есы «У тыя дні» (1927, пастаўлена ў 1927), аднаактоўкі «Жукі ў калгасе» (1933).

## *Міхась* КАЦЮШЭНКА



Міхась (Міхаіл Пятровіч) Кацюшэнка нарадзіўся 1.3.1947 г. у г. Мінску ў сям'і служачага.

Скончыў вячэрняе аддзяленне факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1971). З 1966 г. працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» — літсупрацоўнікам, намеснікам адказнага сакратара, загадчыкам аддзела. З 1975 г.— інструктар аддзела спартыўнай і абаронна-масавай рабо-

ты, з 1977 г.— намеснік загадчыка аддзела прапаганды і агітацыі ЦК ЛКСМБ. У 1979—1984 гг.— рэдактар газеты «Знамя юности». У 1984—1987 гг. вучыўся ў аспірантуры Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС. З 1987 г.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Крыніца». Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1981 г.

Першае апавяданне апублікаваў у 1968 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Первая осень» (1972), «Трэці раунд» (1977), «Адзін дождж на ўсіх» (1979), «Дні, як усе іншыя» (1981), «Сустрэча пасля развітання» (1984), «Урок маўчання» (раман, апавяданні, 1988), «Прызнанне левага крайняга» (раман, аповесць, 1990).

---

## *Арнольд* КАШТАНАЎ



Арнольд Каштанаў (Арнольд Львовіч Эпштэйн) нарадзіўся 21.12.1938 г. у горадзе Валгаградзе (Расія) у сям'і рабочага.

Скончыў механіка-тэхналагічны факультэт Маскоўскага аўтамеханічнага інстытута (1961). Працаваў памочнікам майстра, інжынерам-тэхнолагам на Мінскім трактарным заводзе. У 1965—1980 гг.— старшы інжынер на Мінскім аўтамабільным заводзе. Член СП СССР з 1975 г.

Піша на рускай мове. У 1966 г. надрукаваў аповесць «Чего ты хочешь, парень» (часопіс «Неман»). Выдаў зборнікі аповесцей і апавяданняў «Заводской район» (1976), «Мой дождь» (1982), «Коробейники» (Масква, 1985), «Эпидемия счастья» (1986), «Лучшие годы» (1988).

Напісаў сцэнарый мастацкага фільма «Час яе сыноў» (пастаўлены ў 1975) і мастацкага тэлевізійнага фільма «Інжынер Антаніна Брагіна» (пастаўлены ў 1978, прэмія на Усесаюзным конкурсе за лепшы сцэнарый аб рабочым класе), п'есу «Не стой под грузом» (пастаўлена ў 1980).

## *Аляксей* КЕЙЗАРАЎ



Аляксей Кейзараў (Аляксей Сцяпанавіч Кейзераў) нарадзіўся 4.10.1928 г. у вёсцы Бронніца Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1948 г. скончыў Гомельскі тэхнікум чыгуначнага транспарту. Працаваў аператарам, дыспетчарам станцыі Казань, старшым памочнікам начальніка станцыі ў Калінкавічах. З 1950 г.— бібліятэкар, у 1951—1962 і ў 1964—1967 гг.— выкладчык рускай мовы і літаратуры Бронніцкай сярэдняй школы. У 1955 г. завочна скончыў Гомельскі настаўніцкі інстытут. У 1962—1963 гг.— раз'язны карэспандэнт газеты «Калгасная праўда» (цяпер «Сельская газета»), у 1967—1974 гг.— рэдактар на Беларускім радыё, у 1974 г.— карэспандэнт часопіса «Беларусь», у 1974—1988 гг.— літкансультант часопіса «Неман». Член СП СССР з 1982 г.

З першым вершам выступіў у друку ў 1953 г. (газета «Сталинская молодежь»), з першым апавяданнем — у 1957 г. (газета «Зорька»). Піша на рускай мове. Аўтар кніг прозы «Нас было семеро» (аповесці, 1963), «Не знающий покоя» (нарыс, 1963), «Эхо на Полесье» (дакументальная аповесць пра Р. Мачульскага, Масква, 1979). Для дзяцей выдаў кнігі «Хитрый гвоздик» (1966), «Первый разведвзвод» (1969), «У нас в Тополевке» (1976), «Возвратятся журавли» (1988).

У яго літаратурным запісу выйшлі кнігі ўспамінаў удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны Э. Лаўрыновіча «Огненные рельсы» (1970, перапрацаванае і дапоўненае выданне ў 1974), І. Зуевіча «Райком в подполье» (1972), С. Лясніча «Далеко за фронтом» (1972), М. Дмітрыева «У тихой Серебрянки» (1975) і «Во имя жизни» (1981), М. Фядотава «Разведка ведет поиск» (1976) і «Разведка продолжает поиск» (1988), М. Гірыловіча «Дальва — сестра Хатыні» (1977, перапрацаваныя і дапоўненыя выданні ў 1981, 1987), А. Мазанік «Возмездие» (1981, дапоўненае і перапрацаванае ў 1988), М. Усава «В семье партизанской» (1988).

## *Міхась* КЕНЬКА



Міхась (Міхаіл Паўлавіч) Кенька нарадзіўся 8.2.1947 г. у вёсцы Верацеі Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

У 1965 г. скончыў Ласіцкую адзінаццацігодку і паступіў на філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Пасля заканчэння інстытута (1969) працаваў у кіраўскай раённай газеце «Кіравец», настаўнічаў ва Удзелаўскай сярэдняй школе Глыбоцкага раёна і ў Віцебску, быў лектарам, загадваў кабінетам камсамольскай работы ў Віцебскім абкоме камсамола (1969—1973). З 1973 г.— аспірант, з 1976 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, з 1983 г.— намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Юнацтва», з 1988 г.— дацэнт кафедры беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1988 г.

У рэспубліканскім друку з рэцэнзіямі і артыкуламі па тэорыі і практыцы мастацкага перакладу, праблемах беларускай савецкай прозы і паэзіі пачаў выступаць у 1974 г. Аўтар кніг «Майстэрства Аркадзя Куляшова — перакладчыка» (1983), «Міхась Лынькоў: Летапіс жыцця і творчасці» (1987). Прымаў удзел у падрыхтоўцы Збораў твораў М. Лынькова і М. Гарэцкага.

Перакладае з рускай, украінскай, польскай моў.

## *Кастусь* КІРЭЕНКА



Кастусь (Канстанцін Ціханавіч) Кірэенка нарадзіўся 12.12.1918 г. у вёсцы Гайшын Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1940 г. скончыў літаратурны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута. Пасля некалькіх месяцаў працы ў школе быў прызваны ў Савецкую Армію. У час Вялікай Айчыннай вайны — вежавы стралок танка, потым карэспандэнт армейскай газеты на Заходнім і 2-м Бе-

ларускім франтах. Пасля дэмабілізацыі (1945) працаваў загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва часопіса «Беларусь», з 1962 г.— галоўны рэдактар часопіса «Бярозка». У 1969 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXIV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. У 1972—1986 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Полымя». Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1980—1984). Член СП СССР з 1943 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1970).

Памёр 15.9.1988 г.

Першы верш апублікаваў у 1939 г. (газета «Гомельская праўда»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Ранак ідзе» (1945), «Пасля навальніцы» (1947), «Мая рэспубліка» (1949), «Маякі» (1952), «Родны свет» (1952), «Любоў і дружба» (1955), «Светлая хваля» (1959), «Антонавы грахі» (вершаваныя фельетоны, 1960), «Слаўся, юнацтва» (1961), «Вернасць» (1961), «Смага» (1962), «Жывыя ідуць наперад» (1964), «Цёплая радуга» (1966), «Кніга ста песень» (1971), «Слухайце ластавак» (1974), «Сіні вырай» (1976), «Вёсны веснавацъ» (1979), «Дэкрэтам сэрца» (1983), «Калыска вятроў» (1985), «Надзея» (1985). Для дзяцей выйшлі паэма «Алёнчына школа» (1951), кніжкі вершаў «Зялёнае рэха» (1953), «Вясна-красна» (1956), «Сад піянерскі» (1960), «Урачыстая песня» (1965), «Прысяга» (1969), вершаў і паэм «Размова з капітанамі» (1987). У 1969 і 1978 гг. выйшлі Выбраныя творы ў 2-х, у 1986—1988 гг.— Збор твораў у 3 тамах.

Выдаў кнігі аповесцей і апавяданняў для дзяцей «Сум і радасць дзеда Рэпкі» (1967), «Ручаіны шукаюць ракі» (1967), «Алесева кніжка» (1972), «Вандроўнае шчасце: Рыбацкая паэма» (1977), кнігі публіцыстыкі «Амерыка здалёку і зблізку» (1971) і «Заўсёды з Радзімай» (успаміны, эсэ, нататкі, 1980).

Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы У. Маякоўскага, М. Ісакоўскага, Я. Смелякова, А. Пракоф'ева, Я. Райніса, М. Рыльскага, У. Сасюры, С. Алейніка, М. Бажана, П. Тычыны, М. Нагнібеды, Т. Масэнкі і інш.

У яго перакладзе выйшлі асобнымі выданнямі зборнікі апавяданняў В. Біянкі «Хто чым спявае» (1954), Л. Падвойскага «З Леніным у аўтамабілі» (1971), аповесць Л. Смілянскага «Сашко» (1959), зборнік вершаў Я. Шпорты «Явар» (1976), раманы Й. Дарваша «П'яны дождж» (1975), І. Друцэ «Цяжар нашай дабрыні» (1977), К. Шавялёвай «Аляксандраўскі сад» (1979).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1964) за кнігу вершаў «Смага» і Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1972) за зборнік вершаў «Кніга ста песень».

---

## *Навум КІСЛІК*



Навум Зіноўевіч Кіслік нарадзіўся 26.9.1925 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і рабочага.

Да Вялікай Айчыннай вайны жыў і вучыўся ў школе ў Віцебску, у пачатку вайны працаваў рознарабочым, дахаўшчыком на элеватары, матарыстам-лябёдчыкам у Набярэжных Чаўнах (Татарыя). З канца 1942 г.— у Савецкай Арміі. Удзельнічаў у баях на Курска-Арлоўскай дузе. Быў двойчы паранены. Пасля дэмабілізацыі (1944) некаторы час працаваў рабочым на станкабудаўнічым заводзе ў Арэнбургу, вучыўся ў Арэнбургскім педагагічным інстытуце, з 1946 г.— на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Пасля заканчэння універсітэта (1950) працаваў настаўнікам рускай і беларускай мовы і літаратуры ў Дрысенскай сярэдняй школе. Быў літсупрацоўнікам у газеце «Літаратура і мастацтва» (1952—1958), потым — часопіса «Полымя» (1958—1959). Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступені і медалямі.

Першыя вершы апублікаваў у 1944 г. (газета Паўднёва-уральскай ваеннай акругі «Сталінец»). Піша на рускай мове. Выдаў кнігі паэзіі «Разговор с друзьями» (1956), «Поиск» (1959), «Позывные земли» (1961), «Повесть о прессованном порохе» (вершы, паэма, 1964), «Ветви» (вершы, паэмы, пераклады, 1969), «Праздник снегопада» (1972), «Воспоминание о вок-

залах» (Масква, 1976), «Сентябрьская река» (вершы і паэма, 1978), «Первоснежье» (1980), «Разные годы» (вершы і паэма, 1984), «Зимний свет» (Масква, 1985). Кнігі выбранай паэзіі выйшлі ў 1975 і 1985 гг.

Пераклаў на рускую мову раман І. Мележа «Людзі на балоце» (1964), аповесці А. Карпюка «Данута» (1963), «Пушчанская Адысея» (Масква, 1966) і яго кнігу прозы «На лясных сцежках» (Масква, 1964), У. Караткевіча «Хрыстос прызямліўся ў Гародні» (1966), зборнік паэзіі Я. Купалы (1979), творы Я. Коласа, М. Багдановіча, П. Броўкі, Р. Барадуліна, А. Вялюгіна, С. Дзяргая, А. Куляшова, У. Караткевіча, П. Панчанкі, А. Пысіна, А. Русецкага, М. Стральцова, М. Танка, Ю. Таўбіна і інш. У 1982 г. выдаў кнігу перакладаў беларускай паэзіі «Спелый бор».

---

## *Генадзь* КІСЯЛЁЎ



Генадзь Васільевіч Кісялёў нарадзіўся 19.3. 1931 г. у горадзе Каломне Маскоўскай вобласці (Расія) у сям'і служачых.

Сярэднюю школу скончыў у Віцебску (1948). Пасля заканчэння Маскоўскага гісторыка-архіўнага інстытута (1953) працаваў у архіўных установах Літвы. У 1956—1959 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Маскоўскім гісторыка-архіўным інстытуце. У 1960—1971 гг.— навуковы супрацоўнік Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва Літоўскай ССР. З 1971 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Кандыдат гістарычных навук. Член СП СССР з 1964 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1958 г. Выдаў зборнікі гісторыка-літаратурных нарысаў «Сейбіты вечнага» (1963), «З думай пра Беларусь» (1966), «Героі і музы» (1982), даследаванні «Загадка беларускай «Энеіды» (1971), «Пошукі імя» (1978), «Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча» (1988), літаратуразнаўчую дылогію «Разыскивается классик...» (1989), гістарычныя нарысы «Паплечнік Каліноўскага» (1976), «На пераломе дзвюх эпох: Паўстанне 1863 года на Міншчыне» (1990). Склаў зборні-

кі гісторыка-літаратурных матэрыялаў «Пачынальнікі» (1977), «Пуцявінамі Янкі Купалы» (1981), «З жыццяпісу Якуба Коласа» (1982), «Шляхам гадоў» (1990). Адзін са складальнікаў зборнікаў дакументаў «Рэвалюцыйны ўздым у Літве і Беларусі 1861—1862 гг.» (1964), «Паўстанне ў Літве і Беларусі 1863—1864» (1965).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1990) за кнігі гісторыка-літаратурных даследаванняў «Разыскивается классик...» і «Спасцігаючы Дуніна-Марцінкевіча».

---

## *Ілья КЛАЗ*



Ілья Сямёнавіч Клаз нарадзіўся 17.3.1922 г. у горадзе Магілёве ў сям'і рабочага.

У 1939 г. паступіў на літаратурны факультэт педагагічнага інстытута імя М. Горкага. З першых месяцаў вайны — у Савецкай Арміі. Удзельнік баёў на Паўночна-Заходнім, 2-м Прыбалтыйскім і 1-м Беларускім франтах. Тройчы паранены. У пасляваенныя гады быў літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела літаратуры і культуры ў газеце «Сталинская молодежь», у вайсковых газетах. У 1956—1966 гг. загадваў аддзелам інфармацыі ў газеце «Літаратура і мастацтва», аддзелам прапаганды ў музеі Янкі Купалы. З 1974 г.— літсупрацоўнік у бюлетэні «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі». Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 22.12.1980 г.

У 1940 г. надрукаваў першы верш (газета «Сталинская молодежь»). Пісаў на рускай і беларускай мовах. На рускай мове выйшлі аповесці «Жарцы» (1955), «Подснежники» (1958), «Вор» (1960), «Разбег» (1961), «Заря вишневая» (1973), раман «Белая Русь» (1977) і зборнік нарысаў «Потомству в пример» (1978), на беларускай — «Машыніст Анатоль Шыбуняеў» (1961), «Каменных спраў майстар» (1971), «Па Дзвіне на вёслах» (1975).

## *Міхась КЛЕБАНОВІЧ*



Міхась (Міхаіл Іванавіч) Клебановіч нарадзіўся 14.3.1934 г. у вёсцы Грэск Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1957) працаваў рэдактарам на Беларускім тэлебачанні. У 1967 г. пераведзены ў галоўную рэдакцыю па вытворчасці тэлевізійных фільмаў, у 1972 г. прызначаны членам рэдакцыйна-сцэнарнай калегіі гэтай рэдакцыі, з 1977 г.— галоўны рэдактар сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі Беларускага тэлебачання. Член СП СССР з 1981 г.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1985).

Празаічныя творы пачаў пісаць у канцы 60-х гг. У 1971 г. часопіс «Полымя» змясціў першую падборку апавяданняў. Аўтар кнігі апавяданняў і аповесцей «Ранішняе сонца» (1981).

Асноўная творчая праца звязана з тэлебачаннем. У 1960 г. пастаўлена п'еса «Апляваха». Знята некалькі дакументальных фільмаў. Тэлефільм «Размова пра зямлю» (пастаўлены ў 1971) адзначаны прызам на III Усесаюзным фестывалі.

## *Ірына КЛІМАШЭЎСКАЯ*



Ірына Уладзіміраўна Клімашэўская нарадзілася 30.8.1928 г. у горадзе Мінску ў сям'і чыгуначніка.

Вучылася на аддзяленні журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1949—1952). Была літсупрацоўнікам рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» (1952—1954, 1957—1966). У 1954—1957 гг. вучылася ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага ў Маскве, скончыла яго завочна ў 1960 г. Працавала ўласным карэспандэнтам газеты «Советская культура» па Беларускай ССР (1966—1968). У 1969—1979 гг.— літсупрацоўнік бюлетэня «Строитель-

ство и архитектура Белоруссии». Член СП СССР з 1964 г.

З першым апавяданнем выступіла ў 1952 г. (альманах «Советская Отчизна»). Піша на рускай мове. Аўтар кніжак прозы «Синий Бор» (1960), «Ключики и ключ» (нарысы, 1976), «На долгую память» (1978), «Пятое время года: Письма о любви» (1980), «Пора любви» (1984), «Счастье и смысл жизни» (публіцыстыка, 1986), «Письма о счастье» (публіцыстыка, 1989).

Пераклала на рускую мову кнігу С. Майхровіча «Жыццё і творчасць Ф. Багушэвіча» (1961), аповесці І. Навуменкі «Вайна каля Цітавай копанкі» (з В. Міхайлавай, 1963), П. Кавалёва «Лёнька Гром» (1963), У. Шахаўца «Насустрач...» (1973).

Выступае і як крытык.

---

## *Міхась КЛІМКОВІЧ*



Міхась (Міхаіл Мікалаевіч) Клімковіч нарадзіўся 20.11.1899 г. у вёсцы Сялітранка Барысаўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1915 г. скончыў Барысаўскае вышэйшае чатырохкласнае вучылішча. Здаў экстэрнам экзамен на званне народнага настаўніка. Настаўнічаў на Барысаўшчыне (1915—1921). Служыў у Чырвонай Арміі (1921—1923). Настаўнічаў на Лагойшчыне. Працаваў на партыйнай і прафсаюзнай рабоце. У 1932—1934 гг.— старшыня аргкамітэта, у 1934—1939 гг.— старшыня праўлення, у 1947—1954 гг.— літкансультант СП БССР. У 1943—1947 гг. быў галоўным рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР у Маскве, потым у Мінску. Член ЦВК БССР (1931—1938). Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны медалём.

Памёр 5.11.1954 г.

Друкаваўся з 1928 г. Аўтар драматычных паэм «Кацярына Жарнасек» (1938, пастаўлена ў 1938), «Адплата» (1952), «Уся ўлада Саветам!» (1957), драматычнай трылогіі «Георгі Скарына» (1946, 1947, 1955), лібрэта опер «Апошні вечар на хутары» (1940), «Кастусь

Каліноўскі» (1959, пастаўлена ў 1947), «Песня аб шчасці» (1952), балета «Князь-возера» (пастаўлены ў 1949), аднаактовак «На віленскім шляху» (1939), «На скрыжаванні дарог» (1945), «Маленькая хмарка» (1946). У 1947 г. выйшаў зборнік «Драматычныя паэмы». Аўтар тэксту Дзяржаўнага гімна БССР (1944).

Напісаў кнігу апавяданняў «Лясное возера» (1946), апрацаваў зборнік «Беларускія народныя казкі» (1946). У 1959 г. выдадзены Збор твораў у 2 тамах.

Даследаваў беларускую літаратуру. Выйшлі працы «Літаратура Савецкай Беларусі за 15 год» (1934), «Аб жыватворчым уплыве рускай літаратуры на беларускую літаратуру» (1953), «Літаратурна-крытычныя артыкулы» (1962).

---

## *Святлана КЛІМКОВІЧ*



Святлана Міхайлаўна Клімковіч нарадзілася 26.8.1935 г. у горадзе Мінску ў сям'і пісьменніка.

Скончыла аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1958). Працавала карэктарам, літработнікам, адказным сакратаром газеты «Голас Радзімы» (1958—1970), літсупрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва» (1970—1972), рэдактарам у часопісе «Народная асвета» (1972—1974), рэдактарам рэдакцыі праграм для моладзі на Беларускім тэлебачанні. У 1977—1990 гг.— адказны рэдактар бюлетэня Беларускага тэатральнага аб'яднання (з 1987 г. Саюза тэатральных дзеячаў) «Тэатральны Мінск». Член СП СССР з 1986 г.

Выступае ў друку з 1958 г. У перыядычным друку публікуе апавяданні, нарысы, казкі, тэатральныя рэцэнзіі і артыкулы. Асобным выданнем выйшла казка «Лалі-Лаль» (1974, на аснове яе створаны тэле- і радыёспектаклі).

Аўтар п'ес для тэатра лялек «Дар ляснога цара» (пастаўлена ў 1978), «Балада пра белую вішню» (апублікавана ў зборніку п'ес «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці» ў 1984, пастаўлена ў 1984 і на Беларускім радыё ў 1988), «Казка пра цара Юрыка і каваля Рымшу» (апублікавана

ў 1981, Масква, і ў зборніку «Радзіма мая дарагая», 1989), п'есы «Вясновая песня» (пастаўлена на Беларускім радыё, 1985). Напісала лібрэта опер «Дзікае паляванне караля Стаха» (пастаўлена ў 1989) і «Францыск Скарына» (пастаўлена на Беларускім тэлебачанні ў 1990). Зрабіла пераклад з польскай мовы, рэстаўрацыю і сцэнічную рэдакцыю оперы XVIII ст. «Апалон-заканадаўца, альбо Парнас рэфармаваны» (апублікавана і пастаўлена ў 1989).

---

## *Іван* КЛІМЯНКОЎ



Іван Пракопавіч Клімянкоў нарадзіўся 5.1. 1947 г. у вёсцы Хляўно Кармянскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1970 г. скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Настаўнічаў у Баяніцкай васьмігодцы Любанскага раёна, працаваў сакратаром камсамольскай арганізацыі Смілавіцкага СПТВ-23 Чэрвеньскага раёна. З 1971 г. пачаў выязджаць на сезонныя работы (пасёлак Тазаўскі Ямала-Нянецкай нацыянальнай акругі, г. Пячора Комі АССР, г. Варкута (Расія), пасёлак Сангары Якуцкай АССР, пасёлак Рочыгда Архангельскай вобласці). Быў выхавацелем у рабочым інтэрнаце Мінскага аўтамабільнага завода, працаваў у калгасах Валожынскага і Кармянскага раёнаў, у Касцюковіцкім сельгасбудзе. З 1988 г.— будаўнік калгаса «Перамога» Валожынскага раёна. Член СП СССР з 1988 г.

Літаратурнай працай займаецца з 1976 г. Аўтар кнігі апавяданняў «Сеанс гіпнозу» (1987).

*Уладзімір* КЛІШЭВІЧ



Уладзімір Сідаравіч Клішэвіч нарадзіўся 12.3. 1914 г. у вёсцы Краснадворцы Старобінскага раёна Мінскай вобласці.

Пасля заканчэння педагагічных курсаў у Слуцку працаваў настаўнікам. У 1933 г. паступіў на літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. У 1936 г. быў рэпрэсіраваны і сасланы на Калыму. У жніўні 1940 г. вернуты на даследаванне ў Мінск, дзе і застала яго вайна. У час акупацыі жыў у Слуцку, рэдагаваў «Газэту Случчыны». У 1944 г. выехаў у Германію. З 1948 г. жыў у ЗША, рэдагаваў ратапрынтны часопіс «Беларусь» (1949), працаваў выкладчыкам у коледжы ў штаце Індыяна. Некалькі разоў прыязджаў у БССР.

Памёр 14.11.1978 г. у г. Лос-Анжэлес, ЗША.

Друкаваць вершы пачаў у 1931 г. Выступаў у акруговай і раённай перыёдыцы, у час вайны друкаваўся ў акупацыйных газетах. Удзельнічаў у калектыўных зборніках «Песняры Случчыны» (Слуцк, 1943) і «Ля чужых берагоў» (Мюнхен — Нью-Йорк, 1955). У 1964 г. выдаў зборнік паэзіі «Далячынь» (Саўт-Рывер, ЗША), у 1965 г.— паэму «Васіль Каліна» (Лондан), у 1973 г.— зборнік «Сняцца сны мне залатыя» (бібліятэка газеты «Голас Радзімы», Мінск). У 1970—1975 гг. шмат вершаў апублікаваў у газеце «Голас Радзімы».

*Анатоль* КЛЫШКА



Анатоль Канстанцінавіч Клышка нарадзіўся 16.4.1935 г. у вёсцы Данейкі Баранавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Наваградскім педагагічным вучылішчы (1949—1952). Працаваў карэктарам у навагрудскай гарадской газеце «Звязда», адказным сакратаром рэдакцыі газеты «Фізкультурнік Беларусі». Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1958). Быў супрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва», у 1958 г. працаваў інструктарам па друку ЦК ЛКСМБ, са снежня

1958 г. вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, з 1960 г.— у рэдакцыі часопіса «Полымя». З 1961 па 1963 гг.— старшы рэдактар сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм», пасля зноў у «Полымі» — літработнік аддзела крытыкі, рэдактар аддзела навукі і мастацтва. З 1971 г.— загадчык лабараторыі навучання грамаце, а потым аддзела навучання літаратуры Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР. У 1981—1983 гг.— загадчык рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва», у 1986—1990 гг.— загадчык аддзела крытыкі часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

У 1950 г. у наваградскай газеце апублікаваў першы верш. З літаратурна-крытычнымі артыкуламі выступае з 1953 г. У 1967 г. выйшла кніга літаратурна-крытычных артыкулаў «Права на верш».

Аўтар «Буквара» (1969, 23 выданні), «Прапісаў да «Буквара» (1969, 4 выданні), «Прапісаў для 1 класа» (1973, 18 выданняў), дапаможніка для 1 класа «Верасок» (1978, 3 выданні), «Чабарок» (1989, чытанка для 4 класа школ з рускай мовай навучання). Напісаў кніжкі для дзяцей «У лясах Белавежы» (1975), «Самая лепшая хатка» (1976), «Вярэнька загадак» (1982), «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга» (1983), «Шыльдбюргеры. Па-нямецку пачуў, па-беларуску збаяў А. Клышка» (казкі, 1983), «Святло праз стагоддзі» (пра Ф. Скарыну, выдадзена на англійскай, нямецкай, французскай мовах, 1990).

Пераклаў на беларускую мову Новы запавет (асобныя раздзелы апублікаваны ў часопісе «Спадчына», 1989—1990).

## *Генадзь* КЛЯЎКО



Генадзь Якаўлевіч Кляўко нарадзіўся 1.5.1932 г. у вёсцы Варонічы Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Рудзенскай сярэдняй школы (1950) паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. За год да заканчэння універсітэта (з 1954) стаў адначасова працаваць у рэдакцыі газеты «Калгасная праўда». У 1961—1973 гг.— літсупрацоўнік, адказны сакратар часопіса «Вожык», у 1973—1979 гг.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны медалём.

Памёр 21.8.1979 г.

У рэспубліканскім друку з вершамі выступіў у 1950 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Абветраныя далягляды» (1962), «Сто крокаў» (1967), зборнікаў вершаў і паэм «Прыстань» (1974), «Плуг» (1978), «Вязьмо» (1984), зборнікаў гумарыстычных вершаў і мініяцюр «Лайдак і кнопкі» (1964), «Каб не сурочыць» (1971), «Што праўда, то не грэх...» (1971), «Падкова над парогам» (выбранае, 1979). Для дзяцей выдаў кніжку вершаў «Першы салют» (1964).

Перакладаў на беларускую мову творы пісьменнікаў народаў СССР. У 1975 г. у яго перакладзе выйшаў зборнік паўднёваасецінскай паэзіі «Трубіць алень».

## *Тодар* КЛЯШТОРНЫ



Тодар Тодаравіч Кляшторны нарадзіўся 11.3. 1903 г. у вёсцы Парэчча Лепельскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся на рабфаку ў Оршы. У 1931 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў на радыё, у рэспубліканскіх газетах і часопісах. Быў членам «Маладняка», «Узвышша», БелАПП. Восенню 1936 г. арыштаваны. 29.10.1937 г. прыгавораны

да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957 г.

Расстраляны 30.10.1937 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1925 г. (часопіс «Аршанскі маладняк»). Выйшлі зборнікі вершаў «Кляновыя завеі» (1927), «Светацені» (1928), «Ветразі» (1929), «Праз шторм на штурм» (1934), паэма «Палі загаманілі» (1930) і кніжка-малюнак для дзяцей «Пра зайца, ваўка і мядзведзя» (1935). У 1960 г. выдадзена кніга паэзіі «Залатое вязьмо», у 1970 г.— Выбраныя творы.

Пераклаў на беларускую мову раман Ф. Панфёрава «Брускі» (з М. Багуном, ч. 1, 1932), асобныя творы У. Маякоўскага, М. Асеева, А. Безыменскага, М. Галоднага, А. Лахуці, Л. Первамайскага.

---

## *Рыгор* КОБЕЦ



Рыгор Якаўлевіч Кобец (сапраўднае прозвішча Міхаіл Мусіевіч Сандыга) нарадзіўся 24.7.1898 г. у вёсцы Малыя Рагачыкі Кіраваградскай вобласці (Украіна) у сям'і рабочага.

Вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе, у народным рамесным, у рэальным вучылішчах. У першую сусветную вайну служыў у царскай арміі, удзельнічаў у баях у Галіцыі (1914—1916). Быў паранены. Працаваў токарам у Елісаветградзе, рабочым на Херсонскім заводзе сельгасмашын кампаніі «Эльворці» (завод «Чырвоная звязда»), маркіроўшчыкам на станцыі Елісаветград — Таварная (1916—1918). У час Лютаўскай рэвалюцыі ўвайшоў у федэрацыю анархістаў групы «Набат». У грамадзянскую вайну служыў у Чырвонаармейскім Брацкім палку (Елісаветград). Затым уступіў у рады Чырвонай гвардыі (1-шы інтэрнацыянальны батальён рэвваенсавета Паўднёвага фронту), перайшоў у армію Дзянікіна, працаваў у міліцыі. У 1919 г. ваяваў у асобным кавалерыйскім дывізіёне 1-й Коннай арміі С. М. Будзённага. Пад Варшавай быў цяжка паранены. Зноў трапіў пад уплыў анархістаў. Удзельнічаў у контррэвалюцыйным мяцяжы ў арміі С. М. Будзённага. Пасля хаваўся ад органаў ЧК (пад рознымі

прозвішчамі, апошняе — Р. Кобец). Працаваў качагарам у бальніцы, на Мінскім дражджавым заводзе «Пралетарый» (1922—1928), на піўзаводзе «Беларусь» (1928—1929). Скончыў тры курсы Мінскага вячэрняга рабочага тэхнікума (1928). Уваходзіў у літаратурнае аб'яднанне «Звенья» «Маладняка», у 1929—1930 гг.— загадваў сельгасаддзелам рэдакцыі газеты «Рабочий». Потым кансультант, загадчык сцэнарнага аддзела кінастудыі «Савецкая Беларусь» у Ленінградзе (1931—1937). У 1935 г. прызнаўся старшыні Саўнаркома БССР М. Галадзеду ў сваіх ранейшых сувязях з анархістамі, тады ж пастановай НКУС СССР быў амнісціраваны. У 1933, 1935, 1937 гг. ездзіў у творчыя камандзіроўкі ў Бірабіджан. Супрацоўнічаў у газетах «Биробиджанская правда», «Тихоокеанская звезда» (Бірабіджан). У 1938 г. рэпрэсіраваны ў Бірабіджане. У 1939 г. апраўданы. Пераехаў у Хабараўск, дзе працаваў рэдактарам студыі кінахронікі (1939—1941). У 1941 г. быў зноў арыштаваны, у 1942 г. рашэннем Асобай нарады прыгавораны да 10 год зняволення ў лагерах. Адбываў пакаранне на будоўлях чыгункі ў Тайшэце, Манголіі, у Забайкаллі. З 1951 г.— на пажыццёвым пасяленні ў Кіргізіі. Працаваў у саўгасе «Чалдавар» Фрунзенскай вобласці вартаўніком на вінаградніках, памочнікам пчаляра (у гарах Цянь-Шаня), загадчыкам хаты-чытальні, клуба, гаспадаркі ў школе. У 1958 г. вярнуўся ў Мінск. Справа перагледжана 19.10. 1960 г. Хабараўскім краявым судом, і Пастанова Асобай нарады СССР ад 4.10.1942 г. адменена. У 1963 г. быў пазбаўлены персанальнай пенсіі рэспубліканскага значэння за прыналежнасць да анархістаў. Член СП СССР з 1935 г.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1935).

Памёр 9.9.1990 г.

У беларускім друку выступіў у 1923 г. з вершамі і апавяданнямі (часопіс «Прафрух»). Пісаў на рускай і беларускай мовах. Апублікаваў п'есы «Гута» (1929, пастаўлена ў 1930), «Ратуй, божа!» (з А. Вольным, 1932), «А ўсё ж заспяваю» (1932), «На заставе» (1935), «Мигрень» (Хабараўск, 1940), аднаактоўкі «Цяжкі выпадак» (1961), «Катавасія брата Гервасія» (з А. Астрэйкам, 1962), «Нішто сабе жарты» (1962), «Святая тайна» (1965), «Піражкі з чырвонцамі» (1965). Напісаў кінасцэнарый «Паў-

станне гневу» (з А. Вольным, газета «Літаратура і мастацтва», 1936). Па яго сцэнарыях пастаўлены мастацкія фільмы «Ураган» (з Б. Брадзянскім, 1932), «Двойчы народжаны» (1933), «Шукальнікі шчасця» (з І. Зэльцарам, 1936, апублікаваны ў 1988, у 1987 г. выпушчаны відэафільм), «Дняпро ў агні» (з І. Барашкам, 1937), музычная камедыя «Счастливый берег» (з С. Бытавым, 1940). Выдаў кінааповесці «Герои Балтики» (Хабараўск, 1939), «Трофим Бутан» — новы варыянт «Паўстання гневу» (Хабараўск, 1940). У 1925 г. напісаў верш «Паравоз», які стаў папулярнай камсамольскай песняй.

У 1989 г. часопіс «Нёман» апублікаваў аповесць «Ноев ковчег» (напісана ў 1964).

---

## *Алена* КОБЕЦ-ФІЛІМОНАВА



Алена Рыгораўна Кобец-Філімонава (Кобец) нарадзілася 13.10.1932 г. у гарадскім пасёлку Круглае Магілёўскай вобласці (паводле пашпарта — у Мінску) у сям'і пісьменніка.

Скончыла Мінскую музычную школу-дзесяцігодку імя А. Александроўскай (1952). З 1953 г. працавала выкладчыцай у музычных школах Мінска, Выбарга, Стаўрапаля. У 1954—1955 гг. вучылася ў Ленінградзе ў Музычным вучылішчы імя Рымскага-Корсакава. Некаторы час жыла ў Грэцыі (1964—1966), вучылася ў Афінскай кансерваторыі. Скончыла Беларускую дзяржаўную кансерваторыю імя А. В. Луначарскага па класу раяля (1969), Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1971). Працавала рэдактарам на кінастудыі «Беларусьфільм» (1971—1972), рэдактарам выдавецтва «Юнацтва» (1981—1983). Член СП СССР з 1965 г.

З першым літаратурным творам выступіла ў 1959 г. Піша на рускай і беларускай мовах, пераважна для дзяцей. На беларускай мове выйшлі зборнікі вершаў для дзяцей «Казка пра месяц» (1963) і «Залатыя ручнік» (1972), аповесці «Жаваранкі над Хатынню» (1977), (рускае выданне Масква, 1973), «Блакітны экспрэс» (1981), «Агні за перавалам» (1985; гэтыя дзве аповесці перапрацаваны ў раман «Агні за пера-

валам», 1987), казкі «Вянок дзівосаў» (1986). На рускай — зборнік казак «Читайка и гуляйка» (1963), «Семь художников» (1965), кніга нарысаў «В королевстве... но не сказочном» (1968), «Сказки старого Янниса» (1969). Па матывах аповесці «Блакітны экспрэс» у 1978 г. пастаўлены аднайменны спектакль. Аўтар сцэнарыя мультфільма «Вася Буслік і яго сябры» (зняты ў 1974).

Пераклала на беларускую мову з навагрэчаскай зборнік вершаў Я. Рыцаса «Макронісас» (1973).

Укладальнік зборніка беларускай паэзіі «Земля с лазурными очами» (Масква, 1979).

---

## *Іван КОЗЕЛ*



Іван Васільевіч Козел нарадзіўся 21.5.1928 г. у вёсцы Канчаны Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Маладзечанскую сярэднюю школу № 1 імя Я. Купалы ў 1949 г. Настаўнічаў у Віткаўшчынскай пачатковай (1949—1959), Ермакоўскай сямігадовай (1959—1960) і Красненскай сярэдняй (1960—1963) школах Маладзечанскага раёна. Адначасова завочна скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955). Быў навуковым супрацоўнікам Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР (1963—1964), у 1964—1966 гг.— рэдактар Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, затым старшы рэдактар Камітэта па друку пры Савеце Міністраў БССР. У 1969 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Член СП СССР з 1961 г.

Памёр 30.1.1970 г.

Выступаў як драматург з 1957 г. Аўтар п'ес «Папараць-кветка» (1958, пастаўлена ў 1957, асобнае выданне ў 1959), «Канчане — суседзі мае» (апублікавана і пастаўлена пад назваю «Над хвалямі Серабранкі» ў 1961, асобнае выданне ў 1963).

## *Георгій КОЛАС*



Георгій Данілавіч Колас нарадзіўся 26.2.1929 г. на хутары Куцень Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

30.3.1930 г. у сувязі з калектывізацыяй і раскулачваннем сасланы разам з бацькамі на спецпасяленне ў Гаінскі раён Комі-Пярмяцкай нацыянальнай акругі. Вызвалены 14.9.1945 г. У 1947 г. скончыў філалагічны факультэт Кудымкарскага настаўніцкага інстытута, у 1951 г.— акцёрскі факультэт Беларускага дзяржаўнага тэатральнага інстытута. Два гады працаваў акцёрам Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя М. Горкага ў Мінску. Затым быў супрацоўнікам газеты «Сталинская молодежь», аспірантам Інстытута літаратуры і мастацтва АН БССР. У 1955—1960 гг.— галоўны рэдактар па рэпертуары драматычных тэатраў у Міністэрстве культуры БССР. Працаваў загадчыкам метадычнага кабінета культасветработы Белсаўпрофа. У 1961—1964 гг.— літсупрацоўнік газеты «Літаратура і мастацтва», у 1967—1971 гг.— рэдактар аддзела крытыкі, бібліяграфіі і мастацтва часопіса «Неман». Член СП СССР з 1964 г.

З артыкуламі пра тэатральнае мастацтва і драматургію пачаў выступаць у 1953 г. Выдаў брашуры «Тэатры Беларускай ССР у 2-й Прыбалтыйскай тэатральнай вясне» (1957), «Спектаклі юбілейнага сезона» (1958), «Николай Еременко» (Масква, 1968). Аўтар кнігі «Современник в гриме и без грима» (1963), зборніка артыкулаў «Диалог через рампу» (1967), шматлікіх артыкулаў аб старажытных беларускіх інтэрмедыях, аб творчасці драматургаў К. Марашэўскага, Я. Купалы, К. Губарэвіча, А. Маўзона, А. Макаёнка, А. Вярцінскага, І. Чыгрынава, А. Дударава, М. Матукоўскага, А. Дзялендзіка, Я. Шабана і інш.

Аўтар звыш дваццаці пяці сцэнарыяў дакументальных, навукова-папулярных кіна- і тэлефільмаў «Беларуская сюіта» (1966), «Я чую вестку» (1967), «Купалаўцы» (1970), «Мы — сіняблузнікі» (1971), «Жывая ніць» (1973), «Ларыса Александроўская» (1975), «Тры тысячы песень» (1976), «Мінск — пра час і пра

сябе» і «Лепей за тое, што ёсць» (1977), «Ігра без ігры» (1978), «Іван Шамякін» (1979), «Паклон мой народу за песні» і «Янка Купала» (1982), «Старажытныя паркі» (1989) і інш.

---

## *Якуб КОЛАС*



Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) нарадзіўся 3.11.1882 г. у засценку Акінчыцы (цяпер у межах горада Стоўбцы) Мінскай вобласці ў сям'і лесніка.

Раннія дзіцячыя гады прайшлі ў лесніковых сядзібах Ласток і Альбуць, што недалёка ад вёскі Мікалаеўшчына. Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1902). Настаўнічаў у вёсках Люсіна Ганцавіцкага раёна (1902—1904), Пінкавічы Пінскага раёна (1904—1906), Верхмень Смалявіцкага раёна (1906). За ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе быў звольнены (1906). Зімой 1906—1907 гг. жыў ва ўрочышчы Смольня, вёў прыватную школу. У 1907 г. працаваў у газеце «Наша ніва» ў Вільні, у 1908 г.— у прыватнай школе ў вёсцы Сані Талачынскага раёна. 15.9.1908 г. за ўдзел у настаўніцкім з'ездзе і нелегальную работу быў асуджаны на тры гады, адбываў пакаранне ў мінскім астрозе. У 1912—1914 гг. працаваў настаўнікам у 3-м прыходскім вучылішчы ў Пінску. У час першай імперыялістычнай вайны разам з сям'ёй эвакуіраваўся ў Дзмітраўскі павет Маскоўскай губерні, настаўнічаў у сяле Старыкава. Быў мабілізаваны ў армію (верасень 1915). Скончыў Аляксандраўскае ваеннае вучылішча (Масква, 1916). Служыў у запасным палку ў Пермі. Летам 1917 г. накіраваны на Румынскі фронт, але цяжка захварэў і быў эвакуіраваны ў горад Абаянь. Па дэкрэце Савецкага ўрада ў пачатку 1918 г. звольнены з войска як настаўнік. Працаваў на Куршчыне настаўнікам, школьным інструктарам. Па выкліку ўрада БССР у маі 1921 г. пераехаў у Мінск. Выкладаў у Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме, у Беларускім дзяржаўным універсітэце, чытаў лекцыі на курсах настаўнікаў, займаўся навуковай дзейнасцю ў Інстытуце беларускай культуры. З дня ўтварэння АН БССР (1 студзеня 1929 г.) быў

яе нязменным віцэ-прэзідэнтам. У 1935 г. удзельнічаў у рабоце Кангрэса ў абарону культуры ў Парыжы. У Вялікую Айчынную вайну жыў у Клязьме (пад Масквой), Ташкенце (жнівень 1941 — лістапад 1943), Маскве, займаўся творчай і навукова-грамадскай дзейнасцю. У снежні 1944 г. вярнуўся ў Мінск. Быў членам ЦВК БССР (1929—1931, 1935—1938), дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР (1946—1956) і БССР (1938—1956), з'яўляўся старшынёй Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру. Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны пяццю ордэнамі Леніна, ордэнамі Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

Народны паэт БССР (1926). Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1944).

Памёр 13.8.1956 г.

Пісаць пачаў на рускай мове. У друку дэбютаваў вершам, напісаным па-беларуску «Наш родны край» (14 верасня 1906 г. газета «Наша доля»). У 1910 г. у Вільні выйшаў першы зборнік вершаў «Песні-жальбы» (факсімільнае выданне ў 1982), затым — кнігі прозы «Апавяданні» (1912), «Родныя з'явы» (1914). У Пецярбургу ў 1913 г. асобнымі выданнямі выйшлі апавяданні «Тоўстае палена» і «Нёманаў дар», апавяданні вершам «Прапаў чалавек. Паслушная жонка. Грушы сапяжанкі» і «Батрак. Як Юрка збагацеў». У савецкі час выдадзены кніга апавяданняў «Казкі жыцця» (1926, 1-е выданне — Коўна, 1921), зборнік вершаў «Водгулле» (1922), паэма «Новая зямля» (1923), аповесць «У палескай глушы» (1923), зборнікі апавяданняў «Крок за крокам», «На рубяжы», «Першыя крокі», «У ціхай вадзе», паэма «Сымон-музыка» (усе ў 1925), аповесць «На прасторах жыцця» (1926, экранізавана ў 1929; уключаны і апавяданні, 2-е дапоўненае выданне ў 1928), аповесці «У глыбі Палесся» (1927), «Адшчапенец» (1932), «Дрыгва» (1934), зборнікі вершаў «Нашы дні» (1937), «Адпомсцім» (1942), «Голас зямлі» (1943), паэмы «Суд у лесе» (Масква, 1943), «Адплата» (1946), зборнік вершаў «Мой дом» (1946), паэма «Рыбакова хата» (1947), трылогія «На ростанях» (1955, інсцэніравана пад назвай «Навальніца будзе» ў 1958; экранізавана ў 1960—1961 гг.), збор-

нік вершаў «Жыве між нас геній» (1952) і інш. Многія вершы Я. Коласа пакладзены на музыку. Аўтар твораў для дзяцей — паэмы «Міхасёвы прыгоды» (1935), вершаванай казкі «Рак-вусач» (1938), зборнікаў вершаў «На рэчцы зімой» (1941), «Вершы для дзяцей» (1945), зборнікаў апавяданняў «У старых дубах» (1941), «Раніца жыцця» (1950). Апрацаваў шэраг беларускіх народных казак.

Аўтар п'ес «Антось Лата» (1917, пастаўлена ў 20-х гадах), «Забастоўшчыкі» (1925), «Вайна вайне» (1927, канчатковая рэдакцыя ў 1938, пастаўлена ў 1937), «У пушчах Палесся» (1938, пастаўлены ў 1937), аднаактоўкі «На дарозе жыцця» (1917).

Выступаў у галіне публіцыстыкі і літаратурнай крытыкі. У 1957 г. выйшаў зборнік «Публіцыстычныя і крытычныя артыкулы». Выдаў падручнікі «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (Пецярбург, 1909) і «Методыка роднае мовы» (1926).

Пераклаў на беларускую мову паэмы «Палтава» А. Пушкіна, паасобныя творы Т. Шаўчэнкі, П. Тычыны, А. Міцкевіча, Р. Тагора і інш. Быў адным з рэдактараў «Русско-белорусского словаря» (1953).

Выйшлі Зборы твораў у 7-мі (1952), 12-ці (1961—1964), 14-ці (1972—1978) тамах. Неаднаразова перавыдаваліся Выбраныя творы (апавяданні, вершы і паэмы).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946) за вершы ваеннага часу, Дзяржаўнай прэміі СССР (1949) за паэму «Рыбакова хата».

---

## *Уладзімір КОНАН*



Уладзімір Міхайлавіч Конан нарадзіўся 23.4. 1934 г. у вёсцы Вераскава Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1952 г. скончыў Вераскоўскую сярэднюю школу, працаваў камсоргам у школе (1952—1953), затым у мясцовым калгасе. У 1954 г. паступіў на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння універсітэта (1959) — настаўнік, а з 1960 г.— дырэктар Стражоўскай васьмігадовай

школы Вілейскага раёна. Пасля заканчэння аспірантуры пры Інстытуце філасофіі і права АН БССР (1964) — навуковы супрацоўнік, затым загадчык сектара эстэтыкі і сацыяльнай псіхалогіі, з 1986 г.— вядучы навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Доктар філасофскіх навук. Член СП СССР з 1982 г.

Даследуе пытанні гісторыі і тэорыі эстэтыкі і літаратуразнаўства Беларусі. Першы артыкул надрукаваў у 1963 г. (часопіс «Весці АН БССР»). Піша на беларускай і рускай мовах. Аўтар кніг «Развіццё эстэтычнай думкі ў Беларусі. 1917—1934 гг.» (1968), «Демократическая эстетика Белоруссии. 1905—1917» (1971), «Очерк истории эстетической мысли Белоруссии» (з Э. Дарашэвічам, Масква, 1972); «Адам Бабарэка: Крытыка-біяграфічны нарыс» (1976), «От Ренессанса к классицизму» (1978), «Эстетическая мысль Советской Белоруссии» (1978), «Проблемы искусства и эстетики в общественной мысли Белоруссии начала XX в.» (1985), «Беларуская эстэтыка і мастацкая культура: гістарычныя традыцыі і сучаснасць» (1988), «Ля вытокаў самапазнання: станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору» (1989), брашур «Святло для людзей» (1989), «Боская і чалавечая мудрасць» (1990). У перыядычным друку выступае з артыкуламі пра творчасць беларускіх пісьменнікаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1984) за цыкл калектыўных даследаванняў па гісторыі філасофіі і грамадскай думкі Беларусі.

---

## *Уладзімір* КОРБАН



Уладзімір Іванавіч Корбан нарадзіўся 25.8. 1910 г. у пасёлку Барань Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і рабочага.

Працоўны шлях пачаў токарам на аршанскім заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у 1926 г. Сярэднюю адукацыю атрымаў у вячэрняй школе (1930). У 1930—1932 гг.— токар на Ленінградскім суднабудаўнічым заводзе. У 1932— 1934 гг.— у Чырвонай Арміі. Потым працаваў старшынёй заўкома аршанскага завода «Чырвоны Кастрычнік», старшынёй будкома льнокам-

біната. Удзельнічаў у паходзе 1939 г. у Заходнюю Беларусь. Завочна вучыўся ў Мінскім юрыдычным інстытуце (скончыў два курсы). У гады Вялікай Айчыннай вайны камандаваў стралковай ротай, працаваў у аператыўным аддзеле штаба дывізіі, удзельнічаў у баях пад Бранскам і Арлом, за вызваленне Беларусі, ва Усходняй Прусіі. У 1946 і ў 1948—1952 гг. зноў на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» — галоўны механік, начальнік цэха, начальнік аддзела кадраў. З канца 1946 да студзеня 1948 г.— дырэктар цвікавага завода ў Лідзе. З 1952 г. працаваў у часопісе «Вожык», у 1967—1971 гг.— галоўны яго рэдактар. Член СП СССР з 1948 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1970).

Памёр 30.11.1971 г.

Першыя байкі надрукаваў у рэспубліканскім друку ў 1946 г. Аўтар зборнікаў вершаў, баек і фельетонаў «Мы іх ведаем» (1950), «Байкі» (1953), «З вецярком» (1957), «Дакладныя прыкметы» (1958), «Гарачая прыпарка» (1959), «Дзе гэта вуліца?» (1961), «Сіняк» (1964), «Не на сваім месцы» (1965), «Свінні ў рэпе» (1968), «Дзям'янава юшка» (1970), «Шклянка чаю» (выбранае, 1970), «Закаханы морж» (1972), «Выбранае» (1976), «Жук і мёд» (1980), «Не на сваім месцы» (1990), зборнікаў гумарыстычных апавяданняў «Да цешчы на бліны» (1963), «Дзядзькава крыўда» (1982). Для дзяцей выйшлі кніжкі вершаў і баек «Янка і санкі» (1957), «Пра жывёл і пра звяроў» (1963), «Учора, сёння і заўжды» (1963), «Суседні двор» (1967).

На беларускую мову пераклаў творы І. Крылова, Лесі Украінкі, Т. Масэнкі, Мірмухсіна, А. Юшчанкі і інш.

## *Мікола* КОРЗУН



Мікола (Мікалай Паўлавіч) Корзун нарадзіўся 1.5.1934 г. у вёсцы Заўшыцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1937—1938 гг. памерлі бацькі. Выхоўваўся ў Слуцкім дзіцячым доме. У 1956 г. скончыў Смілавіцкі сельскагаспадарчы тэхнікум. Працаваў на розных пасадах у саўгасах «Бараўляны» (Мінскі раён), імя Янкі Купалы (Радашковіцкі раён), у Інстытуце эканомікі і арганізацыі сельскай гаспадаркі (Мінск). Завочна вучыўся ў Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага. У 1973—1976 гг.— загадчык філіяла Літаратурнага музея Янкі Купалы ў Вязынцы, у 1976—1978 гг.— навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Якуба Коласа, у 1978—1981 гг.— дырэктар «Кнігарні пісьменніка», у 1982—1986 гг.— садоўнік, аграном Літаратурнага музея Янкі Купалы, у 1986—1989 гг.— аграном Аб'яднання літаратурных музеяў БССР. Член СП СССР з 1981 г.

Першае апавяданне апублікаваў у 1958 г. (часопіс «Бярозка»). Піша для дзяцей. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Жывы куток» (1962), «Віця Сітніца» (дакументальная аповесць, 1964), «Тры сонцы» (1971), «Чырвоныя зоркі на танках» (1974), «Навальнічная паласа» (дакументальная аповесць, 1979), «Святло чароўнай зоркі» (1989).

## *Аляксей* КОРШАК



Аляксей Ігнатавіч Коршак нарадзіўся 22.2. 1920 г. у вёсцы Вуглы Капыльскага раёна Мінскай вобласці.

Скончыў Капыльскую сярэднюю школу (1938). Вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1938—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны жыў у Капылі. У 1944 г. прызваны ў Савецкую Армію. Быў разведчыкам.

Загінуў 27.2.1945 г. на фронце ва Усходняй Прусіі пад паселішчам Ласлейндорф.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1937 г.

Першыя вершы ў рэспубліканскім друку апублікаваў у 1938 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Зборнік вершаў «Апаленыя пялёсткі» выйшаў у 1963 г. Асобныя вершы змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Крывёю сэрца» (1967).

---

## *Валянціна КОЎТУН*



Валянціна Коўтун (Валянціна Міхайлаўна Новік) нарадзілася 6.4.1946 г. у вёсцы Дземяхі Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўніка.

У 1963 г. скончыла Малоткавіцкую сярэднюю школу, працавала піянерважатай у Паршавіцкай (цяпер Бярозавіцкай) сярэдняй школе Пінскага раёна. У 1964 г. паступіла на філалагічны факультэт Львоўскага дзяржаўнага універсітэта імя І. Франка, а з 4 курса перавялася ў Беларускі дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна (скончыла ў 1969). Працавала настаўніцай мовы і літаратуры Варнянскай сярэдняй школы Астравецкага раёна (1969—1970), літкансультантам «Сельской газеты» (1970—1976). З 1976 г.— літсупрацоўнік, з 1979 г.— рэдактар аддзела крытыкі і літаратуразнаўства часопіса «Полымя», з 1982 г.— загадчык рэдакцыі літаратуры для юнацтва выдавецтва «Юнацтва», з 1990 г.— старшы рэдактар аддзела прозы часопіса «Полымя». У 1977—1980 гг. вучылася ў аспірантуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1976 г.

У друку выступае з 1966 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Каляровыя вёслы» (1971), «На ўзлёце дня» (вершы і паэмы, 1977), «На зломе маланкі» (1981), «Метраном» (1985), «Лісты да цябе» (вершы і паэмы, 1988), рамана «Крыж міласэрнасці» (1988). Для дзяцей напісала кніжкі вершаў «Мы робім казку» (1983), «Вясёлы заасад» (1986), зборнік апавяданняў «Калінавая гронка залатая» (1988).

Выступае таксама як крытык і літаратуразнаўца. Выйшлі кнігі «Святло народнага слова: Паэтычны лад беларускай народнай песні» (1984), «Крыніца паэзіі: На шляхах эпізацыі» (1987).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова (1986) за кнігу паэзіі «Метраном».

---

*Кандрат* КРАПІВА



Кандрат Крапіва (Кандрат Кандратавіч Атраховіч) нарадзіўся 5.3.1896 г. у вёсцы Нізок Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў царкоўнапрыходскай школе ў вёсцы Нізок, Уздзенскім народным вучылішчы, 4-класным гарадскім вучылішчы ў Стоўбцах, з якога перавёўся ў такое ж вучылішча ў Койданава (цяпер Дзяржынск). Пасля заканчэння (1913) здаў экстэрнам экзамен на званне народнага настаўніка. Восенню 1914 г. атрымаў месца настаўніка ў пачатковай земскай школе ў вёсцы Мнішаны на Міншчыне. Адпрацаваў год і быў мабілізаваны ў армію. У сакавіку 1916 г. скончыў школу прапаршчыкаў. Удзельнічаў у баях на Румынскім фронце. Як настаўнік у лютым 1918 г. дэмабілізаваны. Настаўнічаў у вёсцы Каменка на Уздзеншчыне. У 1920—1923 гг.— камандзір у Чырвонай Арміі. З 1924 г. зноў настаўнічаў на Уздзеншчыне ў пасёлку Астравок. У 1925 г. пераязджае ў Мінск. Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк» (да 1926), потым «Узвышша». Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ (1930). Працаваў інструктарам Цэнтральнага бюро краязнаўства пры Інбелкульце (1925—1926), загадчыкам аддзела ў часопісе «Полымя рэвалюцыі» (1932—1936). Удзельнічаў у паходзе Савецкай Арміі ў Заходнюю Беларусь (1939), у савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гг. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны працаваў у франтавой газеце «За Савецкую Беларусь», у 1943—1945 гг. рэдагаваў сатырычную газету-плакат «Раздавім фашысцкую гадзіну». У пасляваенныя гады — рэдактар часопіса «Вожык» (1945—1947), загадчык сектара мовазнаўства Інстытута мовы і літаратуры АН БССР (1947—1952), дырэктар Інстытута мовазнаўства АН БССР (1952—1956). У 1946 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце I сесіі Генеральнай Асамблеі

ААН. У 1956 — студзені 1982 гг.— віцэ-прэзідэнт АН БССР. Са студзеня 1982 г. па сакавік 1989 г.— вядучы навуковы супрацоўнік-кансультант у аддзеле лексікалогіі і лексікаграфіі Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. Доктар філалагічных навук, акадэмік АН БССР. Неаднаразова абіраўся дэпутатам (1947—1990), старшынёй Вярхоўнага Савета БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Герой Сацыялістычнай Працы (1975). Узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Дружбы народаў і медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1956). Заслужаны дзеяч навукі БССР (1978).

Памёр 7.1.1991 г.

Пісаць пачаў у 1922 г. Першыя фельетоны і сатырычныя вершы надрукаваў у газетах «Красноармейская правда» і «Савецкая Беларусь» (1922). Аўтар кніг сатыры і гумару «Асцё» (1925), «Крапіва» (1925, 4-е перапрацаванае, дапоўненае выданне ў 1932), «Біблія» (1926), «Байкі» (1927), «Ухабы на дарозе» (1930), «Пра нашых шкоднікаў, папоў ды ўгоднікаў» (1930), «Хвядос — Чырвоны нос» (1931, вершаваная казка), «Калючы строй» (1932), «Выбраныя байкі» (1932), «Выбраныя вершы» (1935), «Выбраная сатыра» (1938), «Выбраныя творы» (1941, 1947, 1948), «Смех і гнеў» (1946), «Сатыра і гумар» (1954), «Жаба ў каляіне» (1957), «Байкі, вершы, п'есы» (1960), «Сорак баек» (1966), «Вершы і байкі» (1967, 1990), «Байкі і вершы» (1971), «Пучок жыгучкі» (1973), а таксама кніжкі для дзяцей «Загадкі дзеда Кандрата» (1986).

Аўтар п'ес «Канец дружбы» (апублікавана і пастаўлена ў 1934), «Партызаны» (апублікавана і пастаўлена ў 1937), «Хто смяецца апошнім» (апублікавана і пастаўлена ў 1939, па сцэнарыі аўтара пастаўлены ў 1954 г. аднайменны кінафільм), «Проба агнём» (апублікавана і пастаўлена ў 1943), «Валодзеў гальштук» (1945, пастаўлена ў 1946, аднаактоўка), «Мілы чалавек» (1945, 1956, пастаўлена ў 1946), «З народам» (апублікавана і пастаўлена ў 1948), «Пяюць жаваранкі» (апублікавана і пастаўлена ў 1950, па сцэнарыі аўтара пастаўлены ў 1953 г.

аднайменны кінафільм), «Зацікаўленая асоба» (апублікавана і пастаўлена ў 1953), «Людзі і д'яблы» (апублікавана і пастаўлена ў 1958), «Брама неўміручасці» (1973, пастаўлена ў 1974), «На вастрыі» (1982, пастаўлена ў 1983).

Выдаў зборнікі прозы «Апавяданні» (1926), «Людзі-суседзі» (1928), «Жывыя праявы» (1930), раман «Мядзведзічы» (кн. 1, 1932), нарыс «Герой Савецкага Саюза Міхаіл Сільніцкі» (1943). Выдадзены Збор твораў у 3-х (1956), 4-х (1963), 5-ці (1974—1976), Выбраныя творы ў 2 тамах (1986).

Аўтар літаратуразнаўчых і крытычных артыкулаў, лінгвістычных прац, адзін з навуковых рэдактараў (з Я. Коласам і П. Глебкам) «Русско-белорусского словаря» (1953), навуковы рэдактар «Беларуска-рускага слоўніка» (1962, выданне 2-е перапрацаванае і дапоўненае ў 1988—1989), «Русско-белорусского словаря» (выданне 2-е, перапрацаванае і дапоўненае, 1982), «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» ў 5 тамах (1977—1984) і інш.

На беларускую мову пераклаў асобныя працы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна, творы Дз. Фанвізіна, І. Крылова, А. Пушкіна, М. Гогаля, А. Астроўскага, А. Чэхава, У. Маякоўскага. А. Твардоўскага, Т. Шаўчэнкі і інш.

К. Крапіве тройчы прысуджаліся Дзяржаўныя прэміі СССР: у 1941 г.— за п'есу «Хто смяецца апошнім», у 1951 г.— за п'есу «Пяюць жаваранкі», у 1971 г.— за комплекс прац у галіне беларускай лінгвагеаграфіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1974) за п'есу «Брама неўміручасці».

---

## *Усевалад КРАЎЧАНКА*



Усевалад Ігнатавіч Краўчанка нарадзіўся 14.10. 1915 г. у вёсцы Каплічы Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўніка.

Пасля заканчэння рабфака ў Мазыры (1933) і да 1941 г. працаваў у рэдакцыі раённай газеты «Калгаснік Мазыршчыны» (пазней рэарганізаванай у абласную газету «Бальшавік Палесся»). Адначасова завочна вучыўся на літаратурным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта (скончыў два курсы). У першы год вайны —

супрацоўнік армейскай газеты «Боевое знамя». Потым на журналісцкай рабоце ў Саратаўскай вобласці, з мая 1943 г.— загадчык аддзела партызанскага жыцця ў газеце «Савецкая Беларусь». З 1945 г.— адказны сакратар часопіса «Полымя». З 1950 г.— адказны сакратар, у 1953—1961 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Бярозка». Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 27.8.1961 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1933 г. (часопіс «Чырвоная Беларусь»). Аўтар зборнікаў аповесцей, апавяданняў «На крутым павароце» (1937), «Калгасныя навелы» (1940), «Зямля гудзе» (1945), «Станаўленне» (1947), «У імя Радзімы» (1948), «Жыта красуе» (1951), «Вясна на Палессі» (уключаны аднаактовыя п'есы, 1952), «Крыгаход» (1957), «Не поле перайсці» (1958), «Зорка Венера» (1960), «Над хвалямі Прыпяці» (выбранае, 1964), «Крыгалом» (1985). Выйшлі кнігі для дзяцей «Таямніца аднае вышкі» (1935). «Дзве сяброўкі» (1948, 1959). «Падарунак» (1950), «Тэорыя імавернасці» (1958). «Злачынства ля Зялёнай тоні» (1961), «Таямніца вугла альфа» (выбранае, 1973).

Выдаў зборнік аднаактовых п'ес «Апошняя варажба» (1960).

Пераклаў з рускай і ўкраінскай моў на беларускую «Бялее парус адзінокі» В. Катаева (1949), «Сцяганосцы» А. Ганчара (з І. Мележам, 1949), «Служу Радзіме» І. Кажадуба (1950) і інш.

---

## *Мікалай КРУГАВЫХ*



Мікалай Пятровіч Кругавых нарадзіўся 12.5. 1926 г. у сяле Сярэдні Егарлык Цалінскага раёна Растоўскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

Працоўны шлях пачаў у 1941 г. з учотчыка ў калгасе. У 1943 г. быў прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны служыў на звыштэрміновай службе ў Мінску. Скончыў завочна сярэднюю школу (1957), вучыўся на гістарычным факультэце

Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1967 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Быў членам сцэнарнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм» (1973—1976), у 1976—1979 гг.— кансультант СП БССР. Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Літаратурнай працай займаецца з 1948 г. Піша на рускай мове. Аўтар раманаў «Честь ярма не приемлет» (1962), «Где не ждут тишины» (1968), «Дорога в мужество» (1971), аповесцей «Не ради славы» (1964), «Ленькина удача» (1978), «Юрка — сын командира» (1979), «Звезды во мгле» (1982).

У сааўтарстве з Ф. Коневым напісаў сцэнарый мастацкага фільма «Абочына» (пастаўлены ў 1978), у сааўтарстве з С. Бадровым — «Юрка — сын камандзіра» (пастаўлены ў 1984).

---

## *Міхаіл КРУЛЬ*



Міхаіл Аляксандравіч Круль нарадзіўся 17.2. 1943 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і служачых.

З 1945 г. жыве ў Мінску. Скончыў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум (1961). Працаваў майстрам на будоўлі, старшым тэхнікам у інстытуце «Белпрампраект», інжынерам у органах кіраўніцтва сельскім будаўніцтвам рэспублікі. З 1964 г. працуе на інжынерных пасадах у трэсце «Аўтарэмбудмантажтэхніка». У 1968 г. скончыў вячэрняе аддзяленне факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Член СП СССР з 1989 г.

У 1963 г. пачаў выступаць з артыкуламі, нарысамі, карэспандэнцыямі. Піша на рускай мове. Аўтар кніг аповесцей «Лунная лошадь» (1980) і «День Юпитера» (1987).

*Яўген* КРУПЕНЬКА



Яўген Міхайлавіч Крупенька нарадзіўся 20.8. 1936 г. у вёсцы Саськаўка Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў літсупрацоўнікам у рэдакцыі шклоўскай раённай газеты «Чырвоны барацьбіт» (1954—1955). Служыў у Савецкай Арміі (1955—1958). З 1958 г.— літсупрацоўнік газеты «За вяртанне на Радзіму» (цяпер «Голас Радзімы»), з 1959 г.— часопіса «Блакнот агітатара», з 1961 г.— загадчык аддзела часопіса «Бярозка». У 1970 г. скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. Пасля заканчэння інстытута — супрацоўнік газеты «Чырвоная змена». Член СП СССР з 1980 г.

Памёр 4.2.1990 г.

Першыя вершы ў рэспубліканскім друку апублікаваў у 1956 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў вершаў «Салаўі» (1969), «Нядзеля» (1972), «Бусліны човен» (1975), «Слон пад мікраскопам» (вершы, байкі, мініяцюры, 1978), «Стрэчанне» (1981), «Юбілейныя бліны» (гумар і сатыра, 1984), «Карэнні» (вершы, байкі, паэмы, 1986), «Гекзаметр баразны» (1988), а таксама кніжак паэзіі для дзяцей «Малінавы год» (1971), «Колеры» (1973), «Нашы святы» (1975), «Усе работы добрыя» (1977), «Хто нам дом пабудаваў» (1978).

Перакладаў на беларускую мову творы рускіх і грузінскіх паэтаў. Выступаў з літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі.

*Сяргей* КРЫВЕЦ



Сяргей Міхайлавіч Крывец нарадзіўся ў 1909 г. у вёсцы Дубна Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Быў пастухом, цесляром. Займаўся самаадукацыяй. Вучыўся ў Беластоцкім педагагічным інстытуце (1940—1941). У 1930—1933 гг. жыў у Гродна, у 1933—1944 гг.— у Беластоку. Удзельнічаў у рэвалюцыйным руху, трапіў у астрог. У час Вялікай Айчыннай вайны (1944—1945) служыў у Савецкай Арміі.

Загінуў 28.4.1945 г. пад час штурму Гдыні.

Друкаваўся ў прагрэсіўных заходнебеларускіх выданнях. У 1928 г. у часопісе «Заранка» апублікаваў першы верш. Пісаў на беларускай, рускай, польскай і нямецкай мовах. Вершы змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Сцягі і паходні» (1965), «Крывёю сэрца» (1967), «Ростані волі» (1990). У 1972 г. выйшла кніжка вершаў «Дубок», укладзеная Р. Шырмам.

---

## *Алесь КРЫГА*



Алесь Крыга (Аляксандр Аляксандравіч Асіпенка) нарадзіўся 1.5.1943 г. у горадзе Мінску ў сям'і пісьменніка.

Пасля заканчэння дзесяцігодкі (1960) працаваў на Мінскім заводзе аўтаматычных ліній фрэзероўшчыкам. Вучыўся на вячэрнім, потым на завочным аддзяленні Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў у 1989). У 1962—1966 гг. служыў на Ваенна-Марскім Флоце. З 1967 г.— літсупрацоўнік рэдакцый рэспубліканскіх газет «Чырвоная змена», «Физкультурник Белоруссии», «Піянер Беларусі». У 1971—1972 гг. плаваў матросам траўлера на Поўначы. З 1972 г.— літсупрацоўнік іванаўскай раённай газеты «Чырвоная звязда» Брэсцкай вобласці, у 1989—1990 гг.— загадчык аддзела пісьмаў брагінскай раённай газеты «Маяк Палесся». З 1990 г.— стыльрэдактар газеты «Вячэрні Мінск». Член СП СССР з 1975 г.

Першую аповесць «Я вернусь к тебе, море!» апублікаваў у 1965 г. (газета «На страже Заполярья»). Аўтар аповесцей «Паўночны фарватэр» (1971), «Порт прызначэння» (1974), «Чайкі над полем» (часопіс «Маладосць», 1978), «Марзянка для нелюбімых» (аповесць і апавяданні, 1988), кнігі для дзяцей «Медзведзяня шукае сяброў» (1987), мастацка-публіцыстычнай кнігі «Выбух над Прыпяццю» (часопіс «Полымя», 1990).

## *Уладзімір* КУДЗІНАЎ



Уладзімір Георгіевіч Кудзінаў нарадзіўся 27.5. 1935 г. у горадзе Бранску (Расія) у сям'і рабочага.

У 1958 г. скончыў горны факультэт Маскоўскага горнага інстытута. Працаваў майстрам, тэхнаруком рудніка, начальнікам кар'ера ў Курскай і Арлоўскай абласцях (1958—1960), майстрам, прарабам на будаўніцтве газаправодаў на Беларусі (1960—1964), старшым майстрам, намеснікам начальніка Мінскага механізаванага кар'ера. З 1967 г.— старшы рэдактар аддзела прозы часопіса «Неман». Член СП СССР з 1969 г.

Памёр 21.8.1990 г.

Літаратурную працу пачаў у 1961 г. У рэспубліканскім друку першыя апавяданні надрукаваў у 1962 г. (газета «Знамя юности»). Пісаў на рускай мове. Аўтар кніг прозы «Разделение радости» (1968), «Предчувствие перемен» (1972), «Сполохи» (1978), «Ольховатская история» (1984), «Первоосень» (1987).

Пераклаў на рускую мову асобныя творы В. Адамчыка, А. Бялевіча, А. Карпюка, П. Місько, І. Пташнікава і інш.

## *Анатоль* КУДРАВЕЦ



Анатоль Паўлавіч Кудравец нарадзіўся 1.1. 1936 г. у вёсцы Аколіца Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Слуцкае педагагічнае вучылішча (1955). Кароткі час настаўнічаў у Віркаўскай сямігадовай школе Клічаўскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1955—1958). У 1958—1963 гг. вучыўся на аддзяленні журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Адначасова (з 1961) працаваў у рэдакцыі газеты «Калгасная праўда». Пасля заканчэння універсітэта працаваў рэдактарам на Беларускім радыё (1963—1965), літсупрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва» (1965—1966), рэдактарам выдавецтва «Беларусь» (1966—1970), адказным

сакратаром часопіса «Маладосць» (1970—1972), галоўным рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1972—1974), інструктарам, загадчыкам сектара мастацкай літаратуры ЦК КПБ (1974—1978). З 1978 г.— галоўны рэдактар часопіса «Неман». У 1979 г. удзельнічаў у рабоце XXXIV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член СП СССР з 1969 г.

Першыя апавяданні апублікаваў у 1960 г. (газета «Калгасная праўда», часопіс «Маладосць»). Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «На зялёнай дарозе» (1968), «Раданіца» (1971), «Дзень перад святам» (1975), «Зімы і вёсны» (1976), «На балоце скрыпелі драчы» (1979), «За чужымі далямі» (падарожныя нарысы, 1981), «Сачыненне на вольную тэму» (раман, апавяданні, 1985), «Блакітны вярблюд» (1990). У 1986—1987 гг. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах. Напісаў сцэнарыі тэлефільма «Восеньскія яблыкі» (1975, пастаўлены ў 1977), кінафільма «Раданіца» (з Ф. Коневым, пастаўлены ў 1985).

У яго перакладах на беларускую мову выйшлі «Падарожжы Гулівера» Дж. Свіфта (1974), «Сібірскія апавяданні» У. Іванава (1975), раманы Н. Нурпеісава «Змрок» (1978), «Нягоды» (1981), аповесць К. Сіманава «Дні і ночы» (1979), «Аповесці» А. Тамсаарэ (1980), У. Караленкі «Апошні прамень» (выбранае, 1984), асобныя творы рускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў.

---



## *Анатоль* КУДРАЎЦАЎ

Анатоль Іванавіч Кудраўцаў нарадзіўся 1.1. 1947 г. у вёсцы Вусць-Дзёміна Ельнінскага раёна Смаленскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Мархоткінскай дзесяцігодкі (1963) працаваў настаўнікам Чашчоўскай пачатковай школы, інструктарам Ельнінскага райкома камсамола, карэспандэнтам раённай газеты «Знамя». У 1965—1971 гг. вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Адначасова працаваў спецыяльным карэспандэнтам смаленскай абласной маладзёжнай газеты «Смена» (1967—1968), літсупрацоўнікам газеты «Вячэрні Мінск» (1968—1972). З 1972 г.— адказны сакратар газеты «Вячэрні Мінск», з 1977 г.—

галоўны рэдактар творчага аб'яднання «Летапіс кінастудыі «Беларусьфільм», у 1982—1985 гг.— член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм». Член СП СССР з 1986 г.

Літаратурнай працай займаецца з 1965 г. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар зборніка «Минск и минчане» (1973), кнігі апавяданняў і аповесцей «Бессонница» (1990), п'ес «Иван» (1985, пад назвай «Иван и Мадонна» апублікавана ў зборніку п'ес «Вдоль деревни», Масква, 1986, пастаўлена ў 1986), «Мар'я» (урывак апублікаваны ў 1987, пастаўлена ў 1986), «Как цари жили» (1988, пастаўлена ў 1989), «Суд» (1989, пастаўлена ў 1990), «Донати промазала» (1990), сцэнарыяў мастацкіх фільмаў «Зачем человеку крылья» (1984), «Затянувшийся экзамен» (1985), «Іван» (1982), «З юбілеем пачакаем» (1985), «Чалавек, які браў інтэрв'ю» (1986) і некалькіх дакументальных фільмаў.

---

## *Іван* КУДРАЎЦАЎ



Іван Фёдаравіч Кудраўцаў нарадзіўся 28.6.1922 г. у вёсцы Сыцянец Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

За 2 гады да Вялікай Айчыннай вайны паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. На пачатку вайны эвакуіраваны з Мінска, настаўнічаў у Саранскім раёне (Мардовія). Быў прызваны ў Савецкую Армію, ваяваў на Заходнім, Варонежскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскім і Ленінградскім франтах. Дэмабілізаваны ў 1945 г. У 1948 г. скончыў БДУ. Займаўся завочна ў аспірантуры. Быў літработнікам, загадчыкам літаратурнага аддзела газеты «Літаратура і мастацтва», адказным сакратаром часопіса «Беларусь». У 1965—1970 гг.— навуковы супрацоўнік навукова-даследчага Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР, у 1971—1974 гг.— загадчык літаратурнай часткі Белдзяржфілармоніі. З 1975 г. да 1988 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1950 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

У друку з літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі выступае з 1947 г. Аўтар манаграфіі «Кузьма Чорны: Ідэі і вобразы ў творчасці» (1956), літаратуразнаўчага нарыса «Кузьма Чорны: Жыццё і творчасць» (1968), склаў з У. Агіевічам падручнікі «Кніга для чытання ў 2 класе школ рабочай і сельскай моладзі» (1952), «Кніга для чытання ў 3 класе школ рабочай і сельскай моладзі» (1952).

Аўтар рамана «Разгневаная зямля» (1984). У 1948—1949 гг. працаваў над перакладам 18-га т. Збору твораў У. І. Леніна (1950).

---

## *Анатоль* КУЗЬМІЧОЎ



Анатоль Пятровіч Кузьмічоў нарадзіўся 20.5. 1923 г. на станцыі Узлавая Тульскай вобласці (Расія) у сям'і чыгуначніка.

У сувязі з набліжэннем фронту восенню 1941 г. накіраваўся на ўсход, працаваў рабочым на базе заготзбожжа ў Пугачоўскім раёне Саратаўскай вобласці. На пачатку 1942 г.— літсупрацоўнік рэдакцыі чыгуначнай газеты «Углярка» (г. Узлавая). З мая 1942 г.— у арміі. Удзельнічаў у баях як мінамётчык, служыў у карпуснай газеце «В бой за Родину!». Ваяваў на Бранскім, Паўднёва-Заходнім і 3-м Украінскім франтах. Працаваў у газеце Закаўказскай ваеннай акругі «Ленинское знамя» (1947—1956), быў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Литературная Грузия» (1957—1959). Скончыў два курсы завочнага аддзялення Літаратурнага інстытута імя М. Горкага (1955). З 1967 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1952 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Друкавацца пачаў у 1940 г. Піша на рускай мове. Аўтар п'ес «В нашем полку» (пастаўлена ў 1951), «Возвращение» (пастаўлена ў 1953), «Орлиный перевал» (пастаўлена ў 1958).

Выступае і ў жанры прозы. Выйшлі ў Тбілісі, Маскве аповесці «По свежему следу» (1955), «Смена караулов» (1967), «Первые советские гвардейцы» (1971), раманы «Так наступает весна» (1958), «Юго-Запад» (1962, перавыдадзены ў Мінску ў 1976), «Тревога» (1964), «Дети становятся взрослыми» (1965), «Одиннадцатый

класс» (1967), «Год службы» (1979). У Мінску выйшлі раманы «Поле боя» (1979), «Подпольная кличка — Янош» (1987), кнігі прозы «Час переклички» (дакументальная аповесць, 1981), «Ночная проверка» (аповесці, 1982), «Тревога» (раман, аповесці, 1983), «Запечатленные навек» (дакументальная аповесць, 1984).

---

## *Уладзімір КУЗЬМЯНКОЎ*



Уладзімір Іванавіч Кузьмянкоў нарадзіўся 27.6. 1936 г. у вёсцы Устаннае Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1955) працаваў у калгасе. Восенню 1955 г. быў прызваны ў Савецкую Армію. У 1957 г. дэмабілізаваны. Працаваў адказным сакратаром казлоўшчынскай раённай газеты «Сцяг перамогі» (1957—1958). Скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1963). Быў літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела, адказным сакратаром рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». У 1971—1974 гг.— адказны сакратар часопіса «Политинформатор и агитатор». З 1974 г.— загадчык аддзела, адказны сакратар рэдакцыі газеты «Звязда», з 1980 г.— рэдактар «Настаўніцкай газеты», з 1987 г.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларуская мова і літаратура ў школе». З 1989 г.— старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ. Кандыдат гістарычных навук. Член СП СССР з 1974 г.

Узнагароджаны медалём.

Першае апавяданне апублікаваў у 1966 г. (часопіс «Полымя»). Піша на беларускай і рускай мовах. Выдаў зборнік апавяданняў «Ішла вясна» (1972), кнігу «Восславляя дружбу народов» (1981).

*Аляксей* ***КУЛАКОЎСКІ***



Аляксей Мікалаевіч Кулакоўскі нарадзіўся 24.12.1913 г. у вёсцы Кулакі Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1931 г. скончыў Рагачоўскую прафтэхшколу і некаторы час загадваў дрэваапрацоўчай арцеллю ў Касцюковічах на Магілёўшчыне. З гэтага ж года перайшоў на журналісцкую работу — адказны сакратар шматтыражкі, загадчык аддзела клімавіцкай раённай газеты «Камуна», адказны сакратар жлобінскай раённай газеты «Шлях сацыялізма», а са жніўня 1934 г.— намеснік загадчыка аддзела газеты «Чырвоная змена». У 1936—1939 гг. вучыўся ў Мінскім настаўніцкім інстытуце, пасля заканчэння выкладаў у Цяцерынскай сярэдняй школе на Магілёўшчыне. У канцы 1939 г. быў прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны — камандзір узвода, камандзір роты (Сталінградскі, Украінскі франты). Быў тройчы паранены. Пасля дэмабілізацыі (1945) працаваў загадчыкам аддзела ў газеце «Сталинская молодежь», у часопісе «Беларусь», адказным сакратаром газеты «Літаратура і мастацтва». У 1953—1958 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Маладосць». Быў намеснікам адказнага сакратара, адказным сакратаром праўлення СП БССР (1965—1976). У 1977—1986 гг.— дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы. У 1972 г. у складзе дэлегацыі БССР прымаў удзел у рабоце XXVII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны», Дружбы народаў і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1974).

Памёр 9.4.1986 г.

Да вайны выступаў як журналіст. Першае апавяданне надрукаваў у 1945 г. Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Сад» (1947), «Гартаванне» (1949), «На возеры» (1950), «Новыя сустрэчы» (1950), «Хораша ўзыходзіць сонца» (1952), «Незабыўнае рэха» (1956), «Да ўсходу сонца» (1957), «Дабрасельцы» (аповесць, 1958, часопіс «Маладосць»), «Тут я жыву» (1960),

«Зоркі салігорскія» (нарысы, 1960), «Салігорцы» (нарысы, 1964), «Першае чаканне» (1965), «Расце мята пад акном» (1966), «Чыстая мураўка» (апавяданні і гумарэскі, 1968), «Твой шлях перад табою» (1968), «Родныя шыроты» (1978), «Аповесці і апавяданні» (1979), «Белы сокал» (1985), «Тры зоркі» (1988), раманаў «Расстаёмся ненадоўга» (1955), «Сустрэчы на ростанях» (1962), «Васількі» (1981). У 1970—1971 гг. выйшаў Збор твораў у 4 тамах, у 1984 г.— Выбраныя творы ў 2 тамах. Для дзяцей выдаў зборнік апавяданняў «На возеры» (1950), кнігу аповесцей «Белы сокал» (1985). Па матывах аповесці «Нявестка» А. Макаёнкам напісаны сцэнарый мастацкага фільма «Шчасце трэба берагчы» (пастаўлены ў 1958).

Зрабіў літаратурны запіс кнігі В. І. Казлова «Людзі асобага складу» (1952). Пераклаў раманы Ш. Рашыдава «Мацней за буру» (з П. Кавалёвым, 1963) і Р. Файзі «Яго вялікасць Чалавек» (1978).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1986, пасмяротна) за творы літаратуры і мастацтва для дзяцей, за кнігу аповесцей «Белы сокал».

---

## *Майсей КУЛЬБАК*



Майсей Саламонавіч Кульбак нарадзіўся 20.3. 1896 г. у горадзе Смаргоні Гродзенскай вобласці ў сям'і служачага.

Вучыўся ў Валожынскім ешыбоце (1909—1914). Здаў экстэрнам экзамен на званне настаўніка і працаваў у школах і гімназіях Смаргоні, Мінска, Вільні. У 1920—1927 гг. жыў у Вільні, у 1928 г. вярнуўся ў Мінск. Працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет, у АН БССР. 11.9.1937 г. быў арыштаваны. 28.10.1937 г. асуджаны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Рэабілітаваны 15.12.1956 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Друкавацца пачаў у 1916 г. Пісаў на мове ідыш. Аўтар зборнікаў «Вершы» (Вільня, 1920), «Новыя вершы» (Варшава, 1922), «Паэмы і вершы» (1929), раманаў «Месія сын Эфроіма» (Берлін, 1924), «Панядзелак» (Варшава, 1926). Творы пісьменніка ў 1929 г. выдадзены ў Вільні ў 3 тамах. У Мінску выйшлі «Вершы і

паэмы» (1929), раман «Зельманцы» (кн. 1, 1931; кн. 2, 1935), паэма «Дзісенскі Чайльд Гарольд» (1933), «Выбранае» (1934), у Маскве — «Чалавек добры» (1979). Для дзяцей напісаў казку «Вецер, што быў сярдзіты» (Вільня, 1931).

Аўтар драмы «Якаў Франк» (Вільня, 1929), п'ес «Разбойнік Бойтра» (пастаўлена ў 1936), «Беньямін Магідаў» (пастаўлена ў 1937).

Пераклаў на мову ідыш паасобныя вершы Я. Купалы, Я. Коласа, п'есу М. Гогаля «Рэвізор» (1933), раман М. Астроўскага «Як гартавалася сталь» (1935).

---

## *Валянціна* КУЛЯШОВА



Валянціна Аркадзьеўна Куляшова нарадзілася 27.1.1936 г. у горадзе Мінску ў сям'і пісьменніка.

У 1958 г. скончыла філалагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава. Працавала ў Беларускім таварыстве дружбы і культурных сувязей з замежнымі краінамі, у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР. З 1960 г. жыла ў Сафіі (Балгарыя), працавала настаўніцай сярэдняй школы, вучылася ў аспірантуры (па беларускай мове і літаратуры) Сафійскага універсітэта імя К. Охрыдскага, была рэдактарам-перакладчыкам на Балгарскім радыё. У 1967 г. вярнулася ў Мінск. У 1967—1982 гг.— выкладчык кафедры рускай мовы БДУ імя У. І. Леніна, старшы рэдактар на Беларускім тэлебачанні, загадчык творчага аддзела Рэспубліканскага Дома работнікаў мастацтва.

Літаратурнай працай займаецца з 1967 г. Перакладае з балгарскай, польскай на рускую і беларускую мовы, а таксама з беларускай на рускую. У 1983 г. часопіс «Неман» апублікаваў пераклад рамана П. Вежынава «Весы». Пераклала на беларускую мову асобныя творы Х. Васілева, Я. Конюша, А. Сятэцкага, на рускую — Х. Дэбрэцінава, Г. Алексіева, Х. Васілева. Аўтар літаратуразнаўчай аповесці-эсэ пра А. Куляшова «Лясному рэху праўду раскажу...» (1989) і сцэнарыя дакументальнага фільма пра А. Куляшова «Край крынічны» (1972).

Склала «Анталогію беларускага апавядання» (на балгарскай мове, Сафія, 1968), фотаальбом

«Аркадзь Куляшоў» (1985), кнігу «Маналог» А. Куляшова (1989), Збор твораў А. Куляшова ў 2 тамах (Масква, 1989).

---

## *Аркадзь КУЛЯШОЎ*



Аркадзь Аляксандравіч Куляшоў нарадзіўся 6.2.1914 г. у вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

У 1928 г. паступіў у Мсціслаўскі педагагічны тэхнікум, а ў 1931 г. перайшоў на першы курс літаратурнага факультэта Беларускага вышэйшага педагагічнага інстытута, дзе правучыўся да вясны 1933 г. Быў членам БелАПП. Працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» (1934), на Беларускім радыё (1934—1936), літкансультантам у кабінеце маладога аўтара пры СП БССР (1936—1937). У 1941—1943 гг.— на фронце ў армейскай газеце «Знамя Советов», у 1943—1945 гг.— у Беларускім штабе партызанскага руху. У 1945—1946 гг.— рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», у 1958—1967 гг.— начальнік сцэнарнага аддзела, галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм». У 1961 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XVI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1947—1978). Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

Народны паэт БССР (1968), заслужаны работнік культуры Украінскай ССР (1973).

Памёр 4.2.1978 г.

Першы верш надрукаваў у 1926 г. у клімавіцкай акруговай газеце «Наш працаўнік». У рэспубліканскім друку першыя вершы з'явіліся ў 1927 г. у часопісе «Чырвоны сейбіт». Выйшлі кнігі паэзіі «Росквіт зямлі» (1930), «Па песню, па сонца!..» (1932), «Медзі дождж» (1932), паэмы «Аманал» (1933), «Гарбун» (1935), зборнікі «Мы жывём на граніцы» (1938), «Радзіме і правадыру» (1938), «У зялёнай дуброве» (1940), «Добры чалавек» (1941), паэмы «Баранаў Васіль» (1941), «Сцяг брыгады» (паэма і вершы, Масква, 1943), «Прыгоды цымбал» (1945), зборнікі «На сотай вярсце» (1945), «Вершы»

(1946), «Паэмы» (1947), «Выбраныя вершы і паэмы» (1948), «Камуністы» (1949), паэмы «Простыя людзі» (1949), «Выбраныя творы» (1947, 1951), паэма «Новае рэчышча» (1951, на рускай мове апублікавана ў зборніку «Коммунисты», 1949), «Вершы і паэмы» (1954, 1966), «Граніца» (1954), паэма «Грозная пушча» (1956, 3-е дапрацаванае выданне ў 1963), «Новая кніга» (1964), «Сасна і бяроза» (1970), паэма «Далёка да акіяна» (1972), «Мая Бесядзь» (1973), «Хуткасць» (1976), «Крылы» (1985), «Профілі» (1987), вершы і паэмы «Маналог» (1989). Выдадзены Зборы твораў у 2-х (1957, 1964), 4-х (1966—1967), 5-ці тамах (1974—1977).

Сааўтар сцэнарыяў фільмаў «Чырвонае лісце» (з А. Кучарам, пастаўлены ў 1958), «Першыя выпрабаванні» (па трылогіі Якуба Коласа «На ростанях», з М. Лужаніным, пастаўлены ў 1960—1961) і «Запомнім гэты дзень» (з М. Лужаніным, пастаўлены ў 1967).

У яго перакладах выйшлі раман Г. Эрыксана «Валацужная Амерыка» (1932), паэма А. Пушкіна «Цыганы» (1937) і раман у вершах «Яўгеній Анегін» (1949), паэма А. Парніса «Сказанне пра Белаяніса» (1959), «Выбраная паэзія» М. Лермантава (1969), паэма «Энеіда» І. Катлярэўскага (1969), «Спеў аб Гаяваце» Г. Лангфела (1969), зборнік вершаў К. Куліева «Кніга зямлі» (1974), «Выбранае» С. Ясеніна (з Р. Барадуліным, 1976), асобныя творы Т. Шаўчэнкі, У. Маякоўскага, А. Твардоўскага, М. Ісакоўскага, А. Пракоф'ева, М. Рыльскага, А. Малышкі, М. Нагнібеды, Р. Гамзатава і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1946) за паэму «Сцяг брыгады», Дзяржаўнай прэміі СССР (1949) за паэму «Новае рэчышча», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1970) за пераклады вершаў і паэм М. Лермантава, «Энеіды» І. Катлярэўскага і «Спева аб Гаяваце» Г. Лангфела, прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1968).

## *Фёдар КУЛЯШОЎ*



Фёдар Іванавіч Куляшоў нарадзіўся 18.6.1913 г. у вёсцы Вялікія Стралкі Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Рана застаўшыся без бацькоў, быў пастухом і парабкам. У 1925—1930 гг. выхоўваўся ў дзіцячых дамах у Бабруйску і Пірэвічах. У 1931—1933 гг.— літаратурны супрацоўнік газеты «Камунар» (Рагачоў) і ўласны карэспандэнт газеты «Савецкая Беларусь». Пасля заканчэння Ленінградскага абласнога настаўніцкага інстытута (1935) працаваў у школе выкладчыкам рускай мовы і літаратуры. Адначасова вучыўся завочна ў Ленінградскім педінстытуце імя А. І. Герцена (скончыў у 1944). У 1938 г. быў рэпрэсіраваны. Адбываў зняволенне пад Варкутой. Пасля вызвалення (1943) выкладаў рускую мову і літаратуру ў Кундравінскай сярэдняй школе Міяскага раёна Чэлябінскай вобласці, з лютага 1944 г.— у Чэлябінскім механіка-машынабудаўнічым інстытуце, у 1945—1950 гг.— у Кустанайскім педінстытуце. Адзін год загадваў кафедрай рускай літаратуры Кзыл-Ардынскага педінстытута. У 1951—1955 гг.— выкладчык Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, у 1955—1961 гг.— Сахалінскага педінстытута. З 1961 г.— зноў у БДУ (у 1966—1969 загадваў кафедрай рускай класічнай літаратуры), у 1985—1990 гг.— кансультант пры гэтай кафедры. Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1955 г.

Літаратурнай дзейнасцю займаецца з 1932 г. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар літаратурна-крытычных прац, артыкулаў і рэцэнзій. Выдаў крытыка-біяграфічныя нарысы «Жизнь и творчество Л. Н. Толстого» (1953), «Сатирическая поэзия Н. А. Некрасова» (1954), «Жизнь и творчество А. П. Чехова» (1954), «Антон Павлович Чехов» (Паўднёва-Сахалінск, 1959), «Буревестник революции» (1968), манаграфіі «Міхась Лынькоў» (1961, перапрацаванае выданне ў 1974 і 1979), «Творческий путь А. И. Куприна» (1963, перапрацаванае выданне ў 2 тамах у 1983 і 1987), «Іван Мележ» (1968), «Подвиг художника: Литературный путь И. Мележа» (2-е выданне дапоўненае і перапрацаванае ў 1982), зборнік літаратурна-кры-

тычных артыкулаў «Эцюды аб прозе» (1964), «Літаратурныя партрэты» (1983), «У дарозе» (1988), нарыс «Современная белорусская проза» (Масква, 1970), вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў-філолагаў «М. Ц. Лынькоў: Семінарый» (1963), «Лекции по истории русской литературы конца XIX — начала XX в.» (ч. 1, 1976, ч. 2, 1980), «Л. Н. Толстой: Из лекций по русской литературе XIX века» (1978).

Склаў зборнікі «А. П. Чехов о литературе и искусстве» (1954), «Максім Горкі і Беларусь» (1968), «А. И. Куприн о литературе» (1969), «Леў Талстой і Беларусь» (1980), а таксама кнігі прозы А. Купрына «Листригоны», Л. Андрэева «Красный смех», І. А. Буніна «Избранное», В. Верасаева «К жизни», Г. Караленкі «Избранное», двухтомніка «Повести о любви» і інш.

---

## *Сымон* КУНІЦКІ



Сымон Фаміч Куніцкі нарадзіўся 19.11.1902 г. у вёсцы Гарані Мінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў вясковай школе, на рабфаку ў Мінску. Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1931). Працаваў вучоным сакратаром Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР (1931—1936). Быў членам БелАПП. 26.11. 1936 г. Арыштаваны, асуджаны на 10 год зняволення. Рэабілітаваны 18.12.1954 г.

Памёр, верагодна, на Калыме 14.10.1940 г.

У друку выступіў упершыню з апавяданнямі ў 1928 г. (газета «Чырвоная змена»). З 1929 г. пачаў выступаць як крытык. У калектыўных зборніках, у часопісах «Маладняк», «Полымя рэвалюцыі» і іншых перыядычных выданнях змяшчаў рэцэнзіі, нарысы і літаратурна-крытычныя артыкулы пра творчасць Я. Купалы, Я. Коласа, А. Александровіча, С. Баранавых, В. Каваля, М. Лынькова, Б. Мікуліча, Я. Скрыгана, Х. Шынклера і інш.

*Янка КУПАЛА*



Янка Купала (Іван Дамінікавіч Луцэвіч) нарадзіўся 7.7.1882 г. у фальварку Вязынка Вілейскага павета (цяпер Маладзечанскі раён Мінскай вобласці) у сям'і арандатара.

У 1898 г. скончыў Беларуцкае народнае вучылішча. Пасля смерці бацькі (1902) год працаваў на гаспадарцы, потым — хатні настаўнік, пісар у судовага следчага ў Радашковічах (1903), малодшы прыказчык у памешчыка ў Сенненскім павеце Магілёўскай губерні (1904), практыкант і памочнік вінакура ў маёнтку Сёмкава пад Мінскам, на бровары ў Яхімоўшчыне на Маладзечаншчыне, у маёнтку Дольны Сноў Навагрудскага павета (1905—1908), супрацоўнік «Нашай нівы» і адначасова бібліятэкар бібліятэкі «Веды» Б. Л. Даніловіча (Вільня, 1908—1909). У 1909—1913 гг. вучыўся на агульнаадукацыйных курсах А. С. Чарняева ў Пецярбургу. З кастрычніка 1913 г. зноў у Вільні, супрацоўнік «Беларускага выдавецкага таварыства», рэдактар «Нашай нівы» (1914—1915). У верасні 1915 г. выехаў у Маскву, дзе вучыўся ў народным універсітэце імя А. Л. Шаняўскага. У студзені 1916 г. прызваны ў армію. Служыў у дарожна-будаўнічым атрадзе Варшаўскай акругі шляхоў зносін у Мінску, Полацку, а таксама ў Смаленску, дзе сустрэў Кастрычніцкую рэвалюцыю. У 1919 г. пераехаў у Мінск, дзе і жыў да пачатку Вялікай Айчыннай вайны. Удзельнічаў у стварэнні нацыянальнага тэатра, Беларускага дзяржаўнага універсітэта, Акадэміі навук БССР, у разгортванні выдавецкай справы. У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Маскве, у пасёлку Пячышчы каля Казані. Абіраўся кандыдатам у члены ЦВК БССР (1927—1929), членам ЦВК БССР (1929—1931, 1935—1938), дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (з 1940 г.). Акадэмік АН БССР, АН УССР. Член СП СССР з 1934 г.

Народны паэт БССР (1925).

Узнагароджаны ордэнам Леніна.

Трагічна загінуў 28.6.1942 г. у Маскве. Урна з прахам перавезена ў Мінск у 1962 г.

Пісаць пачаў на польскай мове. Першы вядомы беларускі верш «Мая доля» датаваны 1904 г. Першы надрукаваны верш на беларускай мове —

«Мужык» (15 мая 1905 г. у мінскай газеце «Северо-Западный край»). У 1908 г. пецярбургскае выдавецтва «Загляне сонца і ў наша ваконца» выпусціла першы зборнік паэта «Жалейка» (факсімільнае выданне ў 1982), у 1913 г.— зборнік «Шляхам жыцця». Зборнік вершаў «Гусляр» (1910) выдадзены ў Пецярбургу А. Грыневічам. У савецкі час выйшлі кнігі паэзіі «Спадчына» (1922), «Безназоўнае» (1925), «Апавяданні вершам» (у 2 кнігах, 1926), паэмы «Магіла льва» (1927), «Над ракою Арэсай» (1933), «Курган» (1987), зборнікі «Адцвітанне» (1930), «Песня будаўніцтву» (1936), «Беларусі ардэнаноснай» (1937), «Ад сэрца» (1940), «Беларускім партызанам» (вершы і артыкулы, Масква, 1942), кнігі выбраных вершаў, паэм (1930, 1935, 1936, 1946, 1947, 1948, 1952, 1958, 1967, 1970, 1972 — малафарматнае выданне, 1978, 1980, 1981, 1982 (4 выданні), 1987, 1988 (3 выданні), 1989 (2 выданні) і Зборы твораў у 6-ці (1925—1932), 3-х (1928—1932), 6-ці (1951—1954, 1961—1963), 7-мі (1972—1976) тамах. Многія вершы пакладзены на музыку. Для дзяцей неаднаразова выдаваліся вершы «Хлопчык і лётчык», «Алеся» і інш.

Аўтар драматычных паэм «Адвечная песня» (Пецярбург, 1910, пастаўлена ў 1921) і «Сон на кургане» (Пецярбург, 1912, пастаўлена ў 1928), п’есы «Паўлінка» (Пецярбург, 1913, пастаўлена ў 1913, у 1952 па спектаклю тэатра імя Я. Купалы створаны аднайменны кінафільм, у 1973 г.— аперэта), драматычнай паэмы «На папасе» (1913, ставілася самадзейнасцю), драмы «Раскіданае гняздо» (Вільня, 1919, пастаўлена ў 1917, аднайменны кінафільм — у 1982), сцэнічнага жарту «Прымакі» (1920, ставіўся самадзейнасцю ў 20-я гады, у тэатры пастаўлены ў 1936), п’есы «Тутэйшыя» (1924, пастаўлена ў 1926), драматычнага абразка «На Куццю» (Вільня, 1928, ставіўся ў самадзейных гуртках). У 1989 г. выйшлі «Паэмы. Драматычныя творы» (уключаны трагікамедыя «Тутэйшыя», паэмы «Калека», «На Куццю» і іншыя творы, якія доўгі час былі забаронены).

Выступаў як публіцыст і літаратурны крытык. У 1972 г. выйшла кніга «Публіцыстыка».

Пераклаў на беларускую мову «Слова аб палку Ігаравым» (прозай і вершам), міжнародны пралетарскі гімн «Інтэрнацыянал», польскі тэкст у п’есах В. Дуніна-Марцінкевіча «Ідылія» і

«Залёты», лібрэта оперы «Галька» С. Манюшкі, паэму А. Пушкіна «Медны коннік», шэраг вершаў і паэм Т. Шаўчэнкі, асобныя творы М. Някрасава, І. Крылова, А. Кальцова, А. Міцкевіча, У. Сыракомлі, М. Канапніцкай, Ю. Крашэўскага, У. Бранеўскага, Е. Жулаўскага, П. Панча і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1941) за зборнік «Ад сэрца».

---

## *Дзмітрый* КУРДЗІН



Дзмітрый Іванавіч Курдзін нарадзіўся 13.10. 1899 г. у Пензенскай вобласці (Расія) у сям'і настаўніка.

У 1925 г. скончыў Саратаўскі ветэрынарны інстытут. Служыў у Чырвонай Арміі. У 30-я гады служыў у Віцебску старшым ветэрынарным урачом артылерыйскага палка. У 1937 г. рэпрэсіраваны. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны ў 1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 12.12.1937 г.

Творчую працу пачаў пад псеўданімам А. Сапёлка ў 1925 г. з вершаў. Аўтар п'ес «Міжбур'е» (другі акт апублікаваны ў кнізе «Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі», 1975, пастаўлена ў 1929), «Контратака» (апублікаваны ўрыўкі ў 1932), «Чалавек вырашае» (пастаўлена ў 1934), «Азеляненне цэха» (апублікаваны ўрыўкі ў 1934—1935).

---

## *Яўген* КУРТО



Яўген Іванавіч Курто нарадзіўся 7.7.1924 г. на хутары Рачыборак Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Магілёўскім настаўніцкім інстытуце (1940—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнік камсамольскага падполля ў Багушэвічах, а з 1943 г.— партызан. Быў цяжка паранены (1944). Працаваў бухгалтарам Бярэзінскага райпрамкамбіната, загадваў Капланецкім млыном. Скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1949). У час вучобы працаваў у

газетах «Сталинская молодежь» (1946), «Зорька» (1948—1960). З 1960 г.— рэдактар, потым старшы рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР (пазней — «Беларусь»), у 1972—1987 гг.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1962 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалямі.

У друку выступіў у 1949 г. Напісаў для дзяцей кнігі апавяданняў «На начлезе» (1958), «Шэсць кароткіх гісторый» (1965), «Лясны ўрок» (1973), нарыс «Падарожжа трох сяброў» (1963), аповесці «Ён быў піянерам» (1960), «Дарога бяжыць насустрач» (аповесці і апавяданні, 1964), «Над ярам» (1966), «Шумеў Нягневіцкі лес» (аповесць і апавяданні, 1968, 1989), «Над ціхай Свідаўкай» (1972), кнігу аповесцей «Насустрач жыццю» (1974).

Пераклаў на беларускую мову казкі народаў СССР, паасобныя творы К. Чапека, Э. Раўда, Ш. Бейшаналіева, Т. Цыруліса, А. Імерманіса і іншых пісьменнікаў.

---

## *Святлана* КУРЫЛЁВА



Святлана Леанідаўна Курылёва нарадзілася 25.4. 1928 г. у горадзе Жытоміры (Украіна) у сям'і ваеннаслужачага.

Скончыла рускае аддзяленне філалагічнага факультэта Харкаўскага дзяржаўнага універсітэта (1950). Працавала выкладчыцай рускай мовы і літаратуры ў школе гарадскога пасёлка Камянец Брэсцкай вобласці (1950—1983). Жыве ў Камянцы. Член СП СССР з 1980 г.

У друку пачала выступаць у 1950 г. (брэсцкая абласная газета «Заря»). Піша на рускай мове. Друкавацца пачала з 1960 г., калі ў часопісе «Юность» (Масква) было апублікавана апавяданне «Дорога». Аўтар кніг апавяданняў, аповесцей «Жаворонки на улице» (1965), «И нелегко и непросто» (1975), «Формула успеха» (нарысы, 1979), «Доброта» (1983), «Самый короткий день» (1987) і кнігі-дыялога «Совхоз-комбинат «Беловежский»: сегодня и завтра» (з Ю. Марозам, 1990).

## *Мікола КУСЯНКОЎ*



Мікола (Мікалай Сяргеевіч) Кусянкоў нарадзіўся 11.2.1935 г. у вёсцы Перарост Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўніка.

У 1953 г. скончыў Буда-Кашалёўскі лясны тэхнікум. Працаваў у лясгасах Калінінградскай вобласці, лесаўпарадчыкам на Беларусі і ў Сібіры. У 1969 г. паступіў на Вышэйшыя літаратурныя курсы пры СП СССР. Пасля заканчэння курсаў (1971) — намеснік адказнага сакратара абласной газеты «Гомельская праўда». З 1977 г.— рэдактар дакументальных фільмаў на кінастудыі «Беларусьфільм». У 1980—1985 гг.— рэдактар аддзела прозы часопіса «Полымя». З 1985 г.— загадчык рэдакцыі прозы выдавецтва «Мастацкая літаратура», з 1986 г.— намеснік галоўнага рэдактара гэтага выдавецтва. Скончыў завочна факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1982). Член СП СССР з 1967 г.

Першы верш надрукаваў у 1955 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Жывіца» (1966), «Без прывалу» (1969), «Дуброва» (1990). Выдаў кнігу апавяданняў «Завязь» (1987).

## *Сцяпан КУХАРАЎ*



Сцяпан Іванавіч Кухараў нарадзіўся 31.7.1919 г. у вёсцы Стайкі Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1939 г. скончыў Гомельскае педагагічнае вучылішча. Да жніўня 1941 г. працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры Горскай сярэдняй школы Краснапольскага раёна. З 1942 г.— партызанскі сувязны, з 1943 г.— на фронце. Прайшоў баявы шлях ад Беларусі да Берліна. Дэмабілізаваны ў 1945 г. У 1946—1950 гг. быў літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». У 1950 г. скончыў завочнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў у рэдакцыях газет «Мінская праўда», «Рудзенская праўда», «Настаўніцкая газета». З 1955 г.— літсупрацоўнік, у 1957—1981 гг.—

рэдактар аддзела нарыса і публіцыстыкі часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1972 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1980).

Першы артыкул апублікаваў у краснапольскай раённай газеце «Чырвоны сцяг» у 1934 г. Аўтар зборнікаў нарысаў «Незабыўныя сустрэчы» (1959), «Людзі крылатага ўзросту» (1961), «Ад вашага карэспандэнта» (1966), «Жыццё-легенда» (1971), «Светлая пара» (1978), аповесці «Бацькавічы» (1974), зборнікаў аповесцей, апавяданняў і нарысаў «Бацькавічы» (1980), «Суніцы для сына» (1986), «Сцішанае поле» (1986).

---

## *Алесь КУЧАР*



Алесь (Айзік Евелевіч) Кучар нарадзіўся 27.6.1910 г. у вёсцы Прудзішча Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачага.

Працоўны шлях пачаў у 1926 г. у Смалявіцкім райвыканкоме справаводам. У 1927—1929 гг. вучыўся ў Беларускім педагагічным тэхнікуме, у 1929—1932 гг.— студэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта, потым Вышэйшага педагагічнага інстытута ў Мінску. У 1932—1936 гг. працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет, на Беларускім радыё. Вучыўся ў Маскоўскім інстытуце гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Г. Чарнышэўскага (1937), У 1938—1940 гг.— старшы выкладчык Мінскага педінстытута імя М. Горкага. У час Вялікай Айчыннай вайны — пісьменнік франтавых газет. З 1945 г.— намеснік галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва», з 1948 г.— загадчык аддзела ў «Настаўніцкай газеце», з 1951 г.— рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР, з 1960 г.— літкансультант СП БССР. У 1960—1968 гг.— член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм». Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнамі «Знак Пашаны», Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

З рэцэнзіямі і крытычнымі артыкуламі выступае з 1928 г. Выйшлі кнігі літаратурна-крытыч-

ных артыкулаў «Вялікая перабудова» (1933), «Літаратурна-крытычныя артыкулы» (1953, 2-е выданне, 1980), «Аб мастацкай прозе» (1961), «Аблічча часу» (1971), а таксама брашуры «Творчасць М. Багдановіча» (1939), «Янка Купала» (1948). У 1943 г. выдаў кнігу нарысаў «На партызанскай зямлі» (Масква).

Аўтар п'ес «Заложнікі» (1946, пастаўлена ў 1944), «Гэта было ў Мінску» (1950, пастаўлена ў 1949), «Неспакойныя сэрцы» (1953, пастаўлена ў 1952). Напісаў сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Чырвонае лісце» (з А. Куляшовым, 1958), «Гадзіннік спыніўся апоўначы» (з М. Фігуроўскім, 1958), «Лісты да жывых» (1963), «Усходні калідор» (з В. Вінаградавым, 1968), а таксама дакументальнага фільма «Мы жывём у Мінску» (1968). У 1962 г. выйшаў зборнік выбраных п'ес і кінасцэнарыяў «Над Дзвіной, Нямігай, Віліяй».

# Л



*Міхась ЛАЗАРУК*

Міхась (Міхаіл Арсеньевіч) Лазарук нарадзіўся 5.7.1926 г. у вёсцы Ушаловічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля вызвалення Случчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (1944) прызваны ў Савецкую Армію. Дайшоў да Берліна. У 1951 г. скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага і паступіў у аспірантуру пры гэтым інстытуце. Пасля заканчэння аспірантуры (1954) — выкладчык, потым дацэнт кафедры беларускай літаратуры, з 1968 г.— дэкан філалагічнага факультэта, з 1971 г.— прарэктар Мінскага педінстытута імя М. Горкага. Паўтара года (1959—1960) працаваў на кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. У 1978 г. прызначаны дырэктарам навукова-даследчага Інстытута педагогікі Міністэрства народнай адукацыі БССР. Акадэмік АПН СССР. Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1972 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Выступае ў друку з крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі з 1949 г. Аўтар даследаванняў і манаграфій «Пімен Панчанка» (1959), «Пытанні тэорыі літаратуры» (з А. Ленсу, 1964), «Станаўленне беларускай паэмы» (1968), «Беларуская паэма ў другой палавіне XIX — пачатку XX стагоддзя» (1970), зборніка крытычных артыкулаў «Часу непадуладнае» (1981), навучальных дапаможнікаў і падручнікаў для філалагічных факультэтаў ВНУ «Уводзіны ў літаратуразнаўства» (з А. Ленсу, 1970, 2-е выданне, 1982), падручніка для 9 класа «Беларуская літаратура ў школе» (з В. Івашыным, 1979,

8-е выданне, 1990), дапаможнікаў «Тэорыя літаратуры» (1967, 2-е выданне, 1971), «Слоўніка літаратуразнаўчых тэрмінаў» (з А. Ленсу, 1983). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай літаратуры» (ч. 1—2, 1981, ч. 3, 1983, ч. 4, 1985), працы «Изучение русской литературы во взаимосвязи с белорусской» (1988).

Займаецца таксама даследаваннем пытанняў методыкі выкладання літаратуры, гісторыі школы і педагагічнай думкі ў Беларусі.

---

## *Пятро ЛАМАН*



Пятро (Пётр Аляксандравіч) Ламан нарадзіўся 11.7.1949 г. у вёсцы Маласельцы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1966 г. скончыў Ярэміцкую сярэднюю школу, працаваў трактарыстам у калгасе імя Чарняхоўскага Карэліцкага раёна. У 1967 г. паступіў на акцёрскі факультэт Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Пасля заканчэння інстытута (1971) — акцёр Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску. Член СП СССР з 1983 г.

Першыя вершы ў рэспубліканскім друку апублікаваў у 1970 г. (часопіс «Маладосць»). Першая кніжка вершаў «Споведзь агню» надрукавана ў калектыўным зборніку «Нашчадкі» (1979). Аўтар зборнікаў вершаў «Зерне імгненняў» (1983), «Стары млын» (1988), кнігі аповесцей «Астравы» (1989). Напісаў тэлеп'есу «Мая душа як ястраб дзікі» (пастаўлена ў 1990).

---

## *Міхась ЛАРЧАНКА*



Міхась (Міхаіл Рыгоравіч) Ларчанка нарадзіўся 14.11.1907 г. у вёсцы Хварасцяны Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Княжыцкай школе сялянскай моладзі, у Магілёўскім беларускім педагагічным тэхнікуме. У 1929 г. паступіў на літаратурналінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (у 1931 г. педфак пераўтвораны ў Вышэйшы

педагагічны інстытут). Скончыў яго датэрмінова (1932). З 1935 г., пасля заканчэння аспірантуры пры АН БССР,— супрацоўнік Інстытута літаратуры і мастацтва. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Бранскім фронце, улетку 1942 г. быў цяжка паранены. З 1943 г.— загадчык кафедры і дэкан філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1952—1955 гг.— дактарант Інстытута сусветнай літаратуры імя М. Горкага АН СССР, у 1955—1971 гг.— зноў загадчык кафедры беларускай літаратуры і адначасова (да 1957) дэкан філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1977).

Памёр 31.7.1981 г.

Як крытык і літаратуразнавец выступаў з 1932 г. Выйшлі манаграфіі «На шляхах да рэалізму» (1958), «Па шляху рэалізму» (1959), «Сувязі беларускай літаратуры з літаратурамі суседніх славянскіх народаў у другой палове XIX ст.» (1958), «Жывая спадчына» (1977), зборнікі літаратуразнаўчых прац «Славянская супольнасць» (1963), «Яднанне братніх літаратур» (1974), «Літаратурнае пабрацімства славян» (1984), а таксама брашуры «Творчасць М. Багдановіча» (1949), «А. М. Горкі і беларуская літаратура» (1951), «Гогалеўскія традыцыі ў беларускай літаратуры» (1952).

Складальнік хрэстаматыі для сярэдняй школы «Беларуская літаратура» (1945), адзін з аўтараў дапаможнікаў для ВНУ «Нарысы па гісторыі беларускай літаратуры» (1956), «Беларуская вуснапаэтычная творчасць» (1966), «Старажытная беларуская літаратура» (1968), «Беларуская народна-паэтычная творчасць» (1979).

## *Іван* ЛАСКОЎ



Іван Антонавіч Ласкоў нарадзіўся 19.6.1941 г. у горадзе Гомелі ў сям'і рабочага.

У 1953—1958 гг. выхоўваўся ў Магілёўскім спецыяльным дзіцячым доме. Скончыў хімічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1964). Працаваў у г. Дзяржынску Горкаўскай вобласці. У 1966—1971 гг. вучыўся ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага (Масква). У 1971—1977 гг.— літсупрацоўнік, загадчык аддзела рабочай моладзі рэдакцыі газеты «Молодежь Якутии», старшы рэдактар аддзела масава-палітычнай літаратуры Якуцкага кніжнага выдавецтва. З 1977 г.— старшы літаратурны рэдактар часопіса «Полярная звезда» (Якуцк). Член СП СССР з 1979 г.

Першыя вершы апублікаваў у беларускім рэспубліканскім друку ў 1956 г. (газета «Чырвоная змена»). Піша на беларускай і рускай мовах. На рускай мове выдаў зборнікі паэзіі «Стихия» (1966), «Белое небо» (1969), «Хромец» (паэма, Якуцк, 1975), зборнік апавяданняў «Ивановы» (Якуцк, 1979), на беларускай — зборнік вершаў «Кружное лета» (1973), паэму «Кульга» (1985), зборнікі апавяданняў для дзяцей «Андрэй-Эндэрэй — справядлівы чалавек, або Беларусь на полюсе холаду» (1978), «Чароўны камень» (1983).

## *Вацлаў* ЛАСТОЎСКІ



Вацлаў Юсцінавіч Ластоўскі нарадзіўся 1.11. 1883 г. у засценку Калеснікі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і беззямельнага шляхціца.

Скончыў на радзіме Пагосцкую пачатковую школу. Працаваў хлопчыкам на паслугах у віннай лаўцы ў Вільні, канцылярыстам у Шаўляі (Літва), бібліятэкарам у студэнцкай бібліятэцы ў Пецярбургу, дзе наведваў лекцыі ва універсітэце. Уступіў у Польскую сацыялістычную партыю ў Літве. Рабіў канторшчыкам на таварнай станцыі ў Рызе. Далучыўся да беларускага нацыянальнага грамадскага і культурнага руху.

У 1906—1908 гг. уваходзіў у Беларускую сацыялістычную грамаду. З 1909 г.— сакратар рэдакцыі «Нашай нівы» і загадчык першай беларускай кнігарні (Вільня), у 1916—1917 гг.— рэдактар газеты «Гоман», у 1918 г. выдаваў газету «Крывічанін» (Вільня). У канцы 1918 г. узначаліў Беларускае прадстаўніцтва ўрада БНР пры літоўскай буржуазнай Тарыбе, быў беларускім аташэ пры літоўскім пасольстве ў Берліне. З 1919 г.— у партыі беларускіх эсэраў, са снежня ўзначальваў Раду міністраў БНР. Быў зняволены польскімі буржуазнымі ўладамі, у 1920 г. яму дазволена вярнуцца ў Літву. У красавіку 1923 г. выйшаў з урада БНР і адышоў ад актыўнай палітычнай дзейнасці. Выдаваў у Каўнасе літаратурна-навуковы часопіс «Крывіч» (1923—1927). У 1927 г. урад БССР дазволіў яму вярнуцца ў Мінск. Працаваў дырэктарам Беларускага дзяржаўнага музея, у Інстытуце беларускай культуры, у АН БССР. У 1930 г. пазбаўлены звання акадэміка і высланы на 5 год у Саратаў, дзе працаваў загадчыкам аддзела рэдкай кнігі ва універсітэцкай бібліятэцы. У 1937 г. зноў рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны 10.6.1988 г.

Расстраляны 23.1.1938 г.

Выступаў у друку як крытык і літаратуразнавец. Аўтар першай «Кароткай гісторыі Беларусі» (Вільня, 1910), «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі» (Коўна, 1926). Склаў «Руска-беларускі слоўнік» (Коўна, 1924). Ім напісаны ўспаміны пра нашаніўскі перыяд. Выступаў як паэт, празаік, публіцыст. Выйшлі «Творы» («Мюнхен, 1956).

---



## *Сцяпан ЛАЎШУК*

Сцяпан Сцяпанавіч Лаўшук нарадзіўся 28.7. 1944 г. у горадзе Васілевічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і рабочых.

Пасля заканчэння Васілевіцкай сярэдняй школы № 2 (1961) працаваў рабочым у Пермскай вобласці і ў Васілевічах. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1967). Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры, намеснікам дырэктара ў Дзятлавіцкай, Лахвенскай

сярэдніх школах, загадчыкам аддзела арганізацыйна-камсамольскай работы райкома камсамола, дырэктарам Бродніцкай васьмігодкі Лунінецкага раёна. У 1970—1973 гг. займаўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, пасля заканчэння якой працуе навуковым супрацоўнікам гэтага інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1982 г.

З 1972 г. выступае як крытык, літаратуразнавец. Даследуе праблемы развіцця беларускай драматургіі. Аўтар кніг «Сучасная беларуская драматургія» (1977), «Станаўленне беларускай савецкай драматургіі (20-я — пачатак 30-х гг.)» (1984), «Кандрат Крапіва і беларуская драматургія» (1986), «На драматургічных скрыжаваннях» (1989), брашур «З думкай пра сучасніка: Агляд сучаснай беларускай драматургіі» (1977), «Першы народны артыст БССР» (1982) і «Высокія арбіты грамадзянскасці» (1984). Адзін з аўтараў «Истории белорусской советской литературы» (1977), «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (ч. 1—2, 1981—1982), калектыўных даследаванняў «Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці» (1978), «У. І. Ленін і Кастрычніцкая рэвалюцыя ў беларускай літаратуры» (1987).

Складальнік кнігі «Беларуская дакастрычніцкая драматургія» (1978), зборніка У. Галубка «Творы» (1983), зборнікаў «П'есы» (1984), Збору твораў у 5 т. А. Макаёнка (1986—1990), фотаальбома «Кандрат Крапіва» (1989).

---



## *Леанід ЛЕВАНОВІЧ*

Леанід Кірэевіч Левановіч (Лявонаў) нарадзіўся 14.9.1938 г. у вёсцы Клеявічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Магілёўскае культасветвучылішча (1956). Працаваў ва ўстановах культуры Дзяржынскага і Касцюковіцкага раёнаў (1956—1958). У 1957 г. паступіў на завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Служыў на Балтыйскім флоце (1958—1961). Пасля дэмабілізацыі перавёўся на стацыянар і скончыў універсітэт у 1963 г. Працаваў у рэспубліканскіх

газетах «Знамя юности», «Сельская газета», «Літаратура і мастацтва» (1963—1971). У 1971—1974 гг.— рэдактар аддзела мастацтва і крытыкі часопіса «Неман». З 1974 г.— адказны сакратар, з 1975 г.— рэдактар аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя». У 1980—1982 гг.— галоўны рэдактар літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання. З 1984 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1975 г.

Выступае ў друку з 1963 г. Аўтар кніг нарысаў «Гаспадар зямлі» (1971), «Зялёны трохкутнік» (1973), зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Мадонна з кветкаю» (1976), «Якар надзеі» (1979), «Валанцёр свабоды» (1983), раманаў «Шчыглы» (1986), «Паводка сярод зімы» (1989), зборніка публіцыстыкі «Хлеб і мужнасць» (1987).

Напісаў сцэнарый дакументальнага фільма «Дом майстроў» (пастаўлены ў 1973); аднаактовую п'есу «Ці любіце вы грэчку?» (1972), драму «Пасля разводу» (1980, пастаўлена на радыё ў 1981).

---

## *Павел ЛЕВАНОВІЧ*



Павел Антонавіч Левановіч нарадзіўся 3.11. 1914 г. у вёсцы Мазалава Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся на геаграфічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Удзельнік паходу Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь (1939). Пасля заканчэння універсітэта (1940) працаваў у часопісе «Іскры Ільіча». На пачатку Вялікай Айчыннай вайны трапіў у палон. Уцёк з Крычаўскага лагера ваеннапалонных, удзельнічаў у мсціслаўскім падполлі. У 1943 г. прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях, быў паранены.

Памёр ад ран 20.12.1943 г.

Нарысы і апавяданні пачалі з'яўляцца ў друку ў 1934 г. Выступаў таксама з вершамі. У 1938 г. выйшла кніга апавяданняў для дзяцей «Дружба». У 1940 г. падрыхтаваў зборнік апавяданняў, рукапіс загінуў у вайну. Восенню 1943 г. змяшчаў матэрыялы ў франтавым друку.

## *Іван* ЛЕТКА



Іван Антонавіч Летка нарадзіўся 14.6.1935 г. у былым маёнтку Масаляны Гродзенскага павета (цяпер Бераставіцкага раёна Гродзенскай вобласці) у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Масалянскай сярэдняй школы (1954) вучыўся ў медыцынскім вучылішчы ў Маскве. Служыў у Савецкай Арміі. Дэмабілізаваўшыся (1955), працаваў грузчыкам на бетонавым заводзе № 5 у Маскве, маляром-дэкаратарам у Цэнтральным тэатры Савецкай Арміі. У 1967 г. скончыў завочнае аддзяленне Літаратурнага інстытута імя М. Горкага. У 1960—1985 гг. працаваў на аўтазаводзе імя Ліхачова кавалём, майстрам, намеснікам начальніка цэха па вытворчасці, начальнікам участка, інжынерам па кадрах. Жыве ў Маскве. Член СП СССР з 1978 г.

Першы верш апублікаваў у 1959 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Тры крокі да сонца» (1967), «Тры верасні» (1970), «Грамы на зімоўцы» (вершы і паэма, 1974).

## *Гальяш* ЛЕЎЧЫК



Гальяш Леўчык (Ілья Міхайлавіч Ляўковіч) нарадзіўся 20.7.1880 г. у горадзе Слоніме Гродзенскай вобласці ў сям'і селяніна, які прыехаў у горад шукаць працу.

Скончыў Слонімскае павятовае вучылішча і працаваў пісарам у міравога суддзі, пазней — у каморніка. З 1904 г. жыў у Варшаве. Да 1920 г. працаваў чарцёжнікам у магістраце.

Памёр у верасні 1944 г. у Варшаве.

Друкавацца пачаў у 1908 г. у газеце «Наша ніва». Выдаў зборнік вершаў «Чыжык беларускі» (Вільня, 1912), зборнік вершаў «Беларускі жаваранак» надрукаваць не ўдалося. Друкаваўся ў заходнебеларускіх газетах і часопісах. Некаторыя вершы змешчаны ў «Хрэстаматыі беларускай літаратуры» І. Дварчаніна (1927). У 1980 г. выйшла кніга выбраных твораў «Доля і хлеб».

## *Яўген* ЛЕЦКА



Яўген Рыгоравіч Лецка нарадзіўся 20.4.1944 г. у вёсцы Пабрэззе Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1968 г. скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. У час вучобы працаваў на Мінскім шарыкападшыпнікавым заводзе (1961—1962), настаўнікам нямецкай мовы Ушанскай СШ Бярэзінскага раёна. Пасля заканчэння універсітэта — карэспандэнт-арганізатар раённага радыёвяшчання. У 1969—1971 гг. вучыўся ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры БДУ. У 1971—1986 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1986 г.— старшы рэдактар, з 1987 г.— загадчык рэдакцыі крытыкі выдавецтва «Мастацкая літаратура». Кіраваў школай юнага літаратара пры СП БССР (1984—1986). У 1990 г. абраны старшынёй Згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына». Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1977 г.

Выступае ў друку з літаратурна-крытычнымі артыкуламі і даследаваннямі з 1971 г. Напісаў брашуры «Беларуская літаратура за гады Савецкай улады» (1973), «Вялікая Айчынная вайна ў беларускай прозе» (1979), манаграфію «Выхаваўчая роля літаратуры» (1980), нарыс творчасці В. Адамчыка «Хараство і боль жыцця» (1985).

Аўтар аповесцей «Па цаліку» (1977), «Дарога ў два канцы» (1981). Перакладае з польскай, нямецкай, украінскай, рускай моў.

## *Янка* ЛІМАНОЎСКІ

Янка (Іван Міхайлавіч) Ліманоўскі нарадзіўся ў 1886 г. на Дзісненшчыне ў сялянскай сям'і.

Скончыў рэальнае вучылішча. Вучыўся на агранамічных курсах. У 1915 г. прызваны ў армію. У 1918 г. уступіў у РСДРП(б). Удзельнічаў у баях Чырвонай Арміі з нямецкімі і белапольскімі войскамі як ваенны камісар дывізіі. У мірны час працаваў на розных пасадах у арміі і ўстановах, у тэатры. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў БелАПП. Быў намеснікам дырэктара Інстытута

літаратуры і мастацтва АН БССР. У час нямецкай акупацыі працаваў у Мінску ў беларускім тэатры. Разам з адступаючымі нямецкімі войскамі выехаў у 1944 г. у Германію. Адтуль пераехаў у ЗША. Працаваў лесарубам, кіраваў управай Беларускага інстытута навукі і мастацтва ў Нью-Йорку. Некаторы час быў членам урада БНР, але выйшаў з яго. Некалькі разоў наведваў СССР, Мінск.

У друку пачаў выступаць у 1920 г. Першае апавяданне надрукаваў у 1925 г. (часопіс «Полымя»). Аўтар аповесцей «Знойдзены клад» (часопіс «Полымя», 1925), «Два шляхі» (часопіс «Полымя», 1926), «Вецер з Усходу» (1929), кнігі прозы «Над абрывам» (1929).

Выступаў з літаратурна-крытычнымі артыкуламі (аб творчасці М. Зарэцкага, К. Чорнага).

---

## *Алесь ЛІПНЁВЫ*



Алесь Ліпнёвы (Абрам Восіпавіч Ашаровіч) нарадзіўся ў 1909 г. у горадзе Дзвінску (цяпер Даўгаўпілс, Латвія) у сям'і служачага.

З 1927 г. жыў у Мінску. Працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет «Чырвоная змена», «Звязда», адказным сакратаром часопіса «Напагатове».

Памёр 31.3.1933 г.

З нарысамі і апавяданнямі пачаў выступаць у 1930 г. Друкаваўся ў газетах «Чырвоная змена», «Звязда», часопісах «Заклік», «Чырвоная Беларусь», «Напагатове», у калектыўных зборніках.

---

## *Уладзімір ЛІПСКІ*



Уладзімір Сцяпанавіч Ліпскі нарадзіўся 6.5. 1940 г. у вёсцы Шоўкавічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1960 г. скончыў Мінскі тэхнікум харчовай прамысловасці. Працаваў на Гарадзейскім цукровым заводзе (1960—1964), у нясвіжскай раённай газеце «Чырвоны сцяг» (1964—1967). Завочна скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1966). У 1967—1968 гг.— першы сакратар

Нясвіжскага райкома камсамола, у 1968—1976 гг.— у апараце ЦК ЛКСМБ, у 1976—1978 гг.— адказны сакратар праўлення СП БССР. З 1978 г.— галоўны рэдактар часопіса «Вясёлка», з 1988 г. адначасова — старшыня праўлення Беларускага аддзялення Савецкага дзіцячага фонду імя У. І. Леніна. Член СП СССР з 1979 г.

Узнагароджаны медалём.

У рэспубліканскім друку выступае з 1964 г. Аўтар кніг публіцыстыкі «Райкомаўскія будні» (1971), «Дзень за днём» (1973), «Знайдзі сябе» (1974), «Якое яно, шчасце?» (1977), нарысаў «Прыдзвінскі цуд» (1975), «Высокія зоркі» (1981), дакументальных аповесцей «Крутыя вёрсты» (1980, пастаўлена радыёп'еса ў 1978), «Урокі Купрэвіча» (1987), «Невядомы» (1990), зборнікаў прозы «Раны» (1987), «Дзень нараджэння» (1988), кніг для дзяцей «Рыгоркавы прыгоды» (1974) і «Марынчына казка» (1977), «Клякса-Вакса і Янка з Дзіўнагорска» (1982), «Лаўрэнавы працадні» (1984). З украінскім пісьменнікам Б. Чалым напісаў кнігу «Люби меня при всякой доле» (1982).

---

## *Арсень ЛІС*



Арсень Сяргеевіч Ліс нарадзіўся 4.2.1934 г. у вёсцы Вётхава Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1956). Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Шаркаўшчынскай сярэдняй школе на Віцебшчыне, адначасова загадваў педагагічным кабінетам Шаркаўшчынскага рана. У 1957—1959 гг. працаваў рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. З 1962 г.— навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1967 г.

У друку па пытаннях беларускай культуры пачаў выступаць у 1955 г. Выдаў кнігі «Браніслаў Тарашкевіч» (1966), «Мікола Шчакаціхін» (1968), «Пётра Сергіевіч» (1970), «Купальскія песні» (1974), «Пякучай маланкі след» (1981),

«Вечны вандроўнік» (1984), «Песню — у спадчыну» (1989), «Валачобныя песні» (1989). Даследчык фальклору, адзін з аўтараў вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Беларуская народна-паэтычная творчасць» (1979).

Укладальнік зборнікаў «Беларускія народныя песні» (1970), «Жніўныя песні» (1974), «Восеньскія і талочныя песні» (1981), «Купальскія і пятроўскія песні» (1985), «Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы» (з Я. Саламевічам, 1984).

Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Песня на ўсё жыццё» (з І. Цішчанкам, зняты ў 1984) і «Прысады жыцця» (з А. Вялюгіным, зняты ў 1985).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1986) за ўдзел у падрыхтоўцы і выданні акадэмічнага збору беларускай народнай творчасці.

---

## *Пётр ЛІСІЦЫН*



Пётр Сцяпанавіч Лісіцын нарадзіўся 9.3.1927 г. у горадзе Полацку Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

З канца мая 1942 па ліпень 1944 г.— у партызанскім атрадзе «Няўлоўны» Полацкага злучэння. Быў паранены. У 1950 г. здаў экстэрнам экзамен за сярэднюю школу і паступіў у Рыжскі філіял Усесаюзнага юрыдычнага інстытута, а праз два гады перавёўся ў Латвійскі дзяржаўны універсітэт (скончыў у 1955). Рабіў у сістэме народнай гаспадаркі Латвіі — старшым інжынерам на Рыжскім электралямпавым заводзе, вядучым інжынерам праектна-канструктарскага бюро Упраўлення мясцовай прамысловасці, лабарантам Упраўлення эксіндыцыйнай лоўлі рыбы, інжынерам Рыжскай нарматыўна-даследчай станцыі транспартнага будаўніцтва СССР. Працаваў у органах МУС Латвіі, затым БССР, юрысконсультантам Гродзенскага абласнога вытворчага аб'яднання бытавога абслугоўвання. У 1978—1985 гг.— упаўнаважаны Усесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах па Гродзенскай вобласці. З 1968 г. жыве ў Гродна. Член СП СССР з 1981 г.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Айчыннай

вайны I ступені, медалямі, польскім Крыжам партызанскім.

У 1962 г. у газеце Прыбалтыйскай ваеннай акругі «За Родину» апублікаваў першыя апавяданні, у 1969 г.— у часопісе «Неман». Піша на рускай мове. Аўтар кніг прозы «Февральский наст» (1978), «Росные травы» (Хабараўск, 1981), «Трое разных» (1985). У часопісе «Нёман» апублікаваў аповесць «Самаволка» (1990).

---



## *Уладзімір* ЛІСІЦЫН

Уладзімір Сяргеевіч Лісіцын нарадзіўся 13.4. 1944 г. у фашысцкім канцлагеры Флігегорт. Паходзіў з сялянскай сям'і.

У вайну маці і старэйшы брат вывезены ў канцлагер. Пасля вызвалення сям'я вярнулася ў вёску Пагосцішча Лёзненскага раёна.

Працоўны шлях пачаў шахцёрам у Данбасе. У 1965 г. скончыў Лісічанскае педагагічнае вучылішча (Украіна). Настаўнічаў на Лёзненшчыне, супрацоўнічаў у раённай газеце «Сцяг перамогі». Завочна скончыў тэатразнаўчае аддзяленне Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута (1970). Апошнія гады жыў у Джанкоі (Украіна) — працаваў дырэктарам Палаца культуры, настаўнічаў у школе.

Памёр 12.7.1973 г.

Выступаць у друку з вершамі пачаў у 1964 г. Пісаў на беларускай і рускай мовах. Аўтар кніг вершаў і паэм «Жураўлінае вясло» (1974), «Беларусь — мая калыска» (1990).

---

## *Сцяпан* ЛІХАДЗІЕЎСКІ



Сцяпан Іванавіч Ліхадзіеўскі нарадзіўся 9.5. 1911 г. у вёсцы Баславічы (цяпер Барок) Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Беларускім педагагічным тэхнікуме (1926—1930), у Беларускім дзяржаўным універсітэце (1930—1931), у Беларускім вышэйшым педагагічным інстытуце (1931—1933). Скончыў Томскі педагагічны інстытут (1939). Быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», БелАПП. Працаваў у рэдакцыі газеты «Лі-

таратура і мастацтва». У 1933 г. быў рэпрэсіраваны і высланы на 3 гады на поўдзень Казахстана ў Сарыагачскі раён. Настаўнічаў у сярэдніх школах. У 1939 г. паступіў у аспірантуру Ташкенцкага педінстытута імя Нізамі. Працаваў выкладчыкам гэтага інстытута, быў дэканам факультэта, а з 1963 г. загадваў кафедрай замежнай літаратуры Рэспубліканскага педагагічнага інстытута рускай мовы і літаратуры. Рэабілітаваны ў 1956 г. Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1948 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 13.2.1979 г.

Першы верш надрукаваў у 1925 г. (часопіс «Беларускі піянер»). Пісаў на беларускай, рускай і ўзбекскай мовах. Выйшлі зборнікі паэзіі «Чырванеюць вішні» (1931), «Рокаты дальняй прыстані» (1931), «Крыкавыя знічкі на снезе» (1932), «Мы — маладая гвардыя» (1932), кніжкі вершаў і перакладаў «Берасцянка жывых трывог» (выбраныя вершы і пераклады, 1962), «Поиски сердолика» (вершы, пераклады, Ташкент, 1973), «Вянкі камунарам» (1974), «Чырвоныя макі» (1981).

Вядомы і як крытык і літаратуразнавец. Аўтар кніг «Анатоль Франс: Краткий очерк творческого пути» (Ташкент, 1954), «Анатоль Франс: Очерк творчества» (Ташкент, 1962), зборніка літаратурна-крытычных артыкулаў «Радость встреч» (Ташкент, 1977).

Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы французскіх, нямецкіх, узбекскіх паэтаў.

---



## *Мікола ЛОБАН*

Мікола (Мікалай Паўлавіч) Лобан нарадзіўся 27.10.1911 г. у вёсцы Чаплічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1931 г. скончыў двухгадовыя педагагічныя курсы ў Слуцку. Настаўнічаў у вёсках Пласток, Таль на Любаншчыне (1931—1934), у мястэчку Шацк Пухавіцкага раёна, у вёсцы Пярэжыр Рудзенскага раёна. У 1939 г. паступіў на філалагічны факультэт Кіеўскага універсітэта, а праз год перавёўся ў Беларускі дзяржаўны універсітэт. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Волхаўскім фронце. Быў двойчы

паранены і ў 1942 г.— дэмабілізаваны. Адзін год выкладаў рускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе ў пасёлку Келераўка (Казахстан), зноў вучыўся ў БДУ (скончыў у 1945). У 1944—1967 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа АН БССР, у 1967—1968 гг.— загадчык рэдакцыі выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя», у 1968—1978 гг.— зноў у Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа — загадчык сектара, навуковы супрацоўнік. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1950 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Заслужаны работнік культуры БССР (1974).

Памёр 28.12.1984 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1930 г. Аўтар аповесці «Іркуцянка» (1953), раманаў «На парозе будучыні» (1964), «Гарадок Устронь» (1970), «Шэметы» (1981). У 1984 г. выйшла кніга артыкулаў і эсэ «Пяць раніц тыдня». У 1986 г. Выбраныя творы ў 3 тамах.

Адзін са складальнікаў «Правілаў беларускай арфаграфіі і пунктуацыі» (1959), «Арфаграфічнага слоўніка» (з М. Р. Суднікам, 1948, 1961, 6-е выданне перапрацаванае і дапоўненае ў 1990), «Руска-беларускага слоўніка» (1953), «Беларуска-рускага слоўніка» (1962), кіраваў падрыхтоўкай «Тлумачальнага слоўніка беларускай мовы» ў 5 тамах (1977—1984).

Пераклаў аповесць М. Горкага «У людзях» (з Э. Агняцвет, 1952).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя І. Мележа за кнігу «Пяць раніц тыдня» (1985, пасмяротна).

---

## *Алег ЛОЙКА*



Алег Антонавіч Лойка нарадзіўся 1.5.1931 г. у горадзе Слоніме Гродзенскай вобласці ў сям'і фельчара.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1953), аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры універсітэта (1956). З 1956 г.— выкладчык беларускай літаратуры, з 1985 г.— загадчык кафедры універсітэта. Кіраваў універсітэцкім аб'яднаннем «Узлёт» (1964—1989).

Член-карэспандэнт АН БССР. Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, медалём Францыска Скарыны, іншымі медалямі і польскім медалём «Заслужаны перад польскай літаратурай».

Першыя вершы надрукаваў у 1943 г. («Баранавіцкая газета»). Аўтар зборнікаў паэзіі «На юначым шляху» (1959), «Задуменныя пералескі» (1961), «Дарогі і летуценні» (1963), «Блакітнае азерца» (вершы і паэмы, 1965), «Каб не плакалі ка́ні» (1967), «Дзівасіл» (1969), «Калі ў дарозе ты...» (выбранае, 1971), «Шчырасць» (1973), «Пачуцці» (вершы і паэма, 1976), «Лінія жыцця» (1978), «Скрыжалі» (выбранае, 1981), «Няроўныя даты» (1983), «Грайна» (1986), «Пралескі ў акопах» (1987), «Балады вайны і міру» (1989), «Талая вясна» (вершы і паэмы, 1990). Для дзяцей выйшлі кніжкі вершаў «Як Тоня рэха шукала» (1962), «Карагод дзівосных прыгод» (1966), «Каля млына» (1972), «Дзе хто начуе?» (1977), «Пра дзеда Аяяй і бабку Оёёй» (1984).

Напісаў раманы-эсэ «Як агонь, як вада» (1984) і «Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае» (1990), аповесць «Скарына на Градчанах» (1990), сцэнарый дакументальнага фільма «Максім Багдановіч» (зняты ў 1990).

Выступае і як крытык, літаратуразнавец. Выдаў манаграфіі «Адам Міцкевіч і беларуская літаратура» (1959), «Новая зямля» Якуба Коласа: Вытокі, веліч, хараство» (1961), «Максім Багдановіч» (1966), «Сустрэчы з днём сённяшнім» (1968), «Беларуская паэзія пачатку XX стагоддзя» (1972), зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў і творчых партрэтаў «Паэзія і час» (1981), даклады на V Міжнародны з'езд славістаў «Беларуска-польскія літаратурныя ўзаемасувязі ў XIX ст.» (з Н. Перкіным, 1963), на IX з'езд — «Традыцыі літаратуры старажытнай Русі ў беларускай літаратуры» (з В. Чамярыцкім, А. Коршунавым, 1982), вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ «Гісторыя беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд» (ч. I—1977, ч. II—1980, 2-е дапрацаванае выданне ч. I і II — 1989). Аўтар праграм па старабеларускай літаратуры і беларускай літаратуры XVIII — пачатку XX стагоддзяў. Адзін са складальнікаў хрэстаматыі для вышэйшых навучальных уста-

ноў «Беларуская літаратура XIX стагоддзя» (з С. Александровічам і В. Рагойшам, 1971, 2-е дапрацаванае выданне з В. Рагойшам, 1988).

Працуе і ў галіне перакладу. На беларускую мову пераклаў кніжку выбраных твораў П. Верлена «У месяцавым ззянні» (1974), І.-В. Гётэ «Спатканне і ростань» (1981), асобныя творы рускіх, украінскіх, літоўскіх, латышскіх, польскіх і іншых паэтаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1990) за раман-эсэ «Францыск Скарына, або Сонца маладзіковае».

---

## *Еўдакія ЛОСЬ*



Еўдакія Якаўлеўна Лось нарадзілася 1.3.1929 г. у вёсцы Старына Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1948 г. скончыла Глыбоцкае педвучылішча, у 1955 г.— філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працавала літработнікам у рэдакцыях газет «Чырвоная змена», «Зорька», рэдактарам Вучэбна-педагагічнага выдавецтва БССР. У 1960 г. скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве, зноў працавала ў Вучэбна-педагагічным выдавецтве БССР, літработнікам газеты «Звязда», адказным сакратаром часопіса «Работніца і сялянка», у 1975—1977 гг.— галоўным рэдактарам часопіса «Вясёлка». Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалём.

Памерла 3.7.1977 г.

Выступіла ў друку ў 1948 г. (полацкая газета «Большевистское знамя», часопіс «Работніца і сялянка»). Аўтар зборнікаў вершаў «Сакавік» (1958), «Палачанка» (1962), «Людзі добрыя» (1963), «Хараство» (1965), «Яснавокія мальвы» (1967), «Вянцы зруба» (выбранае, 1969), «Перавал» (вершы і паэмы, 1971), «Галінка з яблыкам» (1973), «Лірыка» (1975), «Лірыка ліпеня» (вершы і паэмы, 1977), «Валошка на мяжы» (выбранае, 1984). Для дзяцей выйшлі кніжкі вершаў «Абутая елачка» (1961), «Казка пра Ласку» (1963), «Вяселікі» (1964), «Зайчык-выхваляйчык» (1970), «Дванаццаць загадак»

(1974), «Смачныя літары» (1978), апавяданняў «Дзесяць дзён у Барку» (1984). У 1979 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Напісала кнігі прозы «Пацеркі» (1966) і «Травіца брат-сястрыца» (1970). У 1977 г. у часопісе «Полымя» надрукаваны цыкл «Навелы пятага паверха».

Пераклала на беларускую мову кніжку вершаў С. Баруздзіна «Краіна, дзе мы жывём» (1977).

---

## *Максім ЛУЖАНІН*



Максім Лужанін (Аляксандр Амвросьевіч Каратай) нарадзіўся 2.11.1909 г. у вёсцы Прусы Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум (1928), вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1928—1930). Быў членам літаратурных арганізацый «Маладняк», «Узвышша». Працаваў у рэдакцыі часопіса «Узвышша» (1930—1931), на Беларускім радыё (1931—1933). Быў рэпрэсіраваны ў 1933 г. і высланы ў Сіблаг. У 1935—1941 гг. знаходзіўся на выдавецкай рабоце ў Маскве. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў Савецкую Армію. Пасля заканчэння Падольскага пяхотнага вучылішча (1942) удзельнічаў у баях пад Сталінградам. Дэмабілізаваўшыся з арміі (1944), працаваў у рэдакцыях газеты «Звязда», часопісе «Вожык», у АН БССР. З 1959 г.— член сцэнарнай калегіі кінастудыі «Беларусьфільм», у 1967—1971 гг.— галоўны рэдактар студыі. У 1968 г. удзельнічаў у рабоце XXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР у 1967—1985 гг. Член СП СССР з 1943 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Дружбы народаў, Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларускай ССР (1969).

Першы верш апублікаваў у 1925 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Крокі» (1928), «Новая ростань» (1930), «Аднагалосна» (1931), «Галасуе

вясна за вясну» (1931), «Кастрычнікам! Ліпенем! Маем!» (1931), «Першамайская вуліца» (1932), «Шырокае поле вайны» (1945), «Моваю сэрца» (1955), «Прасторы» (1958), «Прага крыла» (1974), паэм «Неаплачаны рахунак» (1930), «Галасы гарадоў» (1932), «Як нараджаўся новы свет» (1975), кніжак вершаў і паэм «Поступ» (1950), «Святло Радзімы» (1952), «Росы на коласе» (1973), «Лявоніха» (1977), «Галасы над выраем» (1980), «Паразмаўляй са мной, зямля» (1983), «Вярнуся ветрам» (1987). Выдаў «Вершы для дзяцей» (1948) і паэму-казку «Хто робіць пагоду» (1960). У 1960 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах, у 1968—1970 гг.— Збор твораў у 3-х, у 1979 — у 4 тамах.

Працуе і ў галіне прозы, а таксама крытыкі. Выдаў зборнікі «Вачыма часу» (успаміны, артыкулы, эсэ, 1964), «З ранку да вечара» (роздумы, накіды партрэтаў, 1978), кнігі прозы «Колас расказвае пра сябе» (1964), «Дванаццаць вячорных вогнішчаў» (1968), зборнік сатыры і гумару «Сілівон на дачы» (1958), кнігу публіцыстыкі «Рэпартаж з рубцом на сэрцы» (1973), зборнікі аповесцей, апавяданняў, успамінаў «Людзі, птушкі, прастор» (1976), «Песні з леснічоўкі» (1982), «Сустрэчы» (1982), «Трое» (1989). Аўтар сцэнарыяў мастацкага фільма па аднайменнай п'есе Янкі Купалы «Паўлінка» (пастаўлены ў 1952) і дакументальнага — «Народны паэт» (пастаўлены ў 1952), з А. Куляшовым напісаў сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Першыя выпрабаванні» (пастаўлены ў 1960), «Запомнім гэты дзень» (пастаўлены ў 1967).

На беларускую мову пераклаў «Жыццё Кліма Самгіна» М. Горкага (1938), «Гора ад розуму» А. Грыбаедава (1949), «Вечары на хутары ля Дзіканькі» (1950) і «Выбраныя творы» М. Гогаля (1952). «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву» А. Радзішчава (1951), «Маладую гвардыю» А. Фадзеева (1953), «Яны змагаліся за радзіму» М. Шолахава (1975), «Пераяслаўскую Раду» Н. Рыбака (1954—1955), паасобныя творы А. Пушкіна, А. Міцкевіча, М. Някрасава, І. Буніна, У. Сыракомлі, Ю. Тувіма, У. Маякоўскага, Я. Смелякова і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1965) за кнігу «Колас расказвае пра сябе».

*Валянцін ЛУКША*



Валянцін Антонавіч Лукша нарадзіўся 16.11. 1937 г. у горадзе Полацку ў сям'і служачага.

Скончыў Полацкі лясны тэхнікум (1956) і Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС (1976). Працаваў памочнікам таксатара Пензенскай аэрафоталесаўпарадчай экспедыцыі. У 1958 г.— інструктар Полацкага гаркома камсамола, камсорг трэста № 16 «Нафтабуд». З 1961 г.— літсупрацоўнік полацкай газеты «Сцяг камунізма», загадчык аддзела міжраённай газеты «Ленінская іскра» (Полацк), карэспандэнт Беларускага радыё, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва рэспубліканскай газеты «Чырвоная змена», адказны сакратар штомесячніка «На экранах Беларусі», з 1973 г.— старшы рэдактар, з 1975 г.— галоўны рэдактар Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё, з 1980 г.— дырэктар выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1978 г.

Узнагароджаны медалём і Ганаровым знакам А. П. Гайдара.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1956 г. (апублікаваны верш у «Віцебскім рабочым»). Выйшлі кнігі вершаў «Гарады нараджаюцца сёння» (1964), «Атава» (1969), «Споведзь» (1973), «Белыя берагі» (паэма-хроніка, 1981), «Радзімыя плямы» (вершы і фельетоны, 1982), «Сляды памяці» (вершы і паэма, 1986), «Агонь і попел» (драматычныя паэмы, 1989), кніжкі вершаў, казак для дзяцей «Аркестр» (1972), «Зялёная бальніца» (1974), «Лета — круглы год» (1978), «Крылаты цэх» (1982), «Чароўны камень» (1987). Выдаў кнігі публіцыстыкі «Наша полацкая прафесія» (1966), «Рамантыкі шасцідзесятых» (1967), «Дзесяць дарог да чароўнага» (1970), «Полацк» (1973).

Аўтар п'ес, пастаўленых на тэатральнай сцэне, тэлебачанні і радыё, «Інтэгралы на цэгле» (1974), «Мая радня» (1975), «Свае крылы» (1976), «Вецер веку» (паводле аднайменнага рамана І. Гурскага, 1977), «Калі вяртаюцца буслы» (1982), «Асоль» (паводле твораў А. Грына, 1984), «Пад шыфрам «Зорачка» (1985), «Чароўны камень» (1985).

Пераклаў п'есы С. Міхалкова «Дарагі хлоп-

чык» (1986), М. Рошчына «Уся Надзея» (1986), Е. Тарахоўскай «Казка пра Ямелю» (1990). Напісаў лібрэта оперы «Барвовы золак» (пастаўлена ў 1979).

Многія вершы пакладзены на музыку.

---



## *Мікола* ЛУК'ЯНАЎ

Мікалай Піліпавіч Лук'янаў нарадзіўся 20.7. 1924 г. у вёсцы Лешчанка Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў сярэднюю школу ў пасёлку Кіраўск (1941). У час Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у партызанскім руху (з кастрычніка 1942 г. па чэрвень 1944 г., партызанскі полк № 537 імя Кірава). Быў паранены. Пасля злучэння з Савецкай Арміяй прымаў удзел у баях на фронце. У ліпені 1944 г. на беластоцкім напрамку быў цяжка паранены і страціў зрок. У 1948—1968 гг. працаваў настаўнікам вячэрняй школы на Бабруйскім прадпрыемстве таварыства сляпых. У 1968—1989 гг.— старшыня Магілёўскага абласнога праўлення таварыства сляпых. Член СП СССР з 1990 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Заслужаны работнік сацыяльнага забеспячэння БССР (1981).

Першае апавяданне апублікаваў у 1963 г. (бабруйская газета «Камуніст»). Аповесць «І цемра адступіла» (часопіс «Маладосць», 1987) увайшла ў калектыўны зборнік «Дым родных камiноў» (1988).

---



## *Мікола* ЛУПСЯКОЎ

Мікола (Мікалай Радзівонавіч) Лупсякоў нарадзіўся 4.3.1919 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і сялян.

У 1921 г. сям'я вярнулася на радзіму — у вёску Папаратнае, што на Жлобіншчыне. Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1941). З 1941 г. у Савецкай Арміі. Скончыў Смаленскае артылерыйскае вучылішча (1942). Удзельнічаў у баях пад Масквой, на Цэнтраль-

ным, Варонежскім франтах, пад Харкавам. У сакавіку 1943 г. быў цяжка паранены і пасля лячэння дэмабілізаваны. Працаваў у газеце «Казахстанская правда» (1943—1944), у рэдакцыях часопісаў «Беларусь» (1944—1945), «Бярозка» (1945—1949). Член СП СССР з 1944 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 12.2.1972 г.

У друку пачаў выступаць у 1935 г. (альманах «Аднагодкі»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Першая атака» (1946), «Апавяданні» (1947), «Мост» (1947), «Дружба» (1952), «Чырвоны бераг» (апавяданні і нарысы, 1954), «Дняпроўская чайка» (1957, 1988), «Паядынак» (1957), «У вераб'іную ноч» (1958), «Ля пераправы» (1959), «Прырэчча» (аповесць і апавяданні, 1961), «На берагах Дняпра» (1966), Выбраныя творы (1968), «Міхалаў дуб» (1974).

Для дзяцей выйшлі кніжкі апавяданняў «Разведчыкі» (1949), «На вірах» (1974) і аповесць «Я помню...» (1964).

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы Дж. Лондана, У. Гаршына. П. Паўленкі, А. Гайдара, У. Курачкіна і інш.

---

## *Мікола ЛУФЕРАЎ*



Мікола (Мікалай Пятровіч) Луфераў нарадзіўся 7.1.1929 г. у вёсцы Трубільня Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1950). Працаваў настаўнікам Старобінскай сярэдняй школы Мінскай вобласці. У 1954 г. скончыў аспірантуру пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага. Працаваў старшым выкладчыкам, дацэнтам Магілёўскага педінстытута, навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. У 1975—1978 гг.— дацэнт кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. Кандыдат філалагічных навук. З 1982 г. настаўнічаў у школах Магілёўскага раёна. Жыве ў Магілёве. Член СП СССР з 1971 г.

Выступае ў друку як крытык і літаратуразнавец з 1952 г. Напісаў брашуру «Кузьма Чорны»

(1960) і манаграфію «Проза Кузьмы Чорнага» (1961). Сааўтар кнігі «Праблемы сучаснай беларускай прозы» (з П. Дзюбайлам і В. Жураўлёвым, 1967), адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964), падручніка для студэнтаў філалагічных факультэтаў педінстытутаў «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1917—1940» (1981).

---

## *Антон ЛУЦКЕВІЧ*



Антон Іванавіч Луцкевіч нарадзіўся 30.1.1884 г. у горадзе Шаўлі (цяпер Шаўляй, Літва) у сям'і служачага.

З 1897 г. жыў у Мінску, дзе вучыўся ў мужчынскай класічнай гімназіі. У 1902 г. паступіў на фізіка-матэматычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Пасля васьмі семестраў перавёўся на юрыдычны факультэт Юр'еўскага (цяпер Тартускага) універсітэта, дзе вучыўся шэсць семестраў. Адзін з заснавальнікаў Беларускай Сацыялістычнай Грамады (1903); на першым з'ездзе партыі (1905) абраны членам ЦК. У 1905 г. быў арыштаваны, у 1906—1908 гг. знаходзіўся на нелегальным становішчы. У 1916 г. заснаваў Беларускую сацыял-дэмакратычную работніцкую групу. З 1918 г.— член Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі. Узначальваў Беларускі народны камітэт у Вільні (1916—1919), з'яўляўся старшынёй віленскай Беларускай рады (1918—1919). У сакавіку 1918 г. кааптаваны ў склад Рады Беларускай Народнай Рэспублікі. Адзін з ініцыятараў абвяшчэння незалежнасці БНР (Акт 25 сакавіка 1918 г.). З кастрычніка 1918 па люты 1920 г. старшыня Рады народных міністраў БНР, народны міністр замежных спраў. Адстойваў інтарэсы Беларусі на Парыжскай мірнай канферэнцыі, на перагаворах з Ю. Пілсудскім. У верасні 1919 г. быў інтэрніраваны польскімі ўладамі, у час савецкай улады ў Вільні (ліпень-верасень 1920 г.) зняволены. Пасля заключэння Рыжскага трактата — старшыня падпольнага Беларускага дзяржаўнага камітэта і легальных Беларускага нацыянальнага камітэта, Беларускага выдавецкага таварыства, выкладчык Віленскай беларускай гімназіі, заснавальнік і дырэктар Беларускага

музея імя Івана Луцкевіча ў Вільні. Двойчы прыцягваўся да судовай адказнасці ў справе Беларускай сялянска-рабочай грамады, быў зняволены, звольнены з працы ў гімназіі, а ўзначаленыя ім Беларускі нацыянальны камітэт і Беларускае выдавецкае таварыства — забаронены польскімі ўладамі. Пасля прыходу ў Вільню Чырвонай Арміі 30.9.1939 г. арыштаваны і вывезены ў Мінск. Рэабілітаваны ў 1989 г.

Паводле афіцыйных звестак, памёр у 1946 г. у зняволенні. Паводле іншых звестак, расстраляны ў чэрвені 1941 г. у час эвакуацыі вязняў.

Выступаў як крытык, літаратуразнаўца, публіцыст і перакладчык. Адзін з заснавальнікаў і фактычных кіраўнікоў газет «Наша доля» і «Наша ніва». Пісаў па-беларуску, па-руску і па-польску. Даследаваў творчасць У. Сыракомлі, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, У. Жылкі, Н. Арсенневай, М. Чарота, У. Дубоўкі, іншых пісьменнікаў. Быў рэдактарам і выдаўцом зборнікаў паэзіі, публіцыстыкі, альманахаў. Асобнымі кнігамі, адбіткамі і брашурамі (частка з іх падпісана псеўданімам Антон Навіна) выйшлі «Белорусы» (СПб, 1908), «На дарозе да новага жыцця» (СПб, 1912), «Эканамічная эвалюцыя і беларускі дух» (Вільня, 1917), «Як правільна пісаць пабеларуску» (Вільня, 1917), «Беларускі правапіс» (з Я. Станкевічам, Вільня, 1918), «Нашы песняры: Літаратурна-сацыяльныя нарысы» (Вільня, 1918), «Польская акупацыя ў Беларусі» (Вільня, 1920), «Жыдоўскае пытанне ў беларускай літаратуры» (Вільня, 1921), «Пуцяводныя ідэі беларускае літаратуры» (Вільня, 1921), «Вязніца Адама Міцкевіча» (Вільня, 1923), «Як вучыць у новай школе: Увагі для вучыцеляў беларускіх сярэдніх школ» (Вільня, 1923), «Вільня ў беларускай літаратуры» (Вільня, 1925), «За дваццаць пяць гадоў: Успаміны аб працы першых беларускіх арганізацыяў. Беларуская Рэвалюцыйная Грамада, Беларуская Сацыялістычная Грамада» (Вільня 1928), «Адбітае жыццё: Лекцыі і стацці з беларускае адраджэнскае літаратуры. Кніжка 1» (Вільня, 1929), «Янка Купала як Прарок Адраджэння» (Вільня, 1932), «Беларускі музей імені Івана Луцкевіча» (Вільня, 1933), «Галоўныя кірункі беларускай паэзіі» (Вільня, 1933). На польскай мове выйшлі «Праўда аб вязніцы Канрада: У сотую гадавіну працэсу філаматаў»

(Вільня, 1923), «Нарадавольцы Беларусі і іх орган «Гомон» (Львоў, 1935).

У яго перакладзе на беларускую мову выдадзены «Элементарная алгебра» А. Кісялёва (Вільня, 1921), «Сусветная гісторыя. Ч. 2. Сярэднявечная гісторыя» В. Остэрлёфа і Я. Шустэра (Вільня, 1921). Разам з Л. Дзекуць-Малеем пераклаў Новы запавет і Псалмы (Хельсінкі, 1931; Лондан, 1948). У Цэнтральнай бібліятэцы Літоўскай АН захоўваецца рукапіс перакладу «Кнігі джунгляў» Р. Кіплінга.

---

## *Міхась ЛЫНЬКОЎ*



Міхась (Міхаіл Ціханавіч) Лынькоў нарадзіўся 30.1.1899 г. у вёсцы Зазыбы Вілейскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Скончыў Старасельскае народнае вучылішча, у 1917 г.— Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Настаўнічаў у Ліпініцкай земскай школе (цяпер Буда-Кашалёўскі раён). У 1919—1922 гг. служыў у Чырвонай Арміі. Удзельнічаў у савецка-польскай вайне, у разгроме атрадаў Булак-Балаховіча. Настаўнічаў у вёсцы Свержань Рагачоўскага раёна. У 1925—1928 гг.— адказны сакратар рэдакцыі, намеснік рэдактара, у 1928—1930 гг.— рэдактар бабруйскай акруговай газеты «Камуніст». Быў арганізатарам і кіраўніком Бабруйскай філіі «Маладняка», адным з кіраўнікоў БелАПП. Працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР (1930—1932), сакратаром аргкамітэта (1932—1934), галоўным рэдактарам часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1933—1941), старшынёй праўлення СП БССР (1938—1948). Удзельнік паходу ў Заходнюю Беларусь у 1939 г. (рэдагаваў газету «Беларуская звязда» — орган палітупраўлення Беларускага фронту). У 1941—1942 гг.— рэдактар франтавой газеты «За Савецкую Беларусь» (выходзіла на Заходнім, Цэнтральным і Бранскім франтах). У 1943—1946 і 1949—1952 гг.— дырэктар Інстытута літаратуры, мовы і мастацтва АН БССР. Абіраўся кандыдатам у члены ЦВК БССР (1921—1931), дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1940—1945). Як член дэлегацыі БССР неаднаразова ўдзельнічаў у рабоце сесій Генеральнай Асамблеі

ААН. Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны трыма ордэнамі Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1962).

Памёр 21.9.1975 г.

Першы твор (верш) надрукаваў у 1919 г. (смаленская газета «Борьба»), першыя апавяданні — у 1926 г. (бабруйская газета «Камуніст» і зборнік бабруйскай філіі «Маладняка» — «Уздым»). Выйшлі зборнікі прозы «Апавяданні» (1927), «Гой» (1929), «Андрэй Лятун» (1930), «Саўка-агіцірнік» (1933), «На вялікай хвалі» (1934), «Баян» (1935), «Сустрэчы» (1940), «Астап» (1944), «Апошні зверыядавец» (аповесць, 1930), «За акіянам» (нататкі, апавяданні, нарысы, 1962), раман «На чырвоных лядах» (1934) і раман-эпапея ў 4 кнігах «Векапомныя дні» (1958, 2-е перапрацаванае выданне ў 1969), нарыс «Герой Савецкага Саюза Канстанцін Заслонаў» (1944), апавяданне «Агні Танганьікі» (1957), «Выбраныя творы» (1931, 1934, 1952), «Выбраныя апавяданні» (1938, 1941, 1947), Зборы твораў у 4-х (1967—1968) і ў 8 тамах (1981—1985).

Для дзяцей выдадзены кнігі «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» (1937), «Міколка-паравоз» (1937, аповесць экранізавана ў 1957), «Янка-парашутыст» (1937), «Ядвісін дуб» (1940), «Апавяданні» (1946, 1948, 1960, 1966, 1973, 1974, 1988).

М. Лынькову належаць літаратуразнаўчыя працы «Беларуская літаратура за 30 год» (1948, на беларускай і рускай мовах), «Вобраз Сталіна ў беларускай мастацкай літаратуры» (1950), «Якуб Колас» (1952), «Летапіс эпохі: Беларускай савецкай літаратуры пяцьдзесят год» (1968), зборнік артыкулаў «Літаратура і жыццё» (1978), кніга «Публіцыстыка» (1980).

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы М. Горкага, М. Ціханава і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968) за раман «Векапомныя дні».

## *Рыгор* ЛЫНЬКОЎ



Рыгор Ціханавіч Лынькоў нарадзіўся ў 1909 г. на чыгуначнай будцы каля вёскі Старое Сяло Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

З 1922 да 1925 г. жыў у брата (М. Лынькова) у вёсцы Свержань Рагачоўскага раёна, вучыўся ў сямігодцы, пасля ў сярэдняй школе ў Бабруйску, працаваў у хаце-чытальні ў Бабруйскім раёне. Служыў у Чырвонай Арміі. Дэмабілізаваўшыся, працаваў у рэдакцыі газеты «Камуніст» (Бабруйск), у 1936—1941 гг.— адказны сакратар газеты «Літаратура і мастацтва» ў Мінску.

Прапаў без вестак у 1941 г. на фронце.

Першую нізку вершаў надрукаваў у 1926 г. у літаратурным зборніку бабруйскай філіі «Маладняка» — «Уздым». Змяшчаў паэтычныя творы ў штомесячніках «Вясна» і «Ударнік» — літаратурных дадатках да газеты «Камуніст» (1928—1931).

Пераклаў на беларускую мову апавяданне Л. Панцялеева «Пакет» (1938), п'есу М. Святлова «Казка» (пастаўлена ў 1941), паасобныя творы ўкраінскіх, грузінскіх, казахскіх, польскіх, нямецкіх, іспанскіх паэтаў, удзельнічаў у перакладзе «Выбраных твораў» У. Маякоўскага (1940).

## *Вера* ЛЮТАВА



Вера Сяргееўна Лютава нарадзілася 10.8.1912 г. у вёсцы Каськова Дарагабужскага раёна Смаленскай вобласці (Расія) у сям'і саматужніка.

Сярэднюю адукацыю атрымала ў Дарагабужы (1927). Працавала статыстыкам, бібліятэкарам у Смаленску. Пасля заканчэння (завочна) Смаленскага педагагічнага інстытута (1940) настаўнічала на Смаленшчыне, а ў 1941—1942 гг. у Тамбоўскай вобласці. З 1942 г. была на бібліятэчнай рабоце ў Яраслаўлі, з 1943 г. перайшла на журналісцкую працу. У 1944 г. разам з рэдакцыяй ваеннай газеты пераехала ў Мінск. Некалькі год узначальвала секцыю рускай літаратуры СП БССР. Член СП СССР з 1946 г.

Памерла 24.5.1954 г.

У друку выступіла ў 1930 г. Пісала на рускай мове. Вершы друкаваліся ў смаленскіх абласных газетах, у «Комсомольской правде», у часопісах «Смена», «Огонёк». Выйшлі зборнік вершаў «Воля к жизни» (Яраслаўль, 1943) і аповесць «Зарево над лесом» (1951).

---

## *Юрка ЛЯВОННЫ*



Юрка Лявонны (Леанід Мікалаевіч Юркевіч) нарадзіўся 29.7.1908 г. у горадзе Чавусы Магілёўскай вобласці ў сям'і служачага.

Скончыў Магілёўскі педагагічны тэхнікум, у 1934 г.— крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Вышэйшага педагагічнага інстытута ў Мінску. Працаваў у рэдакцыях газет «Магілёўскі селянін», «Звязда», часопіса «Работніца і калгасніца Беларусі», на Беларускім радыё. Восенню 1936 г. арыштаваны. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 25.4. 1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны восенню 1937 г.

Друкавацца пачаў у 1925 г. Выйшлі зборнікі вершаў «Камсамольскія вершы» і «Штурм» (1930), «Жалезныя віхуры» і «Разбег» (1931), «Стала і мужна» (1932), «Выбранае» (1960). Многія вершы пакладзены на музыку.

Выступаў і як празаік. У 1931 г. выдаў зборнік нарысаў «Крок пяцігодкі». Разам з С. Грахоўскім пераклаў на беларускую мову раман Ж. Верна «80 000 кіламетраў пад вадой» (1937).

---

## *Хрысціна ЛЯЛЬКО*



Хрысціна Аляксееўна Лялько нарадзілася 30.3. 1956 г. у вёсцы Хадзюкі Лідскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Тарноўскай сярэдняй школы (1973) працавала бухгалтарам у Радзівонішкаўскім сельсавеце Лідскага раёна. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1979). З 1979 г.— навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Янкі Купалы, з 1983 г.— літсупрацоўнік

аддзела крытыкі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», з 1984 г.— рэдактар аддзела літаратуры часопіса «Беларусь». Член СП СССР з 1983 г.

У 1971 г. на старонках лідскай раённай газеты «Уперад» змясціла першыя вершы, а ў 1979 г. у штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» — апавяданне. Аўтар кніг апавяданняў і аповесцей «Дарога пад гару» (1985), «Світанак над бярозамі» (1989), сцэнарыя мастацкага кароткаметражнага фільма «Лёгкі хлеб» (1987).

---

## *Сямён ЛЯЛЬЧУК*



Сямён Абрамавіч Ляльчук нарадзіўся 25.9. 1918 г. у горадзе Калінкавічы Гомельскай вобласці ў сям'і служачага.

Скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага (1939). Служыў у арміі. У час Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце.

У ліпені 1941 г. прапаў без вестак на фронце.

Вершы пачаў друкаваць яшчэ да вучобы ў інстытуце ў газеце «Юнгер ленінец» («Юны ленінец»), у 1938 г. стаў друкавацца ў часопісе «Штэрн» («Зорка»). Пісаў на мове ідыш. Разам з маладымі паэтамі І. Баруховічам, Х. Гурэвічам, П. Плоткіным выдаў у 1940 г. калектыўны «Зборнік вершаў». У перакладзе на беларускую мову асобныя творы апублікаваны ў зборніку «Мы іх не забудзем» (1949). У 1985 г. на мове ідыш у Маскве выйшаў зборнік «Ліра».

---

## *Уладзімір ЛЯПЁШКІН*



Уладзімір Ігнатавіч Ляпёшкін нарадзіўся 8.2. 1928 г. у вёсцы Церабель Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўніка.

Сярэднюю школу канчаў у Рудзенску, у 1951 г. скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў у школах Мінска выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры, завучам, дырэктарам. У 1970—1979 гг.— дырэктар выдавецтва «Народная асвета». У 1979—1987 гг.— дырэктар СШ № 23 г. Мінска. Член СП СССР з 1962 г.

Узнагароджаны медалямі.

Заслужаны настаўнік Беларускай ССР (1976).

Друкавацца пачаў у 1949 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Ранішнія росы» (1961), «Рупнасць» (1966), «Роднае» (1970), «Вусце» (1973), «Перадлецце» (1978). Для дзяцей выдаў кніжку паэзіі «Званкі-званочкі» (1972).

---

## *Уладзімір* ЛЯЎДАНСКІ



Уладзімір Аляксандравіч Ляўданскі нарадзіўся 7.2.1911 г. у вёсцы Гудавічы Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і батрака.

У 1930 г. паступіў у Мінскі педагагічны тэхнікум на вячэрняе аддзяленне, адначасова працаваў карэктарам у Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Служыў у Чырвонай Арміі (1933—1935). Зноў працаваў карэктарам, затым рэдактарам у выдавецтве. Скончыў вячэрняе аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1938). У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху, быў сувязным, з сакавіка 1943 г.— камісар атрада «Полымя» на Міншчыне, рэдактар пухавіцкай раённай падпольнай газеты «Партизан Белоруссии». У пасляваенны час рэдагаваў пухавіцкую раённую газету «Сцяг камунізма», а затым загадваў рэдакцыяй у Дзяржаўным выдавецтве БССР (1945—1949), сектарам перакладаў твораў класікаў марксізма-ленінізма Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ (1949—1963). У 1963—1969 гг. быў дырэктарам выдавецтва «Народная асвета». Член СП СССР з 1967 г.

Памёр 18.9.1973 г.

Літаратурную працу пачаў як перакладчык у 1937 г. Першае апавяданне апублікаваў у 1957 г. Аўтар зборнікаў апавяданняў для дзяцей «Адкрыццё сезону» (1960), «На беразе ракі» (1962), «На прывале» (1966), «Ноч над Нёманам» (1969), «Пад старым дубам» (1971), «Яшка прыляцеў» (1973). Сааўтар падручніка для школ дарослых «Буквар і першая кніга для чытання» (1947, 4 выданні). Пераклаў аповесць А. Талстога «Хлеб», зборнікі апавяданняў Л. Талстога, І. Тургенева, М. Салтыкова-Шчадрына, паасобныя творы іншых пісьменнікаў.

# M



## *Ніна МАЕЎСКАЯ*

Ніна Васільеўна Маеўская нарадзілася 4.12. 1938 г. у горадзе Любань Мінскай вобласці ў сям'і служачага.

Пасля заканчэння Любанскай сярэдняй школы (1956) працавала старшай піянерважатай у Сасноўскай сярэдняй школе Любанскага раёна (1956—1958). Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1963). Была літсупрацоўнікам мінскай раённай газеты «Шлях камунізма» (1963—1965), адказным сакратаром шматтыражнай газеты« За технический прогресс» (Мінскі падшыпнікавы завод, 1965—1967), загадчыкам аддзела, адказным сакратаром часопіса «Промышленность Белоруссии» (1968—1978). У 1980 г. скончыла Мінскую вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ. Працавала ў газеце «Літаратура і мастацтва» (1980—1981), старшым рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва» (1981—1985). З 1985 г.— рэдактар аддзела публіцыстыкі часопіса «Беларусь». Член СП СССР з 1983 г.

У друку выступае з 1955 г. Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Ляці, верабейка» (1969), «Агата» (1970), «Надзеевіч» (1983), «Такая позняя вясна» (1984), «Холад доннай вады» (1989).



*Уладзімір МАЗГО*

Уладзімір Мінавіч Мазго нарадзіўся 5.3.1959 г. у гарадскім пасёлку Зэльва Гродзенскай вобласці ў сям'і рабочага.

У 1964—1968 гг. разам з бацькамі жыў у Сібіры. У 1976 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў завочна ў 1985 г.). Служыў у Савецкай Арміі (1979—1981), быў карэспандэнтам шматтыражнай газеты «Інтэграл», выхавацелем у рабочым інтэрнаце, супрацоўнікам рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання. З 1984 г.— рэдактар выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1984 г.

Друкавацца пачаў у 1972 г. Аўтар паэтычных кніг «Пад спеў крыніц» (1982), «Вершаліна» (1987). Выдаў кнігу вершаў для дзяцей «Калі спрачаюцца маланкі» (1989).

Працуе і ў галіне перакладу.



*Сцяпан МАЙХРОВІЧ*

Сцяпан Казіміравіч Майхровіч нарадзіўся 21.6.1908 г. у вёсцы Старэва Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

З дзіцячых год працаваў на гуце. У 1929—1930 гг.— інструктар Бабруйскага акруговага камітэта камсамола. Скончыў завочна Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага (1941). Працаваў рэдактарам раённай газеты (г. Камарын), загадчыкам сектара Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, рэдактарам органаў ЦК КП Беларусі — газет «Орка» і «Штандар вольносці» (на польскай мове). У час Вялікай Айчыннай вайны — інструктар палітаддзела арміі, затым галоўны рэдактар Цэнтральна-беларускага радыёвяшчання ў Маскве. З 1943 г. па асабістай просьбе накіраваны ў тыл, да партызан, рэдагаваў газету «Белостокская правда». У 1944—1948 гг.— дырэктар Дзяржаўнага выдавецтва БССР, потым — журналіст, у 1952—1954 гг.— галоўны рэдактар Вучэбна-педагагіч-

нага выдавецтва БССР. Скончыў аспірантуру пры Мінскім педінстытуце імя М. Горкага (1957), у 1959—1970 гг.— навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі і польскім ордэнам Віртуці мілітары.

Памёр 2.7.1981 г.

Літаратурнай дзейнасцю пачаў займацца ў 1930 г. Аўтар манаграфічных прац і нарысаў па гісторыі савецкай і дакастрычніцкай беларускай літаратуры «Янка Лучына: Жыццё і творчасць» (1952), «В. І. Дунін-Марцінкевіч» (1955), «Нарысы беларускай літаратуры XIX стагоддзя» (1957), «Максім Багдановіч: Жыццё і творчасць» (1958), «Жизнь и творчество Ф. Богушевича» (1961), «Янка Брыль: Жыццё і творчасць» (1961), «Георгій Скарына» (1966), «Слова аб палку Ігаравым» (1968), «Прыказкі і прымаўкі: Гістарычны нарыс» (1976), «Іван Шамякін: Нарыс жыцця і творчасці» (1978), «Нарыс гісторыі старажытнай беларускай літаратуры XIV—XVIII ст.» (1980).

## *Андрэй МАКАЁНАК*



Андрэй Ягоравіч Макаёнак нарадзіўся 12.11. 1920 г. у вёсцы Борхаў Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Журавіцкай сярэдняй школы (1938) працаваў масавіком у раённым Доме культуры. У 1939 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Крымскім фронце. Пасля цяжкога ранення (1942) дэмабілізаваны. Працаваў у Акаурцкай сярэдняй школе Грузіі (1942—1943), сакратаром Журавіцкага райкома камсамола (1944, цяпер у складзе Рагачоўскага раёна), Гродзенскага гаркома камсамола (1945), загадчыкам партыйнага кабінета Магілёўскага чыгуначнага вузла (1945—1946), памочнікам сакратара Журавіцкага райкома партыі (1946—1947). У 1949 г. скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ. У 1949—1953 гг.—

загадчык аддзела прозы часопіса «Вожык», у 1966—1978 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Неман». Як член дэлегацыі БССР у 1965 г. удзельнічаў у рабоце XX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1971—1982). Член СП СССР з 1949 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі і медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1977).

Памёр 16.11.1982 г.

Друкуецца з 1946 г. Аўтар п'ес «На досвітку» (1951, пастаўлена ў 1952), «Выбачайце, калі ласка!» (апублікавана і пастаўлена ў 1953), «Каб людзі не журыліся» (1958, пастаўлена ў 1959), «Лявоніха на арбіце» (апублікавана і пастаўлена ў 1961), «Зацюканы апостал» (1969, пастаўлена ў 1971), «Трыбунал» (1970, пастаўлена ў 1970), «Таблетку пад язык» (апублікавана і пастаўлена ў 1973), «Святая прастата» (1974, пастаўлена ў 1976, асобнае выданне пад назвай «Кашмар» у 1979), «Верачка» (1979, пастаўлена ў 1979), «Пагарэльцы» (апублікавана і пастаўлена ў 1980), «Дыхайце ашчадна» (1982, пастаўлена ў 1984). Напісаў аднаактовыя п'есы «Добра, калі добра канчаецца» (1946), «Перад сустрэчай», «Жыццё патрабуе» і «Першае пытанне» (1950), «Крымінальная справа» і «Аксеніна цялушка» (1951), «На шырокія прасторы» (1958), а таксама сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Шчасце трэба берагчы» (па матывах аповесці А. Кулакоўскага «Нявестка», пастаўлены ў 1958), «Рагаты бастыён» (па п'есе «Лявоніха на арбіце», пастаўлены ў 1964), тэлефільма «Пасля кірмашу» (пастаўлены ў 1973), дакументальных фільмаў «У адзінай сям'і» (зняты ў 1957), «Кандрат Крапіва» (зняты ў 1961). Выйшлі зборнікі п'ес «Перад сустрэчай. Жыццё патрабуе» (1951), «Камедыі» (1961), «Трыбунал. Зацюканы апостал» (1971), «П'есы» (1974), «Кінасцэнарыі» (1989). Выдадзены Выбраныя творы ў 2-х (1980), Збор твораў у 5 тамах (1987—1990).

Пераклаў п'есы «Дабракі» Л. Зорына, «Я, бабуся, Іліко і Іларыён» Н. Думбадзе і Г. Лордкіпанідзе, «Чацвёрты» К. Сіманава і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1962) за п'есу «Лявоніха на арбіце», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1974) за п'есы «Трыбунал» і «Таблетку пад язык».

## *Пятрусь МАКАЛЬ*



Пятрусь (Пётр Міхайлавіч) Макаль нарадзіўся 25.8.1932 г. у вёсцы Крушыняны на Беласточчыне (цяпер Польшча) у сялянскай сям'і.

У 1947 г. паступіў у Гродзенскі будаўнічы тэхнікум, правучыўся два гады. Скончыў Гродзенскі педагагічны інстытут (1953). Быў супрацоўнікам абласной газеты «Гродненская правда». Служыў у Савецкай Арміі (1954—1956). Працаваў рэдактарам аддзела культуры і навукі часопіса «Маладосць» (1957—1960), вучыўся на Вышэйшых літаратурных курсах пры СП СССР (1960—1962), загадваў аддзелам літаратуры ў газеце «Літаратура і мастацтва» (1962—1963), быў рэдактарам рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР (1965—1966), памочнікам галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача (1966—1975). З 1975 г.— літкансультант СП БССР. З 1978 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». У 1980—1983 гг.— рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1953 г.

Узнагароджаны медалямі.

У друку выступае з 1949 г. (газета «Гродненская правда»). Выйшлі зборнікі паэзіі «Першы след» (1955), «Вятрам насустрач» (1958), «Вечны агонь» (1960), «Круглы год» (1964), «Акно» (1967), «Вершы» (выбранае, 1968), «Дотык да зямлі» (1975), «Поле» (1978), «Заручыны» (выбранае, 1979), «Смак яблыка» (1981), «Калыска долі» (1984), «Асенняя пошта лістоты» (1987), «Азбука любві» (1989). Для дзяцей выдаў кніжкі «Хлопчык будзіць сонца» (1966), «Песня згоды» (вершы, паэмы, казкі, 1983), «Чарадзейная скарбонка» (вершы, казкі, загадкі, 1987), «Я гатую абед» (паэма, 1989). У 1982 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Сумесна з А. Вольскім напісаў п'есы «За лясамі дрымучымі» (1959, 1961, пастаўлена ў 1958) і «Марынка-крапіўніца» (пастаўлена ў 1963). Аўтар п'ес «Адчыніце, казляняткі!» (1972, пастаўлена ў 1970), «Дай вады, калодзеж!» (1974, пастаўлена ў 1971), «На ўсіх адна бяда» (1977, пастаўлена ў 1976), а таксама лібрэта араторыі «Запрашэнне ў краіну маленства» (музыка Я. Глебава, 1974).

Займаецца перакладамі са славянскіх моў. Пераклаў зборнік сучаснай славацкай паэзіі «Татры пяюць» (1976) і зборнік вершаў М. Валека «Крылы» (1978).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова (1980) за зборнік паэзіі «Поле», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1984) за зборнік «Смак яблыка».

---

## *Алесь МАКАРЭВІЧ*



Алесь (Аляксандр Антонавіч) Макарэвіч нарадзіўся 30.8.1918 г. у вёсцы Шэлегі Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння літаратурна-лінгвістычнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута (1939) кароткі час настаўнічаў у Хойніцкай сярэдняй школе на Гомельшчыне. У лістападзе 1939 г. прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне, пад Ельняй быў цяжка паранены і трапіў у канцлагер. Вызвалены ў сакавіку 1945 г. Да снежня 1945 г. у дзеючай арміі. З 1946 г. зноў настаўнік, загадчык навучальнай часткі Талькаўскай сярэдняй школы Пухавіцкага раёна. З 1947 па 1949 гг.— аспірант кафедры беларускай літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. У 1949—1967 гг. выкладаў беларускую літаратуру ў Магілёўскім педінстытуце (з 1959 г.— дацэнт, быў загадчыкам кафедры, дэканам філалагічнага факультэта). Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1960.

Памёр 30.12.1967 г.

У друку пачаў выступаць у 1951 г. Выйшлі літаратуразнаўчыя кнігі «Сатыра Кандрата Крапівы» (1962), «Кароткі літаратуразнаўчы слоўнік» (1963, 2-е дапрацаванае і дапоўненае выданне ў 1969), «Ад песень і думак народных» (1965), «Фальклорныя матывы ў драматургіі Янкі Купалы (1969).

Адзін з аўтараў вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ «Беларуская дзіцячая літаратура» (1966), «Беларуская вуснапаэтычная творчасць» (1966).

## *Васіль МАКАРЭВІЧ*



Васіль Сцяпанавіч Макарэвіч нарадзіўся 15.7.1939 г. у вёсцы Купленка Крупскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1957 г., пасля заканчэння сярэдняй школы, працаваў на лесараспрацоўках на Поўначы, з 1958 г.— у калгасе «Ухвала» Крупскага раёна. Пасля заканчэння аддзялення журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1964) чатыры гады працаваў у газеце «Чырвоная змена». З 1979 г.— спецкарэспандэнт Беларускага радыё. Член СП СССР з 1976 г.

Першы верш апублікаваў у 1956 г. (газета «Чырвоная змена»).

Аўтар зборнікаў паэзіі «Вогненная камета» (1963), «Мерыдыяны і паралелі» (1966), «Ліставей» (паэма і вершы, 1971), «Вечнае дрэва» (вершы і паэма, 1974), «Радоўка» (вершы і паэма, 1977), «Праталіна» (1983), «Відушчы посах» (вершы, паэма, 1987), «Сумежжа» (вершы, паэмы, 1989) і вершаванай казкі «Лясныя вандраванні» (1967).

Напісаў кнігі нарысаў «Палын і медуніца» (1976), «Зямное сузор'е» (1980) і нарыс «Старт у будучыню» (1982).

## *Адам МАЛЬДЗІС*



Адам Восіпавіч Мальдзіс нарадзіўся 7.8.1932 г. у вёсцы Расолы Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1956). Працаваў сакратаром радашковіцкай раённай газеты «Сцяг Ільіча». У 1962 г. скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1962 г.— навуковы супрацоўнік, з 1981 г.— загадчык аддзела беларускай дакастрычніцкай літаратуры. У 1990 г. як член дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XLV сесіі ААН. Доктар філалагічных навук. Прафесар. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1965 г.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі, чатырма польскімі ганаровымі адзнакамі.

У друку з артыкуламі і рэцэнзіямі пачаў выступаць у 1954 г. У 1966 г. выйшла даследаванне пра беларуска-польскія літаратурныя сувязі «Творчае пабрацімства», зборнік нарысаў «Падарожжа ў XIX стагоддзе» (1969), даследаванні «Традыцыі польскага Асветніцтва ў беларускай літаратуры XIX стагоддзя» (1972), «Таямніцы старажытных сховішчаў» (1974), «На скрыжаванні славянскіх традыцый» (1980), «Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII стагоддзя» (1982), «З літаратуразнаўчых вандраванняў» (1987), «Перазовы сяброўскіх галасоў» (1988), нарыс «Астравеччына, край дарагі...» (1977), аповесць «Восень пасярод вясны» (1984), эсэ «Жы́ццe і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча» (1990). Падрыхтаваў зборнік А. Міцкевіча «Зямля навагрудская, краю мой родны» (1969), «Творы Я. Дылы (1981), «Пан Тадэвуш» А. Міцкевіча (пераклад Б. Тарашкевіча, 1981). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 2, 1969), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» (1977).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні «История белорусской дооктябрьской литературы» і «История белорусской советской литературы».

Перакладае з польскай і балгарскай моў.

---

## *Хаім МАЛЬЦІНСКІ*



Хаім Ізраілевіч Мальцінскі нарадзіўся 7.8.1910 г. у горадзе Панявежысе (Літва) у сям'і рамесніка.

Вучыўся ў Віцебскім яўрэйскім педагагічным тэхнікуме (1927—1929). Скончыў Кіеўскі інстытут народнай адукацыі (1931). Працаваў у яўрэйскіх газетах «Юны ленінец» (1932—1933) і «Акцябэр» (1935—1937) у Мінску. Служыў у Чырвонай Арміі (1933—1934). У 1939 г. накіраваны ў Пінск, дзе працаваў у абласной газеце. З 1940 г. зноў у Мінску, у газеце «Чырвоная змена». З пачатку Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Удзельнічаў у Сталінград-

скай бітве, у вызваленні Беларусі, Польшчы, пад Берлінам быў цяжка паранены. Пасля вайны быў рэдактарам Беларускага дзяржаўнага выдавецтва (1946—1947), выдавецтва Яўрэйскай аўтаномнай вобласці (Бірабіджан, 1947—1951). У 1951 г. рэпрэсіраваны. У 1956 г. рэабілітаваны. Жыў у Намангане (Узбекістан), з 1960 г.— у Мінску. У 1975 г. выехаў у Ізраіль. Член СП СССР (1934—1974).

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 8.2.1986 г. (Тэль-Авіў, Ізраіль).

У рэспубліканскім друку выступаў з 1929 г. Пісаў на мове ідыш. Аўтар зборнікаў паэзіі «Як жыццё, дарагое» (Кіеў, 1931), «Бадзёрым крокам» (1936), «Без ценю» (1936), «Гады, гады мае» (Масква, 1973), кніг драматургіі «На вышыы» (1934), «Наш фарпост» (1935), «Каля саду» (1936), апавяданняў для дзяцей «Дзеці» (1933), кніжак вершаў для дзяцей «Наш хор» (1933), «Юны ленінец» (1934), «Брацікам і сястрычкам» (1939, 1962). На беларускай мове выйшлі кнігі вершаў і паэм «Поплеч з сынам усталі» (1963), «Родны дом» (1965), вершаў «На сонечным баку» (1967), «Мой добры голуб» (1970), паэма «Ёлка пад акном» (1967), «Аднаактовыя п'есы» (1964), кніжкі паэзіі для дзяцей «Навагодняя ёлка» (1939, 1948), «Вясёлыя вароты» (1972), «Кола дружбы» (1973).

---

## *Яўгенія МАЛЬЧЭЎСКАЯ*



Яўгенія Мальчэўская (Яўгенія Еўдакімаўна Крыжаноўская) нарадзілася 25.8.1949 г. у вёсцы Замошша Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1969 г. скончыла Бабруйскі тэхнікум гумавай прамысловасці. Працавала ў рэдакцыях аб'яднанай газеты «Камуніст» і чашніцкай раённай газеты «Чырвоная змена». Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1978), настаўнічала ў Раваніцкай сярэдняй школе Чэрвеньскага раёна, з 1980 г.— у талачынскай сярэдняй школе № 2, з 1989 г.— у віцебскай сярэдняй школе № 40. Член СП СССР з 1990 г.

Выступаць у друку пачала у час вучобы ў тэхнікуме. Першая кніжка паэзіі «Святло асенняе зярнят» уключана ў калектыўны зборнік «Нашчадкі» (1979). У 1989 г. выйшаў зборнік вершаў «Залежнасць».

---

## *Мікола МАЛЯЎКА*



Мікола (Мікалай Аляксандравіч) Маляўка нарадзіўся 13.12.1941 г. у вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Мікалаеўшчынскай сярэдняй школы (1958) два гады працаваў на лесанарыхтоўках у Карэліі. У 1965 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Настаўнічаў у Варанаўскім і Крупскім раёнах, служыў у Савецкай Арміі, працаваў у рэдакцыі нясвіжскай раённай газеты «Чырвоны сцяг», старшым рэдактарам на Беларускім радыё. З 1969 г.— старшы рэдактар рэспубліканскага метадычнага кабінета Міністэрства культуры БССР, з 1976 г.— старшы рэдактар галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання. З 1980 г.— супрацоўнік часопіса «Вясёлка». Член СП СССР з 1970 г.

Друкавацца пачаў у 1957 г. (газета «Чырвоная змена»). Выйшлі зборнікі паэзіі «Едуць маразы» (1966), «Жалеза» (1970), «Лотаць» (1973), «Круг» (1977), «Эстакада» (вершы і паэма, 1982), «Дар» (вершы і паэма, 1985), «Аднавякоўцы» (вершы, балады, байкі, 1988). Для дзяцей выдаў кніжкі вершаў і казак «Дзед і ўнучка» (1983), «Салодкі лядзяш» (1986), «Як дом будавалі» (1987).

*Валерый* МАРАКОЎ



Валерый Дзмітравіч Маракоў нарадзіўся 27.3. 1909 г. у вёсцы Акалонія (цяпер у межах Мінска) у сям'і рабочага.

Працоўны шлях пачаў мулярам. Вучыўся ў Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме, у 1934 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута. Два гады працаваў настаўнікам у Бабруйску. Быў членам «Маладняка». У 1937 г. рэпрэсіраваны. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 25.4.1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1925 г. Выйшлі зборнікі вершаў «Пялёсткі» (1926), «На залатым пакосе» (1927), «Вяршыні жаданняў» (1930), «Права на зброю» (1933), «Лірыка» (1959), «Вяршыні жаданняў» (вершы і паэмы, 1989).

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы М. Галоднага, А. Новікава-Прыбоя, П. Тычыны.

*Уладзімір* МАРУК



Уладзімір Антонавіч Марук нарадзіўся 6.1. 1954 г. у вёсцы Гута Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1970 г. скончыў Маўчадскую сярэднюю санаторную школу-інтэрнат і паступіў у Магілёўскі бібліятэчны тэхнікум. Пасля заканчэння тэхнікума працаваў ва ўстановах культуры Ганцавіцкага раёна — у Шашкоўскай сельскай, раённай дзіцячай бібліятэках, загадчыкам аўтаклуба. У 1980 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў сярэдняй школе № 106 у Мінску. З 1981 г.— карэспандэнт, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда», з 1986 г.— рэдактар, загадчык рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1984 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1972 г. (газета «Магілёўская праўда»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Зоркі ў кронах» (1982), «Ліст рабіне» (1987).

*Уладзімір МАРХЕЛЬ*



Уладзімір Іосіфавіч Мархель нарадзіўся 28.3. 1940 г. у вёсцы Жыгалкі Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачых.

Пасля заканчэння сярэдняй школы імя Якуба Коласа ў в. Мікалаеўшчына (1957) працаваў малатабойцам у калгасе, рабочым ачышчальнага забою (мае кваліфікацыю 6 разраду) на шахце імя М. Горкага ў Навашахцінску Растоўскай вобласці. У 1964 г. скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1964—1969 гг. выкладаў рускую мову і літаратуру ў школах — у вёсцы Стадолічы Лельчыцкага раёна, Валожыне, Мінску, працаваў у газеце «Мінская праўда», старшым рэдактарам у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа АН БССР, малодшым навуковым супрацоўнікам у Аддзеле навуковай інфармацыі па грамадскіх навуках. З 1978 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1988 г.

Друкавацца пачаў у 1954 г. (вершы ў стаўбцоўскай раённай газеце «Голас селяніна»). З 1957 г. выступае ў рэспубліканскім друку як паэт і літаратуразнавец. Выдаў кнігі «Лірнік вясковы: Сыракомля ў беларуска-польскім літаратурным узаемадзеянні» (1983), «Вяшчун славы і волі» (1989), «Крыніцы памяці» (1990). Уклаў «Творы» В. Каратынскага (1981) і «Творы» Я. Лучыны (1988).

З польскай на беларускую мову пераклаў вершы Я. Купалы, асобныя творы В. Дуніна-Марцінкевіча, У. Сыракомлі, В. Каратынскага, Я. Лучыны, Я. Кахаsucceedingоўскага, Л. Стафа, Ю. Тувіма, Р. Дабравольскага, Б. Драздоўскага і інш.

## *Алесь* МАРЦІНОВІЧ



Алесь (Аляксандр Андрэевіч) Марціновіч нарадзіўся 18.8.1946 г. у вёсцы Казловічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

У 1964 г. паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (з трэцяга курса перавёўся на факультэт журналістыкі, скончыў у 1968). Працаваў у драгічынскай, капыльскай і слуцкай раённых газетах, служыў афіцэрам Савецкай Арміі. З 1972 г.— карэспандэнт аддзела літаратуры, з 1981 г.— загадчык аддзела інфармацыі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1987 г.

Выступіў у друку спачатку як журналіст. З 1966 г. пачаў публікаваць рэцэнзіі, літаратурна-крытычныя артыкулы. Выдаў брашуры «Мастацкі летапіс сучаснасці» (1983), «Сказаць сваё слова» (1990). Аўтар зборнікаў літаратурна-крытычных артыкулаў «Далучанасць» (1990), «Пад небам вечнасці» (1990).

Склаў кнігі публіцыстыкі «Свабоднае грамадства зблізку» (1984), паэзіі «Мы і яны» (1985) і «Слова міру і праўды» (1987).

## *Аркадзь* МАРЦІНОВІЧ



Аркадзь Нічыпаравіч Марціновіч нарадзіўся 10.3.1920 г. у вёсцы Барбарова Глускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1939 г. скончыў Мінскае педагагічнае вучылішча. Працаваў у Турэцкай і Цітвянскай сямігадовых школах на Міншчыне. У 1939—1946 гг. служыў у Савецкай Арміі. Удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гг., у Вялікай Айчыннай вайне. Быў тройчы паранены. З 1946 г.— літсупрацоўнік, потым загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Савецкі селянін». У 1950 г. скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ, у 1955 г.— завочна філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у рэдакцыях газет «Калгасная праўда» (1950—1957), «Літаратура і мастацтва» (1957—1964), у выдавецтве

«Беларусь» (1964—1971). У 1971—1972 гг.— адказны сакратар Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры і мастацтва, у 1972—1974 гг.— літаратурны кансультант СП БССР. У 1974—1981 гг.— галоўны рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура. Член СП СССР з 1959 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Заслужаны работнік культуры БССР (1980).

Першыя вершы ў рэспубліканскім друку былі апублікаваны ў 1938 г. Выйшлі кнігі аповесцей і апавяданняў «Надзея» (1960), «Водгулле» (1963), «Прасека» (1967), «Панарама» (1970), «Няхай ідзе дождж» (1973), «Сцюжа» (1976), раманы «Не шукай слядоў сваіх» (1979), «Груша на Голым Полі» (1986), зборнік вершаў «Чырвоныя ветразі» (1965), аповесць для дзяцей «Неадкрыты востраў» (1966). У 1974 г. выйшла «Выбранае», у 1980 г.— Збор твораў у 2 тамах.

Пераклаў на беларускую мову кнігі «Самы чалавечны чалавек» Н. Ходза (1968), «Прыгоды Гугуцэ» С. Вангелі (1971), «Вецер у галаве» Х. Мянд (1971), «Месяц і сонца» С. Баруздзіна (1972), «Белая вясёлка» К. Паўстоўскага (1976).

---

## *Павел* МАРЦІНОВІЧ



Павел Аркадзьевіч Марціновіч нарадзіўся 27.6.1954 г. у горадзе Мінску ў сям'і пісьменніка.

У 1971 г. паступіў на факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля трэцяга курса перавёўся на завочнае аддзяленне (скончыў у 1976) і адначасова пачаў працаваць памочнікам галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Рэспубліканскага тэатра юнага гледача. У 1978—1979 гг.— літсупрацоўнік рэдакцыі часопіса «Вясёлка». Член СП СССР з 1976 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1969 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Прадвесне» (1975), «Час бурштыну» (1977). Выдаў кніжкі вершаў для дзяцей «Паспяшайся ў наш звярынец!» (1978), «Жыў-быў воўк» (1979), «Дзядзька Сон» (1980), «Сталёвы бусел» (1989).

Перакладае з англійскай, літоўскай, польскай, чэшскай моў на беларускую. У яго перакладзе асобнымі выданнямі выйшлі аповесць В. Стыблавай «Мой брацік» (1977), зборнік чэшскіх народных казак «Кубачак, вары!» (1977), аповесці В. Бубніса «Белы вецер. Рамунас» (1978), зборнік вершаў «Рамоначак-рамунеле» (1979), раман Я. Козака «Гняздо бусла» (1979), аповесць А. Крысці «Нябожчыкава люстэрка» (зборнік «Замежны дэтэктыў», 1988).

---

*Святлана МАРЧАНКА*



Святлана Міхайлаўна Марчанка нарадзілася 15.5.1942 г. у вёсцы Папоўцы Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і служачага.

Працавала на будоўлі, у рэдакцыі касцюковіцкай раённай газеты «Сцяг камунізма» (1958—1959). Адначасова вучылася ў сярэдняй школе рабочай моладзі. Пасля атрымання сярэдняй адукацыі была старшай піянерважатай у школе № 1 у Касцюковічах. Скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут (1964). У 1964—1966 гг.— загадчык школьнага аддзела Касцюковіцкага райкома камсамола. Працавала ў рэдакцыях газет «Літаратура і мастацтва» (1966—1967), «Чырвоная змена» (1967—1968). У 1969—1972 гг.— кіраўнік гуртка «Юныя сябры паэзіі» Дома піянераў у Слуцку, педагог у дзіцячых садах № 10, 14 (1973—1978). Працавала ў часопісах «Вожык» (1978), «Работніца і сялянка» (1980—1983). З 1984 г.— рэдактар аддзела крытыкі і літаратуразнаўства часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1985 г.

Дэбютавала вершамі ў «Магілёўскай праўдзе» (1960). З літаратурна-крытычнымі матэрыяламі выступае ў друку з 1965 г. Аўтар кнігі «Васіль Вітка: Нарыс жыцця і творчасці» (1985).

замалеукамі ў 1966 г. (Столінская раённая газета «Навіны Палесся»). Першая аднаактовая п'еса «Выкраданне Алёны» (1971) адзначана прэміяй на рэспубліканскім конкурсе драматургіі. Аўтар пятнаццаці аднаактовых п'ес, сярод якіх «Новыя прыгоды Несцеркі» (пастаўлена ў 1980), «Магіла Чынгісхана» (надрукавана і пастаўлена ў 1981), «Дыскатэка» (пастаўлена ў 1981), п'ес-казак «Чаканне сабакі Тэафіла» (пастаўлена ў 1979), «Загадка каралевы Аварыі» (1980), «Ці кормяць ваўка ногі» (1982), «Тушканчык і чароўны чамаданчык» (1986). Напісаў камедыі «Люцікі-кветачкі» (пастаўлена ў 1974), «Цвярозы дзень Сцяпана Крываручкі» (пастаўлена ў 1985), «Вясёлыя, бедныя, багатыя» (пастаўлена ў 1986), «Альдона, Анета, Анфіса» (пастаўлена ў 1986), «Дарога ў рай», «Калі заспявае певень» (абедзве пастаўлены ў 1990). Па сцэнарыях пісьменніка пастаўлены тэлефільмы «Вясковы эрудзіт» (1985), «Запрашэнне» (1988). Адзін з аўтараў сцэнарыя дакументальнага кінафільма «Вяртанне Забэйды-Суміцкага» (зняты ў 1990).

Працуе і ў галіне прозы. Выйшлі кнігі казак «Жылі-былі дзед Васільчык і баба Кацярына» (1986), раманы «Крык на хутары» (1983), «Пры-

знанне ў забойстве» (1985), «Кветкі правінцыі» (1986), «Вочы і сон» (1990), «Сава Дым і яго палюбоўніцы» (1990).

(1971), зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Журавіны пад снегам» (1976), «Сонца майго дня» (1988), рамана «Баргузінскае лета» (1982).

Пераклаў на беларускую мову аповесць бурацкага пісьменніка Б. Мунгонава «Чорны вецер» (1973).

## *Мікалай* МАТУКОЎСКІ



Мікалай Ягоравіч Матукоўскі нарадзіўся 12.9. 1929 г. у вёсцы Калюціна Расонскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Тродавіцкай сярэдняй школы (1950) працаваў загадчыкам аддзела кадраў і аргработы Расонскага райкома камсамола, літсупрацоўнікам раённай газеты «Сацыялістычная праца». Скончыў завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1956). У 1952—1960 гг.— літработнік, потым загадчык аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда», у 1960—1964 гг.— галоўны рэдактар літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё, у 1964—1966 гг.— галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР. З 1966 г.— уласны карэспандэнт, з 1970 г.— загадчык Беларускага аддзялення рэдакцыі газеты «Известия». Член СП СССР з 1971 г.

Узнагароджаны медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1977).

Літаратурную працу пачаў у 1952 г. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар п'ес «Мужчына, будзь мужчынам!» (пастаўлена ў 1966), «Тры дні і тры ночы» (пастаўлена ў 1967), «Амністыя» (1971, пастаўлена ў 1970, асобнае выданне ў 1972, аднайменны кінафільм у 1982), «Апошняя інстанцыя» (1976, пастаўлена ў 1974), «Наследны прынц» (1976, пад назвай «Наследнік» пастаўлена ў 1976), «Мошенник поневоле» (паводле рамана М. Ларні «Чацвёрты пазванок», пастаўлена ў 1978), «Паядынак» (1985, пастаўлена ў 1985), «Мудрамер» (апублікавана і пастаўлена ў 1987). Аўтар зборнікаў «П'есы» (1979) і «Мудрамер» (1989). Напісаў сцэнарый мастацкага кінафільма «Сын старшыні» (пастаўлены ў 1976), тэлефільмаў «Траянскі конь» (пастаўлены ў 1980), «Мудрамер» (пастаўлены ў 1989), а таксама некалькіх сцэнарыяў дакументальных тэле- і кінафільмаў.

Выдаў дакументальную аповесць пра Мінскае падполле 1941—1944 гг. «Мінск» (1982), кнігу публіцыстыкі, эсэ «Чужая беда» (1987).

Лаўрэат прэміі Саюза журналістаў СССР (1984) і Дзяржаўнай прэміі БССР (1988) за п'есу «Мудрамер».

---

## *Васіль МАТЭВУШАЎ*



Васіль Іванавіч Матэвушаў нарадзіўся 6.3. 1915 г. у вёсцы Княжыцы Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў літаратурны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1937). Настаўнічаў у Обальскай сярэдняй школе на Віцебшчыне (1937—1939). Служыў у Савецкай Арміі (1939—1946). У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у чыгуначным палку, працаваў на ваенных курсах. У 1946—1948 гг.— выкладчык Омскага фінансавага тэхнікума, у 1948—1971 гг.— супрацоўнік абласной газеты «Магілёўская праўда». Апошнія гады жыцця працаваў сакратаром Магілёўскага абласнога аддзялення СП БССР. Член СП СССР з 1948 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 6.3.1974 г.

У друку пачаў выступаць у 1932 г. Аўтар кніжак вершаў «Магілёўскі шоўк» (1957), «Зорны шлях» (1959), «Сярэбраная кладка» (1965), «Начны дождж» (1969), «Верасы» (1972), «Крынічны луг» (1976). Асобнымі выданнямі выйшлі нарысы «Магілёўскія льнаводы» (1949), «Сяргей Ільіч Слабадзян» (1949), «Даярка Яўгенія Дарашкова» (1950).

---

## *Аркадзь МАЎЗОН*



Аркадзь Маўзон (Арон Іосіфавіч Маўшэнзон) нарадзіўся 23.9.1918 г. у горадзе Віцебску ў сям'і рабочага.

Скончыў фабрычна-заводскае вучылішча (1935). Працаваў токарам на заводзе «Камунар» (цяпер імя С. Кірава) у Мінску. Пасля заканчэння драматычнай студыі пры БДТ-1 (1936) быў акцёрам, асістэнтам рэжысёра БДТ-2 (Віцебск). З 1946 г. загадваў аддзелам культуры газеты «Віцебскі рабочы», з 1951 г. быў начальні-

кам сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм». У 1965—1971 гг. працаваў у Міністэрстве культуры БССР. Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 19.8.1977 г.

У друку пачаў выступаць у 1945 г. Пісаў на беларускай і рускай мовах. Першая п'еса — «Канстанцін Заслонаў» (1949, пастаўлена ў 1947, у 1948 спектакль атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР). Аўтар п'ес «Наталля Крыўцова» (апублікавана і пастаўлена ў 1954), «У ціхім завулку» (апублікавана і пастаўлена ў 1955), «Калі разыходзяцца шляхі» (пастаўлена ў 1955), «Непрымірымасць» (пастаўлена ў 1956), «У бітве вялікай» (1958, пастаўлена ў 1957), «Калі ты чалавек» («Твой светлы шлях», апублікавана і пастаўлена ў 1960), «Пад адным небам» («Асцярожна, Мякішавы», апублікавана і пастаўлена ў 1962), «Куда идешь, Сергей?» (апублікавана і пастаўлена ў 1965), «У доме на Сонечнай» (пастаўлена ў 1966), «Жизнь всего одна» (апублікавана і пастаўлена ў 1968), «Дарога праз ноч» («Людзі, агонь, смерць», апублікавана і пастаўлена ў 1970), «Да апошняга дыхання» (апублікавана ў 1978), шэрагу аднаактовак. Выдадзены зборнікі драматургічных твораў «Выбраныя п'есы» (1964), «Людзі і час» (1972), «П'есы» (1974), «П'есы» (1978), «Да апошняга дыхання» (1985).

Па яго сцэнарыях пастаўлены кінафільмы «Канстанцін Заслонаў» (1949, у 1950 фільм атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР), «Зялёныя агні» (1956), «Наперадзе — круты паварот» (1960).

Выступаў у перыядычным друку з артыкуламі аб драматургіі і сучасным тэатры.



*Янка МАЎР*

Янка Маўр (Іван Міхайлавіч Фёдараў) нарадзіўся 10.5.1883 г. у горадзе Лібава (цяпер горад Ліепая, Латвія) у сям'і сталяра.

Дзяцінства правёў на радзіме маці — у вёсцы Лебянішкі Ковенскай губерні (цяпер Літва). Скончыў пачатковае, затым рамеснае вучылішча ў Коўне (цяпер Каўнас, Літва). У 1899 г. паступіў у Панявежскую настаўніцкую семінарыю. Быў выключаны за ўдзел у гуртку рэвалюцыйнай моладзі. У 1903 г. здаў экстэрнам экзамен і атрымаў званне настаўніка пачатковай школы. Працаваў памочнікам настаўніка ў Новым Месцы (Літва), у вёсцы Бытча на Барысаўшчыне. У 1906 г. удзельнічаў у нелегальным з'ездзе рэвалюцыйна настроеных настаўнікаў у в. Мікалаеўшчына. Разам з Якубам Коласам і іншымі актыўнымі ўдзельнікамі быў аддадзены пад суд, пазбаўлены права выкладаць у школе і ўзяты пад нагляд паліцыі. Толькі ў 1911 г. удалося ўладкавацца выкладчыкам геаграфіі і гісторыі ў Мінскую прыватную гандлёвую школу. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі працаваў у школе, у Рэспубліканскім саюзе работнікаў асветы, у Наркамаце асветы БССР, у Беларускім дзяржаўным выдавецтве. З 1930 г. быў на творчай працы. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры БССР (1968).

Памёр 3.8.1971 г.

У 1923 г. у газеце «Савецкая Беларусь» і ленінградскім часопісе «Бегемот» друкаваў фельетоны. З першым апавяданнем выступіў у друку ў 1926 г. (часопіс «Беларускі піянер»). Аўтар кніг аповесцей, апавяданняў «Чалавек ідзе» (1927), «У краіне райскай птушкі» (1928, 1983), «Сын вады» (1928), «Палескія рабінзоны» (1930, аповесць экранізавана ў 1935), «Слёзы Тубі» (1930), «Аповесць будучых дзён» (1932), «ТВТ» (1934), «Вакол свету» (1947), «Шлях з цемры» (1948), «Апавяданні» (1951), «Аповесці і апавяданні» (выбранае, 1954), «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага» (часопіс «Маладосць», 1954—1955), «Аповесці і апавяданні»

(1969), апавядання «Цётка Эмілія» (1954), байкі «Пекла» (1929), рамана «Амок» (1930). У 1952 г. выйшлі Выбраныя творы, у 1960 г.— Збор твораў у 2-х, у 1975 — 1976 гг.— у 4 тамах.

Аўтар п'есы «Памылка» (апублікавана і пастаўлена ў 1940), аднаактовак «Хата з краю» (1941), «Балбатун» (1946).

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы Г.-К Андэрсена, Д. Маміна-Сібірака, М. Прышвіна, А. Чэхава, Р. Кіплінга, М. Твэна, Ж. Верна, В. Гюго, А. Гайдара, В. Шклоўскага, А. Конанава.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (пасмяротна, 1972) за аповесці «Чалавек ідзе», «У краіне райскай птушкі», «Сын вады», «Палескія рабінзоны», «ТВТ», «Шлях з цемры», раман «Амок».

---

## *Алесь МАХНАЧ*



Алесь (Аляксандр Іванавіч) Махнач нарадзіўся 27.8.1922 г. у вёсцы Забалацце Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1941 г., пасля заканчэння Калінкавіцкага ваеннага вучылішча, накіраваны на пасаду камандзіра ўзвода ў гарнізон Брэсцкай крэпасці. Абараняючы крэпасць, быў цяжка паранены і ўзяты ў палон. Вызвалены з канцэнтрацыйнага лагера ў 1945 г. Знаходзіўся на лячэнні ў ваенных шпіталях (1945—1947), загадваў прысынкаўскай сельскай бібліятэкай на Уздзеншчыне (1947—1953), працаваў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» (1953—1961, 1963—1966). Скончыў завочна Мінскі бібліятэчны тэхнікум (1954) і Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве (1960). Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1980).

Дэбютаваў вершамі ў 1949 г. (уздзенская раённая газета «За савецкую Радзіму»). Аўтар шэрагу аднаактовых п'ес. У 1956 г. выдаў першы зборнік «Драматычныя мініяцюры». Потым выйшлі зборнікі п'ес, сцэнак і асобныя п'есы «Перад бурай» (1958, пастаўлены аднайменны тэлеспек-

такль, 1958), «Смык і Шпунцік» (Беласток, 1958), «Аднаактовыя п'есы» (1961), «Да пары збан ваду носіць» (1963), «Шпачок» (1963, пастаўлена ў 1964), «Усе ідуць у нагу» (1964), «Мы будзем жыць» (1967), «Няхай прыходзяць» (1970), «Маленькія салдаты» (1971), «Гаўрошы Брэсцкай крэпасці» (1974, пастаўлена ў 1969), «П'есы» (1974), «Не кажы: мая хата з краю» (1980), «Няхай красуе жыццё» (1982). У 1973 г. выдаў нарыс «Дзеці крэпасці» (у 1988 выйшаў як дакументальная аповесць). Складальнік зборніка нарысаў «Людзі граніцы» (1989).

---

## *Ніна МАЦЯШ*



Ніна Іосіфаўна Мацяш нарадзілася 20.9.1943 г. у вёсцы Нівы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1960 г. скончыла Бярозаўскую сярэднюю школу і паступіла на факультэт французскай мовы Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў. З-за хваробы вымушана была ўзяць акадэмічны адпачынак (скончыла інстытут у 1966). У 1973—1977 гг. працавала выкладчыцай нямецкай мовы ў Белаазёрскім прафесійна-тэхнічным вучылішчы. Член СП СССР з 1971 г.

Узнагароджана медалямі.

Першы верш апублікавала ў 1962 г. (бярозаўская раённая газета «Маяк камунізма» і «Во славу Родины»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Агонь» (1970), «Удзячнасць» (вершы і паэма, 1973), «Ралля суровая» (вершы і пераклады, 1976), «Прыручэнне вясны» (1979), «Поўны келіх» (1982), «Жнівень» (1985), «Паварот на лета» (выбранае, 1986), «Шчаслівай долю назаві» (1990) і казак «Два браты і сякера» (1975), «Казка пра суседзяў, змяю і мядзведзя» (1982).

Напісала п'есы для тэатра лялек «Прыгоды трох парасят» (пастаўлена ў 1976), «Крок у бессмяротнасць» (пастаўлена ў 1977), тэлесцэнарыі пра творчасць В. Бялыніцкага-Бірулі «Пясняр роднай прыроды» (пастаўлены ў 1978) і Р. Кента «Гэта я, госпадзі» (пастаўлены ў 1980).

Перакладае з нямецкай, польскай, французскай моў. У яе перакладзе выйшлі кніжкі

Ж. Аліўе «У краіне індзейцаў» (1973), А. Гаўрылюка «Песня з Бярозы» (1979), Ж. Сімянона «Першая справа Мегрэ» (1982), А. дэ Сэнт-Экзюперы «Планета людзей» (1984) і «Маленькі прынц» (1989), навелы Г. дэ Мапасана (1987), паэма «Маруся Чурай» Л. Кастэнка (1989).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя А. Куляшова (1984) за «Паэму жніва», прэміі Усебеларускага фестывалю моладзі, прысвечанага 50-годдзю ЛКСМБ (1970) за вершы аб моладзі.

---

## *Міхась МАШАРА*



Міхась (Міхаіл Антонавіч) Машара нарадзіўся 18.11.1902 г. на хутары Падсосна Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў вышэйшае пачатковае вучылішча ў горадзе Глыбокае. У 1920 г. уступіў добраахвотна ў Чырвоную Армію. Жывучы ў Заходняй Беларусі пры буржуазнай Польшчы, працаваў на гаспадарцы, два гады адслужыў у войску, удзельнічаў у нацыянальна-вызваленчым руху. У пачатку 1927 г. рэдагаваў у Вільні газету «Наша воля», быў зняволены ў віленскую турму на Лукішках, дзе прасядзеў звыш чатырох гадоў. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі (1939) абраны дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі. Быў загадчыкам Шаркаўшчынскага рана. У час Вялікай Айчыннай вайны працаваў у газетах «Звязда», «Савецкая Беларусь», «Партызанскае слова», на радыё. Пасля вайны — у часопісе «Полымя» (1945—1947), «Настаўніцкай газеце» (1947—1949). Член СП СССР з 1940 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалём.

Памёр 7.6.1976 г.

Друкавацца пачаў у 1927 г. (часопіс «Заранка»). Выдаў у Вільні зборнікі вершаў «Малюнкі» (1928), «На сонечны бераг!» (1934), «Напрадвесні» (1935), «З-пад стрэх саламяных» (1937), паэмы «Вяселле» (1933), «Смерць Кастуся Каліноўскага» (1934), «Мамчына горка» (1936), п'есы «Вось тут і зразумей» (1933), «Лёгкі хлеб» (1936), «Чорт з падпечча» (1938). У савецкі час

выйшлі кнігі паэзіі «Беларусі» (1944), «Выбраная лірыка» (1945), «Праз навальніцы» (вершы і паэмы, 1948), «Урачыстасць» (вершы і паэмы, 1952). Выбраныя творы (1958), «Ад родных аселіц» (выбранае, 1959), «Мая азёрная краіна» (выбранае, 1962), «Вершы» (1971), казкі ў вершах «Зязюльчыны слёзы» (1961), «Зелянушка і ракатушка» (1964).

Вядомы і як празаік. Аўтар раманаў «Крэсы змагаюцца» (1966), «Сонца за кратамі» (1968) і «Лукішкі» (1970), якія склалі трылогію, «Ішоў дваццаты год» (1973), «І прыйдзе час...» (1975), кнігі ўспамінаў «Старонкі летапісу» (1975).

Пераклаў на беларускую мову «Мёртвыя душы» М. Гогаля (1950), «Апавяданні» Г. Сянкевіча (1955), «Уральскія сказы» П. Бажова (1956), «Калевалу» (1956) і інш.

---

## *Уладзімір МАШКОЎ*



Уладзімір Георгіевіч Машкоў нарадзіўся 5.7. 1938 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і ваеннаслужачага.

У 1960 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Быў літсупрацоўнікам газеты «Зорька» (1960—1964), рэдактарам на Беларускім радыё (1964—1971), рэдактарам выдавецтва «Беларусь» (1971—1972), старшым рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1972—1980), загадчыкам рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва» (1981—1986). З 1987 г.— рэдактар аддзела прозы часопіса «Неман». Член СП СССР з 1970 г.

Першы празаічны твор надрукаваў у 1957 г. Піша на рускай мове. Выдаў кнігі прозы для дзяцей «Между «А» и «Б» (1966), «Веселая дюжина» (1968), «Я сам» (1972), «Здравствуй, Валерка» (1974), «Соскучился по дождику» (1976), «Как я был вундеркиндом» (1979, экранізавана ў 1983), «Последний день матриархата» (1985), «Детское время» (1987).

Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Хлопчык і чапля» (з М. Беравым, пастаўлены ў 1979), «Чалавек з майго жыцця» (пастаўлены ў 1971), «Добрая справа» (пастаўлены ў 1973),

«Юныя айбаліты» (пастаўлены ў 1980), «Станаўленне» (пастаўлены ў 1982). Пераклаў на рускую мову творы К. Чорнага, З. Бядулі, С. Александровіча, А. Васілевіч, У. Караткевіча, У. Краўчанкі, У. Мехава, У. Юрэвіча.

---

## *Іван* МЕЛЕЖ



Іван Паўлавіч Мележ нарадзіўся 8.2.1921 г. у вёсцы Глінішча Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1938) працаваў у Хойніцкім райкоме камсамола. У 1939 г. паступіў у Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і літаратуры і з першага курса быў прызваны ў Савецкую Армію. Летам 1940 г. удзельнічаў у вызваленні Паўночнай Букавіны. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце — на Збручы, пад Уманню, Нікалаевым, Сінелькавам, Растовам-на-Доне, Лазавой. У чэрвені 1942 г. пад Растовам цяжка паранены і пасля лячэння ў тбіліскім шпіталі адпраўлены ў тыл. Жыў у Бугуруслане, потым выкладаў ваенную падрыхтоўку ў Малдаўскім педагагічным інстытуце, а з 1943 г.— у Беларускім дзяржаўным універсітэце, які знаходзіўся тады на станцыі Сходня ў Падмаскоўі, дзе вучыўся спачатку завочна на філалагічным факультэце, а затым перайшоў на стацыянар (скончыў у 1945 г. ужо ў Мінску). Пасля вучыўся ў аспірантуры, выкладаў беларускую літаратуру ва універсітэце, працаваў у рэдакцыі часопіса «Полымя», у апараце ЦК КПБ. З 1966 г.— сакратар, а ў 1971—1974 гг.— намеснік старшыні праўлення СП БССР. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1967—1976), быў старшынёй Беларускага камітэта абароны міру, членам Сусветнага Савета Міру. Член СП СССР з 1945 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1972).

Памёр 9.8.1976 г.

Дэбютаваў у 1939 г. вершамі. Першае выступленне ў друку як празаіка адносіцца да 1943 г. (газета «Бугурусланская правда»). Выдаў збор-

нікі аповесцей і апавяданняў «У завіруху» (1946), «Гарачы жнівень» (1948), «Заўсёды наперадзе» (нарыс, 1948), «Блізкае і далёкае» (1954), «У гарах дажджы» (1957), «Што ён за чалавек» (апавяданні, аповесці, нарысы, 1961), «Жыццёвыя клопаты» (нарысы, эсэ, крытычныя артыкулы, 1975), «Белыя вішні і яблыні» (1976), «Першая кніга: Дзённікі, сшыткі, з запісных кніжак» (1977). Аўтар рамана «Мінскі напрамак» (1952, дапрацаванае выданне ў 1974), цыкла раманаў «Палеская хроніка» — «Людзі на балоце» (1962), «Подых навальніцы» (1966) і «Завеі, снежань» (1978). У 1969—1971 гг. выйшаў Збор твораў у 6-ці, у 1979—1985 гг.— у 10 тамах.

Напісаў п'есы «Пакуль вы маладыя» (1956, асобнае выданне ў 1958, пастаўлена ў 1957), «Дні нашага нараджэння» (апублікавана і пастаўлена ў 1958), аднаактоўку «Хто прыйшоў уночы» (1959, асобнае выданне ў 1966). Па раманах «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» Беларускім тэлебачаннем створаны ў 1966 г. спектакль. Беларускім тэатрам імя Янкі Купалы пастаўлены ў 1966 г. спекталь «Людзі на балоце», Гомельскім абласным тэатрам — «Подых навальніцы» (1977), у 1989 г.— «Страсці эпохі» (паводле рамана «Завеі, снежань»).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1962) за раман «Людзі на балоце», Ленінскай прэміі (1972) за раманы «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы», Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за кнігу крытычных нарысаў, артыкулаў «Жыццёвыя клопаты» (пасмяротна).

---

## *Аляксандр* МЕЛЬНІКАЎ



Аляксандр Пятровіч Мельнікаў нарадзіўся 7.1.1936 г. у вёсцы Васількі Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Ленінградскі санітарна-гігіенічны медыцынскі інстытут (1961), працуе ўрачом радыялагічнай групы Магілёўскай абласной санітарна-эпідэміялагічнай станцыі. Член СП СССР з 1981 г.

У друку з вершамі выступае з 1966 г. Піша на рускай мове. Аўтар зборнікаў вершаў «Спасибо, жизнь» (1977), «Три слова» (1980).

## *Уладзімір МЕХАЎ*



Уладзімір Львовіч Мехаў (Няхамкін) нарадзіўся 25.3.1928 г. у горадзе Рагачове Гомельскай вобласці ў сям'і рабочага.

У 1945—1950 гг. вучыўся на аддзяленні журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Адначасова працаваў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», ва універсітэцкай шматтыражцы. Пасля заканчэння універсітэта працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела. У 1960—1961 гг. быў рэдактарам на Беларускім радыё. Потым зноў у рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва» — загадчык аддзела, адказны сакратар. У 1975—1988 гг.— старшы рэдактар, каментатар на Беларускім радыё. Член СП СССР з 1960 г.

У друку з мастацкімі творамі выступае з 1951 г. Аўтар зборнікаў аповесцей, апавяданняў і нарысаў «Сцяг над рэўкомам» (1958), «Апошняя яўка» (1959), «Помнік герою» (1961), «Станцыя паблізу Тамбова» (1964), «Добры вечар, камбат» (1970), «Слухаецца справа аб замаху» (1972), «Старадаўняя гравюра» (1974), зборніка дыялогаў «Сустрэчы ў радыёстудыі» (1985). Асобныя эсэ і апавяданні ўвайшлі толькі ў зборнікі, якія выпушчаны на рускай мове, «Зарево» (1977), «Старинная гравюра» (1982), «...О которых я очень забочусь» (1988).

Аўтар п'ес для юнацтва «Чырвоны губернатар» (пастаўлена ў 1967) і «Палёт» (1970, пастаўлена ў 1969), сцэнарыяў больш як дваццаці дакументальных фільмаў.

Пераклаў на беларускую мову кнігу татарскага пісьменніка Ш. Ракіпава «Адкуль ты, Жан?».

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1986) як адзін са стваральнікаў цыкла гісторыка-рэвалюцыйных дакументальных фільмаў — «Рэвалюцыя дае нам права», «Мост», «Чарвякову... спешна... Ленін», «Гісторыя адной тэлеграмы».

## *Яўген* МІКЛАШЭЎСКІ



Яўген Васільевіч Міклашэўскі нарадзіўся 9.8. 1936 г. у вёсцы Лыскі Беластоцкага павета Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сялянскай сям'і.

У 1946 г. пераехаў з бацькамі ў вёску Кміты, што на Нясвіжшчыне. У 1953 г. паступіў у Нясвіжскае педагагічнае вучылішча імя Якуба Коласа, дзе правучыўся тры гады. Апошні курс заканчваў у Пінскім педвучылішчы (1957). Працаваў загадчыкам Вяліка-Вулькаўскай і Чарнеевіцкай пачатковых школ на Піншчыне. Вучыўся ў Мінскім педагагічным інстытуце замежных моў (1962—1965). Працаваў загадчыкам аддзела часопіса «Родная прырода» (1972—1978), старшым рэдактарам аддзела прозы часопіса «Маладосць» (1978—1981), літкансультантам СП БССР (1981—1988). Член СП СССР з 1980 г.

Упершыню выступіў у друку ў 1959 г. (часопіс «Полымя»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Свежасць» (1968), «Ганна з Пухавіч» (гумар, 1976), «Світальны водбліск» (1981, усе тры выйшлі пад псеўданімам Яўген Верабей), «У спрадвечным руху» (1985), «Зара-заранка, зара-вячэрніца» (1989). У часопісе «Маладосць» апублікаваў аповесці «Чатыры дарогі» (1979) і «Мёртвая крыніца» (1989).

Перакладае паэзію і прозу з англійскай і славянскіх моў.

## *Барыс* МІКУЛІЧ



Барыс Міхайлавіч Мікуліч нарадзіўся 19.8.1912 г. у горадзе Бабруйску ў сям'і фельчара.

У 1929 г. скончыў сярэднюю школу і стаў працаваць у рэдакцыі бабруйскай акруговай газеты «Камуніст». Быў членам «Маладняка». У 1930 г. пераехаў у Мінск. Працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва», у Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Вучыўся на літаратурных курсах у Маскве (1934—1935). У 1936 г. рэпрэсіраваны. Асуджаны да 10 год пазбаўлення волі. У 1943 г. пераведзены ў катэгорыю ссыль-

нага. У чэрвені 1947 г. вярнуўся на Беларусь, у лістападзе была знята судзімасць. У красавіку 1949 г. арыштаваны паўторна, высланы ў Сібір. Апошнія гады жыцця прайшлі ў сяле Машукоўка Тасееўскага раёна Краснаярскага краю. Рэабілітаваны ў 1945 г. Член СП СССР з 1934 г.

Памёр 17.6.1954 г.

Першыя празаічныя творы надрукаваў у 1927 г. у газеце «Камуніст» (Бабруйск). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Удар» (1931), «Чорная вірня» (1931), «Яхант» (1935), аповесцей «Наша сонца» (1932), «Дужасць» (1934), «Дружба» (1936), «Адвечнае» (часопіс «Полымя», 1972), эцюда «Ускраіна» (1932). У «Выбранае» (1959) увайшлі і творы, якія не ўключаліся ў папярэднія кнігі,— аповесці «Цяжкая гадзіна», «Развітанне», «Жыццяпіс Вінцэся Шастака», навела «Гадзюка ў кароне» і апавяданне «Зорка». У 1985 г. выйшлі «Аповесці». У 1987—1988 гг. часопіс «Неман» апублікаваў яго «Повесть для себя». Пераклаў на беларускую мову раман А. Вясёлага «Краіна родная» (з Р. Бахтам, 1932), аповесць У. Лідзіна «Магіла невядомага салдата» (1934).

---

## *Алесь* МІЛЮЦЬ



Алесь (Аляксандр Макаравіч) Мілюць нарадзіўся 6.10.1908 г. у вёсцы Скорычы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў два класы пачатковай школы, займаўся самаадукацыяй. Пасля вызвалення родных мясцін (1944) пайшоў у Савецкую Армію. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны.

Загінуў 26.10.1944 г. на фронце ва Усходняй Прусіі.

Друкаваўся з 1928 г. у прагрэсіўных заходнебеларускіх газетах і часопісах, з 1939 г.— у стаўбцоўскай раённай газеце. Асобныя вершы змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Сцягі і паходні» (1965), «Крывёю сэрца» (1967), «Ростані волі» (1990).

## *Алег* МІНКІН



Алег Гаўрылавіч Мінкін нарадзіўся 31.3.1952 г. у вёсцы Чарняўка Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Бабруйскай школы-інтэрната № 1 (1969) паступіў у Маскоўскі энергетычны інстытут, праз два гады перавёўся ў Маскоўскі інстытут інжынераў сельскагаспадарчай вытворчасці (скончыў у 1975 г.). Працаваў майстрам на будаўніцтве электрападстанцыі ў Бурацii (г. Улан-Удэ), інжынерам-электрыкам на нафтаперапампоўваючых станцыях нафтаправода «Дружба» (г. Наваполацк), інжынерам-наладчыкам у сістэме «Галоўтранснафта» (г. Гомель), інжынерам тэхнагляду на нафтаправодах поўначы Цюменскай вобласці (г. Наябрск). З 1981 г. жыве ў Брэсце. Член СП СССР з 1988 г.

Пачаў выступаць у рэспубліканскім друку з вершамі ў 1980 г. (газеты «Гомельская праўда», «Літаратура і мастацтва»). Аўтар зборніка паэзіі «Сурма» (1985) і п'есы-казкі для дзяцей «Як Лыска ваўком быў» (калектыўны зборнік «Крынічка», 1985), а таксама шэрага фантастычных апавяданняў, апублікаваных у перыядычным друку.

Перакладае з польскай, украінскай, англійскай моў. Пераклаў вершы Ц. Норвіда, Б. Лесьмяна, Л. Стафа, П. Грабоўскага.

## *Еўсцігней* МІРОВІЧ



Еўсцігней Афінагеназіч Міровіч (Дунаеў) нарадзіўся 10.8.1878 г. у горадзе Пецярбургу (Расія) у сям'і чыгуначніка, выхадца з Беларусі.

Скончыў Самсонаўскае рэальнае вучылішча, нармальную школу малявання пры Акадэміі мастацтваў і курсы Пецярбургскага гуртка аматараў драматычнага мастацтва імя Волкава. З 1900 г. працаваў у пецярбургскіх тэатрах акцёрам, затым рэжысёрам. З 1906 г.— праваздзейны член Санкт-Пецярбургскага саюза драматычных і музычных пісьменнікаў. З 1919 г. працаваў у тэатрах Беларусі. У 1921— 1931 гг.— мастацкі кіраўнік, у 1941—1945 гг. рэжысёр

Беларускага тэатра імя Янкі Купалы (БДТ-1). Быў мастацкім кіраўніком Гомельскага тэатра рабочай моладзі (1932—1935), які ў 1935 г. быў ім рэарганізаваны ў Першы калгасна-саўгасны тэатр, у 1937—1940 гг.— мастацкі кіраўнік Беларускага тэатра юнага гледача імя Н. Крупскай. З 1945 г.— мастацкі кіраўнік і загадчык кафедры майстэрства акцёра Беларускага тэатральнага інстытута. Займаўся таксама выкладчыцкай дзейнасцю ў тэатральных студыях, у Мінскім тэатральным вучылішчы. Прафесар. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі.

Народны артыст БССР (1940).

Памёр 16.2.1952 г.

Першая п'еса «Опекуны» была напісана ў 1904 г., аднак царская цэнзура не дала дазволу на пастаноўку. Такі самы лёс напаткаў і п'есы «Ужас времени» («Современный вампир»), «Ночь миллионера». На рускай мове ў Пецярбургу апублікаваў п'есы «Мефистофель в интересном положении, или Женатый Мефистофель» (1909), «Графиня Эльвира» (апублікавана і пастаўлена ў 1910), «Рыцарь дон Фернандо» (1912, пастаўлена ў 1911), «Фабрика талантов» («Остановитесь!», 1912), «Театр купца Епишкина» (1915, пастаўлена ў 1914, у 1978 пастаўлена на Беларускім тэлебачанні), «Вова приспособился» (апублікавана і пастаўлена ў 1915), аднаактоўкі «Какой нахал!» (1914), «Не ревнуй!» (1915). Напісаў на беларускай мове і паставіў п'есы «Машэка» («У часы даўнейшыя», пастаўлена ў 1923), «Кастусь Каліноўскі» (1957, пастаўлена ў 1923, экранізавана ў 1928), «Каваль-ваявода» (1957, пастаўлена ў 1925), «Кар'ера таварыша Брызгаліна» (1957, пастаўлена ў 1925), «Перамога» («Хроніка нашых дзён», 1957, пастаўлена ў 1926), «Запяюць верацёны» (пастаўлена ў 1928), «Лён» (пастаўлена ў 1932). У 1934 г. апублікаваў п'есу «У вясновую ноч» (1934, ставілася гурткамі самадзейнасці). У 1957 г. выйшаў зборнік «П'есы».

## *Аляксандр МІРОНАЎ*



Аляксандр Яўгеньевіч Міронаў нарадзіўся 23.11.1910 г. у г. Оршы ў сям'і чыгуначніка.

У 1928 г., адначасова з вучобай у школе, працаваў рабочым на будоўлях у Мінску. Скончыў агульнаадукацыйныя курсы (1929). У 1930 г.— рэпарцёр газеты «Звязда». У тым самым годзе выехаў у Архангельск, працаваў журналістам, матросам. Удзельнік чалюскінскай эпапеі 1933—1934 гг. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў на Паўночным флоце. Удзельнічаў у баях, супрацоўнічаў у флоцкім друку. Пасля дэмабілізацыі (1946) вярнуўся ў Мінск. У 1946—1947 гг.— уласны карэспандэнт газеты «Звязда», у 1947—1950 гг.— адказны сакратар рэдакцыі альманаха «Советская Отчизна», начальнік сцэнарнага аддзела кінастудыі «Беларусьфільм». Член СП СССР з 1939 г.

Памёр 15.12.1992 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1978).

Пісаў на рускай мове. З літаратурна-мастацкімі творамі ў друку пачаў выступаць у 1930 г. Выдаў кнігі аповесцей, апавяданняў «Морские будни» (Архангельск, 1932), «Поход «Челюскина» (нарыс, Архангельск, 1935), «Чукотские новеллы» (Архангельск, 1935), «Большое сердце» (1939), «Мужество» (Архангельск, 1942), «Крепость во льдах» (Масква — Ленінград, 1944), «Далеко на севере» (1947), «Остров розовых скал» (Архангельск, 1947), «Каменщик Петр Дудко и его звено» (нарыс, 1947), «Конец легенды» (1948), «Флаг корабля» (Масква, 1954), «По морям, по океанам» (1956), «Зачислен навечно» (нарысы, 1966), «Ледовая Одиссея» (Масква, 1966, 2-е выданне, Мінск, 1978), «Коса на камень» (з М. Янушкам, 1967), «Через тысячу смертей» (1972), «Одно дело Зосимы Петровича» (з В. Крыжэвіч, 1989), раманы «Корабли выходят в океан» (1957), «Только море вокруг» (1960, дылогія ў 1962), «Не поле перейти» (з М. Янушкам, 1975). Выйшлі кнігі для дзяцей «Далеко на севере» (1947), «В стране голубых просторов» (1948), «Честное пионерское» (1950), «В краю полуночного

солнца» (Іркуцк, 1951), «В чужих широтах» (1952), «На океанских дорогах» (Масква, 1952), «Сын докера» (1954), «Флаг корабля» (1954), «Это твои друзья» (Сімферопаль, 1954), «Завтрашний день республики» (з А. Канаевым, 1959), «Твое будущее» (1962), «Дорогой мой подросток» (1966), «Пути, которые мы выбираем» (1968), «Дзед Маўр» (1979, 2-е выданне, 1983). У 1970—1971 гг. і ў 1986 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

На рускую мову пераклаў асобныя творы І. Гурскага, Я. Маўра, А. Стаховіча, П. Кавалёва і інш.

У яго літаратурнай апрацоўцы выйшлі дакументальныя аповесці В. Сабліна «Батька Минай» (1959), В. Паўлава «Идущие впереди» (1961), Я. Акушэвіча «Огни в родных лесах» (1964), запіскі партызан Н. Ратушнова «В боевом походе» (1960), П. Кавальскага «В Брестских лесах» (1970), М. Міхайлашава «Буря гнева» (1971), Д. Смірнова «Запіскі чэкіста» (1965), М. Казловай «Ухожу на задание» (1975), І. Цімашэнка «Солдаты милиции» (1976).

---

## *Павел МІСЬКО*



Павел Андрэевіч Місько нарадзіўся 14.3.1931 г. у вёсцы Старцавічы (цяпер Знамя) Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955). Працаваў адказным сакратаром, намеснікам рэдактара давыд-гарадоцкай раённай газеты «Сцяг Леніна». У 1959—1964 гг.— уласны карэспандэнт газеты «Звязда» па Гродзенскай вобласці, у 1964—1967 гг.— літсупрацоўнік «Сельской газеты», у 1967—1971 гг.— загадчык аддзела культуры рэдакцыі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», у 1971—1972 гг.— загадчык аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя». З 1972 г.— загадчык рэдакцыі прозы, у 1976—1980 гг.— намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1968 г.

Першае апавяданне апублікаваў у 1958 г.

(альманах «Брэст»). Выйшлі кнігі нарысаў «Адмаўленне ад крыжа» (1964), «Гаспадыні свайго лёсу» (1968), «Дрэва жыцця» (1973), зборнікі апавяданняў і аповесцей «Калодзеж» (1967), «Калянае лісце» (1974), зборнікі гумару «Дзівак-чалавек» (1972), «Чэрці ў коміне» (1978), «Вясельны марафон» (1984), «Лекцыя з падвывам» (1988), раманы «Мора Герадота» (1976), «Градабой» (1980), «Хлопцы, чые вы будзеце...» (1990).

Выдаў кнігі прозы для дзяцей «Падарожжа ў калгас» (дакументальная аповесць, 1970), «Зямля ў нас такая» (1971), «Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц у жыцці Жэні Мурашкі» (1972), «Прыгоды Бульбобаў» (1977), «Грот афаліны» (1985), «Эрпіды на планеце Зямля» (1987).

Аўтар аднаактовых п'ес «Канфлікт мясцовага значэння» (калектыўны зборнік «Радзіма мая дарагая», 1989) і «Ліха крадзецца ціха».

Пераклаў на беларускую мову паэму М. В. Гогаля «Мёртвыя душы» (1990), паасобныя творы У. Цендракова, У. Лічуціна, Я. Носава, В. Бялова, перакладае таксама з украінскай, польскай і балгарскай моў.

---

## *Сяргей* МІХАЛЬЧУК



Сяргей Апанасавіч Міхальчук нарадзіўся 14.8. 1925 г. у вёсцы Скабін Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў сярэднюю школу ў Капылі (1941). У 1944 г. быў прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на тэрыторыі Польшчы і Усходняй Прусіі. Быў цяжка паранены. Пасля дэмабілізацыі (1946) паступіў на аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1951 г. скончыў універсітэт і быў накіраваны на працу рэдактарам у Дзяржаўнае выдавецтва БССР (пазней — «Беларусь»). У 1972—1980 гг.— загадчык рэдакцыі выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1972 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1972).

У друку выступае з 1949 г. (абласная газета «Пінская праўда»). Першае апавяданне для дзяцей надрукаваў у 1955 г. (газета «Піянер Беларусі»). Напісаў для дзяцей зборнікі апавяданняў, аповесцей «Сто прыгод за адзін дзень» (1963), «Паштальён, шырэй крок!» (1968), «Зялёны лісточак» (1974), «Першы след» (1985).

Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы А. Гайдара, Б. Жыткова, В. Біянкі, А. Вішні, Л. Панцялеева, В. Асеевай, Л. Варанковай, М. Дубава, Я. Пермяка, Ю. Смуула, Ч. Айтматава, І. Неверлі, зборнік украінскіх народных казак і інш.

---

## *Міхась МОДЭЛЬ*



Міхась (Мендэль Моўшавіч) Модэль нарадзіўся 26.4.1904 г. у вёсцы Камень Лепельскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

Скончыў тры курсы медыцынскага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1924), вучыўся на педагагічным факультэце БДУ (да 1926). Быў на журналісцкай і партыйнай рабоце, працаваў у навуковых і тэатральных установах Беларусі. З 1937 г. у апараце СП БССР — кансультант, з 1940 г. адказны сакратар. У час Вялікай Айчыннай вайны працаваў у тэатрах і ўстановах культуры Тамбова, Ташкента, Андзіжана, у пасляваенны час — загадчык літаратурнай часткі Беларускага дзяржаўнага тэатра оперы і балета (1944—1945), у рэдакцыі часопіса «Полымя» (1945—1949). У 1949—1962 гг. літсупрацоўнік газеты «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 26.10.1980 г.

Літаратурна-крытычнай працай пачаў займацца з 1926 г. Выдаў зборнік артыкулаў «Тэатр і драматургія» (1935), брашуру «Ларыса Пампееўна Александроўская» (1945), кнігу нарысаў «Народныя артысты БССР» (1948).

## *Аркадзь* МОРКАЎКА



Аркадзь Андрэевіч Моркаўка нарадзіўся 26.1. 1900 г. у вёсцы Зазер'е Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Скончыў курсы тэлеграфістаў у Мінску (1916) і працаваў тэлеграфістам на станцыі Мінск (1916—1924). Вучыўся ў Віцебскім электрамеханічным тэхнікуме (1924—1927) і на энергетычным факультэце Беларускага політэхнічнага інстытута. Пасля заканчэння інстытута (1934) працаваў інжынерам у Мінску на заводзе «Беларусь», у Палаце мер і вагі. У гады Вялікай Айчыннай вайны — удзельнік Мінскага падполля. У пасляваенны час працягваў працу ў Палаце мер і вагі, адначасова выкладаў на энергетычным факультэце Беларускага політэхнічнага інстытута.

Памёр 24.4.1957 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1922 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Дым жыцця» (1928), «Гады, як ветразі» (1959), «Вершы» (1973).

## *Андрэй* МРЫЙ



Андрэй Мрый (Андрэй Антонавіч Шашалевіч) нарадзіўся ў 1893 г. у вёсцы Палуж Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і валаснога пісара.

Атрымаў семінарскую адукацыю. Быў прапаршчыкам у царскай арміі. У 1918—1921 гг. служыў у Чырвонай Арміі. У 1921—1926 гг. настаўнічаў у Краснаполлі ў школе II ступені (выкладаў гісторыю і французскую мову). У 1926—1930 гг.— інспектар Цэнтральнага бюро краязнаўства БССР. Быў членам «Узвышша». У 1934 г. рэпрэсіраваны, асуджаны тройкай АДПУ на 5 гадоў ссылкі. Справа пераглядалася. Зноў арыштоўваўся ў 1940 г. Пакаранне адбываў у Карагандзе, Валагодскай, Мурманскай абласцях, працаваў бухгалтарам у леспрамгасе, рыбным кааператыве, выкладчыкам літаратуры ў школе. У час арышту ў Мурманску ўсё створанае ў ссылцы (раман «Жывы

дом», аповесці, навелы) было канфіскавана. Рэабілітаваны 6.1.1961 г.

Памёр 8.10.1943 г. у лагеры на Поўначы.

Першы твор апублікаваў у 1924 г. (газета «Савецкая Беларусь»). Друкаваўся ў «Голасе беларуса» (Вільня), «Узвышшы», «Чырвоным сейбіце». Аўтар сатырычнага рамана «Запіскі Самсона Самасуя» (часопіс «Узвышша», 1929; «Полымя», 1988, пастаўлены тэлефільм «Пратарчака жыцця, або Запіскі Самсона Самасуя», 1990), нарысаў і апавяданняў. Некаторыя перадрукаваны часопісамі «Маладосць», «Полымя», надрукаваны таксама лісты «Другу працоўных Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну» (1988).

Пераклаў на беларускую мову «Тыса гаворыць» Б. Іллеша (1932), «Шляхамі ўзбочнымі» П. Загаруйкі (1932).



## *Іван* МУРАВЕЙКА

Іван Андрэевіч Муравейка нарадзіўся 21.10. 1921 г. у вёсцы Таль Любанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1939 г. скончыў Любанскую сярэднюю школу і паступіў у Мінскі камуністычны інстытут журналістыкі імя С. Кірава. У канцы года прызваны ў Чырвоную Армію. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Заходнім, Данскім, 3-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах. Быў паранены. У 1945—1947 гг. у складзе Цэнтральнай групы войск служыў у Германіі. У 1947 г. дэмабілізаваны. У 1948—1952 гг. працаваў адказным сакратаром і рэдактарам любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы». У 1964 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве, працаваў адказным сакратаром любанскай раённай газеты «Будаўнік камунізма». Жыве ў Любані. Член СП СССР з 1953 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I (двойчы) і II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1982).

У друку выступіў у 1936 г. (газета «Піянер

Беларусі»). Аўтар зборніка вершаў «Песня над палямі» (1955), кніжак вершаў для дзяцей «Ручаінкі» (1956), «Вось якія мы» (1958), «Пра работу і ляноту» (1960), «Дружная сямейка» (1961), «Сняжынкі-смяшынкі» (1962), «Сем колераў вясёлкі» (1965), «Лясное возера» (1970), «Мы таксама падрасцём» (1971), «Дуб і дубок» (1977), «Няхай сонца не заходзіць» (вершы, паэмы, казкі, 1981), «Я прыдумаў казку» (1985).

У сааўтарстве з А. Андруховічам напісаў кнігу «На зямлі камунараў» (1979).

---

## *Рыгор МУРАШКА*



Рыгор Данілавіч Мурашка нарадзіўся 16.2. 1902 г. у вёсцы Бязверхавічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў народнай школе. У 1916 г. скончыў двухкласную валасную школу, у 1917—1918 гг. вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі. Удзельнічаў у барацьбе з польскімі акупантамі на Случчыне (1919—1920). У 1920—1921 і 1924—1926 гг. служыў у Чырвонай Арміі. У 1921—1924 гг.— на савецкай і партыйнай рабоце. Член «Маладняка». Адказны сакратар часопіса «Бальшавік Беларусі» (1926—1929), загадчык аддзела мастацкай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1930—1933). У час Вялікай Айчыннай вайны (з 1943) у радах падпольшчыкаў Мінска, затым — у партызанскім атрадзе на Лагойшчыне. Член СП СССР з 1934 г.

Загінуў у красавіку 1944 г. у час прарыву блакады.

Першы празаічны твор апублікаваў у 1924 г. (газета «Савецкая Беларусь»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Стрэл начны ў лесе» (1926), «Прыгранічны манастыр» (1930), «Званкі» (1931), «Рузікі» (1932), «Мюдаўская ноч» (1934), аповесці «У іхнім доме» (1929), раманаў «Сын» (1929), «Салаўі святога Палікара» (1967). У сааўтарстве з Н. Гарнічам напісаў кнігу «Бацька Бажэнка: Запіскі Тарашчанца» (1935).

*Міхась МУШЫНСКІ*



Міхась (Міхаіл Іосіфавіч) Мушынскі нарадзіўся 24.1.1931 г. у вёсцы Мокрае Быхаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і служачага.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955), да лістапада 1956 г. працаваў рэдактарам Універсітэцкага выдавецтва. З 1956 г.— навуковы супрацоўнік, з 1979 г.— загадчык сектара (цяпер аддзела) выданняў і тэксталогіі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Доктар філалагічных навук. Член СП СССР з 1973 г.

Узнагароджаны медалямі.

Выступае ў жанры крытыкі і літаратуразнаўства з 1956 г. Напісаў манаграфіі «Ад задумы да здзяйснення: Творчая гісторыя «Новай зямлі» і «Сымона-музыкі» (1965), «Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы» (з В. Каваленкам, А. Яскевічам, 1972), «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. 20—30-я гады» (1975), «Беларускае савецкае літаратуразнаўства» (1979), «Беларуская крытыка і літаратуразнаўства. 40-я — першая палавіна 60-х гг.» (1985), «Літаратура і ідэалагічная барацьба»: Некаторыя аспекты фальсіфікацыі беларускай літаратуры на Захадзе» (1987), «Каардынаты пошуку: Беларуская крытыка: набыткі, перспектывы» (1988), а таксама кнігі «Якуб Колас. Летапіс жыцця і творчасці» (1982), «І нічога, апроч праўды: Якой быць «Гісторыі беларускай літаратуры» (1990). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» (1977) і «Истории белорусской советской литературы» (1977). Як тэкстолаг кіраваў падрыхтоўкай і ажыццяўленнем выдання навукова каменціраваных Збораў твораў (І. Мележа ў 10, М. Лынькова ў 8, М. Гарэцкага ў 4, П. Пестрака ў 5, З. Бядулі ў 5, П. Броўкі ў 9, М. Зарэцкага ў 4 тамах).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні «История белорусской дооктябрьской литературы» і «История белорусской советской литературы».

*Валянцін МЫСЛІВЕЦ*



Валянцін Цімафеевіч Мыслівец нарадзіўся 9.5.1937 г. у вёсцы Хазянінка Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў тэхнічнае вучылішча ў Мінску па спецыяльнасці майстар-будаўнік (1956). Служыў у марскіх пагранічных часцях (1956—1957). Працаваў мантажнікам у Мінскім будаўніча-мантажным упраўленні радыёфікацыі (1958), мадэльшчыкам на заводзе аўтаматычных ліній (1959—1964). З 1965 г.— літсупрацоўнік рэдакцыі «Чырвоная змена», з 1967 г.— рэдактар на Беларускім радыё. У 1967 г. скончыў вячэрняе аддзяленне факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. З 1976 г.— галоўны рэдактар Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання, з 1980 г.— рэдактар аддзела нарыса часопіса «Полымя», з 1983 г.— літкансультант «Сельской газеты», у 1987—1988 гг.— начальнік аддзела Беларускага фонду культуры. Член СП СССР з 1967 г.

У друку выступае з 1962 г. Выдаў нарысы «Калі табе камсамолец імя» (1966), «Мае заводчыкі» (1969), «Рабочыя людзі» (1973), «Крылаты канвеер» (1975), «Партрэты знаёмых» (1976), «Скрыль мёду» (1984), «Лясная кладоўка» (1986), «Культурны пласт перабудовы» (1988). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Дубы не маўчаць» (1967), «Гарачая сталь» (1971), «Каханне на золаку» (1986), рамана «Мужанцы» (1982), дакументальнай аповесці «Выгнанне грэшнікаў» (1990).

Зрабіў літаратурны запіс кніг М. Куско «С именем Ленина в сердце» (1967), І. Макарэвіча «Гаспадар на зямлі» (1989).

## *Уладзімір МЯЖЭВІЧ*



Уладзімір Навумавіч Мяжэвіч нарадзіўся 23.5. 1907 г. у пасёлку Якаўлевічы Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1925 г. працаваў загадчыкам хаты-чытальні, загадваў аддзелам прапаганды ў Копыскім, Горацкім райкомах камсамола. У 1927—1929 гг.— сакратар Горацкага райкома камсамола. У 1929 г. накіраваны на працу ў рэдакцыю газеты «Звязда», дзе спачатку быў літсупрацоўнікам, потым загадваў аддзелам культуры. Адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні літаратурнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1930—1932). У 1933 г. рэдагаваў бягомльскую раённую газету «Калгасны змагар». У 1934—1937 гг.— карэспандэнт «Известий» па Беларускай ССР. У 1937 г. рэпрэсіраваны, высланы ў Сібір. Працаваў лесарубам, брыгадзірам, майстрам лесу, галоўным інжынерам і дырэктарам леспрамгаса. У 1956 г. рэабілітаваны. У 1956—1957 гг.— карэспандэнт газеты «Лесная промышленность» па Беларускай ССР. Член СП СССР з 1971 г.

Памёр 1.7.1982 г.

У друку пачаў выступаць у 1925 г. Выдаў кнігі нарысаў «Крок у будучыню» (1931), «Землякі» (1969), «Спатканні на дарогах: Запіскі карэспандэнта» (1978). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Шляхам герояў» (1932), «Яны былі першымі» (апавяданні і нарысы, 1970), «Аксамітны бляск» (1971). Напісаў кніжкі апавяданняў для дзяцей «Медунічкі» (1966), «Лясныя знаходкі» (1969), «Выдумшчыцы» (1971), «Стрэлы на зялёнай палянцы» (1973), «На ўсходзе сонца» (1982).

## *Іван* МЯЛА



Іван Ільіч Мяла нарадзіўся 3.7.1918 г. у вёсцы Сцяпок Старадубскага раёна Бранскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

Скончыў Асташкоўскі ветэрынарны тэхнікум (1939). Служыў у Чырвонай Арміі намеснікам палітрука, ваенветфельчарам. У 1943—1947 гг. вучыўся ў Ваенна-ветэрынарнай акадэміі. У 1947 г. паступіў на апошні курс Маскоўскага зааветэрынарнага інстытута і ў гэтым жа годзе скончыў яго. Працаваў ветурачом у Старадубскім раёне (1947—1948), дырэктарам міжраённай калгаснай школы (1949—1952). У 1956 г. скончыў аспірантуру пры Усесаюзным інстытуце эксперыментальнай ветэрынарыі. У 1958—1962 гг.— навуковы супрацоўнік, загадчык лабараторыі ў Далёкаўсходнім навукова-даследчым ветэрынарным інстытуце, у 1962—1979 гг.— навуковы супрацоўнік Беларускага навукова-даследчага інстытута эксперыментальнай ветэрынарыі імя С. М. Вышалескага. Кандыдат ветэрынарных навук. Член СП СССР з 1967 г. Жыве ў пасёлку Кунцаўшчына Мінскага раёна.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені і медалямі.

Першае апавяданне апублікаваў у 1947 г. (часопіс «Огонёк»). Піша на рускай мове. Змяшчаў нарысы ў бранскім альманаху «Край родной» і ў часопісе «Дальний Восток». Надрукаваў аповесці «Передний край» (часопіс «Неман», 1964), «Бытень» (часопіс «Наш современник», 1966), «Отлучка» (часопіс «Неман», 1977), «Засуха» (часопіс «Неман», 1987), «Карантин» (часопіс «Нёман», 1989). Асобнымі выданнямі выйшлі нарысы «Нижневские животноводы» (Бранск, 1951), «Стародуб» (Бранск, 1951) і «Горит в степи маяк» (Благавешчанск, 1962), п'еса «Дело чести» (Масква, 1963), кніга аповесцей і апавяданняў «Настенькины смотрины» (1969), раманы «Низовские партизаны» (Благавешчанск, 1962), «Верность» (Масква, 1969), «Раскол» (1972), «Искушение Гарпины» (1975), «Повстанцы» (1980), «Принада» (1982), «Овсяный бунт» (1986).

*Мікола* МЯТЛІЦКІ



Мікола (Мікалай Міхайлавіч) Мятліцкі нарадзіўся 20.3.1954 г. у вёсцы Бабчын Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці (вёска выселена ў 1986 г. пасля аварыі на Чарнобыльскай АС) у сялянскай сям'і.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1977), працаваў карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва», з 1983 г.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1981 г.

Першыя вершы змясціў на старонках хойніцкай газеты «Ленінскі сцяг» у 1969 г. Аўтар кніг вершаў «Абеліск у жыце» (1980), «Мой дзень зямны» (1985), «Ружа вятроў» (вершы і паэмы, 1987), «Горкі вырай» (1989), «Шлях чалавечы» (1989).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1986) за кнігу паэзіі «Мой дзень зямны».

# Н



## *Алесь* НАВАРЫЧ

Алесь Наварыч (Аляксандр Іванавіч Трушко) нарадзіўся 2.11.1960 г. у вёсцы Відзібор Столінскага раёна Брэсцкай вобл. у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Відзіборскай сярэдняй школы працаваў цесляром у Столінскай вытворча-механізаванай калоне, затым лабарантам у роднай школе. У 1978—1980 гг., вучыўся на стаматалагічным факультэце Мінскага медыцынскага інстытута. У 1985 г. скончыў аддзяленне рускай мовы і літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Настаўнічаў у Скірмантаўскай сярэдняй школе Дзяржынскага раёна (1985—1986), Малюшыцкай — Карэліцкага раёна (1986—1987). З 1988 г.— літрэдактар у часопісе «Вожык». З 1990 г.— метадыст Рэспубліканскага цэнтра эстэтычнага выхавання. Член СП СССР з 1988 г.

Першыя апавяданні апублікаваў у 1983 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Рабкова ноч» (1988), «Ноч пацалункаў незалежнасці» (1989).

## *Іван* НАВУМЕНКА



Іван Якаўлевіч Навуменка нарадзіўся 16.2.1925 г. у горадзе Васілевічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Са студзеня 1942 г. удзельнік камсамольскага падполля, затым — партызан, вызваляў родныя Васілевічы. У снежні 1943 г. прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на Ленінградскім і 1-м Украінскім франтах. Пасля дэмабілізацыі (снежань 1945) — карэспандэнт мазырскай абласной газеты «Бальшавік Палесся»,

а з 1951 г.— рэспубліканскай газеты «Звязда». Завочна скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1950) і аспірантуру пры універсітэце (1954). Быў загадчыкам аддзела прозы часопіса «Маладосць» (1953—1958), загадваў кафедрай беларускай літаратуры БДУ ім У. І. Леніна. У 1973—1982 гг.— дырэктар Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, з 1982 г.— віцэ-прэзідэнт АН БССР. Старшыня Вярхоўнага Савета БССР (1985—1990). Акадэмік АН БССР, доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Кастрычніцкай Рэвалюцыі, медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1978).

Першыя апавяданні апублікаваў у 1955 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар кніг апавяданняў, аповесцей «Семнаццатай вясной» (1957), «Хлопцы-равеснікі» (1958), «Верасы на выжарынах» (1960), «Бульба» (1964), «Таполі юнацтва» (1966), «Вераніка» (1968), «Тая самая зямля» (1971), «Падарожжа ў юнацтва» (выбранае, 1972), «Замець жаўталісця» (1977), «Пераломны ўзрост» 1986), «Водгулле далёкіх вёснаў» (1989), раманаў «Сасна пры дарозе» (1962), «Вецер у соснах» (1967), «Сорак трэці» (1974), «Смутак белых начэй» (раман, аповесць, апавяданні, 1980), «Летуценнік. Смутак белых начэй» (1985), «Асеннія мелодыі» (раман, апавяданні, 1987), аповесці для дзяцей «Вайна каля Цітавай копанкі» (1959), «Капитан Степь идет в разведку» (з В. Мамантавым, 1982), п'есы «Птушкі між маланак» (1982). Выйшаў Збор твораў у 6 тамах (1981—1984).

Выдаў літаратуразнаўчыя працы «З глыбінь жыцця: Крытычныя эцюды аб творчасці Якуба Коласа» (1960), «Пісьменнікі-дэмакраты» (1967), «Янка Купала: Духоўны воблік героя» (1967), «Якуб Колас: Духоўны воблік героя» (1968), «Гуманизм и народность» (Масква, 1972), «Кніга адкрывае свет» (1978), «Из глубин народной жизни» (1981), «Якуб Колас» (1982), «Якуб Колас: Нарыс жыцця і творчасці» (1982), «Элементы міфалогіі ў паэзіі Янкі Купалы і Якуба Коласа» (1988), даклады на VIII і

IX Міжнародныя з'езды славістаў «Праблемы развіцця літаратуры ў эпоху сучаснага навукова-тэхнічнага прагрэсу» (1978) і «Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа ў кантэксце славянскіх літаратур» (1983).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1967) за кнігу «Таполі юнацтва», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1972) за кнігі «Янка Купала: Духоўны воблік героя» і «Якуб Колас: Духоўны воблік героя».

---

## *Уладзімір НАВУМОВІЧ*



Уладзімір Аляксандравіч Навумовіч нарадзіўся 29.10.1943 г. у вёсцы Баўцічы Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўніцы.

У 1960 г. скончыў Ярэміцкую сярэднюю школу. Працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры Беражноўскай васьмігадовай школы Карэліцкага раёна. У 1966 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Быў на камсамольскай рабоце — у Ленінскім райкоме камсамола Мінска, у Мінскім абкоме камсамола, лектарам ЦК ЛКСМБ. У 1973 г. скончыў аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры БДУ і з таго часу выкладае беларускую літаратуру ва універсітэце, з 1978 г.— дацэнт, з 1989 г.— загадчык кафедры беларускай мовы і літаратуры для прыродазнаўчых факультэтаў БДУ. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1990 г.

Першыя апавяданні надрукаваў у 1964 г. (навагрудская раённая газета «Новае жыццё» і «Чырвоная змена»). Аўтар аповесцей «Узаранае поле» (часопіс «Маладосць», 1968), «Такое бывае аднойчы» (1982) і манаграфіі «Шляхамі арлянят: Проза «Маладняка» (1984).

*Алесь* **НАЎРОЦКІ**



Алесь (Аляксандр Піліпавіч) Наўроцкі нарадзіўся 12.2.1937 г. у вёсцы Давыдаўка Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

У 1954 г. скончыў Бабруйскую школу санітарных фельчараў. Працаваў фельчарам у вёсцы Вышкава Карэліцкага раёна. Скончыў Мінскі медыцынскі інстытут (1962). Працаваў урачом участковай бальніцы ў вёсцы Аравічы Хойніцкага раёна (1962—1965). На Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве правучыўся год (1976). У 1964 г. прыняты ў члены СП СССР, у 1978 г., пратэстуючы супраць прымянення псіхіятрыі ў палітычных мэтах, выйшаў з Саюза пісьменнікаў. У 1981 г. прымацаваны да псіханеўралагічнага дыспансера і пазбаўлены працы ўрача.

Дэбютаваў у друку вершам у 1954 г. (часопіс «Полымя»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Неба ўсміхаецца маланкаю» (1962), «Гарачы снег» (1968), «Пакаленні і папялішчы» (1990), кнігі апавяданняў «Валун» (1976).

*Янка* **НЕПАЧАЛОВІЧ**



Янка (Іван Данілавіч) Непачаловіч нарадзіўся 25.5.1917 г. у вёсцы Мінкавічы Старадарожскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1934) працаваў загадчыкам Крываносаўскай хатычытальні Старадарожскага раёна. У 1935 г. паступіў на літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута, з трэцяга курса быў накіраваны ў Дзяржынскую сярэднюю школу, дзе працаваў настаўнікам у 1937—1939 і 1944—1947 гг. (інстытут скончыў завочна ў 1940). Настаўнічаў у Мар'інагорскай сярэдняй школе (1939—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны — сувязны партызанскай брыгады імя С. М. Кірава на Міншчыне. Пасля вайны быў інспектарам Старадарожскага рана, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Дараганаўскай сярэдняй школе Асіповіцкага раёна. З 1967 г. жыў у

Мінску. Працаваў у выдавецтве «Народная асвета». Член СП СССР з 1958 г.

Узнагароджаны медалём.

Памёр 3.7.1969 г.

Друкаваўся з 1936 г. (часопіс «Полымя рэвалюцыі» (Аўтар зборнікаў вершаў «Мера любві» (1958), «Позні паром» (1967) і «Перад захадам сонца» (1977).

---

## *Янка НЁМАНСКІ*



Янка Нёманскі (Іван Андрэевіч Пятровіч) нарадзіўся 12.4.1890 г. у в. Шчорсы Навагрудскага р-на. Гродзенскай вобл. у сялянскай сям'і.

Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1909) і нейкі час працаваў у вясковай школе. Вучыўся ў Петраградскім універсітэце на гісторыка-філалагічным факультэце (1914—1916, 1918). У 1916 г. прызваны ў армію і пасля школы прапаршчыкаў удзельнічаў у баях на фронце. У 1918 г. працягваў вучобу ва універсітэце, разам з Ц. Гартным выдаваў першую савецкую газету на беларускай мове «Дзянніца». У 1919—1921 гг. служыў у Чырвонай Арміі — ваяваў на Карэльскім, Петраградскім, Польскім франтах, быў у Сібіры і Далёкім Усходзе. З 1921 г. жыў у Мінску. Працаваў у планава-эканамічных органах рэспублікі, вучоным сакратаром Інстытута эканомікі АН БССР, намеснікам старшыні Дзяржплана БССР. З 1933 г. па 1936 г. узначальваў кафедру фінансавых дысцыплін у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі. У 1927—1936 гг.— член ЦВК БССР. 27.4.1937 г. быў арыштаваны і асуджаны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР у кастрычніку 1937 г. да выключнай меры пакарання. Рэабілітаваны 16.3.1957 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР. Акадэмік АН БССР.

Расстраляны 30.10.1937 г.

У 1918 г. у газеце «Дзянніца» выступаў па пытаннях гісторыі, эканомікі і культуры Беларусі. Першае апавяданне надрукаваў у 1922 г. у часопісе «Полымя». Аўтар зборніка апавяданняў «На зломе» (1925), аповесці «Партызан» (1927, часопіс «Полымя»), незавершанага рамана «Драпежнікі» (1928—1930, часопіс «Полымя»). У 1984 г. выйшлі «Творы».

## *Мікола* НІКАНОВІЧ



Мікола (Мікалай Уладзіміравіч) Нікановіч нарадзіўся 15.4.1902 г. у вёсцы Кляннік Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Кляннiцкай пачатковай школе, затым — у Ігумені (цяпер Чэрвень) у гімназіі. Удзельнічаў у партызанскай барацьбе супраць польскіх акупантаў на Беларусі. Пасля грамадзянскай вайны быў настаўнікам у роднай вёсцы. У 1928 г. прыехаў у Мінск і стаў працаваць стылістам у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». У 1933 г. рэпрэсіраваны. Высланы за межы Беларусі. Працаваў у рэдакцыях газет «Уральский рабочий», «Советский Дон». У 1942 г. прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. Рэабілітаваны 24. 8.1956 г. Вярхоўным судом БССР.

У кастрычніку 1944 г. прапаў без вестак на тэрыторыі Чэхаславакіі.

Першае апавяданне апублікаваў у 1923 г. (газета «Савецкая Беларусь»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Золак» (1926), «Радасць» (1926), «Крык працы» (1928), «Вясновы прамень» (1929), аповесцей «Мяцеліца» (1930), «У паўстанцаў» (1931), кнігі выбраных твораў «Летнім днём» (1960) і кнігі апавяданняў, аповесцей і замалёвак «Светлая даль» (1985).

Пераклаў на беларускую мову аповесці А. Неверава «Ташкент — горад хлебны» (1930), А. Дончанкі «Ударны атрад (1933), кнігу Е. Бурчэ «Прыгоды ў паветры» (1932).

## *Ванкарэм* НІКІФАРОВІЧ



Ванкарэм Валяр'янавіч Нікіфаровіч нарадзіўся 15.11.1934 г. у г. Мінску ў сям'і настаўніка.

У 1957 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў рэдактарам мастацкай літаратуры Дзяржаўнага выдавецтва БССР. З 1965 г.— старшы рэдактар, з 1976 г.— загадчык аддзела Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання. З 1983 г.— памочнік галоўнага рэжысёра па літаратурнай

частцы Тэатра-студыі кінаакцёра пры Дзяржкіно БССР, з 1987 г.— кіраўнік літаратурна-драматычнай часткі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Член СП СССР з 1972 г.

Узнагароджаны балгарскім ордэнам Кірыла і Мяфодзія.

Пачаў выступаць у друку з 1958 г. як літаратурны крытык. Артыкулы, прысвечаныя літаратурным узаемасувязям Беларусі з замежнымі краінамі, сабраны ў кнігах «Усяму свету — свой дар» (1973), «Дарогі ў шырокі свет» (1979).

Працуе таксама ў галіне мастацкага перакладу. З балгарскай мовы на беларускую пераклаў аповесці К. Грыгорава «Танча з Гарацвета» (1961), К. Калчава «Закаханыя птушкі» (1964), «Люба» (1984), раман Г. Караславава «Нявестка» (1966), анталогію балгарскага апавядання «Скарб» (з Н. Гілевічам, 1967), аповесць Г. Угарава «Кліча Радопскі бор» (1972), кнігу С. Паптонева «Беларусь — белая балада» (з Р. Барадуліным, 1979), анталогію гумарыстычнага апавядання «Адпачынак з байкапісцам» (1980), аповесць Г. Мішава «Матрыярхат» (1981), аповесці С. Паптонева «Спачатку быў хлеб», Слава Х. Караславава «Такая любоў», Ц. Іярданава «Выпадковы стрэл», уключаныя ў зборнік «Такая любоў» (1987), кніжку гумару «Усмешкі на старых фотаздымках» (1990), асобныя п'есы Д. Асенава, Л. Мілевай, В. Пятрова, С. Страціева, С. Цанева, Х. Бойчава. На рускую мову пераклаў зборнік «Габровские улыбки» (1968) і «Улыбки друзей» (1981). Пераклаў таксама п'есы А. Арбузава «Мой бедны Марат» (1965), І. Малеева «Надзежда Путніна» (1988) і С. Злотнікава «Вар'яцкае жыццё» (1989), пастаўленыя ў тэатры імя Я. Купалы. Напісаў у сааўтарстве з В. Раеўскім п'есу «Страсці эпохі» па матывах незавершаных раздзелаў рамана І. Мележа «Завеі, снежань» (пастаўлена ў 1989).

Аўтар сцэнарыяў дакументальных і тэлевізійных фільмаў «Помнікі не маўчаць» (1971), «Дом Макаравых» (1975), «Такая ў зямлі песня» (1978), «Паэзія Янкі Купалы» (1982), «Верыць сэрцам у Перамогу» (1985), «Паэзія Рыгора Барадуліна» (1988), «Лінія лёсу» (пра С. Станюту, 1990), інсцэніровак для Беларускага тэлебачання па творах А. Куляшова, І. Мележа, А. Кулакоўскага, І. Пташнікава, Р. Барадуліна і інш.

## *Ганна* НОВІК



Ганна Аляксееўна Новік нарадзілася 25.3.1914 г. у горадзе Аўгустове былой Сувалкскай губерні (цяпер Польшча) у сям'і каваля.

Дзяцінства правяла ў вёсцы Варонічы каля Вілейкі. У 1932 г. скончыла сем класаў Куранецкай школы. Працавала наймічкай з 9 гадоў, а ў 1935 г. была ў лагеры для беспрацоўнай моладзі ў Рашыне пад Варшавай. За ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху неаднаразова арыштоўвалася. У 1936—1938 гг. зняволена ў вілейскую турму. Пасля прыходу Чырвонай Арміі (1939) абрана дэпутатам Народнага Сходу Заходняй Беларусі, працавала іспектарам Куранецкага рана. У час Вялікай Айчыннай вайны — партызанская сувязная. у 1948—1954 гг. працавала старшынёй калгаса імя У. І. Леніна в. Варонічы Вілейскага раёна, і старшынёй Кузьміцкага сельсавета Вілейскага раёна, памочнікам начальніка палітаддзела Будслаўскай машынна-трактарнай станцыі на Маладзечаншчыне, Жыве ў Вілейцы. Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Першыя вершы надрукавала ў 1937 г. Аўтар зборніка вершаў «Мае вёсны» (1961), аповесці «Другая сустрэча» (фрагменты апублікаваны ў часопісе «Полымя», 1979). У перыядычным друку апублікаваны апавяданні, нарысы, вершы.

## *Сяргей* НОВІК-ПЯЮН



Сяргей Новік-Пяюн (Сяргей Міхайлавіч Новік) нарадзіўся 27.8.1906 г. у вёсцы Лявонавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Нясвіжскай рускай гімназіі (1918—1924), скончыў беларускія настаўніцкія курсы ў Вільні (1926). За культурна-асветніцкую работу неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі. Адбыў пяцігадовую ссылку на Паморʼі (1926—1931), у 1939 г. сядзеў у турме ў Баранавічах. У савецкі час працаваў інспектарам Слонімскага раённага аддзела народнай асветы

(1939—1940), дырэктарам Слонімскага краязнаўчага музея (1940—1941). У час Вялікай Айчыннай вайны за сувязь з партызанамі прыгавораны фашысцкімі ўладамі да пакарання смерцю. Вызвалены партызанамі з Калдычаўскага лагера. Зноў працаваў дырэктарам Слонімскага музея (1944). 14.12.1944 г. арыштаваны, а ў сакавіку 1945 г. Ваенным трыбуналам войск НКУС Баранавіцкай вобласці асуджаны на 10 год пазбаўлення волі. Тэрмін адбываў на Калыме. 5.11.1958 г. рэабілітаваны Ваенным трыбуналам Беларускай ваеннай акругі. У 1959 г. вярнуўся на Беларусь. З 1960 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1984 г.

У 1925 г. пачаў выступаць у віленскіх прагрэсіўных беларускіх газетах і часопісах з вершамі. У Вільні асобнымі выданнямі выйшлі п'есы «Цудоўная ноч» (1927), «Ёлка Дзеда Мароза» (1927), «Прадка над крыжам» (1939), у зборніку «Сцэнічныя творы» (1927) — п'еса «Пакой у наймы». Афармляў часопіс для дзяцей «Заранка» (1927—1931). Аўтар зборніка паэзіі «Заўсёды з песняй» (паэма, вершы, песні, творы для дзяцей, 1984), кніжкі вершаў для дзяцей «Зорачкі ясныя» (1986). Напісаў некалькі песень на свае вершы («Зорачкі», «Над Шчарай» і інш.).

---

## *Іван* НОВІКАЎ



Іван Рыгоравіч Новікаў нарадзіўся 26.1.1918 г. у вёсцы Нязнань Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Магілёўскі газетны тэхнікум (1935), вучыўся ў Аршанскім настаўніцкім інстытуце (1938) і ў Ленінградскім інстытуце журналістыкі імя. В. В. Вароўскага (1939—1941). Завочна скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955). Працаваў у клімавіцкай раённай газеце «Камуна» (1935—1938). У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у абароне Сталінграда, у вызваленні Украіны, Малдавіі, Балгарыі, Югаславіі, Аўстрыі, у 1944 г. паранены ў баях за венгерскі горад Секешфехервар. Ганаровы грамадзянін балгарскага г. Слівена. З 1946 г.—

літсупрацоўнік, з 1951 г.— загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия», з 1957 г.— карэспандэнт, у 1965—1986 гг.— загадчык карэспандэнцкага пункта газеты «Правда» па Беларускай ССР. Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1967).

Піша на рускай і беларускай мовах. Літаратурную дзейнасць пачаў з нарысаў. Выйшлі нарысы «Герой Сацыялістычнай Працы Тамара Шкурко» (з В. Пыжковым, 1948), «Дзесяць тыдняў у Злучаных Штатах Амерыкі» (1958), «Палескае золата» (1959), «Побач сябры» (1960), «Бессмертие Минска» (1977), «Минск — город-герой» (1986). Аўтар зборніка фельетонаў «Уласны іншаземец» (1960), нарыса «Вера Харужая» (Масква, 1962), дакументальных аповесцей «Руіны страляюць ва ўпор» (1962), «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску» (1964), «Да світання блізка» (1975), якія склалі трылогію «Минский фронт» (1977), аповесці «Тварам да небяспекі» (1968), рамана «Ачышчэнне» (1987), кнігі аповесцей і апавяданняў «Параненая памяць» (1990). Напісаў з І. Чыгрынавым сцэнарый шматсерыйнага тэлефільма «Руіны страляюць...» (пастаўлены ў 1973).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1965) за аповесць «Дарогі скрыжаваліся ў Мінску», Дзяржаўнай прэміі БССР імя П. М. Лепяшынскага (1968) за кнігу «Тварам да небяспекі», Дзяржаўнай прэміі БССР за сцэнарый тэлефільма «Руіны страляюць...», Літаратурнай прэміі імя. А. А. Фадзеева (1980) за трылогію «Минский фронт».

## *Уладзіслаў* НЯДЗВЕДСКІ



Уладзіслаў Іосіфавіч Нядзведскі нарадзіўся 24.7. 1929 г. у вёсцы Рахавічы Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Бацькі загінулі ў 1943 г. У першыя пасляваенныя гады выхоўваўся ў Мікашэвіцкім дзіцячым доме, у 1948—1950 гг. працаваў там старшым піянерважатым. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955). Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Гайнаўскай сярэдняй школе на Лагойшчыне (1955—1958), працаваў на Беларускім тэлебачанні (1958—1960), у часопісе «Маладосць» (1960—1968), з 1972 г.— у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1958 г.

Памёр 17.10.1973 г.

Першы верш надрукаваў у 1949 г., у рэспубліканскім друку — у 1952 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Вясновыя барозны» (1958), «Запрашэнне» (вершы і паэма, 1960), «У лясной старане» (1962), «Размова з адсутнымі» (1969), аповесці «Хлопцы з другога корпуса» (1964), «Капронавыя галёшы» (гумарыстычныя апавяданні, 1964). «Начная пагоня» (апавяданні, гумарэскі, аповесць, 1966). Для дзяцей выдаў кніжку «Сто братоў і сясцёр» (вершы і паэма, 1960) і паэму «Сыны Кастрычніка» (1969). У 1976 г. выйшла «Выбранае», у 1988 г.— кніга паэзіі «Такія і думы і словы».

## *Уладзімір* НЯКЛЯЕЎ



Уладзімір Пракопавіч Някляеў нарадзіўся 11.7. 1946 г. у горадзе Смаргонь Гродзенскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1962—1966 гг. вучыўся ў Мінскім тэхнікуме сувязі. Працаваў радыёмеханікам тэлевізійнага атэлье. Займаўся на аддзяленні паэзіі Літаратурнага інстытута (1971). Завочна скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1973). У 1972—1975 гг.— літсупрацоўнік рэдакцыі га-

зеты «Знамя юности», у 1975—1978 гг.— рэдактар бюлетэня «Тэатральны Мінск». З 1978 г.— старшы рэдактар галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання, з 1987 г.— галоўны рэдактар часопіса «Крыніца» («Родник»). Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1978 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Першыя вершы надрукаваў у 1970 г. Выдаў кніжкі паэзіі «Адкрыццё» (1976), «Вынаходцы вятроў» (1979), «Знак аховы» (1983), «Наскрозь» (вершы і паэмы, 1985), «Галубіная пошта» (1987).

У перыядычным друку выступае з празаічнымі творамі (аповесць «Вежа», часопіс «Полымя», 1988, аднайменная п'еса, з А. Дударавым, пастаўлена ў 1990), літаратурнымі эсэ, крытычнымі артыкуламі.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1979) за кнігу «Вынаходцы вятроў» і паэму «Дарога дарог».

---



## *Уладзімір НЯФЁД*

Уладзімір Іванавіч Няфёд нарадзіўся 27.1.1916 г. у горадзе Шахты Растоўскай вобласці (Расія) у сям'і рабочага.

Працоўны шлях пачаў у 1931 г. слесарам на шахце, з 1933 г.— у гарадской радыёгазеце. Вучыўся на рабфаку (1933—1934). Скончыў тэатразнаўчае аддзяленне Маскоўскага інстытута гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Г. Чарнышэўскага (1940). У 1940—1941 гг.— намеснік, у 1942—1947 гг.— начальнік аддзела тэатраў Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР, у 1941—1942 гг.— выкладчык літаратуры і дырэктар Уцёўскай сярэдняй школы Куйбышаўскай вобласці. Скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР (1951), быў навуковым супрацоўнікам (1951—1954), загадчыкам сектара гісторыі мастацтваў (1954—1957) гэтага інстытута. У 1957—1970 гг.— загадчык сектара тэатра і кіно, у 1970—1977 гг.— збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, з 1977 г.— сектара тэатра, з 1988 г.— галоўны навуковы супрацоўнік ад-

дзела тэатра Істытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. З 1947 г. працуе па сумяшчальніцтве ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. Член-карэспандэнт АН БССР, доктар мастацтвазнаўства, прафесар. Член СП СССР з 1946 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалямі.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1975).

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1940 г. як тэатральны крытык. Піша на беларускай і рускай мовах. Аўтар прац па гісторыі беларускага тэатра «Шлях беларускага савецкага драматычнага тэатра» (1954), «Народны артыст БССР. У. І. Уладамірскі» (1954), «Народны артыст СССР Павел Сцяпанавіч Малчанаў» (1958), «Беларускі тэатр: Нарыс гісторыі» (1959), «Тэатр у вогненныя гады» (1959), «Сучасны беларускі тэатр» (1961), «Становление белорусского советского театра 1917—1941». (1965). У 1970 г. выдаў кнігі «Размышления о драматическом конфликте» і «Беларускі акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы», у 1976 г.— «Беларускі тэатр імя Якуба Коласа», у 1982 г.— вучэбны дапаможнік «Гісторыя беларускага тэатра». Напісаў раздзелы «Белорусский театр» для «Истории советского драматического театра» (Масква, 1966—1971), раздзелы «Гісторыя беларускага тэатра» ў 3 тамах (1983—1986).

У 1990 г. апублікаваў кнігу «Николай Ковязин: Жизнь и творчество».

З 1942 г. пачаў пісаць п'есы, пераважна аднаактовыя. Асобнымі выданнямі выйшлі «Кто первый» (Масква, 1950), «На парозе жыцця» (1951), «Ля разбітага карыта» (1957), «Ошибка Веры Игнатьевны» (1964), «Одноактные пьесы» (1955), «Маленькие комедии и драмы» (1967).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1966) за кнігі «Тэатр у вогненныя гады», «Сучасны беларускі тэатр» і «Становление белорусского советского театра».

*Рыгор* **НЯХАЙ**



Рыгор Восіпавіч Няхай нарадзіўся 5.12.1914 г. у вёсцы Сяліба Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1935 г. скончыў Мінскі педагагічны тэхнікум, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Калодзішчанскай сярэдняй школе пад Мінскам. Завочна скончыў літаратурны факультэт Мінскага настаўніцкага інстытута (1939). У 1939 г. прызваны ў Чырвоную Армію. Удзельнічаў у баях на Паўднёвым, 1-м Украінскім франтах. У 1942—1943 гг. выконваў заданні Галоўнага разведупраўлення Савецкай Арміі ў тыле ворага (Кіеў — Чаркасы — Чарнігаў). Быў начальнікам асобага аддзела партызанскага злучэння Ю. Збанацкага. Прайшоў ваеннымі дарогамі Польшчы, Германіі, Чэхаславакіі, Аўстрыі, Венгрыі. Закончыў вайну на Эльбе. З 1946 г. працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва». У 1952—1954 гг.— загадчык аддзела крытыкі і публіцыстыкі часопіса «Полымя», у 1956—1957 гг.— рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР. Член СП СССР з 1946 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 25.7.1991 г.

Друкавацца пачаў у 1935 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Аўтар зборнікаў вершаў «Па сонечных узгорках» (1939), «Маё пакаленне» (1950), «Вялікі мой і ціхі акіян» (1954), «Размова з восенню» (1961), «Асеннія пракосы» (выбранае, 1973), «Слова сябрам» (1982), зборніка апавяданняў і аповесцей «Навальнічнае рэха» (1958), «Героі не адступаюць» (1965), «Сарочы лес» (1966), «Алёшка-атаман» (1967), «Туман над стэпам» (1971), «Шлях на Эльбу» (1976), нарыса «Минская область» (1968, 2-е дапоўненае і перапрацаванае выданне ў 1974). Для дзяцей напісаў кніжкі «Пра храбрага хлопчыка» (вершы, 1962), «Як расцвітае кветка» (апавяданні, 1968), «Я з табою, гвардыя» (аповесць, 1983). У 1984 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

На беларускую мову пераклаў «Дзень айца Сойкі» С. Тудора (1952), «Над Чарамошам» М. Стэльмаха (1955), «Памфлеты» Ю. Мель-

нічука (1961), асобныя творы А. Твардоўскага, М. Рыльскага, П. Тычыны, А. Малышкі, Ю. Збанацкага і іншых рускіх і ўкраінскіх пісьменнікаў.

Зрабіў літаратурны запіс кніг «Партызанскі край» В. Лівенцава (1950), «Браты па зброі» І. Вятрова (1962), «Палескія былі» І. Шубітыдзе (1969).

# П



## *Вячаслаў ПАЛЕСКІ*

Вячаслаў Палескі (Вячаслаў Пятровіч Станкевіч) нарадзіўся 3.11.1912 г. у вёсцы Астрагляды Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў дзевяцігодку з педагагічным ухілам (1929). Настаўнічаў у вёсцы Лазараўка Рэчыцкага раёна. У 1930—1932 гг. працаваў у гомельскай абласной газеце «Палеская праўда». З 1932 г. у Мінску — у газетах «Савецкая Беларусь», «Калгаснік Беларусі», «Советская Белоруссия», на Беларускім радыё. У 1941—1944 гг.— на радыёстанцыі «Савецкая Беларусь» (Масква). З 1944 г. адказны сакратар, намеснік рэдактара газеты «Звязда». З 1961 г.— намеснік старшыні, у 1965—1971 гг. старшыня Дзяржаўнага камітэта Савета Міністраў БССР па радыёвяшчанню і тэлебачанню. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1971). Член СП СССР з 1949 г.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1967).

Памёр 18.6.1971 г.

Дэбютаваў у 1928 г. вершам. У 1930 г. выйшла кніжка вершаў «Разгон» (з Р. Казаком, С. Ракітам, Гомель). Аўтар п'ес «Песня нашых сэрцаў» («Што пасееш, тое і пажнеш», надрукавана і пастаўлена ў 1949), «Калі зацвітаюць сады» (надрукавана і пастаўлена ў 1950), «Гарачыя пірагі» (1958, ставілася Бугурусланскім тэатрам). У 1976 г. выйшла кніга «П'есы».

Пераклаў на беларускую мову п'есы «Палата» С. Алёшына, «Ноч памылак» О. Голдсміта.

## *Апанас* ПАЛІТЫКА



Апанас (Панас) Паўлавіч Палітыка нарадзіўся 5.2.1935 г. у вёсцы Бродак Крычаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1951 г. скончыў у Кіеве рамеснае вучылішча. Працаваў на машынабудаўнічым заводзе «Бальшавік» (1951—1954). У 1954 г. паехаў на асваенне цалінных зямель у Акмолінскую вобласць (Казахстан). Рабіў прыцэпшчыкам на ферме Балкашынскага племсаўгаса, трактарыстам зернесаўгаса «Калінінскі» (1954—1955). Служыў у Савецкай Арміі (1955—1957). Быў электраслесарам шахты «2-Паўднёвая» (горад Шахты, Растоўская вобласць). З 1959 г. жыў у Крычаве, працаваў слесарам на птушкакамбінаце, цесляром у саўгасе «Вялікі Кастрычнік». У 1960 г. скончыў сярэднюю школу рабочай моладзі, у 1967 г. філалагічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працаваў выхавацелем школы-інтэрната ў Крычаве (1967—1969), загадчыкам сельгасаддзела крычаўскай раённай газеты «Ленінскі кліч». З 1975 г. карэспандэнт-арганізатар, загадчык аддзела інфармацыі і радыёвяшчання газеты «Ленінскі кліч». Член СП СССР з 1981 г.

Першы верш апублікаваў у 1960 г. (газета «Магілёўская праўда»). Аўтар кніг «Маўчанне навыперадкі» (гумар і сатыра, 1980), «Свой хлопец» (сатырычныя аповесці і апавяданні, 1985), «Праверка» (сатырычныя апавяданні, 1990).

## *Дзмітрый* ПАЛІТЫКА



Дзмітрый Антонавіч Палітыка нарадзіўся 15.5.1915 г. у вёсцы Гарывец Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Мінскім, Лепельскім педагагічных тэхнікумах (1930—1932). Настаўнічаў у пачатковай школе ў вёсцы Капцэвічы Чашніцкага раёна. У 1935 г. скончыў літаратурны факультэт Магілёўскага педінстытута. Працаваў у літаратурным кабінеце гэтага інстытута, у Полацкім педвучылішчы. Слу-

жыў у Чырвонай Арміі (1936—1937). Выкладаў рускую літаратуру ў Магілёўскім педвучылішчы (1937—1941), у педінстытуце (1944—1945), быў на педагагічнай рабоце ў Башкірскай АССР (1941—1944). У 1950 г. скончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС. З 1950 г. загадваў кафедрай рускай і беларускай мовы і літаратуры Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1954 г.

Памёр 18.4.1965 г.

Дэбютаваў вершамі ў 1933 г. З 1946 г. пачаў выступаць як крытык. Пісаў на беларускай і рускай мовах. Выйшлі брашуры «О значении советской литературы в коммунистическом воспитании трудящихся» (1952), «Великий русский писатель-сатирик М. Е. Салтыков-Щедрин» (1955) і «Беларуская пасляваенная проза» (1958), літаратуразнаўчыя кнігі «Янка Купала — перакладчык» (1959, дапоўненае выданне ў 1986), «Роман А. И. Гончарова «Обрыв» (1962) і зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Сляды часу» (1967).

---

## *Вера ПАЛТАРАН*



Вера Палтаран (Вера Сямёнаўна Ляпеская) нарадзілася 28.3.1919 г. у вёсцы Бабунічы Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучылася ў Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага (1937—1941). На пачатку Вялікай Айчыннай вайны эвакуіравалася ў Горкаўскую вобласць і працавала на Барміна-Вянецкім заводзе. У 1945 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Працавала стыльрэдактарам газет «Чырвоная змена», «Літататура і мастацтва». У 1953—1973 гг.— рэдактар аддзела крытыкі часопіса «Маладосць». З 1973 па 1986 г. загадвала рэдакцыяй крытыкі і літаратуразнаўства выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1966 г.

Узнагароджана медалём.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1979).

Памерла 28.3.1989 г.

Выступаць у друку пачала ў 1949 г. Аўтар кніг нарысаў «Ключы ад Сезама» (1967) і «Дзівасіл» (1974), зборніка крытыкі і публіцыстыкі «Чалавек на вятрах часу» (1989).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя П. М. Лепяшынскага (1970) за зборнік «Ключы ад Сезама» і нарыс «Дзівасіл».

---

## *Алесь ПАЛЬЧЭЎСКІ*



Алесь (Аляксандр Восіпавіч) Пальчэўскі нарадзіўся 16.1.1905 г. у вёсцы Прусінава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў педагагічны факультэт (творчы цыкл) Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1931). Працаваў адказным сакратаром рэдакцыі часопіса «Кааперацыя БССР», у 1931—1936 гг.— у рэдакцыі часопіса «Іскры Ільіча». 26.11.1936 г. рэпрэсіраваны. 1.10.1937 г. прыгавораны да 8 гадоў пазбаўлення волі. У 1937—1946 гг. працаваў лесарубам у Горкаўскай вобласці. У 1946 г. вярнуўся на Беларусь, выкладаў мову і літаратуру ў Пухавіцкай, Рудзенскай сярэдніх школах. У 1948 г. быў зноў асуджаны да высылкі (на пасяленне). Жыў у Краснаярскім краі, працаваў цесляром (1948—1955). Рэабілітаваны 18.12.1954 г. У 1955—1957 гг. працаваў у газеце «Зорька», рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР, з 1957 г.— літсупрацоўнікам, У 1961—1971 гг.— адказным сакратаром рэдакцыі часопіса «Вясёлка». Член СП СССР з 1956 г.

Узнагароджаны медалём.

Памёр 26.4.1979 г.

Першыя вершы і апавяданні надрукаваў у 1925 г. Аўтар п'ес «З чырвоным сцягам» (1932), «Зломаная іголка» (1934), «Суседка» (Беласток, 1956), зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Родныя берагі» (1958), «Жнівеньская раніца» (1963), «Разбітае люстэрка» (1965), «Былі у маці сыны» (1968), «Запознены пасаг» (1973), «Ноч на вахце» (1979). Для дзяцей выдаў кніжкі «Беражанкі» (1958), «Ты не адзін» (1960), «Аля і Галя» (1961), «Дым над лесам» (1964), «Данеўцы — нашы знаёмыя» (1965), «Таемная крушня» (1969), «Тайна аднаго звяна» (1971), «Аднавокі сом» (1974), «Сцежкі» (1977).

У 1966 г. выйшла кніга выбраных твораў «Мора на камені», у 1975 і ў 1980 г.— Выбраныя творы ў 2 тамах.

Пераклаў на беларускую мову раман П. Данжашвілі «На Алазані» (з Т. Цулукідзе, 1959), асобныя творы рускіх, украінскіх і грузінскіх пісьменнікаў.

---

## *Валянцін ПАНАМАРОЎ*



Валянцін Георгіевіч Панамароў нарадзіўся 5.7. 1923 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і інжынера-эканаміста.

Скончыўшы сярэднюю школу (1941), паступіў у Маскоўскі авіяцыйны інстытут, які неўзабаве быў эвакуіраваны ў Алма-Ату. У 1942 г. прызваны ў армію. Вучыўся ў Ваенна-паветранай Акадэміі імя Жукоўскага (1942—1944), у Маскоўскім інстытуце міжнародных адносін (1944—1945). Быў літсупрацоўнікам газеты «Правда» (1945—1949). З 1949 г. у Мінску,— карэспандэнт «Правды» па Беларускай ССР (1949—1951), часопіса «Огонёк» (1951—1959, 1961—1965), газеты «Известия» (1959—1961), «Литературной газеты» (1974—1976). Працаваў памочнікам першага сакратара ЦК КПБ (1965—1971), кіраўніком групы палітычных аглядальнікаў Дзяржтэлерадыё БССР (1971—1974). Удзельнічаў у рабоце сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1966, 1968, 1970). Член СП СССР з 1965 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Літаратурнай дзейнасцю займаецца з 1945 г. Піша на рускай мове. Выйшлі кнігі нарысаў «Партизанские годы Кирилла Орловского» (Масква, 1958), «На волнах жизни» (1961), «Суд спасает убийц» (1963), «Расскажи моим девочкам» (нарысы і апавяданні, Масква, 1969), «Мятежное сердце» (дакументальная аповесць, Масква, 1970), «К. П. Орловский» (1977), «Все так и было» (1984), «Своими глазами» (1989).

Аўтар сцэнарыя дакументальнага фільма «У агні жыцця» (зняты ў 1969).

## *Сяргей ПАНІЗНІК*



Сяргей Сцяпанавіч Панізнік нарадзіўся 10.5. 1942 г. у вёсцы Бабышкі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Магілёўскае медыцынскае вучылішча (1962). Працаваў фельчарам Княжыцкай бальніцы каля Магілёва. У 1962—1975 гг. служыў у Савецкай Арміі. Пасля заканчэння факультэта журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча СА ВМФ (1967) быў ваенным журналістам. У 1976 г. працаваў фельчарам траўмабрыгады на станцыі «Хуткай дапамогі» ў Мінску. У 1977—1978 гг.— стыль-рэдактар у газеце «Вячэрні Мінск», з 1980 г.— рэдактар Дзяржтэлерадыё БССР, з 1982 г.— рэдактар, а з 1984 г.— загадчык рэдакцыі выдавецтва «Юнацтва», з 1989 г.— вядучы рэдактар гэтай рэдакцыі. Член СП СССР з 1967 г. Узнагароджаны медалём.

Першы верш надрукаваў у 1959 г. (міёрская раённая газета «Зара камунізму» — цяпер «Сцяг камунізму»). Аўтар зборнікаў вершаў «Кастры Купалля» (1967), «Палявая пошта» (1972), «Крона надзеі» (1975), «Чало і век» (1979), «Слова на дабрыдзень» (1982), «Мацярык» (1985), «Стырно» (1989). Для дзяцей выйшлі кніжкі паэзіі «Адкуль вясёлка п'е ваду» (1981), «Жыцень» (1986), «Мы — грамацеі!» (1989), дакументальныя аповесці «Браніслава» (1985), «Освейская трагедия» (1990). Выдаў кніжку публіцыстыкі «Пасля вогненных вёсак...» (1980).

## *Іван ПАНЧАНКА*



Іван Трафімавіч Панчанка нарадзіўся 24.5. 1928 г. у вёсцы Тарапаева Прачысценскага раёна Смаленскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

Працоўны шлях пачаў у 14 год машыністам паравой машыны на льнозаводзе ў вёсцы Велісто Прачысценскага раёна (1942—1944), машыністам на дрэваапрацоўчым камбінаце ў вёсцы Жаркі Калінінскай вобласці (1946—1948). Служыў у Савецкай Арміі (1948—1952). Пасля дэ-

мабілізацыі — літсупрацоўнік у рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия», у 1957 г. у ліку трыццацітысячнікаў паехаў у вёску, працаваў старшынёй калгасаў імя М. Кутузава Стаўбцоўскага і калгаса «Камсамолец» Юрацішкаўскага (цяпер Іў'еўскага) раёнаў. Быў карэктарам, загадчыкам аддзела пісем смалявіцкай раённай газеты «Ленінскі заклік», карэспандэнтам Мінскага абласнога радыё, радыёарганізатарам вузла сувязі ў Смалявічах, супрацоўнікам шматтыражнай газеты «Белорусский автозаводец» (г. Жодзіна). Пасля заканчэння завочнага аддзялення факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1965) вярнуўся на пасаду загадчыка аддзела пісем газеты «Ленінскі заклік». Жыве ў Смалявічах Мінскай вобласці. Член СП СССР з 1981 г.

Першае апавяданне ў рэспубліканскім друку апублікаваў у 1955 г. (газета «Сталинская молодежь»). Піша на рускай мове. Аўтар кніг нарысаў «Жодинские богатыри» (1971), «Люди высокого долга» (1973), «Жодинская хроника» (1977) і апавяданняў «Порванные струны» (1975), «Уйдут метели зимние» (1980), «Новые знакомые» (1983), «...И вечной будет музыка» (дакументальная аповесць, 1986), «Доброе соседство» (1988).

## *Пімен ПАНЧАНКА*



Пімен Емяльянавіч Панчанка нарадзіўся 23. 8.1917 г. у горадзе Таліне (Эстонія) у рабочай сям'і.

Бацькі — бедныя сяляне, у пошуках заробку выехалі ў Прыбалтыку. У 1920 г. сям'я вярнулася ў Бягомль. У 1934 г. скончыў педагагічныя курсы ў Бабруйску. У 1934—1935 гг.— загадчык Алянскай пачатковай школы Бабруйскага раёна, у 1935—1936 гг.— настаўнік Казуліцкай няпоўнай сярэдняй школы Кіраўскага раёна, у 1938—1939 гг. выкладаў мову і літаратуру ў Кіраўскай сярэдняй школе Магілёўскай вобласці. Адначасова вучыўся завочна на філалагічным факультэце Мінскага настаўніцкага інстытута (скончыў у 1939). З верасня

1939 г. да студзеня 1946 г. у Савецкай Арміі — спецыяльны карэспандэнт, пісьменнік у армейскіх і франтавых газетах. Прымаў удзел у паходзе Савецкай Арміі ў Заходнюю Беларусь у 1939 г., у баях на Бранскім, Заходнім, Калінінскім, Паўночна-Заходнім франтах, у 1944—1945 гг. знаходзіўся з часцямі Савецкай Арміі ў Іране. З 1946 г. працаваў у рэдакцыях часопіса «Вожык», газеты «Літаратура і мастацтва», быў галоўным рэдактарам часопісаў «Советская Отчизна» (цяпер «Неман», 1954—1958), «Маладосць» (1958—1966), сакратаром праўлення СП БССР (1966—1971). Як член дэлегацыі БССР у 1958 г. прымаў удзел у рабоце XIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1957—1967, 1971—1975), старшынёй Рэспубліканскага камітэта абароны міру. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1938 г.

Узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, двума — «Знак Пашаны», Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Народны паэт БССР (1973).

Першыя вершы з'явіліся ў 1934 г. у кіраўскай раённай газеце «Кіравец» і альманаху «Ударнікі». Аўтар зборнікаў паэзіі «Упэўненасць» (1938), «Вераснёвыя сцягі» (1940) (зборнік «Трывожныя зарніцы» быў падрыхтаваны да друку і згарэў у час вайны), «Тебе, Беларусь!» (апублікаваны ў Маскве ў перакладзе на рускую мову, 1942), «Дарога вайны» (Масква, 1943), «Далёкія станцыі» (1945), «Гарачыя вятры» (вершы і паэмы, 1947), «Вершы» (1948), «Прысяга» (1949), «За шчасце, за мір!» (1950), «Вершы і паэмы» (1952), «Шырокі свет» (1955), «Выбраныя творы» (1956), «Гарачы лівень» (гумар і сатыра, 1957), «Кніга вандраванняў і любові» (1959), «Нью-Йоркскія маланкі» (1960), «Тысяча небасхілаў» (1962), «Чатыры кантыненты» (вершы і паэмы, 1964), «Пры святле маланак» (1966), «Размова з наследнікамі» (вершы і паэма, 1967), «Снежань» (1972), «Вершы» (1973), «Выбранае» (1975), «Крык сойкі» (1976), «Вячэрні цягнік» (1977), «Лірыка» (1980), «Млечны Шлях» (1980), «Маўклівая малітва» (1981), «Дзе начуе жаўранак» (1983), «Сіні ранак» (1984), «Лясныя воблакі» (1985),

«І вера, і вернасць, і вечнасць» (1986), «Прылучэнне» (вершы і паэма, 1987), «Горкі жолуд» (1988), «Неспакой» (1988). Многія вершы пакладзены на музыку. Выйшлі Зборы твораў у 2-х (1959), у 3-х (1967—1971), у 4-х тамах (1981—1983).

Выдаў кнігу літаратурна-крытычных артыкулаў «На паэтычным небасхіле» (1977).

Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы Ф. Шылера («Разбойнікі»), А. Міцкевіча, Я. Райніса, А. Пракоф'ева, А. Суркова, Т. Масэнкі, Б. Чалага, паэму М. Нагнібеды «Матулям з Расон» і інш.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Янкі Купалы (1959) за «Патрыятычную песню», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1967) за кнігу вершаў «Пры святле маланак», Дзяржаўнай прэміі СССР (1981) за кнігу вершаў «Где ночует жаворонок» (Масква, 1979).

---

## *Уладзімір ПАПКОВІЧ*



Уладзімір Антонавіч Папковіч нарадзіўся 25.3. 1935 г. у вёсцы Дварэц Вілейскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (1958), выкладаў у гэтым інстытуце нямецкую мову (1958—1962). Працаваў інжынерам-перакладчыкам патэнтнага бюро Інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі і прапаганды пры Савеце Міністраў БССР (1962—1963), старшым выкладчыкам кафедры замежных моў Мінскага вышэйшага інжынернарадыётэхнічнага вучылішча (1963—1964), інжынерам-перакладчыкам аддзела тэхнічнай інфармацыі мінскага оптыка-механічнага завода імя С. І. Вавілава. У 1966—1970 гг. настаўнічаў у школе № 20 у Віцебску, у Віцебскім педінстытуце імя С. М. Кірава. Зноў працаваў інжынерам-перакладчыкам. З 1973 г. выкладчык нямецкай і англійскай моў Віцебскага індустрыяльнага тэхнікума, з 1982 г.— старшы выкладчык Віцебскага педінстытута. Член СП СССР з 1981 г.

У друку выступае з 1962 г. з вершамі і апавяданнямі. Аўтар зборнікаў вершаў «На дос-

вітку» (1978), «Зерне» (1982), «Самы кароткі цень» (1988).

На беларускую мову перакладае творы нямецкіх і польскіх паэтаў. У яго перакладзе выйшлі кнігі І.-Р. Бехера «Вяртанне да сябе» (1988), Р. Крафта «Востраў без маяка» (1987), «Закаханы вандроўнік: Паэзія нямецкага рамантызму» (1989).

---

## *Алена ПАПОВА*



Алена Георгіеўна Папова нарадзілася 12.10. 1947 г. у горадзе Легніца (Польшча) у сям'і савецкага ваеннага журналіста.

У 1950 г. прыехала ў Мінск. У 1967—1968 гг. працавала карэспандэнтам Сургуцкага радыёвяшчання (Цюменская вобласць, Расія), у 1969—1970 гг.— сакратаром-машыністкай ва ўстановах Мінска. Скончыла Літаратурны інстытут імя М. Горкага (1973). Працавала рэдактарам-кінадраматургам, асістэнтам рэжысёра на кінастудыі «Беларусьфільм» (1973—1975, 1976—1977), памочнікам галоўнага рэжысёра па літаратурнай частцы Беларускага тэатра імя Янкі Купалы (1975). Член СП СССР з 1979 г.

У друку дэбютавала ў 1967 г. апавяданнем (газета «Советская Белоруссия»). Піша на рускай мове. Аўтар п'ес «Дом на берегу моря» (1973), «Скорые поезда» (1979, пастаўлена ў 1978), «Такая пристань» (апублікавана і пастаўлена ў 1979), «Площадь Победы» (1984, пастаўлена ў 1985), «Объявление в вечерней газете» (1985, пастаўлена ў 1982), «Маленькие радости живых» (апублікавана і пастаўлена ў 1990). Выйшаў зборнік п'ес «Объявление в вечерней газете» (1989).

Выдала аповесць для дзяцей «Галочка едет в Африку» (1973).

## *Георгій ПАПОЎ*



Георгій Лявонцьевіч Папоў нарадзіўся 3.5.1918 г. у вёсцы Прыганка Круціхінскага раёна Алтайскага краю (Расія) у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Анжэра-Суджанскай фельчарскай школы (Кемераўская вобласць, 1938) працаваў загадчыкам Патрушэўскага медпункта. Праз паўтара года заняўся журналістыкай — стаў загадваць аддзелам культуры і быту ў газеце «Борьба за уголь» (Анжэра-Суджанск). Адначасова вучыўся завочна ў Новасібірскім педагагічным інстытуце (1940—1941).У час Вялікай Айчыннай вайны — ваенны медык на Калінінскім, Заходнім, Цэнтральным, 1-м і 4-м Украінскіх франтах. З 1946 г.— ваенны журналіст, з 1950 г.— у газеце Беларускай ваеннай акругі «Во славу Родины» (Мінск). У 1956—1959 гг.— супрацоўнік рэспубліканскай газеты «Калгасная праўда». З 1959 г.— адказны сакратар, у 1966 — 1978 гг.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Неман». Член СП СССР з 1959 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1977).

Літаратурную працу пачаў у 1938 г. У беларускім друку першае апавяданне апублікаваў у 1952 г. (альманах «Советская Отчизна»). Піша на рускай мове. Першы зборнік апавяданняў «В родном полку» выйшаў у 1956 г. у Маскве. Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Половодье» (1958), «Клок сена» (1965), «Гуси-лебеди» (1968), «За тридевять планет» (1976, перапрацаванае выданне ў 1990), «Поездка в Тростёну» (1977), «Память» (1978), «Низкий поклон» (1981), «Первое лето» (1985), «На том, на волжском берегу» (1986), «На дороге» (1989).

Пераклаў на рускую мову паасобныя празаічныя творы Я. Коласа, З. Бядулі, Б. Мікуліча, А. Алешкі, Я. Брыля, А. Савіцкага, Л. Гаўрылкіна і інш., вершы М. Багдановіча.

## *Міхась* ПАРАХНЕВІЧ



Міхась (Міхаіл Прохаравіч) Парахневіч нарадзіўся 20.8.1934 г. у в. Мінкавічы Старадарожскага р-на Мінскай вобл. у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння школы фабрычна-заводскага навучання (1952) працаваў электраманцёрам у Мінску. У 1953—1956 гг. служыў у Савецкай Арміі. Потым супрацоўнічаў у старадарожскай, парыцкай раённых газетах, у 1958—1961 гг.— у ерментаўскай раённай газеце Цалінаградскай вобласці. З 1962 г.— супрацоўнік газеты «Мінская праўда», у 1966—1967 гг.— газеты «Літаратура і мастацтва». Скончыў завочна філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна (1965), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС у Маскве (1969). З 1971 г.— інструктар аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПБ, з 1978 г.— намеснік рэдактара газеты «Вячэрні Мінск». Член СП СССР з 1973 г.

Узнагароджаны медалём.

Літаратурнай працай займаецца з 1950 г. Выйшлі кнігі для дзяцей «Мы майструем самалёт» (1963), «Толікаў гай» (1965), «Дзядзька Толя — трактарыст» (1968), «Чырвоны аўтобус» (1973). Аўтар кніжак прозы «Грыбны дождж» (1969), «Зара-зараніца» (1975), «Абяцанне» (1976), «Модны гальштук» (гумарэскі, 1977), «Маё і тваё маленства» (1978), «Прыгарадная камандзіроўка» (1979), «Марыніка» (1983), «Чаромхавы ранні цвет» (1984), «Белыя цені бяроз» (1989), зб. вершаў «Жыццё» (1972).

## *Яраслаў* ПАРХУТА



Яраслаў Сільвестравіч Пархута нарадзіўся 8.3.1930 г. у вёсцы Мілейкі Івацэвіцкага раёна Брэскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся на аддзяленні журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1949—1952). Быў на журналісцкай працы ў Гродненскай вобласці (1952—1953). Служыў у Савецкай Арміі (1953—1956). З 1956 г.— літсупрацоўнік, загадчык аддзела поразаўскай раённай газеты «Ленінскі шлях», з 1959 г.—

намеснік рэдактара ружанскай раённай газеты «Заветы Леніна», з 1961 г.— рэдактар гарадзішчанскай раённай газеты «Советская Родина», з 1962 г.— намеснік рэдактара, загадчык аддзела міжраённай газеты «Знамя коммунизма» (Баранавічы), з 1965 г.— старшы рэдактар Брэсцкай студыі тэлебачання, у 1965—1969 гг.— загадчык аддзела, намеснік рэдактара маларыцкай раённай газеты «Сельскае жыццё». У 1973 г. скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (Мінск). У 1973—1977 гг.— намеснік рэдактара і рэдактар аддзела часопіса «Вожык». У 1978—1982 гг.— рэдактар аддзела часопіса «Родная прырода». Член СП СССР з 1982 г.

Узнагароджаны медалём.

У друку выступае з 1946 г. Першы верш апублікаваў у 1949 г. (брэсцкая абласная газета «Заря»). Аўтар вершаваных казак «Казка зялёнай дубровы» (1960), «Перапёлачка» (1979), кніг прозы «Ты пайшла ў сонца» (1973), «Мудрая цялушка» (1976), «Там, дзе жыве Юлька» (1978), «Жаваранак над полем» (1985), «Зямля бацькоў нашых» (1988), «Пад высокім сонцам» (1988), «Дарогамі надзеі і трывог» (1989).

---

## *Макар ПАСЛЯДОВІЧ*



Макар Трафімавіч Паслядовіч нарадзіўся 21.8. 1906 г. у вёсцы Караваева Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Пасля заканчэння сямігодкі (1924) вучыўся на падрыхтоўчых курсах у ВНУ. У 1926 г. як актыўны селькор газеты «Беларуская вёска» запрошаны на штатную працу ў гэтую газету. Быў адказным сакратаром часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1935—1939). У час Вялікай Айчыннай вайны — кіраўнік мар'інагорскай падпольнай групы і сувязны асобага партызанскага атрада імя Сталіна ў Пухавіцкім раёне. Па падазрэнні ў сувязі з партызанамі ў 1943 г. быў арыштаваны і адпраўлены на катаржныя работы ў Германію. Пасля вызвалення працаваў спецыяльным карэспандэнтам газеты «Звязда» (1945—1948). Член СП СССР з 1936.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

Памёр 30.12.1984 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1927 г. (часопіс «Паляўнічы Беларусі»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Зруйнаваныя межы» (1930), «Людзі вясны» (1930), «Чатырнаццаты нумар» (1934), «Снайпер» (1937), «Чырвоныя струны» (1988), аповесцей «Марсель» (1931), «Хада ў заўтра» (1933), «Магістральны канал» (1947), «З табою побач» (1960), раманаў «Цёплае дыханне» (1948), «Святло над Ліпскам» (1950, у 1988 г. абодва раманы выйшлі ў адной кнізе). Асобным выданнем выйшлі нарысы «Аляксандра Шаплыка» (1949), «Мяцежнае сэрца» (1959), «Салігорскае дзіва» (1963) і шэраг апавяданняў. Выдаў кніжкі апавяданняў для дзяцей «Вучоны верабей» (1938), «Зялёны канверт» (1964) і дакументальную аповесць «Па воўчых сцежках» (1958), зборнікі гумарыстычных апавяданняў «Пад дзвюма дойнымі каровамі» (1963), «Двайное дно» (1964), кніжку літаратурных пародый «Наравісты Пегас» (1968), «Аповесці. Апавяданні» (выбранае, 1970). У 1961 г. выйшаў Збор твораў у 2 тамах, у 1986 г.— Выбраныя творы.

Аўтар п'ес «Гонар» (1934), «Гарачае сэрца» (1938) і «Шалёная рысь» (1939).

Пераклаў на беларускую мову некаторыя творы А. Пушкіна, А. Чэхава, аповесць М. Гогаля «Тарас Бульба» (з А. Бачылам), раман Р. Джаваньёлі «Спартак», аповесць П. Бажова «Зялёны конік», раман М. Астроўскага «Народжаныя бурай», нарыс М. Горкага «У. І. Ленін», рускія казкі, творы ўкраінскіх, польскіх і інш. пісьменнікаў.

---

## *Уладзімір ПАЎЛАЎ*



Уладзімір Андрэевіч Паўлаў нарадзіўся 25.10. 1935 г. у вёсцы Замошша Любанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1954 г. скончыў Дарасінскую сярэднюю школу і працаваў літработнікам любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы». Служыў у Савецкай Арміі (1954—1957). У 1962 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў загадчыкам літаратуры і мастацтва, адказным

сакратаром рэдакцыі газеты «Чырвоная змена» (1962—1967), адказным сакратаром кінабюлетэня «На экранах Беларусі» (1967—1971), літкансультантам СП БССР (1971—1972, 1986—1988), загадваў рэдакцыямі паэзіі, затым збору твораў і выбраных твораў выдавецтва «Мастацкая літаратура» (1972—1985). З 1990 г.— намеснік старшыні СП Беларусі. Член СП СССР з 1962 г.

Першы верш надрукаваў у 1954 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Узлётная паласа» (1960), «Далягляд» (вершы і паэма, 1964), «Светацені» (1967), «Начная балада» (вершы і паэма, 1971), «Сонца купаецца» (вершы, паэма, 1976), «Каласы радкоў» (1979), «Сляза на вейцы» (1982), «Гадавое кальцо» (1986).

Выйшлі кнігі аповесцей і апавяданняў «Годы нашы — птушкі» (1970), «Ад агню і мяча» (1973), для дзяцей «Пажарніца» («Тайна бункера № 7», аповесць, 1968), «Чуж-чужаніца» (аповесць, 1979), «Радзімкі» (1989). У 1987 г. выдадзены Выбраныя творы ў 2 тамах.

Пераклаў раманы Я. Фельдэака «Чужая дачка» (1979), У. Багамолава «Момант ісціны» («У жніўні сорак чацвёртага», 1984), асобныя творы пісьменнікаў народаў СССР.

---

## *Альберт ПАЎЛОВІЧ*



Альберт Францавіч Паўловіч нарадзіўся 11.11. 1875 г. у горадзе Мінску ў сям'і мешчаніна.

Скончыў чатырохкласнае гарадское вучылішча ў Мінску (1894). Працаваў канторшчыкам, бухгалтарам ва Упраўленні Лібава-Роменскай чыгункі (Мінск). У 1932—1941 гг. жыў у Маскве, ад пачатку вайны да 1945 г.— на Урале, у 1945—1951 гг.— у Курску. Працаваў бухгалтарам у розных установах.

Памёр 17.3.1951 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у канцы XIX стагоддзя, у друку ўпершыню выступіў у 1907 г. у «Нашай ніве». Аўтар зборнікаў вершаў «Снапок» (Вільня, 1910), драмы «Васількі» (Вільня, 1919), вершаваных жартаў, вершаў для дзяцей, якія друкаваліся ў розных перыя-

дычных выданнях дарэвалюцыйнага часу («Наша ніва», «Маладая Беларусь», «Беларусь», «Лучынка» і інш.). Рукапіс зборніка гумару «Перавясла» свету не пабачыў і пакуль не знойдзены. У 1975 г. выйшаў зборнік «Выбранае».

На беларускую мову перакладаў творы А. Пушкіна, Т. Шаўчэнкі, М. Канапніцкай, У. Сыракомлі і інш.

---

## *Банавентура* ПАЎЛЮКЯВІЧУС



Банавентура Казіміравіч Паўлюкявічус нарадзіўся ў 1896 г. у вёсцы Будэжэрай Вілкавішскага раёна (Літва) у сям'і цесляра.

З 1924 г. вучыўся ў Каўнаскім, у 1926—1929 гг.— у Рыжскім універсітэтах. У 1926 г.— рэдактар легальнага літоўскага камуністычнага часопіса «Водгук» (на другім нумары часопіс закрыты, а рэдактар зняволены ў турму). Працаваў у літоўскай школе ў Рызе, у 1929—1931 гг. жыў у Кёнігсбергу, дзе працаваў у органе Літоўскай камуністычнай партыі газеце «Балсас». У 1931 г. запрошаны ў СССР, з 1932 г. жыў у Мінску, працаваў загадчыкам культмасавага сектара літоўскай газеты «Чырвоны араты». У 1933—1936 гг. вучыўся ў аспірантуры пры АН БССР. Член СП СССР з 1934 г. У 1938 г. арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 23.4.1957 г.

Расстраляны 29.11.1938 г.

У друку выступаў з 1926 г. Пісаў на літоўскай мове. Аўтар аповесцей «Бядоты батрака», «Беспрацоўе» (незакончана), апавяданняў, нарысаў, крытычных і публіцыстычных артыкулаў (пісаў пра творчасць Янкі Купалы, Якуба Коласа, А. Александровіча, пра літоўскую пралетарскую літаратуру). У 1960 г. у Вільнюсе выйшаў зборнік «Бядоты батрака».

Перакладаў з рускай і нямецкай моў.

*Нічыпар ПАШКЕВІЧ*



Нічыпар Еўдакімавіч Пашкевіч нарадзіўся 12.12.1924 г. у вёсцы Фелістава Талачынскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1939 г. паступіў у Мінскае педагагічнае вучылішча. Вучобу перапыніла Вялікая Айчынная вайна. У 1942 г. уступіў у партызанскі атрад імя Катоўскага брыгады «Гроза», якая дзейнічала ў Талачынскім раёне. Быў байцом, памочнікам камісара атрада па камсамолу, камісарам атрада. Пасля вызвалення Беларусі працаваў рэдактарам талачынскай раённай газеты «Чырвоны хлебароб», а з 1945 г.— загадчыкам аддзела рэдакцыі абласной газеты «Віцебскі рабочы». У 1946—1948 гг. вучыўся ў Рэспубліканскай партыйнай школе пры ЦК КПБ. Загадваў аддзелам у газеце «Віцебскі рабочы». У 1951 г. скончыў завочна гістарычны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. Працаваў у газеце «Звязда» загадчыкам аддзела, адказным сакратаром рэдакцыі (1951—1956). У 1960 г. скончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС (Масква). У 1960—1961 гг.— рэдактар аддзела культуры і быту «Экономической газеты», у 1961—1969 гг.— галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», у 1969—1972 гг. рэдактар газеты «Правда» па аддзелу прэсы, крытыкі і бібліяграфіі. З 1972 г.— першы намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Литературное обозрение», з 1974 г.— намеснік дырэктара Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, з 1976 г.— рэктар Мінскага інстытута культуры. У 1979—1987 гг.— галоўны рэдактар кінастудыі «Беларусьфільм». У 1975 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1958 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Заслужаны работнік культуры БССР (1974).

З артыкуламі выступае ў друку з 1948 г. Аўтар кніг «На шырокіх шляхах жыцця» (1965), «На эпическом направлении» (Масква, 1969).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1966) за кнігу крытычных артыкулаў «На шырокіх шляхах жыцця».

## *Генадзь ПАШКОЎ*



Генадзь Пятровіч Пашкоў нарадзіўся 23.3.1948 г. у вёсцы Ліпавічы Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачых.

У 1971 г. скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў рэдактарам на Беларускім радыё. З 1972 г. у часопісе «Полымя» — загадчык рэдакцыі, адказны сакратар, з 1979 г.— намеснік галоўнага рэдактара. З 1989 г. працуе кансультантам гуманітарнага аддзела ў апараце ЦК КПБ. Член СП СССР з 1977 г.

У друку выступае з 1967 г. Выдаў зборнікі паэзіі «Кляновік» (1975), «Дыстанцыя небяспекі» (1979), «Гравюры дарог» (1981), «Зямлю слухаю» (1983), «Маналог на кастрышчы» (1986), «Крокі» (1988), «Люблю, спадзяюся, жыву» (1990). Выйшаў зборнік паэзіі для дзяцей «Дзяўчынка з блакітным мячыкам» (1986), кніга нарысаў «Будзень як свята» (1977).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1980) за паэтычныя зборнікі «Красный жаворонок» (Масква, 1977), «Дыстанцыя небяспекі».

## *Навум ПЕРКІН*



Навум Саламонавіч Перкін нарадзіўся 15.2.1912 г. у гарадскім пасёлку Тураве Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і саматужніка.

У 1928 г. паступіў у Гомельскі педагагічны тэхнікум, у 1929—1931 гг. настаўнічаў у пачатковых школах на Гомельшчыне. Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1936) і аспірантуру пры гэтым інстытуце (1941). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны — з 1941 г. на фронце, з 1942 г. у партызанах на Браншчыне, з 1944 г. зноў на фронце. Быў двойчы паранены. З 1946 г.— навуковы супрацоўнік, у 1963—1976 гг.— загадчык сектара ўзаемасувязей літаратур Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 2.10.1976 г.

У друку з літаратурна-крытычнымі артыкуламі, рэцэнзіямі пачаў выступаць з 1946 г. Пісаў на рускай і беларускай мовах. Выйшлі працы «Аркадзь Куляшоў: Паэтычная творчасць» (1951), «Творчасць Петруся Броўкі» (1952), «Шляхі развіцця беларускай савецкай літаратуры 20—30-х гадоў: Праблемы сацыялістычнага рэалізму» (1960), «В семье братских литератур» (1967), «Нацыянальнае і інтэрнацыянальнае ў літаратуры» (1971), «Человек в советском романе» (1975), брашура «Пятро Глебка» (1955), зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Абсягі думкі» (1979). Апублікаваны аўтабіяграфічныя мастацкія творы «Мальчик из местечка» (1981) і «Я стал партизаном» (1982).

Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964), «Истории советской многонациональной литературы» (1970—1971), сааўтар дакладаў да III Міжнароднага з'езда славістаў «Асноўныя асаблівасці развіцця сучаснай беларускай літаратуры» (з В. Івашыным, 1958) і да V — «Беларускапольскія ўзаемасувязі ў XIX ст.» (з А. Лойкам, 1969), а таксама падручніка «Беларуская савецкая літаратура» для 9—10 класаў (з Ю. Пшырковым, 1959—1973).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні «История белорусской дооктябрьской литературы» і «История белорусской советской литературы».

---

## *Пілін* ПЕСТРАК



Пілін Сямёнавіч Пестрак нарадзіўся 27.11.1903 г. у вёсцы Сакоўцы Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў двухкласным вучылішчы. У 1914 г. разам з бацькамі эвакуіраваўся ў сяло Максімаўка Бузулукскага павета Самарскай губерні. Працаваў памочнікам справавода крэдытнага таварыства, вучыўся ў гімназіі. У 1919 г.— памочнік бухгалтара ў валасным выканкоме. Пасля вучобы на рабфаку ў 1920 г. паступіў на гістарычны

факультэт Самарскага універсітэта. Увосень 1921 г. разам з бацькамі вярнуўся на радзіму. Працаваў рабочым на лесапільні, лесніком. Служыў у польскім войску (1924—1926). У 1926 г. уступіў у члены КПЗБ і стаў членам павятовага камітэта Беларускай сялянска-рабочай грамады ў мястэчку Косава. З 1927 г.— сакратар Косаўскага падпольнага райкома, член Слонімскага акругкома КПЗБ, у 1933—1934 гг.— інструктар ЦК КПЗБ. Амаль 11 гадоў сядзеў у турмах буржуазнай Польшчы, вызвалены Савецкай Арміяй у верасні 1939 г. з гродзенскай турмы. Працаваў сакратаром Гродзенскага гаркома (1939—1940). Быў абраны дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі ў Беластоку (1939), членам паўнамоцнай камісіі на сесіі Вярхоўнага Савета СССР (1939). У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху. Працаваў начальнікам Упраўлення па справах мастацтваў пры Саўнаркоме БССР (1943—1945), навуковым супрацоўнікам Інстытута мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР (1945—1947), літкансультантам СП БССР (1948—1951). Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР (1940—1946), а таксама дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1971—1975). Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Дружбы народаў, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1968).

Памёр 22.8.1978 г.

Творчую працу пачаў з вершаў у гады падпольнай рэвалюцыйнай дзейнасці ў Заходняй Беларусі. У друку выступіў у 1927 г. пад псеўданімам Звястун. Першы зборнік вершаў «На варце» надрукаваў у 1940 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «За сваю Айчыну» (1946), «Падарожнае» (1962), паэма «Слова пра Мінск» (1968).

У пасляваенныя гады выступаў пераважна ў галіне прозы. Выдадзены зборнікі апавяданняў «Першыя ўсходы» (1951), «Неспадзяванак» (1957), «Лясная песня» (апавяданні і нарысы, 1958), апавяданне «Камень» (1960), «Сярод чаротаў» (1964), «Апавяданні» (1970), раманы «Сустрэнемся на барыкадах» (1954), «Серадзібор» (1963). У 1947 г. выйшлі Выбраныя творы,

у 1969—1971 гг.— Збор твораў у 4-х, у 1984—1986 гг.— у 5 тамах.

Перакладаў творы польскіх, украінскіх, латышскіх, літоўскіх пісьменнікаў.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1964) за раман «Серадзібор».

---

## *Алесь ПЕТРАШКЕВІЧ*



Алесь (Аляксандр Лявонцьевіч) Петрашкевіч нарадзіўся 1.5.1930 г. у вёсцы Пярэвалачня Талачынскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1955 г. скончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1954—1961 гг. працаваў у ЦК ЛКСМБ інструктарам, кіраўніком лектарскай групы, намеснікам загадчыка аддзела. З 1961 г.— інструктар, у 1963—1967 гг.— загадчык сектара ў аддзеле культуры ЦК КПБ. У 1967—1975 гг.— адказны сакратар, а затым намеснік галоўнага рэдактара Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, у 1975—1976 гг.— рэктар Мінскага інстытута культуры. У 1976—1979 гг.— загадчык аддзела культуры ЦК КПБ, з 1979 г.— намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя». Кандыдат гістарычных навук. Член СП СССР з 1974 г.

Заслужаны работнік культуры БССР (1975).

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1955 г. з фельетонаў, нарысаў, памфлетаў. Аўтар аднаактоўкі «Кары егіпецкія» (1966), п'ес «Адкуль грэх?» (1970, пастаўлена ў 1969), «Трывога» (надрукавана і пастаўлена ў 1974), «Злыдзень» (1979, пастаўлена ў 1973), «Укралі кодэкс» (надрукавана і пастаўлена ў 1976), «Напісанае застаецца» (1978, пастаўлена ў 1979, асобнае выданне ў 1982), «Соль» (надрукавана і пастаўлена ў 1981), «Русь Кіеўская» («Гора і слава», 1983, пастаўлена ў 1982), «Змова» (1986, пастаўлена ў 1983), «Злавеснае рэха» (надрукавана і пастаўлена ў 1984), «У спадчыну — жыццё»

(1986, пастаўлена ў 1985), «Мой друг, Вялікі Чалавек» (пастаўлена ў 1986), «Куды ноч, туды сон» («Ка-та-стро-фа», 1987, пастаўлена ў 1988), «Мост упоперак ракі» (1986), «Прарок для Айчыны» (1990). Выйшлі зборнікі «П'есы» (1976), «У спадчыну — жыццё» (1986), «П'есы» (1988). Напісаў лібрэта оперы «Новая зямля» паводле аднайменнай паэмы Я. Коласа (пастаўлена ў 1982).

Яму належаць сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Уваскрэсная ноч» (пастаўлены ў 1977) і «Нас выбраў час» (з У. Халіпам, пастаўлены ў 1976—1978), а таксама сцэнарыі навукова-папулярнага фільма «Францыск, сын Скарынін» і дакументальнага фільма «Уздоўж і ўпоперак Дняпра» (пастаўлены ў 1990). Напісаў сцэнарыі да радыёспектакляў «Новая зямля» (пастаўлены ў 1976), «Злавеснае рэха» (пастаўлены ў 1984), «У спадчыну — жыццё» (пастаўлены ў 1986), «Надзвычай цяжкая пасада» (пастаўлены ў 1986).

Аўтар шэрагу апавяданняў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за ўдзел у стварэнні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

---

## *Васіль ПЕТРУЧУК*



Васіль Уладзіміравіч Петручук нарадзіўся 23.8.1926 г. у вёсцы Грабавец Бельска-Падляшскага павета Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сялянскай сям'і.

У 1943—1944 гг. рабіў парабкам у вёсцы Елянка. Пасля Перамогі служыў у Корпусе ўнутранай бяспекі, ваяваў, быў паранены. Займаўся на курсах разведчыкаў (Вроцлаў, 1950—1951). Працаваў у Варшаве (1951—1960). Вучыўся ў школе контрразведкі (Легіянова, 1960—1961). Зной працаваў у Варшаве. Скончыў эканамічны тэхнікум (1961). У 1962 г. пераведзены ў Беласток. У 1969 г. выйшаў у адстаўку. Член беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа». Кандыдат у члены Саюза польскіх літаратараў з 1987 г.

Узнагароджаны польскімі ордэнамі Кавалерскі крыж ордэна Адраджэння Польшчы, За-

латым Крыжам заслугі, Крыжам партызанскім, Сярэбраным Крыжам заслугі, медалямі, савецкім ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1988).

У польскім друку выступае з 1961 г. Першае апавядане на беларускай мове надрукаваў у 1975 г. (газета «Ніва»). Аўтар аповесці «Пожня» (Беласток, 1987).

---

## *Зяма ПІВАВАРАЎ*



Зяма Раманавіч (Залман Рувімавіч) Піваварaў нарадзіўся 5.6.1910 г. у горадзе Касцюковічы Магілёўскай вобласці ў сям'і рабочага.

Вучыўся ў Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме. У 1929 г. пераехаў у Ленінград, дзе працаваў качагарам. Быў членам БелАПП. Скончыў літаратурны факультэт Беларускага вышэйшага педагагічнага інстытута (1934). Працаваў у газеце «Чырвоная змена» (1934—1936). У 1936 г. рэпрэсіраваны і ў 1937 г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 8.3. 1958 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Першы верш апублікаваў у 1925 г. На пачатку 30-х гадоў друкаваўся ў ленінградскіх часопісах і беларускіх альманахах. Аўтар зборніка вершаў «Лірыка двух нараджэнняў» (1934). Выступаў у рэспубліканскім друку як тэатральны рэцэнзент.

---

## *Алесь ПІСЬМЯНКОЎ*



Алесь (Аляксандр Уладзіміравіч) Пісьмянкоў нарадзіўся 25.2.1957 г. у в. Бялынавічы Касцюковіцкага р-на Магілёўскай вобл. у рабочай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1974) працаваў у касцюковіцкай раённай газеце «Сцяг камунізму». Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1980). Працаваў у аддзеле крытыкі і бібліяграфіі штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», рэдактарам аддзела навукі і мастацтва часопіса «Полымя». У 1990 г. абраны намеснікам

старшыні СП Беларусі. Член СП СССР з 1984 г.

Першы верш апублікаваў у 1972 г. (касцюковіцкая раённая газета «Сцяг камунізму»).

Аўтар кніг паэзіі «Белы Камень» (1983), «Чытаю зоры» (1988).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1988) за кнігу лірыкі «Чытаю зоры».

---

## *Міхайла ПІЯТУХОВІЧ*



Міхайла (Міхаіл Мікалаевіч) Піятуховіч нарадзіўся 23.2.1891 г. у вёсцы Алексінічы Сенненскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і святара.

Скончыў Нежынскі гісторыка-філалагічны інстытут (1917). Затым быў прыкамандзіраваны да Петраградскага універсітэта для падрыхтоўкі да прафесарскага звання па кафедры рускай мовы і славеснасці. У 1920—1921 гг. жыў у Адэсе. З 1921 г.— выкладчык і сакратар Беларускага педагагічнага тэхнікума, член Беларускай навукова-тэрміналагічнай камісіі, з 1922 г.— выкладчык беларускай літаратуры, з 1926 г.— прафесар кафедры гісторыі беларускай літаратуры Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Правадзейны член Інстытута беларускай культуры. У 1934—1938 гг. працаваў у педагагічных інстытутах Паўночнага Каўказа. У студзені 1937 г. арыштаваны, прывезены ў Мінск і рашэннем калегіі Вярхоўнага суда СССР ад 19.12.1937 г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 27.12.1957 г.

Расстраляны 12.12.1937 г.

У беларускім друку выступіў у 1921 г. Аўтар навуковых прац і артыкулаў пра літаратурную дзейнасць Ф. Скарыны, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, Ядвігіна Ш., Ц. Гартнага, З. Бядулі, М. Чарота, М. Лынькова, П. Труса, змешчаных у зборніках і перыядычным друку. У 1928 г. выдаў «Нарысы гісторыі беларускай літаратуры: Агляд літаратурна-ідэалагічных плыняў XIX і пачатку XX вякоў» (ч. I). Рэдактар-укладальнік першай гісторыка-літаратурнай хрэстаматыі «Выпісы з беларускае літаратуры. Новы і найноўшы кругабегі» (1923).

## *Ісак ПЛАТНЕР*



Ісак (Айзік Хаімавіч) Платнер нарадзіўся 17.11.1895 г. у горадзе Сакалоў-Падляшскі Седлецкай губерні (цяпер Польшча) у сям'і краўца.

З малых год працаваў па найме ў кравецкіх майстэрнях. У 1922 г. выехаў у ЗША — настаўнічаў у школах пры Інтэрнацыянальным рабочым ордэне, супрацоўнічаў у камуністычнай газеце «Морген-фрайхайт» («Вольная раніца»). У 1932 г. прыехаў у СССР. З 1933 г. жыў у Мінску — працаваў у Беларускім радыёкамітэце, у рэдакцыі яўрэйскай газеты «Акцябэр» («Кастрычнік»), у часопісе «Штэрн» («Зорка»). У Вялікую Айчынную вайну працаваў на радыё ў Саранску (Мардовія) і Яраслаўлі. У 1944 г. вярнуўся ў Мінск. У 1949 г. рэпрэсіраваны. 22.4.1950 г. асуджаны на 25 год зняволення. Рэабілітаваны ў 1956. Жыў у Мінску.

Памёр 20.7.1961 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1918 г. у прагрэсіўным яўрэйскім друку ў Польшчы. Пісаў на мове ідыш. Першы зборнік паэзіі «Пра што расказвае дзень» выдаў у Нью-Йорку (1930). Выйшлі зборнікі вершаў «З Амерыкі» (1934), «Паэма аб краўцах» (1935), «Сонца на парозе» (1940), паэмы «Песня маці» (1940), «З любоўю і верай» (Масква, 1947), кніга паэзіі «Соль жизни» (Масква, 1961), зборнік навел «Самае дарагое» (1948). Для дзяцей напісаў кніжкі вершаў «Пра дзве краіны» (1933) і апавяданняў «Сярод дзяцей» (1938).

У перакладзе на беларускую мову выйшлі зборнікі паэзіі «Сваёй краіне» (вершы, 1947), «Соль жыцця» (вершы, 1957), «Дар сэрца» (вершы, 1962), «Песні пра хлеб» (вершы і паэмы, 1986), кніжкі вершаў і апавяданняў для дзяцей «Мой агарод» (1958), «Палаючае сэрца» (1960), «Вясёлая іголка» (1961), «Магазін цацак» (1963), «Хто што робіць» (1970).

Перакладаў з англійскай і нямецкай моў на беларускую. Асобным выданнем у яго перакладзе выйшлі «Казкі братоў Грым» (1939).

## *Мікола* ПРАКАПОВІЧ



Мікола (Мікалай Мікалаевіч) Пракаповіч нарадзіўся 1.11.1948 г. у вёсцы Пугачова (з 1979 г. у межах Брэста) у сям'і рабочага.

У 1970 г. скончыў беларускае аддзяленне факультэта мовы і літаратуры Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна. Настаўнічаў у Асабовіцкай васьмігадовай школе Пінскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1971—1972). З 1972 г.— рэдактар Брэсцкага абласнога радыё, затым загадчык рэдакцыі літаратурна-мастацкіх і музычных перадач Брэсцкай студыі тэлебачання, адначасова (у 1984—1990) сакратар Брэсцкага абласнога аддзялення СП БССР. Член СП СССР з 1981 г.

Першы верш апублікаваў у 1966 г. (брэсцкая абласная газета «Заря»). Аўтар кніг паэзіі «Белая вежа» (у калектыўным зборніку «Нашчадкі», 1979), «Неад'емнае» (вершы і паэма, 1982), «На кругі свае» (вершы і паэма, 1986).

## *Паўлюк* ПРАНУЗА



Паўлюк (Павел Кузьміч) Прануза нарадзіўся 18.3.1918 г. у вёсцы Вылева Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і рабочага.

У 1941 г. скончыў філалагічны факультэт Гомельскага педагагічнага інстытута імя В. Чкалава. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у зенітнай артылерыі, прымаў удзел у баях на Бранскім, Цэнтральным і 1-м Беларускіх франтах. У 1945 г. дэмабілізаваўся, выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Нясвіжскім педагагічным вучылішчы імя Я. Коласа, у сярэдняй школе № 3 Нясвіжа. З 1982 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Славы III ступені і медалямі.

Першыя вершы надрукаваў у 1936 г. У час Вялікай Айчыннай вайны вершы друкаваліся ў газетах «Савецкая Беларусь» (Масква), «За свабодную Беларусь» (Калінінскі фронт), у газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну», у франтавых і армейскіх газетах. Аўтар зборнікаў

вершаў «Разгневаная зямля» (1946), «Добрай раніцы» (1951), «У дальнім раёне» (1954), «Мае землякі» (1957), «Калі верыш» (1963), «Родныя мясціны» (выбранае, 1968), «Непаўторнасць» (1974), «Трываласць» (выбранае, 1978), «Сустрэчы» (1983), «Мой аўтограф» (1988), «Рукі салдата» (1990). Напісаў зборнікі вершаў для дзяцей «Добры дожджык» (1960), «Я вясну малюю» (1962), «Дзе вясны пачатак» (1965), «Ручаёк» (1969), «Вясновыя тэлеграмы» (1976), «Фарбы восені» (1982), «Звініць ручаёк» (1988).

Склаў зборнік вершаў і ўспамінаў пра М. Сурначова «Акопны спеў» (1986). Перакладае з рускай, украінскай і польскай моў.

---

## *Леанід ПРАНЧАК*



Леанід Іванавіч Пранчак нарадзіўся 12.11.1958 г. у вёсцы Пранчакі Ляхавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1981). Пасля заканчэння універсітэта — малодшы рэдактар Магілёўскага абласнога радыё. З 1983 г.— у Рэспубліканскім штабе студэнцкіх атрадаў. Член СП СССР з 1989 г.

Першы верш апублікаваў у 1973 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар кніг вершаў «Ясак любові» (калектыўны зборнік «Лагодны прамень раніцы», 1988), «Першапутак» (1988). Перакладае з польскай, рускай і ўкраінскай моў.

---

## *Васіль ПРАСКУРАЎ*



Васіль Фёдаравіч Праскураў нарадзіўся 25.8. 1926 г. у вёсцы Негаціна Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны скончыў Сваташыцкую няпоўную сярэднюю школу. У 1945 г. прызваны ў Савецкую Армію. Да 1950 г. служыў карэспандэнтам армейскай газеты «За честь Родины» ў Аўстрыі, Венгрыі і Германіі. У 1950—1958 гг.— старшыня Ганцавіцкага райспажыўсаюза, экстэрнам скончыў

Брэсцкую гандлёва-кааператыўную школу. У 1963 г. завочна скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1958—1962 гг.— супрацоўнік ганцавіцкай раённай газеты «Савецкае Палессе», у 1962—1966 гг. працаваў у ляхавіцкай раённай газеце «Будаўнік камунізму», з 1966 г.— рэдактар газеты «Савецкае Палессе». Член СП СССР з 1987 г.

Узнагароджаны медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1968).

Памёр 22.5.1987 г.

Першы літаратурна-крытычны артыкул апублікаваў у 1950 г. Аўтар кніг публіцыстыкі «Святая сівізна» (1966), «Трое з-за Лані» (1967), «Людзі-суседзі» (1974), «Пакажы чалавеку дарогу» (1979), «Пакланіся зямлі-карміцельцы» (1982), «Чорны хлеб» (1984).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя П. М. Лепяшынскага (1986) за кнігу «Пакланіся зямлі-карміцельцы».

---

## *Леанід ПРОКША*



Леанід Януаравіч Прокша нарадзіўся 19.4.1912 г. у горадзе Полацку ў сям'і рабочага.

Скончыў Мінскі педагагічны тэхнікум (1931). Працаваў загадчыкам Кустаўніцкай пачатковай школы Мазырскага раёна (1931—1934), выкладаў беларускую мову і літаратуру ў сямігодцы і на рабфаку ў Барысаве. Служыў у Чырвонай Арміі (1935—1937). Быў літработнікам у газеце «Віцебскі рабочы» (1937—1940), у польскай газеце «Штандар вольнасці» (Мінск, 1940—1941), рэдактарам польскай рэспубліканскай дзіцячай газеты «Піянер» (1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны — ваенны журналіст. Скончыў Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна (1955). У 1956—1958 гг.— загадчык аддзела часопіса «Коммунист Белоруссии», у 1958—1969 гг.— рэдактар газеты «За вяртанне на Радзіму» (з 1960 «Голас Радзімы»), у 1969—1972 гг.— галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і двума — II ступеняў, Чырвонай Зоркі, медалямі і польскім Залатым крыжам заслугі.

Выступае ў друку з 1937 г. (газета «Віцебскі пралетары»). Піша на беларускай і рускіх мовах. Аўтар зборніка апавяданняў і нарысаў «Источник красоты» (1960), кніжак гумарыстычных апавяданняў, памфлетаў «Каб жылося-вялося» (1961), «Камедыянты» (1961), «Кантроль сумлення» (1963), «Праз туманы» (1964), «След вядзе за мяжу» (1965), «Інтрыгі прэзідэнцкага двара» (1967), «Не ў тым поездзе» (1971), «Самадзейнасць у ліфце» (1972), «Зося смяецца» (1982), «Призраки и президенты» (1988), аповесцей «Ці варта было жаніцца» (1968), «За Добрыцай-рэчкай» (1975), нарыса «Герои Олерона» (з В. Андрэевым і У. Сасінскім, 1965), кніг публіцыстыкі «По обе стороны океана» (1968), «Туман развеецца» (1970), «Візітная картка народа» (1972), раманаў «Пакуль жывеш на свеце» (1980), «Туника Несса» (1986). «Урокі любові і нянавісці» (1990). Выйшлі аповесці для дзяцей «Мальчик в больших башмаках» (1963), «Незвычайныя прыгоды хлопчыка Бульбінкі» (1973), «Стрэлы над ярам» (1974, дапоўненае выданне 1979).

---

## *Алесь ПРУДНІКАЎ*



Алесь (Аляксандр Трафімавіч) Пруднікаў нарадзіўся 14.4.1910 г. у вёсцы Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1930 г. працаваў на будаўніцтве чыгункі Асіповічы — Магілёў — Рослаў, потым — на новабудоўлях Мінска, з 1931 г.— на рэспубліканскай кніжнай базе, у Дзяржаўным выдавецтве Беларусі, у БелТА. Вучыўся на творчым аддзяленні Мінскага педагагічнага інстытута (1932—1933). У сакавіку 1933 г. быў рэпрэсіраваны, але праз восем месяцаў вызвалены з турмы і адразу ж прызваны ў рады Чырвонай Арміі, дзе праслужыў да 1935 г. У 1935—1936 гг. быў супрацоўнікам клімавіцкай раённай газеты «Камуна». Скончыў Ленінградскі настаўніцкі інстытут (1938). Працаваў настаўнікам,

інспектарам Пятроўскага (цяпер Кандапожскага) рана Карэльскай АССР, адначасова вучыўся завочна на філалагічным факультэце Карэльскага універсітэта. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце, разведчык.

Загінуў 5.8.1941 г. каля вёскі Утукі Кандапожскага раёна Карэльскай АССР у час выканання баявога задання.

Першыя вершы з'явіліся ў друку ў 1930 г. У 1932 г. асобным выданнем выйшла паэма «Зямныя зоры». Падборка вершаў змешчана ў зборніку «Крывёю сэрца» (1967).

---

## *Павел* ***ПРУДНІКАЎ***



Павел Іванавіч Пруднікаў нарадзіўся 14.7.1911 г. у вёсцы Стары Дзедзін Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Працоўны шлях пачаў у 1930 г. шахцёрам-металургам у Данбасе. Працаваў на будаўніцтве чыгункі Асіповічы — Магілёў — Крычаў — Рослаў, а таксама на Магілёўскай шаўковай фабрыцы, на рэспубліканскай кніжнай базе ў Мінску, грузчыкам на чыгуначнай станцыі Мінск — Таварная, супрацоўнікам рэспубліканскага перыядычнага друку, БелТА, Беларускага радыё і клімавіцкай раённай газеты «Камуна». У 1937 г. скончыў Ленінградскі педагагічны інстытут імя Бубнава (Пакроўскага), а 11.8.1937 г. быў рэпрэсіраваны і пасля 4-х месяцаў зняволення ў ленінградскіх «Крыжах» («Крестах») доўгія гады працаваў у якасці зняволенага на будаўніцтве чыгунак у Бурацкай АССР і Іркуцкай вобласці, на будаўніцтве шыннага завода ў Омску і горна-металургічнага камбіната ў Нарыльску, грузчыкам у рачным порце Енісейска (Краснаярскі край). Пасля вызвалення (1945) працаваў токарам вагоннага дэпо Нарыльскай чыгункі, потым загадчыкам бібліятэкі Нарыльскага горна-металургічнага тэхнікума, настаўнічаў у сярэдніх школах Смаленшчыны (г. Рослаў, Рослаўскі і Ершацкі раёны, 1946—1952). Нейкі час выкладаў мову і літаратуру ў Ашмянскім педвучылішчы. З 1952 па 1968 гг.— выкладчык мовы, літаратуры і гісторыі Слабодскай сярэдняй школы Бра-

слаўскага раёна Віцебскай вобласці. У 1968—1971 гг.— старшы рэдактар часопіса «Служба быту Беларусі». Рэабілітаваны ў 1956 г.

Узнагароджаны медалём.

Першыя вершы ў рэспубліканскім друку апублікаваў у 1930 г. (газета «Піянер Беларусі»). У 1932 г. выйшла першая кніжка вершаў «Песні грузчыкаў») пад псеўданімам Паўлюк Буравей, (з Я. Субачам). Выдадзены зборнікі паэзіі «Час майго нараджэння» (1968), «Прысады» (1979), «Мая магістраль» (выбранае, 1981), «Заасцёр'е» (вершы, паэма, 1986), «Познія ягады» (вершы, паэма, 1990). У 1987 г. выйшла кніжка вершаў для дзяцей «Заранка», у 1988 г.— кніга ўспамінаў пра пісьменнікаў «Далёкае, але не забытае».

Аўтар паэмы «Таймыр» (часопіс «Полымя», 1988) і аўтабіяграфічнай аповесці «Яжовыя рукавіцы» (часопіс «Полымя», 1989), а таксама нарысаў, публіцыстычных артыкулаў.

---

## *Зіновій* ПРЫГОДЗІЧ



Зіновій Кірылавіч Прыгодзіч нарадзіўся 15.10. 1944 г. у вёсцы Лышча Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Лышчанскай сярэдняй школы (1960) працаваў у лагішынскай раённай газеце «Калгасная праўда», а затым карэспандэнтам-арганізатарам мясцовага радыёвяшчання. У 1967 г. скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Быў літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела рэспубліканскай газеты «Звязда». З 1977 г.— інструктар аддзела культуры, у 1978—1981 гг.— памочнік сакратара ЦК КПБ. Скончыў аспірантуру Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1984). З 1984 г.— загадчык кафедры журналістыкі, моў і літаратуры Мінскай вышэйшай партыйнай школы, з 1989 г.— намеснік загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ, з 1990 г.— галоўны рэдактар газеты «Советская Белоруссия». Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1986 г.

Узнагароджаны медалём.

З першым апавяданнем выступіў у 1963 г.

(пінская раённая газета «Палеская праўда»). Аўтар кніг «На палях рэспублікі» (публіцыстыка, 1968), «Добры дзень, сад!» (нарыс, 1974), «На сельских просторах» (публіцыстыка, 1976), «Строгая доброта» (дакументальная аповесць, 1976), «Крылы дужэюць у палёце» (дакументальная аповесць, 1977), «Жменя зярнят» (нарысы, 1979), «Жуpавы на далёкай пойме» (аповесць, 1984), «Ноч перад нядзеляю» (аповесць, лірычныя замалёўкі, 1986).

---

## *Пятро* ПРЫХОДЗЬКА



Пятро (Пётр Фёдаравіч) Прыходзька нарадзіўся 25.2.1920 г. у вёсцы Альшоў Хоцімскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1936 г. працаваў кіраўніком спраў Хоцімскага райкома камсамола. Пасля заканчэння Магілёўскай газетнай партыйнай школы (1938) — адказны сакратар хоцімскай раённай газеты «Калгасная звязда». У 1939 г., пасля заканчэння Хоцімскай сярэдняй школы, паступіў у Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску. У 1940 г. прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на Бранскім фронце, на Курскай дузе, у вызваленні Беларусі, Польшчы, у баях за Берлін, за вызваленне Прагі. У пасляванны час (з 1947) працаваў у акруговай газеце «Во славу Родины» (Мінск), іншых ваенных газетах. У 1953 г. дэмабілізаваны. У 1956 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Працаваў у часопісе «Беларусь» (1953—1954), газетах «Звязда» (1956—1957), «Літаратура і мастацтва» (1957—1961), на мінскай студыі дакументальных фільмаў (1961—1966). У 1967—1971 гг.— рэдактар выдавецтва «Беларусь», у 1972—1979 гг.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Першы верш надрукаваў у 1936 г. (хоцімская раённая газета «Калгасная звязда»), у рэспубліканскім друку выступіў у 1937 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Голас

сэрца» (1947), «Салдаты міру» (1951), «Ранак над Эльбай» (1952), «Пасля развітання» (1958), «Цёплы каравай» (1960), «Вішнёвы агонь» (1963), «Сонца раней узышло» (вершы і паэмы, 1967), «Калінавыя зоры» (вершы і паэма, 1969), «Прызнанне: Выбранае» (1970), «Не здадзеныя вышыні» (вершы і паэма, 1972), «На пераправе» (вершы і паэмы, 1974), «Лірыка» (1975), «Плацдарм» (вершы і паэма, 1978), «Лісты з паходаў» (выбранае, 1980), «Вячэрняя паверка» (вершы, балады, паэмы, 1982), «Парог памяці» (вершы, балады, паэмы, 1983), «Апаленыя вёрсты» (вершы, балада, паэма, 1986), «Водгулле грому» (1989), «Споведзь любові» (выбранае, 1990) і кнігі нарысаў «На новых землях» (з П. Багаценкавым, 1954). Для дзяцей выдаў зборнік вершаў «Сустрэча з маленствам» (1967), «Каляка-маляка» (1981), «Сцяблінка» (1986), паэму «Сын камунара» (1973).

Перакладае творы паэтаў народаў СССР.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя А. Куляшова (1985) за зборнік «Парог памяці».

---

## *Іван* ПТАШНІКАЎ



Іван Мікалаевіч Пташнікаў нарадзіўся 7.10. 1932 г. у вёсцы Задроздзе Лагойскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Крайскую сямігодку, Плешчаніцкую беларускую сярэднюю школу (1951). Працаваў у рэдакцыі плешчаніцкай раённай газеты «Ленінец», настаўнікам Лонваўскай пачатковай школы. У 1957 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Рэдактар мастацкай літаратуры ў Дзяржаўным выдавецтве БССР (1957—1958), рэдактар аддзела прозы часопіса «Маладосць» (1958—1962), з 1962 г.— рэдактар аддзела прозы часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1959 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалём.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1984).

Выступіў у друку з вершамі ў 1952 г. Першы

празаічны твор — аповесць «Чачык» апублікаваў у 1957 г. (часопіс «Полымя»). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Зерне падае не на камень» (1959) і «Сцяпан Жыхар са Сцешыц» (1966), аповесцей «Лонва» (1965, 1982), «Тартак» (1968, паводле сцэнарыя аўтара пастаўлены ў 1973 г. аднайменны тэлефільм), «Найдорф» (1976), раманаў «Чакай у далёкіх Грынях» (1962), «Мсціжы» (1972), «Алімпіяда» (1985, пастаўлены аднайменны тэлеспектакль, 1989). У 1980 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах, у 1990 г.— 1 і 2 тамы Збору твораў у 4 тамах.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1978) за аповесць «Найдорф».

---

## *Язэп ПУШЧА*



Язэп Пушча (Іосіф Паўлавіч Плашчынскі) нарадзіўся 20.5.1902 г. у вёсцы Каралішчавічы Мінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1920 г. скончыў Мінскае рэальнае вучылішча, працаваў у Каралішчавіцкай пачатковай школе. Пасля заканчэння (1922) дзевяцімесячных курсаў беларусазнаўства ў Мінску быў інспектарам Мазырскага, Мінскага ўездных аддзелаў народнай асветы, выкладаў беларускую мову і літаратуру на агульнаадукацыйных курсах, у музычным тэхнікуме ў Мінску. Адзін з заснавальнікаў літаратурных аб'яднанняў «Маладняк» і «Узвышша». У 1925—1927 гг. вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце, адкуль перавёўся ў Ленінградскі дзяржаўны універсітэт (скончыў чатыры курсы ў 1929). Быў стыльрэдактарам у Беларускім дзяржаўным выдавецтве. 25.7.1930 г. арыштаваны, прыгавораны 10.4. 1931 г. калегіяй АДПУ да 5 год высылкі. Прысуд адменены Вярхоўным судом БССР 30.1.1956 г. Працаваў бухгалтарам у Шчадрынску на Урале (1931—1935), у саўгасе «Джэмтэ» каля Анапы (1935—1936), завучам, дырэктарам Маначоўскай сярэдняй школы Мурамскага раёна. У гады вайны мабілізаваны ў армію. У 1941—1958 гг.— дырэктар Чаадаеўскай сярэдняй школы Мурамскага раёна Уладзімірскай вобласці (у 1942 г. быў курсантам 2-га Маскоўскага ваенна-палітыч-

нага вучылішча). З 1958 г. жыў у Мінску. Член СП СССР з 1958 г.

Памёр 14.9.1964 г.

Першыя вершы з'явіліся ў друку ў 1922 г. Выйшлі зборнікі вершаў «Раніца рыкае» (1925), «Vita» (1926), «Дні вясны» (1927), «Песні на руінах» (1929), паэма «Крывавы плакат» (1930), вершаваная казка «На Бабрыцы» (1960), «Вершы і паэмы» (1960), «Пачатак легенды» (1963), «Вершы і паэма» (1968), «Сады вятроў» (вершы і паэмы, 1982).

На беларускую мову пераклаў аповесць А. Талстога «Дзяцінства Мікіты» (1960).

---

## *Яўгенія ПФЛЯЎМБАЎМ*



Яўгенія Эргардаўна Пфляўмбаўм нарадзілася 1.11.1908 г. у горадзе Мінску ў сям'і чыгуначніка.

Скончыла літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1930). Працавала бібліёграфам Кніжнай палаты пры Дзяржаўнай бібліятэцы БССР імя У. І. Леніна (1930—1932), літсупрацоўнікам рэспубліканскай газеты «Звязда». У 1933 г. выехала ў Сібір (у г. Марыінск) услед за сваім мужам, паэтам Максімам Лужаніным, які быў рэпрэсіраваны. У 1935—1945 гг. працавала рэдактарам Абароннага дзяржаўнага выдавецтва («Оборонгиз») у Маскве. У час Вялікай Айчыннай вайны была байцом супрацьпаветранай абароны Масквы. З 1945 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1989 г.

Піша вершы і друкуецца з 1924 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «Вершы» (з З. Бандарынай і Н. Вішнеўскай, 1926), «Сувой жыцця« (1989).

## *Юльян* ПШЫРКОЎ



Юльян Сяргеевіч Пшыркоў нарадзіўся 31.10. 1912 г. у сяле Кісцяні Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў двухгадовыя педагагічныя курсы ў Рагачове (1930). Настаўнічаў у Клічаўскім і Рагачоўскім раёнах. У 1939 г. скончыў філалагічны факультэт Ленінградскага дзяржаўнага універсітэта. Працаваў выкладчыкам у Магілёўскім педагагічным інстытуце (1939—1940). З 1940 г.— у Савецкай Арміі. Удзельнічаў у баях пад Ленінградам і Кёнігсбергам. Быў тройчы паранены. З 1945 г. навуковы супрацоўнік, з 1954 г.— загадчык сектара беларускай дакастрычніцкай літаратуры і тэксталогіі Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Адначасова чытаў курс беларускай літаратуры ў БДУ імя У. І. Леніна (1945—1957) і ў Мінскім педінстытуце імя М. Горкага (1966—1968). Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1950 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч навукі Беларускай ССР (1978).

Памёр 23.12.1980 г.

У 1940 г. выступіў у друку з артыкуламі пра «Новую зямлю» Я. Коласа і дарэвалюцыйныя паэмы Я. Купалы. Аўтар даследаванняў «Якуб Колас: Жыццё і творчасць» (1951), «Трылогія Якуба Коласа «На ростанях» (1956), «Беларуская савецкая проза (20-я — пачатак 30-х гадоў)» (1960), «А. Е. Богданович» (1966), «Эпас рэвалюцыі: Паэмы Я. Коласа «Новая зямля» і «Сымон-музыка» (1975), «Летапісец свайго народа: Жыццёвы і творчы шлях Я. Коласа» (1982), брашур «Народны паэт БССР Якуб Колас» (1949), «Уплыў творчасці А. С. Пушкіна на развіццё беларускай літаратуры» (1949). Адзін з аўтараў дапаможнікаў для 8—10 класаў і падручніка (з Н. С. Перкіным) «Беларуская савецкая літаратура» для 9—10 класаў (1959—1973), «Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. 1—2, 1968—1969), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» (1977).

Складальнік альбома «Якуб Колас: Жыццё і

творчасць» (1959), зборніка «Тарас Шаўчэнка і беларусы» (з І. Крэнь, 1964).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні «История белорусской дооктябрьской литературы» і «История белорусской советской литературы».

---

## *Аляксей* ПЫСІН



Аляксей Васільевіч Пысін нарадзіўся 22.3.1920 г. у вёсцы Высокі Борак Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1938 г. паступіў у Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску. З другога курса быў накіраваны на працу ў рэдакцыю Бельскай раённай газеты на Беласточчыну. У 1941—1945 гг.— у Савецкай Арміі, удзельнічаў у баях на Заходнім, Калінінскім, Ленінградскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах. Быў двойчы паранены. З 1946 г. працаваў у раённым друку, у абласной газеце «Магілёўская праўда». Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы пры СП СССР у Маскве (1958). У 1974—1981 гг.— сакратар Магілёўскага абласнога аддзялення СП БССР. Член СП СССР з 1950 г.

Узнагароджаны медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1980).

Памёр 27.8.1981 г.

Першы верш апублікаваў у 1938 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар кніжак паэзіі «Наш дзень» (1951), «Сіні ранак» (1959), «Сонечная паводка» (1962), «Мае мерыдыяны» (1965), «Твае далоні» (1967), «Пойма» (выбранае, 1968), «Да людзей ідучы» (1972), «Вярбовы мост» (1974), «Вершы» (1976), «Ёсць на свеце мой алень» (1978), «Палёт» (1982), «Яшчэ не скончана дарога» (1983). У 1980 і ў 1989 гг. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах. Для дзяцей выдаў зборнікі вершаў «Матылёчкі-матылі» (1962), «Вясёлка над плёсам» (1964), «Кавылёк» (1966), паэму «Дзяўчынка Марыям» (1970), кнігі вершаў і паэм «Колькі сонцаў!» (1979), «Аляксей, Дзяніс, Алёнка» (1984). Напісаў кнігу пра народныя песні і іх выканаўцаў «Бярозка ля кожных варот» (1972).

Пераклаў на беларускую мову «Маабіцкі сшытак» М. Джаліля (з С. Гаўрусёвым, 1975), зборнік вершаў М. Ханінава «Жураўлі над стэпам» (1977).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1968) за кнігу вершаў «Твае далоні».

---

## *Міхась* ПЯНКРАТ



Міхась (Міхаіл Міхайлавіч) Пянкрат нарадзіўся 28.8.1918 г. у вёсцы Карпілаўка Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Смілавіцкі паляводчы тэхнікум (1939). Удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гг., быў цяжка паранены. У 1940—1941 гг. працаваў у рэдакцыі рудзенскай раённай газеты «Бальшавіцкі сцяг». З 1943 г.— памочнік начальніка штаба партызанскай брыгады «Чырвоны сцяг» Мінскай вобласці. З 1945 г. працаваў у рэдакцыях рэспубліканскіх газет «Савецкі селянін», «Сталинская молодежь», у 1959—1979 гг.— рэдактар аддзела часопіса «Вожык». Член СП СССР з 1951 г.

Узнагароджаны медалямі.

Першы верш надрукаваў у 1937 г. (газета «Чырвоная змена»). Першая кніга — зборнік вершаў «Салаўіны бераг» (1956). Аўтар зборнікаў сатырычных апавяданняў і гумарэсак «Палын і кветкі» (1958), «Не з таго канца» (1959), «Аўтарытэт на колах» (1968), апавяданняў і аповесцей «Шчасце маё» (1962), «Ведрыцкія напевы» (1965), «Любоў у квадраце» (1969), «Прынцыповы пасаг» (апавяданні, вершы і гумарэскі, 1978), «Спатканні і ростані» (выбранае, 1978), «Не астудзі сваё сэрца» (1989). Напісаў кнігі нарысаў «Простыя людзі» (1957), «Чэрвень» (1977), кніжкі апавяданняў для дзяцей «Два Пецькі» (1973), «Двое ў лодцы» (1983).

*Аляксей* ***ПЯТКЕВІЧ***



Аляксей Міхайлавіч Пяткевіч нарадзіўся 30.3. 1931 г. у вёсцы Новы Свержань Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і рабочага.

У 1954 г. скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, у 1957 г.— аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры універсітэта. Працаваў у Гродзенскім педагагічным інстытуце імя Янкі Купалы (у 1968—1974 гг. загадчыкам кафедры, затым дацэнтам), з 1978 г.— дацэнт кафедры беларускай літаратуры, з 1990 г.— дацэнт кафедры беларускай культуры Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1971 г.

Узнагароджаны медалём.

Выступае ў галіне крытыкі і літаратуразнаўства з 1958 г. Артыкулы, гісторыка-літаратурныя і краязнаўчыя даследаванні, рэцэнзіі друкаваліся ў альманахах, навуковых зборніках, энцыклапедычных выданнях, перыядычным друку. Выдаў кнігу «Сюжэт. Кампазіцыя. Характар: Аб прозе Кузьмы Чорнага» (1981). Адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), «Гісторыі беларускай літаратуры. XIX — пачатак XX ст.» (1981).

# Р

*Валянцін* **РАБКЕВІЧ**



Валянцін Іванавіч Рабкевіч нарадзіўся 15.2. 1937 г. у вёсцы Аксаміты Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1960). Працаваў настаўнікам Іказненскай сярэдняй школы (1959—1960), завучам Барадзініцкай сярэдняй школы (1960—1963) Браслаўскага раёна, завучам Ракаўскай сярэдняй школы (1963—1965) Валожынскага раёна. Вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага (1965—1968). У 1968—1974 гг.— старшы рэдактар, загадчык рэдакцыі літаратуры, мовы, фальклору і этнаграфіі выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя». З 1974 г.— рэдактар, з 1975 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1983 г.

Першы верш апублікаваў у 1957 г. (часопіс «Работніца і сялянка»). Аўтар зборніка вершаў для дзяцей «Ад зімы да зімы» (1982), кніжкі прыказак і прымавак «Паслухай, што людзі кажуць» (1985). Выступае з артыкуламі па культуры беларускай мовы.

Пераклаў на беларускую мову «Апавяданні пра Леніна» М. Зошчанкі (1982), «Апавяданні» М. Чарамшыны (1982), раманы «Мары не паміраюць» Л. Метсара (1983), «Жанчына ў пяску» і «Чужы твар» Коба Абэ (1986), «Мама выходзіць замуж» М. Марцінсан (1988), «Птушкі на цернях» К. Маккалаў (з І. Дорскім, 1988), паэму «Тарас Бульба» М. Гогаля (1990), асобныя творы Г. Ахматавай, С. Ясеніна, М. Рыльскага, Д. Салодкага, Э. Селялёніса і інш.

*Вячаслаў* РАГОЙША



Вячаслаў Пятровіч Рагойша нарадзіўся 5.6.1942 г. у вёсцы Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1963 г. скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна і быў пакінуты ў аспірантуры на кафедры беларускай літаратуры. У 1965 г. служыў у Савецкай Арміі. Пасля заканчэння аспірантуры (1967) выкладаў беларускую літаратуру ў БДУ імя І. У. Леніна. З 1988 г.— дацэнт кафедры тэорыі і гісторыі культуры Інстытута паліталогіі і сацыяльнага кіравання. Член СП СССР з 1969 г. Кандыдат філалагічных навук.

Узнагароджаны медалём.

Першыя вершы і допісы апублікаваў у радашковіцкай раённай газеце «Сцяг Ільіча» ў 1957 г. З 1961 г. выступае ў рэспубліканскім друку з літаратуразнаўчымі і крытычнымі артыкуламі. Аўтар манаграфій, кніг артыкулаў і эсэ «Паэтыка Максіма Танка» (1968), «Пераклаў Якуб Колас...» (1972), «Карані дружбы: Беларуска-ўкраінскія літаратурныя ўзаемасувязі пачатку XX ст.» (з Т. Кабржыцкай, 1976), «І нясе яна дар...: Беларуская паэзія на рускай і ўкраінскай мовах» (1977), «Гутаркі пра верш: Метрыка. Рытміка. Фоніка» (1979), «Паэтычны слоўнік» (1979, 2-е выданне 1987), «Проблема перевода с близкородственных языков: Белорусско-русско-украинский поэтический взаимоперевод» (1980), «Напісана рукой Купалы: Архіўныя знаходкі» (1981), «Кантакты» (1982), «Слядамі знічкі: Пра Сяргея Палуяна» (з Т. Кабржыцкай, 1990).

Складальнік бібліяграфічнага даведніка «Праца кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна» (1968), вучэбнага дапаможніка для студэнтаў ВНУ «Хрэстаматыя беларускай літаратуры XX стагоддзя» (з С. Александровічам, А. Лойкам, 1971, 2-е выданне 1988, з А. Лойкам), кнігі Я. Купалы «А хто там ідзе?» на мовах свету (з Я. Раманоўскай, 1983), зборнікаў твораў С. Палуяна «Лісты ў будучыню» (з Т. Кабржыцкай, 1986), Старога Уласа «Год беларуса» (1990) і інш.

Пераклаў на беларускую мову аповесць М. Кацюбінскага «Цені забытых продкаў» (1980), раманы А. Ганчара «Твая зара» (1985), У. Яварыўскага «Марыя з палыном у канцы стагоддзя» (1990), творы Б. Алейніка, І. Драча, В. Сіменкі і інш.

---

## *Аляксей РАГУЛЯ*



Аляксей Уладзіміравіч Рагуля нарадзіўся 25.3. 1953 г. у вёсцы Сенна Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Любчанскай сярэдняй школы Навагрудскага раёна (1951) год загадваў хатай-чытальняй у роднай вёсцы. У 1957 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. З 1957 па 1962 гг. выкладаў рускую мову ў Халхоліцкай і Зачысцкай школах Барысаўскага раёна, з 1962 па 1970 гг. выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Рэспубліканскай школе спартыўнага профілю ў Мінску. З 1979 г.— асістэнт, выкладчык, з 1976 г.— дацэнт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1990 г.

Першы крытычны артыкул апублікаваў у 1970 г. Аўтар кнігі крытыкі «Імгненні...» (1990). Стварыў дапаможнік «Беларуская літаратура ў 4 класе» (1980), адзін са складальнікаў падручніка-хрэстаматыі для 8 класа «Родная літаратура» (з Л. Тамашовай, 1989), адзін з аўтараў «Методыкі выкладання беларускай літаратуры» для вышэйшых навучальных устаноў (1986). Напісаў раздзелы пра творчасць К. Чорнага, І. Мележа, В. Быкава для падручніка «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры» (1981—1983) для педагагічных інстытутаў. Прымаў удзел у выданні Збору твораў К. Чорнага ў 6 тамах (1988—1991).

*Уладзімір* **РАГУЦКІ**



Уладзімір Лаўрынавіч Рагуцкі нарадзіўся 9.12.1917 г. у вёсцы Цёплае Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў настаўніцкай сям'і.

Вучыўся ў школе ў вёсцы Старое Пашкава Магілёўскага раёна. Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1939). Працаваў у абласной газеце «Камунар Магілёўшчыны». У час Вялікай Айчыннай вайны — на фронце.

Загінуў у 1941 г.

Першы верш надрукаваў у 1934 г. (газета «Піянер Беларусі»). У 1940 г. Дзяржаўнае выдавецтва БССР прыняло да друку першы зборнік яго вершаў, але рукапіс згарэў у час вайны. Асобныя творы змешчаны ў калектыўных зборніках «Мы іх не забудзем» (1949), «Крывёю сэрца» (1967), «Покліч долі адзінай» (1979).

*Яўген* **РАДКЕВІЧ**



Яўген Рыгоравіч Радкевіч нарадзіўся 3.10. 1937 г. у горадзе Сянно Віцебскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

У 1955 г. паехаў у Казахстан. Скончыў Усць-Каменагорскае вучылішча сельскай гаспадаркі (1956). Працаваў трактарыстам, камбайнерам у саўгасах імя Жданава і «Пагранічнік» Паўладарскай вобласці. У 1958 г.— піянерважатым дзіцячага дома № 2 у п. Парэчча Гродзенскай вобласці. З 1958 г. вучыўся на аддзяленні журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў у 1963). З 1960 г. адначасова працаваў рэдактарам, загадчыкам маладзёжнай рэдакцыі Беларускага радыё. З 1971 г.— аспірант, з 1974 г.— выкладчык, з 1978 г.— загадчык кафедры тэлебачання і радыёвяшчання БДУ. Доктар філалагічных навук. Член СП СССР з 1975 г.

Друкуецца з 1966 г. Аўтар кніг апавяданняў і аповесцей «Плытагоны» (1972), «Месяц Межань. Зіма на выратавальнай» (1976), «Гор-

ны мёд» (1982), аповесцей «Антаніна» (1979), «Пешшу праз Галактыку» (1984), раманаў «Сутокі дзён» (1984), «Закон прыцягнення» (1990). Напісаў кнігу публіцыстыкі «Камсамольская дынастыя» (1968), даследаванне «Маладзёжная радыёпраграма: станаўленне, функцыі, форма» (1979), манаграфію «Беларускае радыё: гісторыя, перспектывы развіцця» (1983).

---

## *Алесь РАЗАНАЎ*



Алесь (Аляксандр Сцяпанавіч) Разанаў нарадзіўся 5.12.1947 г. у вёсцы Сялец Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачых.

У 1966 г. скончыў Сялецкую сярэднюю школу Бярозаўскага раёна і паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1969 г. перавёўся ў Брэсцкі педагагічны інстытут імя А. С. Пушкіна (скончыў у 1970). Працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў вёсцы Кругель Камянецкага раёна, служыў у Савецкай Арміі. З 1972 г. у Мінску — літсупрацоўнік газеты «Літаратура і мастацтва», бюлетэня «Родная прырода». У 1974—1986 гг.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». З 1989 г.— віцэ-прэзідэнт Беларускага ПЭН-цэнтра. Член СП СССР з 1972 г.

З вершамі ў друку выступіў у 1961 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Адраджэнне» (1970), «Назаўжды» (1974), «Каардынаты быцця» (1976), «Шлях — 360» (1981), «Вастрыё стралы» (1988). Перакладае з літоўскай, латышскай, грузінскай, балгарскай, сербскахарвацкай, чэшскай, англійскай моў. Пераклаў кнігу К. Саі для дзяцей «Гэй, хавайцеся!» (1982), п'есу У. Шэкспіра «Сон у Іванаву ноч» (у зборніку «Тры камедыі», 1989), раман Ё. Авіжуса «Час, калі пусцеюць сядзібы» (1989). Склаў кнігу паэзіі Я. Купалы «Выйду з сэрцам, як з паходняй!..» (1982).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1990) за кнігу паэзіі «Вастрыё стралы».

*Віктар* РАКАЎ



Віктар Афанасьевіч Ракаў нарадзіўся 22.1.1935 г. у вёсцы Целяшы Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і калгаснікаў.

Скончыў фізіка-матэматычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1958) і Мінскую вышэйшую партыйную школу (1971). Настаўнічаў у Целяшоўскай, Рэчкаўскай сярэдніх школах на Магілёўшчыне (1958—1965). Быў карэспандэнтам-арганізатарам Магілёўскага раённага радыёвяшчання (1965), загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела шклоўскай раённай газеты «Ударны фронт» (1965—1969), літсупрацоўнікам рэспубліканскай газеты «Звязда» (1971—1975). З 1975 г.— рэдактар аддзела публіцыстыкі, з 1982 г.— адказны сакратар часопіса «Полымя».

У друку выступае з 1956 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Вернасць» (1968), «Акно ў зялёны сад» (1972), «Пазыўныя» (1975), «Песня і памяць» (1979), «І сноп, і птах, і я...» (1983).

*Сяргей* РАКІТА



Сяргей Ракіта (Сяргей Васільевіч Законнікаў) нарадзіўся 15.10.1909 г. у вёсцы Ліцвінава Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Наватухіньскую школу другой ступені (1925). Будучы вучнем, пісаў допісы ў аршанскую акруговую газету «Камуністычны шлях». У 1929 г. накіраваны на работу ў рэдакцыю гомельскай абласной газеты «Палеская праўда». З 1930 г. з'яўляўся кіраўніком Гомельскай філіі БелАПП. Служыў у Чырвонай Арміі (1932—1933). Працаваў у Мінску ў рэдакцыях газет, на Беларускім радыё, у Дзяржаўным выдавецтве БССР, адначасова вучыўся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі імя С. М. Кірава.

19.10.1936 г. рэпрэсіраваны. Прыгавораны да 10 гадоў зняволення ў лагерах. Працаваў на лесапавале ў Горкаўскай вобласці. Рэабілітаваны пасмяротна.

Памёр у лагеры 23.3.1942 г.

Першы верш апублікаваў у 1928 г. (часопіс «Аршанскі маладняк»). У 1930 г. у калектыўным зборніку «Разгон» (Гомель) змешчана нізка яго вершаў. Выдаў зборнік паэзіі «Я агітую за пяцігодку» (1934).

---

## *Мікола* РАКІТНЫ



Мікола Ракітны (Мікалай Ісакавіч Новікаў) нарадзіўся 15.4.1920 г. у вёсцы Петрыцкае Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Віцебскім мастацкім вучылішчы (1936—1939). У 1939 г. прызваны ў Чырвоную Армію. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях на Цэнтральным і Паўднёва-Заходнім франтах. Пасля дэмабілізацыі (1946) працаваў мастаком і літработнікам газеты «Звязда». З 1949 г.— рэдактар аддзела нарыса, у 1967—1980 гг.— аддзела літаратуры і мастацтва часопіса «Беларусь».

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Першае апавяданне надрукаваў у 1944 г. на рускай мове ў вайсковым друку, з 1947 г. піша на беларускай мове. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Ранняй вясною» (1952), «Вячэрнія зоры» (1956), «Селькоры» (1958), «Пад адным дахам» (апавяданні і нарысы, 1961), «Была вясна...» (1964), «Сярод людзей сваіх» (1967), «Вясковыя навелы» (1969), «Выбранае» (1972), «Засмужаная далеч» (1979), «У буйным свеце лотаці» (1989). У 1980 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

## *Іван* РАЛЬКО



Іван Дзмітрыевіч Ралько нарадзіўся 21.11. 1929 г. у вёсцы Макраны Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1951 г. скончыў Нясвіжскае педагагічнае вучылішча. З 1951 і да пачатку 1957 г. працаваў дырэктарам і выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры Багушоўскай сямігадовай школы, затым выкладаў рускую мову і літаратуру ў Навамышскай сярэдняй школе Баранавіцкага раёна. У 1958 г. скончыў завочна філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, у 1961 г.— аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Працаваў навуковым супрацоўнікам гэтага інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1970 г.

Памёр 27.12.1979 г.

У перыядычным друку ў 1951 г. дэбютаваў вершамі (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборніка паэзіі «Святло зары вячэрняй» (1983). Як крытык і літаратуразнавец выступіў у 1958 г. Даследаваў праблемы сучаснай паэзіі, гісторыі і тэорыі беларускага вершаскладання. Асобнымі выданнямі выйшлі працы «Беларускі верш: Старонкі гісторыі і тэорыі» (1969), «Вершаскладанне: Даследаванне і матэрыялы» (1977), «Верш і мова: Праблема тэорыі і гісторыі беларускага верша» (1986).

Перакладаў з украінскай і польскай моў.

## *Яўген* РАМАНОВІЧ



Яўген Сцяпанавіч Рамановіч нарадзіўся 21. 1. 1905 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага.

У пятнаццацігадовым узросце пачаў выступаць у «Беларускай хатцы» як акцёр, быў там загадчыкам клуба. З 1922 г. працаваў у БДТ-1 (з 1944 г.— Беларускі тэатр імя Янкі Купалы) акцёрам, рэжысёрам, загадчыкам літаратурнай часткі. Адначасова вучыўся на факультэце грамадскіх навук Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1922—1924). У час Вя-

лікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў эвакуацыі ў Томску (1941—1944). У 1947—1949 гг.— кансультант ва Упраўленні прапаганды і агітацыі ЦК КПБ, у 1949—1963 гг.— намеснік начальніка Упраўлення па справах мастацтваў і галоўны рэдактар рэпертуарна-рэдакцыйнай камісіі Міністэрства культуры БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны артыст Беларускай ССР (1944).

Памёр 25.2.1979 г.

Дэбютаваў у 1923 г. вершамі і фельетонамі (выступаў пад псеўданімам «Брацішка»). Выдаў нарыс «Першы тэатр» (1946), манаграфію «Народны артыст СССР Б. В. Платонаў » (1954), зборнік прозы «Галіна Званцова» (1958), кнігі ўспамінаў «Рэкі цякуць з ручаёў» (1969), «Знаёмыя сілуэты» (1974) і кнігу пра тэатр «Людзі і маскі» (1977).

Апублікаваў п'есу «Мост» (1930, пастаўлена ў 1929), аднаактоўку «Горад у полымі» (1931), інсцэніроўку «Капітанская дачка» (1937, паводле аднайменнай аповесці А. С. Пушкіна, пастаўлена ў 1937). Пастаўлены п'есы «Усё добра будзе» («Кантракт, альбо Усё добра будзе», 1924), «Вір» (1926), «Крывая аблона» («Чаму замоўк гармонік над Дзвіной», 1929), «Камяні на дарозе» (1931), «Герой» (1933), «Шляхі-дарогі» (1933), «Першая вясна» (1935), «Палешукі» (1944), «Таварыш Андрэй» («Дзве сяброўкі», 1944), інсцэніроўка «Салаўі пяюць на волі» (1955, паводле аповесці «Салавей» З. Бядулі).

Напісаў лібрэта опер «У пушчах Палесся» (пастаўлена ў 1939), «Алеся» («Дзяўчына з Палесся», з П. Броўкам, пастаўлена ў 1944; 1953), балетаў «Падстаўная нявеста» (пастаўлена ў 1958), «Мара» (пастаўлена ў 1961).

Пераклаў асобныя п'есы А. Астроўскага, А. Чэхава, М. Горкага, К. Транёва, А. Карнейчука і інш.

## *Галена* РАМАНОЎСКАЯ



Галена Людвігаўна Раманоўская нарадзілася 26.12.1908 г. у горадзе Мінску ў сям'і чыгуначніка.

Скончыла ў Мінску польскі педагагічны тэхнікум (1929) і Беларускі вышэйшы педагагічны інстытут (1934). Да Вялікай Айчыннай вайны працавала ў школах Дзяржынскага раёна і Мінска, у газеце «Орка» («Ворыва», Мінск), на Беларускім радыё. У 1944—1963 гг. настаўнічала ў Мінску. Была членам секцыі польскіх пісьменнікаў СП БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Памерла 17.5.1980 г.

Друкавала вершы, апавяданні ў мінскіх альманахах «Ідземы» («Ідзём», 1929), «Пазьдзернік» («Кастрычнік», 1934) і іншых выданнях. Пісала на польскай мове. Асобнымі выданнямі выйшлі аповесці «З вясною ў спаборніцтве» (1933), «Пахне зямля» (1934), інсцэніроўка для дзяцей «У барацьбе за Саветы» (1934).

На польскую мову пераклала аповесць П. Галавача «Спалох на загонах» (1933), асобныя творы беларускіх пісьменнікаў.

## *Леанід* РАШКОЎСКІ



Леанід Сямёнавіч Рашкоўскі нарадзіўся 9.1. 1937 г. у горадзе Барысаве Мінскай вобласці ў сям'і служачага.

У 1955 г. скончыў барысаўскую сярэднюю школу № 2, працаваў рознарабочым на будоўлі. У 1956 г. паступіў вучыцца ў Віцебскі ветэрынарны інстытут на заатэхнічны факультэт. Аднак з-за цяжкай хваробы быў вымушаны спыніць вучобу на другім курсе. У 1962 г. скончыў фельчарскае аддзяленне Барысаўскага медыцынскага вучылішча. У 1963 г. арганізаваў і ўзначаліў літаб'яднанне пры барысаўскай аб'яднанай газеце «Камуністычная праца». Завочна скончыў чатыры курсы факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1972). Жыве ў Барысаве. Член СП СССР з 1970 г.

Першы верш надрукаваў у 1955 г. (барысаўская газета «Бальшавіцкая трыбуна»). Піша на рускай мове. Аўтар зборнікаў вершаў «Пускай не умирают звезды» (1968), «Ливень» (1975), «Преодоление» (1979), «Откровение» (1987). Выдаў кніжкі паэзіі для дзяцей «Как пингвину шили фрак» (1970), «Почемучка» (1973), «Трубач» (1976) і «На веселой карусели» (1984).

---

## *Леапольд* РОДЗЕВІЧ



Леапольд Іванавіч Родзевіч нарадзіўся 12.6. 1895 г. у фальварку Кур'янаўшчына Вілейскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і збяднелага шляхціца.

Скончыў Вілейскае гарадское вучылішча (1909). У 1914 г. пераехаў у Вільню. Працаваў на цукеркавай фабрыцы «Вікторыя». Прымаў удзел у культурна-асветніцкім, рэвалюцыйным руху. З 1921 г. член Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА), член ЦК БРА. Адзін з рэдактараў газеты «Вольны сцяг». У 1922 г. сядзеў у турме. Адзін з ініцыятараў уступлення БРА ў Камуністычную партыю Заходняй Беларусі (КПЗБ). Рэдагаваў газеты «Беларускі звон» і «Наша будучыня» (1922—1923). Быў абраны сакратаром Гродзенскага падпольнага акруговага камітэта КПЗБ і ўведзены ў склад ЦК КПЗБ (1924). З 1925 г.— у прадстаўніцтве ЦК КПЗБ пры Камінтэрне. Вучыўся ў Камуністычным універсітэце народаў Захаду ў Маскве (1923—1924). У 1925—1934 гг.— рэдактар газеты «Чырвоны сцяг» і часопіса «Бальшавік» (органы ЦК КПЗБ). Працаваў у Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры АН БССР. Быў рэпрэсіраваны.

Бясследна згінуў пасля 1938 г.

Друкаваць вершы і допісы пачаў у 1912 г. (газета «Наша ніва»). Аўтар п'ес «Пакрыўджаныя» (апублікавана ў 1921), «Блуднікі» (апублікавана ў 1960), вадэвіляў «Збянтэжаны Саўка», «Пасланец» (апублікаваны ў 1921, пастаўлены ў 1922), «Багаты і бедны» (апублікавана ў 1923), асобных драматычных жартаў і

абразкоў («Досвіткі», «Кавалі» і інш.), якія ставіліся самадзейнымі калектывамі Заходняй Беларусі. Выйшлі «Сцэнічныя творы» (уключаны п'есы «Збянтэжаны Саўка», «Конскі партрэт», «Пасланец» (Вільня, 1921, 1925, 1933), у 1922 г.— драматычныя сцэнкі «Досвіткі». У 1964 г. асобным выданнем выйшаў жарт «Збянтэжаны Саўка».

Апублікаваў зборнікі вершаў «Беларусь» (Вільня, 1922), «На паняволеных гонях» (Кракаў, на самай справе падпольнае выданне, 1928). Шэраг паэтычных твораў змешчаны ў зборніку «Сцягі і паходні» (1965).

Выдаў кнігі апавяданняў «Рэвалюцыйным шляхам» (1928) і «Вогнішча барацьбы» (1930). У перыядычным друку актыўна выступаў з публіцыстычнымі артыкуламі.

---

## *Алесь РОЗНА*



Алесь (Абрам Ісакавіч) Розна нарадзіўся ў 1913 г. у горадзе Мінску ў рабочай сям'і.

Пасля вучобы ў сярэдняй школе працаваў наборшчыкам у друкарні. Заняткі ў Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага (скончыў у 1935) сумяшчаў з працай у рэдакцыі «Чырвонай змены».

У 1936 г. арыштаваны. Рэабілітаваны ў 1955 г.

Памёр у 1942 г. ва Унжлагу (станцыя Сухабязводная Горкаўскай чыгункі).

У друку з вершамі выступіў у 1927 г. (часопіс «Беларускі піянер»). Друкаваўся ў газетах «Савецкая Беларусь», «Звязда», «Чырвоны сейбіт», «Чырвоная змена», часопісах «Полымя» і «Чырвоная Беларусь». Пераклаў на беларускую мову асобныя творы Г. Гейнэ, А. Міцкевіча, разам з С. Грахоўскім пераклаў некалькі вершаў А. Пушкіна (1935).

## *Уладзіслаў* РУБАНАЎ



Уладзіслаў Якаўлевіч Рубанаў нарадзіўся 15.12. 1952 г. у вёсцы Аляксандраўка 1-я Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўніка.

Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1975). Працаваў карэспандэнтам, адказным сакратаром старадарожскай раённай газеты «Поступ Кастрычніка». З 1978 г.— рэдактар, а затым старшы рэдактар аддзела прозы часопіса «Полымя», з 1986 г.— загадчык рэдакцыі прозы выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1982 г.

Першае апавяданне апублікаваў у 1972 г. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Вокны без фіранак» (1981), «Пахі адталай зямлі» (1984), «Цёплы пух адуванчыкаў» (1987), «Таямніца птушынага гнязда» (1989), «Светлы ручай любві» (1990). Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы рускіх, кіргізскіх, чувашскіх пісьменнікаў.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя І. Мележа (1990) за кнігу «Таямніца птушынага гнязда».

## *Людміла* РУБЛЕЎСКАЯ



Людміла Рублеўская (Людміла Іванаўна Шніп) нарадзілася 5.7.1965 г. ў горадзе Мінску ў сям'і служачых.

Скончыла аддзяленне архітэктуры Мінскага архітэктурна-будаўнічага тэхнікума (1984). Працавала ў канструктарскім бюро на вытворчым аб'яднанні «Гарызонт». Вучылася на аддзяленні паэзіі Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве (1986—1987), затым перавялася на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Член СП СССР з 1990 г.

Першы верш надрукавала ў 1983 г. (газета «Знамя юности»). Аўтар зборніка вершаў «Крокі па старых лесвіцах» (1990), «Адукацыя» (1990).

*Веніямін* ***РУДАЎ***



Веніямін Сямёнавіч Рудаў нарадзіўся 17.12. 1914 г. у сяле Долінскае Ананьеўскага раёна Адэскай вобласці (Украіна) у сям'і служачых.

У 1931 г. скончыў сярэднюю школу і стаў працаваць настаўнікам. У 1936—1962 гг. служыў у пагранічных войсках. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Скончыў Вышэйшую вайсковую навучальную ўстанову (1946) і юрыдычны факультэт Азербайджанскага дзяржаўнага універсітэта (1953). Працаваў рэдактарам на Беларускім радыё (1965—1970), літаратурным кансультантам газеты «Вячэрні Мінск» (1970—1977). Член СП СССР з 1972 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Літаратурнай працай займаецца з 1954 г. Піша на рускай мове. Першую аповесць «Прыгоды на энскай заставе» (Львоў, 1957) напісаў на ўкраінскай мове. Аўтар аповесцей «Тусклое золото» (1964), «Мобилизован партией» (з П. Емяльянавым, 1971), «Вьюга» (1977), «Последний зов» (Масква, 1978), «Капкан» (1984) і раманаў «Чужие ветры» (1969), «Черная Ганьча» (1973), «Перекрестое» (1978), «Временно исполняющий» (Масква, 1988), «Переправа» (1988).

*Юрый* ***РУДЗЬКО***



Юрый Герасімавіч Рудзько нарадзіўся 27.6. 1913 г. у горадзе Бабруйску ў сям'і служачага.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1929) працаваў настаўнікам Стараруссевіцкай пачатковай школы на Случчыне. Скончыў літаратурны факультэт Беларускага вышэйшага педагагічнага інстытута (1933). Загадваў аддзелам літаратуры і мастацтва газеты «Чырвоная змена» (1933—1935), служыў у Чырвонай Арміі (1935—1937), быў супрацоўнікам, загадчыкам аддзела мастацтва газеты «Літаратура і мастацтва». У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у палітупраўленні Заходняга фронту, 50-й арміі, адказным сакратаром газеты 2-га Беларускага

фронту, 50-й арміі, адказным сакратаром газеты 2-га Беларускага фронту. Член СП СССР з з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 4.2.1948 г.

У 1931 г. выступіў у рэспубліканскай прэсе з нарысамі, артыкуламі, апавяданнямі. Выйшлі зборнік нарысаў «Размова па шчырасці» (з Іл. Дуброўскім, 1935) і кніга «Слава дружбе» (апавяданні, аповесці, п'есы, 1950).

У сааўтарстве з У. Стэльмахам напісаў п'есу «Канец маскараду» (пастаўлена ў 1938).

---

## *Міхась* РУДКОЎСКІ



Міхась (Міхаіл Міхайлавіч) Рудкоўскі нарадзіўся 17.4.1936 г. у вёсцы Востраў Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Пінскае педагагічнае вучылішча (1955), настаўнічаў у Кукаўскай сямігодцы Ганцавіцкага раёна. У 1960—1962 гг.— літсупрацоўнік ганцавіцкай раённай газеты «Сялянская праўда». Скончыў завочна філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна (1961). У 1962—1981 гг. працаваў старшым рэдактарам літаратурнадраматычных і музычных праграм Брэсцкай студыі тэлебачання. Член СП СССР з 1966 г.

Памёр 7.7.1991 г.

У рэспубліканскім друку выступае з вершамі з 1959 г. Выйшлі зборнікі вершаў «Першыя вёрсты» (1963), «Сінія Брады» (1967), «Позвы» (1971), «У краі тым...» (1975), «Векавечная бацькаўшчына» (1976), «Трыгор'е» (1981), «Засцярога» (1984), «Залатазвон» (1986).

Вядомы і як перакладчык з украінскай, рускай і польскай моў.

## *Пятро* РУНЕЦ



Пятро (Пётр Мікалаевіч) Рунец нарадзіўся 4.5.1911 г. у вёсцы Азярычына Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння курсаў пры Барысаўскім педагагічным тэхнікуме (1930) настаўнічаў у вёсках Глінішчы і Сяліба Бярэзінскага раёна. У 1937 г. паступіў вучыцца, а ў 1940 г. скончыў Камуністычны інстытут журналістыкі імя С. М. Кірава ў Мінску. Увосень 1940 г. прызваны ў Чырвоную Армію. Удзельнічаў у баях у Літве, на Волхаўскім, Сталінградскім франтах. Двойчы паранены. У маі 1943 г. дэмабілізаваны. Працаваў у эвакашпіталі, а затым у рэдакцыі новакузнецкай газеты «Большевистская сталь». У 1945 г. вярнуўся на радзіму. У 1946—1953 гг.— загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Піянер Беларусі», у 1953—1962 гг.— літсупрацоўнік часопіса «Бярозка», у 1963—1971 гг.— рэдактар-стыліст на Беларускім радыё. Член СП СССР з 1955 г.

Узнагароджаны медалямі.

Першае апавяданне апублікаваў у 1932 г. (часопіс «Іскры Ільіча»). Піша пераважна для дзяцей. Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Юныя змагары» (1940), «У веснавыя дні» (1954), «Бярозавы конь» (1956), «Гіпсавая маска» (1958), «Канец казкі» (1960), «Заламаны ражок» (1961), «Вясёлыя здарэнні» (1962), «Алёшка-верхалаз» (1963), «Аб чым шэпчацца аер» (1966) — абедзве аповесці ў 1971 г. выдадзены асобнай кнігай «Алёшка і яго сябры», «Важнае заданне» (1968), «Белы васілёк» (1971), «Добрая душа» (1977), «Незвычайны збор» (1981), «Незвычайны наведвальнік» (1985), «Апошняе шчасце» (гумарэскі, 1984). Апублікаваў аднаактоўку «Сіні пясок» (1959).

Склаў зборнік успамінаў дзяцей пра вайну «Ніколі не забудзем» (з Я. Маўрам, 1948). У 1979 г. выдаў брашуру пра Я. Маўра «Чалавек з крылатай фантазіяй».

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы С. Міхалкова, Б. Емяльянава, Дж. Радары, Ж. Грывы, Л. Талвіра і інш.

## *Адам* РУСАК



Адам Герасімавіч Русак нарадзіўся 24.5.1904 г. у вёсцы Пясочнае Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Беларускі музычны тэхнікум (1930), Ленінградскую кансерваторыю (1934). У 1932—1949 гг.— саліст аркестра Ленінградскага Малога опернага тэатра (у час Вялікай Айчыннай вайны разам з тэатрам быў эвакуіраваны ў Арэнбург), у 1949—1959 гг.— саліст аркестра Беларускай дзяржаўнай філармоніі. Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнамі Дружбы народаў, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1964).

Памёр 21.3.1987 г.

У друку з вершамі пачаў выступаць у 1927 г. (часопіс «Чырвоны сейбіт»). Аўтар зборнікаў вершаў і песень «На родных палетках» (1946), «Песні і вершы» (1951), «Песні» (1954), «Пад голас баяна» (1957), «Толькі з табою» (1960), «Звонкія крыніцы» (1965), «Выбранае» (1972), «Песні на словы А. Русака» (1975, 1980), «Закрасуйся, Нёман» (1978), «Засцілайце сталы» (выбранае, 1984), «Дружбакі» (1987), а таксама кніжак вершаў для дзяцей «У Буслаўцы» (1967), «Добра ведаю ўрок» (1981). Песні А. Русака «Бывайце здаровы», «Лясная песня» і іншыя сталі народнымі. Многія песні выходзілі асобнымі выданнямі.

## *Аляксей* РУСЕЦКІ



Аляксей Сцяпанавіч Русецкі (Бурдзялёў) нарадзіўся 4.12.1912 г. у сяле Студзянец Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Маскоўскі заавецэрынарны інстытут (1935), служыў у Чырвонай Арміі. З 1936 г. працаваў ва ўпраўленні саўгасаў у Мінусінску, у бактэрыялагічных лабараторыях Масквы і Мінска. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у Савецкай Арміі, удзельні-

чаў у баях на Калінінскім, Заходнім, 3-м Прыбалтыйскім франтах. Прымаў удзел у разгроме імперыялістычнай Японіі. У 1947 г. дэмабілізаваны. Працаваў літкансультантам СП БССР (1947—1952, 1960—1967), загадчыкам аддзела публіцыстыкі часопіса «Беларусь» (1952—1960), намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Полымя» (1967—1973), старшым рэдактарам рэдакцыі часопіса «Беларусь» (1973—1980).

Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Заслужаны работнік культуры БССР (1983).

З першымі вершамі выступіў у друку ў 1934 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «У заўтрашні свет» (1951), «Святло акон тваіх» (1959), «Усход і Захад» (выбранае, 1962), «Яго вялікасць» (паэма, 1965), «Служба святла» (1967), «Вершы і паэма» (1969), «Зямля гаворыць зорам» (паэмы і вершы, 1971), «Два колеры жыцця» (выбранае, 1973), «Позірк» (вершы і паэмы, 1977), «Паэмы» (1979), «Крокі сэрца» (1980), «Хвала жыццю» (1987). У 1982 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова (1981) за кнігу паэзіі «Крокі сэрца».

---

## *Алена* РУЦКАЯ



Алена Вітальеўна Руцкая нарадзілася 11.1. 1950 г. у вёсцы Дзякаўцы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і служачых.

У 1961 г. з бацькамі пераехала ў Слонім. Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1971). У 1971—1977 гг. працавала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў Сцянявіцкай васьмігадовай школе Слонімскага раёна, у Судзілаўскай сярэдняй школе Клімавіцкага раёна, у Сянькоўшчынскай сярэдняй школе Слонімскага раёна. С 1977 г. працуе ў сярэдняй школе № 2 у Слоніме. Член СП СССР з 1985 г.

З першым вершам выступіла ў 1966 г. (газета «Голас Радзімы»). Аўтар зборніка паэзіі «Роздум» (1988).

Перакладае з украінскай мовы.

## *Алесь* РЫБАК



Алесь (Аляксандр Пятровіч) Рыбак нарадзіўся 7.11.1934 г. у вёсцы Макаўчыцы Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Рана застаўся без бацькоў — загінулі ў час Вялікай Айчыннай вайны. У 1958 г. скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у рэдакцыях радашковіцкай, дзяржынскай і бягомльскай раённых газет (1958—1959), часопісе «Вожык», газеце «Калгасная праўда» (1959—1962), на Беларускім радыё (1962—1963), у часопісе «Бярозка» (1963—1964). З 1966 да 1972 г. жыў у Маскве — працаваў старшым карэктарам у Аддзеле апублівання Актаў Вярхоўнага Савета СССР, рэферэнтам у сакратарыяце Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР. Па сумяшчальніцтве выкладаў беларускую мову ў Літаратурным інстытуце імя М. Горкага. З 1972 г.— намеснік адказнага сакратара праўлення СП БССР, з 1978 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП БССР з 1973 г.

Узнагароджаны медалём.

Дэбютаваў вершамі ў рэспубліканскім друку ў 1953 г. Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Дарогі бываюць розныя» (апавяданні і гумарэскі, 1972), «Што пасееш...» (1982), «Апошняя камандзіроўка» (1985), рамана «Трэба было жыць» (1990). Выдаў кніжку апавяданняў для дзяцей «Сёння прыедзе тата» (1976).

## *Алесь* РЫЛЬКО



Алесь (Аляксей Іванавіч) Рылько нарадзіўся 27.3.1923 г. у вёсцы Рыдамля Талачынскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыўшы 9 класаў Рыдамлянскай сярэдняй школы, а затым педагагічныя курсы ў Оршы (1939), настаўнічаў у Лявонаўскай пачатковай школе на Аршаншчыне. Першы год Вялікай Айчыннай вайны працаваў на сельскай гаспадарцы, са жніўня 1942 г.— партызан атрада «Перамога» брыгады К. Заслонава, з верасня

1943 г.— мінёр у спецгрупе «Непераможныя». Быў паранены. У 1944—1946 гг. працаваў адказным сакратаром баранавіцкага абласнога спартыўнага таварыства «Дынама», настаўнічаў на Пастаўшчыне. Скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1951), працаваў у газетах «Савецкі селянін», «Літаратура і мастацтва», часопісах «Вожык», «Полымя», літаратурным кансультантам СП БССР. Член СП СССР з 1952 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 16.4.1967 г.

Друкавацца пачаў у 1946 г. Выйшлі кнігі апавяданняў «Мае сустрэчы» (1952), «Цвіце чаромха» (апавяданні, п'есы, 1957), «Стуканок у аблавушцы» (гумарыстычныя апавяданні, 1959), «Ты прыгожая, Арынка» (апавяданні, нарысы, 1960), «Напрадвесні» (выбранае, 1984), аповесць для дзяцей «Мядовыя краскі» (1959, 1983), аднаактовая п'еса «Гром з яснага неба» (1953), «Колькі вяровачку не віць...» (аднаактовая камедыя і сцэнкі, 1958). У 1969 г. выйшла «Выбранае».

---

## *Рува* РЭЙЗІН



Рува Шоламавіч Рэйзін нарадзіўся ў горадзе Лондане (Англія) у 1911 г. у сям'і рабочага, які выехаў туды на заработкі.

У дзяцінстве застаўся сіратой і выхоўваўся ў дзіцячым доме ў Слуцку. Васемнаццацігадовым прыехаў у Мінск, працаваў мулярам, а потым паступіў на рабфак. У 1937 г. скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута. У 1940 г. быў прызваны ў армію.

Загінуў у 1942 г. на фронце.

Першыя вершы апублікаваў у 1929 г. Пісаў на мове ідыш. Выступаў у газетах «Юнгер арбайтэр» («Малады рабочы»), «Акцябэр» («Кастрычнік») і ў часопісе «Штэрн» («Зорка»). Выйшлі «Вершы і апавяданні» (1929), зборнікі вершаў «Нялёгкай працай» (1934), «Вершы» (1940) і паэма «Вялікая хартыя» (1935). Асобныя творы апублікаваны ў перакладзе на беларускую мову ў зборніку «Мы іх не забудзем» (1949).

*Рыгор РЭЛЕС*



Рыгор Львовіч Рэлес нарадзіўся 23.4.1913 г. у горадзе Чашнікі Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

Скончыў Віцебскі педагагічны тэхнікум (1933), вучыўся на яўрэйскім аддзяленні літаратурнага факультэта Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. У 1937—1941 гг. працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў сярэдніх школах Слуцка і Навагрудка. З чэрвеня 1941 г.— у Савецкай Арміі, з 1942 г.— адказны сакратар шматтыражнай газеты «Строитель» (Грамячынск). У 1945—1947 гг. літработнік у рэдакцыях брэсцкай абласной газеты «Заря», рэспубліканскай піянерскай газеты «Зорька», часопіса «Вожык», у 1947—1973 гг. выкладаў рускую мову і літаратуру ў вячэрніх школах рабочай моладзі ў Мінску. Член СП СССР з 1936 г.

Узнагароджаны медалём.

Упершыню выступіў у друку з вершам у 1931 г. (газета «Юнгер арбайтэр» — «Малады рабочы»). Піша на ідыш і рускай мовах. Выдаў зборнікі вершаў на мове ідыш «Пачатак» (1939), «Вершы» (1941) і кнігу апавяданняў «Пад мірным небам» (Масква, 1983). У перакладзе на беларускую мову выйшла кніга вершаў «Бяроза пад акном» (1961), на рускую — «Стихи» (Масква, 1974). Пастаянна друкуецца на старонках яўрэйскага часопіса «Саветыш Геймланд» («Савецкая Радзіма», Масква).

Выступае і ў галіне прозы. Першая аповесць «Пра тое, чаго не ведаюць вучні» надрукавана ў 1955 г. у перакладзе на беларускую мову (часопіс «Полымя»). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Записки моего коллеги» (1960), «Друзья и знакомые» (1963), «За тесными партами» (1966), «В родном уголке» (1972), «Через трудный порог» (1976), «Под каждой крышей» (1979), «Не розами устлан твой путь» (1984). Выйшлі «Аднаактовыя п'есы (з Х. Мальцінскім, 1964).

# С



## *Раман САБАЛЕНКА*

Раман Карпавіч Сабаленка нарадзіўся 15.10. 1907 г. у вёсцы Сабалі Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Гомельскі педагагічны тэхнікум (1929), вучыўся ў Гомельскім педагагічным інстытуце (1933—1935). У 1929 г. пачаў працаваць у рэспубліканскай газеце «Звязда», але праз паўгода быў прызваны ў Чырвоную Армію. У 1930—1941 гг. працаваў у рэдакцыі абласной газеты «Палеская праўда» (з 1938 г. «Гомельская праўда»). Двойчы арыштоўваўся (1933, 1937), але справы закрываліся. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў асуджаны Ваенным трыбуналам да 10 год пазбаўлення волі, але прыгавор быў адменены з-за адсутнасці складу злачынства. Удзельнічаў у баях на Калінінскім і 2-м Прыбалтыйскім франтах. У 1945—1953 гг.— загадчык аддзела культуры, намеснік галоўнага рэдактара баранавіцкай абласной газеты «Чырвоная звязда». У 1953 г. пераехаў у Мінск, дзе працаваў у рэдакцыях газеты «Калгасная праўда», часопісе «Маладосць». У 1957—1966 гг.— намеснік галоўнага рэдактара газеты «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 13.5.1975 г.

Дэбютаваў вершам у 1927 г. (газета «Звязда»). У 1935 г. апублікаваў паэму «Брагінь» (часопіс «Полымя»). Выдаў зборнікі вершаў «З родных крыніц» (1950) і «Мая эстафета» (1954). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Жменя зярнят» (апавяданні і нарысы, 1957), «Сустрэчы (1958), «Юнацтва ў дарозе» (1958), «Блакітнае ззянне» (1959), «Каралінцы» (1960), «Іду ў жыццё» (1961), «З пройдзеных

дарог» (1962), «Паляўнічыя боты» (гумарыстычныя апавяданні, 1962), «Незамужняя ўдава. Былое застаецца ў сэрцы» (1965), «Пад дажджом і сонцам» (апавяданні, партрэты, 1966), «Спатканне пасля разлукі» (1971), «Роздум у дарозе» (1973), кнігі нарысаў аб дзеячах беларускай літаратуры і культуры «Колерамі вясёлкі» (1975). Аповесці «Юнацтва ў дарозе», «Выпрабаванне сталасці» («Іду ў жыццё») і «Былое застаецца ў сэрцы» склалі трылогію «Іду ў жыццё». Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1967—1968), «Выбранае» (1977), «Творы» (1983).

---

## *Анатоль САБАЛЕЎСКІ*



Анатоль Вікенцьевіч Сабалеўскі нарадзіўся 27.5.1932 г. у вёсцы Андрыеўшчына Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1953 г. скончыў Мінскае педагагічнае вучылішча імя Н. К. Крупскай і паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Апошнія два гады вучобы ва універсітэце сумяшчаў з працай у аддзеле мастацтва рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва». У 1958—1961 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Дзяржаўным інстытуце тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага ў Маскве. Пасля заканчэння аспірантуры — навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Адначасова выкладаў гісторыю тэатра ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце. У 1972—1990 гг.— загадчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтва, мовы і літаратуры, у 1974—1979 гг.— рэктар Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. З 1990 г. загадвае аддзелам міжнацыянальных культурных працэсаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Доктар мастацтвазнаўства. Прафесар. Член СП СССР з 1964 г.

Як тэатральны крытык пачаў выступаць у 1952 г. Піша на беларускай і рускай мовах. Выдаў кнігі пра тэатр і драматургію «Рампай асветленае» (1962), «Уладар дум чалавечых» (1964),

«Ад п'есы — да спектакля» (1965), «Театр открывает занавес» (1970), «Беларуская савецкая драматургія і яе сцэнічнае ўвасабленне» (1971), «Белорусская драматургия в театрах народов СССР» (1972), «Беларуская савецкая драма» (у 2 кнігах, 1969, 1972), «Жыццё тэатра» (1980), «Образ В. И. Ленина на белорусской сцене» (1980), «Белорусско-молдавские театральные связи» (1984), «Сучаснасць і гісторыя» (1985), «Барыс Платонаў» (1989), «Кандрат Крапіва: Нарыс жыцця і творчасці» (1989). Укладальнік «Хрэстаматыі па гісторыі беларускага тэатра і драматургіі» для ВНУ у 2 тамах (1975), аўтар раздзелаў у «Гісторыі беларускага тэатра» (1983).

Напісаў аповесць «Жылі-былі хлопцы...» (1961, часопіс «Маладосць») і шэраг апавяданняў.

---

## *Алесь САВІЦКІ*



Алесь (Аляксандр Ануфрыевіч) Савіцкі нарадзіўся 8.1.1924 г. у горадзе Полацку Віцебскай вобласці ў сям'і рабочага.

З 1942 г.— партызан атрада «Смерць фашызму», з 1943 г.— камандзір падрыўной групы атрада «Бальшавік» брыгады імя Варашылава на Віцебшчыне. У 1944—1945 гг.— у Савецкай Арміі, удзельнічаў у вызваленні Літвы, Польшчы, у баях за ўзяцце Берліна. Быў тройчы паранены. Пасля дэмабілізацыі (1945) працаваў у рэдакцыі полацкай газеты «Бальшавіцкі сцяг» (пазней «Сцяг камунізму»). У 1958 г. скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага, у 1961 г.— аспірантуру пры гэтым інстытуце. У 1961—1962 гг.— загадчык рэдакцыі выдавецтва «Ураджай», у 1962—1969 гг.— вучоны сакратар Літаратурнага музея Якуба Коласа. У 1969—1973 гг. загадваў сектарам мастацкай літаратуры аддзела культуры ЦК КПБ. Ганаровы грамадзянін г. Полацка (1987). Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, «Знак Пашаны», Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Друкуецца з 1943 г. (ветрынская раённая газета «Чырвоная звязда»). Першае апавяданне

апублікаваў у 1948 г. (полацкая абласная газета «Бальшавіцкі сцяг»). Аўтар кніг апавяданняў, аповесцей «Кедры глядзяць на мора» (1960), «Пасля паводкі» (1962), «Белы гарлачык» (1965), «Самы высокі паверх» (1969), дакументальнай аповесці «След пракладае першы» (1971), «Белая знічка» (1984), раманаў «Жанчына» (1963), «Палын — зелле горкае» (1967), «Верай і праўдай» (1976), «Толькі аднойчы» (1979), «Зямля раскажа» (1980), «Літасці не чакай» (1982), «Памерці заўсёды паспееш» (1983), «Верасы» (1987), «Обаль» (1989), кнігі нарысаў «На посту у тишины» (1987), зборніка апавяданняў для дзяцей «Шкляная нітка» (1970). У 1982 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1970) за аповесць «Самы высокі паверх».

---

## *Уладзімір САВІЦКІ*



Уладзімір Іларыёнавіч Савіцкі нарадзіўся 28.6.1914 г. у вёсцы Добасна Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1930 г. працаваў сакратаром Дабаснянскага сельсавета. У 1937 г. скончыў Ленінградскі тэкстыльны інстытут. Служыў у Савецкай Арміі (1937—1939). Працаваў зменным майстрам, начальнікам цэха Смаленскага льнокамбіната. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце — камандзір мінамётнага ўзвода, камандзір агнявога ўзвода, палкавой артылерыйскай батарэі. Удзельнічаў у баях на Калінінскім, Паўночна-Заходнім, 2-м Прыбалтыйскім, 1-м Беларускім франтах. Быў паранены. Са снежня 1944 г.— ваенны журналіст. Дэмабілізаваны ў 1957 г. Жыў у Барысаве. Член СП СССР з 1972 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 14.2.1989 г.

У 1942 г. у франтавым друку змясціў першыя карэспандэнцыі. Літаратурнай працай стала займацца з 1946 г. Пісаў на рускай мове.

Выйшлі зборнікі аповесцей і апавяданняў «Люди переднего края» (Масква, 1956. Ч. 1. 1958. Ч. 1—2), «Шли солдаты» (Масква, 1961), «Ночь перед парадом» (Масква, 1970), «Ни минуты покоя» (1973), «Не сотвори зла ближнему» (1974), «Улька» (Масква, 1981), «А годы идут...» (1984), «Радость жизни» (1987), «Аленушка из Долгих Нив» (1989), «Опаленные выходы» (1989), раман «И придет твой день» (1977). Аўтар зборнікаў вершаў «После боя» (Масква, 1963), «Сполохи на горизонте» (1985).

---

## *Мікола* САДКОВІЧ



Мікола (Мікалай Фёдаравіч) Садковіч нарадзіўся 21.1.1907 г. у вёсцы Вусце Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Дзяржаўны тэхнікум кінематаграфіі ў Маскве (1928). Да 1945 г. працаваў рэжысёрам на кінастудыях Масквы, Адэсы, Кіева, Ташкента. У 1942—1945 гг. кіраўнік Беларускай кінагрупы на Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў у Маскве, з якой выязджаў да партызан і на франты. У 1946—1947 і з 1950 г.— міністр кінематаграфіі БССР, у 1953—1956 гг.— намеснік міністра культуры БССР. Узначальваў рускую секцыю СП Беларусі. У 1948—1950 гг. быў галоўным рэдактарам і рэжысёрам Цэнтральнай студыі дакументальных фільмаў у Маскве. Абіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1947—1959). Член СП СССР з 1947 г.

Заслужаны дзеяч мастацтва Беларускай ССР (1944).

Памёр 16.8.1968 г.

У беларускім друку выступіў у 1948 г. Пісаў на рускай мове. Аўтар гістарычнага рамана «Георгий Скорина» (з Я. Львовым, 1951, папраўленае і дапоўненае выданне ў 1957), «Повести о ясном Стахоре» (1956), дзённіка назіранняў «Человек в тумане» (1960), рамана «Мадам Любовь» (Масква, 1966), апавяданняў, нарысаў. У 1987 г. выйшаў аднатомнік «Мадам Любовь. Человек в тумане. Повесть о ясном Стахоре».

Сцэнарыст і пастаноўшчык фільмаў «Майская ноч» (паводле М. Гогаля, пастаўлена ў

1940), «Тры гвардзейцы» (зняты ў 1942), «Беларускі кінаканцэрт» («Жыві, родная Беларусь!»), «Вызваленне Савецкай Беларусі» (абодва з У. Корш-Сабліным, зняты ў 1944). Сцэнарыст фільмаў «Міколка-паравоз» (з М. Лыньковым, пастаўлены ў 1957), «Так мы жывём» (зняты ў 1958), «Наша зямля» (зняты ў 1960), «Ахвяры абвінавачваюць» (зняты ў 1962), «Доля жаночая» (зняты ў 1967) і інш. Рэжысёр мастацкіх і дакументальных фільмаў «Шчаслівыя кольцы» (1929), «Песня пра першую дзяўчыну» (абодва з Л. Голубам), «Шумі, гарадок» (1939), «Дэмакратычная Германія» (сумесна з «Дэфа», 1950).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951) за дакументальны фільм «Дэмакратычная Германія».

---

## *Яфім САДОЎСКІ*



Яфім Ільіч Садоўскі нарадзіўся 4.1.1908 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага.

Вучыўся ў сталярнай майстэрні (1924—1925), у прафтэхшколе (1926), скончыў агульнаадукацыйныя курсы (1927). Быў супрацоўнікам газет «Савецкая Беларусь», «Рабочий», «Советская Белоруссия». У 20-я гг.— член групы рускіх літаратараў «Звенья». Служыў у Савецкай Арміі (1930—1931). У першыя гады Вялікай Айчыннай вайны — ваенны журналіст на Заходнім і Цэнтральным франтах. У 1943—1970 гг.— супрацоўнік газеты «Советская Белоруссия». Член СП СССР з 1935 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і Чырвонай Зоркі, медалямі.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1923 г. з вершаў. Піша на рускай і беларускай мовах. У 1927 г. апублікаваў зборнік вершаў «Полустанок» (з Г. Ладным). Выйшлі зборнікі апавяданняў «Скрыпка і ордэн» (1935), «Я вижу» (1939), «Ясные дали» (1951), «Жизни и судьбы» (1962), а таксама нарысы і брашуры «Рукамі ўдарнікаў» (1931), «У барацьбе за паліва» (1931), «Дзесяць дзён, якія прынеслі перамогу цэхам» (1931), «Записки молодого бойца» (Смаленск, 1932), «Раўняцца па героях» (1932),

«Герой Савецкага Саюза Аляксандр Ісачанка» (1946), «Чэмпіён краіны» (з Ю. Багушэвічам, 1953), «Гістарычныя помнікі Беларусі» (1958), «Люди и подвиги» (1965), «Их именами названы улицы Минска» (1965, апошняе перавыданне пад назвай «Герои не умирают» у 1974), «По историко-революционным местам Минска» (1981). Склаў зборнікі «Маякоўскі ў Беларусі» (1957) і «Успаміны пра Змітрака Бядулю» (з К. Цвіркам, 1988).

Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Наваселле» (пастаўлены ў 1945), «Па малых рэках» (пастаўлены ў 1947) і казкі для лялечных тэатраў «Выспа мудрасці» (пастаўлена ў 1952).

---

## *Алесь САЛАВЕЙ*



Алесь Салавей (Альфрэд Васільевіч Радзюк) нарадзіўся 1.1.1922 г. у вёсцы Крысава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і служачага.

Вучыўся ў Мінскім педагагічным вучылішчы (1937—1938). Вучобу пакінуў з-за арышту бацькоў (трэба было ўзяць на сябе клопат пра малодшых братоў і сястру). У час акупацыі працаваў вярстальшчыкам у «Менскай (Беларускай) газэце», затым пісарам ва ўправе гарадскога пасёлка Ілья. З кастрычніка 1942 г.— сакратар часопіса «Новы шлях» (Рыга). Пад час наступлення Савецкай Арміі (1944) з'ехаў у Берлін, затым у Прагу, потым у Вену. У 1949 г. выехаў у Аўстралію, дзе працаваў на фабрыцы, займаўся літаратурнай дзейнасцю.

Памёр 22.1.1978 г. у Мельбурну (Аўстралія).

Першыя вершы апублікаваў у 1937 г. (часопіс «Піянер Беларусі», раённая газета «Ударнік Дзяржыншчыны»). Аўтар кніг паэзіі «Мае песні» (вершы і паэма, Рыга, 1944), «Сіла гневу» (вершы, паэма, Аўстрыя, 1948), «Нятускная краса» (Нью-Йорк — Мельбурн, 1982).

## *Леў САЛАВЕЙ*



Леў Антонавіч Салавей нарадзіўся 21.10.1925 г. у горадзе Мінску ў сям'і рабочага.

Да вайны скончыў адзін курс Мінскага будаўнічага тэхнікума. Пасля вайны працаваў на чыгунцы. У 1950 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У час вучобы працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная змена», у Галоўным упраўленні па справах літаратуры і выдавецтваў пры Савеце Міністраў БССР. З 1950 г.— рэдактар, з 1968 г.— загадчык рэдакцыі перавыданняў і перакладаў выдавецтва «Беларусь». У 1972—1983 гг.— загадчык рэдакцыі перакладной літаратуры выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 3.1.1988 г.

У друку выступаў з 1950 г. Пісаў літаратурна-крытычныя артыкулы і рэцэнзіі. Працаваў пераважна ў галіне мастацкага перакладу. У яго перакладзе на беларускую мову апублікаваны аповесці Г. Леберэхта «Святло ў Каордзі» (1952), А. Купрына «Алеся» (1970), Г. Маркава «Наказ» (1976), У. Цендракова «Вясеннія пярэваратні» (1977), Ч. Айтматава «Пасля казкі» («Белы параход», 1978), раманы А. Рыбакова «Вадзіцелі» (1953), Дзін Ліна «Сонца над ракой Сангань» (1954), С. Спасэ «Афэрдзіта зноў у вёсцы» (1960), Ф. Дастаеўскага «Белыя ночы» (1971), І. Грыгуркі «Канал» (1975), А. Ганчара «Бераг любові» (часопіс «Полымя», 1977), А. Кешокава «Зламаная падкова» (1981), М. Шундзіка «Белы шаман» (1983), аднатомнік выбраных твораў М. Садавяну (1954), аповесці і апавяданні Л. Талстога (1977), «Выбранае» А. Купрына (1985) і іншыя творы пісьменнікаў народаў СССР і замежных краін; у перакладзе на рускую мову выйшлі раманы Р. Мурашкі «Салаўі святога Палікара» (1970) і «Сын» (1973), М. Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі» (1971), М. Ткачова «Дыханне агню» (1983), аднатомнікі выбраных твораў А. Марціновіча «Накцюрн» (1969), В. Каваля «Выбранае» (1975), М. Гарэцкага «Чырвоныя ружы» (1976), М. Ваданосава «Надзеі і здзяйсненні» (1979), аповесці Р. Няхая «Туман

над стэпам» і «Алёшка-атаман» (1974), «Аповесць пра добрае сэрца» П. Кавалёва (1976), І. Навуменкі «Апошняя восень (1977), М. Гроднева «Што скажуць людзі» (1978), М. Парахневіча «Маленства маё і тваё» (1978) і інш.

---

## *Алесь САЛАГУБ*



Алесь Салагуб (Аляксей Феафілавіч Салагуб) нарадзіўся 18.10.1906 г. у вёсцы Зарудзічы Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Віленскую беларускую гімназію (1927). За рэвалюцыйную дзейнасць двойчы быў зняволены польскімі ўладамі ў турму (1924, 1927). У 1928 г. нелегальна перайшоў польска-савецкую граніцу, жыў у Мінску. Скончыў Беларускі дзяржаўны універсітэт (1931). Вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры і мастацтва АН БССР (1931—1933). Арыштаваны органамі АДПУ БССР 10. 8.1933 г. і па пастанове пазасудовага органа ад 9.1.1934 г. асуджаны да выключнай меры пакарання. Рэабілітаваны 16.8.1956 г.

Расстраляны 17.5.1934.

Свой першы цыкл вершаў напісаў у 1924 г. у турме. Друкаваўся з 1925 г. у прагрэсіўных заходнебеларускіх выданнях. У Мінску выйшаў зборнік вершаў «Лукішкі» (1929). Шэраг вершаў апублікаваны ў калектыўных зборніках «Сцягі і паходні» (1965), «Ростані волі» (1990).

У газеце «Звязда», часопісе «Полымя рэвалюцыі» змяшчаў артыкулы, у якіх асвятляў літаратурны рух у Заходняй Беларусі і Польшчы. Выступаў таксама і як публіцыст. Часопіс «Полымя» надрукаваў у 1961 г. «Лукішскі дзённік», які паэт вёў у зняволенні.

## *Уладзімір САЛАМАХА*



Уладзімір Пятровіч Саламаха нарадзіўся 24.3. 1949 г. у вёсцы Бераснёўка Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і рабочага.

Пасля заканчэння Скачкоўскай сярэдняй школы Кіраўскага раёна (1966) быў залічаны на працу карэктарам у рэдакцыю раённай газеты «Кіравец». У 1968—1970 гг. служыў у Савецкай Арміі. Пасля заканчэння факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1975) працаваў старшым рэдактарам Дзяржаўнага камітэта БССР па кінематаграфіі. З 1983 г. працуе ў рэдакцыі часопіса «Маладосць» — літсупрацоўнікам, цяпер загадчык аддзела публіцыстыкі. Член СП СССР з 1982 г.

У друку пачаў выступаць як журналіст з 1966 г. Першыя апавяданні апублікаваў у 1977 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар кніг прозы «На ўзмежку радасці» (1980), «Заўтра ў дарогу» (1985), «Кавалёк — лесавая былінка» (1988), «Цяпло чужога сэрца» (1990).

Па яго сцэнарыях зняты шэраг дакументальных і мультыплікацыйных фільмаў.

## *Янка САЛАМЕВІЧ*



Янка (Іван Уладзіміравіч) Саламевіч нарадзіўся 29.10.1938 г. у вёсцы Малая Кракотка (у 1969 г. аб'яднана ў вёску Вялікая Кракотка) Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1960). Працаваў карэктарам, тэхнічным рэдактарам выдавецкага аддзела Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя У. І. Леніна (1960—1962), рэдактарам у выдавецтве Міністэрства вышэйшай, сярэдняй спецыяльнай і прафесійнай адукацыі (цяпер «Вышэйшая школа»). У 1967 г. скончыў аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры БДУ. З 1968 г. працуе ў Галоўнай рэдакцыі БелСЭ (з 1980 г.— выдавецтва БелСЭ імя П. Броўкі) —

старшым навуковым рэдактарам, з 1976 г.— загадчыкам навуковай рэдакцыі народнай асветы і беларускіх слоўнікаў. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1989 г.

Упершыню ў друку выступіў у 1955 г. (слонімская раённая газета «Вольная праца»), у рэспубліканскім — у 1957 г. Аўтар манаграфіі «Міхал Федароўскі» (1972), «Слоўніка беларускіх псеўданімаў і крыптанімаў XVI—XX стст.» (1983).

Склаў бібліяграфічны даведнік «Беларускі фальклор. 1926—1963» (1964), вучэбны дапаможнік для студэнтаў ВНУ «Беларуская дзіцячая літаратура: Хрэстаматыя» (з А. Налівайкам, М. Пятровічам, 1966), анталогію «Беларуская балада» (1978), выбраныя творы «Доля і хлеб» Г. Леўчыка (з Н. Ляшковіч, 1980), зборнікі «Беларускія загадкі (1982, 1989), «Мама Мышка сушыла шышкі» (беларускія народныя скорагаворкі, 1983), зборнік «Максім Гарэцкі: Успаміны, артыкулы, дакументы» (з А. Лісам, 1984), адзін са складальнікаў беларускага літаратурна-мастацкага календара «Кола дзён» (1987, 1988).

Перакладае з рускай, украінскай, польскай моў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за ўдзел у стварэнні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

---

## *Аляксандр САЛАЎЁЎ*



Аляксандр Гаўрылавіч Салаўёў нарадзіўся 15.2. 1932 г. у сяле Старашашмінск Ніжнякамскага раёна (Татарская АССР) у рабочай сям'і.

Скончыў Чыстапольскі тэхнікум механізацыі сельскай гаспадаркі (1949), Казанскае военна-авіяцыйнае вучылішча (1951), Ленінградскую Чырванасцяжную Ваенна-паветраную акадэмію імя А. Ф. Мажайскага (1961). Служыў у Забайкальскай, Туркестанскай, Сярэднеазіяцкай, Прыкарпацкай венных акругах. У 1982 г. звольнены ў запас. З 1983 г. жыў у Мінску. Член СП СССР з 1983 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 9.12. 1986 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1957 г. у армейскай газеце «На страже Родины» (Ленінградская ваенная акруга). Пісаў на рускай мове. Аўтар зборнікаў паэзіі «Траектории радуг» (Ужгарад, 1978), «Продолжение крыльев» (Масква, 1981).

## *Алег* САЛТУК



Алег Уладзіміравіч Салтук нарадзіўся 25.8. 1946 г. у вёсцы Рыжэнькі Шумілінскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1963 г. скончыў Мішкаўскую сярэднюю школу Шумілінскага раёна і паступіў на аддзяленне рускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Магілёўскага педагагічнага інстытута. Пасля заканчэння інстытута служыў у Савецкай Арміі (1967—1968). У 1969—1973 гг.— адказны сакратар ушацкай раённай газеты «Патрыёт». У 1974—1979 гг.— уласны карэспандэнт абласной газеты «Віцебскі рабочы», з 1980 г.— сакратар Віцебскага абласнога аддзялення СП БССР. Член СП СССР з 1977 г.

Узнагароджаны медалямі.

Першыя вершы надрукаваў у 1965 г. (газета «Віцебскі рабочы»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Пачатак дня» (1974), «Працяг» (1977), «Святло зямлі» (вершы і паэмы, 1982), «На далонях жыцця» (вершы і паэма, 1988).

## *Эдуард* САМУЙЛЁНАК



Эдуард Людвігавіч Самуйлёнак нарадзіўся 5.8. 1907 г. у горадзе Пецярбургу (Расія) у сям'і рабочага.

Вучыўся ў польскай гімназіі (Петраград). Юнацкія гады правёў на радзіме бацькі ў вёсцы Бандзелі Верхнядзвінскага раёна. Хадзіў пільшчыкам па вёсках, займаўся самаадукацыяй. Загадваў хатай-чытальняй, быў сакратаром камсамольскай ячэйкі Росіцкага сельсавета. У 1929—1930 гг. служыў у Чырвонай Арміі. Працаваў у рэдакцыях газет «Чырвоная Полаччына» (1930—1933), «Літаратура і мастацтва»

(1934—1939). Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Памёр 12.2.1939 г.

Дэбютаваў вершам у 1928 г. (газета «Чырвоная Полаччына»). Першае апавяданне «Апошні заказ» апублікаваў у 1929 г. таксама ў «Чырвонай Полаччыне». Выйшлі аповесць «Тэорыя Каленбрун» (1934), зборнікі апавяданняў «Пункт апоры» (1935), «Дачка эскадрона» (1937), «Паляўнічае шчасце» (1950), «Апавяданні» (1958, 1967), раман «Будучыня» (1938), апавяданне «Пагібель воўка» (1939), «Апавяданні і аповесць» (1977), кнігі Выбраных твораў (1940, 1948), «Выбраных апавяданняў» (1946), Збор твораў у 2 тамах (1952).

Аўтар п'ес «Сяржант Дроб» (інсцэніроўка аповесці «Тэорыя Каленбрун», апублікавана і пастаўлена ў 1935), «Пагібель воўка» (апублікавана і пастаўлена ў 1939).

---

## *Ганна САПРЫКА*



Ганна Іосіфаўна Сапрыка нарадзілася 16.6. 1911 г. у вёсцы Куркаўшчына Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Мсціслаўскага педагагічнага тэхнікума (1930) працавала настаўніцай на Віцебшчыне. У 1931 г. пераехала ў Мінск, у 1933 г. скончыла газетна-выдавецкае аддзяленне Мінскага педагагічнага інстытута. З 1933 г. працавала ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве.

Памерла 14.5.1962 г.

Першы верш надрукавала ў 1926 г. (часопіс «Маладыя араты»). У 1959 г. выйшла кніга прозы «Калі ў сэрцы вясна».

На беларускую мову пераклала «Апавяданні кітайскіх пісьменнікаў» (1953), кнігу Я. Галана «З крыжам ці з нажом» (1954), В. Авечкіна «Раённыя будні» (з М. Герасімовіч, 1958), М. Вірты «Мой памочнік Карсыбек» (1961) і інш.

*Васіль* САХАРЧУК



Васіль Якаўлевіч Сахарчук нарадзіўся 10.7. 1953 г. у вёсцы Свадзьбічы Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1970 г. скончыў Равяціцкую сярэднюю школу і паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння універсітэта (1975) настаўнічаў у Касцюкоўскай васьмігадовай і Обчынскай сярэдняй школах Любанскага раёна, затым у Высокаўскай сярэдняй школе Бярозаўскага раёна. З 1979 г. жыве ў г. Жабінка Брэсцкай вобласці, працуе карэспандэнтам мясцовай раённай газеты «Сельская праўда». Член СП СССР з 1988 г.

З вершамі выступіў у 1971 г. у калектыўным зборніку «Універсітэт паэтычны». Аўтар кніжак паэзіі «Зорны мост» (у калектыўным зборніку «Крыло», 1984) і «Даніна» (1988).

Працуе таксама ў галіне перакладу. У яго перакладзе з балгарскай мовы выйшаў зборнік паэзіі П. Яварава «Апалавы пярсцёнак» (1988).

*Барыс* САЧАНКА



Барыс Іванавіч Сачанка нарадзіўся 15.5.1936 г. у вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і рабочага хімлясгаса.

У чэрвені 1943 г. разам з бацькамі быў вывезены ў Германію. Вярнуўся на радзіму ў 1945 г. У 1960 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У час вучобы ва універсітэце (з 1958) пачаў працаваць у часопісе «Вожык». У 1960—1976 гг. працаваў у аддзеле прозы часопіса «Полымя», у 1976—1986 гг.— сакратар праўлення СП БССР. З 1986 г.— загадчык рэдакцыі перакладной замежнай літаратуры выдавецтва «Мастацкая літаратура». Прымаў удзел у рабоце XXXV сесіі Генеральнай Асамблеі ААН (1980). Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалём Францыска Скарыны.

Першае апавяданне надрукаваў у 1956 г.

(часопіс «Маладосць»). Аўтар кніг прозы «Дарога ішла праз лес» (1960), «Барвы ранняй восені» (1962), «Зямля маіх продкаў» (1964), «Пакуль не развіднела» (1966), «Апошнія і першыя» (1968), «Дарогі» і «Аксана» (1971), «Памяць» (1973), «Тры аповесці» (1976), «Ваўчыца з Чортавай Ямы» (1978), «Горкая радасць вяртання» (1987), «Вечны кругазварот» і «Родны кут» (1989), рамана «Чужое неба» (1975), трылогіі «Вялікі Лес» (1980, 1982, 1984), кніг гумару і сатыры «Вол-фігурыст» (1966), «Халасцяк» (1969), кніг крытыкі і эсэістыкі «Жывое жыццё» (1985), «Сняцца сны аб Беларусі...» (1990), кніг для дзяцей «Кошык малін» (1986) і «Бабка Адарка» (1987). У 1981 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

Пераклаў на беларускую мову аповесць Я. Гуцалы «Школьны хлеб» (1976), П. Андрэева (П. Абрасімава) «Аповесць пра майго сябра» (1979), кнігу аповесцей і апавяданняў І. Андрыча «Трывожны год» (1978), п'есы А. Салынскага «Барабаншчыца» (пастаўлена ў 1978) і А. Галіна «Апошняе спатканне» (пастаўлена ў 1980), паасобныя творы М. Прышвіна, С. Нікіціна, У. Багамолава, П. Мірнага, М. Кацюбінскага, Ф. Крайцвальда і інш.

Укладальнік кніг аповесцей і апавяданняў Я. Гушчы «Пан Грацыян і іншыя» (1976), Я. Івашкевіча «Дзяўчына і галубы» (1977), выбранай прозы М. Булгакава (1985), Ф. Салагуба (1987), Б. Пільняка (1988), У. Набокава (1989), зборніка паэзіі Л. Геніюш «Белы сон» (1990), двухтомнай «Анталогіі рускага савецкага апавядання» (1987). У часопісах «Полымя», «Маладосць», «Спадчына», штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва» апублікаваў (з прадмовамі і каментарыямі) забытыя ці малавядомыя і зусім невядомыя творы Я. Купалы, Я. Коласа, В. Ластоўскага, К. Сваяка, Л. Геніюш, У. Жылкі, У. Клішэвіча, А. Салаўя і інш. Напісаў сцэнарый дакументальнага фільма «Алесь Гарун» (зняты ў 1990).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1982) за кнігу «Ваўчыца з Чортавай Ямы», Літаратурнай прэміі СП Беларусі імя І. Мележа (1991) за кнігу «Сняцца сны аб Беларусі...».

## *Казімір СВАЯК*



Казімір Сваяк (Канстанцін Мацвеевіч Стаповіч) нарадзіўся 19.2.1890 г. у вёсцы Барані Астравецкага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і лесніка.

У 1905 г. скончыў гарадскую школу ў Свянцянах. У 1906 г. прыехаў у Вільню, з 1908 г. вучыўся там у каталіцкай духоўнай семінарыі. у 1913 г. з-за хваробы на сухоты вярнуўся на радзіму і толькі ў 1914 г. скончыў духоўную семінарыю. Быў вікарыем у парафіі Камаі каля Свянцян, затым перавёўся ў Клюшчаны. Набажэнства вёў па-беларуску. Арганізаваў кароткія настаўніцкія курсы (1915), а таксама шэраг беларускіх школ. У канцы 1916 г. пераведзены ў Карыціна на Беласточчыне. У 1919 г. жыў у вёсцы Лапеніцы пад Ваўкавыскам. З 1920 г.— зноў у Клюшчанах, затым у Засвіры.

Памёр 6.5.1926 г. у Вільні.

Першы верш апублікаваў у 1913 г. (газета «Беларус»). Аўтар зборніка вершаў «Мая ліра» (Вільня, 1924), апавядання вершам «Чарку дай, браце» (Вільня, 1926). Дваццаць пяць вершаў надрукаваны ў калектыўным зборніку «Ростані волі» (1990).

Выступаў і як публіцыст, асветнік з эсэ, артыкуламі рэлігійнага і літаратурна-крытычнага зместу (нарыс аб творчасці Ф. Багушэвіча, нататка аб аповесці «Дзве душы» М. Гарэцкага і інш.). У 1913 г. у Вільні выдадзена брашура «Алкаголь», у 1932 г.— яго філасофскі дзённік «Дзеля маёй мыслі, сэрца і волі».

Пісаў драматургічныя творы (ставіліся самадзейнымі калектывамі). Асобнымі выданнямі выйшлі «Янка Канцавы» (Вільня, 1920, 1924), «Купалле» (Вільня, 1930).



## *Юрась* СВІРКА

Юрась (Юрый Мікалаевіч) Свірка нарадзіўся 6.5.1933 г. у вёсцы Маргавіца Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1959). Працаваў у часопісе «Коммунист Белоруссии» (1959), газеце «Чырвоная змена» (1960—1961), на Беларускім радыё (1961—1975). З 1975 г.— загадчык аддзела прозы і паэзіі газеты «Літаратура і мастацтва». Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны медалём.

Першыя вершы апублікаваў у 1953 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Шэпчуцца ліўні» (1959), «Вечнасць» (1963), «Баравіна» (1967), «Крэўнасць» (1971), «Аўтограф» (1974), «Люблю і веру» (1975), «Памятная вярста» (1978), «Біяграфія памяці» (1981), «Ядранасць» (1983), «Паўшар'е блакіту» (1986), «Кружка з пясчаным дном» (1990).

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы А. Пушкіна, А. Фета, Ф. Цютчава, Б. Пастарнака, А. Твардоўскага, М. Ціханава, М. Браўна, Я. Смелякова, М. Луконіна, М. Дудзіна, А. Жыгуліна, вершы ўкраінскіх, літоўскіх, малдаўскіх, грузінскіх, азербайджанскіх, армянскіх, узбекскіх, татарскіх, асецінскіх, чувашскіх паэтаў.



## *Рыгор* СЕМАШКЕВІЧ

Рыгор Міхайлавіч Семашкевіч нарадзіўся 12.9. 1945 г. у вёсцы Дамашы Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1966 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў дырэктарам Малінаўскай васьмігадовай школы Смаргонскага раёна. У 1967—1969 гг.— аспірант кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна. З 1970 г. выкладаў беларускую літаратуру ў гэтым жа універсітэце. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Член СП СССР з 1969 г.

Памёр 11.6.1982 г.

У друку пачаў выступаць з вершамі ў 1960 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Леснічоўка» (1968), «Субота» (1973), аповесці «Бацька ў калаўроце» (1976), кнігі «Лічыла дні зязюля» (вершы, аповесці, эсэ, 1987).

Напісаў літаратуразнаўчыя працы «Браніслаў Эпімах-Шыпіла» (1968) і «Беларускі літаратурна-грамадскі рух у Пецярбурзе» (1971), кнігу «Выпрабаванне любоўю» (эсэ, артыкулы, 1982).

---

## *Язэп* СЕМЯЖОН



Язэп Семяжон (Іосіф Ігнатавіч Семяжонаў) нарадзіўся 16.11.1914 г. у вёсцы Пятровічы Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і лесніка.

Пасля заканчэння Смілавіцкай сярэдняй школы (1930) працаваў у калгасе рахункаводам, вучыўся на драматычных курсах у Мінску. У 1932—1934 гг.— акцёр Трэцяга беларускага дзяржаўнага тэатра. Скончыў факультэт замежных моў Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1938). У 1938—1940 гг. служыў у Чырвонай Арміі, удзельнічаў у паходзе ў Заходнюю Беларусь, у савецка-фінляндскай вайне. Потым настаўнічаў у роднай вёсцы. У 1941—1945 гг. удзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне. Дэмабілізаваўся ў 1959 г. Выкладаў замежныя мовы ў Мінскім суворараўскім вучылішчы (1953—1960), у Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна (1961—1975), адначасова працаваў у рэдакцыі часопіса «Беларусь» (1962—1967). Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, Айчыннай вайны I ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, польскім ордэнам Залатой Зоркі Заслугі і медалямі.

Памёр 16.8.1990 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1931 г. з вершаў. Перакладамі стаў займацца з 1938 г. Перакладаў з англійскай, французскай, нямецкай, італьянскай, польскай, чэшскай, славацкай, рускай, літоўскай і іншых моў. У яго перакладзе выйшлі «Кароль Лір» У. Шэкспіра («Тра-

гедыі», 1954), кніжка паэзіі Дж. Радары «Неаполь без сонца» (1955), Р. Бёрнса «Шатландская слава» (1957) і «Вам слова, Джон Ячмень» (1983), раман М. Твэна «Жанна д'Арк» (з Н. Цімафеевай, 1961), зборнік класічнай і сучаснай паэзіі В'етнама «Апалены лотас» (1968), паэма беларускага паэта-лаціціста М. Гусоўскага «Песня пра зубра» (1973), кніга выбраных перакладаў паэзіі «Сем цудаў свету» (1977), раман Г. Ота «Пара ў дарогу, буслы!» (з У. Чапегам, 1982), паэма А. Міцкевіча «Пан Тадэвуш» (1985), зборнік Дж. Байрана «Лірыка» (1989), камедыі У. Шэкспіра «Дванаццатая ноч, альбо Чаго пажадаеце», «Утаймаванне наравістай» (зборнік У. Шэкспіра «Тры камедыі», 1989).

Выступаў з артыкуламі па пытаннях мастацкага перакладу.

---

## *Антон* СЕМЯНОВІЧ



Антон Аляксандравіч Семяновіч нарадзіўся 5.8.1917 г. у вёсцы Шабунеўшчына Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1934—1938 гг. працаваў слесарам на заводзе імя К. Варашылава ў Мінску, у 1938—1941 гг. вучыўся на літаратурным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (скончыў у 1945). У час Вялікай Айчыннай вайны (з кастрычніка 1943) сувязны партызанскага атрада імя Д. Фурманава (Дзяржынскі раён). У пасляваенныя гады настаўнічаў у Івацэвічах на Брэстчыне (1945—1946), вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР (1946—1949). Быў навуковым супрацоўнікам Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1949—1963). З 1963 г.— дацэнт кафедры рускай і зарубежнай літаратур, з 1971 па 1989 гг.— загадчык кафедры беларускай літаратуры Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Доктар філалагічных навук, прафесар. Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Як крытык і літаратуразнавец выступае з 1949 г. Аўтар манаграфій «Проза Якуба Коласа

(дакастрычніцкі перыяд)» (1953), «Беларуская драматургія (дакастрычніцкі перыяд)» (1961), «Беларуская савецкая драматургія. 1917—1932» (1968), «Ад вытокаў да сталасці: Беларуская драматургія 1917—1945 гг.» (1978), брашур «Кандрат Крапіва» (1956), «Змітрок Бядуля» (1960). Адзін з аўтараў падручніка для сярэдняй школы «Беларуская літаратура» (1949), «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964—1966), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), падручнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў педінстытутаў БССР «Гісторыя беларускай літаратуры. XIX—пачатак XX ст.» (1981), «Гісторыя беларускай савецкай літаратуры. 1917—1940» (1981), зборніка навуковых артыкулаў «Янка Купала і Якуб Колас: Некаторыя аспекты творчасці» (1982), аўтар вучэбных дапаможнікаў для студэнтаў філалагічных факультэтаў вышэйшых навучальных устаноў БССР «Гісторыя беларускай драматургіі. XIX — пачатак XX ст.» (1985), «Гісторыя беларускай савецкай драматургіі. 1917—1955» (1990).

---

## *Анатоль* СЕРБАНТОВІЧ



Анатоль Станіслававіч Сербантовіч нарадзіўся 13.5.1941 г. у вёсцы Ордаць Шклоўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўніка.

У 1960 г. экстэрнам здаў экзамены за дзесяць класаў у Роска-Сялецкай сярэдняй школе Аршанскага раёна і паступіў на аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Адначасна з вучобай (з 1963) і пасля заканчэння універсітэта (1965) быў літсупрацоўнікам часопіса «Бярозка», з 1969 г.— газеты «Піянер Беларусі». Член СП СССР з 1967 г.

Памёр 21.3.1970 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1959 г. (газета «Магілёўская праўда»). Выйшлі зборнікі паэзіі «Азбука» (1966), «Мінная поле» (1968), «Пярсцёнак» (1971), «Жаваранак у зеніце» (1989).

## *Мікола* СЕРГІЕВІЧ



Мікола (Мікалай Антонавіч) Сергіевіч нарадзіўся 3.9.1921 г. у вёсцы Залессе Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі хіміка-тэхналагічны тэхнікум (1937), Аршанскі настаўніцкі інстытут (1939). Працаваў настаўнікам у Глоданскай сямігодцы Лёзненскага раёна (1931—1941). Завочна скончыў факультэт мовы і літаратуры Магілёўскага педагагічнага інстытута (1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны быў партызанскім сувязным, рэдактарам старобінскай падпольнай раённай газеты «Савецкі патрыёт». Пасля вайны працаваў рэдактарам старобінскай раённай газеты, у рэдакцыях рэспубліканскіх, цэнтральных газет. У 1955—1959 гг.— старшыня калгаса «Чырвоны пуцілавец» Старобінскага раёна. У 1959—1981 гг. працаваў у часопісе «Народная асвета». Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1947 г. з нарысаў. Аўтар кніг нарысаў «На роднай зямлі» (1956), «Нашы будні» (1957) і «Будні калгасныя» (1959).

Напісаў п'есу «Смех і... толькі» (пастаўлена ў 1975).

## *Юльян* СЕРГІЕВІЧ



Юльян Іосіфавіч Сергіевіч нарадзіўся 23.9. 1910 г. у вёсцы Юраўшчына Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў пачатковай школе, а далей займаўся самаадукацыяй. Працаваў на сельскай гаспадарцы. Пасля службы ў польскай арміі (1932—1933) скончыў сельскагаспадарчыя курсы. Быў актывістам Беларускай сялянска-рабочай грамады і Таварыства беларускай школы. Пісаў сцэнарыі для самадзейных калектываў. Пад час нападу Германіі на Польшчу (1939) трапіў у палон як салдат польскага войска. Знаходзіўся ў розных лагерах, на рабоце ў нямецкага баўэра. У савецкі час працаваў настаў-

нікам пачатковай школы на Маладзечаншчыне. Быў рэпрэсіраваны, жыў у Сібіры і Казахстане. Пасля рэабілітацыі працаваў у калгасе імя Леніна Маладзечанскага раёна.

Памёр 4.10.1976 г.

Друкавацца пачаў у 1922 г. Выступаў у калектыўным зборніку заходнебеларускіх пісьменнікаў «Рунь веснаходу» (Вільня, 1928), у часопісах «Маланка», «Шлях моладзі» і інш. У 1939 г. меў выйсці падрыхтаваны да друку зборнік паэзіі, аднак 17 верасня лісты кнігі былі раскіданы і зборнік не выйшаў. Асобныя творы ўключаны ў зборнік «Ростані волі» (1990).

---

## *Васіль СЁМУХА*



Васіль Сяргеевіч Сёмуха нарадзіўся 18.1.1936 г. на хутары Ясенец Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і лесніка.

Рана застаўся без бацькоў — у 1942 г. яны былі расстраляны фашыстамі. Скончыў раманагерманскае аддзяленне філалагічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя М. В. Ламаносава (1959). Працаваў рэдактарам у Беларускім дзяржаўным выдавецтве (1959—1964), інжынерам у сектары тэхінфармацыі СКБ-3 на Мінскім трактарным заводзе (1964—1965), выкладчыкам нямецкай мовы ў школе (1966—1967), літсупрацоўнікам газеты «Літаратура і мастацтва» (1967—1972). Па сумяшчальніцтве выкладаў нямецкую мову ў БДУ імя У. І. Леніна (1966—1970). З 1972 г.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1977 г.

У друку пачаў выступаць у 1959 г. Перакладае з нямецкай, латышскай, польскай моў. У яго перакладзе выйшлі В. Брэдэль «Ад Эбра да Волгі» (1959), А. Рэн «Вайна без бітвы» (1962), Ё.-В. Гётэ «Фаўст» (1976), Г. дэ Бройн «Прысуджэнне прэміі» (1977), Г. Гофэ «Фінальны акорд» (з М. Навіцкім, 1979), Г. Фалада «Даўным-даўно ў нас дома...» (1981), Р.-М. Рыльке «Санеты Арфею» (1982), Ю. Тувім «Польскія кветкі» (1984), В. Бэлшавіца «Белы алень» (1985), Я. Райніс «Агонь і ноч» (1988),

К. Шэрман «Сны» (з Р. Барадуліным, 1989), К. Маркс «Лірыка» (1989), Т. Ман «Доктар Фаўстус» (1989), зборнік выбраных перакладаў «Прыйдзі, стваральны дух» (1986). Пераклаў Стары Запавет (асобныя раздзелы надрукаваны ў «Даляглядах», 1990).

Для Віцебскага тэатра імя Якуба Коласа пераклаў драму Ф. Шылера «Марыя Сцюарт» (пастаўлена ў 1968), п'есы О'Ніла «Каханне пад вязамі» (пастаўлена ў 1987), Н. Саймана «Гэты палкі каханак» (пастаўлена ў 1988).

---

## *Давід* СІМАНОВІЧ



Давід Рыгоравіч Сімановіч нарадзіўся 26.6. 1932 г. у горадзе Нароўлі Гомельскай вобласці ў сям'і служачага.

У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Ферганскай вобласці (Узбекістан). Пасля заканчэння Нараўлянскай сярэдняй школы (1950) паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў у 1955). Працаваў настаўнікам рускай мовы і літаратуры Крынкаўскай сярэдняй школы Лёзненскага раёна (1955—1959), літсупрацоўнікам рэдакцыі абласной газеты «Віцебскі рабочы» (1959—1960). З 1961 г.— рэдактар, потым загадчык аддзела на Віцебскім тэлебачанні. У 1971—1980 гг. узначальваў Віцебскае абласное літаратурнае аб'яднанне. Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджаны медалём.

Першыя вершы надрукаваў у 1948 г. (мазырская абласная газета «Бальшавік Палесся» і «Зорька»). Піша на рускай мове. Выдаў кнігі лірыкі «Весенняя сказка» (1959), «Июнь-река» (1962), «Равноденствие» (1966), «Минуты» (1969), «Станция тревоги и любви» (1972), «Письмо тебе» (1975), «Встречные поезда» (1978), «Силуэты дней» (1981), «Солнечный хмель» (1982), «Сентябри» (1990), зборнікі вершаў для дзяцей «Волшебный луг» (1959), «Зелёный кузнечик» (1968), кнігі нарысаў «Подорожная Александра Пушкина» (1977), «Сквозь даль времен» (1984).

Аўтар тэлеп'ес «Якаў Свярдлоў» (пастаўлена

ў 1963), «Асенні букет» (пастаўлена ў 1964), сцэнарыяў для тэлефільмаў «Маладосць старажытнага горада» (пастаўлены ў 1964), «Балада пра чырвонага кавалерыста» (пастаўлены ў 1968).

Перакладае на рускую мову творы беларускіх паэтаў і паэтаў братніх рэспублік.

---

## *Іван* СІНЯЎСКІ



Іван Іванавіч Сіняўскі нарадзіўся 22.6.1919 г. у вёсцы Жажэлка Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага (1941). З канца 1942 г.— сувязны Смалявіцкага падпольнага райкома партыі, з красавіка 1943 г.— партызан атрада імя В. Чкалава ў брыгадзе «Смерць фашызму». Пасля вызвалення Беларусі некалькі месяцаў працаваў інспектарам Смалявіцкага рана, а затым быў прызваны ў Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях за вызваленне Варшавы, у Памераніі, за ўзяцце Берліна. З 1946 г. працаваў дырэктарам Жажэлкаўскай сямігадовай школы, у 1953—1983 гг.— выкладчык беларускай мовы і літаратуры гэтай школы. Жыве ў Жодзіна. Член СП СССР з 1959 г.

Узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Дэбютаваў вершамі ў раённай газеце «Шлях калектывізацыі» пад час вучобы ў школе. Для дзяцей напісаў зборнік апавяданняў «У навальніцу» (1949), «Новая школа» (1951), «Піянерскі гальштук» (1955), «Дабрадзейка» (1960), «Ой, рэчанька, рэчанька» (1962), «Марка» (1969) і аповесць «На правым флангу» (1964). Выйшлі кнігі аповесцей і апавяданняў «Вернасць» (1971), «А вяселля не было» (1989), раман «Дарога на Замлынне» (1980).

## *Янка* СІПАКОЎ



Янка (Іван Данілавіч) Сіпакоў нарадзіўся 15.1. 1936 г. у вёсцы Зубрэвічы Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Рана страціў бацькоў — у час Вялікай Айчыннай вайны за сувязь з партызанамі іх закатавалі фашысты. Вучыўся ў Зубрэвіцкай сярэдняй школе і адначасова працаваў паштальёнам. Пасля дзесяцігодкі некаторы час (1954—1955) быў літсупрацоўнікам шклоўскай раённай газеты «Чырвоны барацьбіт». У 1960 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у часопісе «Вожык» (1960—1973). З 1973 г.— загадчык аддзела мастацтва, крытыкі і бібліяграфіі, з 1989 г.— адказны сакратар) часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1961 г.

Першы верш надрукаваў у 1953 г. у аршанскай раённай газеце «Ленінскі прызыў». Выдаў кнігі паэзіі «Сонечны дождж» (1960), «Лірычны вырай» (1965), «Дзень» (1968), «З вясны ў лета» (1972), «Веча славянскіх балад» (1973), «У поўдзень, да вады» (1976), «Вочы ў вочы» (выбранае 1978), «Усміхніся мне» (1984), а таксама зборнікі гумарэсак «Лысы юбілей» (1965), «Плюс на мінус» (1973), «Ланцугі для мух» (1980), «Пятніца ў суботу» (1988).

Аўтар кніг нарысаў «Па зялёную маланку» (1971), аповесцей і апавяданняў «Крыло цішыні» (1976), «Жанчына сярод мужчын» (1980), «Усе мы з хат» (1982), «Спадзяванне на радасць» (1983), «Пяць струн» (1984), «Сад людзей» (1985), «Журба ў стылі рэтра» (1990). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1985).

Пераклаў на беларускую мову кнігі паэзіі — «Лісце травы» У. Уітмена (1978), «Турэмны дзённік» Хо Шы Міна (1985), «Санеты byды» Ф. Прэшарна (1987), паасобныя творы А. Пушкіна, А. Міцкевіча, Т. Шаўчэнкі, А. Блока, А. Туманяна, А. Цэрэтэлі, С. Квазімоды, Д. Максімовіч, І. Межэлайціса, І. Сарайліча, Р. Гамзатава, Д. Паўлычкі, А. Сійга, Ю. Марцінкявічуса, Г. Эміна, А. Малдоніса, А. Салакауры, урыўкі з «Калевалы» і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за кнігу паэзіі «Веча славянскіх балад».

## *Іван* СІЎЦОЎ



Іван Кузьміч Сіўцоў нарадзіўся 27.12.1922 г. у вёсцы Бакунавічы Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Чэрыкаўскую сярэднюю школу (1940) і паступіў у Ленінградскае авіятэхнічнае вучылішча. У час Вялікай Айчыннай вайны — авіямеханік, ваяваў пад Сталінградам. З прычыны цяжкай хваробы дэмабілізаваны (1944). Два гады працаваў у Чэрыкаўскім райкоме партыі. У 1948 г. скончыў рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ. Працаваў у Магілёўскім абкоме партыі інструктарам, загадчыкам сектара друку (1948—1950), у рэдакцыях часопісаў «Бярозка» (1950—1952), «Беларусь» (з 1952). Член СП СССР з 1945 г.

Памёр 9.11.1959 г.

Некалькі вершаў змясціў у франтавым друку. Аўтар аповесці для дзяцей «Самыя юныя» (1949, 1961), рамана «Нягоды і радасці» (1960).

## *Уладзімір* СІЎЧЫКАЎ



Уладзімір Мікалаевіч Сіўчыкаў нарадзіўся 3.5.1958 г. у горадзе Жодзіна Мінскай вобласці ў сям'і служачых.

Скончыў педагагічнае аддзяленне Мінскага мастацкага вучылішча імя А. Глебава (1977). Працаваў настаўнікам малявання і чарчэння ў Траянаўскай сярэдняй школе Барысаўскага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1977—1979). Быў мастаком-афарміцелем у Мінскім палацы культуры і спорту чыгуначнікаў (1979—1983). У 1981 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (пад час вучобы праходзіў стажыроўку ў Тбіліскім дзяржаўным універсітэце, дзе вывучаў грузінскую мову і літаратуру). Пасля заканчэння універсітэта (1986) — рэдактар аддзела літаратуры і мастацтва, у 1989—1990 гг.— адказны сакратар часопіса «Бярозка». З 1990 г.— прэзідэнт Беларускай асацыяцыі дэтэктыўнага, прыгодніцкага і палітычнага рамана. Член СП СССР з 1990 г.

У друку выступае з 1982 г. Аўтар кнігі вершаў «Адліга» (калектыўны зборнік «Лагодны прамень раніцы», 1988), адзін з аўтараў зборніка апавяданняў «Жнівеньскі праспект» (1988).

Працуе таксама ў галіне перакладу. У яго перакладзе з грузінскай мовы на беларускую апублікаваны раман Н. Думбадзе «Закон вечнасці» (1988), шэраг вершаў і паэм у «Анталогіі грузінскай паэзіі» ў 2 тамах (1989).

---

## *Іван* СКАРЫНКІН



Іван Яфімавіч Скарынкін нарадзіўся 26.11. 1919 г. у вёсцы Тратнае Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1939 г. паступіў у Камуністычны інстытут журналістыкі (Мінск) і праз некалькі месяцаў быў прызваны ў Чырвоную Армію. У 1941—1942 гг. вучыўся ў ваенным авіявучылішчы сувязі (Харкаў, Ташкент). Накіраваны на Паўночна-Каўказскі фронт. У верасні 1942 г. пераведзены ў Забайкалле. Удзельнічаў у вайне з Японіяй. У 1946—1948 гг.— літсупрацоўнік дывізійнай газеты «Красный кавалерист». У 1952 г. скончыў рэдактарскі факультэт Ваенна-палітычнай акадэміі імя У. І. Леніна (Масква). З 1952 г.— спецкарэспандэнт газеты «Знамя победы» (Паўначная група войск), з 1958 г.— карэспандэнт, начальнік аддзела газеты Беларускай ваеннай акругі «Во славу Родины», у 1972—1985 гг.— старшы рэдактар выдавецтва «Беларусь». Член СП СССР з 1985 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Выступае ў друку з мастацкімі творамі з 1950 г. (газета «Во славу Родины»). Піша на рускай мове. Аўтар кніг нарысаў «Завещано отцами» (1974). «О чем шумят сосны» (Масква, 1980), аповесці «Право вести в бой» (1980), дакументальных аповесцей «Крепче стали» (1978), «Тугие ветры» (Масква, 1983), «В дымке полигонной» (1984), «Резерв комбата» (1988).

## *Уладзімір* СКАРЫНКІН



Уладзімір Максімавіч Скарынкін нарадзіўся 7.6.1939 г. у горадзе Віцебску ў сям'і служачага.

Скончыў Рыжскі інстытут інжынераў грамадзянскай авіяцыі імя Ленінскага камсамола (1961). Працаваў інжынерам у Мінскім аэрапорце. З 1970 г.— начальнік аварыйна-выратавальнай службы Беларускага ўпраўлення грамадзянскай авіяцыі, у 1982—1987 гг.— намеснік дырэктара бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР. Член СП СССР з 1970 г.

У друку дэбютаваў вершам у 1955 г. (газета «Піянер Беларусі»). Выдаў зборнікі паэзіі «Буслы над аэрадромам» (1969). «Гукавы бар'ер» (1972), «Дазвольце ўзлёт» (вершы і паэмы, 1975), «Чацвёрты разварот» (1979), «Вугал атакі» (вершы і паэмы, 1982), «Пасадачныя агні» (паэма, вершы, 1985), «Выратавальны плыт» (вершы, паэма, 1988).

Пераклаў на беларускую мову зборнік вершаў М. Рубцова «Рускі агеньчык» (1986).

## *Эдуард* СКОБЕЛЕЎ



Эдуард Марцінавіч Скобелеў нарадзіўся 8.12. 1935 г. у горадзе Мінску ў сям'і ваеннага інжынера-будаўніка.

У 1959 г. скончыў заходні факультэт Маскоўскага інстытута міжнародных адносін. Знаходзіўся на дыпламатычнай службе. З 1966 г. працуе ў апараце ЦК КПБ. Член СП СССР з 1970 г.

У друку выступае з 1964 г. Піша на рускай мове. Аўтар зборнікаў вершаў «Дорога» (1969), «Капли дождя» (1973), «Вечерние тени» (1977), «Земные долги» (1987), «Мой дом» (1988), кніг аповесцей «Чудо любви» (1975), «Выпускники» (1984), «Кристина» (1986), «Сегодня исповедь моя» (1988), раманаў «Шаги за твоей стеной» (1971), «Маятник надежды» (1978), «Мирослав — князь дреговичский» (1979), «Катастрофа» (1984), «Свидетель. Записки капитана Тимкова» (1987), «Беглец» (1989), а таксама кніг для дзяцей «Приключение Арбузика и Бе-

бешки» (1983, пад назвай «Полет в страну чудовищ» пастаўлены тэлефільм у 1986), «Пацаны купили остров» (1989).

Напісаў радыёп'есу «Дело доктора Дариэля» (пастаўлена ў 1979). Вершаваныя драматычныя творы ўвайшлі ў кнігі «Из тьмы светлеющие лики» (1983) і «Фигуры» (1986).

---

## *Ян* СКРЫГАН



Ян (Іван Аляксеевіч) Скрыган нарадзіўся 16.11.1905 г. у сяле Труханавічы Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля парафіяльна-царкоўнай школы (1918) вучыўся ў Слуцкім духоўным вучылішчы, у школах першай і другой ступені, у рэальным вучылішчы, мяшанай гімназіі, нарэшце, у Слуцкім сельскагаспадарчым тэхнікуме (пакінуў з чацвёртага курса, у 1924). З 1924 г. працаваў у слуцкай акруговай газеце «Вясковы будаўнік», пасля — загадчыкам Народнага дома ў Расонах, у рэдакцыі газеты «Чырвоная Полаччына». У 1928—1932 гг. вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педфака Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У 1933—1936 гг. працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва». Быў членам літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», «Літаратурна-мастацкая камуна». У канцы 1936 г. быў арыштаваны і 5.10.1937 г. асуджаны на 10 год зняволення ў лагерах і на 10 гадоў ссылкі. Пакаранне адбываў у Нова-Іванаўскім лагеры (пад Марыінскам). У ссылцы працаваў на нумарным заводзе ва Узбекістане, у сланцахімічнай прамысловасці ў Эстоніі, на новабудоўлях Краснаярскага краю. 29.12.1954 г. рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР. З 1955 г.— рэдактар у Дзяржаўным выдавецтве БССР, з 1959 г.— рэдактар аддзела прозы, потым намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Полымя». З 1967 г.— загадчык літаратурна-кантрольнай рэдакцыі Беларускай Савецкай Энцыклапедыі, у 1975—1985 гг.— адказны сакратар Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 18.9.1992 г.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1985).

Дэбютаваў у друку вершам у 1925 г. (слуцкая газета «Вясковы будаўнік»). Удзельнічаў у альманахах «Росквіт» (1925), «Наддзвінне» (1926), «Зарніцы» (1928), у калектыўным зборніку «Слуцкія песняры» (1926), у кнізе з гісторыі Магілёўскай шаўковай фабрыкі «На Цішоўскай пустэчы» (1931). Аўтар кніг апавяданняў, аповесцей «Затока ў бурах» (1929), «Каця Лапянкова» (1932), «Сустрэчы» (1935), «Апавяданні» (1956), «Наталя» (1957), «Няпрошаная сляза» (1958), «Скажы адно слова» (1961), «Свая аповесць» (1964), «Кругі» (выбранае, 1969), «Кругі» (аповесць з доказамі, 1986). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1975, 1985).

Напісаў кнігі ўспамінаў, партрэтаў, нататак і артыкулаў па праблемах літаратурнага майстэрства і культуры мовы «Ранішнія росы» (1965), «Некалькі хвілін чужога жыцця» (1979, 1990). Пераклаў на беларускую мову кнігі і асобныя творы А. Астроўскага, М. Горкага, І. Буніна, Ф. Гладкова, К. Федзіна, І. Бабеля, а таксама ўкраінскіх, літоўскіх, латышскіх, эстонскіх пісьменнікаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1976) за ўдзел у стварэнні Беларускай Савецкай Энцыклапедыі.

---

## *Міхась СКРЫПКА*



Міхась (Міхаіл Аляксандравіч) Скрыпка нарадзіўся 26.11.1907 г. у вёсцы Месціна Бярэзінскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Рагачоўскі педагагічны тэхнікум (1930). Настаўнічаў у Рагачоўскім раёне. У 1940 г. скончыў завочна літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. У час Вялікай Айчыннай вайны быў у партызанах, у 1944—1945 гг.— у Савецкай Арміі. Пасля вайны настаўнічаў у школах Магілёўшчыны і Міншчыны. У 1965—1971 гг. працаваў намеснікам дырэктара бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР.

Памёр 8.10.1991 г.

У друку ўпершыню выступіў у 1927 г. Выдаў зборнікі баек, вершаў, мініяцюр «Сатыра і гумар» (1958), «Сатырычны калаўрот» (1967), «Ад смеху не ўцячэш» (1975), зборнікі аповесцей, апавяданняў і гумарэсак «Мая хата не з краю» (1959), «Пад корань» (1962), «Усяк бывае...» (1963), «Шануючы вас» (1982), кніжку антырэлігійных нарысаў «Сцеражыся цемрашалаў!» (1964), «Дзіва ў кошыку» (1983), «Злазьце — прыехалі!» (1985), «З сэрцам і перцам» (1987), кніжку апавяданняў для дзяцей «Дзіва ў рэшаце» (1963) і вершаваны зборнік «Пад смешнай вясёлкай» (1971). У 1977 г. выйшла кніга выбраных твораў «І з перцам і з сэрцам».

Выступаў і як драматург. Напісаў сцэнарый кароткаметражнай тэлекамедыі «Акадэмік» (пастаўлена ў 1963). Аўтар звыш трыццаці аднаактовых п'ес, камедый для мастацкай самадзейнасці «Дадому» (1958), «Тэлеграма» (1959), «Землякі» (1962), «Чорт дапамог» (1963), «Навагодняя сустрэча» (1963), «Небяспечны госць» (1964), «На сваю галаву» (1966) і інш.

Перакладаў з рускай і ўкраінскай моў. Пераклаў асобныя вершы А. Твардоўскага, С. Маршака, С. Міхалкова, А. Барто, С. Алейніка, А. Вішні, П. Глазавога і інш.

---

## *Іосіф* СКУРКО



Іосіф Уладзіміравіч Скурко нарадзіўся 24.2. 1938 г. у вёсцы Пількаўшчына Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1956 г. скончыў Пастаўскую сярэднюю школу № 2 і стаў працаваць піянерважатым. Служыў у Савецкай Арміі (1957—1960). У 1965 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у ЦК ЛКСМБ (1965—1967), дырэктарам Бюро міжнароднага маладзёжнага турызму «Спадарожнік» (1967—1971), рэферэнтам у Савеце Міністраў БССР (1971—1974), палітычным аглядальнікам, каментатарам, загадчыкам аддзела, намеснікам галоўнага рэдактара літаратурна-драматычных

праграм Беларускага тэлебачання (1974—1989). Член СП СССР з 1986 г.

Узнагароджаны медалём.

Памёр 2.7.1989 г.

З вершамі ў друку выступіў у 1962 г. («Настаўніцкая газета»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Бацькоўскі парог» (1973). Асобныя вершы, пакладзеныя на музыку, сталі вядомымі песнямі («Верасы», «Бацькоўскі парог» і інш.).

Перакладаў творы рускіх, украінскіх і польскіх паэтаў. Напісаў сцэнарый дакументальнага фільма «Драугістэ — дружба».

---

## *Даір СЛАЎКОВІЧ*



Даір Фёдаравіч Слаўковіч нарадзіўся 21.9. 1932 г. у горадзе Мінску ў рабочай сям'і.

Хлапчуком быў паранены, кантужаны і ў выніку гэтага ў 1944 г. цяжка захварэў. Восем гадоў праляжаў, прыкаваны да ложка, самастойна вучыўся. Скончыў Уздзенскую сярэднюю школу імя А. С. Пушкіна (1954). Працаваў бібліятэкарам, потым загадчыкам уздзенскай раённай дзіцячай бібліятэкі, настаўнікам у школе. У 1960 г. завочна скончыў факультэт бібліяграфіі і бібліятэказнаўства Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. З 1977 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1970 г.

Выдатнік культуры СССР (1968).

Дэбютаваў вершамі (1946). Першае апавяданне надрукаваў у 1947 г. (часопіс «Затейник», Масква). Выдаў для дзяцей і юнацтва кнігі апавяданняў і аповесцей «Каласавічок» (1969), «Сцежкаю мужных» (1971), «Хвядоскавы канікулы» (1972), «Пачым фунт ліха» (1975), «Я вярнуся, мама» (1977), «Я ў рабочыя пайду» (1978), «Алесік едзе ў Красабор» (1981), «Алея Невядомага салдата» (1981), «Гвардзейскі знак» (1982). Аўтар зборніка гумару і сатыры «Фірменны сродак» (1976), кнігі нарысаў «Библиотекарь» (1983).

Напісаў п'есы «Крутадух» (1980), «Барацьба за градус» (1983), «Беражыце мужчын» (1984), «Даеш хуткасны!» (1985).

Пераклаў з нямецкай кнігу В. Гаўфа «Маленькі Мук» (1977).

## *Аляксей СЛЕСАРЭНКА*



Аляксей Аляксеевіч Слесарэнка нарадзіўся 7.3.1919 г. у горадзе Кіеве (Украіна) у сям'і служачага.

У 1924 г. бацькі вярнуліся на Беларусь. Вучня Брагінскай сярэдняй школы, яго запрасіла кінафабрыка Белдзяржкіно ў Ленінградзе здымацца ў ролі Мірона ў фільме «Палескія рабінзоны» (1934). Пасля гэтага яго накіравалі на вучобу ў Маскоўскую студыю кінаакцёраў. Здымаўся ў фільмах «Бежын луг» (рэжысёр С. Эйзенштэйн), «Вясёлыя хлопцы» (рэжысёр Р. Аляксандраў), «Аэраград» (рэжысёр А. Даўжэнка). У час Вялікай Айчыннай вайны быў на фронце, камандаваў стралковым узводам. Ад Вялікіх Лук дайшоў да Берліна. Служыў у арміі да 1953 г. У 1954—1956 гг. працаваў дырэктарам бюро прапаганды мастацкай літаратуры пры СП БССР. Тры гады вучыўся на завочных курсах мастацкага чытання пры Усесаюзным доме народнай творчасці. Выступаў як чытальнік Беларускай дзяржаўнай філармоніі, адначасова (1962—1974) быў навуковым супрацоўнікам Літаратурнага музея Якуба Коласа. Член СП СССР з 1969 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1960).

У друку пачаў выступаць у 1940 г. Аўтар літаратурнай кампазіцыі «Народны паэт БССР Якуб Колас» (1956) і шэрагу кампазіцый для мастацкага чытання, кніг нарысаў «Дарогі і песні» (1965) і партрэтаў дзеячаў літаратуры і культуры «Дарагія аблічча» (1967), «Жыццё ў мастацтве» (1977). У Кіеве выйшла на ўкраінскай мове кніга «Аляксандр Даўжэнка. Шлях да слова» (1974), у кнігу «Продолжение радости» (1981) уключаны, акрамя перакладных, арыгінальныя працы аўтара.

Пераклаў на беларускую мову кнігу А. А. Маякоўскай «Дзіцячыя і юнацкія гады Уладзіміра Маякоўскага» (1957).

## *Марк* СМАГАРОВІЧ



Марк Станіслававіч Смагаровіч нарадзіўся 28.2.1927 г. у вёсцы Забалацце Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У час Вялікай Айчыннай вайны падлеткам пайшоў у партызанскі атрад імя Чапаева. Бацькі загінулі ў канцэнтрацыйным лагеры. У 1944 г. быў цяжка паранены, лячыўся ў шпіталі, знаходзіўся ў Бабруйскім доме інвалідаў (1945—1952), дзе скончыў сярэднюю школу. Некаторы час жыў у Астрашыцкім Гарадку на Міншчыне, з 1964 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1955 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені і медалямі.

Літаратурнай працай займаецца з 1949 г. Першую кніжку вершаў «Мой таварыш» выдаў у 1955 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «На крыллях песні» (1958), «Маё выступленне» (1961), «Пачастунак» (1963), «Крокі» (1966), «Разводдзе» (вершы і паэмы, 1973), «Сплаў» (1976), «Жорны віру» (1980), «Бляск крышталю» (вершы і паэмы, 1983). Для дзяцей напісаў кніжкі паэзіі «Каля кастра» (1959), «Жураўліная труба» (1968), «Паглядае Дзіма ў неба» (1978), «Гартаванне» (1987). Сатырычныя вершы змешчаны ў калектыўным зборніку «Са свайго пункту гледжання» (з М. Макаевым, І. Шуцько, 1966).

## *Сяржук* СОКАЛАЎ-ВОЮШ



Сяржук Сокалаў-Воюш (Сяргей Анатольевіч Сокалаў) нарадзіўся 16.10.1957 г. у вёсцы Астроўшчына Полацкага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачых.

Працаваў слесарам на заводзе жалезабетонных вырабаў (1974—1976), на Навапалацкім вытворчым аб'яднанні «Палімір» (1979). Служыў у Савецкай Арміі (1976—1978). У 1979 г. паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, а пасля трох курсаў перавёўся на завочнае аддзяленне (скончыў у

1985). Настаўнічаў у сярэдняй школе № 5 Наваполацка (1982—1984, 1985—1988), быў навуковым супрацоўнікам філіяла Літаратурнага музея Якуба Коласа ў вёсцы Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна (1984—1985), загадваў літаратурнай часткай лялечнай трупы Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Якуба Коласа ў Віцебску (1988—1990). З 1973 г. жыве ў Наваполацку. Член СП СССР з 1990 г.

У друку выступае з 1973 г. (наваполацкая газета «Хімік»). Аўтар зборніка паэзіі «Кроў на сумётах» (1989). Часта выступае як аўтар і выканаўца сваіх песень.

Напісаў п'есу-казку «Свецяць, свецяць зорачкі...» (пастаўлена ў 1989).

Пераклаў на беларускую мову п'есы А. Андрэева «Манумент», «Любоў да бліжняга», асобныя творы ўкраінскіх, польскіх пісьменнікаў.

---

## *Аляксандр СОПАТ*



Аляксандр Сцяпанавіч Сопат нарадзіўся 23.2. 1936 г. у вёсцы Партызанская Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў рабочай сям'і.

Працоўную дзейнасць пачаў у Архангельску ў 1950 г. на рыбалоўным сейнеры. У 1952—1955 гг. працаваў качагарам, матросам на судах Мурманскага тралавага флоту. Служыў у Савецкай Арміі (1955—1958). Зноў быў матросам, боцманам, памочнікам капітана на судах Арктычнага параходства (Мурманск). У 1965 г. пераехаў у Гомель. Працаваў памочнікам экскаватаршчыка трэста «Гомельсельбуд», затым на Поўначы машыністам экскаватара, шафёрам у трэсце «Саюзтрубапровад» (Надым), вышкамантажнікам Беларускага ўпраўлення буравых работ на нафтапромыслах Саматлора, Пагранічнага (Ніжнявартаўск, Наябрск). Член СП СССР з 1984 г.

Літаратурнай працай займаецца з пачатку 60-х гадоў. Піша на рускай мове. У беларускім друку выступае з 1965 г. (апавяданне ў газеце «Гомельская праўда). Аўтар кніг аповесцей «Трасса» (1982), «Самотлор» (1987), «Корабли» (1989).

*Браніслаў* СПРЫНЧАН



Браніслаў Пятровіч Спрынчан нарадзіўся 16.8. 1928 г. у в. Каніж Наваміргарадскага р-на Кіраваградскай вобл. (Украіна) у сям'і служачага.

Пасля заканчэння Кіраваградскага машынабудаўнічага тэхнікума (1949) працаваў на заводзе «Гомсельмаш» майстрам кавальскага цэха, літсупрацоўнікам завадской шматтыражнай газеты «Сельмашавец». Скончыў завочнае аддзяленне Літаратурнага інстытута імя М. Горкага (1959). У 1962—1964 гг.— літсупрацоўнік газеты «Советская Белоруссия». Пасля заканчэння Мінскай вышэйшай партыйнай школы (1966) — загадчык аддзела паэзіі часопіса «Нёман». Член СП СССР з 1985 г.

Узнагароджаны медалём.

Друкуецца з 1949 г. Піша на рускай мове. Аўтар зборнікаў паэзіі «Над кручами Сожа» (1957), «В центральном пролете» (1961), «Ветер на откосах» (1964), «Плавка» (1968), «Черты лица» (1970), «Ясень» (1973), «Вечная страда» (выбраныя вершы і пераклады, 1978), «Стремнина» (1982), «Сотворение» (1983), «Надежды нежные ростки» (1986), «Свет любви» (выбранае, 1988), «Жизни вечные круги» (1990), «Васильки на белом полотне» (1990).

Перакладае творы беларускіх, украінскіх паэтаў на рускую мову. Выйшлі зборнік П. Макаля «Прикосновение к земле» (1977), кніга вершаў беларускіх паэтаў «Стожары» (1984), М. Багдановіча «Венок» (1985).

*Вадзім* СПРЫНЧАН



Вадзім Браніслававіч Спрынчан нарадзіўся 14.1.1950 г. у горадзе Гомелі ў сям'і паэта.

У 1963 г. з бацькамі пераехаў у Мінск. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1972). Працаваў рэдактарам, у 1982—1989 гг.— загадчыкам рэдакцыі паэзіі выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1982 г.

Дэбютаваў у друку перакладамі паэзіі ў 1976 г. (часопіс «Неман»). Аўтар кнігі лірыкі «Земля и звезды» (1981).

Пераклаў на рускую мову вершы беларускіх паэтаў А. Пысіна, М. Стральцова, Я. Янішчыц, Р. Барадуліна, Г. Пашкова, А. Канапелькі і іншых.

---

## *Алесь СТАВЕР*



Алесь (Аляксандр Сяргеевіч) Ставер нарадзіўся 10.8.1929 г. у вёсцы Маргавіца Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вясной 1944 г. пад час блакады партызанскага краю згубіў бацькоў, быў вывезены фашыстамі ў Германію.

Вярнуўся дамоў у 1945 г. У 1949 г. скончыў Барысаўскае педагагічнае вучылішча. Працаваў старшым піянерважатым і выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Бягомльскай сярэдняй школе. У 1954 г. скончыў філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў інспектарам школ Лагойскага рана, літсупрацоўнікам газеты «Калгасная праўда», рэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР, загадчыкам літаратурнай часткі Белдзяржфілармоніі, навуковым супрацоўнікам Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. У 1975—1984 гг.— карэспандэнт-арганізатар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР. Член СП СССР з 1962 г.

З вершамі выступіў у друку ў 1949 г. (барысаўская раённая газета «Бальшавіцкая трыбуна»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Золак над Бярозай» (вершы і паэма, 1959), «Ластаўкі перад дажджом» (1967), «Жураўлі ляцяць» (вершы і песні, 1972), «Лірнік» (1975), «Жнівеньскі вырай» (выбранае, 1979), «Зоры зямныя» (паэмы, вершы, песні, 1989).

Выйшлі кнігі паэзіі для дзяцей «Касцёр не гасне» (1961), «Пад вясёлкавай дугой» (1984), рамана «Пад канвоем» (1969), зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Да сваіх» (1974), «Лясныя аповесці» (1986).

Напісаў лірычную камедыю «Алімпіяда Салодкая» (пастаўлена ў 1977) і п'есу «Слова — не верабей» (пастаўлена ў 1977). На многія

вершы напісаны песні («Жураўлі на Палессе ляцяць», «Беларусачка» і інш.).

У 1983 г. выдадзены зборнік песень «Мой край беларускі».

---

## *Іван* СТАДОЛЬНІК



Іван Канстанцінавіч Стадольнік нарадзіўся 30.9.1941 г. у вёсцы Янкі Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Докшыцкай сярэдняй школы (1959) працаваў у мясцовым калгасе імя А. Суворава, на асваенні цалінных зямель у Казахстане, дзе на станцыі Купрыянаўка Рузаеўскага раёна Какчатаўскай вобласці быў качагарам. У 1959 г. вярнуўся з цаліны, працаваў у родным калгасе, пасля бібліятэкарам Бярозаўскай бібліятэкі Докшыцкага раёна. Скончыў зубаўрачэбнае аддзяленне Полацкага медыцынскага вучылішча (1963). Працаваў выконваючым абавязкі галоўнага ўрача, зубным урачом Мосарскай сельскай бальніцы Глыбоцкага раёна (1963—1967), вучыўся завочна на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў у 1971). У 1967—1971 гг.— адказны сакратар, у 1971—1980 гг.— загадчык аддзела сельскай гаспадаркі полацкай аб'яднанай газеты «Сцяг камунізму». З 1980 г.— рэдактар аддзела літаратуры, з 1984 г.— адказны сакратар часопіса «Вожык». Член СП СССР з 1980 г.

Першы верш апублікаваў у 1960 г. (докшыцкая раённая газета «Ленінская трыбуна»), першае апавяданне ў рэспубліканскім друку ў 1971 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Хачу табе шчасця» (1979), сатыры і гумару «Як тут не смяяцца» (1985), «Лістапад на пачатку лета» (1987).

## *Адам СТАНКЕВІЧ*



Адам Вікенцьевіч Станкевіч нарадзіўся 5.1. 1892 г. у вёсцы Арляняты Смаргонскага раёна Гродненскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Ашмянскім гарадскім вучылішчы, у Віленскай духоўнай семінарыі. У 1914 г. паступіў у Каталіцкую духоўную акадэмію ў Пецярбургу і ў той самы год высвечаны на святара. У 1918 г. пераехаў у Вільню, адкуль на кароткі тэрмін быў высланы польскімі духоўнымі ўладамі ў Драгічын-над Бугам. З 1919 г. у Вільні вёў беларускую душпастырскую дзейнасць, супрацоўнічаў у Беларускім нацыянальным камітэце, камітэце дапамогі ахвярам вайны, у Беларускім інстытуце гаспадаркі і культуры, Таварыстве беларускай школы, выкладаў рэлігію ў Віленскай беларускай гімназіі. Адзін з заснавальнікаў і лідэраў партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя. У 1922 г. абраны паслом у польскі сейм, дзе бараніў інтарэсы беларусаў. У 1926 г. заснаваў Беларускую друкарню імя Ф. Скарыны, у 1928 г.— Беларускае каталіцкае выдавецтва. Выдаваў і рэдагаваў газету «Беларуская крыніца», часопіс «Хрысціянская думка». З ягонай дапамогай выходзілі часопісы «Шлях моладзі», «Самапомач», «Калоссе». У 1938 г. за нацыянальную беларускую дзейнасць высланы польскімі ўладамі ў Слонім. З 1939 г. зноў у Вільні, старшыня «Беларускага цэнтру ў Літве», дырэктар Беларускай дзяржаўнай прагімназіі (да ўсталявання савецкай адміністрацыі ў Літве). Пад час другой сусветнай вайны працаваў у Беларускай гімназіі ў Вільні і вёў душпастырскую дзейнасць у віленскай беларускай парафіі пры касцёле св. Міхала. Пасля кароткатэрміновага арышту савецкімі ўладамі ў снежні 1944 г. працягваў святарскую дзейнасць у Вільні. Увесну 1949 г. зноў быў арыштаваны і адпраўлены этапам у Іркуцкую вобласць, у лагер непадалёку ад станцыі Віхараўка. Кандыдат кананічных навук.

Памёр 29.11.1949 г. (па некаторых звестках — на пачатку 1950 г.).

Упершыню ў друку выступіў з допісам у 1909 г. (газета «Наша ніва»). Аўтар кніг (усе выйшлі ў Вільні) «Доктар Францішак Скарына, першы друкар Беларусі (1525—1925)» (1925),

«Беларуская мова ў школах Беларусі XVI—XVII ст.» (1928), «Родная мова ў святынях» (1929), «Францішак Багушэвіч: Яго жыццё і творчасць (у трыццатыя ўгодкі смерці (1900—1930)» (1930), «Вітаўт Вялікі і беларусы» (1930), «Казімір Сваяк: Нарыс аб ягонай ідэалогіі (у пятыя ўгодкі смерці)» (1931), «Кастусь Каліноўскі. «Мужыцкая праўда» і ідэя незалежнасці Беларусі» (1933), «Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення» (1935), «Праф. Браніслаў Эпімах-Шыпіла: З яго жыцця і працы» (1935), «З жыцця і дзейнасці Казіміра Сваяка (у дзесятыя ўгодкі яго смерці)» (1936), «Магнушэўскі, Паўлюк Багрым, Баброўскі (да вытокаў беларускага адраджэння)» (1937), «Божае слова ў нядзелі і святы» (1938), «Міхал Забэйда-Суміцкі і беларуская народная песня» (1938), «У чэсць 950-годдзя хрышчэння Беларусі» (1938), «Беларускі хрысціянскі рух» (1939), «Вучыся маліцца» (1940), «Хрысціянства і беларускі народ» (1940), «На сьвята маткі: Увагі аб дастойнасці і значэнні маткі» (1940).

---

## *Аляксандр СТАНЮТА*



Аляксандр Аляксандравіч Станюта нарадзіўся 17.10.1936 г. у горадзе Мінску ў акцёрскай сям'і.

Скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1960). Працаваў у рэспубліканскай газеце «Знамя юности» літсупрацоўнікам, загадчыкам аддзела інфармацыі, літаратуры і мастацтва (1960—1970). Вучыўся ў аспірантуры пры кафедры рускай класічнай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна (1971—1973), з 1973 г. выкладае там гісторыю літаратуры. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1985 г.

З літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі выступае з 1960 г. Піша на беларускай і рускай мовах. Аўтар манаграфіі «Постижение человека. Творчество Достоевского 1840—1860-х гг.» (1976).

Напісаў шэраг апавяданняў, а таксама аповесць «Мост» (часопіс «Маладосць», 1984), сцэнарый дакументальнага фільма «Такі характар» (зняты ў 1984).

## *Стары УЛАС*



Стары Улас (Уладзіслаў Пятровіч Сівы-СіЦкі) нарадзіўся 22.3.1865 г. у горадзе Валожыне на Міншчыне.

Асірацеўшы ў дзесяць год, пайшоў працаваць памочнікам кухара да пана. Быў кухарам, аб'ездчыкам, ляснічым у маёнтку Сужаны на Віленшчыне. Жыў у вёсцы Варняны Астравецкага раёна, у Вільні. У 1920 г. пераехаў у вёску Сужаны, а пазней у Шашэльгішкі Віленскага павета, дзе займаўся земляробствам.

Памёр 30.9.1939 г.

Друкаваць вершы пачаў у 1907 г. у «Нашай ніве». У беларускіх дакастрычніцкіх і заходнебеларускіх календарах змяшчаў вершы і вершаваныя апавяданні. Выступаў і як публіцыст. Шэраг вершаў надрукаваны ў «Анталогіі беларускай паэзіі» (1961) і ў зборніку «Беларуская дакастрычніцкая паэзія» (1969). У 1990 г. выйшла кніга вершаў і публіцыстыкі «Год беларуса».

## *Алесь СТАХОВІЧ*



Алесь (Аляксандр Іосіфавіч) Стаховіч нарадзіўся 3.7.1907 г. у вёсцы Кашына Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў сярэднюю школу ў Оршы (1923), быў на камсамольскай рабоце ў Оршы, Мсціслаўлі, загадваў аддзелам культуры і прапаганды ў Крупскім, Талачынскім, Жлобінскім райкомах партыі, працаваў начальнікам палітаддзела ў саўгасах «Горкі-Апчак», «Старчыцы», інструктарам ЦК КПБ. З 1938 г. адказны сакратар часопіса «Полымя». У час Вялікай Айчыннай вайны працаваў у армейскім друку. Член СП СССР з 1938 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 7.2.1956 г.

У друку выступіў у 1928 г. з нарысамі, першае апавяданне апублікаваў у 1930 г. (часопіс «Беларуская работніца і сялянка»). Аўтар кніг аповесцей і апавяданняў «Шумяць

лясы» (1944), «Пампей Шчупак» (1946), «Неспакойны гарадок» (1946), «Аповесці і апавяданні» (1952), раманаў «Пад мірным небам» (1948), «Шырокія гарызонты» (1954) і кніжак апавяданняў для дзяцей «Маленькія героі» (1939), «Залаты карп» (1951). У 1947 г. выйшлі Выбраныя творы.

Пераклаў на беларускую мову «Аповесць аб сапраўдным чалавеку» Б. Палявога (1951), асобныя творы рускіх пісьменнікаў.

---

## *Васіль СТАШЭЎСКІ*



Васіль Пятровіч Сташэўскі нарадзіўся 23.3. 1895 г. у вёсцы Лугавая Капыльскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю (1914). Удзельнік першай сусветнай вайны. У час грамадзянскай вайны прымаў удзел у барацьбе супраць войск буржуазнай Польшчы. У 1918—1920 і ў 1923 гг. настаўнічаў, у 1920—1921 гг.— ваенком і загадчык аддзела асветы Магільнянскага валаснога рэўкома, сакратар Нясвіжскага павятовага ваенкамата, загадчык беларускага пададдзела Мінскага павятовага аддзела народнай асветы. Вучыўся ў Беларускай драматычнай студыі ў Маскве (1921—1922). Пасля заканчэння Мінскага настаўніцкага інстытута (1924) выкладаў гісторыю і літаратуру на настаўніцкіх курсах і рабфаку ў Оршы, узначальваў культаддзел Аршанскага акруговага Савета прафсаюзаў. З 1927 г.— адказны сакратар літаратурнага аб'яднання «Маладняк», з 1929 г.— аб'яднання «Полымя». У 1928—1929 гг. працаваў у газеце «Савецкая Беларусь». У 1937 г. рэпрэсіраваны. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 8.6. 1957 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Друкаваўся з 1923 г., першую п'есу «На другі дзень» апублікаваў у 1926 г. («Аршанскі маладняк»). Надрукаваў п'есы «Бацька і сын», «Кацярына», «Сашка-будаўнік», аднаактоўкі «Беспрытульныя», «У цемры» (усе ў 1927), «Музыка Цвілеўскі», «Спявай, вясна!» (абедзве ў 1928), «Архангелы з крэсаў» (1929), «Прысяга

ў лесе» (1930), «Гарачы віхор» («Віхор», 1930), «На варце» (1932), «На платформу» (урывак у 1934), «Самсон і Людміла» (1936) і інш. П'еса «Мікола Гоман» пастаўлена ў 1936 г.

Выйшлі кнігі прозы «Па сонечным шляху» (эскізы, 1930), «Пад местачковым месяцам» (аповесць, 1931), «Шуміць бярэзінка» (аповесць, 1933), нарысы «Гаворыць Асінстан...» і «Чырвоны сцяг» (1930), «Койданаўская МТС» (1931), «Каласіцца зямля» (1932), зборнік выбраных празаічных твораў «Шуміць бярэзінка» (1963).

---

## *Міхась* СТРАЛЬЦОЎ



Міхась (Міхаіл Лявонцьевіч) Стральцоў нарадзіўся 14.2.1937 г. у вёсцы Сычын Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўніка.

Скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1959). Працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» (1959—1961, 1969—1972), часопісах «Полымя» (1961—1962), «Маладосць» (1962—1968), з 1984 г.— загадчыкам аддзела мастацтва, крытыкі і бібліяграфіі часопіса «Неман». Член СП СССР з 1962 г.

Памёр 23.8.1987 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1957 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Блакітны вецер» (1962), «Сена на асфальце» (1966), аповесці «Адзін лапаць, адзін чунь» (1970), кнігі прозы «Падарожжа за горад» (апавяданні, аповесць, 1986), кніг выбраных твораў «На ўспамін аб радасці» (1974), «Выбранае» (проза, паэзія, эсэ, 1987).

Выйшлі зборнікі вершаў «Ядлоўцавы куст» (1973), «Цень ад вясла» (1979), «Яшчэ і заўтра» (1983), «Мой свеце ясны» (1986).

Выдаў кнігі літаратурна-крытычных артыкулаў і эсэ «Жыццё ў слове» (1965), «Загадка Багдановіча» (1968), «У полі зроку» (1976), «Пячатка майстра» (1986).

Пераклаў на беларускую мову раман Ч. Айтматава «Буранны паўстанак» (1987), асобныя

творы рускіх, украінскіх, італьянскіх, лацінаамерыканскіх паэтаў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (пасмяротна, 1986) за кнігу вершаў «Мой свеце ясны».

---

## *Міхась СТРЫГАЛЁЎ*



Міхась (Міхаіл Лаўрэнцьевіч) Стрыгалёў нарадзіўся 25.5.1938 г. у вёсцы Недайка Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Недайскай сярэдняй школы (1955) год працаваў у мясцовым калгасе імя Ф. Энгельса, скончыў энергетычны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1961). Быў старшым інжынерам-электрамеханікам вайсковай часці (Уральская ваенная акруга, 1961—1965), інжынерам трэста «Уралмантажаўтаматыка», старшым інжынерам лабараторыі трэста «Пермгаррамбуд» у Пярмі (1965—1969). Скончыў завочна Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве (1969). Працаваў літкансультантам Пермскай абласной пісьменніцкай арганізацыі СП РСФСР (1970—1971), загадчыкам фальклорна-выдавецкага аддзела пермскага Дома народнай творчасці (1971—1972), рэдактарам шматтыражнай газеты трэста «Будтэрмаізаляцыя» «За коммунистический труд». З 1978 г. жыве ў Барысаве. У 1980—1982 гг.— сцэнарыст кінастудыі «Беларусь фільм». З 1980 г. кіруе літаратурным аб'яднаннем «Бярэзіна» пры барысаўскай аб'яднанай газеце «Камуністычная праца». Член СП СССР з 1988 г.

У друку выступіў упершыню ў 1956 г. (шматтыражная газета Беларускага політэхнічнага інстытута «Советский инженер»). Спачатку пісаў на рускай мове, з 1961 г.— і на беларускай. У Пермі выйшлі зборнікі паэзіі «Хмель» (1966), «Цвет времени» (1971), кніга перакладаў «Четыре ветра: Поэзия народов Прикамья» (1970), у Мінску — кнігі паэзіі «Белая Русь» (1967), «Ростань» (1974), «Чырвоныя казармы» (1978), «Кола фартуны» (1981), «Дзевяты кардон» (вершы і паэма, 1990).

## *Уладзімір СТЭЛЬМАХ*



Уладзімір Мацвеевіч Стэльмах нарадзіўся 15.12.1907 г. у вёсцы Бушмічы Камянецкага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

З 1927 г. вучыўся ў Мінскім беларускім педагагічным тэхнікуме, у 1929 г. паступіў у драматычную студыю Беларускага дзяржаўнага тэатра ў Віцебску. Пасля заканчэння студыі (1931) працаваў у тэатрах рабочай моладзі і юнага гледача ў Мінску акцёрам, дырэктарам, загадчыкам літчасткі. На пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях пад Смаленскам, з 1942 г.— загадчык ваеннага аддзела і аддзела прапаганды і агітацыі Рудаўскага райкома партыі Тамбоўскай вобласці. З 1943 г.— дырэктар БДТ-2 у Віцебску, з 1945 г.— Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР, з 1947 г.— Беларускага тэатра імя Янкі Купалы, з 1955 г.— Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, у 1952—1955 гг.— начальнік аддзела тэатраў Міністэрства культуры БССР. Скончыў завочна Маскоўскі дзяржаўны інстытут тэатральнага мастацтва імя А. В. Луначарскага (1954). У 1966—1971 гг.— намеснік старшыні прэзідыума Беларускага тэатральнага аб'яднання. Член СП СССР з 1965 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР (1961).

Памёр 27.1.1974 г.

Першая п'еса «Шляхі» апублікавана ў 1930 г. (пастаўлена ў 1931). Аўтар п'ес «Крушэнне рэнегатаў» (1931), «Фантан» (1932, пастаўлена ў 1933), «Тры крыжы» (1932, пастаўлена ў 1933), «Канец маскараду» (сумесна з Ю. Рудзько, пастаўлена ў 1938). Выдаў нарыс «Народны артыст СССР Г. П. Глебаў» (1954) і кнігі пра тэатр «Шляхі беларускага тэатра» (на ўкраінскай мове, Кіеў, 1964), «Кранаючы чуткія струны душы» (1966), «Вечна жывая крыніца» (1970), «Тэатр і час: Запіскі дырэктара тэатра» (1973).

## *Пятро* СТЭФАНОВІЧ



Пятро (Пётр Францавіч) Стэфановіч нарадзіўся 28.6.1922 г. у вёсцы Сёмкаў Гарадок Мінскага раёна ў сям'і рабочага і сялянкі.

Скончыў гімназію ў Ашмянах (1939). На пачатку 1941 г. пачаў працаваць літсупрацоўнікам ашмянскай раённай газеты «Знамя свободы». У час вайны скончыў курсы малодшых лейтэнантаў у Забайкальскай ваеннай акрузе і курсы «Выстрел» Міністэрства Узброеных Сіл СССР. Удзельнічаў у баях на Паўднёвым фронце. У 1943 г. быў паранены. Восенню 1944 г. адкліканы з Карэльскага фронту і накіраваны ў Войска Польскае, дзе служыў начальнікам аддзела штаба 10-й дывізіі пяхоты. З 1950 г. працаваў на будоўлях — прарабам, начальнікам участка, галоўным інжынерам, начальнікам аддзела капітальнага будаўніцтва, у 1969—1979 гг.— інжынер Беларускага аддзялення Літфонду СССР, у 1979—1984 гг.— літаратурны рэдактар часопіса «Вожык». Член СП СССР з 1990 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі і польскім медалём «Заслужаны перад польскай культурай».

У друку выступае з 1941 г. Перакладае з польскай на беларускую і рускую мовы, з беларускай на польскую. На польскую мову пераклаў кнігі для дзяцей А. Лойкі «Дзе хто начуе» (1981), П. Марціновіча «Паспяшайся ў наш звярынец» (1981), А. Вольскага «Еду ў госці да слана» (1981) і «Сцяпан — вялікі пан» (1983), І. Бурсава «Казкі, поўныя цудаў» (1983), беларускія народныя казкі «Лісіца-хітрыца» (1982), «Удовін сын» (1985). На беларускую мову пераклаў асобныя творы Я. Бжэхвы, Я. Гушчы, В. Жукроўскага, Э. Кабатца, У. Махэека, Г. Марцінка, Ю. Озгі-Міхальскага, Я. Парандоўскага, Е. Путраманта, У. Рэйманта, Т. Ружэвіча і інш., на рускую — З. Сафяна, Г. Гаворскага, Е. Адыгея.

Склаў анталогіі «Ад Буга да Одры» (апавяданні сучасных польскіх пісьменнікаў, 1969) і «Вясёлы калейдаскоп» (гумар і сатыра сучасных польскіх пісьменнікаў, 1979).

## *Анатоль* СУЛЬЯНАЎ



Анатоль Канстанцінавіч Сульянаў нарадзіўся 3.9.1927 г. у сяле Аксіньіна Адзіноцкага раёна Маскоўскай вобл. (Расія) у сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сямігадовай школы ў сяле Вялікія Вяземы залічаны ў Маскоўскую спецшколу Ваенна-паветраных сіл (1943—1946). У 1946—1950 гг.— курсант Тамбоўскага, Армавірскага авіявучылішчаў, у 1950—1951 гг.— слухач Вышэйшых лётнаінструктарскіх курсаў. Служыў лётчыкам-інструктарам, камандзірам звяна. У 1962 г. скончыў Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна ў Маскве. У 1962—1969 гг. быў намеснікам камандзіра па палітычнай часці авіяпалка, начальнікам палітаддзела палка дывізіі, затым інспектарам, начальнікам аддзела Галоўнага Палітупраўлення Савецкай Арміі (Масква, 1969—1976). З 1976 г. у Мінску — член Ваеннага Савета, начальнік палітаддзела арміі (1976—1980), намеснік начальніка Палітупраўлення БВА (1980—1987). Генерал-маёр авіяцыі, ваенны лётчык І класа. Член СП СССР з 1981 г.

Заслужаны работнік культуры БССР (1985).

Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам «За службу Радзіме», медалямі.

Літаратурнай дзейнасцю займаецца з 1957 г. Піша на рускай мове. Аўтар рамана «Расколотое небо» (1981), зборніка аповесцей і апавяданняў «Хождение за седьмое небо» (1985), «Только одна ночь» (раман, аповесці, 1987), рамана «Голубые снега» (1990) і кнігі для дзяцей «Посеешь ветер» (1984).

## *Віктар* СУПРУНЧУК



Віктар Пятровіч Супрунчук нарадзіўся 7.12.1949 г. у вёсцы Сялец Бярозаўскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Сялецкай сярэдняй школы (1967) працаваў грузчыкам на Нова-Бярозаўскім вапнавым заводзе, вучыўся ў Белаазёрскім прафесійна-тэхнічным вучылішчы № 82 электратэхнікі (скончыў у 1968). У 1968—1970 гг. служыў у Савецкай Арміі. Працаваў

электрамантажнікам і электразваршчыкам у трэсце «Электрацэнтрмантаж». Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1976). Працаваў карэспандэнтам шматтыражнай газеты «Электрон» завода ЭВМ імя Арджанікідзе. З 1977 г.— спецыяльны карэспандэнт «Сельской газеты», з 1981 г.— рэдактар аддзела літаратуры Беларускага тэлебачання, з 1983 г.— загадчык аддзела нарыса, з 1986 г.— старшы рэдактар аддзела прозы часопіса «Полымя». З 1990 г.— намеснік старшыні СП Беларусі. Член СП СССР з 1985 г.

Друкуецца з 1977 г. Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Страсці» (1983), «Недзе баліць ля сэрца» (1986), «Набат» (1989), аповесці «Банальны дэтэктыў» (1989), раманаў «Жывеш толькі раз» (1988) і «З плоці і крыві» (часопіс «Полымя», 1990).

## *Мікола* СУРНАЧОЎ



Мікола (Мікалай Мікалаевіч) Сурначоў нарадзіўся ў снежні 1917 г. у вёсцы Слабада Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Гомельскага сельскагаспадарчага тэхнікума працаваў аграномам на Рагачоўшчыне. Потым перайшоў у раённую газету «Камунар». У 1937—1939 гг. вучыўся на літаратурным факультэце Гомельскага педагагічнага інстытута. У 1939 г. перавёўся ў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага. Вучобу сумяшчаў з працай у рэспубліканскіх газетах «Звязда» (1939—1940) і «Чырвоная змена» (1940—1941). З 1941 г.— у Савецкай Арміі, удзельнічаў у абароне Каўказа, у вызваленні Беларусі, Украіны, Румыніі, Польшчы.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Загінуў 20.4.1945 г. пад Берлінам.

Друкавацца пачаў у 1933 г. (рагачоўская раённая газета «Камунар»). Выйшлі зборнікі паэзіі «На сурмах баравых» (1946), «Барвовая зара» (1959), кніга вершаў, лістоў і ўспамінаў «Акопны спеў» (1986). Выступаў з літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі.

## *Вера СУРСКАЯ*



Вера Сяргееўна Сурская нарадзілася 15.4. 1899 г. у горадзе Маскве (Расія) у сям'і інжынера.

Пасля заканчэння жаночай гімназіі (1916) вучылася ў мастацкай студыі І. Машкова і музычным вучылішчы Селіванавых. Была артысткай у тэатрах Сочы, Сухумі, Батумі, Тбілісі (1917—1926), мастаком-карыкатурыстам і літсупрацоўнікам у газетах (Тбілісі). Скончыла Грузінскую акадэмію мастацтваў (1928). У 1945 г. працавала карэспандэнтам газеты Закаўказскай ваеннай акругі «Боец РККА». З восені 1945 г. жыла ў Брэсце, працавала педагогам у абласным Палацы піянераў, стварыла першы ў Беларусі дзіцячы тэатр лялек, дзе была драматургам, мастаком і рэжысёрам. Член СП СССР з 1952 г.

Памерла 19.5.1952 г.

Выступаць у друку пачала ў 1937 г. (газета «Заря Востока»), у беларускім друку з 1946 г. Пісала на рускай мове. У Тбілісі выйшлі кніжкі вершаў для дзяцей «Про Мишек» (1939), «Бобкин зуб» (1940), «Будь смелым», «Налёт», «Встреча», «И я помогаю» (усе ў 1943), «Я не так уж мал» (1944), у Мінску — «Пионерское лето» (1950), «Звёздный поход» (1954) і зборнік казак «Новый дом» (1966). Аўтар шэрагу інсцэніровак і п'ес для дзяцей («Мороз-Снеговик», «Про лентяя» і інш.). Пераклала на рускую мову асобныя творы азербайджанскіх, армянскіх і грузінскіх паэтаў.

## *Павел СУШКО*



Павел Міхайлавіч Сушко нарадзіўся 20.11.1909 г. у вёсцы Сушкі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Перад кайзераўскай акупацыяй разам з маці і старэйшым братам падаўся ў бежанцы. Вярнуўшыся дадому, працаваў на сельскай гаспадарцы і адначасова займаўся самаадукацыяй. Быў на вайсковай службе ў Вільні (1930—1931). Пасля ўз'яднання Беларусі (1939) стаў старшынёй мясцовага сельсавета. У Вялікую Айчынную вай-

ну — спачатку ў падпольным атрадзе «Масква», потым у 4-й Беларускай партызанскай брыгадзе. Мабілізаваны як нестраявы на працоўны фронт, з восені 1944 да вясны 1947 г. працаваў на адной з шахт Чарамхоўскага вугальнага басейна ў Сібіры. Адпушчаны па стану здароўя, працаваў будаўніком, печніком, кіраваў паляводчай брыгадай у калгасе «Баявы партызан».

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 26.9.1974 г.

Друкавацца пачаў у 1938 г. у заходнебеларускіх выданнях. Творы змешчаны ў калектыўных зборніках «Сцягі і паходні» (1965), «Партызаны, партызаны...» (1985), «У паходзе» (1985), «Ростані волі» (1990).

---

## *Пятро* СУШКО



Пятро (Пётр Паўлавіч) Сушко нарадзіўся 1.1.1937 г. у вёсцы Сушкі Міёрскага раёна Віцебскай вобласці ў сям'і паэта-селяніна.

Пасля заканчэння Міёрскай сярэдняй школы (1956) працаваў выхавацелем у Аляксандраўскім дзіцячым доме. У 1959—1961 гг. служыў у Савецкай Арміі. Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1966), працаваў загадчыкам аддзела міёрскай раённай газеты «Сцяг працы» (1966—1967), уласным карэспандэнтам абласной газеты «Віцебскі рабочы» (1968—1969), літсупрацоўнікам газет у Мінску «На страже Октября» (1969—1970) і «Звязда» (1970—1973), рэдактарам аддзела літаратуры часопіса «Вожык» (1973—1980), адказным сакратаром штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» (1980—1987). З 1989 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Полымя». Член СП СССР з 1984 г.

Узнагароджаны медалём.

Першы верш надрукаваны ў 1954 г. (міёрская раённая газета «Сцяг працы»). Аўтар зборнікаў баек і мініяцюр «Ганарлівы сучок» (пад псеўданімам Цімох Дзераза, 1975), лірыкі «Пратока» (1976), вершаваных фельетонаў і гумарыстычных вершаў «Восці напагатоў» (1978), пародый і эпіграм «Парнаская кузня» (1981), кніжак для дзяцей «Вясёлы Бай» (1980),

«Чмялёва гушкалка» (1986), «Ехаў кот у лес па дровы» (1990).

Перакладае з польскай і ўкраінскай моў. Пераклаў асобныя творы В. Брудзінскага, Т. Паляноўскага, Ю. Кругляка, І. Неміровіча, П. Рабра і інш.

---

## *Анатоль* СЫС



Анатоль Ціханавіч Сыс нарадзіўся 26.10.1959 г. у вёсцы Гарошкаў Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1982 г. скончыў аддзяленне рускай і беларускай мовы і літаратуры гісторыка-філалагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага універсітэта. У 1982—1984 гг. служыў у Савецкай Арміі, потым працаваў карэспандэнтам веткаўскай раённай газеты «Перамога Кастрычніка». З 1985 г.— старшы тэхнік на Рэспубліканскім радыётэлецэнтры. Член СП СССР з 1988 г.

У друку выступае з вершамі з 1974 г. (рэчыцкая раённая газета «Дняпровец»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Агмень» (бібліятэка часопіса «Маладосць», 1988) і «Пан Лес» (1989).

---

## *Масей* СЯДНЁЎ



Масей (Майсей Ларывонавіч) Сяднёў нарадзіўся 1.9.1915 г. у вёсцы Мокрае Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Саматэвіцкай сямігодкі вучыўся у Мсціслаўскім педагагічным тэхнікуме (1930—1932). У 1933 г. паступіў на літаратурналінгвістычнае аддзяленне Мінскага вышэйшага педагагічнага інстытута, але на апошнім курсе (кастрычнік 1936) быў арыштаваны. Высланы на Калыму, дзе адбыў 5 год у лагерах. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны прывезены ў Мінск на перагляд справы, пад час акупацыі апынуўся на волі. Жыў у вёсцы Мокрае. У 1943 г. выехаў у Беласток, затым у Берлін. Спачатку жыў у Германіі, настаўнічаў у беларускай гімназіі ў Міхельсдорфе, у 1950 г. перасяліўся ў ЗША, дзе выкладаў рускую мову ў адным з уні-

версітэтаў штата Індыяна. У 1969—1983 гг. працаваў на радыёстанцыі «Свабода» (Мюнхен, ФРГ). Жыве ў горадзе Глен-Коў (ЗША).

З першымі вершамі і апавяданнем выступіў у друку ў 1933 г. (часопіс «Работніца і калгасніца Беларусі», газета «Чырвоная змена»). Змяшчаў творы ў часопісе «Полымя рэвалюцыі», газетах «Савецкая Беларусь», «Літаратура і мастацтва», «Чырвоная змена», альманаху «Аднагодкі» (1936). У час вайны — у акупацыйных выданнях: часопісе «Новы шлях», газетах «Раніца», «Новая дарога», «Беларускі работнік» і інш. У Беластоку быў падрыхтаваны зборнік вершаў «Ад сына твайго, Беларусь» (меўся выйсці ў Кёнігсбергу, але згарэў там пад час пажару). Аўтар кніг паэзіі «У акіяне начы» (Рэгенсбург, 1946), «На край света» (Міхельсдорф, 1947), «Спадзяванні» (Рэгенсбург, 1947), «Цень Янкі Купалы» (Ватэнштат, 1947), «Ля ціхай брамы» (Нью-Йорк, 1958), «Патушаныя зоры» (Мюнхен — Нью-Йорк, 1975), «Ачышчэнне агнём» (Глен-Коў — Нью-Йорк, 1985), «А часу больш, чым вечнасць» (Глен-Коў — Нью-Йорк, 1989), раманаў «Раман Корзюк» (Нью-Йорк, 1985), «І той дзень надышоў» (Глен-Коў — Нью-Йорк, 1987). Напісаў успаміны пра Янку Купалу і Якуба Коласа (калектыўны зборнік «Янка Купала і Якуб Колас», Нью-Йорк, 1982).

У 1989—1990 гг. газеты «Знамя юности», «Літаратура і мастацтва», часопісы «Маладосць», «Крыніца» змясцілі яго падборкі вершаў.

На беларускую мову пераклаў асобныя творы І.-В. Гётэ, «Плач Яраслаўны» («Слова аб палку Ігаравым») і інш.

---

## *Мікола СЯМАШКА*



Мікола (Мікалай Пятровіч) Сямашка нарадзіўся ў 1914 г. у вёсцы Барылы (пазней зліласся з вёскай Катушанкі) Полацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сямігодкі працаваў у ветрынскай раённай газеце. У 1939 г. мабілізаваны ў Савецкую Армію, удзельнічаў у паходзе ў Заходнюю Беларусь. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны — на фронце.

Загінуў у 1941 г. пры абароне Оршы.

Першы верш апублікаваў у 1926 г. (газета «Чырвоная Полаччына»). Аўтар зборніка паэзіі «Шчырасць» (1939). Паасобныя вершы друкаваліся ў зборніках «Мы іх не забудзем» (1949) і «Крывёю сэрца» (1967).

---

## *Сцяпан СЯМАШКА*



Сцяпан Пятровіч Сямашка нарадзіўся 27.7. 1898 г. у вёсцы Барылы (пазней злілася з вёскай Катушанкі) Полацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1920 г. пайшоў у Чырвоную Армію, удзельнічаў у грамадзянскай вайне. У 1921—1926 гг.— на партыйнай і савецкай рабоце ў Полацку. У 1926—1929 гг. працаваў рэдактарам акруговай газеты «Чырвоная Полаччына», потым — у часопісе «Шляхі калектывізацыі», у газеце «Звязда». Вучыўся ў Камуністычным інстытуце журналістыкі ў Мінску (1932). У гады Вялікай Айчыннай вайны — палітработнік у Савецкай Арміі. У 1945—1946 гг.— адказны сакратар камісіі па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, з 1947 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 23.9.1965 г.

Першы празаічны твор надрукаваў у 1925 г. У 1927 г. у газеце «Чырвоная Полаччына» апублікаваў некалькі ўрыўкаў з аповесці «Пад панскай няволяй». Аўтар кнігі апавяданняў «Пералом» (1932).

Пераклаў на беларускую мову паасобныя творы К. Маркса, Ф. Энгельса, У. І. Леніна.

## *Ала* СЯМЁНАВА



Ала (Альбіна Іванаўна) Сямёнава нарадзілася 9.8.1938 г. у сяле Бальшарэцкае Бальшарэцкага раёна Камчацкай вобласці ў сям'і служачых.

У 1944 г. сям'я вярнулася на радзіму ў Навагрудак. Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1960) працавала рэдактарам і старшым рэдактарам выдавецтва «Навука і тэхніка». У 1968—1972 гг. літсупрацоўнік у прэсбюлетэні «Служба быту Беларусі», у 1972—1986 гг.— рэдактар, старшы рэдактар рэдакцыі крытыкі, літаратуразнаўства і драматургіі выдавецтва «Мастацкая літаратура». З 1986 г.— літсупрацоўнік, з 1987 г.— рэдактар аддзела мастацтва, крытыкі і бібліяграфіі часопіса «Нёман». Член СП СССР з 1982 г.

Узнагароджана медалём.

З рэцэнзіямі, літаратурна-крытычнымі артыкуламі і эсэ выступае з 1966 г. Аўтар кніг «Гарачы след таленту» (1979), «Слова сапраўднага лад» (1986).

## *Іван* СЯРКОЎ



Іван Кірэевіч Сяркоў нарадзіўся 4.1.1929 г. у вёсцы Пакалюбічы Гомельскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

З 1948 г. служыў у Савецкай Арміі. Скончыў артылерыйскае вучылішча (1952). Пасля дэмабілізацыі (1955) працаваў у гомельскай раённай газеце «Маяк». Завочна скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1962). З 1960 г.— старшы рэдактар, у 1961—1989 гг.— галоўны рэдактар Гомельскай абласной студыі тэлебачання, з 1977 г. адначасова сакратар Гомельскага абласнога аддзялення СП БССР. Член СП СССР з 1970 г.

Узнагароджаны медалём.

Літаратурную працу пачаў у 1962 г. з вершаваных гумарэсак і кароткіх гумарыстычных

апавяданняў (часопіс «Вожык»). Аўтар аповесцей «Мы з Санькам у тыле ворага» (1968), «Мы — хлопцы жывучыя» (1970), «Мы з Санькам — артылерысты...» (1989).

Напісаў сцэнарый тэлевізійнага мастацкага фільма «Мы — хлопцы жывучыя» (пастаўлены ў 1974).

# Т



## *Леў ТАЛАЛАЙ*

Леў Барысавіч Талалай нарадзіўся ў 1906 г. на Магілёўшчыне.

У 1925—1926 гг. працаваў настаўнікам Вендарожскай пачатковай школы Магілёўскага раёна, у 1926—1928 гг. вучыўся ў Віцебскім педагагічным тэхнікуме. Быў прызваны ў Савецкую Армію. З 1932 г.— супрацоўнік яўрэйскай газеты «Юнгер арбайтэр» («Малады рабочы»). У 1936—1941 гг. выкладаў рускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе ў Мінску. З пачатку Вялікай Айчыннай вайны — у арміі.

Загінуў у 1942 г. на фронце.

Першы верш апублікаваў у 1924 г. Пісаў на мове ідыш. Аўтар зборнікаў «Мой першы сноп» (1932) і «На маршы» (1940). Асобныя творы апублікаваны ў перакладзе на беларускую мову ў зборніку «Мы іх не забудзем» (1949).

## *Максім ТАНК*



Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко) нарадзіўся 17.9.1912 г. у вёсцы Пількаўшчына Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў пачатковую польскую школу, вучыўся ў Вілейскай рускай і ў Радашковіцкай беларускай гімназіях, з апошняй быў выключаны за ўдзел у школьнай забастоўцы. Потым вучыўся ў віленскіх беларускай, рускай гімназіях. У 1927 г. уступіў у камсамол і пачаў актыўна ўдзельнічаць у падпольным руху. Працаваў інструктарам ЦК камсамола Заходняй Беларусі (1932—1933), вёў рэвалюцыйную дзейнасць на Віленшчыне і Навагрудчыне. З мая 1933 да мая

1934 г. і з верасня да снежня 1934 г. сядзеў у віленскай турме «Лукішкі». Працаваў у легальным і падпольным камуністычным друку. Пасля далучэння Заходняй Беларусі быў супрацоўнікам абласной газеты «Вілейская праўда» (1939—1940). У час Вялікай Айчыннай вайны працаваў у газеце «За Савецкую Беларусь» (Бранскі фронт), у агітплакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну». У 1945—1948 гг.— літаратурны рэдактар часопіса «Вожык», у 1948—1966 гг.— галоўны рэдактар часопіса «Полымя», з 1966 г.— першы сакратар, а ў 1971—1990 гг.— старшыня праўлення СП БССР. Дэпутат Вярхоўнага Савета СССР (1969—1989) і БССР (1947—1971), сакратар праўлення СП СССР (з 1966), член Савецкага камітэта абароны міру, старшыня Беларускага аддзялення савецка-польскай дружбы (з 1958 г.). Старшыня Вярхоўнага Савета БССР VI—VII скліканняў. Акадэмік АН БССР. Член СП СССР з 1940 г.

Герой Сацыялістычнай Працы (1974). Ганаровы грамадзянін г. Мінска (1987). Узнагароджаны чатырма ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны II ступені, Дружбы народаў і медалямі, а таксама афіцэрскім крыжам Адраджэння Польшчы, ордэнамі Заслугі ПНР.

Народны паэт БССР (1968).

Друкавацца пачаў у 1932 г. у часопісе «Пралом» (выдаваў з паэтам Я. Гарохам), «Часопісе для ўсіх», газетах-аднадзёнках «На пераломе» і «Беларускае жыццё» (апошняя выдадзена ў Львове, у ёй змешчаны першы, падпісаны псеўданімам Максім Танк, верш «Заштрайкавалі гіганты-коміны»). Першыя кніжкі паэзіі выдаў у Вільні: «На этапах» (1936, факсімільнае ў 1983, Мінск), «Журавінавы цвет» (1937), «Пад мачтай» (1938), паэма «Нарач» (1937). У Мінску выдадзены «Выбраныя вершы» (1940), рукапіс наступнага зборніка і сцэнарыя «Бура над Нараччу» загінулі ў час вайны, «Янук Сяліба» (паэма, 1943), «Вастрыце зброю» (вершы і паэмы, 1945), «Праз вогненны небасхіл» (1945), «Выбраныя вершы» (1947), «Вершы» (1947, 1948), «Каб ведалі» (1948), «На камні, жалезе і золаце» (1951), «Выбраныя творы» (1952, 1954), «У дарозе» (1954), «След бліскавіцы» (1957), «Мой хлеб надзённы»

(1962), «Лірыка» (1963), «Глыток вады» (1964), «Селядцы з вершамі» (гумар, 1966), «Вершы» (1967), «Ключ жураўліны» (1972), «Хай будзе святло» (1972), «Дарога, закалыханая жытам» (1976), «Вершы» (1979), «Прайсці праз вернасць» (1979), «Лірыка» (1982), «За маім сталом» (1984), «Лірыка» (1987), «Дарога і хлеб» (1988), «Збор калосся: Вершы 1983—1988» (1989), «Паслухайце, вясна ідзе» (1990). Для дзяцей напісаў кніжкі вершаў «Галінка і верабей» (1946), «Кніжка пра мядзведзя» (1947), «Вершы» (1948), «Урачыстае абяцанне» (1949), «Сярод лясоў наднёманскіх» (1951, 1987), кніжкі казак «Ехаў казачнік Бай» (1955, 1984), «Конь і леў» (1955), «Казкі. Легенды» (1960), «Светлячок» (1970), «Быліна пра касмічнае падарожжа мураша Бадзіні» (1979). Аўтар кнігі-дзённіка «Лісткі календара» (1970). У 1958 г. выйшаў Збор твораў у 2-х, у 1966—1967 гг.— у 4-х, у 1978—1981 гг.— у 6 тамах.

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы А. Пушкіна, У. Маякоўскага, П. Тычыны, М. Рыльскага, А. Венцлавы, Я. Судрабкална, А. Міцкевіча, Ю. Славацкага, Ю. Тувіма, У. Бранеўскага, Р. Дабравольскага, Т. Ружэвіча, А. Германава і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1948) за зборнік паэзіі «Каб ведалі», Літаратурнай прэміі Янкі Купалы (1959) за зборнік «След бліскавіцы», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1966) за зборнік «Мой хлеб надзённы», Ленінскай прэміі (1978) за зборнік «Нарочанские сосны» (Масква, 1977), Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева (1980) за кнігу «Прайсці праз вернасць». Атрымаў у Польшчы прэмію аўтарскага аб'яднання «ЗАІКС» (1971) за пераклады твораў польскай літаратуры і ўмацаванне дружбы паміж народамі.

*Вялянцін ТАРАС*



Валянцін Яфімавіч Тарас нарадзіўся 9.2.1930 г. у горадзе Мінску ў сям'і мастака.

У час Вялікай Айчыннай вайны трынаццацігадовым хлапчуком пайшоў у партызаны, быў байцом атрада «За Савецкую Радзіму» брыгады імя Чкалава (Баранавіцкае партызанскае злучэнне). З канца 1944 г. працаваў шліфавальшчыкам у Беларускай рэспубліканскай літаграфіі ў Гродне і адначасова вучыўся ў вячэрняй школе рабочай моладзі. На пачатку 1948 г. вярнуўся ў Мінск, быў рознарабочым на Мінскай бісквітнай фабрыцы і працягваў навучанне ў вячэрняй школе. У 1955 г. скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда» (1955—1962), у 1964—1968 гг.— рэдактар аддзела прозы часопіса «Неман». Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Першыя вершы апублікаваў у 1948 г. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар зборнікаў паэзіі «Минска улицы родные» (1959), «Доверие» (1960), «Тревожная земля» (1963), «Две тетради» (1982), «Пазіцыя» (1987) і кніг аповесцей і апавяданняў «Первая молния» (Масква, 1973) «Ни минуты раскаяния» (1947), «Под созвездием Льва» (1978), «Прощальные костры» (выбранае, 1980), «Размышление» (1984), «Дань времени» (выбранае, 1990).

Аўтар літаратурна-драматычнай кампазіцыі і тэкстаў большасці песень для канцэртнай праграмы «Праз усю вайну» ансамбля «Песняры» (кампазітар У. Мулявін, 1984). Апавяданне «Незвычайная смерць» экранізавана на Кіеўскай кінастудыі імя А. Даўжэнкі ў 1974 г. На кінастудыі «Беларусьфільм» па яго сцэнарыях зняты дакументальныя стужкі «Жаўрукі ляцяць на Палессе» (1975), «Праз усю вайну» (на падставе аднайменнай праграмы «Песняроў», з П. Якубовічам, 1985), «Зорка Максіма» (кінаэсэ пра М. Багдановіча, 1980), «Наш Пімен» (да 70-годдзя П. Панчанкі), «Вяртанне ў першы снег» (пра Р. Барадуліна, 1985), некалькі мультыплі-

кацыйных фільмаў. У 1974 г. на Беларускім тэлебачанні пастаўлена тэлевізійная п'еса «Не загасі свечку».

Для тэатра імя Янкі Купалы пераклаў п'есы І. Жаміяка «Мес'е Амількар» (пастаўлена ў 1983) і «Дракон» Я. Шварца (пастаўлена ў 1988).

У яго перакладах на рускую мову выйшлі кнігі У. Нядзведскага «Хлопцы из второго корпуса» (1966), С. Гаўрусёва «Отправление в полет» (Масква, 1967), Г.-Г. Маркеса «Осень патриарха» (з К. Шэрманам, Масква, 1978), апублікаваны асобныя пераклады паэзіі Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Танка, У. Хадыкі, Р. Барадуліна, М. Стральцова, прозы К. Чорнага, Я. Брыля, В. Быкава, М. Стральцова, А. Асіпенкі і інш. Лепшыя пераклады беларускай паэзіі змешчаны ў зборніку «Запах меда» (1986). На беларускай мове выступае ў перыядычным друку як паэт, крытык і перакладчык з рускай мовы.

---

## *Ніна ТАРАС*



Ніна Міхайлаўна Тарас нарадзілася 15.5.1916 г. у вёсцы Заполле Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучылася ў Навагрудскай беларускай гімназіі (1930—1934), затым у Віленскай (скончыла ў 1936). Удзельнічала ў рэвалюцыйным руху. У 1937 г. вярнулася ў родную вёску, у 1938 г. пераехала ў Ліду. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі працавала ў лідскай раённай газеце «Уперад». У 1942—1944 гг.— сувязная лідскай спецгрупы партызанскай брыгады імя С. М. Кірава і партызанскага атрада імя Р. І. Катоўскага брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага Баранавіцкай вобласці. Зноў працавала ў райгазеце «Уперад» (1944—1945), была стыльрэдактарам у Дзяржаўным выдавецтве БССР (1945—1946), літработнікам рэдакцыі газеты «Піянер Беларусі» (1951—1953), літкансультантам пры рэдакцыі газеты «Звязда» ў Мінску. У 1957 г. скончыла Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1940 г.

Узнагароджана ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Выступаць у друку пачала з 1936 г. (у віленскіх перыядычных выданнях). Аўтар зборнікаў вершаў «На ўсход ідучы...» (1940), «Суніцы» (1946), «Вершы» (1952), «Кветка шчасця» (выбранае, 1958), «Пад белым яварам» (выбранае, 1966), «У тапаліную замець» (вершы і паэма, 1976), «Праметэю прыйду пакланіцца» (1981), «Праз вятры-завеі» (выбранае, 1986). Напісала кніжкі паэзіі для дзяцей «Казкі пра абавязкі» (1955), «Наш бор» (1968). Паасобныя вершы сталі папулярнымі песнямі («Сонца за хмарамі ўранні...»).

Перакладае з рускай, украінскай, польскай моў.

---

## *Канстанцін ТАРАСАЎ*



Канстанцін Іванавіч Тарасаў нарадзіўся 10.10. 1940 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1957) на працягу трох год працаваў слесарам-зборшчыкам на Мінскім механічным заводзе, калектарам у Паўночна-Заходняй геолага-разведачнай экспедыцыі, слесарам-мантажнікам у арганізацыі «Спецэлеватармельбуд». Вучыўся на хімічным факультэце Беларускага політэхнічнага інстытута (1960—1965). Па заканчэнні інстытута працаваў майстрам шкловарэння на шклозаводзе «Нёман», тэхнолагам на віцебскім заводзе «Маналіт». Быў рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі ў выдавецтве «Вышэйшая школа» (1967—1975), журналістам па дагаворы і загадчыкам аддзела прапаганды і агітацыі газеты «Знамя юности» (1975—1977), рэдактарам аддзела мастацтва і крытыкі часопіса «Неман» (1977—1983), спецыяльным карэспандэнтам газеты «Літаратура і мастацтва» (1986—1988). З 1990 г.— адказны сакратар часопіса «Спадчына». Член СП СССР з 1982 г.

У друку з мастацкім творам выступіў упершыню ў 1976 г. (аповесць «Следственный эксперимент», часопіс «Неман»). Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар кніг аповесцей «День рассеяния» (1980), «В час Стрельца» (1981),

«Странствие в тесном кругу» (1986), «Погоня на Грунвальд» (Масква, 1986), зборніка гісторыка-літаратурных эсэ «Памяць о легендах» (1984, пашыранае выданне на беларускай мове ў 1990).

---

## *Люба ТАРАСЮК*



Люба (Любоў Канстанцінаўна) Тарасюк нарадзілася 7.12.1953 г. у вёсцы Пінкавічы Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і рабочых.

Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1975) і аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры (1978). З 1978 г. выкладае гісторыю беларускай літаратуры ў БДУ. Кандыдат філалагічных навук, дацэнт. Член СП СССР з 1981 г.

Першыя вершы надрукавала ў 1966 г. (газета «Піянер Беларусі»). Выдала кнігу паэзіі «Смага ракі» (1983).

Выступае ў друку таксама як крытык і літаратуразнаўца. Аўтар манаграфіі «Вернасць вытокам: Фальклорныя традыцыі ў сучаснай беларускай паэзіі» (1985).

---

## *Браніслаў ТАРАШКЕВІЧ*



Браніслаў Адамавіч Тарашкевіч нарадзіўся 20.1.1892 г. у засценку Мацюлішкі (цяпер Вільнюскі раён, Літва) у сялянскай сям'і.

У 1916 г. скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Петраградскага універсітэта і быў пакінуты пры кафедры рускай мовы і літаратуры. Працаваў і як прыват-дацэнт грэчаскай і лацінскай моў. У 1917 г.— адзін з лідэраў Беларускай сацыялістычнай грамады. У 1918 г. загадваў культурна-асветным аддзелам Белнацкама, яго Петраградскага аддзялення. У 1919 г.— выкладчык беларускай і грэчаскай моў у Мінскім педагагічным інстытуце. У 1920 г.— загадчык беларускага сектара дэпартамента асветы т. зв. Сярэдняй Літвы. З 1921 г.— дырэктар Віленскай беларускай гімназіі. У 1922 г. быў абраны паслом (дэпутатам) у польскі сейм, належаў да

левага крыла Беларускага пасольскага клуба, якое цесна зблізілася з камуністычнымі сіламі. Заснавальнік і старшыня Беларускай сялянска-рабочай грамады (1925—1927). Удзельнічаў у III канферэнцыі КПЗБ як член кампартыі (1925). У студзені 1927 г. быў арыштаваны польскімі буржуазнымі ўладамі, а ў маі 1928 г. засуджаны на 12 год зняволення. У 1930 г. выпушчаны з астрога. У лютым 1931 г. арыштаваны, у лістападзе 1932 г. засуджаны на 8 год катаржнай турмы. З верасня 1933 г. у выніку абмену палітзняволенымі жыў у СССР. Працаваў загадчыкам аддзела Польшчы і Прыбалтыкі ў Міжнародным аграрным інстытуце (Масква). 6.5.1937 г. арыштаваны. Пастанова НКУС ад 5.1.1938 г. адменена Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР ад 26.1.1957 г. Акадэмік АН БССР.

Расстраляны 29.11.1938 г.

У беларускім друку выступаў з 1914 г. Выдаў у Вільні «Беларускую граматыку для школ» (1918, вытрымала 6 выданняў). Пераклаў на беларускую мову «Іліяду» Гамера (урывак змешчаны ў часопісе «Полымя рэвалюцыі», 1935), «Пана Тадэвуша» А. Міцкевіча (1981; Ольштын, 1984). Апублікаваў брашуры «Заходняя Беларусь — плацдарм імперыялістычнай інтэрвенцыі (1931), «Как живут крестьяне за границей» (Масква — Ленінград, 1935), «Дифференциация крестьянства в Польше во время кризиса» (у зборніку «Польская деревня во время кризиса», Масква, 1935).

Вядомы як публіцыст і выдатны прамоўца часоў нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі.

---

## *Раман ТАРМОЛА*



Раман Якаўлевіч Тармола нарадзіўся 4.4.1936 г. у гарадскім пасёлку Мір Карэліцкага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і рамесніка.

У 1960 г. скончыў гісторыка-філалагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Працаваў старшым рэдактарам, загадчыкам літаратурна-мастацкага аддзела, галоўным рэдактарам літаратурна-драматычных праграм, каментатарам па літаратуры і мастацтву Беларускага тэлебачання. З 1977 г. член сцэ-

нарна-рэдакцыйнай калегіі мастацкіх фільмаў кінастудыі «Беларусьфільм», з 1980 г.— член сцэнарна-рэдакцыйнай калегіі тэлевізійных фільмаў Беларускага тэлебачання. Член СП СССР з 1964 г.

Першыя творы апублікаваў у 1957 г. («Настаўніцкая газета», «Чырвоная змена»). Аўтар кніг паэзіі «Асколкі і росы» (1964), «Поўня» (1966), «Абнаўленне» (1968), «Міранка» (1971), «Побач» (1974), «Павага» (1976), «Зямное — зямному» (выбранае, 1979), «Вобразы вечара» (1982), «Толькі б дагаварыць» (1986), «Спрадвечнасць» (выбранае, 1989). Выдаў кнігі для дзяцей «Каго баяцца ў лесе» (1973), «Казкі-падказкі» (1984).

Напісаў сцэнарыі дакументальных фільмаў «Людзям сябе пакажы» (зняты ў 1973), «Я не самотны... Максім Багдановіч» (зняты ў 1982), тэлеспектакля «Зачараваны Валерка» (пастаўлены ў 1976).

---

## *Мікола ТАТУР*



Мікола (Мікалай Ігнатавіч) Татур нарадзіўся 3.3.1919 г. ва ўрочышчы Застар'і Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

З 1931 г. выхоўваўся ў Бабруйскім дзіцячым доме. Скончыў факультэт мовы і літаратуры Мінскага настаўніцкага інстытута (1937), да 1941 г. настаўнічаў у гарадах Сянно Віцебскай вобласці і Друскінінкай (цяпер Літва). У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у партызанскім руху. Быў цяжка паранены і доўга лячыўся ў шпіталях. З 1944 г.— рэдактар, загадчык рэдакцыі Дзяржаўнага выдавецтва БССР, выдавецтва «Полымя». У 1966—1970 гг.— дырэктар Беларускага аддзялення Літаратурнага фонду СССР, у 1970—1979 гг.— дырэктар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР. Член СП СССР з 1953 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Літаратурную працу пачаў у 1948 г. Пераклаў з рускай мовы «Кладоўка сонца» М. Прышвіна

(1948), «Школа» А. Гайдара (1948), «Стажары» А. Мусатава (1950), «Паўночная Аўрора» М. Нікіціна (з В. Зубам, 1953), «Журбіны» У. Кочатава (1955), «Далёка ад Масквы» В. Ажаева (з У. Шахаўцом, 1951), «Запіскі майго калегі» Р. Рэлеса (1960), з польскай — «Мараль пані Дульскай» Г. Запольскай (часопіс «Полымя», 1958), «Грамадзяне» К. Брандыса (з Я. Міско, 1958), Я. Івашкевіча, Я. Гушчы і інш.; з украінскай — апавяданні А. Вішні, п'есу В. Шчогалева «Бярозка» (1958). У яго перакладзе выйшлі раманы «Дзень нараджэння» А. Венцлавы (з С. Дзяргаем, 1961), «Трэція пеўні» А. Лупан (1971), «Чародка белых варон» Э. Бээкман (1973), «Зялёная зорка» У. Умарбекава (1976), «Скалакі» А. Ірасека (з Я. Васілёнкам, 1974), пастаўлены п'есы «Гросмайстарскі бал» І. Штэмлера, «Дзівак» Н. Хікмета, «Вясёлы тракт» Б. Васільева, «Варшаўская мелодыя» Л. Зорына, «Пэпі — Доўгая Панчоха» (інсцэніроўка па аповесці А. Ліндгрэн), «Восем лялек і адзін мядзведзік» І. Юргялевіч і інш.

Пераклаў на рускую мову п'есу І. Козела «Папараць-кветка» (Ленінград, 1960).

Аўтар эпіграм і мінібаек у перыядычным друку.

---

## *Юлі* ТАЎБІН



Юлі (Юдаль Абрамавіч) Таўбін нарадзіўся 15.9.1911 г. у горадзе Астрагожску Варонежскай вобласці (Расія) у сям'і аптэкара.

У 1921 г. з бацькамі пераехаў у Мсціслаў. Скончыў педагагічны тэхнікум. Вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце (1931—1933). 25.2.1933 г. арыштаваны і 10.8.1933 г. пазасудовым органам прыгавораны да двух гадоў высылкі ў Цюмень. 6.12.1936 г. арыштаваны другі раз (відаць, пасля вяртання ў Мінск) і Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР ад 29.10.1937 г. прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны па першай справе — Судовай калегіяй па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР 24.8.1956 г., па другой — Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 29.7.1957 г.

Расстраляны 30.10.1937 г.

Друкавацца пачаў у 1926 г. (часопіс «Маладняк Калініншчыны», газета «Чырвоная змена»). Выйшлі зборнікі паэзіі «Агні» (1930), «Каб жыць, спяваць і не старэць...» (1931), «Тры паэмы» (1931), «Мая другая кніга» (1932), паэма «Таўрыда» (1932), «Выбраныя вершы» (1957) і «Вершы» (1969).

Пераклаў на беларускую мову асобныя творы Г. Гейнэ, У. Маякоўскага, а таксама англамоўных паэтаў.

---

## *Валянцін ТАЎЛАЙ*



Валянцін Паўлавіч Таўлай нарадзіўся 8.2.1914 г. у горадзе Баранавічах у сям'і чыгуначніка.

Дзяцінства прайшло ў вёсцы Рудаўка на Слонімшчыне. У 1927 г. паступіў у Віленскую беларускую гімназію, а ў 1929 г. быў выключаны за ўдзел у вучнёўскай забастоўцы. Летам 1929 г. арыштаваны польскімі ўладамі, а восенню 1930 г. асуджаны на 2 гады зняволення. У кастрычніку 1930 г. камуністычнае падполле накіравала яго ў БССР. Працаваў у Рэчыцы інструктарам райкома камсамола, у газеце «Звязда», вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. У канцы 1932 г. прыняты ў члены Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі і адклікани ЦК КПЗБ на падпольную працу ў Заходнюю Беларусь. Член цэнтральнай рэдакцыі КПЗБ (Варшава), супрацоўнік легальнага органа КПЗБ «Беларуская газета» (Вільня), прадстаўнік ЦК КПЗБ у Цэнтры нацыянальна-вызваленчага руху Заходняй Беларусі. Адзін з арганізатараў Літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў (1933). У 1934 г. зноў арыштаваны і асуджаны да 8 гадоў турмы. У верасні 1939 г. вызвалены з гродзенскай турмы Чырвонай Арміяй. Працаваў у лідскай раённай газеце «Уперад» (1939—1941). У гады Вялікай Айчыннай вайны быў сувязным партызанскага атрада імя Р. І. Катоўскага брыгады імя Ф. Э. Дзяржынскага Баранавіцкага злучэння (1942—1944), разведчыкам, кіраўніком навагрудскай агентурнай сеткі спецгрупы «Буравеснік» (студзень — ліпень 1944). У 1944—1945 гг. працаваў адказным сакратаром

навагрудскай раённай газеты «Звязда», у 1945—1947 гг.— старшы навуковы супрацоўнік і намеснік дырэктара Літаратурнага музея Янкі Купалы. Член СП СССР з 1941 г.

Памёр 27.4.1947 г.

Друкавацца пачаў у 1928 г. (газета «Сіла працы», Вільня). Аўтар паэмы «Непераможная» (выдадзена на шапірографе, Вільня, 1928), зборнікаў паэзіі «Выбранае» (1947), Выбраныя творы (1951, 1958), «Вершы і паэмы» (1955, 1979), «Творы» (1961), «Выбраныя вершы і паэмы» (1967), «Пілую вершам краты» (выбранае, 1984).

Пісаў літаратурна-крытычныя (пра творчасць Я. Купалы, П. Пестрака, Я. Брыля) і публіцыстычныя артыкулы.

Перакладаў на беларускую мову творы А. Міцкевіча, І. Крылова і інш.

---

## *Васіль ТКАЧОЎ*



Васіль Юр'евіч Ткачоў нарадзіўся 1.1.1948 г. у вёсцы Гута Рагачоўскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і вясковых настаўнікаў.

Пасля заканчэння Ільічоўскай сярэдняй школы (1966) працаваў у раённых газетах (г. Івацэвічы і г. п. Карма). У 1967 г. прызваны ў Савецкую Армію. Скончыў факультэт журналістыкі Львоўскага вышэйшага ваенна-палітычнага вучылішча (1973). Служыў у Туркменіі ваенным карэспандэнтам. У 1979—1980 гг. працаваў рэдактарам рэкламы камбіната «Туркменгандальрэклама» (Ашхабад). З 1980 г.— карэспандэнт шматтыражкі «Сельмашавец» (Гомель), у 1983—1985 гг.— стыліст, спецыяльны карэспандэнт абласной газеты «Гомельская праўда». У 1989 г. абраны сакратаром Гомельскага абласнога аддзялення СП БССР. Член СП СССР з 1989 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1966 г. (часопіс «Вясёлка»). Выдадзены зборнікі апавяданняў для дзяцей «Хітры Данік» (1975) і «Партрэт салдата» (1984), для дарослых — «Дзень у горадзе» (1985), а таксама кніга публіцыстыкі «Пахвалі пражыты дзень» (1988).

Аўтар п'ес «Сівы бусел» (пастаўлена ў 1985),

«Вокны» (пастаўлена ў 1985), «Прыгоды з Канапухіным» (пастаўлена ў 1988), «Лесвіца» (пастаўлена ў 1988), «Кветкі-ягадкі» (пастаўлена ў 1990), аднаактоўкі «Дублёр» і інш.

Пераклаў на беларускую мову п'есу Л. Петрушэўскай «Маскоўскі хор» (пастаўлена ў 1989).

---

## *Мікола ТКАЧОЎ*



Мікола (Мікалай Гаўрылавіч) Ткачоў нарадзіўся 8.3.1918 г. у вёсцы Горанка Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Працоўны шлях пачаў з рабочага мэблевай фабрыкі ў Віцебску ў 1933 г. Адначасова вучыўся на вячэрнім рабфаку. Пасля заканчэння планава-эканамічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага інстытута народнай гаспадаркі імя В. У. Куйбышава (1939) некалькі месяцаў працаваў у газеце «Піянер Беларусі», пасля ў сістэме кінафікацыі. У 1940 г. прызваны ў Чырвоную Армію — быў інструктарам-літаратарам дывізійнай газеты. У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся на фронце, у партызанах. Быў кантужаны. З кастрычніка 1943 г.— супрацоўнік магілёўскай абласной газеты «За Радзіму». У 1949—1957 гг.— адказны сакратар часопіса «Полымя», у 1957—1959 гг.— галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва», у 1959—1972 гг.— сакратар праўлення СП БССР. У 1972—1979 гг.— дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура». У 1967 г. як член дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член СП СССР з 1948 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Дружбы народаў, «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 20.4.1979 г.

Літаратурную працу пачаў у 1938 г. з нарысаў і апавяданняў. Выйшлі раман «Згуртаванасць» (1951), кнігі прозы «Пошукі скарбаў» (апавяданні і нарысы, 1963), «Дыханне агню» (раман, апавяданні, нарысы, 1978, 2-е выданне ў 1988). Пераклаў на беларускую мову зборнік апавяданняў В. Рошкі «Што мае вочы бачылі» (1962) і аповесць М. Прыляжаевай «Жыццё Леніна» (1975).

*Павел ТКАЧОЎ*



Павел Іванавіч Ткачоў нарадзіўся 3.9.1930 г. у вёсцы Скадаінаўка Шахцінскага раёна Растоўскай вобласці (Расія) у сям'і шахцёра.

Пасля заканчэння сярэдняй школы быў дыктарам і літаратурным сакратаром на радыёстудыі ў г. Паўлаўску Варонежскай вобласці. Скончыў аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955). Працаваў у рэдакцыях газет «Зорька», «Піянер Беларусі», часопіса «Бярозка». У 1967 г. скончыў аспірантуру, выкладаў рускую класічную літаратуру, з 1969 г. загадвае кафедрай рускай класічнай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна, адначасова быў дэканам факультэта журналістыкі (1981—1986). Прафесар, доктар філалагічных навук. Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны медалямі.

Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларускай ССР (1983).

Друкавацца пачаў у 1947 г. (паўлаўская раённая газета «Луч коммуны»). Піша на беларускай і рускай мовах. Для дзяцей выйшлі кнігі апавесцей, апавяданняў «Мікіткаў падарунак» (1960), «Пра Сяргейку і лясных жыхароў» (1961), «Акцябраты — твае сябры» (1962), «Вішнёвая квецень. Апавяданні пра У. І. Леніна» (1965, 2-е дапоўненае і перапрацаванае выданне ў 1971), «Сэрца камунара» (1966), «Самае галоўнае: Штрыхі да партрэта Ільіча» (1977), апавесці «Піліпка з Галубінай слабодкі» (1969), «Граніца была побач» (1972), «Час світальнай зоркі» (выбранае, 1980, 1990), «Як разгаралася полымя» (1982), «У ліпені 1917 года» (1986), «Пралескі яе вясны» (апавесці, нарысы, 1986), «Балада аб партыйным білеце» (1988), «Чатыры дні» (часопіс «Маладосць», 1989), нарысы «Імя Леніна ў сэрцы нашым» (1963), «Люся Герасименко» (Масква, 1968, 2-е дапоўненае і перапрацаванае выданне ў 1980), «Маніфест народнага шчасця» (1987), «Рэвалюцыйны трымаем крок» (1988). Адзін з аўтараў і ўкладальнікаў кніг «Піянеры-героі» (1962), «Напісалі кніжку самі» (1966), «Эстафета пакаленняў» (1967).

Выступае як крытык і літаратуразнавец. Вый-

шлі манаграфіі «Вечный бой: Памфлетное наследие Я. Галана и традиции М. Горького» (1970), «Иду на «вы»: Заметки о памфлете» (1975), «Границы жанра» (1977), «Сатиры злой звенящая строка...»: Природа смеха в памфлете» (1980), кніга нарысаў і эсэ «Силуэты прошлого» (1983), «Пра самага чалавечнага» (1985).

---

## *Віктар* ТРАСЦЯНСКІ



Віктар Сцяпанавіч Трасцянскі нарадзіўся 5.12. 1924 г. у горадзе Майкопе (Адыгейская аўтаномная вобласць) у сям'і служачых.

У 1941 г. пайшоў на фронт. Удзельнічаў у баях на тэрыторыі нашай краіны, Польшчы, Румыніі, Венгрыі. Службу закончыў камандзірам батальёна марской пяхоты. У 1945 г. прыехаў у Гомель, дзе працаваў намеснікам дырэктара тарфянога завода «Бальшавік», намеснікам загадчыка аддзела ў аблвыканкоме. У 1946—1948 гг.— студэнт юрыдычнага інстытута (Алма-Ата). З 1948 г.— начальнік аддзела кадраў Упраўлення будаўнічых работ Маскоўскай ваеннай акругі, з 1950 г.— начальнік адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела выдавецтва «Литературная газета», з 1953 г.— інспектар Галоўнага ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Міністэрства геалогіі і аховы недраў, з 1955 г.— інструктар Галоўнага ўпраўлення распаўсюджвання друку Міністэрства сувязі СССР, з 1956 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Физкультура и спорт», з 1958 г.— загадчык аддзела прапаганды, старшы рэдактар выдавецтва «Знание», у 1966—1978 гг.— рэдактар рэдакцыі часопіса «Дружба народов», карэспандэнт. У 1955 г. скончыў Усесаюзны завочны інжынерна-будаўнічы інстытут. З 1978 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1983 г.

Узнагароджаны трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, медалямі.

З першым вершам у друку выступіў у 1949 г. (армейская газета «Красный воин» Маскоўскай ваеннай акругі). Піша на рускай мове. У Маскве выйшлі зборнікі паэзіі «Расстрелянные листья» (1975), «Далеко от войны» (1980),

«Расстояния и расставания» (1983), у Мінску — «Дальние дороги, дальние...» (1981), «Наследникам» (1985). Кніга паэзіі «Багряные дороги» змешчана ў калектыўным зборніку «Надежность» (Масква, 1986).

---

## *Алесь* ТРАЯНОЎСКІ



Алесь (Аляксандр Пятровіч) Траяноўскі нарадзіўся 22.9.1925 г. ва ўрочышчы Уздымач Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і лесніка.

У час Вялікай Айчыннай вайны з верасня 1942 па ліпень 1944 г.— партызан брыгады імя Чапаева, з ліпеня 1944 г.— на 3-м Беларускім і 3-м Украінскім франтах, быў цяжка паранены. Пасля дэмабілізацыі (1946) працаваў на розных пасадах у Мінску. У 1959 г. скончыў Маскоўскі гісторыка-архіўны інстытут. У 1955—1962 гг.— літсупрацоўнік шматтыражнай газеты «Западная трасса» (Беларускае ўпраўленне грамадзянскай авіяцыі). У 1962—1982 гг.— літсупрацоўнік, загадчык аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда», у 1983—1986 гг.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Мастацтва Беларусі». Член СП СССР з 1990 г.

Узнагароджаны медалямі.

Творчую дзейнасць пачаў у 1957 г. артыкуламі на літаратуразнаўчыя тэмы ў перыядычным друку. Працуе ў галіне мастацкага перакладу з 1960 г. Перакладае з верхнялужыцкай, ніжнялужыцкай, кашубскай, польскай і ўкраінскай моў. Адзін з укладальнікаў і перакладчыкаў, аўтар прадмовы і каментарыяў да анталогіі паэзіі лужыцкіх сербаў «Там, дзе Шпрэвя шуміць» 1969). У яго перакладах на беларускую мову выйшлі анталогія кашубскай паэзіі «За даляглядам край Сталемаў» (1980), аповесць Ю. Брэзана «Чорны млын» (1984). Пераклаў шэраг твораў І. Франка, П. Тычыны, Я. Барта-Цішынскага, Ю. Брэзана, К. Лоранца, А. Лаймінг і інш.

*Паўлюк* ТРУС



Паўлюк (Павел Адамавіч) Трус нарадзіўся 6.5. 1904 г. у вёсцы Нізок Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1923 г. скончыў Уздзенскую сямігодку, у 1927 г.— Мінскі беларускі педагагічны тэхнікум. Працаваў у рэдакцыі гомельскай газеты «Палеская праўда» (1927—1928), вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1928—1929). Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк».

Памёр 30.8.1929 г.

З першымі творамі выступіў у друку ў 1923 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «Вершы» (1925), «Ветры буйныя» (1927), Збор твораў (1934), «Творы» (1935), кнігі Выбраных твораў (1931, 1940, 1941, 1946, 1949, 1953, 1958, 1967, 1977, 1979), «Новай квадры настаў маладзік» (вершы і паэмы, 1984). Для дзяцей выдадзена кніга паэзіі «Падаюць сняжынкі» (1983).

*Віктар* ТРЫХМАНЕНКА



Віктар Фёдаравіч Трыхманенка нарадзіўся 10.5. 1923 г. у сяле Гуменцы Камянец-Падольскага раёна Хмяльніцкай вобласці (Украіна) у сям'і служачага.

У пачатку Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў Савецкую Армію. Скончыў ваенна-авіяцыйнае вучылішча (1944), як лётчык-знішчальнік удзельнічаў у баях супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Па стану здароўя ў канцы 1946 г. быў звольнены з арміі. У 1947—1949 гг. працаваў у БелТА. Быў зноў прызваны ў кадры Узброеных Сіл, у 1963 г. скончыў Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна. Многія гады з'яўляўся ўласным карэспандэнтам газеты «Красная звезда» па Беларускай ваеннай акрузе. У 1974—1979 гг.— адказны рэдактар газеты Беларускай ваеннай акругі «Во славу Родины». Сакратар праўлення Саюза журналістаў БССР (1976—1979). Дырэктар Дома літаратара (1980—1981). Член СП СССР з 1962 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» III ступені і медалямі.

Першыя апавяданні надрукаваў у 1956 г. Піша на рускай мове. У свет выйшлі зборнікі апавяданняў і аповесцей «Сложный вариант» (Масква, 1958), «Звуковой барьер» (Хабараўск, 1959) і «Наташины зорьки» (Хабараўск, 1960), «Человек расправляет крылья» (Масква, 1961), «Знакомый почерк» (Масква, 1963), «Истинная высота» (1965), «Сестра белой березы» (1979), аповесці «Крылья на вырост» (Масква, 1973), «Сергей Грицевец» (1987), раман «Небом крещенные» (Масква, 1969), кніга прозы «Крылья на вырост» (раман, аповесць, апавяданні, 1984).

## *Нэлі ТУЛУПАВА*



Нэлі Іванаўна Тулупава (Лісоўская) нарадзілася 1.2.1938 г. у вёсцы Капань Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і настаўніка.

У 1955 г. скончыла Гомельскае медыцынскае вучылішча. Працавала фельчарам і акушэркай у медыцынскіх установах Віцебшчыны, дыктарам Віцебскага абласнога тэлебачання. У 1969 г. скончыла завочнае аддзяленне факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1962 г. пераехала ў Горкі Магілёўскай вобласці, дзе працавала інструктарам РДК, медсястрой у бальніцы, загадчыкам агульнага сектара райкома камсамола, рэдактарам газеты «Советский студент» Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. У 1974—1978 гг.— загадчык рэпертуарнага аддзела Белдзяржфілармоніі, у 1979—1988 гг.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». З 1990 г. загадчык аддзела літаратуры часопіса «Вожык». Член СП СССР з 1977 г.

У друку выступае з 1956 г. (аршанская раённая газета «Ленінскі прызыў»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Станцыя надзей» (1971), «Дабрадзея» (вершы і паэмы, 1977), «Босая цішыня» (вершы, паэма, 1980), «Гарывада» (драматычная паэма-бая, 1984), «Сонца ў хату» (выбранае, 1986), «Як павезлі мяне сватаць» (гумарэскі, 1987), «Скажыце ўсім» (лірыка і гумар, 1988), кніжак для дзяцей «Дождждык Мікіта» (вершы,

1979), «Бізоны-рабінзоны» (казкі, 1983), «Пра што думае кіт» (аповесць, 1986).

Перакладае на беларускую мову творы паэтаў народаў СССР.

---

## *Любоў* ТУРБІНА



Любоў Мікалаеўна Турбіна нарадзілася 17.7. 1942 г. у горадзе Ашхабадзе (Туркменія) у сям'і вучонага.

Пасля заканчэння фізічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1964) — інжынер, аспірант, навуковы супрацоўнік Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР. У 1980 г. скончыла завочнае аддзяленне паэзіі Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве. З 1984 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Кандыдат біялагічных навук. Член СП СССР з 1990 г.

З вершамі пачала выступаць у друку ў 1974 г. (газета «Знамя юности»). Піша на рускай мове. Аўтар зборнікаў вершаў «Улица детства» (1981), «Город любви» (1988).

На рускую мову пераклала паасобныя вершы М. Багдановіча, М. Стральцова, Р. Барадуліна, Г. Каржанеўскай, паэтаў Туркменіі і Азербайджана.

---

## *Міхась* ТЫЧЫНА



Міхась (Міхаіл Аляксандравіч) Тычына нарадзіўся 10.2.1943 г. у пасёлку Ленінскі Алданскага раёна (Якуцкай АССР) у сям'і ссыльнага.

У 1947 г. разам з бацькамі пераехаў на іх радзіму, у вёску Завалочыцы Глускага раёна. Скончыў філалагічны факультэт Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна (1964). Кароткі час працаваў настаўнікам на Піншчыне. Служыў у Савецкай Арміі (1964—1965). Скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1970) і працуе навуковым супрацоўнікам гэтага інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член Беларускага ПЭН-цэнтра з 1989 г. Член СП СССР з 1976 г.

Узнагароджаны медалём.

Друкавацца пачаў у 1963 г. з вершаў (брэсцкая абласная газета «Заря»), як крытык і літаратуразнавец з 1969 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар манаграфій «Кузьма Чорны: Эвалюцыя мастацкага мыслення» (1973), «Народ и война» (1985), зборнікаў літаратурна-крытычных артыкулаў «Змена квадры» (1983), «Час прозы» (1988). Адзін з аўтараў «Истории белорусской советской литературы» (1977), калектыўнай працы «Магчымасці рэалізму: Прычыннасць і гістарызм» (з В. Жураўлёвым, 1982).

Выступае і ў галіне прозы. Выйшлі «Дажынкі» (аповесць і апавяданні, 1979), «Вяртанне: Аповесць пра Кузьму Чорнага» (1984).

# У



## *Дзмітрый* УКСУСАЎ

Дзмітрый Ільіч Уксусаў нарадзіўся 15.5.1915 г. у горадзе Янакіева Данецкай вобласці (Украіна) у сям'і рабочага.

Працоўны шлях пачаў у 1932 г. токарам на Янакіеўскім металургічным заводзе. У 1936 г. працаваў сакратаром у раённай газеце «Ленинское знамя» (г. Тосна Ленінградскай вобласці), адначасова вучыўся на вячэрнім аддзяленні Ленінградскага інстытута інжынераў камунальнай гаспадаркі. У час Вялікай Айчыннай вайны — баец партызанскага атрада, адказны сакратар абласной газеты «Ленинградский партизан». Пасля вызвалення Тоснянскага раёна (1944) — рэдактар раённай газеты, адказны рэдактар наўгародскай газеты «Звязда», адказны сакратар абласной газеты «Новгородская правда». У 1948 г. скончыў Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПСС і накіраваны на працу рэдактарам баранавіцкай абласной газеты «Чырвоная звязда». Працаваў у рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» загадчыкам аддзела, намеснікам рэдактара (1952—1959), загадчыкам рэдакцыі ў Дзяржаўным выдавецтве БССР (1959—1964), дырэктарам выдавецтва «Навука і тэхніка» (1964—1968), адказным сакратаром часопіса «Служба быту Беларусі» (1968—1975). Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 19.9.1989 г.

Апавяданні і нарысы пачаў пісаць у даваенныя гады. Пісаў на рускай мове. Аўтар кніг прозы «Ранний ветерок» (аповесць і апавяданні, 1959), аповесці «Я — твой друг» (1962, 2-е дапрацаванае выданне ў 1965) і публіцыстычнай кніжкі «Постоянно действующий агитпункт» (Масква, 1961).

## *Якуб УСІКАЎ*



Якуб (Якаў Кірылавіч) Усікаў нарадзіўся 20.9.1919 г. у вёсцы Кадзіна Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Магілёўскім палітасветтэхнікуме, затым на літаратурна-лінгвістычным факультэце Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. З трэцяга курса пераведся на завочнае аддзяленне (скончыў у 1940). Працаваў дырэктарам сярэдняй школы ў Вялікім Сяле Дзяржынскага раёна (1937—1939), выкладчыкам мовы і літаратуры ў Мар'інагорскім сельскагаспадарчым тэхнікуме. У час Вялікай Айчыннай вайны быў партызанам на Магілёўшчыне, потым — у Савецкай Арміі на 2-м Беларускім фронце. Быў паранены. Пасля вайны вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце мовы, літаратуры і мастацтва АН БССР (1947—1949) і працаваў у газеце «Чырвоная змена» (1945—1949). У 1949—1975 гг.— загадчык кафедры беларускай літаратуры Магілёўскага педінстытута, дацэнт таго ж інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1951 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

З рэцэнзіямі і артыкуламі пачаў выступаць у 1946 г. Выдаў манаграфіі «Драматургія Кандрата Крапівы: Нарысы аб станоўчым герое» (1953), «Беларуская камедыя: Ля вытокаў жанру» (1964), «Беларуская камедыя» (1973), зборнік літаратурна-крытычных артыкулаў «Грамадзянскае сумленне мастака» (1976), «Беларуская камедыя: Літаратурна-крытычныя нарысы» (1979), «Андрэй Макаёнак: Нарыс жыцця і творчасці» (1984). Адзін з аўтараў дапаможнікаў для студэнтаў ВНУ «Беларуская дзіцячая літаратура» (1966), «Беларуская вуснапаэтычная творчасць» (1966), «Гісторыя беларускай літаратуры: XIX — пачатак XX ст.» (1981), «Гісторыя беларускага тэатра» (1983).

## *Андрэй* УШАКОЎ



Андрэй Фёдаравіч Ушакоў нарадзіўся 16.10. 1912 г. у вёсцы Рабяткі Чавускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў прафтэхшколу металістаў, працаваў слесарам у дэпо, у майстэрнях авіяпарка, на швейнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі» ў Віцебску. У 1930—1931 гг. вучыўся на крытыка-творчым аддзяленні Вышэйшага педагагічнага інстытута ў Мінску, у 1933—1934 гг.— ва Усесаюзным інстытуце кінематаграфіі ў Маскве. Скончыў літаратурны факультэт Маскоўскага інстытута гісторыі, філасофіі і літаратуры імя М. Г. Чарнышэўскага (1939). З 1939 г. служыў у Чырвонай Арміі, працаваў у рэдакцыі дывізійнай газеты «За Советскую родину» (Гомель).

Загінуў у 1941 г. на фронце.

Вершы пачаў друкаваць у 1928 г. (газета «Чырвоная змена»). Першы зборнік вершаў «Рабочы пульс» выдаў у 1932 г. (з П. Ананьевым). Аўтар зборнікаў вершаў «Праца і маладосць» (Віцебск, 1933), «Зарава вагранак» (1933), «Голас Радзімы» (1938), «Наша маладосць» (выбранае, 1962). Выйшлі напісаныя для дзяцей у сааўтарстве з А. Жаўруком паэмы «Пра майго таварыша» (1939), «Пра слаўных папанінцаў нашага дзетсада» (1939) і зборнік вершаў «Пра майго катка» (1950).

Пісаў таксама апавяданні. Сааўтар лібрэта аперэты «Зарэчны барок» (з А. Жаўруком).

# Ф



## *Сяргей ФАМІН*

Сяргей Уладзіміравіч Фамін нарадзіўся 29.4. 1906 г. у вёсцы Пепелеўка Мсціслаўскага павета Магілёўскай губерні (цяпер Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці, Расія) у сям'і настаўніка.

Скончыў Магілёўскі педагагічны тэхнікум (1925). Два гады працаваў настаўнікам на Барысаўшчыне. Скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1930). Выкладаў беларускую і рускую літаратуры ў Горацкай сельскагаспадарчай акадэміі. Член літаратурных аб'яднанняў «Маладняк», БелАПП і інш. 4.01.1934 г. быў арыштаваны і прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Пасля апеляцыі Вярхоўным судом СССР расстрэл заменены пазбаўленнем волі на 10 гадоў. Адбываў зняволенне ў Комі АССР. 29 верасня — 2 кастрычніка 1941 г. адбыўся паўторны суд. Прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Па першай справе рэабілітаваны Вярхоўным судом СССР ад 27.2.1958 г., па другой — Вярхоўным судом РСФСР ад 25.01.1957 г.

Расстраляны 4.12.1941 г.

З вершамі пачаў выступаць у 1924 г. (газета «Соха и молот»). У 1927 г. асобным выданнем апублікавана паэма «Балота». У 1929 г. была падрыхтавана і здадзена ў выдавецтва кніга вершаў «Дымнае лета», але не выйшла. Асобныя вершы змешчаны ў «Анталогіі беларускай паэзіі» (1961), зборніку «Універсітэт паэтычны» (1971).

*Юрый* **ФАТНЕЎ**



Юрый Сяргеевіч Фатнеў нарадзіўся 10.2.1938 г. у сяле Акімаўка Краснашчокаўскага раёна Алтайскага краю ў сям'і ваеннаслужачага.

Незадоўга да пачатку Айчыннай вайны з бацькамі пераехаў на Беларусь. Пад час акупацыі жыў у вёсцы Старыя Дзятлавічы на Гомельшчыне, у 1944 г.— у вайсковай часці ў раёне станцыі Сарны (Украіна). У пасляваенныя гады вучыўся ў Новасвержанскай сярэдняй школе Стаўбцоўскага раёна (да 1955). У 1956 г. паехаў у Казахстан, дзе працаваў бібліятэкарам. З 1965 г. жыў у Гомелі, Бранску, Ленінградзе. З 1990 г. жыве ў Гомелі. Член СП СССР з 1967 г.

У друку пачаў выступаць з вершамі ў 1955 г. (стаўбцоўская раённая газета «Прамень»). Піша на рускай мове. Першыя тры зборнікі вершаў апублікаваны ў Алма-Аце: «Любимое» (1962), «Общий вагон» (1964), «Глаза не умеют молчать» (1966). Затым выйшлі кнігі «Поет рожок у Сожа» (1967), «Лирика» (Масква, 1971), «День прозренья» (Масква, 1978), «Лунный час» (Тула, 1983), «Костер на пристани» (Масква, 1983).

*Андрэй* **ФЕДАРЭНКА**



Андрэй Міхайлавіч Федарэнка нарадзіўся 17.1.1964 г. у вёсцы Бярозаўка Мазырскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1983 г. скончыў Мазырскі політэхнікум. Працаваў мулярам будаўнічага ўпраўлення № 63 у пасёлку Мікашэвічы Лунінецкага раёна. Служыў у Савецкай Арміі (1983—1984). Працаваў транспартным рабочым у Калінкавічах. Скончыў бібліятэчны факультэт Мінскага інстытута культуры (1990). Працуе загадчыкам аддзела культуры і навукі часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1990 г.

Першыя апавяданні надрукаваў у 1987 г. (часопіс «Маладосць»). У 1989 г. у «Бібліятэцы часопіса «Маладосць» выйшла кніжка прозы «Гісторыя хваробы».

## *Уладзімір* ФЕДАСЕЕНКА



Уладзімір Канстанцінавіч Федасеенка нарадзіўся 22.4.1926 г. у пасёлку Бор Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Удзельнічаў у партызанскім руху на Гомельшчыне (1942—1943). Быў паранены. Скончыў Гомельскі рачны тэхнікум (1946), Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1950). Быў інструктарам Гомельскага абкома камсамола (1946—1948), ЦК ЛКСМБ (1950—1951). У 1951—1967 гг. працаваў на розных пасадах у газеце «Піянер Беларусі», часопісе «Сельская гаспадарка Беларусі», «Настаўніцкай газеце», рэдактарам выдавецтва «Беларусь», у 1969—1979 гг.— старшым інспектарам Упраўлення кніжнага гандлю Дзяржкамітэта СМ БССР па друку, загадчыкам аддзела ў газеце «Літаратура і мастацтва», старшым рэдактарам у рэдакцыі часопіса «Беларусь». Член СП СССР з 1972 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны II ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Літаратурную працу пачаў у 1951 г. Аўтар раманаў «Дубовая Града» (1965), «Віхры на скрыжаваннях» (1970) і «Пасля смерчу» (1975).

## *Мікола* ФЕДЗЮКОВІЧ



Мікола (Мікалай Мікалаевіч) Федзюковіч нарадзіўся 22.5.1943 г. у вёсцы Гутава Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння сярэдняй школы (1960) працаваў літсупрацоўнікам драгічынскай раённай газеты «Чырвоная зорка», фотакарэспандэнтам лунінецкай міжраённай газеты «Ленінскі шлях» на Брэстчыне. У 1962—1965 гг. служыў у Савецкай Арміі. У 1970 г. скончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. З 1970 г. быў рэдактарам у выдавецтве «Народная асвета», з 1971 г.— літсупрацоўнікам, потым загадчыкам аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Чырвоная змена», у 1975—1976 гг.—

рэдактарам у рэдакцыі часопіса «Служба быту Беларусі», у 1979—1983 гг.— зноў у «Чырвонай змене». Член СП СССР з 1972 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1962 г. (міжраённая газета «Ленінскі шлях»). Аўтар зборнікаў вершаў «Зямля-магніт» (1968), «Мілавіца» (1971), «Птушыны грай» (1976), «Макаў цвет» (1979).

---

## *Любоў ФІЛІМОНАВА*



Любоў Аляксандраўна Філімонава нарадзілася 12.10.1948 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачых.

У 1971 г. скончыла аддзяленне мастацкага перакладу Літаратурнага інстытута імя М. Горкага ў Маскве. Да 1972 г. працавала на Омскім тэлебачанні, у 1972—1980 гг.— малодшым рэдактарам выдавецтва «Мастацкая літаратура», у 1983—1984 гг.— рэдактарам літаратурна-драматычнай рэдакцыі на Беларускім тэлебачанні. Член СП СССР з 1982 г.

Друкавацца пачала ў 1967 г. у перыёдыцы, у тым самым годзе апублікавала ў часопісе «Неман» першую нізку вершаў. Аўтар зборнікаў паэзіі «Стазвоны» (1974), «Гучныя фарбы» (1978), «Імправізацыя» (вершы, паэма, 1988). Выйшаў зборнік апавяданняў «Пад шолах ветразяў» (1981).

Перакладае з англійскай, польскай, французскай, венгерскай моў. З туркменскай пераклала кніжку вершаў К. Чаліева «Чароўнае шкельца» (1983). Укладальнік і адзін з перакладчыкаў анталогіі дзіцячай туркменскай літаратуры «Кветкі Каракумаў» (1990).

*Марыя* ***ФІЛІПОВІЧ***



Марыя Канстанцінаўна Філіповіч нарадзілася 1.1.1947 г. у вёсцы Смётанка Аршанскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыла Магілёўскае медыцынскае вучылішча (1968), завочна — Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве (1980). Працавала фельчарам у Аршанскім раёне (1968—1971), загадчыцай фельчарска-акушэрскага пункта ў Дубровінскім (1971—1979), Дзяржынскім (1979—1982) раёнах, выхавацелькай у інтэрнаце ў Мінску (1982—1983), бібліятэкарам, медсястрой, у 1985—1986 гг.— карэспандэнтам газеты «Трыбуна наватара» ў Оршы. З 1989 г. жыве ў Мінску. Член СП СССР з 1987 г.

Першае апавяданне апублікавана ў 1978 г. (часопіс «Неман»). Аўтар кнігі апавяданняў «Мадонна з Выселкаў» (1984) і кнігі прозы для дзяцей «Пра Алеся і яго сяброў» (1988). Працуе таксама ў галіне публіцыстыкі.

*Уры* ***ФІНКЕЛЬ***



Уры Гіршавіч Фінкель нарадзіўся 8.10.1896 г. у мястэчку Ракаў Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і разніка.

Вучыўся ў політэхнічным вучылішчы ў Харкаве (1915—1917), на філалагічным факультэце Маскоўскага універсітэта (1918—1919). Удзельнічаў у грамадзянскай вайне як палітработнік. Працаваў інструктарам у Наркамасветы РСФСР. З 1921 г.— літработнік выдавецкага аддзела Наркамасветы БССР, з 1922 г.— у рэдакцыях газет у Мінску. У 1926 г. здаў экстэрнам экзамены на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта БДУ, у 1931 г. скончыў аспірантуру пры АН БССР. У 1930—1938 гг. выкладаў у Мінскім педінстытуце. У час вайны быў эвакуіраваны. У 1949—1953 гг. выкладаў у Ракаўскай дзесяцігодцы рускую літаратуру. Апошнія гады пражыў у Мінску.

Памёр 5.12.1957 г.

Друкавацца пачаў у 1918 г. Пісаў пераважна

на мове ідыш. Аўтар біяграфічных кніжак пра класікаў яўрэйскай літаратуры «А. Гольфадэн» (з Н. Айслендарам, 1926), «Шолам-Алейхем» (1938, на беларускай мове ў 1939, 1958), «Мендэле Мойхер-Сфорым» (1939, на беларускай мове ў 1940). Тыраж кніжкі пра М. Гордана знішчаны ў 1941 г. пад час акупацыі.

Аўтар артыкулаў пра М. Дабралюбава, В. Бялінскага, Я. Купалу, Я. Коласа, З. Бядулю, гісторыка-этнаграфічных нарысаў пра П. Шэйна, М. Нікольскага і інш.

# Х

*Ігар ХАДАНОВІЧ*



Ігар Піліпавіч Хадановіч нарадзіўся 10.6.1940 г. у вёсцы Шпількі Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўніка.

У 1957 г. паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1962 г., пад канец вучобы, быў залічаны на працу ў рэдакцыю газеты «Чырвоная змена». З 1963 г. працаваў у Мінскім абкоме камсамола, у 1964—1966 гг.— у газеце «Літаратура і мастацтва».

Трагічна загінуў 9.1.1966 г.

Друкавацца пачаў у 1957 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў апавяданняў і нарысаў «За акном дождж» (1967), «На досвітку» (1986).

*Тарас ХАДКЕВІЧ*



Тарас Канстанцінавіч Хадкевіч нарадзіўся 7.3.1912 г. у вёсцы Шайцерава Верхнядзвінскага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Полацкім педагагічным тэхнікуме (1927—1929), у Беларускім вышэйшым педагагічным інстытуце (1931—1933). Працаваў у газетах «Чырвоная Полаччына» (1929—1931), «Чырвоная змена» (1933—1934), «Звязда» (1936—1941). Служыў у Чырвонай Арміі (1934—1936). У час Вялікай Айчыннай вайны ў якасці камандзіра ўзвода прымаў удзел у баях пад Вялікімі Лукамі, Тарапцом. У канцы верасня 1941 г. быў паранены і трапіў у палон. Удзель-

нічаў у інтэрнацыянальным руху Супраціўлення на тэрыторыі Германіі. Тройчы ўцякаў з палону (апошні раз, на пачатку мая 1945 г., паспяхова). Працаваў у газетах «Звязда» (1945—1950), «Літаратура і мастацтва» (1950—1951), літкансультантам СП БССР (1953—1972). Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны» і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1972).

Памёр 14.8.1975 г.

У 1925 г. выступіў у друку з вершамі (часопіс «Малады араты»). Выдаў зборнік паэзіі «Смялей, таварыш!» (1932). Першае апавяданне апублікаваў у 1945 г. Выйшлі кнігі апавяданняў і аповесцей «Братэрства» (1948), «Вяснянка» (1949), «Рэха ў гарах» (1951), «Сяброўства» (1952), «На новым месцы» (1954), «Спеюць яблыкі» (1959), «Сад у квецені» (апавяданні і нарысы, 1966), «За акном дождж» (1967), раманы «Даль палявая» (1959), «Песня Дзвіны» (1975), брашура «Прыгажосць душэўная» (1963), нарысы «Шлях да першынства» (1939), «Мая Беларусь» (1961), «Нафтагігант на Дзвіне» (1963), даведнік «Мінск» (1962). Сааўтар кніг «Беларуская ССР» (1958), «Мы раскажам пра Мінск» (1964). Для дзяцей напісаў кніжкі апавяданняў «За сінім лесам» (1951), «На новым месцы» (1954), «Спеюць яблыкі» (1959), «Жыла-была казка» (1967), «Дзвіна пайшла» (1968), «Крынічка» (1983). У 1970 г. выдадзена «Выбранае», у 1982 г.— Выбраныя творы ў 2 тамах, у 1987 г.— кніга выбраных аповесцей «Братэрства. Рэха ў гарах. Вяснянка».

Пераклаў на беларускую мову «Апавяданні» (1955), «У Амерыцы» М. Горкага (1952) і раман А. Чайшвілі «Лело» (1953).

## *Уладзімір* ХАДЫКА



Уладзімір Марцінавіч Хадыка нарадзіўся 3.1. 1905 г. у вёсцы Цітва Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

З 12 год працаваў парабкам. У 1923 г. скончыў агульнаадукацыйныя курсы ў Мінску. Працаваў настаўнікам пачатковых класаў у вёсцы Асака Дудзіцкага сельсавета. Два гады служыў у Чырвонай Арміі, а потым стаў сакратаром Дудзіцкага сельсавета. З 1929 г. жыў у Мінску. Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». 26.11.1936 г. арыштаваны, 5.10.1937 г. асуджаны на 10 год пазбаўлення волі. Пакаранне адбываў у Іванаўскім і Марыінскім лагерах. Рэабілітаваны Прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР 29.12.1954 г. Член СП СССР з 1934 г.

Загінуў 12.5.1940 г. на будоўлі чыгункі каля Улан-Удэ.

З вершамі выступіў у 1926 г. (часопіс «Чырвоны сейбіт»). Выйшлі зборнікі вершаў «Суніцы» (1926), «Выбраныя вершы» (1932, 1956), «Радасны будзень» (1935), «Вершы» (1969), «На ўзвеях дзён» (1986).

Пераклаў на беларускую мову аповесць К. Гарбунова «Ледалом» (1932), кнігу выбраных твораў У. Бахмецьева «Людзі і рэчы» (1934), творы М. Горкага («Мяшчане», «На дне», «Чалавек», «Дачнікі», «Дзеці сонца», «Варвары» і інш. склалі 5 і 6-ты тамы Збору твораў М. Горкага на беларускай мове, 1935), раман М. Шолахава «Ціхі Дон» (1935) і інш.

## *Пётр* ХАРКОЎ



Пётр Андрэевіч Харкоў нарадзіўся 15.8.1922 г. на станцыі Хацень Сухініцкага раёна Калужскай вобласці (Расія) у сям'і чыгуначніка.

Скончыўшы Маскоўскае тэатральна-тэхнічнае вучылішча (1939), працаваў светлатэхнікам у Маскоўскім тэатры оперы. Восенню 1939 г. паступіў у Літаратурны інстытут імя М. Горкага. Па заканчэнні вучобы (1943) накіраваны на Стэпавы фронт у армейскую газету «На штурм». Франтавымі дарогамі прайшоў ад

Арлоўска-Курскай дугі да Усходняй Прусіі. З 1947 г. у акруговай газеце «Во славу Родины», у 1963—1965 гг.— уласны карэспандэнт газеты «Советская культура» па Беларусі. З 1966—1983 гг.— член рэпертуарна-рэдакцыйнай калегіі Міністэрства культуры БССР. Член СП СССР з 1962 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў і медалямі.

Памёр 10.1.1983 г.

У друку выступіў у 1940 г. з апавяданнямі. Пісаў на рускай мове. У газетах і часопісах выступаў з нарысамі. Аўтар п'ес «От имени поколения» (1962, пастаўлена ў 1957), «Вечный огонь» (1967, пастаўлена у 1963), «Репортаж из преисподней» (аперэта, музыка Я. Глебава, пастаўлена ў 1972), «Цветы на пепле» (пастаўлена ў 1978). Выйшлі кінасцэнарый «Пока бьется сердце» (1957), кніга «Подвиг без награды» (кінааповесць, п'есы, 1983).

Аўтар тэкстаў шэрагу песень, слоў да кантаты «Неизвестный солдат» (выканана ў 1970), цыкла вакальных паэм «Раздумье о любви» (апублікаваны ў 1973 пад назвай «Три вокальные поэмы»).

---

## *Ізі* ХАРЫК



Ізі (Ісак Давыдавіч) Харык нарадзіўся 17.3.1898 г. у вёсцы Зембін Барысаўскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і шаўца.

Вучыўся ў хедары, затым у рускай народнай школе ў Зембіне. У юначыя гады працаваў рабочым на фабрыках і заводах Мінска, Барысава, Гомеля. У 1917 г. пераехаў у Мінск на пастаяннае жыхарства. Быў бібліятэкарам, загадчыкам агульнаадукацыйнай школы. У 1919 г. пайшоў добраахвотнікам у Чырвоную Армію. Прымаў удзел у баях на тэрыторыі Беларусі. Вучыўся ў Вышэйшым літаратурна-мастацкім Інстытуце імя В. Брусава, у 1927 г. скончыў Маскоўскі універсітэт. Пасля вяртання ў Мінск у 1928—1937 гг. быў рэдактарам яўрэйскага часопіса «Штэрн» («Зорка»). Старшыня секцыі яўрэйскіх пісьменнікаў СП БССР. У верасні 1937 г. рэпрэсіраваны. 28.10.1937 г. Ваеннай Калегіяй

Вярхоўнага суда СССР прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 13.6.1956 г. Член ЦВК БССР у 1931—1934 гг. Член-карэспандэнт АН БССР. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Першыя вершы апублікаваў у 1920 г. (часопіс «Камуністычны свет», Масква). Пісаў на мове ідыш. Аўтар зборнікаў паэзіі «Трапятанне» (1922), «Мінскія балоты» (1924), «На зямлі» (Масква, 1926), «Душой і целам» (паэма, 1928), «Вершы і паэмы» (Кіеў, 1930), «Хлеб» (паэма, Харкаў, 1930), «Круглыя тыдні» (1932), «Ад полюса да полюса» (1934), «Наша бадзёрасць» (Кіеў, 1934), «Вершы і паэмы» (1935), «Пяць паэм» (1936), «На чужым балі» (паэма, 1936), «Душой і целам» (выбранае, Масква, 1970). У перакладзе на беларускую выйшлі Выбраныя творы (1958), «Выбранае» (1969), на рускую «Стихи» (1935), «Стихи и поэмы» (Масква, 1958), «От полюса к полюсу» (Масква, 1971).

---

## *Віктар ХАЎРАТОВІЧ*



Віктар Кандрацьевіч Хаўратовіч нарадзіўся 21.6. 1934 г. у вёсцы Стары Сінін Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1954—1956 гг. служыў у Савецкай Арміі. У 1957 г. скончыў Магілёўскі будаўнічы тэхнікум. У 1957—1958 гг.— майстар на будаўніцтве ў Самаркандзе (Узбекістан). Затым вярнуўся на Магілёўшчыну, дзе працаваў прарабам у саўгасах Горацкага, Краснапольскага, Слаўгарадскага раёнаў, майстрам, старшым інжынерам у будаўнічых арганізацыях Касцюковіч, Крычава, Слаўгарада, Краснаполля, настаўнікам Мхініцкай васьмігадовай школы Краснапольскага раёна, старшым тэхнікам «Белдзяржпраекта» ў Магілёве, у 1966—1968 гг. вучыўся ў Магілёўскім педінстытуце. У 1982—1989 гг. працаваў начальнікам прарабскага ўчастка ў Бялынічах. Член СП СССР з 1985 г.

Памёр 17.10.1991 г.

У друку выступаў з 1961 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Сонца на кельме» (1983), «Зямныя колеры і гукі» (1990).

## *Рыгор ХАЦКЕВІЧ*



Рыгор Мікітавіч Хацкевіч нарадзіўся 1.2.1911 г. у вёсцы Ратуцічы Барысаўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Барысаўскі педагагічны тэхнікум (1930). Настаўнічаў у Барысаўскім раёне. Працаваў у чэрвеньскай раённай газеце (1931—1933), настаўнічаў у Крупках. У 1937 г. быў рэпрэсіраваны. Асуджаны на 5 год лагерных работ і сасланы на Поўнач, дзе працаваў у геалагічных партыях. У 1945 г. вярнуўся на Беларусь. Рэабілітаваны ў 1959 г. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школах Барысаўскага і Крупскага раёнаў. Вучыўся завочна ў Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага. Каля дваццаці год выкладаў рускую мову і літаратуру ў Днепрапятроўску.

Памёр 9.8.1979 г.

З вершамі ў друку выступіў у 1930 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборніка паэзіі «Налівайся, колас» (1932), кніжак вершаў для дзяцей «Наш пяты клас» (1962), «Бяроза на ўзлеску» (1977). Асобнымі выданнямі выйшлі аповесці «На золку» (1972) і «Хмары над лесам» (1980).

## *Яўген ХВАЛЕЙ*



Яўген Іванавіч Хвалей нарадзіўся 1.1.1947 г. у вёсцы Белькаўшчына Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Мікалаеўшчынскай сярэдняй школы імя Якуба Коласа (1965) працаваў будаўніком, у рэдакцыі стаўбцоўскай раённай газеты «Прамень». Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1971). Настаўнічаў, працаваў у выдавецтве «Народная асвета», Мінскім абласным Доме народнай творчасці, на Беларускім радыё і тэлебачанні. З 1985 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Юнацтва». Член СП СССР з 1989 г.

Першыя вершы надрукаваў у 1963 г. (раённая газета «Прамень»). Аўтар кніг паэзіі

«Ярына» (калектыўны зборнік «Нашчадкі», 1979), «Прычасце» (1983), «Зялёны прамень аеру» (1987), вершаванай казкі для дзяцей «Насціны гасціны» (1989).

У перыядычным друку выступае і як крытык. Перакладае вершы паэтаў народаў СССР. Укладальнік зборнікаў «Вершы» Якуба Коласа (1987), «Гары, агонь Кастрычніка» (1987) і інш.

---

## *Мікола* ХВЕДАРОВІЧ



Мікола Хведаровіч (Мікалай Фёдаравіч Чарнушэвіч) нарадзіўся 6.4.1904 г. у гарадскім пасёлку Капыль Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У часы першай сусветнай вайны як бежанец жыў у Калузе, у дзіцячым прытулку для дзяцей-бежанцаў. Займаўся ў гарадскім вучылішчы. У 1918 г. вярнуўся дамоў і паступіў у Цімкавіцкае гарадское вучылішча. З прыходам немцаў працаваў батраком. Пасля прыходу Чырвонай Арміі (1919) — удзельнік прадатрадаў і часцей асобага прызначэння (ЧОН), адзін з арганізатараў камсамольскіх ячэек на Случчыне. У 1924 г.— камісар ваенкамата па дапрызыўнай падрыхтоўцы. У 1928 г. скончыў рабфак у Мінску, а затым літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1931). Працаваў у часопісах «Партыйны работнік» і «Бальшавік Беларусі» (1929—1932), рэдактарам часопіса «Чырвоная Беларусь» (1932—1933), загадчыкам кабінета маладога аўтара СП БССР (1933—1934), адказным сакратаром часопіса «Полымя рэвалюцыі» (1934—1937). У жніўні 1938 г. арыштаваны. Некалькі гадоў прабыў на Кольскім паўвостраве, удзельнічаў у будаўніцтве Манчагорска. З 1941 г. знаходзіўся ва Усцьвытлагу (Комі АССР). З 1946 г. працаваў у г. Каршы (Узбекістан) загадчыкам планава-эканамічнага аддзела, з 1949 і да моманту рэабілітацыі (1955) жыў у г. Енісейску Краснаярскага краю, з 1956 г.— у Мінску. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 20.8.1982 г.

У друку пачаў выступаць з 1924 г. Выйшлі кніжкі паэзіі «Настроі» (1929), «Рытмы» (1930), «Баявыя песні» (1930), «Тэмпы-кантрасты» (1931), «Вайна за мір» (1932), «Ха» (жарты, пародыі, 1932), «Усім сэрцам» (1937), «Залаты лістапад» (1957), «Перазвон бароў» (1961), «Пасля навальніцы» (выбранае, 1965), «Зоркі на камені» (1968), «Крынічка» (1978), «Любістак» (выбранае, 1984). Выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах (1974). Для дзяцей выдаў кніжкі «Сонечны зайчык» (1961), «Лясныя званочкі» (1968), «Крылы» (1973), «Светлы дзянёк» (1984).

Выдаў кнігі ўспамінаў «Памятныя сустрэчы» (1960, 3-е выданне перапрацаванае ў 1977), «Незабыўнае» (1976) і аповесць «Споведзь перад будучыняй» (1978).

Пераклаў паэмы А. Пушкіна «Каўказскі нявольнік» (1937), «Бахчысарайскі фантан» (1938), «Казку пра цара Салтана» (часопіс «Полымя рэвалюцыі», 1937), раман А. Фадзеева «Апошні з удэге» (з А. Звонакам, 1935), паэмы Э. Багрыцкага «Дума пра Апанаса» (часопіс «Маладняк», 1930) і Ш. Руставелі «Віцязь у тыгравай шкуры» (з А. Звонакам, 1966), раман У. Кочатава «Браты Яршовы» (з І. Грамовічам, 1960), кнігу паэзіі Ш. Пецёфі «Ліра і меч» (1971).

Лаўрэат прэміі венгерскага агенцтва па літаратуры і мастацтву «Артысіуз» (1981) за прапаганду венгерскай паэзіі на беларускай мове.

---

*Людміла ХЕЙДАРАВА*



Людміла Фёдараўна Хейдарава нарадзілася 11.2. 1952 г. у пасёлку Ялізава Асіповіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і рабочага і настаўніцы.

Скончыла факультэт прыкладной матэматыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1974). Працавала старшым інжынерам навукова-даследчага Інстытута электронных вылічальных машын. У 1980—1985 гг.— вядучы канструктар Беларускага навукова-даследчага і праектна-тэхналагічнага інстытута

арганізацыі і кіравання будаўніцтвам пры Дзяржбудзе БССР, у 1985—1987 гг.— вядучы інжынер Мінскага навукова-даследчага праектнага інстытута. З 1987 г.— старшы рэдактар, з 1990 г.— намеснік галоўнага рэдактара літаратурна-драматычнай рэдакцыі Беларускага тэлебачання. Член СП СССР з 1985 г.

Першая падборка вершаў апублікавана ў 1980 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар зборнікаў вершаў «Адведзіны рамонкавай паляны» (1985), «Тваё святло» (1988), драматычнай паэмы «Можна і Нельга» (1987) — усе выйшлі пад псеўданімам Людміла Паўлікава. З 1989 г. выступае пад прозвішчам Хейдарава. У перыядычным друку публікуе апавяданні, навелы.

Перакладае творы рускіх, украінскіх паэтаў на беларускую мову.

---

## *Васіль ХОМЧАНКА*



Васіль Фёдаравіч Хомчанка нарадзіўся 12.1. 1919 г. у вёсцы Канічы Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Мінскім хіміка-тэхналагічным тэхнікуме (1934—1935), на рабфаку пры Беларускім дзяржаўным універсітэце. 5 красавіка 1937 г. быў рэпрэсіраваны. Адбываў тэрмін на Далёкім Усходзе да красавіка 1941 г. у Ніжне-Амурскім лагеры. Рэабілітаваны Вярхоўным судом БССР у 1969 г. У 1941—1968 гг.— у Савецкай Арміі. У час Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у баях як камандзір мінамётнага ўзвода. У 1944 г. скончыў Буйнакскае пяхотнае вучылішча, у 1951 г.— Ваенна-юрыдычную акадэмію ў Маскве. У 1972—1985 гг.— загадчык рэдакцыі прозы выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Памёр 4.11.1992 г.

У 30-я гады выступіў у друку з вершамі (газета «Піянер Беларусі», часопіс «Іскры Ільіча»). Першыя кнігі апавяданняў выйшлі ва Уладзіміры на рускай мове — «Куда исчез гриб» (1957), «Жаворонок» (1958), «Рассказы» (1959). Піша пераважна для дзяцей. У Мінску

на беларускай мове выдаў зборнікі апавяданняў «Наша вячэра» (1959), «Рукавіцы генерала Даватара» (1960), «Аднойчы майскім днём» (1962), «Суседзі» (1962), «Чырвоны мак» (1964), «Верны рыцар» (1965), «Тваё чэснае слова» (1965), «Зімовы дождж» (1968), «Сустрэча з цудам» (1969), «Паляванне на львоў» (гумарэскі, 1970), «Цёплая зямля» (1971), «Я ўжо вялікі» (1972), «Уначы пад сонцам» (1974), «Паклон» (1976), «Лёгкая рука» (гумарэскі, апавяданні, 1979), аповесці «Чырвоныя хвалі» (1968), «Я прынёс вам радасць» (1981), «Пры апазнанні — затрымаць» (1983), кнігі аповесцей і апавяданняў «Бацькава шабля» (1982), «Чэкістам стала вядома» (1985), «Стрэл у акно» (1988) і раман «Вяртанне ў агонь» (1978). У 1975 г. выдаў «Выбранае», у 1979 г.— Выбраныя творы ў 2-х тамах.

Аўтар сцэнарыяў мастацкага фільма «Ветразі майго дзяцінства» (пастаўлены ў 1982 ) і тэлевізійнага «Незнаёмая песня» (пастаўлены ў 1983). Пераклаў на беларускую мову казку Р. Кіплінга «Чаму ў сланіка доўгі нос» (1974).

---

## *Кузьма* ХРОМЧАНКА



Кузьма Рыгоравіч Хромчанка нарадзіўся 25.10. 1929 г. у пасёлку Калінаўка Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў літаратурны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1951). Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Дзятлаўскай сярэдняй школе (Гродзенскай вобласці, 1951—1953). Вучыўся ў аспірантуры (1953—1956), працаваў навуковым супрацоўнікам, вучоным сакратаром Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1956—1966). З 1966 г. на выкладчыцкай рабоце ў Беларускім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна, дацэнт кафедры беларускай літаратуры. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1983 г.

У друку выступае з рэцэнзіямі і літаратурнакрытычнымі артыкуламі з 1957 г. Аўтар манаграфій «Піліп Пестрак: Жыццё і творчасць» (1960), «Беларуская мастацкая проза (канец XIX — пачатак XX ст.» (1979), навукова-папулярнай кнігі «За шчасце зямное» (1966).

## *Сымон ХУРСІК*



Сымон Аляксеевіч Хурсік нарадзіўся 13.2.1902 г. у вёсцы Снусцік Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Мінскага беларускага педагагічнага тэхнікума (1925) настаўнічаў у мястэчку Валынцы, у Полацку. Працаваў у рэдакцыі газеты «Чырвоная Полаччына». У 1930 г. скончыў літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. 10.4.1931 г. быў арыштаваны і асуджаны на 5 гадоў высылкі ў Йашкар-Алу. Працаваў настаўнікам у школах Марыйскай і Чувашскай АССР, Казахскай ССР. У гады Вялікай Айчыннай вайны ваяваў на 4-м Украінскім і 1-м Беларускім франтах, двойчы кантужаны. Пасля вайны зноў настаўнічаў. 13.10. 1958 г. рэабілітаваны. З 1964 г. жыў у Карагандзе.

Памёр 31.3.1972 г.

Упершыню выступіў у друку з апавяданнем у 1924 г. (газета «Савецкая Беларусь»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Першы паўстанак» (1925), «Шляхамі навальніц» (1930) і аповесці «Чорны мост» (1929—1930, часопіс «Маладняк»).

Пераклаў на беларускую мову аповесць А. Серафімовіча «Горад у стэпе» (1930).

# Ц



## *Кастусь ЦВІРКА*

Кастусь (Канстанцін Аляксеевіч) Цвірка нарадзіўся 28.3.1934 г. у вёсцы Зялёная Дуброва Старадарожскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1958). У 1958—1959 гг. выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Труханавіцкай сярэдняй школе Капыльскага раёна. Быў літсупрацоўнікам раённай газеты «Рудзенская праўда», рэдактарам на Беларускім радыё, старшым метадыстам рэспубліканскага Дома народнай творчасці, старшым інспектарам Упраўлення па распаўсюджванні друку Міністэрства сувязі БССР. У 1972 г. скончыў аспірантуру пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР і з таго часу — навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. З 1981 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Юнацтва», з 1984 г.— рэдактар аддзела паэзіі часопіса «Полымя». Кандыдат гістарычных навук. Член СП СССР з 1961 г.

Першы артыкул у рэспубліканскім друку з'явіўся ў 1951 г., першы верш — у 1953 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Такія сэрцы ў нас» (1959), «Бягуць раўчукі» (1962), «Чарназём» (1967), «Каласы» (1975), «Сцежка дадому» (1980), «Рэха дарог» (1982), «Хат вячысты дар» (вершы і паэма, 1982), «Зялёная Дуброва» (1987), «Лодка долі тваёй» (1988), а таксама кніжак вершаў і казак для дзяцей «Зайчыкаў хлеб» (1966), «Дарункі лесу» (1969), «Як Алесь згубіўся ў лесе» (1986), «Добрыя суседзі» (1988).

Выйшлі мастацкія нарысы, звязаныя з літа-

ратурнымі мясцінамі Беларусі,— «Дарога ў сто год» (1974), «Той курган векавечны» (1985), а таксама манаграфія «Слова пра Сыракомлю» (1975).

Прыняў удзел у напісанні кнігі «Беларуская фалькларыстыка эпохі феадалізму» (1989) (з. Г. Каханоўскім, Л. Малаш, 1989). Складальнік тома «Вяселле. Абрад» (1978), кнігі ўспамінаў пра З. Бядулю (з Я. Садоўскім, 1988), зборніка твораў Я. Чачота «Наваградскі замак» (1989).

---

## *Канстанцін ЦІТОЎ*



Канстанцін Маркавіч Цітоў нарадзіўся 26.10. 1905 г. у сяле Сачкавічы Клімаўскага раёна Бранскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

Скончыў Нова-Ропскую прафтэхшколу (Бранская вобласць, 1922), вучыўся на літаратурным факультэце Ленінградскага універсітэта. Пасля трэцяга курса (1927) быў прызваны ў Чырвоную Армію. У 1937 г. здаў экстэрнам экзамены за універсітэт. Працаваў у газетах «Советская Белоруссия» (1937—1938), «Літаратура і мастацтва» (1938—1939), кансультантам СП БССР (1939—1940). У час Вялікай Айчыннай вайны служыў камандзірам эскадрона, карэспандэнтам армейскага і франтавога друку. Быў паранены. У пасляваенныя гады — на творчай працы ў Мінску. Член СП СССР з 1939 г.

Узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I і II ступеняў і медалямі.

Памёр 13.4.1972 г.

З вершамі ў друку выступіў у 1930 г., у беларускім — з 1934 г. Пісаў на рускай мове. Аўтар зборнікаў паэзіі «Выступление в путь» (1941), «Мы поклялись» (Свярдлоўск, 1942), «Солдатские строки» (1947), «Искатели» (1956), «Сердце земли» (вершы і паэма, 1958), «Локоть друга» (вершы і паэма, 1961), «Ручеек» (1966), «Просто про любовь» (1970), «Следы на отмели» (1972), «Солнце загорается за Сожем» (1978), «Возвращение» (1986) і зборніка

вершаваных казак для дзяцей «Якубова каша» (1960).

Працаваў і ў галіне прозы. Выйшлі нарыс «За честь заводской марки» (Варонеж, 1947), «Невыдуманные рассказы» (1967), кніжкі апавяданнў для дзяцей «Лесной маршрут» (1959, 2-е дапоўненае выданне ў 1975), «Изумрудный гусь» (1967).

Пераклаў на рускую мову зборнік вершаў М. Смагаровіча «Снежинка» (1962), трылогію Р. Сабаленкі «Иду в жизнь» (1963), асобныя творы беларускіх паэтаў.

---

## *Тамара ЦУЛУКІДЗЕ*



Тамара Георгіеўна Цулукідзе нарадзілася 19.12. 1903 г. у горадзе Тбілісі (Грузія) у сям'і настаўніка.

У 1924 г. скончыла Тбіліскі дзяржаўны тэатральны інстытут і была прынята ў трупу Акадэмічнага тэатра імя Ш. Руставелі. Як «жонка ворага народа» (яе муж, вядомы рэжысёр А. Ахметэлі, быў расстраляны) з 1937 да 1946 г. знаходзілася ў турмах, лагерах, на лесапавале, на земляных работах, працавала санітаркай, медсястрой у Краснаярскім краі. У Сыктыўкары (Комі АССР) арганізавала тэатр лялек. У 1946 г. была вызвалена, а праз два гады пераехала ў Курск, дзе працавала рэжысёрам абласнога тэатра лялек. Тут паўторна арыштавана па ранейшай справе і выслана ў Краснаярскі край, дзе пазнаёмілася з рэпрэсіраваным пісьменнікам А. Пальчэўскім (у 1948—1955 гг. жыў у Краснаярскім краі), стала яго жонкай. Рэабілітавана ў 1956 г. Зноў працавала ў тэатры імя Ш. Руставелі. З 1958 г. жыла ў Мінску. Член СП СССР з 1967 г.

Узнагароджана ордэнам «Знак Пашаны» і медалём.

Заслужаная артыстка Грузінскай ССР (1934).

Памерла 9.2.1991 г.

Літаратурную працу пачала з рэцэнзій і артыкулаў пра тэатр у 1933 г. у рускай і грузінскай

перыёдыцы. З 1959 г. выступала ў беларускім друку. Пісала на рускай, беларускай і грузінскай мовах. Выдала кнігі для дзяцей «Театр кукол в школе» (1957), «Когда поднимается занавес» (1963), «К детям пришел вожатый» (1967), зборнікі пазнавальных нарысаў «Голубой факел» (1965, 2-е дапоўненае выданне ў 1970), аднаактовых п'ес — «Твое честное слово» (1973). У Тбілісі выйшла кніга мемуараў «Всего одна жизнь» (1983) і напісаны па-грузінску зборнік апавяданняў «Вяртанне» (1989).

Пераклала з грузінскай мовы на беларускую раман Ц. Данжашвілі «На Алазані» (з А. Пальчэўскім, 1959), асобныя творы іншых празаікаў.

---

## *Артур* ЦЯЖКІ



Артур Іосіфавіч Цяжкі нарадзіўся 23.7.1943 г. у вёсцы Лылойці Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Свірскай сярэдняй школы Мядзельскага раёна (1963) працаваў у смаргонскай раённай газеце «Светлы шлях» літсупрацоўнікам. У 1963—1967 гг. служыў у Савецкай Арміі. У 1967—1968 гг.— літсупрацоўнік раённай газеты. З 1969 г.— карэспандэнт газеты «Чырвоная змена», з 1971 г.— уласны карэспандэнт гэтай газеты па Брэсцкай вобласці, у 1972—1975 гг. і ў 1978 г.— карэспандэнт брэсцкай абласной газеты «Заря». У 1974 г. скончыў завочнае аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1975—1977 гг.— карэспандэнт раённай газеты «Астравецкая праўда», з верасня 1978 г.— адказны сакратар Гродзенскага абласнога таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, у 1979 г.— карэспандэнт газеты «Голас Радзімы», са снежня 1979 г.— карэспандэнт газеты «Знамя юности», у 1981—1984 гг.— рэдактар Гродзенскага абласнога навукова-метадычнага цэнтра народнай творчасці. Член СП СССР з 1982 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 5.4.1984 г.

Першыя апавяданні апублікаваў у 1966 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Сустрэча пасля вясны» (1980), «Пара блакітных дажджоў» (1982), «Дзе мой дом?..» (1986).

# Ч



## *Тамара ЧАБАН*

Тамара Канстанцінаўна Чабан нарадзілася 31.5.1952 г. у вёсцы Чабаны Глыбоцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1974). Выкладала беларускую мову і літаратуру ў Ветрынскай сярэдняй школе Полацкага раёна. З 1978 г. жыве ў Мінску. Працавала старшым карэктарам у выдавецтве «Навука і тэхніка». Скончыла завочна аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры БДУ імя У. І. Леніна (1980). З 1981 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1988 г.

Памерла 20.03.1992 г.

Выступіла ў друку як крытык і літаратуразнаўца ўпершыню ў 1976 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Аўтар кніг пра паэзію «Крылы рамантыкі» (1982), «Сучасная паэзія і фальклор» (з Я. Гарадніцкім, 1988).



## *Міхась ЧАВУСКІ*

Міхась (Майсей Моталевіч) Чавускі нарадзіўся 25.12.1904 г. у вёсцы Шапілава Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і вясковага шаўца.

З 1917 г.— наборшчык у друкарні ў Жлобіне, з 1924 г.— у Мінску. Служыў у пагранічных войсках (1926—1928). Працаваў у Белспажыўсаюзе, рэдагаваў газету палітаддзела Плешчаніцкай МТС, мінскую сельскую раённую газету,

быў інструктарам ЦК КПБ, адказным кіраўніком і галоўным рэдактарам БелТА. У 1934—1937 гг. вучыўся завочна ў Камуністычным інстытуце журналістыкі ў Ленінградзе. У час Вялікай Айчыннай вайны — адказны рэдактар газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1941—1943), затым — сатырычнай газеты Вілейскага абкома «Партызанскае слова» (1943). У пасляваенныя гады — намеснік старшыні Камітэта па радыёвяшчанні пры СНК БССР (1944—1947), галоўны рэдактар, потым загадчык аддзела фельетонаў часопіса «Вожык» (1947—1961), дырэктар Бюро прапаганды мастацкай літаратуры СП БССР (1964—1970). Член СП СССР з 1957 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 1.7.1984 г.

З артыкуламі ў рэспубліканскім друку пачаў выступаць у 1937 г. Выдаў зборнікі апавяданняў, фельетонаў, аднаактовак і сцэнак «Крытычны момант» (1954), «Індык на курорце» (1960), «Рука руку мые» (1964), «Чаму ж не смяяцца?» (1969), «Стрэляны Вераб'ёў» (1976), дакументальную аповесць «Фарбамі гневу» (1975, дапоўненае выданне ў 1978).

---

## *Вячаслаў* ЧАМЯРЫЦКІ



Вячаслаў Антонавіч Чамярыцкі нарадзіўся 22.7. 1936 г. у вёсцы Рабкі Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1958). Працаваў настаўнікам Слабадской сямігадовай школы Вілейскага раёна (1958—1959), карэктарам маладзечанскай абласной газеты «Чырвоны сцяг» (1959), інспектарам аддзела народнай асветы Маладзечанскага раёна (1959—1962). Скончыў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1965). З 1965 г.— навуковы супрацоўнік інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1983 г.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Друкавацца пачаў з вершаў у 1952 г. (навагрудская раённая газета «Новае жыццё»). З рэцэнзіямі, літаратурна-крытычнымі артыкуламі, даследаваннямі па старажытнай літаратуры выступае з 1959 г. Аўтар манаграфіі «Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў» (1969), брашуры «Беларускі тытан эпохі Адраджэння» (1990), аўтар кнігі «Францыск Скарына» (з Г. Галенчанкам і В. Шматавым, на французскай мове — 1979 і на англійскай — 1980, Парыж), напісаў даклад на IX Міжнародны з'езд славістаў «Традыцыі літаратуры старажытнай Русі ў беларускай літаратуры: Дакастрычніцкі перыяд» (з А. Коршунавым, А. Лойкам, 1982), адзін з аўтараў «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (т. I, 1968), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» (1977), «Истории всемирной литературы» (т. 3, 1985; т. 4, 1987), падручніка для ВНУ «Гісторыя беларускай літаратуры: Старажытны перыяд» (1985).

Перакладае са старажытнарускай і старабеларускай моў. Прымаў удзел у выданні «Поўнага збору рускіх летапісаў» (т. 32 і 35), складальнік зборніка «Слова пра паход Ігаравы» (1986).

---

## *Уладзімір ЧАПЕГА*



Уладзімір Пятровіч Чапега нарадзіўся 18.6. 1939 г. у вёсцы Сялец Брагінскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (1961), Данецкае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча інжынерных войск і войск сувязі (экстэрнам, 1973). Працаваў выкладчыкам нямецкай мовы ў Мінскім дзяржпедінстытуце замежных моў (1961—1962). У 1962—1988 гг. служыў у Савецкай Арміі. Член СП СССР з 1982 г.

Узнагароджаны медалямі.

У друку выступае з 1971 г. Перакладае з ня-

мецкай мовы на беларускую і з беларускай на нямецкую. На нямецкую мову пераклаў раман І. Мележа «Людзі на балоце» (з Г. Чапега і Г. Бярэзкам, 1974), аповесці В. Быкава «Абеліск» (1975) і «Здрада» (1978), А. Кудраўца «Раданіца» (1983, усе з Г. Чапега і Н. Рандавым), кнігі В. Віткі «Ладачкі-ладкі» (1980), У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» (1983), асобныя творы Цёткі, Я. Брыля, К. Крапівы, П. Галавача, М. Зарэцкага, В. Каваля, Л. Калюгі, Я. Нёманскага для анталогіі беларускага апавядання «Буслы над балотамі» (1971), Я. Коласа, М. Гарэцкага, М. Зарэцкага, Л. Калюгі, Я. Скрыгана для анталогіі класічнага беларускага апавядання «Малады дубок» (1987), кнігі для дзяцей у апрацоўцы А. Якімовіча «Лісіца-хітрыца» (1980) і «Залатая яблынька» (1981), «Сядзіць мядзведзь на калодзе» (1980), «Кот Максім» (1981), «Андрэй за ўсіх мудрэй» і «Беларускія народныя казкі» (1986, усе з Г. Чапега). З рускай на нямецкую мову пераклаў кнігу В. Лазарава «Старыя італьянскія майстры» (з Г. Чапега, Н. Рандавым, Берлін, 1990).

На беларускую мову з нямецкай пераклаў раманы Г. Ота «Пара ў дарогу, буслы» (з Я. Семяжонам, 1982). А. Аменды «Апасіяната» (1983), Л. Франка «Ісусавы вучні» (1989, усе з Г. Чапега), асобныя творы Ш. Гермліна, Ш. Цвэйга.

---

## *Мікалай ЧАРГІНЕЦ*



Мікалай Іванавіч Чаргінец нарадзіўся 17.10. 1937 г. у горадзе Мінску ў сям'і рабочага.

Скончыў Вышэйшую школу трэнераў Беларускага дзяржаўнага інстытута фізічнай культуры (1963). Быў членам футбольнай каманды майстроў «Спартак» (Мінск), некаторых іншых каманд краіны. Працаваў інструктарам фізічнай культуры на Мінскім прыборабудаўнічым заводзе імя У. І. Леніна. У 1964 г. накіраваны на работу ў органы міліцыі — у крымінальны вышук. У 1967 г. скончыў юрыдычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя

У. І. Леніна. З 1969 г.— намеснік начальніка Першамайскага, з 1973 г.— начальнік Ленінскага раённага аддзела ўнутраных спраў Мінска. З 1975 г.— намеснік начальніка ўпраўлення ўнутраных спраў Мінскага гарвыканкома, з 1981 г.— начальнік Упраўлення крымінальнага вышуку Міністэрства ўнутраных спраў БССР. У 1984—1987 гг. быў у Афганістане, удзельнічаў у баявых аперацыях, быў паранены. З 1987 г.— начальнік Беларускага ўпраўлення ўнутраных спраў на транспарце МУС БССР. Генерал-маёр міліцыі. Кандыдат юрыдычных навук. Член СП СССР з 1978 г.

Заслужаны работнік Міністэрства ўнутраных спраў СССР (1977).

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, вышэйшым афганскім ордэнам Чырвоны Сцяг, савецкімі і афганскімі медалямі.

У 1963 г. пачаў выступаць у друку як журналіст. Піша на рускай мове. Выдаў кнігі прозы «Четвертый след» (1973), «Тревожная служба» (1975), «Следствие продолжается» (1977), «Финал Краба» (1979), «Приказ № 1» (1985), «Служба — дни и ночи» (1981), «Следствие продолжается. Финал Краба» (1986), раманы «Вам — задание» (1982), «За секунду до выстрела» (1983), «Тайна Черных Гор» (1987), «Сыновья» (1989).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева (1990) за раман «Сыновья».

---

## *Ганад ЧАРКАЗЯН*



Ганад Бадрыевіч Чарказян нарадзіўся 18.10. 1946 г. у сяле Ерасхаун Акцембяранскага раёна (Арменія).

Пасля заканчэння сярэдняй школы вучыўся ў тэхнічным вучылішчы № 1 у Ерэване (1967—1968). Працаваў токарам на сударамонтным заводзе ў Туапсе Краснадарскага краю (1968—1969). Служыў у Савецкай Арміі (1969—1971). Працаваў выхавацелем прафесійна-тэхнічнага вучылішча № 27 у Эчміадзіне (1971—1973, Арменія). З 1973 г. жыве і працуе ў Мінску:

старшы тэхнік у Беларускім дарожным навукова-даследчым інстытуце, інжынер-сметчык рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 10, начальнік участка рамонтна-будаўнічага ўпраўлення № 15. Завочна скончыў Ерэванскі індустрыяльны тэхнікум (1974), будаўніча-педагагічны факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1984). З чэрвеня 1982 г.— інжынер-тэхнолаг мінскага ўчастка Слонімскай фабрыкі «Гасцінічная мэбля». Член СП СССР з 1988 г.

Першы верш апублікаваў у 1963 г. (часопіс «Пионер», Ерэван). У друку Беларусі выступае з 1977 г. Піша на курдскай і армянскай мовах. У Мінску ў перакладзе на рускую мову выйшлі зборнікі паэзіі «Прочность» (з армянскай, 1980), «Цвет доброты» (з курдскай, 1986), «Пространство и время» (з курдскай, 1990).

---

## *Анатоль ЧАРКАСАЎ*



Анатоль Паўлавіч Чаркасаў нарадзіўся 28.11. 1928 г. у горадзе Светлагорску Кіравааградскай вобласці (Украіна) у сям'і служачага.

На пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў эвакуіраваны ў Паволжа. У 1943—1944 гг. працаваў у ваеннай установе. У час выбуху склада боепрыпасаў быў цяжка паранены. У 1951 г. скончыў Мінскі бібліятэчны тэхнікум імя А. С. Пушкіна, у 1956 г.— аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў карэктарам, рэдактарам выдавецтва «Беларусь». З 1972 г.— рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура», з 1981 г.— выдавецтва «Юнацтва», у 1986—1989 гг.— загадчык рэдакцыі гэтага выдавецтва. Член СП СССР з 1969 г.

Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны» і медалём.

Літаратурнай працай займаецца з 1957 г. Выйшлі кніжкі нарысаў «Балотны скарб» (1959), «Цудоўны камень» (1963), «Старонкі слаўнага летапісу» (1964), «Магутны твой зямляк» (1969), «Волаты на дарогах» (1974).

Аўтар сцэнарыяў дакументальнага фільма

«Мазырскі ліст» (зняты ў 1967) і навукова-папулярнага «Наш завод — наш дом» (зняты ў 1968).

Пераклаў творы рускіх і ўкраінскіх дзіцячых пісьменнікаў на беларускую мову, на рускую мову — апавяданні ўкраінскіх празаікаў, балгарскія, чэшскія казкі.

---

## *Нічыпар ЧАРНУШЭВІЧ*



Нічыпар Чарнушэвіч (Нічыпар Тодаравіч Чарнышэвіч) нарадзіўся 14.11.1900 г. у гарадскім пасёлку Капыль Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1917—1920 гг. настаўнічаў у Траянаўскім земскім народным вучылішчы на Капыльшчыне. У 1920—1922 гг. служыў у Чырвонай Арміі. У 1928 г. скончыў гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Вучобу сумяшчаў з працай у газеце «Савецкая Беларусь» (1924—1929). Член літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У 1929—1930 гг.— слухач Вышэйшых навукова-педагагічных курсаў пры 2-м Маскоўскім універсітэце. Улетку 1930 г. быў арыштаваны. 10.4.1931 г. прыгавораны да 5 гадоў ссылкі ў г. Вятку. У 1931—1935 гг.— супрацоўнік газеты «Вятская правда» (пазней — «Кировская правда»). У жніўні 1935 г. абвінавачванні былі зняты. У 1935—1941 гг. выкладаў гісторыю ў сярэдніх школах № 379, 395 Масквы. У кастрычніку 1941 г. эвакуіраваўся ў Цюмень, дзе працаваў загадчыкам аддзела рэдакцыі газеты «Тюменская правда». З 1947 г. жыў у Мінску.

Працаваў у Беларускім дзяржаўным выдавецтве, начальнікам планавага аддзела Белсельгасзабеспячэння, выкладчыкам гісторыі ў Мінскай афіцэрскай школе, старшым інжынерам трэста папяровай прамысловасці, на Беларускім тэлебачанні.

Канчаткова рэабілітаваны 19.9.1960 г. Член СП СССР з 1957 г.

Памёр 18.2.1967 г.

Першыя творы надрукаваў у 1923 г. (часопіс «Полымя»). Аўтар зборнікаў вершаў «Дзі-

ва» (1927), «Нясу надзею» (1962), «Гаворка дум» (1966), «Выбраныя вершы» (1975), п'ес «Шукальнікі вышыні» (прэмія на рэспубліканскім конкурсе, 1947), «Сям'я доктара Чыверса», кінасцэнарыя «Арсенал пачуццяў» (прэміраваны на ўсесаюзным конкурсе на лепшы кінасцэнарый, 1957).

Перакладаў на беларускую мову творы рускіх, украінскіх, яўрэйскіх паэтаў.

---

## *Аркадзь ЧАРНЫШЭВІЧ*



Аркадзь Дзмітрыевіч Чарнышэвіч нарадзіўся 8.8.1912 г. у вёсцы Кулакі Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Па заканчэнні Старобінскай сямігодкі (1928) памагаў бацькам у гаспадарцы. У 1930 г. бацьку раскулачылі і адправілі на будаўніцтва Беламорска-Балтыйскага канала, а сям'ю вывезлі ў Качоўскі раён Комі-Пярмяцкай акругі. А. Чарнышэвіч працаваў у пасёлку Янчэр рабочым на лесараспрацоўках, загадчыкам мясцовай крамы, настаўнічаў. У 1940 г. завочна скончыў Кудымкарскае педагагічнае вучылішча. У 1950 г. вярнуўся на радзіму, быў прызначаны дырэктарам Насовіцкай, а потым Свірскай пачатковых школ Мядзельскага раёна. З 1954 г. жыў у Радашковічах, потым пераехаў у Мінск. Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны медалём.

Памёр 18.1.1967 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1927 г. (часопіс «Чырвоны сейбіт»). Сталай літаратурнай працай пачаў займацца з 1940 г., калі апублікаваў у часопісе «Полымя рэвалюцыі» падборку апавяданняў «Лета». Аўтар зборнікаў апавяданняў «Суседзі» (1956), «Марцін Когут» (1958), «Праз зімы і вёсны» (1960), «Новы дом» (1967), «Апавяданні» (1970), раманаў «Світанне» (1957), «Засценак Малінаўка» (1964, ч. 1; 1965, ч. 2), у 1982 г. абедзве часткі выйшлі пад назвай «Засценак Малінаўка». Спачатку выступаў з творамі для дзяцей. Выйшлі аповесці «У адной сям'і» (1951), «На сажалках» (1955), зборнікі апавяданняў «Зосін лужок» (1952),

«Апавяданні старога Арцёма» (1958), «Складанец» (1969). У 1979 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

## *Леаніла* ЧАРНЯЎСКАЯ



Леаніла Усцінаўна Чарняўская нарадзілася 16.11.1893 г. у вёсцы Таргуны Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыла Марыінскае вышэйшае вучылішча ў Вільні (1910). З 1911 да 1918 г. працавала настаўніцай пачатковай школы ў сяле Залессе на Дзісеншчыне. У 1919—1923 гг. выкладала беларускую мову ў Віленскай беларускай гімназіі, а ў кастрычніку 1923 г. разам з мужам, пісьменнікам Максімам Гарэцкім, прыехала ў Мінск. Затым жыла ў Горках Магілёўскай вобласці. У 1932 г. пераехала ў Кіраў (былая Вятка), куды быў высланы муж, працавала выхавацелькай у дзіцячым садзе, потым жыла ў гарадскім пасёлку Пясочня (цяпер г. Кіраў Калужскай вобласці), у Ленінградзе (з 1947).

Узнагароджана медалём.

Памерла 26.9.1976 г.

Першая праца выйшла ў 1919 г.— зборнік «Дзяціныя гульні» (Вільня). Першае апавяданне «Мікітка» апублікавала ў 1921 г. (газета «Наша думка», Вільня). Аўтар чытанкі «Родны край» для 1, 2, 3, 4 года навучання (1919, перавыдавалася да 1936 г.). Выйшлі кнігі прозы «Апавяданні», «Валуй — камісар часоў Керанщчыны», «Падарожніца», «Бяздзетуха» (усе ў 1930), «Апавяданні» (1983), кнігі для дзяцей «Варка» (1928), «Кот Знайдзён» (1929), «Андрэйка» (1930), «Перамога» (1932), «Лявонка» (1932), «Сталёвы конь» (1933), «Жук» (1960), «Казёл Мэка і Кудла» (1979).

Пераклала на беларускую мову аповесці В. Забайкальскага «Маленькія чырвонаармейцы» (1931), А. Іркутава «Пан Бергер падае ў адстаўку» (1931), Я. Хазіна «Барабаншчык рэвалюцыі» (1932), «Апавяданні старога матроса» С. Заяіцкага (1930), «Рэха» Э. Ажэшкі (Вільня, 1919), «Гісторыю аднаго мядзведзя»

Э. Сэтана-Томпсана (1927), «Бунт Моці-Гёджа» Р. Кіплінга (1927), «Прыгоды Фрыдрыха Крона ў Сярэдняй Еўропе. Расстрэл рабочай моладзі ў Радожыне» Г. Краўса (1932), «Тыля Уленшпігеля» Ш. дэ Кастэра (1934), а для чытанкі «Родны край» — урыўкі з твораў А. Чэхава, А. Серафімовіча, У. Гаршына, Г. Караленкі, Д. Маміна-Сібірака і інш.

---

## *Мікола* ЧАРНЯЎСКІ



Мікола (Мікалай Мікалаевіч) Чарняўскі нарадзіўся 16.1.1943 г. у вёсцы Буда-Люшаўская Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1960 г. паступіў на вячэрняе аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна і скончыў яго ў 1966 г. Адначасова працаваў рэдактарам Беларускага радыё. У 1966—1988 гг.— літсупрацоўнік, старшы рэдактар аддзела, адказны сакратар часопіса «Бярозка». З 1989 г.— літаратурны рэдактар часопіса «Вясёлка». Член СП СССР з 1972 г.

Першы верш надрукаваны ў 1958 г. у газеце «Піянер Беларусі». Выйшлі кніжкі паэзіі для дзяцей «Дзе лета канчаецца» (1963), «Апошні бой» (1967), «Сонца ў хованкі гуляе» (1970), «Кліча горн» (1974), «Адрас наш — дзіцячы сад» (1975), «Парад» (1976), «Залатая ніва» (1977), «Дзе пяцёркі прадаюцца?» (1978), «Я збіраюся на БАМ» (1979), «Хто сябруе з добрым днём?» (1981), «Звініць званок...» (1982), «Зоркі-зорачкі» (1984), «Навечна з сонцам» (1986), «Аб чым пяе крынічка» (1989), а таксама аповесці «Бегунок пачынае думаць» (1965) і «Акадэмія ... на колах, альбо За вясёлкай наўздагон» (1990).

Выдаў зборнікі паэзіі «Чалавечнасць» (1971), «Трывога» (1988) і сатыры і гумару «Казёлмоднік» (1978), «І не косяць, і не жнуць...» (1982), «Камар на матацыкле» (1985), «Нашто бабе агарод?» (1989).

Аўтар шэрагу тэкстаў піянерскіх песень і кантат.

На беларускую мову пераклаў творы пісьменнікаў народаў СССР — Г. Гуляма, М. Міршакара, Т. Уметаліева, А. Тактамушава, М. Мрэўлішвілі, Р. Фархадзі, Н. Джундубаевай, А. Рахманава, Х. Мянд, Г. Сар'яна, Х. Алі, А. Чакану, Ю. Семяндэра, П. Глазавога, П. Рабра, А. Юшчанкі, В. Юхімовіча, В. Маругі і інш.

---

## *Міхась ЧАРОТ*



Міхась Чарот (Міхаіл Сямёнавіч Кудзелька) нарадзіўся 7.11.1896 г. у гарадскім пасёлку Рудзенск Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Маладзечанскую настаўніцкую семінарыю (1917). У 1917 г. мабілізаваны ў армію. У 1918 г. вярнуўся на Беларусь, удзельнічаў у партызанскім руху ў час акупацыі Беларусі буржуазнай Польшчай. З 1920 г.— супрацоўнік, у 1925—1929 гг.— рэдактар газеты «Савецкая Беларусь». Ініцыятар стварэння і кіраўнік першай у рэспубліцы літаратурнай арганізацыі «Маладняк» (з 1923). Быў членам ЦВК БССР (1924—1931). У 1937 г. рэпрэсіраваны, асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 8.2.1956 г. Член СП СССР з 1934 г.

Расстраляны 20.10.1937 г.

Друкавацца пачаў у 1919 г. Аўтар кніжак паэзіі «Завіруха» (1922), «Босыя на вогнішчы» (паэма, 1922), «Выбраныя вершы» (1925), «Карчма», «Ленін», «Марына» (паэмы, усе ў 1926), «Беларусь лапцюжная» (паэма, 1927), «Чырванакрылы вяшчун» (паэма-фантазія, 1927), «Паэмы» (1928), «Сонечны паход» (1929), «У сонечным паходзе» (вершы і паэмы, 1986), «Выбраныя вершы і паэмы» (1935), Збору твораў у 3 тамах (1933—1936), у 2 тамах (1958), «Выбраныя вершы і паэма» (1967), «Выбранае» (1982).

Выдаў зборнік апавяданняў «Веснаход» (1924) і «Выбраныя апавяданні» (1926).

Апублікаваў п'есы «Мікітаў лапаць» (апублікавана і пастаўлена ў 1923), «Дажынкі» і аднаактоўку «Сон на балоце» (1924), дзіцячыя п'есы «Пастушкі. Данілка і Алеська» (Клімавічы, 1925). Напісаў музычную драму «На Купалле» (адноўлены тэкст апублікаваны ў 1982, пастаўлена ў 1921, кампазітар А. Туранкоў стварыў на тэкст п'есы оперу «Кветка шчасця»).

Па аповесці «Свінапас» стварыў з Ю. Тарычам сцэнарый першага мастацкага фільма «Лясная быль» (пастаўлены ў 1926).

---

## *Іван ЧАРОТА*



Іван Аляксеевіч Чарота нарадзіўся 16.9.1952 г. у вёсцы Лышчыкі Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1974). Працаваў настаўнікам у Палецкішскай сярэдняй школе Воранаўскага раёна Гродзенскай вобласці. З 1977 г.— выкладчык БДУ імя У. І. Леніна, з 1988 г.— дацэнт кафедры рускай савецкай літаратуры. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1985 г.

У друку як крытык, літаратуразнавец і перакладчык выступае з 1978 г.

Сааўтар кнігі «Беларуская савецкая літаратура за мяжой» (з Г. Адамовіч, Л. Казырам, У. Сакалоўскім, 1988).

Перакладае з сербскахарвацкай, славенскай, македонскай, украінскай моў. У яго перакладзе выйшлі кнігі Б. Зупанчыча «Памінкі» (1983), Б. Нушыча «Аўтабіяграфія» (1985), Ё. Юрчыча «Як аднойчы казла судзілі» (1986), П. Воранца «Падарункі» (1986), Д. Янчара «Галернік» (1990), пераклаў п'есу Д. Янчара «Дэдал». Укладальнік, адзін з перакладчыкаў анталогіі «Сербская паэзія» (1989).

*Кузьма ЧОРНЫ*



Кузьма Чорны (Мікалай Карлавіч Раманоўскі) нарадзіўся 24.6.1900 г. у маёнтку Боркі Слуцкага павета (цяпер Капыльскі раён Мінскай вобласці) у сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі (1916—1919). У 1920—1922 гг. працаваў у валасным рэўкоме, у Слуцкім павятовым ваенкамаце, настаўнічаў. У 1923 г. паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта (скончыў два курсы). У 1924—1928 гг. працаваў у газеце «Беларуская вёска». Член літаратурнага аб'яднання «Маладняк» (з 1923), старшыня «Узвышша» (1926—1931). У 1932—1937 гг.— галоўны літкансультант у кабінеце маладога аўтара пры СП БССР. 14.10.1938 г. быў арыштаваны. Каля 8 месяцаў адседзеў у мінскай турме, а затым быў вызвалены. У гады Вялікай Айчыннай вайны жыў у Маскве, працаваў у газеце-плакаце «Раздавім фашысцкую гадзіну» (1941—1944), часопісе «Беларусь». Вярнуўся ў Мінск. Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і партызанскім медалём.

Памёр 22.11.1944 г.

У друку пачаў выступаць з 1921 г. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Апавяданні» (1925), «Срэбра жыцця» (1925), «Па дарозе» (1926), «Пачуцці» (1926), «Хвоі гавораць» (1926), «Вераснёвыя ночы» (1929), «Нянавісць» (1930), «Буры» (1930), «Два апавяданні» (1932), «Брыгадзіравы апавяданні» (1932), «Выбраныя апавяданні» (1932), «Як дзядзька Тамаш напалохаў ваўкоў» (1941, апавяданні для дзяцей), «Вялікае сэрца» (1945), аповесцей «Лявон Бушмар» (1930), «Вясна» (1931), «Люба Лук'янская» (1937), «Насцечка» (1941, апошняе выданне ў 1987), кніжак апавяданняў і аповесцей «Вераснёвыя ночы» (1984) і «Матчына благаславенне» (1984), раманаў «Зямля» (1928), «Бацькаўшчына» (1932), «Трэцяе пакаленне» (1935, апошняе выданне ў 1981), кніжкі фельетонаў «Кат у белай манішцы» (1942), нарыса «Герой Савецкага Саюза Ціхан Піменавіч Бумажкоў» (1943). Гумарыстычныя творы сабраны

ў зборніку «Вяселле ў Скіп'ёўскім Пераброддзі» (1971). Выдадзены Выбраныя творы (1934, 1947), Зборы твораў у 6-ці (1954—1955, 1988—1991), у 8 тамах (1972—1975). У Зборы твораў увайшлі раманы «Сястра», «Ідзі, ідзі», «Трыццаць год», «Пошукі будучыні», аповесць «Скіп'ёўскі лес» і многія іншыя творы, якія асобнымі выданнямі да гэтага не публікаваліся (рукапісы раманаў «Судны дзень» і «Вялікае выгнанне» згарэлі пад час вайны ў Мінску).

Выступаў і ў жанры драматургіі. Выйшлі п'есы «Бацькаўшчына» (1934, пастаўлена ў 1932), «Базылевічава сям'я» (1938), «Ірынка» (1947, пастаўлена ў 1941).

Пераклаў на беларускую мову аповесці А. Пушкіна «Трунар», «Станцыйны даглядчык», «Паненка-сялянка», «Дуброўскі», «Капітанская дачка» (у зборніку «А. Пушкін: Выбраныя творы», 1949), У. Караленкі «У благой кампаніі» (1930), П. Панчанка «Блакітныя эшалоны» (з Л. Калюгам, 1930), камедыю А. Астроўскага «Гарачае сэрца» (1937), аповесць Я. Гашака «Прыгоды ўдалага ваякі Швейка» (ч. 4, 1931), а таксама п'есы для тэатра «Рэвізор» М. Гогаля, «Апошнія» і «Варвары» М. Горкага, «Позняе каханне» А. Астроўскага і інш.

---

## *Іван* ЧЫГРЫН



Іван Пятровіч Чыгрын нарадзіўся 10.4.1931 г. у вёсцы Чамяры Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і. Скончыў філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна (1955), працаваў настаўнікам у Дзераўноўскай сярэдняй школе Слонімскага раёна, завучам у Яварскай сярэдняй школе Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці (1955—1957), настаўнікам у Кракоцкай сярэдняй школе Слонімскага раёна (1957—1958). Вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (1958—1961). З 1961 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1988 г.

У друку выступае з літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі з 1959 г. Аўтар кніжак

«Станаўленне беларускай прозы і фальклор: Дакастрычніцкі перыяд» (1971), «Проза «Маладняка»: Дарогамі сцвярджэння» (1985), «Крокі: Проза «Узвышша» (1989). З'яўляецца сааўтарам кніжкі «Беларуская літаратура і праблемы сучаснасці» (1978), аўтарам асобных раздзелаў «Истории белорусской советской литературы» (1977), «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1981).

Выступае ў друку з вершамі. Пераклаў паасобныя вершы Ф. Цютчава, У. Сыракомлі, Я. Лучыны. Склаў «Выбраныя творы» Ядвігіна Ш. (1976) і зборнік «Веснаход» (апавяданні «Маладняка», 1987).

---

## *Іван* ЧЫГРЫНАЎ



Іван Гаўрылавіч Чыгрынаў нарадзіўся 21.12. 1934 г. у вёсцы Вялікі Бор Касцюковіцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1972 г. скончыў Саматэвіцкую сярэднюю школу і паступіў на аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Пасля заканчэння універсітэта (1957) працаваў рэдактарам, загадчыкам рэдакцыі літаратуры і мастацтва ў выдавецтве Акадэміі навук БССР. У 1965—1975 гг.— рэдактар аддзела публіцыстыкі і нарыса ў часопісе «Полымя». З 1975 г. намеснік старшыні, а з 1976 г. да 1986 г.— сакратар праўлення СП БССР. У 1987 г. абраны старшынёй праўлення Беларускага фонду культуры. З 1989 г.— галоўны рэдактар часопіса «Спадчына». У 1978 г. у складзе дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XXXIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1986—1990), старшыня пастаяннай камісіі Вярхоўнага Савета БССР па нацыянальных пытаннях і міжнацыянальных адносінах (1988—1990). Член СП СССР з 1964 г.

Узнагароджаны ордэнам Дружбы народаў, медалямі.

У рэспубліканскім друку дэбютаваў вершам у 1952 г., як празаік — у 1958 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар кніг апавяданняў і аповесцей «Птушкі ляцяць на волю» (1965), «Самы

шчаслівы чалавек» (1967), «Ішоў на вайну чалавек» (1973), раманаў «Плач перапёлкі» (1972), «Апраўданне крыві» (1977), «Свае і чужыя» (1984), п'ес — «Дзівак з Ганчарнай вуліцы» (1986), «Следчая справа Вашчылы» (1988), «Чалавек з мядзвежым тварам» (1988), «Звон — не малітва» (1988), «Толькі мёртвыя не вяртаюцца» (1989), «Ігракі» (1989), кнігі крытыкі і публіцыстыкі — «Новае ў жыцці, новае ў літаратуры» (1983). У 1984 г. выйшлі Выбраныя творы ў 3 тамах.

Напісаў асобныя раздзелы манаграфіі «Н. Я. Никифоровский» (1960).

Адзін з аўтараў сцэнарыя шматсерыйнага тэлевізійнага фільма «Руіны страляюць...» (пастаўлены ў 1973 г.).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Фадзеева (1979) за раманы «Плач перапёлкі», «Апраўданне крыві», Дзяржаўнай прэміі БССР (1974) як сааўтар сцэнарыя тэлефільма «Руіны страляюць...».

---

## *Ян ЧЫКВІН*



Ян Арцёмавіч Чыквін нарадзіўся 18.5.1940 г. у вёсцы Дубічы-Царкоўныя Гайнаўскага павета Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сям'і настаўніка.

У 1959 г. скончыў агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім. У 1964 г. скончыў філалагічны факультэт Варшаўскага універсітэта. Працаваў настаўнікам у ліцэі ў Беластоку, адначасова быў лектарам рускай мовы ў Інжынерскай вышэйшай школе. З 1969 г.— асістэнт філіяла Варшаўскага універсітэта на гуманітарным факультэце ў Беластоку. З 1985 г.— дацэнт кафедры беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. З 1988 г. старшыня Беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа». Доктар гуманітарных навук. Член Саюза польскіх пісьменнікаў з 1970 г.

Узнагароджаны Залатым крыжам заслугі і медалямі.

Дэбютаваў у друку на беларускай мове ў 1957 г. вершам (газета «Ніва», Беласток). Піша на беларускай і польскай мовах. Аўтар

зборнікаў вершаў «Іду» (Беласток, 1969), «Святая студня» (Беласток, 1970), «Неспакой» (Беласток, 1977), «Светлы міг» (Мінск, 1989). У 1988 г. выйшла білінгуальнае выданне (на беларускай і польскай мовах) кнігі вершаў «Сонечная вязь» (Ольштын, 1988). У кнізе «На парозе свету» (Варшава, 1983) побач з перакладамі твораў паэта на польскую мову змешчаны вершы, напісаныя ім па-польску.

Працуе таксама як крытык і літаратуразнавец. Напісаў манаграфію «Афанасій Фет: Гісторыка-літаратурнае даследаванне» (Беласток, 1984). Склаў для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў анталогію «Русская поэзия. 1842—1895» (Варшава, 1984). Сааўтар падручніка беларускай мовы для 7 класа беларускіх школ «Крыніцы» (з Л. Раманюк, Варшава, 1990).

Пераклаў з польскай мовы на беларускую асобныя творы Я. Івашкевіча, Т. Ружэвіча, В. Шымборскай, Ч. Мілаша, С. Грахов'яка, С. Бараньчака і інш. На полькую мову пераклаў асобныя творы А. Разанава, Г. Марчука.

---

## *Хведар ЧЭРНЯ*



Хведар Мікалаевіч Чэрня нарадзіўся 10.6.1939 г. у вёсцы Лінкі Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Вішнеўскай сярэдняй школы (1957) працаваў загадчыкам Вішнеўскага сельскага клуба. Вучыўся ў тэхнічным вучылішчы № 9 пры Мінскім аўтазаводзе і працаваў фармоўшчыкам-ліцейшчыкам (1958). Служыў у Савецкай Арміі (1959—1961). Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1966) і Мінскую вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1969). Працаваў рэдактарам на Беларускім радыё (1966—1967), у выдавецтве «Беларусь» (1969—1971). У 1972—1983 гг.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1970 г.

Памёр 16.3.1983 г.

Выступаць у друку пачаў у 1955 г. Выйшлі зборнікі паэзіі «Добрай раніцы, людзі!» (1966),

«Дабрэе свет» (вершы і паэма, 1968), «Размова з памяццю» (паэма, 1970), «Сады юнацтва» (вершы і паэмы, 1972), «Настрой» (1974), «Ваколіца» (1976), «Ажаніся, не журыся...» (гумарыстычныя вершы, 1979), «Святло рамонкаў» (1981), «На скрыжаваннях памяці» (вершы і паэмы, 1982), «Музыка дарог» (1984), кніжкі для дзяцей «Песня Сабіны» (паэма, 1971), «На сонечнай вуліцы» (1973).

# Ш



*Яўген ШАБАН*

Яўген (Яўгеній Пятровіч) Шабан нарадзіўся 29. 12.1936 г. у вёсцы Калодзіна Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў акцёрскі факультэт Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (1958). Працаваў акцёрам, загадчыкам літаратурнай часткі Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Я. Коласа ў Віцебску (1958—1965), рэжысёрам студыі Беларускага тэлебачання (1965—1976). У 1976—1980 гг.— загадчык літаратурнай часткі Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы.

Памёр 30.7.1982 г.

Літаратурную працу пачаў у 1960 г. Выдаў зборнікі вершаў «Нарачанка» (1969), «Чырвоныя сумёты» (1977). Аўтар п'ес «Ракіроўка» (1975), «Прад'явіце пропуск» (1975), «Сіні снег» (пастаўлена ў 1975), «Шрамы» (апублікавана і пастаўлена ў 1977), «Чалавек з легенды» (з І. Ражковым, апублікавана і пастаўлена ў 1978), «Востраў Алены» (апублікавана і пастаўлена ў 1982), лібрэта тэлеоперы «Ранак» (пастаўлена ў 1968), сцэнарыя тэлефільма «І смех, і бяда» (пастаўлены ў 1973), тэлеспектакля «Вячэра» (пастаўлены ў 1980).

Перакладаў на беларускую мову паэзію народаў СССР, творы рускай драматургіі.

## *Кастусь ШАВЕЛЬ*



Кастусь (Канстанцін Міхайлавіч) Шавель нарадзіўся 5.6.1912 г. у вёсцы Кухцічы Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі педагагічны інстытут імя М. Горкага (1938). Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Негарэльскай сярэдняй школе. Пасля вызвалення Беларусі (1944) быў прызваны ў Савецкую Армію. З 1956 г. працаваў бухгалтарам у калгасе імя Ільіча Уздзенскага раёна.

Памёр 19.8.1987 г.

Пачаў друкавацца ў 1927 г. (часопіс «Беларускі піянер»). Аўтар кніг паэзіі «Мой кут салаўіны» (1967), «Музыка нівы» (1977), «Пахне бяроста» (1978), «Цалуйце хлеб» (1981), «Асеннія пракосы» (1983).

## *Іван ШАЛЬМАНАЎ*



Іван Ігнатавіч Шальманаў нарадзіўся 5.9.1936 г. у вёсцы Каромка Буда-Кашалёўскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1955 г. скончыў Рогінскую сярэднюю школу і быў прызваны ў рады Савецкай Арміі. З 1958 г. працаваў на Мінскім цагельным заводзе, качагарам на паравозе, слесарам на розных прадпрыемствах Мінска. З 1968 г.— літсупрацоўнік рэдакцыі газеты «Связист Белоруссии», рэдактар на Беларускім радыё. З 1975 г.— рэдактар, намеснік дырэктара Мінскага абласнога Дома народнай творчасці, у 1976—1979 гг.— старшы рэдактар Мінскага эксперыментальна-канструктарскага тэхналагічнага бюро скургалантарэйнай і фурнітурнай прамысловасці. У 1981 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. З таго часу працуе на Беларускім радыё. Член СП СССР з 1977 г.

Першае апавяданне надрукавана ў 1960 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар аповесці «Зарево в ночи» (газета «Связист Белоруссии» 1968), зборніка апавяданняў «Дзень пачаўся» (1969) і аповесці «Цагельня» (1977).

*Іван ШАМЯКІН*



Іван Пятровіч Шамякін нарадзіўся 30.1.1921 г. у вёсцы Карма Добрушскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Гомельскі тэхнікум будаўнічых матэрыялаў (1940). У 1940—1945 гг. у Савецкай Арміі — камандзір гарматы, затым камсорг дывізіёна. Удзельнічаў у баях пад Мурманскам, у вызваленні Польшчы, у баях на Одэры. У 1945—1948 гг. настаўнічаў у вёсцы Пракопаўка Церахаўскага раёна. З 1946 г. вучыўся на завочным аддзяленні Гомельскага педагагічнага інстытута. Скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ (1950). Працаваў старшым рэдактарам Беларускага дзяржаўнага выдавецтва, галоўным рэдактарам альманаха «Советская Отчизна». З 1954 г.— намеснік старшыні, з 1966 г.— сакратар, з 1968 г.— другі сакратар, з 1971 г.— першы намеснік старшыні, у 1976—1980 гг.— першы сакратар праўлення СП БССР. З 1980 г.— галоўны рэдактар выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя». У 1963 г. як член дэлегацыі БССР удзельнічаў у рабоце XVIII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР (1963—1985) і СССР (1980—1989). Старшыня Вярхоўнага Савета БССР (1971—1985). Член-карэспандэнт АН БССР. Член СП СССР з 1947 г.

Герой Сацыялістычнай Працы (1981). Узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Айчыннай вайны II ступені, «Знак Пашаны», медалём Францыска Скарыны і іншымі медалямі.

Народны пісьменнік БССР (1972).

У час Вялікай Айчыннай вайны выступаў у армейскай газеце «Часовой Севера» з нарысамі і вершамі. У 1945 г. надрукаваў аповесць «Помста» (часопіс «Полымя»). Аўтар раманаў «Глыбокая плынь» (1949, інсцэніраваны ў 1956), «У добры час» (1953), «Крыніцы» (1957, інсцэніраваны ў 1961), «Сэрца на далоні» (1964, інсцэніраваны ў 1965), «Снежныя зімы» (1970), «Атланты і карыятыды» (1974, аднайменны відэафільм Беларускага тэлебачання, 1980), «Вазьму твой боль» (1979, экранізаваны ў 1981),

«Петраград — Брэст» (1983), «Зеніт» (1987). Цыкл з пяці аповесцей («Непаўторная вясна», 1957; «Начныя зарніцы», 1958; «Агонь і снег» і «Пошукі сустрэчы», 1959; «Мост», 1965) аб'яднаны ў пенталогію «Трывожнае шчасце» (1960, 1973, 1982). Выйшлі кнігі апавяданняў і аповесцей: «На знаёмых шляхах» (1949), «Дзве сілы» (1951), «Апавяданні» (1952), «Першае спатканне» (1956), «Матчыны рукі» (1961), «Вячэрні сеанс» (1968), «Лёс майго земляка» (1970), «Бацька і дзеці» (1971), «Сцягі над штыкамі» (1976), «Гандлярка і паэт. Шлюбная ноч» (1976, пастаўлены кінафільмы адпаведна ў 1978 і 1980), «Браняпоезд «Таварыш Ленін» (1985), «У роднай сям'і» (1986), «Драма» (аповесці, гістарычныя сцэны, 1990), а таксама кніжка апавяданняў для дзяцей «У Маскву» (1950). У 1965—1966 гг. выйшаў Збор твораў у 5-ці, ў 1977—1979 гг.— у 6 тамах.

Напісаў п'есы «Не верце цішыні» (апублікавана і пастаўлена ў 1958), «Выгнанне блудніцы» (апублікавана і пастаўлена ў 1961, асобнае выданне ў 1962), «Дзеці аднаго дома» (апублікавана і пастаўлена ў 1967), «Экзамен на восень» (1973, пастаўлена ў 1974), «Баталія на лузе» (1975), «І змоўклі птушкі» (1977, пастаўлена ў 1977), Залаты медаль» (1979, пастаўлена ў 1980). Аўтар сцэнарыя 4-серыйнага тэлеспектакля «Трывожнае шчасце» (з А. Гутковічам, пастаўлены ў 1968), кінасцэнарыяў «Крыніцы» (з Ю. Шчарбаковым, пастаўлены ў 1964), «Хлеб пахне порахам» (пастаўлены ў 1974), «Атланты і карыятыды» (пастаўлены ў 1978). У 1974 г. выйшаў зборнік кінааповесцей і п'ес «Экзамен на восень».

Аўтар кніг публіцыстычных і літаратурнакрытычных артыкулаў «Размова з чытачом» (1973), «Карэнні і галіны» (1986).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1951) за раман «Глыбокая плынь», Літаратурнай прэміі імя Якуба Коласа (1959) за раман «Крыніцы», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1968) за раман «Сэрца на далоні» і кнігу «Трывожнае шчасце», Літаратурнай прэміі Міністэрства абароны СССР (1978) за кнігу «Гандлярка і паэт. Шлюбная ноч», Дзяржаўнай прэміі БССР у галіне тэатральнага мастацтва, кінематаграфіі, радыё і тэлебачання (1982) за кінафільм «Вазьму твой боль».

## *Таццяна* ШАМЯКІНА



Таццяна Іванаўна Шамякіна нарадзілася 8.10. 1948 г. у горадзе Мінску ў сям'і пісьменніка.

Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1971) і аспірантуру пры гэтым універсітэце (1974). З 1974 г.— выкладчык, з 1982 г.— дацэнт кафедры беларускай літаратуры універсітэта. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1983 г.

З рэцэнзіямі і артыкуламі выступіла ў рэспубліканскім друку ў 1972 г. (газета «Літаратура і мастацтва»). Аўтар кнігі літаратурнай крытыкі «На лініі перасячэння» (1981).

Пераклала на рускую мову аповесці І. Шамякіна «Гандлярка і паэт» (Масква, 1977), «Драма» (часопіс «Нёман», 1989), п'есу «Залаты медаль» (пастаўлена ў 1980), раманы «Вазьму твой боль» (Масква, 1980), «Петраград — Брэст» (Масква, 1985), «Зеніт» (Масква, 1988).

## *Іван* ШАПАВАЛАЎ



Іван Еўдакімавіч Шапавалаў нарадзіўся 26.1. 1907 г. у вёсцы Бежаўка Бурынскага раёна Сумскай вобласці (Украіна) у сялянскай сям'і.

Скончыў Камуністычны універсітэт Беларусі. 1923 г. служыў у войсках ЧОН, у 1925—1939 гг.— у пагранічных войсках, з 1939 г.— у палітупраўленні пагранічных войск НКУС СССР (Масква). Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны працаваў загадчыкам аддзела ў часопісе «Пограничник» (Масква). Член СП СССР з 1934 г.

Загінуў 26.6.1941 г. на фронце пад Барысавам.

Друкаваць вершы, апавяданні, нарысы пачаў у канцы 20-х гадоў. Пісаў на рускай мове. Выйшлі ў Мінску зборнікі вершаў «Товарищи» (1932), «Дзержинцы» (1934), «Время близится» (1937), паэма-аповесць «Ян Рендя» (1932), аповесць «Большевики границы» (1936) і кніжка прозы «Ненадуманные рассказы» (1939). Асоб-

ныя творы надрукаваны ў зборніку «Мы іх не забудзем» (1949).

У 1940 г. напісаў лібрэта оперы «Пограничники» (музыка А. Туранкова).

---

*Лазар ШАПІРА*



Лазар Львовіч Шапіра нарадзіўся 13.6.1905 г. у горадзе Нова-Беліца (цяпер у складзе Гомеля) у рабочай сям'і.

У 1918—1926 гг. працаваў у Гомелі рабочым, качагарам на заводзе «Чырвоны хімік». Скончыў вячэрнюю сярэднюю школу ў Нова-Беліцы (1926). Быў загадчыкам агітпропа Нова-Беліцкага райкома камсамола. З 1927 г.— у Чырвонай Арміі. У Вялікую Айчынную вайну — старшы інструктар па друку, адказны сакратар часопіса «Фронтовой юмор» Палітупраўлення Заходняга фронту, спецкарэспандэнт газеты «Сталинский пилот» 1-й паветранай арміі. Пасля вайны — на бібліятэчнай рабоце. У 1948—1953 гг.— начальнік бібліятэкі Акруговага Дома афіцэраў у Мінску. Член СП СССР з 1942 г.

Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума — Айчыннай вайны II ступені, ордэнам Чырвонай Зоркі і 12 медалямі.

Памёр 28.5.1991 г.

Друкуецца з 1929 г. Пісаў на рускай мове. Аповесць «Кипучие дни» друкавалася ў часопісе «Напагатове» (1933—1934), п'еса «Рожденные летать» — у газеце «Боевые крылья» (1961). Асобныя апавяданні і нарысы друкаваліся ў перыядычным друку, у зборніку «Чтоб всегда было солнце» (1968).

Аўтар сцэнарыя дакументальнага фільма «На варце радзімы» (зняты ў 1948).

## *Янка ШАРАХОЎСКІ*



Янка (Іван Захаравіч) Шарахоўскі нарадзіўся 4.3.1908 г. у гарадскім пасёлку Бялынічы Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1925—1927 гг. вучыўся ў Магілёўскім педагагічным тэхнікуме, у 1931 г. скончыў Ленінградскі гісторыка-лінгвістычны інстытут. Працаваў у рэдакцыях часопіса «Чырвоная Беларусь», газеты «Літаратура і мастацтва», часопіса «Полымя рэвалюцыі». У 1938—1941 гг. вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага. У час Вялікай Айчыннай вайны ваяваў пад Масквой, на Бранскім, 2-м Прыбалтыйскім, Ленінградскім франтах як камандзір узвода, з 1943 г.— інструктар франтавой газеты. Пасля вайны — адказны сакратар часопіса «Полымя» (1946—1948), галоўны рэдактар Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1948—1957), намеснік міністра культуры БССР (1957—1959), галоўны рэдактар газеты «Літаратура і мастацтва» (1959—1961), дырэктар Літаратурнага музея Янкі Купалы (1961—1968). Член СП СССР з 1940 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі «Знак Пашаны» і медалямі.

Памёр 6.4.1973 г.

У друку пачаў выступаць як паэт, а з 1931 г.— як крытык і літаратуразнавец. Выдаў кнігі пра жыццё і творчасць Янкі Купалы «Янка Купала» (1962), «Пясняр народных дум» (1970 — дарэвалюцыйны перыяд, 1976 — савецкі перыяд).

Аўтар зборнікаў апавяданняў «Срэбраная раніца» (1951), «Сплочаны доўг» (1978), кніжкі апавяданняў для дзяцей «Сердалікавая бухта» (1955).

Пераклаў на беларускую мову раман «Белая бяроза» М. Бубеннава (1949), аповесць «Сляпы музыка» У. Караленкі (1950), раманы «Чэсць змоладу» А. Первенцава (1951), «Рудзін», «Напярэдадні» І. Тургенева (1952), «Аповесць пра дзяцінства» Ф. Гладкова (1952), «Казкі» М. Салтыкова-Шчадрына (1953), «Апавяданні» І. Франка (1956), апавяданне «Лёс чалавека» М. Шолахава (1959) і інш.

## *Пётр ШАСЦЕРЫКОЎ*



Пётр Паўлавіч Шасцерыкоў нарадзіўся 4.5. 1919 г. у вёсцы Тоўсты Луг Суджанскага раёна Курскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

Скончыў літаратурны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1941). На пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўступіў у камуністычны знішчальны батальён пры ЦК КПБ, а са жніўня 1941 г. служыў у войсках Міністэрства ўнутраных спраў па ахове чыгункі, з 1944 г.— інструктар чырвонаармейскай дывізійнай газеты «За Родину». Пасля дэмабілізацыі (1946) — карэспандэнт газеты «Звязда» па Магілёўскай вобласці, затым загадчык аддзела крытыкі газеты (1946—1956), карэспандэнт Беларускага радыё (1961), сакратар Магілёўскага абласнога аддзялення СП БССР (1961—1971). У 1973—1990 гг.— упаўнаважаны УААП Магілёўскай вобласці. Член СП СССР з 1952 г.

Першае апавяданне надрукаваў у 1941 г. (газета «Камунар Магілёўшчыны»). Піша на рускай мове. Аўтар аповесці «Камень за камнем» (1955), кніг аповесцей і апавяданняў для дзяцей «Звени, звонок!» (1957), «Солнечный луч» (1961), «На всю жизнь» (1962), нарыса «А слава тебя найдет» (1964). Зрабіў літаратурную апрацоўку кніг успамінаў «Солдатами были все» (1968, 1978) і «Орлы» (1978). Напісаў тэксты да фотаальбомаў «Магілёў» (1968, 1971, 1977), «Магілёўская вобласць» (1975). У 1979 г. выйшаў зборнік «Повести и рассказы».

## *Анатоль ШАЎНЯ*



Анатоль Аляксандравіч Шаўня нарадзіўся 2.9. 1930 г. у пасёлку Дорахава Рузскага раёна Маскоўскай вобласці (Расія) у сям'і рабочага — перасяленца з Беларусі.

Скончыў перакладчыцкі факультэт 1-га Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў (1954), працаваў у рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» літсупрацоўнікам, потым выконваў абавязкі загадчыка аддзела крытыкі і бібліяграфіі. З 1959 г.— літсупрацоў-

нік, пасля рэдактар грамадска-палітычнага аддзела часопіса «Беларусь». З 1981 г.— рэдактар студыі «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм». Член СП СССР з 1967 г.

Узнагароджаны медалямі.

Першыя вершы надрукаваў у 1953 г. у інстытуцкай шматтыражцы. Аўтар зборнікаў вершаў «Паводка» (1975), «Урок дабрыні» (1980).

Перакладае з італьянскай мовы на беларускую. У яго перакладзе асобнымі выданнямі выйшлі аповесць Л. Стурані «Праўдзівая гісторыя» (1957), «Прыгоды К'ядзіна» М. Арджылі і Г. Паркі (1959), аповесць В. Берціні «Юнацтва становіцца ў строй» (1960), раман Д. Арфелі «Лішнія» (1965), анталагічны зборнік сучаснага італьянскага апавядання «Золата Фарчэлы (1968), «Казкі нашых дзён» М. Арджылі (1971). Шмат вершаў сучасных італьянскіх паэтаў перакладзена ім для зборніка «Ад вежаў Ферары» (1974).

Напісаны таксама сцэнарыі мультыплікацыйнага фільма «Квака-задавака» (з Э. Калядэнкам, пастаўлены ў 1977), дакументальнага фільма «Кандрат Крапіва» (1982), шэрагу іншых дакументальных і навукова-папулярных фільмаў.

## *Марыя ШАЎЧОНАК*



Марыя Сіланцьеўна Шаўчонак нарадзілася 11.5. 1944 г. у вёсцы Новы Востраў Клічаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1965 г. скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Настаўнічала ў Ракавіцкай сярэдняй школе Шчучынскага раёна. У 1966—1978 гг. працавала ў шчучынскай раённай газеце «Савецкая вёска». З 1978 г.— старшы рэдактар аддзела прапаганды Гродзенскай студыі тэлебачання. Член СП СССР з 1979 г.

Узнагароджана медалём.

Першы верш надрукавала ў 1954 г. (газета «Піянер Беларусі»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Белая ластаўка» (1971) і «Свята зямлі» (1976), «Бацькоўскае імя» (1981), «Раса-расінка» (1985).

## *Соф'я ШАХ*



Соф'я Мікалаеўна Шах нарадзілася 29.11.1947 г. у вёсцы Лясец Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сям'і рабочых.

Дзіцячыя і юнацкія гады прайшлі ў гарадскім пасёлку Азарычы Калінкавіцкага раёна.

Скончыла факультэт пачатковых класаў Мазырскага педагагічнага інстытута імя Н. К. Крупскай (1969). Працавала настаўніцай пачатковай школы ў вёсцы Гажын Нараўлянскага раёна, у вёсцы Цідаў, у пасёлку Азарычы Калінкавіцкага раёна. У 1980 г. скончыла завочна дэфекталагічны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага, працуе лагапедам у школе-інтэрнаце ў Светлагорску. Член СП СССР з 1990 г.

Літаратурнай працай займаецца з 1983 г. Адна з аўтараў калектыўных зборнікаў паэзіі «Маладыя галасы» (1985), «Лагодны промень раніцы» (1988). У «Бібліятэцы часопіса «Маладосць» выйшаў зборнік вершаў «І не пакіне спадзяванне» (1989).

## *Уладзімір ШАХАВЕЦ*



Уладзімір Міхайлавіч Шахавец нарадзіўся 26. 11.1918 г. у вёсцы Кімія Барысаўскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Працоўны шлях пачаў у 1934 г. спачатку рахункаводам калгаса, а потым сакратаром сельсавета. У 1937 г. скончыў Магілёўскі рабфак і паступіў на фізіка-матэматычны факультэт дзяржаўнага універсітэта (скончыў у 1946). Удзельнік партызанскага руху на Беларусі, у 1945 г.— у дзеючай арміі на 1-м Украінскім фронце. У 1946—1948 гг.— літсупрацоўнік газеты «Літаратура і мастацтва», з 1948 г.— рэдактар, загадчык рэдакцыі, намеснік галоўнага рэдактара выдавецтва «Беларусь», з 1972 г.— намеснік галоўнага рэдактара, у 1976—1982 гг.— загадчык рэдакцыі выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1947 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1979).

Памёр 8.6.1991 г.

Друкавацца пачаў у 1937 г. з вершаў. Аўтар зборнікаў аповесцей і апавяданняў «Землякі» (1949), «Насустрач» (1951), «Будзьце здаровы» (1955), «Пасля вяселля» (1958), «Месца ў жыцці» (1960), «Аповесці» (выбранае, 1968), «Блакітная мара» (1985), «Дарога пачыналася ў Бярозаўцы» (1990), кніг для дзяцей «Крылаты дзень» (1961), «Чорны снег» (1962), «Пісьмо да сябра» (1966), «На зімнім возеры» (1970), «Светлая раніца» (1988). У 1986 г. выйшаў зборнік вершаў «Вяртанне». У 1978 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах.

На беларускую мову пераклаў паэмы «Мцыры» і «Ізмаіл-бей» М. Лермантава, шэраг вершаў А. Пушкіна, М. Някрасава, У. Маякоўскага, сучасных рускіх, украінскіх, многіх паэтаў народаў СССР, кнігі прозы «Звычайную гісторыю» І. Ганчарова (1955), «З берагоў Мядзведзіцы» М. Прыляжаевай (1958), «Корцік» А. Рыбакова (1959), «Тронку» А. Ганчара (1974), «Ясеневыя прысады» Б. Саўліта (1975), трагедыю У. Шэкспіра «Макбет», асобныя творы англійскіх, французскіх, венгерскіх, сербскіх, славацкіх паэтаў. У 1983 г. выйшла кніга перакладаў «Пераклічка».

---

## *Міхась ШАХОВІЧ*



Міхась (Міхаіл Аляксеевіч) Шаховіч нарадзіўся 20.11.1953 г. у вёсцы Сакі Бельска-Падляшскага павета Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сялянскай сям'і.

Скончыў агульнаадукацыйны ліцэй з беларускай мовай навучання ў Бельску-Падляшскім (1972), у 1972 г. паступіў на аддзяленне беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. У 1975 г. перайшоў на завочнае навучанне (скончыў у 1977) і пачаў працаваць журналістам у беларускім штотыднёвіку «Ніва». З 1985 г.— адказны сакратар польскага грамадска-культурнага штомесячніка «Кантрасты». З 1990 г.— кіраўнік выдавецкай суполкі «Су-

межжа». Жыве ў Беластоку. Член Саюза польскіх пісьменнікаў з 1985 г.

Узнагароджаны Сярэбраным крыжам заслугі.

Дэбютаваў у 1974 г. на старонках «Нівы» вершам. Піша на беларускай мове. Аўтар зборнікаў паэзіі «Прамінанне» (1978), «Святая ноч» (паэма, з паралельным перакладам на польскую мову, 1979), «Напевы» (паэмы, 1987) і кнігі апавяданняў «Вада ў рэшаце» (1984).

Пад яго рэдакцыяй выйшаў том навуковых прац, прысвечаных польска-беларускім культурным узаемасувязям «Мост праз стагоддзі» (1980).

---

## *Васіль ШАШАЛЕВІЧ*



Васіль Антонавіч Шашалевіч нарадзіўся 9.1. 1897 г. у вёсцы Мхінічы Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і валаснога пісара.

Вучыўся ў духоўным вучылішчы, у духоўнай семінарыі ў Магілёве (1910—1914), у Яраслаўскім юрыдычным ліцэі (1915—1916). З прычыны матэрыяльных нястач ліцэй не скончыў. Настаўнічаў у вёсцы Ясенцы, у мястэчку Краснаполле на Магілёўшчыне, у Мінску (1917—1924). У другой палове 20-х гадоў працаваў сцэнарыстам на кінафабрыцы ў Ленінградзе. Пазней жыў у Мінску, займаўся творчай працай. У ліпені 1930 г. арыштаваны, у сакавіку 1931 г. выпушчаны на волю. У 1937 г. зноў арыштаваны органамі НКУС. Прыгавораны да 10 год зняволення. Пакаранне адбываў у Тамасінлагу, Унжлагу. Рэабілітаваны Прэзідыумам Вярхоўнага суда БССР 19.10.1955 г.

Загінуў 23.10.1941 г. у лагеры на лесапавале.

Сталую літаратурную працу пачаў у сярэдзіне 20-х гадоў з апавяданняў і драматычных твораў. Аўтар п'ес «Апраметная» (пастаўлена ў 1925), «Змрок» (пастаўлена ў 1927), «Воўчыя вочы» (1928—1929), «Рой» (1931), «Сімфонія гневу» (пастаўлена ў 1935).

## *Алесь ШАШКОЎ*



Алесь (Аляксандр Андрэевіч) Шашкоў нарадзіўся 3.1.1923 г. у вёсцы Раманаўшчына Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Па заканчэнні сярэдняй школы (1941) пайшоў у Савецкую Армію. Удзельнічаў у баях на Заходнім, 1-м Прыбалтыйскім і 2-м Беларускіх франтах. Двойчы паранены. Пасля дэмабілізацыі (1947) — адказны сакратар чашніцкай раённай газеты «Сцяг сацыялізма». У 1950 г. скончыў Рэспубліканскую партыйную школу пры ЦК КПБ, працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда». У 1951 г. зноў быў прызваны ў Савецкую Армію, служыў карэспандэнтам армейскай газеты «Сталінскі воін» да 1953 г. У 1953—1954 гг.— загадчык аддзела літаратуры і мастацтва газеты «Звязда», з 1954 г.— рэдактар аддзела часопіса «Калгаснік Беларусі». Скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве (1959), завочна — Літаратурны інстытут імя М. Горкага (1961). Працаваў адказным сакратаром рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», старшым рэдактарам на Беларускім радыё, галоўным рэдактарам у Міністэрстве культуры БССР, загадчыкам рэдакцыі выдавецтва «Народная асвета» (да 1965). Член СП СССР з 1952 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Творчую працу пачаў у 1947 г. з нарысаў. Аўтар зборнікаў апавяданняў «Абуджэнне» (1955), «Ранняй вясной» (1957), «Сонца тушыць зоркі» (1959), раманаў «Навальніца спее ў цішыні» (1969) і «Спытай сваё сэрца» (1972). У 1983 г. выйшла кніга прозы «Спытай сваё сэрца. Навальніца спее ў цішыні». Выдаў кнігі прозы для дзяцей «Змена» (1951), «Белы камень» (1953), «На рачных плёсах» (1956), «Лань — рака лясная» (1960, 1979), «На вадзе і такое здараецца» (1966).

## *Віктар ШВЕД*



Віктар Мікітавіч Швед нарадзіўся 23.3.1925 г. у вёсцы Мора Гайнаўскага павета Беластоцкага ваяводства (Польшча) у сялянскай сям'і.

У 1944—1945 гг. вучыўся ў Гайнаўскай беларускай гімназіі, у 1946 г. скончыў беларускі ліцэй у Бельску-Падляшскім. У 1951 г. скончыў Акадэмію палітычных навук у Варшаве, у 1955 г.— аддзяленне журналістыкі, а ў 1969 г.— аддзяленне беларускай філалогіі Варшаўскага універсітэта. З 1948 да 1957 г. працаваў рэдактарам у Інстытуце грамадскіх навук у Варшаве. У 1957 г. быў публіцыстам газеты «Ніва» (Беласток). З 1958 да 1960 г. працаваў сакратаром Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства ў Беластоку. З 1960 да 1988 г.— старшы рэдактар у выдавецтве «Ксёнжка і ведза» ў Варшаве. З 1988 г. жыве ў Беластоку. Член Саюза польскіх пісьменнікаў з 1977 г. Выбіраўся старшынёй Беларускага літаратурнага аб'яднання «Белавежа», з 1988 г.— намеснік старшыні гэтага аб'яднання.

Узнагароджаны ордэнамі Кавалерскі Крыж ордэна Адраджэння Польшчы, Залатым Крыжам заслугі і Сярэбраным Крыжам заслугі.

Заслужаны дзеяч культуры Польшчы (1971).

Дэбютаваў у друку ў 1957 г. вершам («Ніва», Беласток). Аўтар зборнікаў паэзіі «Жыццёвыя сцежкі» (Беласток, 1967), «Дзяцінства прыстань» (Беласток, 1975), «Дружба» (для дзяцей, Мінск, 1976), «Мая зялёная Зубровія» (Мінск, 1990). Цыкл вершаў для дзяцей змешчаны ў падручніку для беларускіх дапаўняльных школ «Чытанка» (Нью-Йорк, 1968). Дзіцячыя вершы змешчаны таксама ў падручніках для пачатковых беларускіх школ у Польшчы. Сааўтар (з А. Баршчэўскім) падручнікаў для 8 класа пачатковых беларускіх школ «Дружба і праца» (Варшава, 1967) і «Насустрач жыццю» (Варшава, 1974).

## *Генадзь* ШВЕДЗІК



Генадзь Барысавіч Шведзік нарадзіўся 4.3. 1914 г. у горадзе Бабруйску ў сям'і служачага.

Працаваў на новабудоўлях Бірабіджана. У 1929 г. прыехаў у Мінск і паступіў на рабфак. Скончыў літаратурны факультэт Мінскага педагагічнага інстытута (1937). Адначасова працаваў у газеце «Юнгер арбайтэр» («Малады рабочы»), потым загадчыкам аддзела ў газеце «Піянер Беларусі». У 1938—1940 гг. выкладаў рускую мову і літаратуру ў сярэдняй школе ў Мінску, пасля — навуковы супрацоўнік Інстытута мовы і літаратуры АН БССР. У час Вялікай Айчыннай вайны служыў у Савецкай Арміі, быў кулямётчыкам.

Загінуў 11.10.1942 г. пад Бранскам.

Упершыню выступіў у друку з вершамі ў 1929 г. Пісаў на мове ідыш. Выдаў зборнікі паэзіі «Старт» (1934), паэму для дзяцей «Наш Джым» (1935) і зборнік «Вершы» (1939). У 1962 г. у перакладзе на беларускую мову апублікаваны зборнік «Лірыка», у 1989 г.— кніга вершаў і лістоў «Матчына сляза».

## *Рыгор* ШКРАБА



Рыгор Васільевіч Шкраба нарадзіўся 17.3.1919 г. у вёсцы Краснадворцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Старобінскай дзесяцігодкі ў 1939 г. паступіў на беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваўся ў Свярдлоўск. Там паступіў на трэці курс педінстытута. Цяжкія матэрыяльныя ўмовы вымусілі кінуць вучобу. Працаваў выкладчыкам рускай мовы і літаратуры ў Слабода-Турынскай сярэдняй школе Свярдлоўскай вобласці. У 1944 г. аднавіў вучобу ва універсітэце (скончыў у 1946). Заняткі спалучаў з працай — быў літаратурным кансультантам у рэдакцыі газеты «Звязда». З 1946 па 1957 гг. быў літсупрацоўнікам, выконваючым абавязкі адказ-

нага сакратара, загадчыкам аддзела літаратуры ў газеце «Літаратура і мастацтва». З 1957 г.— у рэдакцыі часопіса «Полымя», працаваў літсупрацоўнікам аддзела крытыкі і літаратуразнаўства, з 1959 па 1979 гг.— рэдактар гэтага аддзела. Член СП СССР з 1948 г.

Узнагароджаны медалём.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1978).

Першыя рэцэнзіі і артыкулы надрукаваў у 1940 г. (часопіс «Савецкая школа», рэспубліканскія газеты). Стала з літаратуразнаўчымі і крытычнымі працамі выступае з 1945 г. Выдаў кнігі літаратурна-крытычных артыкулаў «Сіла слова» (1958), «Характар, стыль, дэталь» (1965), «Літаратура і мова» (1969), «Энергія слова» (1988). Выходзілі выбраныя творы: «Скарбы» (1973) і «Моваю вобразаў» (1989). У сааўтарстве з І. Шкраба выдаў тлумачальны слоўнік беларускіх прыказак і прымавак «Крынічнае слова» (1987).

Выступае ў друку па праблемах выкладання беларускай літаратуры ў школе. Напісаў падручнікі «Беларуская савецкая літаратура» для 10 класа (да 1990 г.— 14 выданняў) і «Беларуская савецкая літаратура» для 11 класа (да 1989 г.— 12 выданняў). На рэспубліканскім конкурсе ў 1972 г. за падручнік па беларускай літаратуры аўтару прысуджана першая прэмія. Сааўтар хрэстаматыі «Родная літаратура» для 5 класа (да 1990 г.— 8 выданняў).

Лаўрэат Літаратурнай прэміі СП БССР імя Івана Мележа (1989) за кнігу «Энергія слова».

---

## *Алесь ШЛЕГ*



Алесь (Аляксандр Карпавіч) Шлег нарадзіўся 15.10.1936 г. у вёсцы Вялікі Бор Хойніцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў рамеснае вучылішча № 13 у Навагрудку (1953). Працаваў слесарам, электразваршчыкам трэста «Альмецьеўнафтабуд» (Альмецьеўск, 1953), пазней — у гандлёвым флоце качагарам, машыністам (Рыга, Мурманск, Адэса, 1953—1954). Служыў на Балтыйскім ваенна-марскім флоце (Калінінград, 1954—1958).

Пасля дэмабілізацыі працаваў у ляхавіцкай раённай газеце «Савецкі патрыёт» (1958—1959). Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1965). З 1960 г. адначасова з вучобай ва універсітэце — карэспандэнт газеты «Звязда», затым рэдактар выдавецтва «Беларусь», у 1975—1977 гг.— «Мастацкай літаратуры», карэспандэнт газет «Літаратура і мастацтва» (1977—1978), «Чырвоная змена» (1978—1979), старшы рэдактар Рэспубліканскага праўлення таварыства кнігалюбаў. З 1985 г.— рэдактар, з 1988 г.— старшы рэдактар Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання і радыё. Член СП СССР з 1987 г.

З першай публікацыяй выступіў у 1954 г. (газета Балтыйскага ваеннага флоту «Страж Балтики»), у друку Беларусі — з 1959 г. (часопіс «Маладосць»). Аўтар зборнікаў апавяданняў і аповесцей «Трывожная памяць» (1968), «Цыганок» (1971), «Праўда адна» (1974), «Жыло чаканне болю» (1979), «Хлеб на далонях тваіх» (публіцыстыка, 1986).

Напісаў кінасцэнарыі дакументальных фільмаў «Балтыйцы», «Палескі Марэсьеў», «Мой дом у бядзе», «Ядвіга Іосіфаўна», радыёспектакляў «Цыганок» — (пастаўлены ў 1980), «Рэха баравое» (пастаўлены ў 1990).

---

## *Віктар ШНІП*



Віктар Анатольевіч Шніп нарадзіўся 26.3. 1960 г. у вёсцы Пугачы Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Мінскі архітэктурна-будаўнічы тэхнікум (1978). Працаваў цесляром на будоўлях Мінска, літкансультантам у часопісе «Неман» і газеце «Вячэрні Мінск». У 1987 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве, працуе старшым рэдактарам аддзела культуры ў часопісе «Беларусь». Член СП СССР з 1984 г.

Першыя вершы былі надрукаваны ў 1977 г. (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў паэзіі «Гронка святла» (1983), «Пошук радасці» (1987), «Шляхам ветру» (1990), «Горад Утопія» (1990).

Лаўрэат прэміі імя Уладзіміра Маякоўскага Савета Міністраў Грузіі (1987) за зборнік «Гронка святла».

---

## *Павел ШРУБ*



Павел Міхайлавіч Шруб нарадзіўся 20.2.1955 г. у вёсцы Хільчыцы Жыткавіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў фізічны факультэт Ленінградскага універсітэта (1977). Працаваў старшым інжынерам кафедры фізікі Наваполацкага політэхнічнага інстытута (1977—1979). Служыў у Савецкай Арміі (1981—1983). З 1983 г.— выкладчык-метадыст Мінскай спецыяльнай сярэдняй школы міліцыі. Скончыў завочна Мінскую вышэйшую школу Міністэрства ўнутраных спраў СССР (1987). Член СП СССР з 1988 г.

У рэспубліканскіх выданнях друкуецца з 1979 г. Аўтар зборніка вершаў «Лабараторыя» (1987).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1988) за зборнік вершаў «Лабараторыя».

---

## *Паўлюк ШУКАЙЛА*



Паўлюк (Павел Захаравіч) Шукайла нарадзіўся у 1904 г. у вёсцы Малая Лапеніца Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці.

Удзельнік падпольнага рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. У канцы 1924 або на пачатку 1925 г. перайшоў цераз граніцу ў БССР. У 1925 г. апынуўся ў Слуцку, дзе арганізаваў філію «Маладняка», быў рэдактарам акруговай газеты. Потым пераехаў у Расоны, працаваў сакратаром райкома партыі, адначасова быў старшынёй Нацыянальнай камісіі пры акруговым камітэце партыі і выканкоме па праверцы ходу беларусізацыі ў раёне. У 1926 г. паступіў вучыцца на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Увосень 1927 г. арганізаваў у Мінску аб'яднанне «Беларуская літа-

ратурна-мастацкая камуна» (існавала да вясны 1928). У 1928 г. адкамандзіраваны на вучобу ў Камуністычную акадэмію (Масква), скончыў там так званы факультэт «чырвонай прафесуры» (1930). Працаваў загадчыкам кафедры метадалогіі мастацтва ў Інстытуце кінематаграфіі. Да 1931 г. кіраваў Беларускай секцыяй Маскоўскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў. Быў рэдактарам маскоўскай газеты «Кино», дырэктарам Цэнтральнага тэхнікума тэатральнага мастацтва. З 1932 г.— віцэ-прэзідэнт Дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (Ленінград). З 1936 г. зноў у Маскве, працаваў паводле ўмовы з фабрыкай «Межрабпомфильм» пісьменнікам-сцэнарыстам. 1.11.1938 г. арыштаваны ў Маскве. 13.4.1939 г. Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР прыгавораны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны Ваеннай калегіяй Вярхоўнага суда СССР 14.4.1959 г. Прафесар.

Расстраляны 14.4.1939 г.

У беларускім друку выступаў з 1925 г. Аўтар кнігі паэзіі «Акрываўленая зямля» (1930), шэрагу літаратурна-крытычных артыкулаў.

---

## *Міхаіл ШУМАЎ*



Міхаіл Шумаў (Міхаіл Іосіфавіч Шульман) нарадзіўся 17.10.1923 г. у горадзе Магілёве ў сям'і служачых.

У 1940 г. паступіў на літаратурны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. У складзе камсамольскага знішчальнага батальёна прымаў удзел у абароне Магілёва ў 1941 г. Удзельнічаў у баях на Паўднёва-Заходнім і Заходнім франтах. Пасля цяжкага ранення (1943) дэмабілізаваны. У 1944—1945 гг. працаваў мантажнікам і кантрольным майстрам на заводзе «Кінап» у Самаркандзе. У 1945 г. вярнуўся ў Магілёў, завочна працягваў вучобу ў педінстытуце (скончыў у 1949). З 1946 г.— мантажнік на Мінскім радыёзаводзе, з 1947 г.— завуч Магілёўскага абласнога Дома піянераў, з 1948 г.— выкладчык культасветвучылішча, у 1950—1979 гг.— выкладчык рускай і беларускай мовы і літаратуры ў сярэдніх школах Магілёва. Член СП СССР з 1967 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, медалямі.

Літаратурную працу пачаў у 1959 г. Першую аповесць надрукаваў у 1960 г. (часопіс «Неман»). Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар аповесцей «Жизнь зовет» (1962), «Печеные яблоки» (1963), «Придет и твое время» (1980), «Хроника улицы Грушевой» (1982), «Вечный шах» (1986), «Повести» (1983), «Аккорды древних тревог» (выбранае, 1984). Зрабіў літаратурны запіс успамінаў партызан З. Хаўранковай «Шесть сестер» (1971), Н. Храпко, Ф. Папова «По зову сердца» (1982).

---

## *Генадзь ШУПЕНЬКА*



Генадзь Серафімавіч Шупенька нарадзіўся 6.4. 1936 г. у вёсцы Падбярэззе Мядзельскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1955 г. паступіў на аддзяленне беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У час вучобы цяжка захварэў, таму універсітэт скончыў толькі ў 1965 г. Вучыўся ў аспірантуры пры кафедры беларускай літаратуры універсітэта. У 1969—1979 гг.— старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчага Інстытута педагогікі Міністэрства асветы БССР, з 1979 г.— рэдактар, з 1982 г.— загадчык рэдакцыі серыйных выданняў выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1975 г.

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны.

Выступае ў друку з 1969 г. як крытык і літаратуразнавец. Выдаў кнігі крытычных нарысаў, літаратурных партрэтаў і артыкулаў «Цеплыня чалавечнасці» (1977), «Галоўнае — талент» (1987).

Пераклаў на беларускую мову кнігу «Мілы ба-пэр!..» Ц. Дзеры (1983), аповесць «Кат» П. Лагерквіста (1986), паасобныя апавяданні пісьменнікаў народаў СССР.

## *Гаўрыіл* ШУТЭНКА



Гаўрыіл Карнеевіч Шутэнка нарадзіўся 24.6. 1924 г. у сяле Арзгір Арзгірскага раёна Стаўрапольскага краю (Расія) у сялянскай сям'і.

У 1940 г. скончыў школу фабрычна-заводскага навучання пры швейнай фабрыцы імя В. Валадарскага ў Баку, працаваў рабочым. У 1942 г. прызваны ў Савецкую Армію. Быў разведчыкам, пасля цяжкага ранення на Паўночным Данцы (1943) — камісаваны. Працаваў старшынёй касы ўзаемадапамогі калгаса «Парыжская камуна» на Стаўрапольшчыне, ва ўстановах Таварыства сляпых — культработнікам, дырэктарам вучэбна-вытворчага прадпрыемства, інспектарам. Жыве з 1946 г. у Навагрудку. У 1964 г. скончыў паэтычныя курсы ў Маскве пры Інстытуце павышэння кваліфікацыі кіруючых работнікаў і спецыялістаў Усерасійскага таварыства сляпых. Член СП СССР з 1970 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

Першыя вершы апублікаваў у 1939 г. (газета «Стахановец» палітаддзела Мар'іна-Зольскай МТС Георгіеўскага раёна Стаўрапольскага краю). Піша на рускай мове. У друку Беларусі выступае з 1952 г. (газета «Гродненская правда»). Аўтар кніжак паэзіі «Мои глаза» (1961), «Память» (1969), «Жажда» (1974), «Солнце на десницах: Строки разных лет» (1984), «Горит костер воспоминаний» (1990), кніжкі для дзядзяцей «Наш котенок Димурлы» (1978).

## *Іван* ШУЦЬКО



Іван Цітавіч Шуцько нарадзіўся 20.12.1925 г. у вёсцы Гаць Крупскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Да вайны скончыў восем класаў у Крупках. Працаваў у Крупскім раённым камітэце радыёінфармацыі (1940—1941). У 1943 г. разам з аднавяскоўцамі вывезены фашыстамі ў канцэнтрацыйны лагер (пад Гданьск). У 1944 г. уцёк з лагера. У 1944—1946 гг. служыў у Савецкай Арміі. Працаваў брыгадзірам калгаса ў роднай

вёсцы. У 1958—1961 гг.— літсупрацоўнік крупскай раённай газеты «Голас калгасніка». У 1963 г. скончыў Вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. У 1963 г.— літсупрацоўнік, у 1964—1984 гг. працаваў фотакарэспандэнтам крупскай раённай газеты «Ленінскім курсам». Член СП СССР з 1954 г.

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 31.8.1984 г.

Друкавацца пачаў у 1940 г. Выдаў кніжкі для дзяцей «Мой мяч» (вершы, 1953), «Чужая хатка» (казкі, 1958), «Лепшая сяброўка» (вершы, 1959), «Дзедава рэліквія» (апавяданні, 1960), «Першае слова» (вершы, 1964), «Дзіма хоча быць героем» (апавяданні, 1965) і зборнік вершаваных баек, мініяцюр «Са свайго пункту гледжання» (1966).

---

## *Станіслаў* ШУШКЕВІЧ



Станіслаў Пятровіч Шушкевіч нарадзіўся 19.2. 1908 г. у вёсцы Бакінава Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і беззямельнага селяніна.

Вучыўся ў Беларускім педагагічным тэхнікуме ў Мінску (1926—1928). Працаваў у Дзяржаўнай бібліятэцы БССР, загадваў бібліятэкай навукова-даследчага Інстытута сельскай ілясной гаспадаркі імя У. І. Леніна (1928—1931). Быў членам літаратурных арганізацый «Маладняк», БелАПП. Скончыў крытыка-творчае аддзяленне літаратурнага факультэта Вышэйшага педагагічнага інстытута ў Мінску (1934). Працаваў у рэдакцыях газет «Літаратура і мастацтва», «Калгаснік Беларусі», «Звязда». 15.11.1936 г. быў арыштаваны, асуджаны да 8 год пазбаўлення волі. Знаходзіўся ў турме, лагеры, ссылцы. Працаваў шахцёрам, цесляром, бухгалтарам у лагеры МУС Кемераўскай вобласці, пасля вызвалення (1944) — вольнанаёмным бухгалтарам саўгаса. У 1946—1949 гг. настаўнічаў у Даніла-віцкай сярэдняй школе Дзяржынскага раёна. У 1949 г. арыштаваны паўторна і высланы на спецпасяленне ў Краснаярскі край, дзе працаваў лесарубам, у геалагічных партыях і экспедыцыях. У 1956—1958 гг.— супрацоўнік газеты

«Мінская праўда», у 1958—1970 гг.— загадчык аддзела газеты «Літаратура і мастацтва». Канчаткова па абедзвюх справах рэабілітаваны 26.9.1975 г. Член СП СССР з 1934 г.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1983).

Узнагароджаны медалямі.

Памёр 1.1.1991 г.

Друкаваўся з 1924 г. Аўтар зборнікаў паэзіі «Вершы» (1934), «Дарогаю вясны» (1959), «Услед за марамі» (1961), «Навальніца» (1966), «Сябрам» (1972), «Дарога ў залатую восень» (1983), «Рэха маладосці» (1984), «Сонца над маім асеннім садам» (1987), кнігі ўспамінаў «Вяртанне ў маладосць» (1968), зборніка сатыры і гумару «Грушы на вярбе» (1969), кніжак вершаў, апавяданняў і казак для дзяцей «Звярыны баль» (1936), «Лясная калыханка» (1958), «Сарочы церамок» (1959), «Мы на змену ідзём» (1961), «Гара Марата Казея» (1963), «Будзільнік» (1966), «Апавяданні пра Марата Казея» (1968, 1988), «Вясёлыя дзятлікі» (1970), «Колькі кіпцікаў у кошкі» (1972), «Дванаццаць пасланцоў» (1973), «Барадаты камар» (1977), «Красавік» (1977), «Ліса з магнітафонам» (1979), «Казачны церам» (1983), «Едзе страшная Яга» (1985), «Казёл на верталёце» (1987). У 1978 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2 тамах, у 1988 г.— «Выбранае».

---

## *Георгій ШЧАРБАТАЎ*



Георгій Міхайлавіч Шчарбатаў нарадзіўся 7.5. 1919 г. у вёсцы Рэкатка Горацкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Магілёўскае педагагічнае вучылішча (1938). Настаўнічаў у Бярэзінскім раёне, завочна вучыўся ў Магілёўскім педагагічным інстытуце. Працаваў у рэдакцыях газет «Камунар Магілёўшчыны» (1939—1940), «Советская Белоруссия» (1940—1941). На пачатку Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваўся ў Куйбышаў. У 1942 г. знаходзіўся ў тыле ворага як карэспандэнт газеты «Савецкая Беларусь», у 1943—1944 гг. працаваў у газеце «Звязда», якая выдавалася падпольна на акупаванай тэрыторыі. Па-

сля вайны працаваў у газеце «Звязда», карэспандэнтам газеты «Известия» па Беларускай ССР, загадчыкам аддзела, намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Маладосць». Член СП СССР з 1949 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і медалямі.

Памёр 2.2.1957 г.

Літаратурныя матэрыялы за подпісам Г. Шчарбатаў з'явіліся ў 1941 г. (магчыма, да гэтага выступаў пад псеўданімам). Аўтар запісак «Партызанскія агні» (1950), нарысаў «Камсамол Беларусі ў баях за Радзіму» (1950, 2-е дапоўненае выданне ў 1957), «Неспакойныя сэрцы» (1951), кніжак прозы «Шумелі пушчы» (1957), «Лясны фронт» (аповесць, апавяданні і нарысы, 1961), «Лясны фронт» (1970), «Партызанскія агні» (1979).

Пераклаў на беларускую мову «Слова перад пакараннем смерцю» Ю. Фучыка (1953).

---

## *Георгій ШЫЛОВІЧ*



Георгій Уладзіміравіч Шыловіч нарадзіўся 7.1. 1924 г. у горадзе Мінску ў сям'і служачага.

Да вайны скончыў першы курс Мінскага будаўнічага тэхнікума. Са снежня 1941 г. удзельнік Мінскага падполля, а з сакавіка 1943 г.— партызан у брыгадзе імя Жалезняка на Бягомльшчыне, з 1944 па 1945 гг. служыў у Савецкай Арміі. Скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1951). Працаваў у рэдакцыях газет «Мінская праўда» (1951—1953), «Зорька» (1953—1964). З 1965 г.— адказны сакратар, а ў 1978—1985 гг.— намеснік галоўнага рэдактара часопіса «Беларусь». Член СП СССР з 1961 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі.

Першыя апавяданні надрукаваў у 1948 г. Выйшлі кнігі нарысаў, апавяданняў і аповесцей для дзяцей «Твая дарога» (1957), «Запіска на шыбе» (1960), «Школа ля крэпасці» (1962), «Піянерская адвага» (1962), «Праз полымя вайны» (1963), «Сшытак у чорнай вокладцы»

(1965), «Чарапаха без панцыра» (1966), «Святло далёкага Алькора» (1973). Напісаў аповесці «Туман ідзе па следу» (часопіс «Беларусь», 1963—1964), «Сустрэча з сонейкам, альбо Аповесць пра Пецьку-флібусцьера і некаторых яго сяброў» (1981), «Падарожжа сярод лета» (1983). У 1986 г. выдадзены аднатомнік выбраных твораў «Школа каля крэпасці».

Аўтар сцэнарыяў дакументальных фільмаў «Родныя бярозы не спяць» (1965), «Зялёны патруль» (1966), «Трэба марыць» (1967).

Перакладае з рускай і ўкраінскай моў.

---

## *Віктар ШЫМУК*



Віктар (Вікенцій Мікалаевіч) Шымук нарадзіўся 2.4.1933 г. у вёсцы Змяёўцы Дзятлаўскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння васьмі класаў працаваў адказным сакратаром дзятлаўскай раённай газеты «За новую вёску» (1949—1951). Адначасова вучыўся ў вячэрняй сярэдняй школе. У 1951 г. паступіў на аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (скончыў завочна ў 1957). Адначасова працаваў у рэдакцыі газеты «Калгасная праўда», потым — літсупрацоўнікам рэдакцыі газеты «Звязда» (1967—1971), адказным сакратаром штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва» (1974—1977). З 1977 г.— намеснік галоўнага рэдактара Галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання на Беларускім радыё. Член СП СССР з 1964 г.

Літаратурную працу пачаў у 1949 г. Для дзяцей напісаў паэму «Каля Броннай гары» (1960), зборнікі вершаў «Мы вясне дапамагалі» (1962), «Дочкі сіняга Нёмана» (1964), «Марылі пра шчасце хлапчукі» (паэмы, 1981). Аўтар зборнікаў вершаў «Свіцязянскія хвалі» (1968), «Світанне» (1972), «Святло красавіцкіх бяроз» (1983), «Спелы жнівень» (1990), сатырычных вершаў «Ад хаты да хаты» (1983).

Выдаў кнігі нарысаў «Добрай раніцы, поле» (1964), «Сын каваля» (1970), «Коля Гойшык» (1971), «Леў Даватар» (1973), «Пасля працы рупнай» (1974), «Дыханнем ліпеньскім сагрэ-

тыя» (з Л. Смілавіцкім, 1971), «Рэха Аўроры» (1979) і зборнік апавяданняў «Помняць пушчы і паляны» (1969).

На шэраг вершаў напісаны песні.

---

*Хвядос* ШЫНКЛЕР



Хвядос Сяргеевіч Шынклер нарадзіўся 22.9. 1903 г. на станцыі Ізяслаўль (цяпер Беларусь) Мінскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і чыгуначніка.

Вучыўся ў Мінскім рэальным вучылішчы (1914—1920). З 1919 г. працаваў на чыгунцы тэлеграфістам, пасля — бібліятэкарам, загадчыкам клуба ў Рудзенску. Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У 1929—1931 гг.— супрацоўнік бабруйскай газеты «Камуніст», са снежня 1931 г.— сакратар рэдакцыі раённай транспартнай газеты «Ударнік» (Жлобін). У 1935—1941 гг. працаваў у газеце «Літаратура і мастацтва» і часопісе «Полымя». На пачатку Вялікай Айчыннай вайны эвакуіраваўся ў Свярдлоўск. У 1942 г. пайшоў добраахвотнікам у Савецкую Армію. Чатыры месяцы вучыўся ў вайсковым вучылішчы ў г. Кыштым Чалябінскай вобласці.

Загінуў 25.10.1942 г. на фронце пад Сталінградам.

Пісаць пачаў у 1922 г. (допісы ў газеты). Першае апавяданне надрукаваў у 1928 г. Асобнымі выданнямі выйшлі апавяданне «Ічэ» (1929), зборнік апавяданняў «Стрэлачнік Мігай» (1930), апавяданне «Блок» (1933), аповесці «Сонца пад шпалы» (1933), «Запіскі інструктара Томана» (1934), «Пульс жыцця» (1950, выходзіла на рускай мове ў 1942 г. у Маскве). Аўтар аповесці для дзяцей «Петрык-завадатар» (1935). У 1960 г. выйшлі Выбраныя творы, у 1984 г.— кніга апавяданняў, аповесцей, успамінаў «Апошні рэйс».

Напісаў п'есу «Пачэсны рэйс» (апублікавана ў 1939), кінасцэнарый «Шчаслівы шлях» (з Ю. Рудзько, 1940). Выступаў з рэцэнзіямі, артыкуламі, нарысамі.

## *Васіль ШЫРКО*



Васіль Аляксандравіч Шырко нарадзіўся 31.8. 1948 г. у вёсцы Чурылава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1972). Служыў у Савецкай Арміі (1972—1973). У 1973—1978 гг. працаваў карэспандэнтам «Сельской газеты», у 1973—1986 гг.— рэдактар, загадчык аддзела галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычных праграм Беларускага тэлебачання. З 1986 г.— рэдактар аддзела нарыса часопіса «Полымя». Член СП СССР з 1990 г.

Першыя падборкі вершаў надрукаваў у 1968 г. (часопіс «Маладосць», газета «Чырвоная змена»). Выйшлі кнігі «Зямлі бацькоўскай прыцягненне» (нарысы, 1987), «Сцяжына да людзей» (дакументальныя аповесці, нарысы, 1989). У 1990 г. выйшла кніга казак «Дзед Манюкін не салжэ». Аўтар інсцэніровак паводле твораў М. Гарэцкага, Н. Гілевіча (1987), сцэнарыя дакументальнага фільма «Песня пшанічнага поля» (1984).

## *Рыгор ШЫРМА*



Рыгор Раманавіч Шырма нарадзіўся 20.1.1892 г. у вёсцы Шакуны Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў двухгадовыя настаўніцкія курсы ў Свянцянах (1912), працаваў у Ганускай пачатковай двухгадовай школе Свянцянскага павета. У 1918 г. скончыў Седлецкі настаўніцкі інстытут (Польшча), які на той час быў эвакуіраваны спачатку ў Маскву і Яраслаўль, а потым у Варонеж. Пасля працаваў у школе сяла Навагольскае Варонежскай вобласці. У чэрвені 1922 г. вярнуўся на радзіму. З 1926 г.— настаўнік Віленскай беларускай гімназіі. Быў сакратаром Галоўнай управы культурна-асветніцкай арганізацыі рэвалюцыйна-дэмакратычнага характару Заходняй Беларусі — Таварыства беларускай школы (1928—1937), адным з выдаўцоў часопіса

«Беларускі летапіс». Спрыяў творчаму станаўленню маладых заходнебеларускіх рэвалюцыйных паэтаў. Выдаў першыя зборнікі М. Васілька, М. Танка, пазней — С. Крыўца. За рэвалюцыйна-прапагандысцкую і культурна-асветніцкую дзейнасць быў двойчы зняволены буржуазнымі ўладамі Польшчы, сядзеў у вядомай турме «Лукішкі».

Збіральнік і прапагандыст беларускай народнай песні, у 1924 г. арганізаваў у Пружанах беларускі народны хор. У 1926 г.— хор у Беларускай гімназіі, у 1931 г.— Вялікі беларускі хор пры Беларускім студэнцкім саюзе ў Вільні. У 1940 г. на аснове хароў, якімі кіраваў Р. Шырма, быў створаны Беларускі дзяржаўны ансамбль песні і танца, у 1955 г. перайменаваны ў Дзяржаўную акадэмічную харавую капэлу Беларускай ССР. Узначальваў капэлу да 1970 г. У 1966—1978 гг.— старшыня праўлення Саюза кампазітараў БССР, сакратар праўлення Саюза кампазітараў СССР. Выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР (1955—1978). Член СП СССР з 1966 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знак Пашаны», балгарскім ордэнам Кірыла і Мяфодзія II ступені, медалямі.

Народны артыст БССР (1949).

Народны артыст СССР (1955).

Герой Сацыялістычнай Працы (1977).

Памёр 23.3.1978 г.

Друкавацца пачаў у 1925 г. Першыя зборы народнага меласу выдаў у Вільні: «Беларускія народныя песні» (1929), «Наша песня» (1938). У пасляваенныя гады надрукаваны «Беларускія народныя песні, загадкі, прыказкі» (1947), «Беларускія народныя песні» (т. 1, 1959; т. 2, 1960; т. 3, 1962; т. 4, 1976), «Беларускія народныя песні (для хору)» (т. 1, 1971; т. 2, 1973). Аўтар зборніка публіцыстычных, літаратуразнаўчых і музыказнаўчых артыкулаў «Песня — душа народа» (1976).

Лаўрэат Дзяржаўных прэмій БССР (1966) за канцэртна-выканаўчую дзейнасць і (1974) за «Беларускія народныя песні для хору».

## *Лявон* ШЫРЫН



Лявон (Леанід Іванавіч) Шырын нарадзіўся 1.1.1930 г. у вёсцы Працавічы Слуцкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся завочна ў Слуцкім, затым у Мінскім педагагічным вучылішчы імя Н. К. Крупскай (скончыў у 1954). У 1951—1957 гг. выкладаў маляванне, чарчэнне, замежную мову, беларускую мову і літаратуру ў школах Любанскага раёна (в. Таль, Асавец, п. Барыкоў, г. Любань). Завочна скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1962). З 1957 г.— загадчык аддзела рэдакцыі старобінскай раённай газеты «Савецкі патрыёт». З 1958 г.— загадчык Старобінскага раённага педкабінета, з 1960 г.— дырэктар Жабінскай васьмігадовай школы, з 1962 г.— загадчык аддзела народнай асветы Старобінскага райсавета, з 1963 г.— дырэктар Жабінскай сярэдняй школы. У 1968—1982 гг.— намеснік дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце Салігорскай завочнай сярэдняй школы. З красавіка 1982 г.— дырэктар Мяцявіцкай сярэдняй школы Салігорскага раёна. У 1982—1989 гг.— дырэктар Гоцкага вучэбна-вытворчага камбіната Салігорскага раёна. Член СП СССР з 1986 г.

Узнагароджаны медалём.

Першы верш надрукаваны ў 1956 г. (любанская раённая газета «Кліч Радзімы»). У абласным і рэспубліканскім друку выступае з 1974 г. Аўтар зборнікаў вершаў для дзяцей «Мы дзеці шахцёраў» (кніжка-маляванка, 1978), «Песні ручая» (1980), «Ясь, жалейка і вясна» (1989).

*Уладзімір* ШЫЦІК



Уладзімір Мікалаевіч Шыцік нарадзіўся 31.8. 1922 г. у горадзе Шклове Магілёўскай вобласці ў сям'і рабочага.

Вучыўся ў Маскоўскім электратэхнічным інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту (1940—1943), у Куйбышаўскім індустрыяльным інстытуце. У снежні 1944 г. вярнуўся ў Шклоў і працаваў тэхнікам-канструктарам на папяровай фабрыцы «Спартак». У 1949 г. скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1949—1952 гг. працаваў у рэдакцыі газеты «Сталинская молодежь», у 1953—1964 гг.— у рэдакцыі газеты «Калгасная праўда» (у 1962—1990 гг.— «Сельская газета»), у 1965—1966 гг.— адказным сакратаром газеты «Літаратура і мастацтва», у 1978—1983 гг.— карэспандэнтам «Сельскай газеты». Член СП СССР з 1962 г.

Узнагароджаны медалём.

Першае апавяданне апублікаваў у 1952 г. (газета «Сталинская молодежь»). У 1958 г. у часопісе «Полымя» надрукаваў аповесць «Назаўсёды». Аўтар аповесцей «Сосны адшумелі сваё» (1960), «Апошняя арбіта» (1962), «Майская раніца» (1963), зборнікаў фантастычных апавяданняў і аповесцей «Зорны камень» (1967), «Парсекі за кармой» (1970), «У час не вярнуліся» (1975), «Масткі над абрывам» (1977), кніг фантастыкі і дэтэктываў «Другая версія» (1979), «Трансплутонавыя афеліі» (1982), «Левы рэйс» (1983), «Ускосныя доказы» (1985), «Камандзіроўка ў сваім горадзе» (1989), «Падстаўка» (1990), апавядання для дзяцей «Як малако на стол прыйшло» (1979).

*Міхась ШЭЛЕХАЎ*



Міхась (Міхаіл Міхайлавіч) Шэлехаў нарадзіўся 1.11.1954 г. у вёсцы Плотніца Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і служачых.

Скончыў факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1976) і Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў пры Дзяржкіно СССР (1984). У 1976—1980 гг.— літсупрацоўнік часопіса «Рабочая смена», у 1980—1982 гг.— рэдактар студыі дакументальных фільмаў «Летапіс» кінастудыі «Беларусьфільм», у 1984—1987 гг. працаваў паводле ўмовы на кінастудыі «Саюзмультфільм» студыі імя М. Горкага (Масква), у 1987—1988 гг. быў рэдактарам тэлефільма Дзяржтэлерадыё БССР. З 1988 г.— галоўны рэдактар студыі мастацкіх фільмаў «Кадр» кінастудыі «Беларусьфільм». Член СП СССР з 1988 г.

Выступае ў друку з 1968 г. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар зборнікаў паэзіі «Слово ненастное, слово лазурное» (Масква, 1987) і «Сын яблыні» (1990).

Напісаў сцэнарыі мастацкіх фільмаў «Сын чайкі» (1987), «Мост» (паводле аповесці «Круглянскі мост» В. Быкава, пастаўлены ў 1988), «Люк» (пастаўлены ў 1988), «Метэарыт» (пастаўлены ў 1988), шэрагу мультыплікацыйных фільмаў.

*Карлас ШЭРМАН*



Карлас Рыгоравіч Шэрман нарадзіўся 25.10. 1934 г. у горадзе Монтэвідэо (Уругвай) у сям'і рабочага — выхадца з Заходняй Беларусі.

Вучыўся ў Нацыянальным інстытуце імя М. Марэна (Буэнас-Айрэс, Аргенціна, 1951—1956) па спецыяльнасці філалогія. Працаваў у аргенцінскіх газетах. У 1956 г. прыехаў на Беларусь. У 1964—1980 гг.— загадчык рэдакцыйна-выдавецкага сектара Фундаментальнай бібліятэкі імя Якуба Коласа АН БССР. З 1989 г.— віцэ-прэзідэнт Беларускага ПЭН-цэнтра. Член СП СССР з 1979 г.

Пачаў друкавацца ў 1952 г. у аргенцінскім перыядычным друку, у рускай перыёдыцы Беларусі — з 1964, на беларускай мове — з 1975 г. З іспанскай мовы на рускую пераклаў раман М. Сапата Алівелы «Чорны загон» (часопіс «Неман», 1967), раман Г. Гарсія Маркеса «Восень патрыярха» (з В. Тарасам, Масква, 1978), на беларускую мову пераклаў паасобныя творы Н. Гільена, Г. Гарсія Маркеса, Ф. Піта Радрыгеса, О. Фернандэса, У. Дзітаранта, С. Ібаргоена, К. Кастэльотэ, Э. Кардэналя, Д. Алонса і інш., а таксама выбраную лірыку А. Тэхада Гомеса (1987). У перакладзе з беларускай на іспанскую выйшлі «Мая Бесядзь» А. Куляшова, «Конь і леў» М. Танка, «Чырвоны мак» В. Хомчанкі, народныя казкі ў апрацоўцы А. Якімовіча (усе ў 1976), «Шлюбная ноч» І. Шамякіна (1980), «Дажыць да світання» (1980), «Абеліск» (1984) і «У тумане» (1989) В. Быкава, выбранае Я. Купалы і Я. Коласа «Папараць-кветка» (1982), выбранае Р. Барадуліна «Чорны вол маёй трывогі» (1985), «Плач перапёлкі» І. Чыгрынава (1988), «Загад № 1» М. Чаргінца (1990).

Аўтар кніг паэзіі «Дождж у Каралішчавічах» (на іспанскай мове, у перакладзе на беларускую Р. Барадуліна, 1984) і «Сны (у перакладзе з іспанскай Р. Барадуліна і В. Сёмухі, 1989).

Склаў зборнікі выбранай лірыкі Ф. Гарсія Лоркі (1975), П. Нэруды (1976), Н. Гільена (1977), Габрыэлы Містраль (1984), а таксама анталогію сучаснай кубінскай паэзіі «Тытунёвая кветка» (1986).

# Ю



## *Міхась ЮДЭЛЕВІЧ*

Міхась Львовіч Юдэлевіч нарадзіўся 20.4.1914 г. у гарадскім пасёлку Смалявічы Мінскай вобласці ў сям'і саматужніка.

Пасля заканчэння сярэдняй школы ў Мінску (1929) працаваў рабочым на гуце. Быў акцёрам у Мінскім тэатры рабочай моладзі (1929—1931), студэнтам Дзяржаўнага інстытута мастацтва ў Маскве (1931—1935). У 1935—1940 гг.— супрацоўнік рэдакцыі газеты «Літаратура і мастацтва», загадчык аддзела тэатра Упраўлення па справах мастацтва пры Саўнаркоме БССР. З 1940 г. у Савецкай Арміі, удзельнічаў у савецка-фінляндскай і ў Вялікай Айчыннай войнах.

Загінуў у 1941 г. на фронце.

Літаратурную працу пачаў у 1929 г.

Адзін з аўтараў калектыўнай п'есы «Першы штандар» (апублікавана і пастаўлена ў 1930). У 1932 г. напісаў п'есу «Зямля гарыць», якая ставілася на радыё. Аўтар інсцэніроўкі «Як гартавалася сталь» паводле аднайменнага рамана М. Астроўскага (1937), лібрэта оперы «Паўка Карчагін» (музыка П. Падкавырава, ставілася пасля вайны ў кансерваторыі як студэнцкі спектакль). Перакладаў на рускую мову асобныя творы беларускай драматургіі, у тым ліку п'есу І. Гурскага «Сваты» (1937), склаў зборнік «Аднаактовыя п'есы» для самадзейнай сцэны (1937).

Пісаў вершы, прыпеўкі, якія змяшчаліся ў перыядычным друку.

## *Арон* ЮДЭЛЬСОН



Арон Ісакавіч Юдэльсон нарадзіўся 17.7.1907 г. у горадзе Рызе (Латвія) у сям'і настаўніка.

Сярэднюю адукацыю атрымаў у Рызе. З 1928 г. жыў у Мінску. Працаваў у рэдакцыі яўрэйскай газеты «Акцябэр» («Кастрычнік»), на Беларускім радыё. З 1930 г. адначасова вучыўся на літаратурна-лінгвістычным аддзяленні педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта (скончыў тры курсы). У 1937 г. рэпрэсіраваны. Асуджаны да вышэйшай меры пакарання. Рэабілітаваны 9.4.1957 г.

Расстраляны 29.10.1937 г.

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1923 г. з выступленняў у нелегальным камуністычным друку Латвіі. Пісаў на мове ідыш. У 1929 г. апублікаваў паэму «Негарэлае» ў часопісе «Штэрн» («Зорка»). Выдаў паэму «Камбінат» (1931), кнігу вершаў «Граніца» (1934), зборнікі нарысаў «У нас у краіне» (1934), «Чырванасцяжны калгас «Колас» (з Х. Шынклерам, 1934). У перакладзе на беларускую мову выйшла кніжка паэзіі «Прывітанне» (1961).

Выступаў як перакладчык на мову ідыш.

## *Георгій* ЮРЧАНКА



Георгій Фёдаравіч Юрчанка нарадзіўся 31.1. 1928 г. у вёсцы Кудрычы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1951 г. скончыў Магілёўскі настаўніцкі інстытут. Выкладаў беларускую і рускую мову і літаратуру ў школах Дзятлаўскага і Воранаўскага раёнаў на Гродзеншчыне. У 1959 г. завочна скончыў філалагічны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута і паступіў у аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1961 г.— рэдактар, у 1962—1988 гг. загадчык рэдакцыі літаратуры, мовы і мастацтва, затым рэдакцыі філалогіі ў выдавецтве «Навука і тэхніка». Член СП СССР з 1975 г.

Узнагароджаны медалём.

Друкавацца пачаў з 1959 г. (воранаўская раённая газета «Путь социализма».) Выйшлі

кнігі літаратурных пародый і эпіграм «Распрэжаны Пегас» (1965), «Вярхом на вожыку» (1968), «Немеладычныя мелодыі» (1974), «Парнаскія ўхабы» (1979), «У натхнёнай пáграбеньцы» (1983), «Негабляваная пегасня» (1989), навукова-папулярная праца «На мсціслаўскай зямлі ўзгадаваны: Нарыс жыцця і навуковай дзейнасці П. П. Кабекі» (1986), дыялектныя слоўнікі «Дыялектны слоўнік: З гаворак Мсціслаўшчыны» (1966), «Народная сінанiміка» (1969), збор дыялектнай фразеалогіі Мсціслаўшчыны ў 3-х кнігах — «І коціцца і валіцца» (1972), «І сячэ і паліць» (1974), «Слова за слова» (1977), «Народнае вытворнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны» ў 3-х кнігах (1981, 1983, 1985), «Сучаснае народнае слова: З гаворкі Мсціслаўшчыны» (1988).

---

## *Уладзімір ЮРЭВІЧ*



Уладзімір Міхайлавіч Юрэвіч нарадзіўся 22.7. 1916 г. у вёсцы Дуброва Смалявіцкага раёна Мінскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

Скончыў Мінскі індустрыяльна-педагагічны тэхнікум (1934), будаўнічы факультэт Беларускага політэхнічнага інстытута (1941). Адначасова вучыўся завочна на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага універсітэта (1939—1941). У 1932—1947 гг. працаваў дыктарам Беларускага радыё (у гады Вялікай Айчыннай вайны — радыёстанцыя «Савецкая Беларусь», Масква). У пасляваенныя гады загадваў аддзелам літаратурна-драматычнага вяшчання Беларускага радыё (1948—1951), быў галоўным рэдактарам мастацкага радыёвяшчання (1952—1954). Працаваў уласным карэспандэнтам «Литературной газеты» па Беларускай ССР (1954—1959), адказным сакратаром часопіса «Маладосць» (1959—1970), дырэктарам Літаратурнага музея Янкі Купалы (1970—1972), палітычным аглядальнікам Беларускага тэлебачання (1972—1974), рэдактарам аддзела, членам рэдкалегіі часопіса «Коммунист Белоруссии» (1974—1979), літкансультантам СП БССР (1979—1985). З 1985 г.— адказны сакратар Камітэта па Дзяржаўных прэміях БССР. Член СП СССР з 1953 г.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені і медалямі.

Заслужаны работнік культуры Беларускай ССР (1976).

Літаратурную дзейнасць пачаў у 1942 г. з публіцыстычных і літаратуразнаўчых выступленняў на радыё. Друкуецца з 1949 г. Выйшлі кнігі літаратурнай крытыкі «Слова і вобраз» (1961), «Шматгалоссе жыцця» (1965), «Погляд» (1974), «Абрысы» (выбранае, 1976), «Янка Купала: Нарыс жыцця і творчасці» (1983), «Выбранае» (1987), брашура «Янка Купала — наш сучаснік» (1972).

Выдаў кніжкі апавяданняў для дзяцей «Тараскавы турботы» (1966), «Дзе начуе сонца» (1970), «Дожджык на колах» (1977), «Нястрашны страх» (1986), публіцыстычныя нарысы: «Першая неабходнасць» (1963), «Мінск. Учора, сёння, заўтра» (1982), «Синьоока сестра Украины» (Кіеў, 1985). У яго літаратурным запісе выйшла дакументальная аповесць М. Новікава «Пять шагов жизни» (1970).

На Беларускім радыё распачаў у 1963 г. штомесячную перадачу для школьнікаў — радыёклуб «Жывое слова», нязменным старшынёй якога з'яўляецца.

---

## *Янка ЮХНАВЕЦ*



Янка Змітравіч Юхнавец нарадзіўся 3.11.1921 г. у вёсцы Забродак Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

З прыходам на Беларусь немцаў быў арыштаваны СД, летам 1944 г. вывезены ў Германію. Атрымаў юрыдычную адукацыю ў Вольным універсітэце ў Мюнхене па спецыяльнасці заходнееўрапейскае права (1949). З 1949 г. жыве ў ЗША.

Вершы і прозу пачаў пісаць у эміграцыі (першыя творы надрукаваны ў эмігранцкіх часопісах «Шыпшына» і «Сакавік», 1948). Аўтар зборнікаў паэзіі «Шорах моўкнасці» (Нью-Йорк, 1955), «Новая Элэгія (Баварыя, 1964), «Калюмбы» (Нью-Йорк, 1967), кнігі выбранай паэзіі «Творы» (Нью-Йорк, 1989—1990).

# Я



## *Уладзімір ЯГОЎДЗІК*

Уладзімір Іванавіч Ягоўдзік (Ягаўдзік) нарадзіўся 14.2.1956 г. у вёсцы Кастровічы Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Вучыўся ў Дзятлаўскай, Слонімскай, Зэльвенскай школах-інтэрнатах, у 1978 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1978—1982 гг. працаваў карэспандэнтам Брэсцкай абласной газеты «Заря», рэдактарам Брэсцкай абласной студыі тэлебачання. З 1982 г. жыве ў Мінску. У 1982—1990 гг.— супрацоўнік штотыднёвіка «Літаратура і мастацтва», з 1990 г.— рэдактар газеты «Дзеці і мы». Член СП СССР з 1985 г.

Дэбютаваў у друку вершамі ў 1972 г. (газета «Гродненская правда»). Выдаў кнігі прозы «Стронга» (1984). «Вочы Начніцы» (бібліятэка часопіса «Маладосць», 1989), «Прыручэнне птушкі» (1989), зборнік казак «Сонейка, свяці!» (1988). Аўтар мастацкага альбома «Алена Кіш» (1990).

Напісаў для дзяцей п'есы, што ставіліся ў лялечных і драматычных тэатрах краіны, на Беларускім радыё і тэлебачанні, «Залатое зярнятка» (пастаўлена ў 1983), «Сонейка, свяці!» (надрукавана і пастаўлена ў 1985), «Пякла баба калачы» (з А. Шкілёнкам, пастаўлена ў 1987), «Сакрэты Вогніка» (пастаўлена ў 1987), «Усміхніся, прынцэса...» (надрукавана і пастаўлена ў 1990).

Выступае ў перыядычным друку як літаратурны крытык, а таксама з мастацтвазнаўчымі артыкуламі пра самадзейных і прафесійных мастакоў рэспублікі.

Пераклаў з рускай і ўкраінскай моў асобныя творы Л. Лявонава, В. Астаф'ева, Ю. Бондарава, М. Віграноўскага.

## *ЯДВІГІН Ш.*



Ядвігін Ш. (Антон Іванавіч Лявіцкі) нарадзіўся 4.1.1869 г. у былым маёнтку Добасна (цяпер у складзе вёскі Добасна) Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і ўпраўляючага маёнткам.

Вучыўся на медыцынскім факультэце Маскоўскага універсітэта, у 1890 г. за ўдзел у студэнцкіх хваляваннях быў арыштаваны і выключаны з універсітэта. Сядзеў у Бутырскай турме. Вярнуўся на Беларусь, працаваў памочнікам правізара ў Радашковічах, потым у краме-кааперацыі. Па стану здароўя пакінуў працу і пераехаў з сям'ёю ў бацькоўскі фальварак Карпілаўка, што пад Радашковічамі, дзе і правёў большую частку жыцця. У 1909—1910 гг. жыў у Вільні, працаваў некаторы час сакратаром, затым загадчыкам літаратурнага аддзела «Нашай нівы». У 1913 г.— у рэдакцыі газеты «Беларус». З лістапада 1913 г. да студзеня 1915 г.— тэхнічны рэдактар беларускага сельскагаспадарчага часопіса «Саха» і беларускага часопіса для дзяцей і моладзі «Лучынка» ў Мінску.

Памёр 24.2.1922 г. у Вільні.

Літаратурную дзейнасць пачаў у турме: пераклаў на беларускую мову апавяданне У. Гаршына «Сігнал» (выдадзена ў Маскве ў 1891). У 1892 г. напісаў камедыю «Злодзей» (пастаноўка забаронена паліцыяй, рукапіс загінуў). Першае апавяданне на беларускай мове «Суд» апублікаваў у 1906 г. (газета «Наша доля»). Аўтар зборнікаў апавяданняў «Бярозка» (Вільня, 1912, 1923), «Васількі» (Вільня, 1914), «Апавяданні» (1940, 1946), падарожнага нарыса «Дзед Завала» (Вільня, 1910), кнігі «Успаміны» (Вільня, 1921), няскончанага рамана «Золата», шэрагу рэцэнзій і літаратурна-крытычных артыкулаў. У 1976 г. выйшлі Выбраныя творы.

## *Васіль ЯКАВЕНКА*



Васіль Цімафеевіч Якавенка нарадзіўся 5.5. 1936 г. у вёсцы Пажыхар Светлагорскага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1956 г. скончыў Беларускі індустрыяльны тэхнікум па спецыяльнасці — геолаг. Служыў у Савецкай Арміі (1956—1958). Працаваў майстрам, тэхнікам, інжынерам у розных геалагічных партыях і праектных інстытутах рэспублікі, рэдактарам на Беларускім радыё. У 1966 г. завочна скончыў БДУ імя У. І. Леніна. У 1972—1977 гг.— рэдактар аддзела навукі і мастацтва, аддзела нарыса і публіцыстыкі часопіса «Полымя». У 1977—1978 гг.— сакратар праўлення Саюза кінематаграфістаў БССР. З 1990 г.— прэзідэнт Беларускага сацыяльна-экалагічнага саюза «Чарнобыль». Член СП СССР з 1977 г.

У друку выступае з 1957 г. (газета «Гомельская праўда»), з мастацка-публіцыстычнымі творамі з 1962 г. (газета «Калгасная праўда»). Піша на беларускай і рускай мовах. Аўтар кніг нарысаў «Земля, открытая нами» (1971), «Пробны камень» (1974), «Пакуль сонца ў зеніце» (1977), «Дайсці да ладу» (1985), падарожнага эсэ «Вясковыя дыспуты» (1987), «Другой зямлі не будзе» (1989).

З М. Місюком напісаў п'есу «Вер таму, хто выпакутаваў» (першапачатковая назва «Персона нон грата», пастаўлена ў 1981).

## *Алесь ЯКІМОВІЧ*



Алесь (Аляксандр Іванавіч) Якімовіч нарадзіўся 17.1.1904 г. у вёсцы Чурылава Уздзенскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў Беларускі педагагічны тэхнікум (1926), у 1930 г.— літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педагагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта. З 1924 г. працаваў у рэдакцыях часопісаў «Беларускі піянер», «Іскры Ільіча». Быў членам літаратурнага аб'яднання «Маладняк». У першыя месяцы Вя-

лікай Айчыннай вайны выкладаў у адной з сярэдніх школ г. Чыстапаля (Татарыя), быў адказным сакратаром раённай газеты ў Казахстане. З кастрычніка 1942 г.— у Савецкай Арміі, камандзір стралковага ўзвода, затым роты, пад Харкавам быў цяжка паранены (1943). Жыў у Маскве, займаўся рэдактарскай працай (1943—1944). Быў старшым рэдактарам Дзяржаўнага выдавецтва БССР (1944—1945, 1948—1954), адказным рэдактарам часопіса «Бярозка» (1945—1948), літкансультантам СП БССР (1955—1960). Член СП СССР з 1934 г.

Узнагароджаны двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і медалямі.

Заслужаны дзеяч культуры Беларускай ССР (1968).

Памёр 15.1.1979 г.

Друкавацца пачаў у 1923 г. (часопіс «Маладняк»). Першая кніжка «Вершы» (1925). Пісаў пераважна для дзяцей. Выдаў кнігі апавяданняў, аповесцей «Гул бубна» (1925), «Перамога» (1932), «Незвычайны мядзведзь» (1934), «Выпадак на чыгунцы» (1938), «Помста» (1946), «Сябры» (1948), «Аповесці і апавяданні» (1949), «Гаворыць Масква» (1951), «Арляняты» (апавяданні, аповесці, казкі, 1952), «Я — юны піянер» (1952), «Базылёў курган» (1954), «Новы год» (1958), «Смелыя людзі» (1960), «Адкуль ліха на свеце» (1963), «Прыгоды хлопчыка Іларыка» (1965), «Канец сервітуту» (1968), «Светлы дзень» (апавяданні і казкі, 1969), «Кастусь Каліноўскі» (1971), «Цяжкі год» (1976), нарысы «Коска» (1935), «У нашай сталіцы» (1954), літаратурныя казкі ў вершах і прозе «Каваль Вярнідуб» (1936), «Казка пра смелага вожыка» (1937), «Браты Лазоўскія» (1965), зборнік паэзіі «Улетку» (1947). У 1967 г. выйшлі Выбраныя творы ў 2-х, у 1978—1980 гг.— у 3 тамах.

У яго апрацоўцы асобнымі выданнямі выйшла шмат беларускіх казак, а таксама зборнікі «Каток — залаты лабок» (1955), «Бацькаў дар» (1957), «З рога ўсяго многа» (1959), «Андрэй за ўсіх мудрэй» (1983). Сааўтар «Чытанкі» для 2 класа (з Е. Тародкінай, 1933), аўтар падручніка для 2 класа «Роднае слова» (1932), кніг для чытання «Слухай — запамінай: Азбука ў вершах і малюнках» (1948), «Звяры нашых лясоў» (1951).

На беларускую мову пераклаў асобныя творы А. Пушкіна, М. Някрасава, П. Яршова, І. Крылова, І. Тургенева, Д. Маміна-Сібірака, Л. Талстога, А. Чэхава, У. Маякоўскага, М. Горкага, К. Чукоўскага, С. Маршака, С. Міхалкова, А. Гайдара, М. Носава, І. Франка, М. Рыльскага, П. Тычыны, Н. Забілы, Г.-Х. Андэрсена, Дж. Лондана, Г. Мапасана і інш.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР (1974) за аповесці «Адкуль ліха на свеце», «Канец сервітуту» і «Кастусь Каліноўскі».

---

## *Аляксей* ***ЯКІМОВІЧ***



Аляксей Мікалаевіч Якімовіч нарадзіўся 15.10. 1949 г. у вёсцы Парэчча Слонімскага раёна Гродзенскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1972 г. скончыў беларускае аддзяленне філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Працаваў настаўнікам на Слонімшчыне — у Кастровіцкай васьмігадовай школе, Жыровіцкай сярэдняй школе, арганізатарам пазакласнай і пазашкольнай выхаваўчай работы ў Жыровіцкай сярэдняй школе, дырэктарам Дзеравянчыцкай васьмігадовай школы. З 1982 г. — выхавацель групы падоўжанага дня, з 1983 г.— настаўнік Касцянёўскай няпоўнай сярэдняй школы. Член СП СССР з 1990 г.

Упершыню выступіў у друку ў 1967 г. Аўтар кніжак апавяданняў для дзяцей «Гордзіеў вузел, альбо Нявыдуманыя гісторыі з жыцця Алеся Пятрашкі (1987), «Эльдарада просіць дапамогі» (1989).

## *Леанід ЯКУБОВІЧ*



Леанід Яўгеньевіч Якубовіч нарадзіўся 21.3. 1948 г. у вёсцы Радкава Салігорскага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Працаваў паштальёнам, апаратарам у аддзяленні сувязі вёскі Чапялі, пасля заканчэння Любанскай завочнай сярэдняй школы (1965) — машыністам на другім Салігорскім калійным камбінаце. У 1967 г. залічаны ў штат рэдакцыі салігорскай раённай газеты «Шахцёр». Завочна вучыўся на факультэце журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1969—1970 гг. працаваў у шахце.

Трагічна загінуў у шахце 8.6.1970 г.

Першы верш надрукаваў у 1965 г. (газета «Чырвоная змена»). Вершы ўключаліся ў калектыўныя зборнікі «Рунь» (1970), «Універсітэт паэтычны (1971). У 1979 г. выйшаў зборнік вершаў «Я з вамі, вёсны...».

## *Уладзімір ЯКУТАЎ*



Уладзімір Дзмітрыевіч Якутаў нарадзіўся 5.11. 1926 г. у вёсцы Ранькава Ушацкага раёна Віцебскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1942—1944 гг.— у партызанскім атрадзе брыгады «Неуловимые». З 1944 г.— у дзеючай арміі. У 1945 г. быў паранены і дэмабілізаваны. У 1945—1946 гг. працаваў сакратаром Булаўскага сельсавета Полацкага раёна. У 1946—1961 гг. у Літве — сакратар Швенгіонеляйскага валаснога камітэта камсамола, інструктар, загадчык парткабінета райкома партыі. Скончыў юрыдычны факультэт Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Капсукаса (1954). З 1961 г. працаваў у Мінску адказным сакратаром таварыства «Веды» Ленінскага раёна, намеснікам дырэктара па культрабоце тэхнічнага вучылішча № 53, навуковым супрацоўнікам Інстытута гісторыі пры ЦК КПБ. З 1973 г.— навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі АН БССР. З сакавіка 1990 г.— прэзідэнт культурна-творчай фірмы «Русь Белая». Кандыдат гістарычных навук. Член СП СССР з 1984 г.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны, Чырвонай Зоркі і медалямі.

Літаратурнай працай займаецца з 1962 г. Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар кніг «А. Г. Червяков: Страницы биографии» (1978), «Н. М. Голодед: Страницы биографии» (1981), дакументальных аповесцей «Віхурны досвітак» (1983), «Всегда с Лениным» (нарысы, 1983), «Александр «Червяков» (1986), «Вровень с веком» (1989), «Приговор века» (1990).

---

## *Эрнест* ***ЯЛУГІН***



Эрнест Васільевіч Ялугін нарадзіўся 19.11. 1936 г. на станцыі Асінаўка Аршанскага (цяпер у складзе Дубровенскага) раёна Віцебскай вобласці ў сям'і служачага.

Дзіцячыя гады прайшлі на радзіме бацькоў — у Крычаве. Пасля заканчэння сярэдняй школы (1954) стаў літсупрацоўнікам пры крычаўскай раённай газеце «Шлях сацыялізма», з 1955 г.— літсупрацоўнік гэтай газеты. Працаваў у мсціслаўскай раённай газеце «Калгасная праўда» (1957—1960), у шматтыражцы «За коммунистический труд» (Салігорск). Скончыў завочна аддзяленне журналістыкі філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1962). З 1961 г.— літсупрацоўнік, загадчык аддзела, адказны сакратар газеты «Знамя юности», з 1966 г.— раз'язны карэспандэнт «Сельской газеты», у 1969—1972 гг.— карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва». З 1976 г.— супрацоўнік часопіса «Неман», у 1978 — 1984 гг.— намеснік галоўнага рэдактара. З 1990 г.— рэдактар газеты «Наша слова». Член СП СССР з 1972 г.

Першы нарыс надрукаваў у 1955 г. (газета «Советская Белоруссия»), першае апавяданне ў 1966 г. (газета «Знамя юности»). Піша на рускай і беларускай мовах. Выйшлі аповесці «Камни Млечного Пути» (1969), «Мстиславцев посох» (1971), «Сіндбад вяртаецца» (1988), «Последний князь» (асобным выданнем у кнізе «Острова. Последний князь», 1986), «Без эпітафіі» (1989), «Только камни» (аповесць і эсэ, 1989), кніга нарысаў «Соленая планета» (1973),

раманы «Острова» (1975), «Год-другой в Алжире» (часопіс «Неман», 1986). Аўтар сцэнарыяў дакументальных тэлефільмаў «Мсціслаў: звенні часу» (1984), «Без эпітафіі» (1990).

---

## *Яўгенія* ЯНІШЧЫЦ



Яўгенія Іосіфаўна Янішчыц нарадзілася 20.11. 1948 г. у вёсцы Рудка Пінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыла філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1971). Працавала загадчыцай бібліятэкі ў ЦК ЛКСМБ (1971). З 1976 г.— літкансультант «Сельской газеты», у 1983—1988 гг. загадвала аддзелам паэзіі часопіса «Маладосць». У 1981 г. як член дэлегацыі БССР удзельнічала ў рабоце XXXVI сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Член СП СССР з 1971 г.

Памерла 25.11.1988.

Выступіла з вершамі ў рэспубліканскім друку ў 1964 г. (часопіс «Бярозка»). Аўтар зборнікаў вершаў «Снежныя грамніцы» (1970), «Дзень вечаровы» (1974), «Ясельда» (1978), «На беразе пляча» (1980), «Пара любові і жалю» (1983), «Каліна зімы» (1987), кнігі вершаў і паэм «У шуме жытняга святла» (1988).

Лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі (1978) за кнігу лірыкі «Дзень вечаровы», Дзяржаўнай прэміі БССР імя Янкі Купалы (1986) за кнігу лірыкі «Пара любові і жалю».

---

## *Фёдар* ЯНКОЎСКІ



Фёдар Міхайлавіч Янкоўскі нарадзіўся 21.9. 1918 г. у вёсцы Клетнае Глускага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1936 г. скончыў Рагачоўскі педагагічны тэхнікум. Працаваў настаўнікам Буцавіцкай школы Мінскага раёна. Скончыў завочна Мінскі настаўніцкі інстытут у 1939 г. Удзельнічаў у савецка-фінляндскай вайне 1939—1940 гг., быў паранены. У час Вялікай Айчыннай вайны — разведчык, начальнік разведкі атрада «Грозны» на Міншчыне. Пасля вызвалення Беларусі ад

нямецка-фашысцкіх захопнікаў два гады (1944—1946) працаваў адказным сакратаром рэдакцыі глускай раённай газеты «Сацыялістычная вёска» і настаўнічаў у Глускай сярэдняй школе. У 1948 г. скончыў філалагічны факультэт Гродзенскага педагагічнага інстытута. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў Радашковіцкай сярэдняй школе, вучыўся ў аспірантуры пры Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага. З 1953 г.— выкладчык беларускай мовы, у 1956—1982 гг.— загадчык, з 1983 г.— прафесар кафедры беларускага мовазнаўства гэтага інстытута. Доктар філалагічных навук. Член СП СССР з 1968 г.

Заслужаны дзеяч навукі БССР (1972).

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

Памёр 13.11.1989 г.

Першае выступленне ў рэспубліканскім друку датуецца 1936 г. (нарыс у часопісе «Работніца і калгасніца Беларусі»). Аўтар кніг «Дыялектны слоўнік» (вып. 1—3, 1959—1970), «Беларускае літаратурнае вымаўленне» (1960), «Пытанні культуры мовы» (1961), «Вусная мова і выразнае чытанне» (з У. Калеснікам, 1962), «Роднае слова» (1967, 2-е выданне ў 1972, 3-е пад назвай «Беларуская мова» ў 1978), «Беларуская фразеалогія» (1968, 1981), «Беларускія народныя параўнанні» (1973), «Гістарычная граматыка беларускай мовы» (ч. I — 1974, ч. II — 1977) «Сучасная беларуская мова» (1984), «Само слова гаворыць» (1986). Выдаў «Фразеалагічны слоўнік» (з Н. Гаўрош і Я. Лепешавым, 1973). Складальнік зборнікаў крылатых слоў і афарызмаў, прыказак і прымавак, параўнанняў, фразеалагізмаў «З беларускіх літаратурных крыніц» (1960), «Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі» (1957), «Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы» (1962). Адзін з аўтараў дапаможнікаў для вышэйшых навучальных устаноў «Сучасная беларуская літаратурная мова» (1976, 1984), «Практыкум па беларускай мове» (1980) і інш.

Выйшлі кнігі прозы «Абразкі» (1975), «Прыпыніся на часінку» (1979), «І за гарою пакланюся» (1982), «Радасць і боль» (1984), «З нялёгкіх дарог» (выбранае, 1988).

## *Сакрат* ЯНОВІЧ



Сакрат Канстанцінавіч Яновіч нарадзіўся 4.9. 1936 г. у мястэчку Крынкі Беластоцкага ваяводства (цяпер Польшча) у сям'і шаўца.

У 1955 г. скончыў Беластоцкі электратэхнікум. Працаваў брыгадзірам электраманцёраў на баваўняным камбінаце пад Беластокам. 3.2. 1956 г. працаваў у новастворанай рэдакцыі газеты «Ніва» — перакладчыкам, потым журналістам. У 1960 г. скончыў завочнае аддзяленне беларускай філалогіі Настаўніцкага інстытута ў Беластоку. У 1959 — 1962 гг. загадваў арганізацыйным аддзелам Галоўнага праўлення Беларускага грамадска-культурнага таварыства. Пасля звальнення ў 1970 г. з работы ў «Ніве» па палітычных матывах (за так званы беларускі нацыяналізм) застаўся беспрацоўным. Нейкі час рабіў грузчыкам, тэхнікам бяспекі працы. У 1973 г. скончыў завочны факультэт польскай і славянскай філалогіі Варшаўскага універсітэта. У другой палове 70-х гг.— паўштатны інструктар-метадыст Беластоцкага гарадскога Дома культуры, у першай палове 80-х гг.— тэхнічны рэдактар «Нівы». Член Саюза польскіх пісьменнікаў з 1970 г. З'яўляўся старшынёй Клуба Саюза польскіх пісьменнікаў у Беластоку (1976—1981). Старшыня Беларускага Дэмакратычнага аб'яднання — першай беларускай палітычнай партыі ў пасляваеннай Польшчы (утворана на пачатку 1990 г.).

Узнагароджаны Сярэбраным Крыжам заслугі.

Першае апавяданне апублікавана ў 1956 г. («Ніва», Беласток). Піша на беларускай і польскай мовах. Аўтар зборніка апавяданняў і мініяцюр «Загоны» (Беласток, 1969), «Не пашанцавала» (Беласток, 1978). Наступныя кнігі выйшлі ў перакладзе на польскую мову: «Вялікі горад Беласток» (Варшава, 1973), «Забыцці» («Вроцлаў, 1978), «Сцяна» (Ольштын, 1979), «Самасей» (Варшава, 1981), «Малыя дні» (Варшава, 1981), «Трэцяя пара» (Варшава — Беласток, 1983), «Сярэбраны яздок» (Варшава, 1984), «Беларусь, Беларусь» (Варшава, 1987). У Мінску выйшла кніга прозы «Сярэбраны яздок» (1978), у Лондане — білінгуальнае вы-

данне (па беларуску і па-англійску), «Мініяцюры» (1984). Пераклаў на польскую мову «Вітражы» Я. Брыля (Варшава, 1979), п'есу Я. Шабана «Шрамы» (для Драматычнага тэатра імя Я. Вянгеркі ў Беластоку).

---

## *Мікола* ЯНЧАНКА



Мікола (Мікалай Ігнатавіч) Янчанка нарадзіўся 22.6.1931 г. у вёсцы Забалацце Магілёўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і каваля.

Скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута (1956). Настаўнічаў у Брожскай сярэдняй школе на Бабруйшчыне (1956—1961), у Дварэцкай сярэдняй школе (1965—1966), быў выхавацелем у Гарадзецкай школе-інтэрнаце (1961) Рагачоўскага раёна. Працаваў у раённых газетах у Рагачове, Жлобіне, Калінкавічах, Карме. З 1972 г.— адказны сакратар рагачоўскай раённай газеты «Камунар». Член СП СССР з 1979 г.

Дэбютаваў у друку вершам у 1958 г. (бабруйская раённая газета «Камуніст»). Піша на рускай і беларускай мовах. Аўтар зборнікаў паэзіі «Разнотравье» (1971), «Кросны» (1980), «Жыцейка-жыта» (1990), кніжак апавяданняў для дзяцей «З людзьмі добра» (1973) і «Зраблю сонейка» (1978), «Жменька жалудоў» (1989), кніжкі-маляванкі «Лета ў серванце» (1981) і зборніка вершаў «Залаты вулей» (1986). На беларускую мову пераклаў кнігу вершаў Д. Кавалёва «Вечназялёная Ветка» (1990).

---

## *Віктар* ЯРАЦ



Віктар Уладзіміравіч Ярац нарадзіўся 23.10. 1948 г. у пасёлку Красны Мост Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і.

У 1966 г. паступіў на філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, У 1968 г. перавёўся ў Гомельскі педагагічны інстытут імя В. Чкалава, на базе якога ў 1969 г. быў адкрыты універсітэт (скончыў у 1970). Быў некалькі месяцаў загадчыкам сельгасаддзела рагачоўскай раённай газе-

ты «Камунар». У 1970—1971 гг. служыў у Савецкай Арміі. Працаваў на Гомельскай студыі тэлебачання. У 1975 г. скончыў аспірантуру пры кафедры беларускай літаратуры Гомельскага універсітэта. Працуе выкладчыкам гэтага універсітэта, з 1978 г.— дацэнт. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1980 г.

Першыя вершы апублікаваў у газеце «Піянер Беларусі» ў школьныя гады. Актыўна пачаў выступаць у друку з 1966 г. Аўтар зборнікаў вершаў «Уваходзіны» (1976), «Добрыца» (бібліятэка часопіса «Маладосць», 1989).

Выступае ў перыядычным друку па праблемах развіцця сучаснай беларускай паэзіі. Напісаў вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў-філолагаў «Беларускія паэты — лаўрэаты Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР» (Гомель, 1983).

Перакладае творы балгарскіх, літоўскіх, рускіх, украінскіх паэтаў на беларускую мову.

---

## *Эдуард ЯРАШЭВІЧ*



Эдуард Сігізмундавіч Ярашэвіч нарадзіўся 28.8. 1937 г. у горадзе Бабруйску ў сям'і служачага.

У 1954 г. скончыў Смілавіцкую сярэднюю школу Мінскай вобласці. З-за цяжкай хваробы не змог вучыцца далей. Член СП СССР з 1970 г.

Памёр 6.10.1986 г.

У 1956 г. у рэспубліканскім друку было змешчана першае апавяданне (газета «Чырвоная змена»). Выйшлі зборнікі апавяданняў і аповесцей «Прызнанне» (1969), «Дзень далёкі і блізкі» (1973), «Практыка ў Вербічах» (1975), «Белыя Лугі» (1978), «Пражыць дзень» (1983), «Чакаю цябе, раніца» (1987), а таксама зборнік гумарыстычных апавяданняў «Вішанькі Восіпа Міхеевіча» (1969).

## *Мікалай* ***ЯРОМУШКІН***



Мікалай Несцеравіч Яромушкін нарадзіўся 17. 12.1904 г. у горадзе Арэхава-Зуеве Маскоўскай вобласці (Расія) у рабочай сям'і.

Скончыў два курсы літаратурнага аддзялення 1-га Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта (1929). У 1929—1930 гг. жыў у Ленінградзе, працаваў літкансультантам часопіса «Резец». Вярнуўшыся ў Арэхава-Зуева, працаваў у раённай газеце, у Палацы культуры. З 1932 г. жыў у Маскве, працаваў загадчыкам літаддзела часопіса «Рост», рэдактарам выдавецтва ЦДРАМ, намеснікам адказнага рэдактара часопіса «Мурзилка». У 1941—1942 гг.— намеснік загадчыка аддзела агітацыі і прапаганды Арэхава-Зуеўскага райкома партыі. Вучыўся ў Вышэйшым ваенным педагагічным вучылішчы ў Ташкенце (1942—1943). З 1943 г.— адказны сакратар дывізійнай, затым карпусной газет. У 1946—1949 гг.— рэдактар газеты «За торф» (Арэхава-Зуева). У 1950—1964 гг.— літсупрацоўнік газеты Беларускай ваеннай акругі «Во славу Родины». Кіраваў літаб'яднаннем вайсковых пісьменнікаў. Член СП СССР з 1960 г.

Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і медалямі.

Памёр 10.6.1983 г.

Друкаваўся з 1925 г. (часопіс «Красная нива»). Пісаў на рускай мове. У Маскве і Ленінградзе выдадзены яго кнігі прозы «Гитара» (1927), «Гостья» (1929), «Молодой человек» (1930). У 1938 г. некалькі нарысаў увайшлі ў кнігу «Волшевцы» (Масква). У часопісе «Неман» надрукаваны аповесці «Государева награда» (1968), «Конец двора его величества» (1969).

Пераклаў на рускую мову асобныя апавяданні У. Краўчанкі, І. Пташнікава, А. Карпюка і інш.

## *Міхась ЯРОШ*



Міхась (Міхаіл Рыгоравіч) Ярош нарадзіўся 10.1.1929 г. у вёсцы Межная Слабада Клецкага раёна Мінскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1948). Вучыўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР (1953—1956). У 1956—1987 гг.— навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Кандыдат філалагічных навук. Член СП СССР з 1968 г.

Памёр 10.7.1987 г.

Друкавацца пачаў у 1955 г. Выступаў як крытык і літаратуразнавец. Аўтар кніг «Драматургія Янкі Купалы» (1959), «Міхась Чарот: Нарыс жыцця і творчасці» (1963), «Янка Купала і беларуская паэзія» (1971), «Беларуская савецкая лірыка» (з В. Бечыкам, 1979), «Пятрусь Броўка» (1981), «Пясняр роднай зямлі: Жыццё і творчасць Янкі Купалы» (1982), «Янка Купала і Якуб Колас: Паралельны аналіз жыцця і творчасці» (1988), брашур «Міхась Чарот» (1966), «Пятрусь Броўка» (1975), «Янка Купала і современность» (1981), «В памяти народной» (1982). З'яўляецца адным з аўтараў двухтомнай «Гісторыі беларускай савецкай літаратуры» (1964—1966), «Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры» (1969), «Истории советской многонациональной литературы» (Масква, 1972), «Истории белорусской дооктябрьской литературы» и «Истории белорусской советской литературы» (1977).

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР імя Якуба Коласа (1980) за ўдзел у двухтомным даследаванні «История белорусской дооктябрьской литературы» и «История белорусской советской литературы».

## *Алесь* ЯСКЕВІЧ



Алесь (Аляксандр Сямёнавіч) Яскевіч нарадзіўся 12.6.1934 г. у вёсцы Ушакі Чэрыкаўскага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Скончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1953). Працаваў у газеце «На страже Октября» (Мінск). У 1961—1964 гг. займаўся ў аспірантуры пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. З 1964 г.— навуковы супрацоўнік гэтага інстытута. Доктар філалагічных навук. Член СП СССР з 1966 г.

З крытычнымі і літаратуразнаўчымі артыкуламі выступае з 1958 г. Выйшлі зборнікі літаратурна-крытычных артыкулаў і даследаванняў «Карані маладога дрэва» (1967), «Ад слова да вобраза» (1968), «Шляхі развіцця беларускай савецкай прозы» (з В. Каваленкам і М. Мушынскім, 1972), «Пытанні паэтыкі» (з В. Жураўлёвым і Я. Шпакоўскім, 1974), «Грані майстэрства» (1974), «У свеце мастацкага твора» (1977), «Нараджэнне новага мастацтва» (з Л. Гараніным і А. Матрунёнкам, 1980), «Выхад за круг» (1985), «Становление белорусской художественной традиции» (1987).

## *Леанід* ЯЎМЕНАЎ



Леанід Фёдаравіч Яўменаў нарадзіўся 22.7. 1932 г. у вёсцы Халмы Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.

Скончыў аддзяленне філасофіі гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1955), аспірантуру Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1961). У 1954—1958 гг.— сакратар Мінскага гаркома камсамола. У 1961—1970 гг.— дацэнт Мінскага педагагічнага інстытута замежных моў. У 1970—1971 гг.— лектар ЦК КПБ. З 1971 г.— міжнародны чыноўнік у дэпартаменце сацыяльных, гуманітарных навук і культуры ЮНЕСКА, з 1975 г.— загадчык кафедры этыкі, эстэтыкі і навуковага атэізму БДУ імя У. І. Леніна,

з 1979 г.— загадчык сектара Інстытута філасофіі і права АН БССР, з 1982 г.— загадчык аддзела навуковай інфармацыі АН БССР. Доктар філасофскіх навук, прафесар. Член СП СССР з 1981 г.

Выступае ў друку з мастацкімі творамі з 1949 г. (бабруйская газета «Камуніст»). Выдаў зборнікі паэзіі «Чужая планета» (1980) і «Блізкія далі» (1983). Перакладае сучасную французскую і франкамоўную паэзію.

Аўтар навуковых прац па філасофіі, этыцы і эстэтыцы. Асобнымі выданнямі выйшлі «Філасофія антымарксізму і дыялектыка» (1981), «Антыгуманістычныя тэндэнцыі ў сучасным буржуазным мастацтве» (1983) і інш.

---

## *Святлана* ЯЎСЕЕВА



Святлана Георгіеўна Яўсеева нарадзілася 4.9. 1932 г. у горадзе Ташкенце (Узбекістан) у сям'і ваеннаслужачага.

Скончыла літаратурны факультэт Ташкенцкага педагагічнага інстытута імя Нізамі (1957) і Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве (1962). У Мінску жыве з 1962 г. Член СП СССР з 1964 г.

Першыя творы надрукавала ў 1955 г. Піша на рускай мове. Аўтар зборнікаў паэзіі «Женщина под яблоней» (Масква, 1962, пад такой самай назвай выйшла кніга выбраных вершаў у Мінску, 1982), «Новолуние» (1965), «Зову!» (1974), «Евразия» (1979), «Последнее прощание» (1983), «Ищу человека» (вершы, паэмы, 1988).

Пераклала на рускую мову кніжку вершаў для дзяцей «Черничка» А. Вольскага (1967), кнігу паэзіі Н. Тулупавай «Я соловья искала» (Масква, 1987), асобныя творы Я. Купалы, М. Танка, А. Вялюгіна, А. Вярцінскага і інш. Займаецца перакладамі на рускую мову армянскіх, асецінскіх, балкарскіх, кіргізскіх, французскіх і іншых паэтаў.

## *Рыгор* ЯЎСЕЕЎ



Рыгор (Ягор Мінавіч) Яўсееў нарадзіўся 10.9. 1942 г. у вёсцы Барок Бялыніцкага раёна Магілёўскай вобласці ў сялянскай сям'і.

Пасля заканчэння Малабялевіцкай сярэдняй школы (1960) рабіў у калгасе. Служыў у Савецкай Арміі (1961—1963). Працаваў у бялыніцкай раённай газеце «Зара камунізму» (1964—1971). Скончыў завочнае аддзяленне філфака Магілёўскага педінстытута (1969), Вышэйшую партыйную школу пры ЦК КПБ (1973). Працаваў у рэдакцыі часопіса «Полымя» (1973—1975), у Дзяржкамвыдзе БССР (1975—1977). З 1977 г.— старшы рэдактар выдавецтва «Мастацкая літаратура». Член СП СССР з 1983 г.

Дэбютаваў гумарыстычнымі вершамі і байкамі ў 1960 г. Аўтар зборнікаў гумару, сатыры «Верабей пад воблакамі» (1976), «Гатовая рэпка» (1976), «Вялікая лыжка» (1977), «Мох на бярвенні» (1979), «Шаравая бліскавіца» (1986). Выйшлі для дзяцей кніжкі-маляванкі «Нашы хлопцы-рыбакі» (1976), «Дзядзькавы памочнікі» (1981). Выдаў слоўнік гаворак Бялыніцкага раёна «Маці казала так...» (1978).

Перакладае на беларускую мову вершы рускіх, украінскіх, малдаўскіх, французскіх, чэшскіх паэтаў.

## *Фёдар* ЯФІМАЎ



Фёдар Архіпавіч Яфімаў нарадзіўся 5.5.1933 г. у вёсцы Наватроіцкае Цярноўскага раёна Варонежскай вобласці (Расія) у сялянскай сям'і.

Скончыў Варонежскае суворاўскае (1951) і Чэрапавецкае пяхотнае (1953) вучылішчы. Камандаваў узводам. У 1957—1958 гг. вучыўся на Цэнтральных курсах палітсаставу. Служыў у Савецкай Арміі да 1963 г. З 1959 г. жыве ў Мінску. У 1966—1967 гг. загадваў аддзелам нарыса і публіцыстыкі часопіса «Неман». У 1967 г. скончыў завочна Літаратурны інстытут імя М. Горкага. Член СП СССР з 1962 г.

У друку з вершамі выступае з 1951 г., у Беларусі — з 1959 г. Піша на рускай мове.

Аўтар кніг вершаў «Армия» (1962), «Утренний автобус» (1964), «Дням настоящим» (паэма, вершы, 1972), «Светлые зимние ночи» (1982).

Перакладае творы беларускіх паэтаў на рускую мову. Асобнымі выданнямі выйшлі кнігі А. Русака «Пролетели ветры» (Масква, 1969), А. Лойкі «Расколдованное Полесье» (Масква, 1976), а таксама кніга курдскага паэта Г. Чарказяна «Цвет доброты» (1986).

Як крытык піша па-беларуску.

# ЗМЕСТ

Ад складальніка *3*

Авечкін Аляксандр *5*
Агіевіч Уладзімір *6*
Агняцвет Эдзі *6*
Адамовіч Алесь *8*
Адамчык Вячаслаў *10*
Аколава Валянціна *11*
Аксельрод Зэлік *12*
Александровіч Андрэй *12*
Александровіч Сцяпан *14*
Алексіевіч Святлана *15*
Алешка Антон *16*
Аляксееў Мікалай *16*
Аляхновіч Мікола *17*
Аляхновіч Францішак *18*
Андраюк Серафім *19*
Аніскові Уладзімір *20*
Аношкін Іван *21*
Арабей Лідзія *22*
Арабейка Іван *23*
Арлоў Уладзімір *23*
Арол М. *24*
Арочка Мікола *25*
Арсеннева Наталля *26*
Артымовіч Надзея *27*
Асіпенка Алесь *27*
Астапенка Алесь *29*
Астапенка Змітрок *29*
Асташонак Алесь *30*
Астрэйка Анатоль *31*
Астрэйка Сяргей *32*
Аўрамчык Мікола *33*

Бабарэка Адам *34*
Багданаў Юрый *35*
Багдановіч Ірына *36*
Багдановіч Максім *36*
Багун Міхась *37*
Багушэвіч Юрый *38*
Бадак Алесь *39*
Бажко Алесь *39*
Бандарына Зінаіда *40*
Баравікова Раіса *41*
Барадулін Рыгор *42*
Баранавых Сымон *44*
Барашка Іллары *44*
Бароўскі Анатоль *45*
Барскі Алесь *46*
Барсток Марына *47*
Баршчэўскі Леанід *48*
Барысенка Васіль *49*
Барычэўскі Яўген *50*
Барэйша Міхась *51*
Басуматрава Святлана *51*
Бачыла Алесь *53*
Башлакоў Міхась *53*
Беляжэнка Барыс *54*
Бечык Варлен *55*
Бірала Захар *56*
Бітэль Пятро *56*
Бічэль-Загнетава Данута *58*
Блакіт Валянцін *58*
Блатун Сымон *59*
Бліцінаў Міхась *60*
Бобрык Янка *61*
Бондар Таіса *61*
Браніштэйн Якаў *62*
Броўка Пятрусь *63*
Брыль Янка *65*
Бубнаў Генадзь *67*
Бугаёў Дзмітрый *68*

Будзінас Яўген *69*
Буйло Канстанцыя *69*
Букчын Сямён *70*
Булыка Галіна *71*
Бураўкін Генадзь *72*
Бурносаў Васіль *73*
Бурсаў Іван *74*
Бур'ян Барыс *75*
Бусько Мікола *76*
Бутрамееў Уладзімір *76*
Быкаў Васіль *77*
Бэндэ Лукаш *79*
Бяганская Ядвіга *79*
Бядуля Змітрок *80*
Бялевіч Антон *82*
Бярозкін Рыгор *83*
Бяспалы Змітро *84*

Ваданосаў Мікола *86*
Вазнясенскі Аляксандр *87*
Вайцяшонак Марыя *88*
Вайшнорас Феліксас *88*
Вакулоўская Лідзія *89*
Валасевіч Эдуард *90*
Валкадаеў Пётр *91*
Варановіч Адольф *91*
Васілевіч Алена *92*
Васілеўская Галіна *93*
Васілеўскі Іосіф *94*
Васілеўскі Пятро *95*
Васілёк Міхась *96*
Васілёнак Яўген *96*
Васюкова Галіна *97*
Ватацы Ніна *98*
Верабей Анатоль *99*
Верамейчык Уладзімір *100*
Верас Зоська *100*
Вечар Алесь *101*
Віталін Змітро *102*
Вітка Васіль *103*
Віцьбіч Юрка *104*
Вішнеўскі Мікола *105*
Вольны Анатоль *106*
Вольскі Артур *107*
Вольскі Віталь *108*
Воранаў Мікола *110*
Вышынскі Міхась *110*
Вялюгін Анатоль *111*
Вярба Вера *112*
Вярцінскі Анатоль *113*

Гайдук Мікола *115*
Галавач Платон *116*
Галаўчынер Віктар *117*
Галіноўская Ніна *117*
Галубовіч Леанід *118*
Галубок Уладзіслаў *118*
Гальпяровіч Навум *119*
Гамолка Мікола *120*
Гарбацэвіч Васіль *121*
Гарбук Вісарыён *122*
Гардзей Віктар *123*
Гардзіцкі Аляксей *123*
Гародня Алесь *124*
Гартны Цішка *125*
Гарулёў Мікола *126*
Гарун Алесь *128*
Гарэлікава Таццяна *129*
Гарэцкі Максім *129*
Гаўрук Юрка *131*
Гаўрусёў Сцяпан *132*
Гаўрылаў Леанід *133*
Гаўрылкін Леанід *134*
Гейнэ Аркадзь *135*
Геніюш Ларыса *135*
Герасімаў Мікалай *136*
Герцовіч Якаў *137*
Герчык Міхаіл *137*
Гігевіч Васіль *138*
Гілевіч Ніл *139*
Гіль Мікола *141*
Глазырын Уладзімір *142*
Глебка Пятро *143*
Глобус Адам *145*
Глушакоў Уладзімір *145*
Гніламёдаў Уладзімір *146*
Голуб Юрка *147*
Грамовіч Іван *147*

Грамыка Міхайла *148*
Граніт Пятрусь *150*
Грахоўскі Сяргей *150*
Грачанікаў Анатоль *152*
Гроднеў Мікола *153*
Грыневіч Клім *154*
Грынчык Мікола *154*
Грышановіч Валерый *155*
Губарэвіч Кастусь *156*
Гурло Алесь *158*
Гурскі Ілья *159*
Гурэвіч Эсфір *160*
Гусак Сяргей *161*
Гусеў Сілан *161*
Гутараў Іван *162*
Гутковіч Аляксандр *163*

Дабулявічус Андрус *165*
Давыдзенка Васіль *166*
Дадзіёмаў Уладзімір *166*
Дайліда Віктар *167*
Дайнека Леанід *168*
Далідовіч Генрых *169*
Дамашэвіч Уладзімір *169*
Даніленка Міхась *170*
Дарожны Сяргей *171*
Даўгапольскі Цодзік *171*
Дашкевіч Вячаслаў *172*
Дварчанін Ігнат *173*
Дзеружынскі Авяр'ян *174*
Дзмітрыеў Генадзь *175*
Дзюба Уладзімір *176*
Дзюбайла Павел *176*
Дзягцяр Мота *177*
Дзялендзік Анатоль *178*
Дзяргай Сяргей *179*
Дзяркач Анатоль *180*
Дзятлаў Алесь *181*
Дорскі Іосіф *181*
Дорскі Сямён *182*
Дракахруст Аляксандр *183*
Дранько-Майсюк Леанід *184*
Дубінка Вячаслаў *185*
Дубоўка Уладзімір *185*
Дубровіч Алесь *187*
Дуброўскі Ігнат *187*
Дуброўскі Міхась *188*
Дубянецкі Міхаіл *189*
Дудар Алесь *190*
Дудараў Аляксей *191*
Дудзюк Зінаіда *192*
Дудо Пятро *193*
Дукса Мар'ян *193*
Дунец Хацкель *194*
Дыла Язэп *195*

Егарэнкава Галіна *196*
Емяльянаў Алесь *197*
Ермаловіч Мікола *197*
Ермаловіч Якуб *198*
Есакоў Алесь *199*

Жалязняк Рыгор *200*
Жалязоўскі Анатоль *200*
Жамойцін Алесь *201*
Жарнасек Ірына *202*
Жарскі Генрык *202*
Жаўрук Алесь *203*
Ждан Алег *204*
Жук Алесь *204*
Жук Кастусь *205*
Жуковіч Васіль *206*
Жураўлёў Васіль *207*
Журба Янка *208*
Жыгуноў Алесь *209*
Жыжэнка Уладзімір *209*
Жылка Уладзімір *210*
Жычка Хведар *211*

Забалоцкая Людміла *213*
Загорская Ніна *213*
Зазека Язэп *214*
Зайцаў Сяргей *215*
Законнікаў Сяргей *216*
Замоцін Іван *217*
Зарыцкі Аляксей *218*
Зарэмба Міхась *219*
Зарэцкі Міхась *220*

Засім Мікола *221*
Звонак Алесь *221*
Знаёмы Сяргей *223*
Зуб Валянцін *223*
Зуёнак Васіль *224*
Зьніч *225*

Іваноў Анатоль *227*
Івашын Васіль *227*
Іверс Анатоль *229*
Іпатава Вольга *229*

Кабаковіч Ала *231*
Кабржыцкая Таццяна *231*
Каваленка Віктар *232*
Кавалёў Павел *233*
Кавалёў Дзмітрый *235*
Кавалёў Сяргей *236*
Каваль Васіль *237*
Кавальскі Уладзімір *237*
Кавыль Міхась *238*
Каган Сара *239*
Каган Эля *239*
Кажадуб Алесь *240*
Казанаў Барыс *240*
Казбярук Уладзімір *241*
Казека Янка *242*
Казловіч Анатоль *243*
Казлоўскі Віктар *244*
Казыра Леанід *244*
Казько Віктар *245*
Калачынскі Міхась *246*
Калеснік Іван *247*
Калеснік Уладзімір *248*
Калінковіч Мікалай *250*
Каліна Клаўдзія *251*
Калодзежны Леанід *251*
Калюга Лукаш *252*
Камароўскі Алесь *252*
Камейша Казімір *253*
Камянецкі Гірш *254*
Канапелька Ала *254*
Кандраценя Уладзімір *255*
Кандрусевіч Аркадзь *256*
Канэ Юлія *257*
Капусцін Аляксандр *257*
Капыловіч Іван *258*
Капыловіч Мікола *259*
Караічаў Леў *259*
Карамазаў Віктар *260*
Караткевіч Уладзімір *261*
Каржанеўская Галіна *263*
Карпаў Уладзімір *264*
Карпечанка Васіль *265*
Карпюк Аляксей *266*
Каршукоў Яўген *267*
Карызна Уладзімір *268*
Каско Алесь *269*
Катляроў Ізяслаў *269*
Каханоўскі Генадзь *270*
Кацовіч Лазар *271*
Кацюшэнка Міхась *271*
Каштанаў Арнольд *272*
Кейзараў Аляксей *273*
Кенька Міхась *274*
Кірэенка Кастусь *274*
Кіслік Навум *276*
Кісялёў Генадзь *277*
Клаз Ілья *278*
Клебановіч Міхась *279*
Клімашэўская Ірына *279*
Клімковіч Міхась *280*
Клімковіч Святлана *281*
Клімянкоў Іван *282*
Клішэвіч Уладзімір *283*
Клышка Анатоль *283*
Кляўко Генадзь *285*
Кляшторны Тодар *285*
Кобец Рыгор *286*
Кобец-Філімонава Алена *288*
Козел Іван *289*
Колас Георгій *290*
Колас Якуб *291*
Конан Уладзімір *293*
Корбан Уладзімір *294*
Корзун Мікола *296*
Коршак Аляксей *296*
Коўтун Валянціна *297*

Крапіва Кандрат *298*
Краўчанка Усевалад *300*
Кругавых Мікалай *301*
Круль Міхаіл *302*
Крупенька Яўген *303*
Крывец Сяргей *303*
Крыга Алесь *304*
Кудзінаў Уладзімір *305*
Кудравец Анатоль *305*
Кудраўцаў Анатоль *306*
Кудраўцаў Іван *307*
Кузьмічоў Анатоль *308*
Кузьмянкоў Уладзімір *309*
Кулакоўскі Аляксей *310*
Кульбак Майсей *311*
Куляшова Валянціна *312*
Куляшоў Аркадзь *313*
Куляшоў Фёдар *315*
Куніцкі Сымон *316*
Купала Янка *317*
Курдзін Дзмітрый *319*
Курто Яўген *319*
Курылёва Святлана *320*
Кусянкоў Мікола *321*
Кухараў Сцяпан *321*
Кучар Алесь *322*

Лазарук Міхась *324*
Ламан Пятро *325*
Ларчанка Міхась *325*
Ласкоў Іван *327*
Ластоўскі Вацлаў *327*
Лаўшук Сцяпан *328*
Леванович Леанід *329*
Леванович Павел *330*
Летка Іван *331*
Леўчык Гальяш *331*
Лецка Яўген *332*
Ліманоўскі Янка *332*
Ліпнёвы Алесь *333*
Ліпскі Уладзімір *333*
Ліс Арсень *334*
Лісіцын Пётр *335*
Лісіцын Уладзімір *336*
Ліхадзіеўскі Сцяпан *336*
Лобан Мікола *337*
Лойка Алег *338*
Лось Еўдакія *340*
Лужанін Максім *341*
Лукша Валянцін *343*
Лук'янаў Мікола *344*
Лупсякоў Мікола *344*
Луфераў Мікола *345*
Луцкевіч Антон *346*
Лынькоў Міхась *348*
Лынькоў Рыгор *350*
Лютава Вера *350*
Лявонны Юрка *351*
Лялько Хрысціна *351*
Ляльчук Сямён *352*
Ляпёшкін Уладзімір *352*
Ляўданскі Уладзімір *353*

Маеўская Ніна *354*
Мазго Уладзімір *355*
Майхровіч Сцяпан *355*
Макаёнак Андрэй *356*
Макаль Пятрусь *358*
Макарэвіч Алесь *359*
Макарэвіч Васіль *360*
Мальдзіс Адам *360*
Мальцінскі Хаім *361*
Мальчэўская Яўгенія *362*
Маляўка Мікола *363*
Маракоў Валерый *364*
Марук Уладзімір *364*
Мархель Уладзімір *365*
Марціновіч Алесь *366*
Марціновіч Аркадзь *366*
Марціновіч Павел *367*
Марчанка Святлана *368*
Марчук Георгій *369*
Масарэнка Алесь *370*
Матукоўскі Мікалай *371*
Матэвушаў Васіль *372*
Маўзон Аркадзь *372*
Маўр Янка *374*
Махнач Алесь *375*

Мацяш Ніна *376*
Машара Міхась *377*
Машкоў Уладзімір *378*
Мележ Іван *379*
Мельнікаў Аляксандр *380*
Мехаў Уладзімір *381*
Міклашэўскі Яўген *382*
Мікуліч Барыс *382*
Мілюць Алесь *383*
Мінкін Алег *384*
Міровіч Еўсцігней *384*
Міронаў Аляксандр *386*
Місько Павел *387*
Міхальчук Сяргей *388*
Модэль Міхась *389*
Моркаўка Аркадзь *390*
Мрый Андрэй *390*
Муравейка Іван *391*
Мурашка Рыгор *392*
Мушынскі Міхась *393*
Мыслівец Валянцін *394*
Мяжэвіч Уладзімір *395*
Мяла Іван *396*
Мятліцкі Мікола *397*

Наварыч Алесь *398*
Навуменка Іван *398*
Навумовіч Уладзімір *400*
Наўроцкі Алесь *401*
Непачаловіч Янка *401*
Нёманскі Янка *402*
Нікановіч Мікола *403*
Нікіфаровіч Ванкарэм *403*
Новік Ганна *405*
Новік-Пяюн Сяргей *405*
Новікаў Іван *406*
Нядзведскі Уладзіслаў *408*
Някляеў Уладзімір *408*
Няфёд Уладзімір *409*
Няхай Рыгор *411*

Палескі Вячаслаў *413*
Палітыка Апанас *414*
Палітыка Дзмітрый *414*
Палтаран Вера *415*
Пальчэўскі Алесь *416*
Панамароў Валянцін *417*
Панізнік Сяргей *418*
Панчанка Іван *418*
Панчанка Пімен *419*
Папковіч Уладзімір *421*
Папова Алена *422*
Папоў Георгій *423*
Парахневіч Міхась *424*
Пархута Яраслаў *424*
Паслядовіч Макар *425*
Паўлаў Уладзімір *426*
Паўловіч Альберт *427*
Паўлюкявічус Банавентура *428*
Пашкевіч Нічыпар *429*
Пашкоў Генадзь *430*
Перкін Навум *430*
Пестрак Піліп *431*
Петрашкевіч Алесь *433*
Петручук Васіль *434*
Піваварaў Зяма *435*
Пісьмянкоў Алесь *435*
Піятуховіч Міхайла *436*
Платнер Ісак *437*
Пракаповіч Мікола *438*
Пpануза Паўлюк *438*
Пранчак Леанід *439*
Праскураў Васіль *439*
Прокша Леанід *440*
Пруднікаў Алесь *441*
Пруднікаў Павел *442*
Прыгодзіч Зіновій *443*
Прыходзька Пятро *444*
Пташнікаў Іван *445*
Пушча Язэп *446*
Пфляўмбаўн Яўгенія *447*
Пшыркоў Юльян *448*
Пысін Аляксей *449*
Пянкрат Міхась *450*
Пяткевіч Аляксей *451*

Рабкевіч Валянцін *452*
Рагойша Вячаслаў *453*

Рагуля Аляксей *454*
Рагуцкі Уладзімір *455*
Радкевіч Яўген *455*
Разанаў Алесь *456*
Ракаў Віктар *457*
Ракіта Сяргей *457*
Ракітны Мікола *458*
Ралько Іван *459*
Рамановіч Яўген *459*
Раманоўская Галена *461*
Рашкоўскі Леанід *461*
Родзевіч Леапольд *462*
Розна Алесь *463*
Рубанаў Уладзіслаў *464*
Рублеўская Людміла *464*
Рудаў Веніямін *465*
Рудзько Юрый *465*
Рудкоўскі Міхась *466*
Рунец Пятро *467*
Русак Адам *468*
Русецкі Аляксей *468*
Руцкая Алена *469*
Рыбак Алесь *470*
Рылько Алесь *470*
Рэйзін Рува *471*
Рэлес Рыгор *472*

Сабаленка Раман *473*
Сабалеўскі Анатоль *474*
Савіцкі Алесь *475*
Савіцкі Уладзімір *476*
Садковіч Мікола *477*
Садоўскі Яфім *478*
Салавей Алесь *479*
Салавей Леў *480*
Салагуб Алесь *481*
Саламаха Уладзімір *482*
Саламевіч Янка *482*
Салаўёў Аляксандр *483*
Салтук Алег *484*
Самуйлёнак Эдуард *484*
Сапрыка Ганна *485*
Сахарчук Васіль *486*
Сачанка Барыс *486*
Сваяк Казімір *488*
Свірка Юрась *489*
Семашкевіч Рыгор *489*
Семяжон Язэп *490*
Семяновіч Антон *491*
Сербантовіч Анатоль *492*
Сергіевіч Мікола *493*
Сергіевіч Юльян *493*
Сёмуха Васіль *494*
Сімановіч Давід *495*
Сіняўскі Іван *496*
Сіпакоў Янка *497*
Сіўцоў Іван *498*
Сіўчыкаў Уладзімір *498*
Скарынкін Іван *499*
Скарынкін Уладзімір *500*
Скобелеў Эдуард *500*
Скрыган Ян *501*
Скрыпка Міхась *502*
Скурко Іосіф *503*
Слаўковіч Даір *504*
Слесарэнка Аляксей *505*
Смагаровіч Марк *506*
Сокалаў-Воюш Сяржук *506*
Сопат Аляксандр *507*
Спрынчан Браніслаў *508*
Спрынчан Вадзім *508*
Ставер Алесь *509*
Стадольнік Іван *510*
Станкевіч Адам *511*
Станюта Аляксандр *512*
Стары Улас *513*
Стаховіч Алесь *513*
Сташэўскі Васіль *514*
Стральцоў Міхась *515*
Стрыгалёў Міхась *516*
Стэльмах Уладзімір *517*
Стэфановіч Пятро *518*
Сульянаў Анатоль *519*
Супрунчук Віктар *519*
Сурначоў Мікола *520*
Сурская Вера *521*
Сушко Павел *521*
Сушко Пятро *522*

Сыс Анатоль *523*
Сяднёў Масей *523*
Сямашка Мікола *524*
Сямашка Сцяпан *525*
Сямёнава Ала *526*
Сяркоў Іван *526*

Талалай Леў *528*
Танк Максім *528*
Тарас Валянцін *531*
Тарас Ніна *532*
Тарасаў Канстанцін *533*
Тарасюк Люба *534*
Тарашкевіч Браніслаў *534*
Тармола Раман *535*
Татур Мікола *536*
Таўбін Юлі *537*
Таўлай Валянцін *538*
Ткачоў Васіль *539*
Ткачоў Мікола *540*
Ткачоў Павел *541*
Трасцянскі Віктар *542*
Траяноўскі Алесь *543*
Трус Паўлюк *544*
Трыхманенка Віктар *544*
Тулупава Нэлі *545*
Турбіна Любоў *546*
Тычына Міхась *546*

Уксусаў Дзмітрый *548*
Усікаў Якуб *549*
Ушакоў Андрэй *550*

Фамін Сяргей *551*
Фатнеў Юрый *552*
Федарэнка Андрэй *552*
Федасеенка Уладзімір *553*
Федзюковіч Мікола *553*
Філімонава Любоў *554*
Філіповіч Марыя *555*
Фінкель Уры *555*

Хадановіч Ігар *557*
Хадкевіч Тарас *557*
Хадыка Уладзімір *559*
Харкоў Пётр *559*
Харык Ізі *560*
Хаўратовіч Віктар *561*
Хацкевіч Рыгор *562*
Хвалей Яўген *562*
Хведаровіч Мікола *563*
Хейдарава Людміла *564*
Хомчанка Васіль *565*
Хромчанка Кузьма *566*
Хурсік Сымон *567*

Цвірка Кастусь *568*
Цітоў Канстанцін *569*
Цулукідзе Тамара *570*
Цяжкі Артур *571*

Чабан Тамара *573*
Чавускі Міхась *573*
Чамярыцкі Вячаслаў *574*
Чапега Уладзімір *575*
Чаргінец Мікалай *576*
Чарказян Ганад *577*
Чаркасаў Анатоль *578*
Чарнушэвіч Нічыпар *579*
Чарнышэвіч Аркадзь *580*
Чарняўская Леаніла *581*
Чарняўскі Мікола *582*
Чарот Міхась *583*
Чарота Іван *584*
Чорны Кузьма *585*
Чыгрын Іван *586*
Чыгрынаў Іван *587*
Чыквін Ян *588*
Чэрня Хведар *589*

Шабан Яўген *591*
Шавель Кастусь *592*
Шальманаў Іван *592*
Шамякін Іван *593*
Шамякіна Таццяна *595*
Шапавалаў Іван *595*
Шапіра Лазар *596*
Шарахоўскі Янка *597*

Шасцерыкоў Пётр *598*
Шаўня Анатоль *598*
Шаўчонак Марыя *599*
Шах Соф'я *600*
Шахавец Уладзімір *600*
Шаховіч Міхась *601*
Шашалевіч Васіль *602*
Шашкоў Алесь *603*
Швед Віктар *604*
Шведзік Генадзь *605*
Шкраба Рыгор *605*
Шлег Алесь *606*
Шніп Віктар *607*
Шруб Павел *608*
Шукайла Паўлюк *608*
Шумаў Міхаіл *609*
Шупенька Генадзь *610*
Шутэнка Гаўрыіл *611*
Шуцько Іван *611*
Шушкевіч Станіслаў *612*
Шчарбатаў Георгій *613*
Шыловіч Георгій *614*
Шымук Віктар *615*
Шынклер Хвядос *616*
Шырко Васіль *617*
Шырма Рыгор *617*
Шырын Лявон *619*
Шыцік Уладзімір *620*
Шэлехаў Міхась *621*
Шэрман Карлас *621*

Юдэлевіч Міхась *623*
Юдэльсон Арон *624*
Юрчанка Георгій *624*
Юрэвіч Уладзімір *625*
Юхнавец Янка *626*

Ягоўдзік Уладзімір *627*
Ядвігін Ш. *628*
Якавенка Васіль *629*
Якімовіч Алесь *629*
Якімовіч Аляксей *631*
Якубовіч Леанід *632*
Якутаў Уладзімір *632*
Ялугін Эрнест *633*
Янішчыц Яўгенія *634*
Янкоўскі Фёдар *634*
Яновіч Сакрат *636*
Янчанка Мікола *637*
Ярац Віктар *637*
Ярашэвіч Эдуард *638*
Яромушкін Мікалай *640*
Ярош Міхась *640*
Яскевіч Алесь *641*
Яўменаў Леанід *641*
Яўсеева Святлана *642*
Яўсееў Рыгор *643*
Яфімаў Фёдар *643*

**Беларускія** пісьменнікі (1917—1990): Давед-
Б43 нік/Склад. А. К. Гардзіцкі; Нав. рэд. А. Л. Верабей.— Мн.: Маст. літ., 1994.— 653 с. іл.

ISBN 5-340-00709-X.

Новы біябібліяграфічны даведнік складаецца на падставе папярэдняга, выдадзенага ў 1981 годзе. Яго істотна папаўняюць імёны, якія нам вяртае час,— А. Гаруна, В. Ластоўскага, А. Мрыя і інш., а таксама звесткі пра беларускіх пісьменнікаў замежжа і тых, што сталі членамі СП за апошнія дзесяць гадоў.

**4406010000— 003**

**Б ———————— 68—93**

**М 302(03)—94**

**ББК 91.9:83.3Бел7**

Літаратурна-мастацкае выданне

**Беларускія пісьменнікі**

**(1917—1990)**

*Даведнік*

Складальнік
Гардзіцкі Аляксей Кузьміч

---

Рэдактар *Н. А. Давыдзенка.* Мастак *М. Р. Казлоў.*
Мастацкі рэдактар *А. І. Цароў.* Тэхнічны рэдактар *Т. М. Сокал.*
Карэктары *К. А. Крукоўская, Я. Ф. Харко.*

ІБ № 3503

Здадзена ў набор 14.07.92. Падп. да друку 18.11.93. Фармат $84\times108^1/_{32}$. Папера афс. № 1. Гарнітура тып Таймс. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 34,44. Ум. фарб.-адб. 34,44. Ул.-выд. арк. 31,53. Тыраж 22 000 экз. Зак. 2206.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа, 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Беларускія пісьменнікі